БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў СЛАВЯНСКІМ ЭТНАКУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

Віцебск 2015

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь
Установа адукацыі “Віцебскі дзяржаўны
ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА Ў СЛАВЯНСКІМ ЭТНАКУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

Матэрыялы II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі

Віцебск,
19–20 лістапада 2015 г.

Віцебск
ВДУ імя П.М. Машэрава
2015

УДК 811.161.3(06)+821.161.3(06)
ББК 811.411.3я43+83.3(4Беи)я43
Б43

Друкуецца па рашэнні навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава”. Пратакол № 1 ад 23.10.2015 г.

Рэдакцыйная калегія:
Г.А. Арцямёнак (адк. рэд.), **В.В. Лапацінская,**
Ю.М. Бабіч, В.Ю. Бароўка,
С.У. Нікалаенка, В.Ф. Падстаўленка, Г.К. Семянькова

Б43 **Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце :** матэрыялы II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі, Віцебск, 19–20 лістапада 2015 г. / Віц. дзярж. ун-т ; рэдкал.: Г.А. Арцямёнак (адк. рэд.) [і інш.]. – Віцебск : ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015. – 298 с.

ISBN 978-985-517-509-5.

Зборнік змяшчае навуковыя даклады мовазнаўцаў і літаратуразнаўцаў, прачытаныя на II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі “Беларуская мова і літаратура ў славянскім этнакультурным кантэксце”.

Разгледжаны праблемы лексікалогіі, анамастыкі, сацыялінгвістыкі, культуры мовы, літаратуразнаўства, методыкі выкладання мовы і літаратуры.

Для навуковых супрацоўнікаў, аспірантаў, студэнтаў.

УДК 811.161.3(06)+821.161.3(06)
ББК 811.411.3я43+83.3(4Беи)я43

ISBN 978-985-517-509-5

© ВДУ імя П.М. Машэрава, 2015

Е.И. Абрамова (Брест)

ОСОБЕННОСТИ ПУБЛИЦИСТИЧЕСКОГО ДИСКУРСА ПЕЧАТНЫХ СМИ БРЕСТЧИНЫ

Современная эпоха – это время активных и стремительных политических, экономических, социальных перемен. Они не могут не находить отражения в языке, активно и повседневно использующемся обществом как средство коммуникации. Новые реалии, новая ситуация определяют изменения языкового, стилевого облика журналистики, а также и некоторых ее содержательных черт. Это закономерно: меняется социальная действительность – другой становится и журналистика. Значительные перемены, которые были обусловлены такими факторами, как изменение статуса и функций СМИ в обществе, обретение демократических свобод (печати, слова), развитие конкурентных отношений между СМИ, изменение коммуникативного статуса аудитории, произошли и в региональных СМИ Беларуси, в том числе брестских. Все больше усложняются функции СМИ, среди которых важнейшими на сегодняшний день считаются регулятивная, эмоционально-эстетическая, оценочная, коммуникативная, ценностно-ориентирующая, оперативная, мобилизационная, инновационная, образовательная, функция критики, контроля, модераторства, социализации, формирования общественного мнения, артикуляции и интеграции.

Печатные СМИ Брестчины выступают в качестве своеобразного зеркала отражения жизни региона и сильнодействующего катализатора, оказывающего преобразующее влияние на ее динамику.

Изменения, наблюдаемые в печатных СМИ Бреста и Брестской области, нашли выражение прежде всего в росте объема информационного поля и информационной нормы: информирование стремится быть достоверным, фактологическим, полным. Стилистика материализации воздействующей функции стала более разнообразной, раскованной, индивидуализированной. Сегодня почти каждая газета Брестчины (областные и городские «Заря», «Брестский вестник», «Брестский курьер», «Вечерний Брест», «Народная трыбуна» и др., районные «Навіны Камянеччыны», «Чырвоная звязда», «Раённыя будні», «Заря над Бугом», «Полесская правда» и др.) имеет свое лицо, а каждый журналист стремится к проявлению своего авторского Я, своего стиля. Изменение стилистики журналистских текстов связано не только с преобразованиями в выражении субъекта речи, но и с презентацией отношений с адресатом. Перемены наблюдаются в способах выражения оценочности, в изменениях речевого воплощения диалогично-

сти, в выборе и распределении языковых средств, наконец, в жанровой системе.

В чем же конкретно проявляется специфика письменного дискурса региональных печатных СМИ Брестчины? Сразу оговоримся, что тексты средств массовой информации, с нашей точки зрения, представляют собой именно дискурс, так как они всегда динамичны и современны, воспринимаются участниками коммуникации в контексте происходящих событий. Материалы, относящиеся к этому регистру речи, представляют собой «сплав» всего спектра функциональных стилей языка, в них функция сообщения реализуется в той же мере, что и функция воздействия, для чего используется весь набор имеющихся в распоряжении языка средств. Прежде всего следует отметить увеличение объема информационного поля региональной прессы, расширение публицистической проблематики, возможность альтернативной подачи информации вследствие того, что в регионе существуют государственные и независимые издания (например, газеты «Заря» и «Брестский вестник» с одной стороны и «Брестский курьер», «Вечерний Брест» с другой). В региональных брестских изданиях представлены разные подходы, взгляды, мнения, оценки одного и того же события: сравним, к примеру, заголовки «*Каждый голос важен*!» («Заря», № 114, 2015) и «*Предвыборная предсказуемость никого в Беларуси уже не удивляет*» («Брестский курьер», № 44, 2015).

Общей чертой региональных печатных СМИ Брестчины в плане экспликации информационной функции является движение стилистических изменений «сверху вниз», уменьшение сдержанности, официальности в передаче информации, субъективизация дискурса новостей. В целом взаимоотношения между информативной и воздействующей функциями, их содержательная сущность и, особенно, средства реализации этих функций заметно изменились за последние полтора десятилетия. В публицистическом дискурсе обе эти функции (информационная и воздействующая) все более выступают в своей основной роли – информирования и экспрессивности.

Значительный масштаб и интенсивность приобрела в письменном дискурсе региональных СМИ «экспансия» разговорной речи вплоть до просторечия. В тексты проникают сленговые и жаргонные лексические единицы (приведем в качестве примера заголовки: «*Бизнес «с душком*» («Вечерний Брест», № 34, 2015); «*Зачистка» в общежитиях*» («Вечерний Брест», № 34, 2014) и др. Возросло использование в письменном дискурсе региональных СМИ фразеологических единиц, причем заметно чаще стали использоваться фразеологизмы сниженного, просторечного характера: «*Медсестрам «скостят» срок*» («Вечерний Брест», № 23, 2015); *Небо «в клеточку»* («Брестский курьер», № 20, 2014) и т. п. Участилось и использование приема иронической деформации или трансформации смысла известных пословиц и поговорок: «*В ноже правды нет*» («Вечерний Брест», № 100, 2014) и др. Широко представлены лексические и семантические ок-

казионализмы, например: *детсадизм, игнор, экзот, плодово-выгодное, убыточно-народное, ГЕЕполитический, гардеробообразующий* и мн. др. В морфологии разговорные средства широко представлены такими элементами, как, например, *гаишник, ипэшник, шариковщина*; частицами *дескать, мол, де* и др.; в синтаксисе – резким увеличением частотности предложений устно-разговорного типа, эллиптических конструкций. Разговорные средства всех языковых уровней используются в самых различных жанрах.

Парадоксально, но вместе с поиском новых средств информирования, оценочности, экспрессии в письменном дискурсе региональных СМИ Брестчины используются и языковые средства советской прессы, а именно «общие», или «универсальные», слова. Содержание текстов, насыщенных такими «общими» словами, становится приблизительным, неточным, так как конкретные наименования конкретных же предметов, действий, свойств заменяются единственным, семантически предельно расплывчатым при таком употреблении словом, например: «*Предприняты меры* (у читателя сразу возникает вопрос, а кем именно?) *для обеспечения безопасности* (от чего?) *населения* (всего поголовно или какой-то части?) *в будущем* (завтра? через год?). К таким словам можно отнести *акцент, аннулировать, афишировать, внедрять, возводить, вопрос, вручить, гарантировать, годовщина, дело, дефект, дилемма, добротный, довелось, инцидент, исключительно, качественный, ликвидировать, масштаб, масштабность, осуществить, порядка* (в значении «около, приблизительно»), *практически, приоритет, проблема, реализовать, в результате* и др.

Влияние устно-разговорной речи и перераспределение статуса адресанта и адресата ощутимо сказываются на уровне публицистического дискурса региональных СМИ в изменениях речевого воплощения диалогичности. Важной чертой выражения диалогичности в дискурсе региональных СМИ является возросшая частота использования деформированных прецедентных текстов, которые способствуют формированию у читателя дополнительных ассоциаций: «*Берегись автомобиля!*» («Заря», № 57, 2014), «*Бомжи в помощь*» («Заря», № 105, 2014), «*Кончита ля комедия*» («Заря», № 51, 2014), «*В списке – значатся!*» («Заря», № 116, 2014), «*Неправда, что у войны не женское лицо!*» («Заря», № 35, 2011), «*Пойти и вернуться*» («Заря», № 101, 2014) и др. Как известно, какими бы ни были отношения между прецедентным и журналистским текстами, это всегда отношения диалога: сцепление и наполнение «чужого» слова своим содержанием. В диалогические отношения втягиваются не только тексты, но и создатели, и читатели, тексты и их потребители.

В целом в письменном дискурсе региональной печати отмечается упразднение жанровых перегородок, происходит заметная эволюция системы жанров: одни жанры замещаются другими, некоторые трансформируются, третьи взаимодействуют и синтезируются.

Дискурс региональных СМИ дает богатый материал для наблюдения за эволюционными процессами прежде всего в лексическом составе языка, потому что значение любого слова, в том числе и печатного, и его восприятие пребывают в постоянной динамике.

Дискурс региональных СМИ, перемены, происходящие в нем, нуждаются в изучении, осмыслении, в выработке рекомендаций по совершенствованию речевой культуры журналиста.

М.М. Аляхновіч (Брэст)

СЕМАНТЫКА МОЎНАГА ЗНАКА Ў ЛІНГВАКУЛЬТУРАЛАГІЧНЫМ КАНТЭКСЦЕ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАГА ПАМЕЖЖА

Праяўленне сэнсава-сістэмных адносін у лексіцы і фразеалогіі мовы вытлумачваецца аднымі і тымі агульнамоўнымі законамі. Праўда, непасрэднае вытлумачэнне сутнасці гэтых з'яў (сінанімія, антанімія, полісемія, варыянтнасць і г.д.) даследчыкамі мовы да сёння не дае магчымасці сцвердзіць, што ўсе кропкі над "і" ў гэтым пытанні пастаўленыя.

З'ява многазначнасці ў лексіцы і фразеалогіі, да прыкладу, лічыцца ці не найпаўней даследаванай і раскрытай: і непасрэдна ў лексічнай сістэме, і ў фразеалагічнай, а таксама на ўзроўні супастаўлення і функцыянальнага параўнання. Спецыфіка фразеалагічных адзінак (ФА) абумовіла як знешняе, так і ўнутранае разыходжанне многазначнасці фразеалагічнай і лексічнай. "Прыкладна чацвёртая частка лексікі беларускай літаратурнай мовы – многазначныя словы", а "з 5755 фразеалагізмаў, пададзеных у Фразеалагічным слоўніку беларускай мовы (1993), на долю многазначных прыходзіцца 873 фразеалагізмы, або 15 % ад агульнай колькасці" [1, с. 62], "прыкладна толькі шостая іх частка мае часцей за ўсё два значэнні" [2, с. 57]. А па даных "Фразеологического словаря русского языка", "даже если иметь в виду условность, относительность этих данных, общее соотношение многозначных фразеологизмов и однозначных выражается как один к десяти" [4, с. 112].

Падыходы даследчыкаў пры акрэсленні сэнсава-сістэмных адносін у фразеалогіі вызначаюцца неакрэсленасцю пазіцый, што можна ў пэўнай ступені патлумачыць навуковым пошукам найбольш прымальных і выверaных тэарэтычных палажэнняў. Што да полісеміі ў сферы фразеалогіі, то ў навуковым плане гэта з'ява няпростая, бо закранае цэлую сістэму адносін унутры неаднаслоўнай устойлівай адзінкі, якой з'яўляецца фразеалагізм. Напрыклад, пры вызначэнні многазначных фразеалагізмаў апошнія падзяляюцца на дзве групы: да першай адносяцца ўстойлівыя адзінкі, значэнні якіх непасрэдна залежаць адно ад аднаго, наступнае вынікае з папярэдняга; да другой – фразеалагізмы, значэнні якіх не выяўляюць паміж сабой ніякай генетычнай сувязі, існуюць незалежна адно ад аднаго [4].

У класіфікацыйнай схеме для мнагазначных фразеалагізмаў айчыннага даследчыка І.Я. Лепешава адзначаем больш за дзесяць пазіцый. Сярод іх – абсалютыўнасць / канструктыўная абмежаванасць значэння, суб'ектнае акружэнне (адушаўлёнасць / неадушаўлёнасць, канкрэтнасць / абстрактнасць), аб'ектнае акружэнне (кантэкстуальная сувязь – кіраванне, дапасаванне, прымыканне), словы-суправаджальнікі (абавязковасць / неабавязковасць), стылістычнае размежаванне значэнняў, полісемія ў сістэме сэнсавых адносін (сінанімія, антанімія і інш.) [1, с. 62–73].

Класіфікацыйныя крытэрыі (паказчыкі) мнагазначных фразеалагізмаў, як бачым, маюць і падобнае, і адрознае абгрунтаванне. Для прыкладу, мнагазначнасць фразеалагізма павінна праяўляцца тады, калі яго значэнні "разграничиваются в зависимости от сочетания с существительными о д у ш е в л е н н ы м и или н е о д у ш е в л е н н ы м и. Ср.: **брать вверх** *над кем-либо* 'главенствовать, верховодить, иметь преимущество в чем-либо' и **брать вверх** *над чем-либо* 'оказываться сильнее, значительнее в каком-либо отношении, преобладать'" [Молотков, 121]. Параўн.: у І.Я. Лепешава: **браць (узяць) верх** 1. *над кім*. Падпарадкоўваць каго-н. сваёй волі, панаваць над кім-н.; 2. *над чым*. Аказвацца больш значным, мацнейшым чым што-н. іншае; 3. *над кім, над чым*. Дамагацца перавагі над кім-, чым-н., адольваць, перамагаць каго-, што-н. [ФСБМ, 1, 121].

І разам з тым – яшчэ меркаванне: "в фразеологизме **стереть с лица земли** неверно делить значение 'уничтожить' на значения 'погубить' и 'разрушить до основания' только потому, что далее следует одушевленное или неодушевленное существительное" [7, с. 43]. Цалкам адпавядае гэтаму сцвярджэнню фразеаграфічны артыкул слоўніка фразеалагізмаў украінскай мовы: **змести (стерти, зітерти) з лиця землі** *кого, що*. Жорстоко расправитися з ким-небудь, знищити, розгромити щось [ФСУМ, 1, с. 338].

Параўнаем фіксацыю адпаведных адзінак у фразеаграфічных даведніках рускай і беларускай моў: **стереть с лица земли** 1. *кого*. Жестоко расправиться с кем-либо, совсем погубить кого-либо; 2. *что*. Полностью уничтожить, разрушить до основания [ФСРЯ, 1986, с. 456]; **сціраць (сцерці) з твару зямлі** 1. *каго*. Жорстка распраўляцца з кім-н., знішчаць каго-н.; 2. *што*. Поўнасцю знішчаць, разбураць дашчэнту; 3. *што*. Поўнасцю і рашуча выкараняць тое, што перашкаджае [ФСБМ, 2, с. 410–411].

Сэнсавыя адносіны мнагазначных фразеалагізмаў найбольш прыкметна праяўляюцца пры параўнальна-гістарычным вывучэнні ўстойлівых адзінак, а наяўнасць адной, агульнай крыніцы паходжання дазваляе мнагазначным ФА на міжмоўным узроўні захаваць аднолькавую ўнутраную форму і – вельмі часта – семантыка-спалучальныя сувязі са словамі ў кантэксце, што з'яўляецца істотным пры размежаванні значэння. Пры такім падыходзе можна канстатаваць супадзенне напрамкаў (спосабаў) развіцця новых значэнняў ФА ў мовах – бел.: **Адзін на адзін** 1. Без сведак, без пабочных асоб (гаварыць, дамаўляцца, сустракацца *з кім-н*.); 2. Без саюзнікаў, памочнікаў, без падтрымкі з боку *каго-н*. (біцца, сустракаць не-

бяспеку і пад.); 3. У адзіночку, зусім адзін (заставацца, апынуцца *з чым-н.* і пад.) [ФСБМ, 1, с. 56–57]; укр.: **Один на один** 1. *з ким* і без додатка. Удвох *з ким-небудь*, без стороннього втручання; віч-навіч; 2. *з чим*. Сам *з чим-небудь* [ФСУМ, 2, с. 579]; рус.: **Один на один** 1. Наедине, без свидетелей, без посторонних; 2. Без союзников, без помощников, единомышленников и т.п. [ФСРЯ, с. 295].

Супадзенне вобразнай асновы і прыватных значэнняў характэрнае для многіх адзінак – бел.: схіляць галаву *перад кім, перад чым*; рус.: склонять (склонить) голову *перед кем, перед чем*; укр.: схиляти /схилити голову (чоло, шию) *перед ким.-чим*; пол.: skłaniać, skłonić głowę *przed kim, przed czym*; балг.: прекланям / прекланя (също скланям / скланя) глава *пред някого, пред нещо*; або: бел.: каламуціць (муціць) ваду; рус.: мутить воду; укр.: каламутити / скаламутити (закаламутити) воду [в криниці] *кому и без додатка*; балг.: мътя (също розмътвам / розмътя, бъркам, розбърквам / розбъркам) водата *на някого*; славацк.: mutit’ vodu; пол.: mącić, zamącić komu wodę і інш.

Першасная канкрэтна-паняційная суаднесенасць фразеалагізма ў нацыянальных умовах часцей за ўсё не дае магчымасці павялічыць ступень сэнсавага абагульнення, пашырыць спалучальныя сувязі ўстойлівай адзінкі, а значыць, праявіць на міжмоўным узроўні аднолькавыя ці падобныя сэнсавыя адносіны. У гэтым выпадку мнагазначныя ФА ў роднасных мовах пры частковым сэнсавым супадзенні ў цэлым разыходзяцца ў семантыцы, у канкрэтным яе змесце. Параўнаем: бел. – **залатыя рукі** *ў каго*. Хто-н. вельмі ўмелы і здольны ў сваёй справе чалавек [ФСБМ, 2, с. 287]; рус.: **золотые руки** 1. Мастер своего дела; человек, очень искусный в своем деле; 2. *у кого*. Кто-либо умеет сделать, смастерить все, за что ни возьмется [ФСРЯ, с. 398]; укр.: **золоті руки** 1. Майстер своєї справи; вправна, уміла, здібна людина; 2. *у кого*. Хто-небудь уміє зробити, змайструвати все, за що не візьметься; хтось кмітливий, спритний у роботі; 3. Уміння, вправність в усякій роботі, кмітливість у ремеслах, висока професійна майстерність [ФСУМ, 2, с. 769]; пол.: **mieć złote ręce** – być zdolnym, umieć co dobrze zrobić; umieć wszystko zrobić [Skorupka, 2, s.29]; балг.: **златни руце**, або: бел.:– **так сабе** 1. Без усякай прычыны, без пэўнага намеру (рабіць што-н.); 2. Ні добра і ні дрэнна, пасрэдна, сярэдне; 3. Ні добры і ні дрэнны, сярэдні, такі, што нічым асаблівым не вылучаецца [ФСБМ, 2, с. 434]; рус.: **так себе** 1. Ни плохо, ни хорошо; неважно; 2. Ничего особенного собой не представляющий. О ком-либо или о чем-либо среднем, посредственном, не имеющем ярко выраженных качеств; 3. Без особых намерений, цели, повода, причины [ФСРЯ, с. 470]; укр.: **так собі** 1. Ні добре, ні погано; посередньо; 2. Нічим не виділяється, нічого особливого не становить; посередній; 3. Непоганий; 4. Без особливої причини, наміру; випадково [ФСУМ, 2, с. 876]; пол.: **tak sobie** 1. Nie najlepiej, średnio, nieczygolnie; 2. Nie wiedzieć dlaczego, po co; bez celu, bez powodu [Skorupka, 2, s. 339].

Ці такая паралель – бел.: **як (нібы) снег на галаву** 1. Зусім нечакана для каго-н. (з'яўляцца, прыходзіць, прыязджаць і пад.). Пра раптоўнае з'яўленне каго-н. 2. Зусім нечакана, раптоўна (наступіць, адбыцца і пад.). Пра якую-н. падзею, вестку і пад. 3. Зусім нечаканы, раптоўны (прыход, візіт, навіна і пад.) [ФСБМ, 2, с. 365]; рус.: **как [будто, словно, точно] снег на голову** 1. Совершенно неожиданно, внезапно (появляться, прибывать, сваливаться, являться и т. п.); 2. Совершенно неожиданный, внезапный [ФСРЯ, с. 441]; укр.: **як (мов, ніби і т. ін.) сніг (дощ) на голову [з ясного неба],** з сл. з в а л ю в а т и с я, з ' я в л я т и с я та ін. Зовсім несподівано; раптово [ФСУМ, 2, с. 837]. Ці яшчэ **–** бел.: **з вераб'ёў нос.** 1. Вельмі мала. 2. Невялікі па колькасці, памерах. [ФСБМ, 1, 55]; пол.: **Strach, straszydło no wroble:** 1. kij przybrany łachmanami, stawiany w ogrodach i na polach dla odstraszenia ptastwa wyrządzającego szkody; 2. człowiek dziwacznie wyglądający [Skorupka, 2, s. 616].

Сюды ж можна дадаць і ФА па (самыя) вушы, кроў з малаком, пусціць слязу, адным духам, браць верх, сам па сабе і інш.

Літаратура

1. Лепешаў, І.Я. Фразеалогія сучаснай беларускай мовы: вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Выш. шк., 1998. – 271 с.

2. Лепешаў, І.Я. Праблемы фразеалагічнай стылістыкі і фразеалагічнай нормы / І.Я. Лепешаў.– Мінск: Навука і тэхніка, 1984. – 264 с.

3. Лепешаў, І.Я. Фразеалагічны слоўнік беларускай мовы. У 2 т. Т. 1. А–Л. – 500 с; Т. 2. М–Я / І.Я. Лепешаў. – Мінск: БелЭн, 1993. – 607 с. [ФСБМ].

4. Молотков, А.И. Основы фразеологии русского языка / А.И. Молотков. – Л.: Наука, 1977. – 284 с.

5. Фразеологический словарь русского языка: Свыше 4 000 словарных статей / Л.А. Войнова, В.П. Жуков, А.И. Молотков, А.И. Федоров; Под ред. А.И. Молоткова. – 4-е изд., стереотип. – М.: Рус. яз., 1986. – 543 с. [ФСРЯ].

6. Фразеологічний словник української мови / Уклад.: В.М. Білоноженко та ін. – Київ: Наукова думка, 1993. – 984 с. [ФСУМ].

7. Шанский, Н.М. Фразеология современного русского языка. – 3-е изд., испр. и доп. / Н.М. Шанский – М.: Высш. шк., 1985. – 160 с.

8. Skorupka Stanisław. Słownik frazeołogiczny języka polskiego. – Warszawa, Wiedza Powszechna, 1989. – A / P – 788 s.; R / ż – 909 s. [Skorupka].

Г.А. Арцямёнак (Віцебск)

БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў САЦЫЯЛЬНАЙ ТЫПАЛОГІІ МОЎ СВЕТУ

Сацыяльная тыпалогія з'яўляецца параўнальна новым напрамкам лінгвістычных даследаванняў, яна вызначае прынцыпы аб'яднання моў у залежнасці ад іх сацыяльных функцый, ролі ў працэсах камунікацыі. Для сацыяльна-тыпалагічнай характарыстыкі моў істотнымі з'яўляюцца грамадска-палітычныя абставіны іх функцыянавання, колькасць носьбітаў, сферы і асяродкі ўжывання, формы існавання, юрыдычны і рэальны статус

у соцыуме, грамадскі прэстыж, магчымыя перспектывы далейшага выкарыстання. У адрозненне ад структурнай тыпалогіі, вытокі якой можна знайсці ў сярэдневяковых мовазнаўчых распрацоўках, сацыяльная (функцыянальная) тыпалогія яшчэ толькі складваецца. Гэта звязана як з метадалагічнымі цяжкасцямі, так і з выключнай разнастайнасцю статусаў і функцый моў у краінах свету. “На Зямлі няма дзвюх тоесных моўных сітуацый, няма дзвюх моў з роўным аб’ёмам камунікацыі, з аднолькавай гісторыяй і з аднолькавай будучыняй” [1, с. 13].

Паводле камунікатыўнага рангу беларуская мова адносіцца да нацыянальных (дзяржаўных) моў. Такім статусам у свеце валодаюць усяго каля 100 моў. Аднак названы фактар істотна трансфармуецца пад уплывам моўнай сітуацыі ў пэўнай краіне ці рэгіёне. Паколькі беларуская мова функцыянуе на тэрыторыі Беларусі ў сітуацыі нераўнаважнага білінгвізму побач з рускай мовай, якая належыць да найвышэйшага камунікатыўнага рангу сусветных моў, рэальны модус выкарыстання беларускай мовы прыкметна паслаблены. Вызначальнай характарыстыкай сучаснай моўнай сітуацыі ў Беларусі з’яўляецца функцыянальна незбалансаванае руска-беларускае двухмоўе, якое мае не этнічны, а сацыяльна-культурны характар. Беларуская мова валодае дзяржаўным юрыдычным статусам, яна дастаткова развітая на ўсіх структурных узроўнях і патэнцыяльна не абмежаваная ў сферах выкарыстання. Разам з тым наяўная камунікатыўная практыка ілюструе істотную перавагу больш моцнай і прэстыжнай рускай мовы амаль ва ўсіх сферах.

Апошнія афіцыйныя звесткі пра выкарыстанне беларускай мовы ў штодзённых зносінах змешчаны ў матэрыялах перапісу 2009 года. Паводле іх, беларускую мову як мову, на якой звычайна размаўляюць дома, выкарыстоўваюць 23,4% насельніцтва Беларусі (з тых, хто адносіць сябе да беларусаў, – 26,1%) [3]. Гэтыя лічбы ў цэлым карэлююць з агульнай колькасцю сельскага насельніцтва ў краіне (25,7%). Калі ўлічыць, што ў апытальных лістах не былі прадугледжаны змешаныя формы маўлення (так званая “трасянка”), можна меркаваць пра пераважнае ўключэнне апошніх самімі рэспандэнтамі ў камунікатыўную прастору беларускай мовы. Верагодна таксама, што пэўная колькасць насельніцтва, адказваючы на пытанні перапісу, імкнулася мэтанакіравана падтрымаць камунікатыўны статус беларускай мовы, чым падсвядома падкрэслівала важнасць яе сімвалічнай функцыі.

Руская мова сёння дамінуе ў сферы гаспадаркі і вытворчасці, грамадска-палітычнай і дыпламатычнай дзейнасці, сістэме навучання, сродках масавай інфармацыі і прапаганды, навуцы, кнігавыданні, мастацтве (сферы эстэтычнага ўздзеяння – тэатр, кіно), абслугоўванні, справаводстве, асабістай перапісцы, афіцыйнай інтэрперсанальнай камунікацыі і інш. Беларуская мова пакуль пераважае ў сферы нацыянальнай мастацкай літаратуры і традыцыйнага фальклору, хаця і тут у апошні час назіраюцца зрухі ў напрамку пашы-

рэння рускамоўных твораў. Пры гэтым сфера вербальнай мастацкай творчасці добра асвоена беларускай мовай нават у самых сучасных, навамодных праявах (постмадэрнісцкі дыскурс, моладзевы і камп'ютарны слэнг, інтэрнэт-камунікацыя).

Такім чынам, маючы камунікатыўны ранг і юрыдычны статус дзяржаўнай, а таксама з'яўляючыся тытульнай мовай краіны, беларуская мова ў Рэспубліцы Беларусь стала фактычна мінарытарнай (мовай меншасці). Такая неадпаведнасць увогуле амаль не характэрная для моўнага ланшафту свету. Пэўныя паралелі ў Еўропе назіраюцца з каталанскай, галісійскай, басконскай, рэтараманскай, фарэрскай мовамі, але яны маюць статус афіцыйных толькі на пэўнай частцы тэрыторыі дзяржавы, населенай прадстаўнікамі адпаведнага этнасу, і двухмоўе мае там этнічны характар.

У падрыхтаваным ЮНЕСКА інтэрактыўным "Атласе моў свету, што знаходзяцца пад пагрозай знікнення" (2010) ўсе мовы паводле ступені жыццяздольнасці падзяляюцца на 6 узроўняў у адпаведнасці з 9 крытэрыямі, самым важным з якіх лічыцца пераемнасць моў паміж пакаленнямі. Беларуская мова аднесена да так званых "загрожаных", ці "нестабільных", "уразлівых" (vulnerable), як і, напрыклад, адыгейская, басконская, башкірская, карачаева-балкарская, уэльская, чувашская (звяртае на сябе ўвагу, што названымі мовамі, у адрозненне ад беларусаў, карыстаюцца этнасы, якія не маюць уласнай суверэннай дзяржаўнасці). Разам з тым беларуская мова не трапіла ў пералік моў, што стаяць перад рэальнай пагрозай, як абазінская, валонская, ідыш, ірландская, карэльская, ламбардская, цыганская, шатландская, эрзянская, або сур'ёзнай пагрозай знікнення, як брэтонская, іжорская, каракская, кашубская, лангедокская, нанайская, нганасанская, правансальская, чукоцкая [4]. У Чырвонай кнізе моў Еўропы (1999) беларуская належыць да моў з патэнцыйнай пагрозай знікнення па прычыне непрэстыжнасці ў соцыуме разам з галісійскай, карсіканскай, ламбардскай, лігурыйскай, ніжнесаксонскай і іншымі [5].

У еўрапейскіх краінах з другой паловы мінулага стагоддзя няўхільна нарастае імкненне захаваць і адрадзіць культурна-моўную самабытнасць розных этнасаў. Думаецца, беларуская мова сёння таксама патрабуе спецыяльнай падтрымкі з боку дзяржавы, нягледзячы на свой высокі прававы статус, бо ў сітуацыі дзяржаўнага, да таго ж блізкароднаснага, двухмоўя фактычнае становішча моў апрыёры не можа адпавядаць юрыдычнаму. У прыватнасці, такая падтрымка магла б выявіцца ў свядомым і мэтанакіраваным пашырэнні сітуацый дыглоснага характару ў некаторых галінах сацыяльна-моўнай практыкі, што звязана з наданнем кожнай мове спецыфічнага кола абавязкаў і строга зафіксаваных "зон абслугоўвання". Прадуманае размежаванне сфер выкарыстання беларускай і рускай моў дазволіла б стабілізаваць моўную сітуацыю, павысіць прэстыж беларускай мовы, захаваць яе як этнакультурны скарб для наступных пакаленняў і ўмацаваць нацыянальную самасвядомасць беларускага народа.

Беларуская пісьмова-літаратурная мова, хоць і з’яўляецца “маладой”, мае дастаткова высокую ступень унармаванасці і кадыфікацыі. Аднак у сучасным шматмоўным свеце на першы план выходзіць вусная масавая камунікацыя (асабліва на тэлебачанні), якая, па сутнасці, прадвызначае камунікатыўна-сацыяльны статус мовы. Сёння рост папулярнасці беларускай мовы немагчымы без тэлетрансляцыі на асноўных дзяржаўных каналах навін, грамадска-палітычных і навукова-папулярных перадач, новых фільмаў, серыялаў, канцэртаў, спектакляў, рэкламы па-беларуску. Гэта наглядна паказвае моўная палітыка і практыка мас-медыя былых савецкіх рэспублік.

Паводле вучэбна-педагагічнага статусу беларуская мова блізкая да ўкраінскай, польскай, грузінскай, венгерскай, чэшскай, літоўскай і іншых моў, што могуць выкарыстоўвацца ва ўстановах адукацыі як дапаможныя пры навучанні замежнай мове (беларуская – рэдка), як непасрэдныя мовы выкладання (удзельная вага беларускай пастаянна змяншаецца), а таксама як вучэбныя прадметы. Названыя мовы, аднак, не вывучаюцца ў якасці агульнаадукацыйнага прадмета “замежная мова”, у адрозненне ад вядомых сусветных і міжнародных моў (англійская, іспанская, нямецкая, руская, французская). З 2012 года ў Беларусі па прыкладзе краін Балтыі і шэрагу славянскіх краін Еўропы была адноўлена традыцыя правядзення летніх школ беларускай мовы, літаратуры і культуры для замежнікаў.

Беларуская мова не мае і гістарычна не мела канфесійнага статусу сакральнай (“прафетычнай” або “апостальскай”) мовы, хоць на яе здаўна маглі перакладацца кнігі рэлігійнага зместу. Больш за тое, параўнальна слабыя кантакты з царкоўнаславянскай як сакральнай мовай Усходняй Славіі істотна паўплывалі на станаўленне пласта абстрактнай лексікі, што і сёння яшчэ заўважаецца ў параўнанні з мовамі, якія мелі працяглую і неперарваную літаратурна-пісьмовую традыцыю (параўн. семантыка-стылістычныя цяжкасці з перакладам славянізмаў тыпу *благодать, благословить, воображение, восхитительный, лик, неблагополучный, обольщение, общаться, отвлечь, предоставить, уязвимый* і да т. п.). У наш час беларуская мова можа спарадычна выкарыстоўвацца ў якасці культавай, праўда, амаль выключна ў сферы каталіцкай царквы.

У тыпалогіі літаратурных моў сучасная беларуская літаратурная мова адносіцца да параўнальна “маладых”, як, напрыклад, украінская або славенская. Такія мовы не дэманструюць значных адрозненняў, з аднаго боку, паміж гутарковым маўленнем на літаратурнай мове і дыялектным маўленнем, з другога – паміж кадыфікаванай літаратурнай мовай і арыентаваным на яе гутарковым штодзённым маўленнем. Адпаведна ў іх не назіраецца глыбокай сэнсавай дыферэнцыяцыі варыянтных і сінанімічных сродкаў, г. зн. у многіх выпадках выбар варыянта не звязаны з істотнымі семантычнымі і стылістычнымі адрозненнямі, якія папросту яшчэ не паспелі скласціся. Для такіх жа моў з працяглай пісьмовай традыцыяй, як англійская, руская, французская, нямецкая, арабская, японская, іўрыт,

функцыянальна не абумоўленае вар'іраванне моўных сродкаў у цэлым не характэрнае. Важным фактарам з'яўляецца таксама перарванасць / бесперапыннасць пісьмовай традыцыі. Для большасці славянскіх народаў (беларускага, украінскага, чэшскага, балгарскага, сербскага, харвацкага, славацкага, славенскага) адсутнасць дзяржаўнай самастойнасці, іншаземны нацыянальны прыгнёт перапынілі развіццё ранняй пісьмовай культуры, у выніку чаго кніжна-літаратурная практыка адраджалася нанова праз некалькі стагоддзяў у рэчышчы нацыянальна-вызваленчых рухаў. Фарміраваннем новай літаратурнай мовы на грунце жывых народных гаворак абумоўлена, напрыклад, абмежаванае ўжыванне дзеепрыметнікаў незалежнага стану і звязаныя з гэтым некаторыя праблемы выкарыстання беларускай мовы ў афіцыйным і навукова-тэхнічным стылях. У той жа час руская, польская, чэшская мовы вельмі часта чэрпаюць стылістычныя сродкі з ранніх перыядаў сваёй гісторыі.

У айчыннай навукова-папулярнай публіцыстыцы не раз адзначалася тыпалагічная блізкасць моўных сітуацый у Беларусі і Ірландыі. Трэба, аднак, бачыць і розніцу: этнічную самасвядомасць ірландцаў значна ўмацоўваюць істотныя рэлігійныя і культурныя адрозненні, сацыяльная памяць пра гісторыю народа і краіны, адзінства палітычных мэт. Гістарычныя абставіны станаўлення беларускай нацыі складваліся па-іншаму і ў многім залежалі ад моўнай самаідэнтыфікацыі насельнікаў, у выніку чаго для беларусаў, на нашу думку, менавіта мова стала найгалоўнейшым фактарам падтрымкі існавання этнасу, засцярогай ад ператварэння яго ў геаграфічную групоўку насельніцтва. У канкрэтна-гістарычных умовах Беларусі, улічваючы ўсе акалічнасці ўзнікнення і развіцця беларускай дзяржаўнасці, цяжка пагадзіцца з меркаваннем, што "сістэма нацыянальнай самасвядомасці са стратай нацыянальнай мовы можа трывала ўгрунтоўвацца на іншых кампанентах этнасу" [2, с. 118].

Літаратура

1. Мечковская, Н.Б. Общее языкознание. Структурная и социальная типология языков / Н.Б. Мечковская. – 7-е изд. – М.: Флинта; Наука, 2009. – 312 с.

2. Мікуліч, Т.М. Мова і этнічная самасвядомасць / Т.М. Мікуліч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1996. – 159 с.

3. Перепись населения Республики Беларусь 2009 года [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.belstat.gov.by/uploads/file/GU_demogr/5.11-0.pdf. – Дата доступа: 15.10.2015.

4. UNESCO Atlas of the World's Languages in Danger [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.unesco.org/languages-atlas/en/atlasmap.html. – Дата доступа: 18.10.2015.

5. UNESCO Red Book on Endangered Languages: Europe [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.helsinki.fi/~tasalmin/europe_index.html. – Дата доступа: 18.10.2015.

Ю.М. Бабіч (Віцебск)

НЕКАДЫФІКАВАНАЯ ЛЕКСІКА Ў ЗАГАЛОЎКУ ГАЗЕТНАГА ТЭКСТУ: КАМУНІКАЦЫЙНА-ПРАГМАТЫЧНЫ АСПЕКТ

Публіцыстычны дыскурс у сродках масавай інфармацыі ўяўляе сабой асобную, адрозную ад іншых відаў тэксту структуру. Тут прысутнічаюць традыцыйныя моўныя ўтварэнні – загалоўкі, падзагалоўкі, рубрыкі. Але калі рубрыкі і падзагалоўкі не заўсёды абавязковыя, то загаловак – неад'емны структурна-кампазіцыйны складнік кожнага газетнага тэксту. І менавіта загаловак адыгрывае найважнейшую камунікацыйна-прагматычную ролю – прыцягненне ўвагі чытача да канкрэтнай публікацыі. Можна меркаваць, што загаловак апошнім часам набывае ўсё большае значэнне і ў кампазіцыйным плане. У структуры загалоўкаў і загаловачных комплексаў стала куды менш рознага кшталту штампаў і клішэ, змяншаецца і колькасць яшчэ нядаўна папулярных газетызмаў. Адбываецца паступовы адыход ад своеасаблівай стандартызацыі газетнага лексікону, журналісты шукаюць новыя, арыгінальныя і крэатыўныя шляхі ўздзеяння на чытача. І тут варта звярнуць увагу на жарганізмы, прастамоўі і індывідуальна-аўтарскія наватворы, чыя роля ў сістэме экспрэсіўных сродкаў беларускамоўнага публіцыстычнага тэксту нязменна ўзрастае.

Апошнім часам істотна пашырыліся ў складзе загалоўкаў элементы так званага "крымінальнага жаргону". Мяркуецца, што гэта дзейсны сродак прыцягнення ўвагі чытача, бо падобная лексіка на слыху ў пэўнай часткі грамадства. Інакш кажучы, асобныя моўныя канструкцыі газеты максімальна набліжаныя да рэцыпіента, што адразу здымае магчымы віртуальны бар'ер паміж журналістам і спажывальнікам інфармацыі. Прывядзём колькі прыкладаў са "Звязды": *Вучні 9-га класа "ўзялі" касу* (12.04.11); *Абама ўвёў санкцыі супраць "братвы" з СНД* (27.07.11); *Дама "ў чорным" "пайшла" на абменнік* (26.03.13); *"Залётных" махляроў затрымалі* (29.05.13); *Дырэктар "кінуў" знаёмых на 2 мільярды* (20.02.14); *Кватэру ў сваім жа доме "вынес" падлетак* (4.03.15). Падобныя стылістычна маркіраваныя лексемы нясуць, акрамя ўсяго, свайго кшталту адценне разняволенасці, нейкай рамантыкі, таму і прывабныя для чытача. Але такая схільнасць журналістаў да адыходу ад ранейшых стэрэатыпаў, скасаванне яшчэ нядаўна досыць выразна акрэсленых стылістычных межаў наўрад ці спрыяе выхаванню ў чытача добрага моўнага густу. Згаданае "разняволенне мовы" вядомы расійскі лінгвіст В. Кастамараў называе "варварызацыяй" або "вандалізацыяй" [1, с. 10]. Пры гэтым трэба заўсёды памятаць, што чытач звычайна ўспрымае мову СМІ як узор, эталон, варты безумоўнага пераймання. А сучасная газетная камунікацыя ў ідэале павінна мець на мэце не толькі інфармаванне чытача, але і фарміраванне ў яго пэўных эстэтычных уяўленняў, развіццё культуры слова. Таму ў па-

добных выпадках наўрад ці выпадае гаварыць пра які-небудзь нават мінімальны культурамоўны, выхаваўчы эфект.

Матэрыял паказвае, што даволі хутка ў айчынных друкаваных медыях пашыраецца практыка, калі ў ролі эмацыйна афарбаванага загалоўка, дзе асноўную канатацыйную функцыю выконваюць некадыфікаваныя лексемы, выступае цэлы сказ з закончанай думкай. У такім выпадку тэкст публікацыі толькі раскрывае некаторыя дэталі, канкрэтызуе факты ў тых ці іншых адносінах, істотна не ўплываючы на тэматычны складнік: *Як я “бамбіў” на Нарачы* (“Звязда”, 12.05.12); *Малады настаўнік: “Два гады – і я валю”* (“Наша ніва”, 13.03.13); “*Мы зарабляем мільёны на пантах моладзі*” (“Наша слова”, 27.03.13); *Мазыранін “разуваў” аўтамабілі* (“Звязда”, 10.10.13); *Парачка “прамышляла” ў саўне* (“Звязда”, 15.01.14); Як можна заўважыць, у загалоўках-сказах выкарыстоўваюцца і прастамоўі, і жарганізмы, што зноў жа падразумяваюць ці адлюстроўваюць пэўны крымінальны падтэкст. І частотнасць падобных лексем у загалоўках на старонках розных выданняў увесь час павялічваецца. Прычым аўтары артыкулаў часта нават не бяруць такія словы ў двукоссе: *Вайцюшкевіч запіша альбом блатняка па-беларуску* (“Наша ніва”, 14.11.12); *Міліцыянты мацюкаліся і слухалі зэкаўскі блатняк* (“Наша ніва”, 28.01.15). Тут па сутнасці мы маем справу з разгорнутымі тэкстамі, самадастатковымі ў сэнсавых адносінах, дзе некадыфікаваныя лексемы сапраўды істотна ўзмацняюць прагматычны складнік.

Многія лінгвісты, даследуючы спецыфіку сучасных газетных тэкстаў (В. Кастамараў, Г. Салганік, А. Земская і інш.), адзначаюць вялікі ўплыў на характар загалоўкаў элементаў “моўнай гульні”, а таксама своеасаблівай “маўленчай моды”. У айчынных СМІ названыя з’явы апошнім часам атрымалі таксама дастаткова шырокае распаўсюджанне. Нярэдка бачым загалоўкі, рэпрэзентаваныя адмысловымі наватворамі, што ў той ці іншай ступені адлюстроўваюць і журналісцкую словатворчасць, і патэнцыяльныя магчымасці нашай мовы ўвогуле: *Расія спыняе ўвоз малочкі з Літвы* (“Наша ніва”, 9.10.13) – пра абмежаванне экспарту малочных прадуктаў; *Голая аўтамыйка? О, прышпільна!* (“Наша ніва”, 6.11.13) – пра адкрыццё аўтамыйні, дзе працуюць дзяўчаты ў адпаведнай форме; *Кадратрус* (“Народная воля”, 30.12.14) – пра перастаноўкі ва ўрадзе Беларусі; *Пяць тэндэнцый сучбелліту* (“Звязда”, 4.02.15) – пра новыя кірункі ў сучаснай беларускай літаратуры.

Як вынік моўнай гульні можна ўспрымаць і вынесеныя ў загаловак пэўныя індывідуальна-аўтарскія наватворы, нярэдка рыфмаваныя. Напрыклад: *У “Юбілейнай” – усё “хакейна”* (“Звязда”, 11.04.14); *Хакей на “окей”* (“Звязда”, 7.05.14). Няцяжка зразумець, што ў дадзеным канкрэтным выпадку да падобных словатворчых эксперыментаў журналістаў падштурхнула правядзенне ў Мінску чэмпіянату свету па хакеі. Таму прывед-

зеныя ўтварэнні можна лічыць сітуацыйнымі, прывязанымі да пэўнай падзеі агульнанацыянальнага ці нават сусветнага маштабу.

Зразумела, што на газетнай паласе загаловак вылучаецца друкам, пішацца вялікімі літарамі. Гэта павышае верагоднасць хаця б фармальна-візуальнага азнаямлення з назвай артыкула ледзь не да ста працэнтаў. І калі праз загаловак не атрымалася зацікавіць чытача публікацыяй, то і артыкул ці нататка прачытаныя, хутчэй за ўсё, не будуць. Гэта значыць, мэта публікацыі недасягнутая. Таму на выбар загалоўка часам выдаткоўваецца не менш часу, чым на падрыхтоўку непасрэдна артыкула. Загаловак павінен адразу прывабіць патэнцыйнага чытача, але ні ў якім разе не дэзарыентаваць яго, не ўводзіць убок ад галоўнай тэмы, ідэі публікацыі.

Аналіз кампазіцыі беларускамоўных газетных тэкстаў апошніх гадоў сведчыць, што істотным чынам узмацняецца не толькі роля загалоўкаў, але і падзагалоўкаў, лідаў (ад англ. *lead* – “уступны”, “лідар”). Дарэчы, гэты спачатку чыста журналісцкі тэрмін цяпер усё часцей выкарыстоўваецца мовазнаўцамі пры аналізе розных аспектаў публіцыстычнага дыскурсу, у прыватнасці, пры даследаванні ролі загалоўкаў і загаловачных комплексаў. Лід уяўляе сабой першы абзац тэксту, звычайна вылучаны паўтлустым друкам, дзе тэзісна выказваецца асноўная праблематыка публікацыі. Дык вось менавіта ліды выконваюць усё больш важную структурна-семантычную функцыю ў газетным тэксце, выступаючы па сутнасці адмысловым ключом да ўласна загалоўка. Самі ж загалоўкі нярэдка адлюстроўваюць напаўпразрысты, напаўпрыхаваны сэнс і маюць алюзіўны характар. Гэта моцны элемент тэксту, які, можна сказаць, з’яўляецца яго імем і першым семіятычным сімвалам. А зразумець, расшыфраваць гэтую сімволіку якраз і дапамагаюць падзагалоўкі і ліды. Некаторыя лінгвісты мяркуюць, што нават слабы ў літаратурных ці сэнсавых адносінах тэкст будзе да канца прачытаны, калі яго суправадзіць па-майстэрску афармленым падзагалоўкам ці лідам.

Паводле сінтаксічнай формы загалоўкі сучасных беларускіх СМІ, якія ўтрымліваюць некадыфікаваную лексіку, можна класіфікаваць на намінатыўныя і прэдыкатыўныя. Намінатыўны загаловак – гэта няпоўны сказ, рэпрэзентаваны назоўнікам, двума назоўнікамі ці спалучэннем назоўніка з прыметнікам або дзеепрыметнікам: *Дэзы* (Загаловак). *Як расійская прапаганда хлусіла пра Украіну* (Падзагаловак, “Наша ніва”, 5.03.14); *Дубар на “Інтэграле”* (Загаловак). *Супрацоўнік прадпрыемства піша пра блізкія да нуля тэмпературы ў цэхах* (Падзагаловак, “Наша ніва”, 2.03.11); *Пакрыўджаная “бамбістка”* (Загаловак). *50-гадовая мінчанка з гарачкі “замініравала” будынак паштамта Гомеля* (Падзагаловак, “Звязда”, 28.01.11). Намінатыўны загаловак звычайна апрыёры з’яўляецца ацэначным, адпаведным чынам характарызуе апісанае ў тэксце і традыцыйна суправаджаецца падзагалоўкам – разгорнутым сказам, дзе ўдакладняецца сутнасць справы. У прыведзеных прыкладах стылістычна афарбаваныя

лексемы выступаюць адмысловым сродкам своеасаблівай імпліцытнай агрэсіі, калі аўтар падае прыхаваную негатыўную канатацыю. А падзагаловак расшыфроўвае яе, фарміруючы ў чытача адпаведны характар успрымання інфармацыі. Але, як паказвае матэрыял, такога кшталту назвы з некадыфікаванымі лексемамі ў айчынных выданнях саступаюць па частотнасці прэдыкатыўным, што ўяўляюць сабой поўныя сказы. Пры гэтым прэдыкатыўны загаловак у значна меншай ступені залежыць ад падзагалоўка, таму можа яго і не мець: *Шанц "завязаць"* ("Звязда, 9.10.14); *Дзеўкі "зажыгаюць"!* ("Звязда", 26.01.13); *"Залётных" махляроў затрымалі* ("Звязда", 29.05.13); *Няхай самі "фільтруюць" прапановы* ("Звязда", 4.12.14). Прыведзеныя загалоўкі сапраўды самадастатковыя ў сэнсавых і сінтаксічных адносінах і самі па сабе прывабныя для непатрабавальнага чытача. Гэта якраз той выпадак, калі на першы план выходзіць не столькі інфармацыйная, колькі забаўляльная функцыя газеты, ужо не гаворачы пра захаванне нейкіх стылістычных межаў публіцыстычнага дыскурсу.

Такім чынам, матэрыял паказвае, што некадыфікаваная лексіка адыгрывае ўсё большую ролю ў структуры загалоўка газетнага тэксту. Істотна павялічылася частотнасць выкарыстання элементаў так званага "крымінальнага жаргону", што фіксуюцца ў загалоўках публікацый практычна ў кожным нумары найбольш папулярных беларускамоўных выданняў – газет "Звязда" і "Наша ніва". Такая з'ява – гэта адлюстраванне пэўнага моўнага "густу" сучаснага беларускага грамадства і адначасова індыкатар тых працэсаў, якія адбываюцца ў нашай мове. Прыгадаем тут справядлівае меркаванне расійскага даследчыка І. Сцерніна, што "абсалютная большасць змяненняў у мове звязана са змяненнямі у грамадстве" [2, с. 4]. І, безумоўна, надзвычай вялікі ўплыў на жарганізацыю беларускага публіцыстычнага дыскурсу аказвае руская мова, дзе падобная з'ява праяўляецца ў яшчэ большай ступені.

Можна меркаваць, што выкарыстанне некадыфікаваных лексем у загалоўку дапамагае дасягнуць неабходнага камунікацыйна-прагматычнага эфекту. Але гэта выразна кантрастуе з праблемай захавання культуры мовы, разбурае само паняцце "чысціня маўлення", што можа мець сур'ёзныя негатыўныя наступствы для агульнага культурнага ўзроўню нашага грамадства.

Літаратура

1. Костомаров, В.Г Языковой вкус эпохи. Из наблюдений над речевой практикой масс-медиа / В.Г. Костомаров. – СПб., 1999.
2. Стернин, И.А. Практическая риторика / И.А. Стернин. – М., 2005.

Л.М. Вардамацкі (Віцебск)

АДЛЮСТРАВАННЕ РЭГІЯНАЛЬНЫХ АСАБЛІВАСЦЕЙ МОВЫ Ў ПІСЬМОВЫХ ПОМНІКАХ ПОЛАЦКА ПАЧАТКУ XIV СТ.

Вывучэнне матэрыяльнай і духоўнай культуры продкаў, якія насялялі наш край шмат стагоддзяў назад, іх светаўспрымання, асаблівасцей штодзённага побыту, узаемаадносін з іншымі народамі на падставе вывучэння асаблівасцей мовы, адлюстраванай у рознахарактарных гістарычных дакументах, мае значную гісторыю і даволі багатыя набыткі. Пісьмовыя помнікі Вялікага Ноўгарада, Пскова, паўночна-ўсходніх старажытных рускіх зямель, дзякуючы высілкам вядомых гісторыкаў мовы, археолагаў, апісаны вельмі шырока і падрабязна. Але сёння мы не можам, на жаль, сказаць, што і беларускія гістарычныя дакументы часоў да Вялікага Княства Літоўскага знаходзяцца пад такой жа пільнай увагай даследчыкаў-мовазнаўцаў (у адрозненне ад гісторыкаў). Работы, распачатыя такімі вядомымі гісторыкамі беларускай мовы, як У.В. Анічэнка, А.М. Булыка, А.І. Жураўскі, А.А. Крывіцкі, Л.М. Шакун і інш., заклалі трывалы падмурак беларускага гістарычнага мовазнаўства. Але трэба адзначыць, што ў апошнія дзесяцігоддзі ўвага да гэтага прадмета значна аслабла. Між тым менавіта сённяшні дзень патрабуе як новых росшукаў у скарбонцы помнікаў беларускага пісьменства, так і перагляду некаторых хрэстаматыйных паняццяў гісторыі фарміравання беларускай мовы з пункту погляду новых задач і новых магчымасцей мовазнаўства.

Мэта нашага даследавання – актывізаваць цікавасць да дакументальных гістарычных пісьмовых крыніц, якія нясуць у сабе асноўны патэнцыял станаўлення беларускай гістарычнай этналогіі.

Гісторыя данесла да нас шэраг тэкстаў, якія даюць даследчыку магчымасць гаварыць пра час, крыніцы, этапы, асаблівасці фарміравання беларускай мовы. Помнікі пісьменства Полаччыны можна лічыць найбольш прыдатнымі для вывучэння гэтага працэсу, бо мова гэтай тэрыторыі ў гістарычным плане акумулюе ў сабе, з аднаго боку, яе базавыя, вытокавыя карані, з другога – сацыяльна і эканамічна апраўданыя вынікі міжмоўных кантактаў.

Зразумела, кожны помнік пісьма, а асабліва помнік дзелавога пісьменства, нясе ў сабе пэўны элемент аддаленасці ад жывой тагачаснай гаворкі. А менавіта гэты варыянт мовы (вусна-гутарковая мова) з’яўляецца асабліва важным для даследчыка, бо паступовыя змены ў мове, якія прыводзяць у выніку да такога яе стану, калі мы можам гаварыць пра фарміраванне самастойнай моўнай сістэмы, узнікаюць, працякаюць і развіваюцца ў жывой штодзённай народнай гаворцы, паступова ахопліваючы ўсё больш шырокае камунікатыўнае поле. І толькі потым перацякаюць у мову пісьмовую. Фанетычных і граматычных запісаў вуснай

гаворкі палачан 12 – 15 стагоддзяў у нас, натуральна, няма. Узнікае пытанне – наколькі можна давяраць пісьмовым крыніцам пры вывучэнні вуснай мовы гэтага перыяду?

На жаль, большасць дакументаў, якія маюць адносіны да старажытнай гісторыі Полацкай зямлі (і Беларусі ўвогуле), застаюцца маладаступнымі.

Адзін з такіх нешматлікіх помнікаў вядомы нам пад умоўнай назвай «Гандлёвы дагавор паміж Полацкам і Рыгай пра вагу тавараў, кошты за вагу і адносна няякасных тавараў» (каля 1330 г.). Пад такой назвай Дагавор быў упершыню апублікаваны К.Э. Напіерскім у 1857 годзе. Сярод нешматлікіх выданняў гэтага дакумента можна назваць і выданне А.Л. Харашкевіч, уключанае ў зборнік «Полоцкие грамоты» (М., 1977 г.). На жаль, пры падрыхтоўцы тэксту да выдання А.Л. Харашкевіч значна яго спрасціла, тэхнічна адаптавала. Таму выданне К.Э. Напіерскага застаецца больш прыдатным да вывучэння моўных асаблівасцей дакумента, хоць і менш даступным. Трэба адзначыць і разыходжанне К.Э. Напіерскага і А.Л. Харашкевіч адносна датавання дакумента. К.Э. Напіерскі ўказвае на час «каля 1330 года». А.Л. Харашкевіч лічыць, што грамата з'явілася «не раней 1338 г.».

Арыгінал дакумента быў выкананы на пергаменце, замацаваны двума вісячымі свінцовымі пячаткамі: адна з надпісам па частках у пяць радкоў «Печать епспа грігор (?ѧ)», другая – з надпісам часткамі ў чатыры радкі «(П)ѥчат(ь) (к)нѧжа глебова». Агульны аб'ём тэксту дакумента – 21 радок, ад 39 да 43 знакаў у кожным радку (у апошнім – 35). Тэкст выкананы ў традыцыі дзелавога пісьма XIII – XV стст., паўуставам (блізкім да ўстаўнога пісьма), без прабелаў між словамі, з выкарыстаннем кропак у сярэдзіне радка пры пералічэннях або паміж часткамі сінтаксічных структур. Адчуваецца значны вопыт у гэтым плане як таго (тых), хто дыктаваў тэкст, так і таго, хто яго пісаў. Нельга сказаць, што да нас з тых часоў дайшла вялікая колькасць такіх грамат, але ўжо і па тых, якія ёсць, можна гаварыць аб актыўнасці пісьмовых зносін рознага характару на старажытнай тэрыторыі Полаччыны.

Разам з тым тэкст дакумента дэманструе і некаторыя асаблівасці тэхнічнага і моўнага характару. Так, тэкст граматы, яго моўнае і стылістычнае афармленне даюць магчымасць сцвярджаць, што ў яго аснове ляжыць жывая гутарковая мова. «Літаратурная апрацаванасць» мінімальная. Дакумент не ўяўляе сабой змястоўна і моўна прадуманага тэксту з паслядоўнасцю тэматычных адзінак. Найбольш верагодна, тэкст прадыктаваны і запісаны ў эмацыянальным стане пасля невядомых нам падзей у гандлёвых зносінах і ўзнікшай у сувязі з гэтым неабходнасці звароту да рыжскага магістрата. Дакумент не мае такой часткі, якую б можна было назваць загалоўкам ці назвай. «Назва» ўключана ў тэкст, у першы радок дагавора: «*Тако хочемъ мы горожане с мѣ҃ститеремъ:*…». Далей адап-

таваная перадача тэксту ў К.Э. Напіерскага і А.Л. Харашкевіч разыходзіцца. К.Э. Напіерскі перадае тэкст, як «*переже, како в҃сіті воскъ на скалвах…*». А.Л. Харашкевіч – «*переже каково / в҃сіті воскъ на скалвахъ…*». Адсутнасць коскі і форма займенніка ў другім выпадку вядуць да іншага прачытання фразы. Параўнанне з арыгіналам дае магчымасць сцвярджаць памылковасць перадачы тэксту ў выданні А.Л. Харашкевіч. Але і ў адносінах да выдання К.Э. Напіерскага можна гаварыць аб дыскусійнасці перадачы гэтай фразы. Пастаўленая пасля *переже* коска патрабуе перакладу: «*Па-першае, як узвешваць воск на вагах*». Без коскі (ясна, што ў арыгінале яе няма) сказ мае іншае значэнне: «*Перш чым узвешваць воск на вагах*». У пісаўшага і дыктаваўшага, зразумела, такога розначытання не было. Але форма выкладання думкі (у тэксце гэта далёка не адзінкавы выпадак) сведчыць, што тэкст па свайму лексіка-сінтаксічнаму характару вельмі блізкі да гутарковай мовы, у якой лагічная паслядоўнасць, слоўная напоўненасць і сінтаксічная аформленасць не з'яўляюцца прынцыпова запатрабаванымі. Літаратурна-пісьмовая традыцыя ў большай ступені выяўляецца хіба толькі ў сінтаксічных канструкцыях складаназлучанага сказа.

Такое меркаванне дае падставу бачыць у мове тэксту Дагавора жывую мову палачан пачатку (першай паловы) XIV стагоддзя.

А.С. Васілеўская (Мінск)

ТАПОНІМЫ Ў АПОВЕСЦІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА "ДЗІКАЕ ПАЛЯВАННЕ КАРАЛЯ СТАХА"

Разуменне мастацкага тэксту немагчыма без аналізу часу і прасторы, у якіх адбываецца дзеянне. Нярэдка сродкам стварэння хранатопу ў творы становяцца тапонімы [1]. Асабліва выразна такая функцыя геаграфічных назваў выяўляецца ў гістарычных творах. Не з'яўляецца выключэннем аповесць У. Караткевіча "Дзікае паляванне караля Стаха", у якой ужываецца каля 50 розных геаграфічных назваў. Так, адзін з найбольш частотных тапонімаў у тэксце – назва ***Беларусь*** (намі налічана 11 ужыванняў) – дазваляе акрэсліць месца дзеяння: *Наступны дзень быў звычайным шэрым днём, якія часта бываюць увосень у* ***Беларусі*** [2, с. 29]. А ўжыванне ў творы назваў ***Расійская імперыя*** і ***Паўночна-Заходні край*** дае пэўнае ўяўленне пра час: *Гэта – дзействіе ўгалоўна наказуемае, іба акурат супярэчыць норавам нашага навакольля, а таксама і зводам законаў* ***імперыі Расійскай*** [2, с. 151]; ***Паўночна-Заходні край*** *як паняцце – фікцыя* [2, с. 169].

Асаблівасцю гэтай аповесці, як і іншых твораў У. Караткевіча, з'яўляецца тое, што яе нельга цалкам аднесці да гістарычнага жанру. Сам пісьменнік казаў: "Стапрацэнтных гістарычных твораў у мяне няма… Мяне цікавіць не гісторыя-сапраўднасць, а гісторыя-анекдот, гісторыя-

прытча” [3, с. 146]. На думку даследчыкаў, У. Караткевіч “не апісвае вяршынныя падзеі, не партрэтызуе праслаўленых асоб. Наадварот, ён чэрпае матэрыял, яўна пабочны, з легенд, старых хронік і народных паданняў. Невядомыя, як правіла, выдуманыя героі і падзеі з глухіх, перыферыйных закуткаў служаць яму сыравінай, з якой ён стварае тыпы і выклікае ўяўленне духу беларускай народнай гісторыі” [3, с. 189–190].

Асаблівасць адлюстравання падзей, а таксама жанр гістарычнага дэтэктыва істотна ўплываюць на тапанімічную прастору аповесці.

Традыцыйна ў працах, прысвечаных тапанімікону мастацкага твора, геаграфічныя назвы размяжоўваюцца на рэальныя і нерэальныя. У аповесці неаднаразова ўжываюцца назвы рэальных геаграфічных аб’ектаў: ***Вільня, Койданава, Крычаў, Мінск*** і інш. Разам з тым у творы выкарыстаны айконімы і мікратапонімы тыпу ***Жабічы, Ліпічна, Дубрава*** і пад., якія адпавядаюць тапанімічнай сістэме Беларусі, таму падаецца верагодным існаванне такіх тапонімаў у “глухіх, перыферыйных закутках” нашай краіны.

Ядро тапанімічнай прасторы аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” складаюць уласныя імёны, якія непасрэдна апісваюць месца дзеяння. Варта адзначыць, што месца на карце, дзе знаходзяцца Балотныя Яліны, акрэслена дастаткова агульна: *Я ехаў з губернскага горада* ***М.*** *у самы глухі куток губерні...* [2, с. 6], *Такі быў той час, калі я ехаў на экспедыцыю ў глухі* ***Н-скі*** *павет губерні* [2, с. 9]. Аднак сама тапаграфія месца дзеяння выпісана вельмі дакладна: ***Балотныя Яліны, Волатава прорва, Яноўская пушча*** і інш.: – *Вы ў маёнтку* ***Балотныя Яліны*** [2, с. 18]; *Я ішоў краем* ***Волатавай прорвы****, і воку літаральна не было на чым адпачыць* [2, с. 107]; *Наступнага дня я ішоў са Свеціловічам да невялікага ласнога востраваля* ***Яноўскай пушчы*** [2, с. 123].

Практычна ўсе гэтыя назвы двухкампанентныя паводле структуры: утвараюцца з агульнага назоўніка і прыметніка: ***Халодная лагчына, Хаданоўская пушча, Ведзьмакова ступа:*** *Вырашылі, што Рыгор будзе сённяшняй ноччу сядзець у* ***Халоднай лагчыне…*** [2, с. 127]; *Тут, у* ***Хаданоўскай пушчы****, сядзеў кульгавы бацька Яраш Штамет…* [2, с. 43]; – *Ля Халоднай лагчыны, дзе ляжыць камень,* ***Ведзьмакова ступа*** [2, с. 126].

Тапонімы з’яўляюцца матываванымі, ствараюць дакладныя прасторавыя арыенціры, каб дакладна, прадметна апісаць месца дзеяння, што вельмі важна для раскрыцця загадкі дзікага палявання. Адначасова назвы тыпу ***Халодная лагчына, Ведзьмакова ступа*** дазваляюць аўтару стварыць таямнічы і міфічны фон для незвычайных падзей аповесці.

Назвы, што знаходзяцца на перыферыі тапанімічнай прасторы аповесці, выконваюць самыя разнастайныя функцыі, якія не абмяжоўваюцца задачамі акрэслення месца і часу.

Так, ужыванне назваў геаграфічных аб’ектаў, якія знаходзяцца на тэрыторыі Беларусі, дазваляюць перадаць любоў галоўнага героя да сваёй зямлі, выказаць адносіны да таго, што адбываецца на радзіме: *Гэта была*

візантыйская ***Беларусь*** [2, с. 8]; *Няшчасная* ***Беларусь!*** *Добры, памяркоўны, рамантычны народ у руках такой поскудзі* [2, с. 72]; *Можа, цёплыя агні вёсак, назвы якіх і дагэтуль нейкім цёплым болем уваходзяць у маё сэрца:* ***Ліпічна, Сорак Татар, Бярозава Воля,*** *урочышча* ***Разбіты Рог, Памярэч, Дубрава, Вавёркі?*** [2, с. 8].

З розным функцыянальным прызначэннем выкарыстоўваюцца ў тэксце назвы іншых краін і гарадоў. Напрыклад, яны дазваляюць стварыць кантраст паміж неабсяжнай прасторай свету і маленькім абсягам Балотных Ялін: *– Скажыце, гэта вялікія гарады,* ***Вільня*** *і* ***Мінск?*** *– Даволі вялікія. Але* ***Масква, Пецярбург*** *большыя. – А што, там таксама людзям нядобра ўночы?* [2, с. 27].

Тапонімы становяцца сродкамі стварэння іроніі: *Размаўляла дама з самым сапраўдным французскім прапонсам, які, як вядома, захаваўся на зямлі толькі ў дзвюх мясцінах: у салонах* ***Парыжа*** *і ў засценку* ***Кабыляны*** *пад* ***Оршай*** [2, с. 56]. Іранічны эфект дасягаецца ўвядзеннем у адзін кантэкст назваў ***Парыж*** і ***Кабыляны***.

Сустракаецца ў тэксце і такі стылістычны прыём, як антанамазія – замена агульнага імя ўласным: *І ўсё ж нават гэта было* ***Італіяй*** *у параўнанні з тым, што мы пабачылі праз два дні* [2, с. 11]. У кантэксце назва краіны абазначае светлы сонечны край.

Уласныя геаграфічныя назвы выступаюць сродкамі стварэння падтэксту: *Прапаведавалі б нам гэтую тэорыю да пачатку гэтага стагоддзя – абавязкова б Беларусь перашыбла* ***Германію****, а беларусы зрабіліся б першымі гвалтаўнікамі на зямлі і пайшлі б адваёўваць у рускіх, якія не сапраўды рускія, жыццёвы абшар, асабліва яшчэ калі б добры Божачка даў нам рогі* [2, с. 7]. Разуменне гэтага сказа немагчыма без ведання гісторыі Германіі XIX ст., часу, калі гэтая краіна ператвараецца ў магутную ваяўнічую дзяржаву.

Уяўленне пра далейшы лёс галоўнага героя дае наступны сказ: *Нам было добра паўсюль, нават у* ***Сібіры****, куды я трапіў у 1902 годзе* [2, с. 197]. Увядзенне тапоніма ***Сібір*** дае магчымасць меркаваць пра ссылку, якую адбыў Андрэй Беларэцкі.

Такім чынам, тапонімы ў аповесці “Дзікае паляванне караля Стаха” дазваляюць не толькі акрэсліць прастору і час, у якіх адбываецца дзеянне, але і арганічна ўваходзяць у вобразную сістэму твора, цесна звязваюцца з жанрам і сюжэтам тэксту, перадаюць як фактычную, так канцэптуальную і падтэкставую інфармацыю.

Літаратура

1. Имя собственное в художественном тексте: учеб.-метод. пособие / автор-составитель А.Н. Деревяго. – Витебск: УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2008. – 195 с.

2. Караткевіч, У. Дзікае паляванне караля Стаха / У. Караткевіч // Збор твораў: у 8 т. Т. 7. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – С. 5 – 197.

3. Мальдзіс, А. Жыццё і ўзнясенне Уладзіміра Караткевіча: партрэт пісьменніка і чалавека / А. Мальдзіс. – Мінск: Мастацкая літаратура, 1990. – 230 с.

В.У. Гарнак (Віцебск)

АСАБЛІВАСЦІ МАЎЛЕННЯ ЖЫХАРОЎ ВІЦЕБСКА Ў ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XIX СТАГОДДЗЯ (ПАВОДЛЕ ЎСПАМІНАЎ МАКСІМІЛІЯНА МАРКСА)

Максіміліян Восіпавіч Маркс нарадзіўся 19 (7) кастрычніка 1816 года ў Віцебску. Пасля заканчэння Віцебскай гімназіі (1834) вучыўся ў Маскоўскім універсітэце. Потым вярнуўся ў родны горад над Дзвіной. У 50–60-я гг. настаўнічаў у Смаленску, выкладаў у 4-й гімназіі Масквы. У 1866 годзе па справе Д.У. Каракозава (замах на цара Аляксандра II) і за актыўны ўдзел у польскай рэвалюцыйнай арганізацыі сасланы ў Сібір на пажыццёвае пасяленне. Доўгі час наш зямляк жыў у Енісейску, дзе і памёр у 1893 годзе.

У 1887–1888 гг. М. Маркс напісаў успаміны “Запіскі старога” («Записки старика») [1], а таксама некалькі артыкулаў мемуарнага характару [2; 3].

Як сведчыць Максіміліян Восіпавіч Маркс, на вуліцах Віцебска ў пачатку XIX стагоддзя можна было лёгка пачуць беларускую, польскую, рускую і яўрэйскую мовы. Але царская ўлада мэтанакіравана разбурала гэта даволі мірнае суіснаванне культур і ў выніку зрабіла так, што недзе ў 1840-я гады ўжо *не было такога багацця народнасцяў, саслоўяў, касцюмаў, гутарковай мовы – усё гэта цяпер змылась, згладзілась і сцёрлась у нейкую аднастайнасць* [1, 1995, с. 74].

Вышэйшыя чыноўнікі горада Віцебска (губернатар, віцэ-губернатар, паліцмайстар, паштмайстар, дырэктар гімназіі, розныя дарадцы і г. д.) былі рускія, размаўлялі, натуральна, на сваёй роднай мове.

Дваранства, у першую чаргу памешчыкі, складалася з дзвюх секцый: польскай (пераважна каталіцкай) і рускай (у асноўным праваслаўнай). Да першай групы, якая была даволі значнай, належалі землеўладальнікі з польскімі прозвішчамі. Усе яны, як заўважае мемуарыст, былі ў асноўным выпускнікамі Віленскага ўніверсітэта, прыхільнікамі апошняга караля Рэчы Паспалітай. Руская секцыя складалася з уласнікаў, якія атрымалі маёмасць пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай. Такім чынам, буйныя і сярэднія землеўладальнікі карысталіся звычайна альбо польскай, альбо рускай мовай [1, 1995, с. 75].

Дробная шляхта і чыншавікі паміж сабой размаўлялі звычайна па-беларуску, але ім хацелася больш ужываць польскую мову. У прыватнасці, М. Маркс піша: *Яны думалі, што беларускае слова, вымаўленае “ў нос” з прыбаўкай гука “ж” пасля “р”, зробіцца польскім, і таму pies siedzi na progu вымаўлялі:“ Пенс сендзі на пржогу”* [1, 1996, с. 97]. У выніку атрымлівалася своеасаблівая беларуска-польская “трасянка".

У “Запісках старога”, на жаль, маецца толькі адзін прыклад беларускага маўлення. Гэта галашэнне беларускай вясковай жанчыны. Вось як гэты маленькі ўрывак занатаваў мемуарыст:

“Авой, авой, дзяцюк ты мой!

Не на радосць, не к счасцью ты родзився!” [3, 1997, с. 138].

Паводле ўспамінаў М.Маркса, вынікае, што ў Віцебску першай паловы XIX стагоддзя было даволі шмат аматараў беларушчыны. І сам Максіміліян у маладыя гады ўваходзіў у гурток прыхільнікаў беларускай мовы і культуры. Каштоўнымі і цікавымі з’яўляюцца артыкулы М. Маркса, якія апісаў і часткова надрукаваў прафесар Львоўскага ўніверсітэта Вільгельм Брухнальскі (1859-1938), «Emilia Platerówna jako folklorystka» [2] і «Z pamiętnika M. Marksa Witebscanina» [3].

Успаміны, якія былі апублікаваныя ў 1922 годзе, складаюцца з 6 невялікіх частак [3]. Максіміліян Восіпавіч сабраў цікавы матэрыял пра адзенне віцебскіх мяшчан (беларусаў, яўрэяў), забавы і танцы простых гараджан [3, с. 136–139].

Мемуарыст расказаў пра Піліпа Смурага і Уласа – вядомых у 30-40-я гады XIX стагоддзя гутарніках. Запісаў і ўнікальны “Rodowod Białoruski” [3, с. 139–144].

Аўтар успамінаў з душэўнай цеплынёй піша пра сваіх землякоў – віцебскіх аматараў беларушчыны. Сярод самых адметных прадстаўнікоў фальклярыстыкі мемуарыст узгадвае Э. Плятэр (1806 – 1831) [2; 3, с. 147]. Не пакінуў без увагі Максіміліян Восіпавіч і постаць таленавітага паэта Тадэвуша Лады-Заблоцкага (1811–1847) [3, с. 147]. Сярод названых Марксам пачынальнікаў фальклярыстыкі на Віцебшчыне – Цвяцінскі, Аляксандр Зброжак (Зброжка), Станіслаў Маркіянавіч [3, с. 147]. Звестак пра іх, на жаль, вельмі мала. Ёсць інфармацыя аб тым, што Аляксандр Зброжак родам з Віцебшчыны, а Станіслаў Маркіянавіч – выпускнік віцебскай гімназіі. Абодва падазраваліся ва ўдзеле ў паўстанні 1831 года [4, с. 421, 431].

Як піша Маркс, маўленню віцяблян было характэрна тое, што яны канцавы t (т) у дзеясловах змякчалі на č (ц’), не маглі змякчыць [р]. Напрыклад: *пішуць, будуць* замест *пішут, будут; зара, рад* замест *заря, ряд.* Адзначае мемуарыст і такую асаблівасць беларускай мовы, як наяўнасць [ў]. Віцяблянін называе гэты гук *u krotkie (v)* [3, с. 153]. Такім чынам, для вымаўлення жыхароў Віцебска першай паловы XIX стагоддзя ў сферы зычных, паводле М.В. Маркса, характэрна:

1) афрыката [дз’] мяккая і вымаўляецца як адзін гук;

2) наяўнасць мяккай афрыкаты [ц’];

3) гук [р] заўсёды цвёрды;

4) наяўнасць губна-губнога [ў].

Успаміны і назіранні Масіміліяна Восіпавіча Маркса сёння цікавыя і неабходныя лінгвістам, літаратуразнаўцам, этнографам і фальклярыстам.

Літаратура

1. Маркс, Максимилиан. Записки старика // Віцебскі сшытак. – 1995. – № 1. – С. 74 –77; 1996. – № 2. – С. 87 –102; 1997. – № 3. – С. 137–147.

2. Bruchnalski, Wilhelm. Emilia Platerówna jako folklorystka / Wilhelm Bruchnalski // Lud. – 1906. – Tom XII. – S. 183–197.

3 Bruchnalski, Wilhelm. Z pamiętnika M. Marksa Witebscanina / Wilhelm Bruchnalski // Lud. – 1922. – Tom XXI. – S. 136–153.

4. Каліноўскі, К. За нашую вольнасць. Творы, дакументы / Уклад., прадм., пасляcл. і камент. Г.В. Кісялёва. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1999. – 464 с. (Серыя 2. Гісторыка-літаратурныя помнікі).

У.М. Генкін (Віцебск)

ЛАНДШАФТНЫЯ ПРЫЯРЫТЭТЫ Ў АЙКАНІМІІ ВІЦЕБШЧЫНЫ

Слова “ландшафт”, якое мае нямецкае паходжанне (корань *land* – зямля + *schaft* – суфікс, што перадае значэнне ўзаемасувязі, узаемазалежнасці) і ў мове-крыніцы літаральна азначае “аблічча краю”, у сучасных гуманітарных навуках усё часцей выкарыстоўваецца ў якасці тэрміна і набывае новыя дэфініцыі. У сувязі з гэтым узнікае неабходнасць удакладніць, што мы будзем ужываць гэтае паняцце ў яго першасным, геаграфічным разуменні. Геаграфічны ландшафт – гэта аднародная па паходжанні і развіцці тэрыторыя з уласцівымі ёй прыроднымі рэсурсамі. Да ландшафту адносяцца рэльеф мясцовасці, шматлікія прыродныя, а таксама створаныя чалавекам аб’екты.

Даследчыкі-анамасты неаднаразова падкрэслівалі ролю ландшафту ў фарміраванні тапанімічнай сістэмы рэгіёнаў. “Паходжанне некаторых геаграфічных назваў звязана з асаблівасцямі геаграфічнага асяроддзя: у назвах у той ці іншай меры адлюстроўваецца характар мясцовасці”, – піша вядомы беларускі географ-тапаніміст В.А. Жучкевіч [1, с. 27]. Аўтар цытаты ўжывае займеннік “некаторыя”, верагодна, маючы на ўвазе адносна невялікую колькасць такіх назваў, што вельмі характэрна для сучаснай тапанімічнай сістэмы з яе пераважна антрапацэнтрычным падыходам да працэсу намінацыі. У старажытнай тапаніміі адсоткавыя суадносіны паміж ландшафтнымі і антрапацэнтрычнымі назвамі былі іншымі. Чалавек існаваў сярод прыроднага асяроддзя, сам быў яго арганічнай часткай, шматлікія ландшафтныя аб’екты традыцыйна служылі чалавеку арыенцірамі ў прасторы, а іх назвы актыўна выступалі ў якасці матывавальных асноў для тапонімаў. Вялікую ролю адыгралі ландшафтныя “прывязкі” ў фарміраванні рэгіянальнай тапанімічнай сістэмы, шмат у чым дзякуючы ім тапанімія рэгіёна не зрабілася нейкім наборам асобных назваў, а набыла сістэмны характар.

Відавочна, кожны рэгіён мае свае ландшафтныя прыярытэты – гэта абумоўлена прыроднымі асаблівасцямі, кліматам, адносінамі да пэўнай

геаграфічнай зоны, характарам глебы, расліннасці, распаўсюджаннем тых або іншых прыродных аб'ектаў, спецыфікай гаспадарчай дзейнасці і г.д.

Амаль што ўся тэрыторыя сучаснай Віцебшчыны адносіцца да рэгіёна, які носіць выразную назву – Беларускае Паазер'е. Геаграфічныя крыніцы вызначаюць гэты рэгіён як правінцыю (геаграфічны тэрмін) азёрна-ледніковых, марэнна-азёрных і ўзгорыста-марэнна-азёрных ландшафтаў. Няцяжка заўважыць, што ў назве кожнага з трох пералічаных відаў ландшафту прысутнічае прыметнік "азёрны". Менавіта азёры, колькасць якіх у Беларускім Паазер'і значна перавышае лічбу ў 2000 адзінак, разам з іншымі воднымі аб'ектамі з'яўляюцца галоўным ландшафтным прыярытэтам у тапаніміі рэгіёна. Рэкі і азёры спрадвеку выконвалі найважнейшую ролю ў жыцці чалавека: яны былі транспартнымі шляхамі (дастаткова нагадаць знакаміты шлях з варагаў у грэкі, частку якога ўяўляла сабой, у тым ліку, і галоўная рака Беларускага Паазер'я – Заходняя Дзвіна), крыніцамі здабычы ежы і неабходных для жыцця рэчаў, спрыялі вядзенню сельскай гаспадаркі і развіццю рамёстваў. Інакш кажучы, водныя аб'екты з глыбокай старажытнасці вызначалі асаблівасці гаспадарчага ўкладу, нацыянальна-культурных традыцый і ў выніку менталітэт жыхароў рэгіёна.

Сёння ў склад Віцебскай вобласці ўваходзіць 21 адміністрацыйны раён: Аршанскі (далей – Арш.), Бешанковіцкі (Беш.), Браслаўскі (Бр.), Верхнядзвінскі (Верх.), Віцебскі (Віц.), Гарадоцкі (Гар.), Глыбоцкі (Гл.), Докшыцкі (Док.), Дубровенскі (Дубр.), Лепельскі (Леп.), Лёзненскі (Лёз.), Мёрскі (Мёр.), Пастаўскі (Паст.), Полацкі (Пол.), Расонскі (Рас.), Сенненскі (Сен.), Талачынскі (Тал.), Ушацкі (Уш.), Чашніцкі (Чаш.), Шаркаўшчынскі (Шарк.), Шумілінскі (Шум.). Мы ўказваем адміністрацыйна-тэрытарыяльную прыналежнасць населеных пунктаў з мэтай паказаць шырокую распаўсюджанасць тых ці іншых тыпаў назваў і фактычную адсутнасць іх лакалізацыі на карце Віцебшчыны. Асноўнай крыніцай збору матэрыялу стаў нарматыўны даведнік "Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцебская вобласць" [2].

Азёры сустракаюцца па ўсёй тэрыторыі Віцебшчыны, але нераўнамерна. Большая іх частка сканцэнтравана на паўночным захадзе, пры гэтым у большасці раёнаў ёсць назвы населеных пунктаў, матываваныя лексемай *возера* і яе вытворнымі: *Азярок* (Арш.), *Паўазер'е* (Беш.), *Азярава, Азяраўцы* (Бр.); *Азернікі* (Верх.), *Падазер'е, Падазерцы* (Пол.), *Азёрная* (Рас.), *Абузер'е* (Чаш.), *Новая Заазер'е* (Тал.) і г. д. Некаторыя айконімы з гэтым коранем сустракаюцца неаднойчы. Самай распаўсюджанай сярод іх з'яўляецца назва *Заазер'е*, якую носяць 13 паселішчаў у 8 раёнах. Наогул трэба зазначыць, што канфіксальная мадэль за- + j адносіцца да ліку прыярытэтных у групе айконімаў з прасторавым значэннем. Менавіта такія назвы характарызуюцца найбольш частай паўтаральнасцю. 5 населеных пунктаў называюцца *Азёркі* (Беш., Гл.,

Паст., 2 – Гар.). Двойчы на сучаснай карце сустракаюцца назвы *Заазерцы* (Мёр., Шарк.), *Заазёрная* (Гл., Леп.), *Надазер'е* (Гл., Леп.). Паказальна, што сярод гэтых айконімаў ёсць і новыя, штучныя: вёска *Заазёрная* Глыбоцкага раёна да 1964 года мела назву *Драчына*.

Шматлікія айконімы рэгіёна суадносяцца не толькі з апелятывам *возера* і яго вытворнымі, але і з лімнонімамі, якія, па нашым меркаванні, у сэнсавых адносінах нельга адрываць ад папярэдняй групы. Больш таго, развітая лімнанімічная сістэма не менш ярка сведчыць пра ролю азёр і ў жыцці, і ў айканіміі. З словаўтваральнага пункту гледжання тут выяўляюцца два тыпы назваў:

1) утвораныя лексіка-семантычным спосабам: вёс. *Гародна* ← воз. *Гародна*, вёс. *Паўазер'е* ← воз. *Паўазер'е*, вёс. *Бікложа* ← рака і воз. *Бікложа* (Беш.), вёс. *Войса* ← воз. *Войса* (Бр.), пгт. *Езярышча* ← воз. *Езярышча* (Гар.), *г. Глыбокае* ← воз. *Глыбокае* (Гл.), вёс. *Вымна* ← воз. *Вымна* (Віц.), вёс. *Крывое* ← воз. *Крывое*, *Лучай* ← воз. *Лучай* (Паст.);

2) афіксальныя ўтварэнні: вёс. *Заплюшчына* ← воз. *Плюсы*, вёс. *Падмуйса* ← *воз. Муйса*, вёс. *Паснуддзе* ← воз. *Снуды* (Бр.), пгт. *Расоны* ← воз. *Расона*, *вёс. Завячэлле* ← воз. *Вечалле*, вёс. *Пад'язна* ← воз. *Язна* (Уш.) і інш. Як бачна з прыкладаў, сярод назваў другой групы ёсць айконімы флексійнага ўтварэння.

Шэраг айконімаў Віцебшчыны ў якасці ўтваральных асноў выкарыстоўвае апелятыў *рака* і разнастайныя патамонімы. Характар дэрыватыўных сувязей паміж гэтымі лексемамі і айконімамі такі ж, як паміж лімнонімамі і айконімамі: *Віцебск* ← р. *Віцьба*, *Двор Павулле* ← р. *Ула* (Уш.), *Двор Узрэчча* (Гл.), *Двурэчча, Узрэчча* (Беш.), *Зарачча* (Бр.), *Зарэцкія* (Мёр., Паст.), *Зарэчная* (Чаш.), *Зарэчнае Падбярэззе* (Тал.), *Зарэчная Слабада* (Чаш.), *Каспляны* ← р. *Каспля* (Віц.), *Рачныя* (Док.), *Рэчыца* (Пол.), *Падзсенныя Чарэмушнікі* (Паст.) ← р. *Дзісна*, *Полацк* ← р. *Палата*, *Прыдзвінне*, *Ушачы* ← р. *Ушача* і г. д. Самым распаўсюджаным з'яўляецца айконім *Зарэчча*: ён сустракаецца на карце сучаснай Віцебшчыны 14 разоў (Арш., Беш., Бр., Віц., Гар. – 3, Рас., Тал. – 2, Уш., Шарк. – 2, Шум.). Назву *Парэчча* маюць 9 населеных пунктаў (Арш., Віц., Гл., Док., Леп., Рас., Сен., Тал., Шарк.), *Рэчкі* – 5 населеных пунктаў (Лёз., 2 – Сен., Тал., Шарк.). Да прыведзеных прыкладаў можна дадаць айконім *Вусце* (6 паселішчаў: Арш., Бр. – 2, Верх., Гар. Дубр.): вусце – месца ўпадзення ракі ў іншы вадаём, месца ніжняй плыні ракі. З азёрамі і рэкамі ўскосна звязаны назвы населеных пунктаў *Дабраплёсы* (Верх.), *Дабраплесаўскі* (Рас.) і т. п.

Нізінныя формы рэльефу і значная колькасць рэк і азёраў садзейнічалі фарміраванню шматлікіх балот на тэрыторыі рэгіёна. Балоты, якія напачатку ўспрымаліся чалавекам як нешта таямнічае і небяспечнае, з цягам часу сталі таксама патрэбнымі і неабходнымі прыроднымі аб'ектамі для патрэбаў жыцця. "Балотныя" назвы (да іх можна аднесці

тыя, што ўтвораны непасрэдна ад лексемы “балота”, сумежных з ёй па сэнсе слоў і ад гелонімаў) таксама шырока адлюстраваны ў айканіміі Віцебшчыны, прычым некаторыя з іх характарызуюцца частай паўтаральнасцю: па 10 населеных пунктаў маюць назвы *Забалацце* (Арш., Беш., Леп. – 2, Лёз., Мёр., Паст., Тал. – 2, Уш.) і *Забалоцце* (Бр., Гл. – 3, Мёр. – 2, Пол. – 2, Рас., Уш.). Іншыя назвы гэтай групы: *Балотнікі* (Леп., Шарк.), *Балотавічы* (Арш.), *Балоціна* (Верх.), *Балотніца* (Гар.), *Вялікае Балота* (Рас.), *Заблацішкі* (Бр.), *Забалоцінка* (Віц.) і г. д. Да групы “балотных” назваў лагічна аднесці і распаўсюджаныя ў рэгіёне айконімы з коранем *мох*: *Барсучы Мох* (Паст.), *Гараднянскі Мох* (Віц.), *Замошша* (23 паселішчы: Беш., Бр., Верх., Гл. – 2; Док. – 2; Леп., Лёз., Пол. – 3, Рас., Сен. – 2, Тал. – 4, Уш. – 2, Чаш. – 2), *Замхава* (Гл. – 2), *Замхі* (Пол.), *Замшаны* (Верх.), *Замшына* (Лёз.), *Падомхі* (Док.), *Чумачоў Мох* (Віц.) і інш. Звычайна каля балот узнікалі *рудні* – невялікія прадпрыемствы па выплаўцы жалеза. Апелятыў “рудня” з цягам часу страціў першаснае значэнне і сёння больш вядомы як айконім – на Віцебшчыне такую назву маюць 9 населеных пунктаў (Верх., Гар., Леп., Мёр., Пол. – 2, Рас. – 2, Тал.). Балоты – гэта таксама месцы здабычы торфу, таму семантычна да гэтай групы падыходзіць і айконім *Асінторф* (Дубр.).

Азёры, рэкі і балоты – гэта часцей за ўсё буйныя ці сярэднія па велічыні водныя аб’екты, разам з імі існуюць шматлікія невялічкія вадаёмы “лакальнага” значэння, якія таксама адыгралі сваю ролю ў фарміраванні тапанімічнай сістэмы. Ад лексемы *пруд* паходзяць назвы *Запруддзе* (8 паселішчаў: Бр. – 2, Віц., Гл., Сен., Тал., Чаш., Шарк.), *Пруд* (Гар.), *Прудаўё* (Гл.), *Прудзец* (2 населеныя пункты ў Талачынскім раёне), *Прудзінка* (Бр.), *Прудзінкі* (Верх.), *Прудзіны* (Беш.), *Прудзішча* (Док.), *Пруднікі* (6 паселішчаў: Вц. – 2, Гар., Док., Мёр., Паст.), *Прудняны* (Гар.), *Прудок* (9 населеных пунктаў: Гар. – 5, Леп., Пол., Рас., Уш.), *Прудцы* (Тал.), *Пруды* (Мёр., Уш.). Апелятыў *ручэй* паслужыў базай для фарміравання айконімаў *Заручэўе* (Беш., Шум.), *Ручай* (Шарк.), Чарнаручча (7 паселішчаў: Леп., Лёз., Пол. – 3, Тал., Уш.).

Чым больш вадаёмаў, забалочаных месцаў, тым узнікае большая неабходнасць у шляхах зносін паміж населенымі пунктамі, а таксама паміж паселішчамі і іншымі аб’ектамі гаспадарчай дзейнасці. Такім чынам, водная спецыфіка ландшафту абумовіла развіццё гэтых шляхоў, а іх назвы з часам перайшлі ў айканімію ў якасці матывавальных асноў. Для тапаніміі Віцебшчыны найбольш характэрны назвы з каранямі *брод* (мелкае месца на ўсю шырыню ракі, возера, праз якое можна пераходзіць, пераязджаць, а таксама пераход, пераезд у гэтым месцы), *гаць* (насціл з бярвення ці галля для праезду, праходу праз балота або топкае месца): *Брадок* (Док.), *Брод* (Гл.), *Броды* (Беш.), *Заброддзе* (Паст.), *Пераброддзе* (Мёр.), *Гаці* (Гар.), *Гацькаўшчына* (Арш.), *Загацце* (Док., Пол., Тал.) і некаторыя іншыя. Чатыры населеныя пункты маюць

назву *Перавоз* (Віц., Гл., Рас.), у тым ліку айконім *Барвін-Перавоз* (Віц. – сёння ў афіцыйных крыніцах падаецца як *Барвін*). У Браслаўскім раёне ёсць вёска *Перавалока* (перавалока, валок – месца найбольшага збліжэння двух суднаходных рэк ці азёраў, па якіх у даўніну перацягвалі, “валачылі” судны і грузы).

Як ужо вышэй адзначалася, вадаёмы заўсёды адыгрывалі вялікую ролю ў жыцці чалавека, уяўленні якога аб навакольным свеце, рэлігійныя погляды, штодзённае жыццё – усё так ці інакш было звязана з вадой. Нам падаецца лагічным і мэтазгодным далучыць да айконімаў, якія непасрэдна ўтвораны ад назваў водных аб’ектаў, яшчэ і тыя, што маюць апасродкаваную “водную” матывацыю. Такім чынам група пашырыцца, напрыклад, за кошт тапонімаў, якія адлюстроўваюць распаўсюджанасць рыбалоўства ў рэгіёне і актуальнасць прафесіі рыбака для мясцовых жыхароў: *Рыбакі* (Віц. – 2, Мёр., Пол., Уш.), *Рыбалтова* (Дубр.), *Рыбачкі* (Мёр.), *Рыбнае* (Сен.), *Рыбнае* (Сен.), Рыбчаны (Паст.), *Рыбчына* (Шум.).

Яшчэ адным важным элементам рэльефу Віцебшчыны, які аказаў уплыў на тапанімію, з’яўляюцца лясныя масівы. Айконімы, вытворныя ад лексемы “лес” і відавых назваў лесу, а таксама назваў дрэў, дастаткова распаўсюджаны на тэрыторыі рэгіёна. Найбольш частотныя назвы гэтага тыпу – айконімы з каранямі:

1) “лес”: *Залесная* (Гл.), *Залесныя* (Бр.), *Залессе* (Бр. – 2, Верх., Гл. – 2, Леп. – 2, Лёз., Пол. – 4, Рас., Чаш., Шарк., Шум.), *Залеські* (Гл.), *Лесава* (Пол.), *Лескавічы* (Шум.), *Леснікі* (Гл., Сен.), *Леснікова* (Верх., Сен.), *Лясны* (Арш.), *Ляснічыя* (Арш.), *Лясныя Азёры* (Уш.) і *Лясныя Муляры* (Паст.), *Трылесіна* (Чаш.);

2) “бор”: *Баравыя Шакелі* (Бр., мясцовая назва – *Баравыя*), *Баркі* (7 паселішчаў: Бр., Гар. – 2, Мёр., Пол., Чаш., Шум.), *Барок* (Сен., Чаш., Шарк.), *Бароўка* (Верх., Леп. – 2), *Бор* (5 населеных пунктаў: Леп., Лёз., Мёр., Сен., Чаш.), *Бораўна* (Леп.), *Бор-Паляна* (Мёр.), *Даўгабор’е* (Рас.), *Забораўна* (Уш.), *Забор’е* (17 паселішчаў: Беш., Бр. – 2, Верх. – 2, Гар., Гл., Док., Леп., Мёр. – 2, Рас. – 2, Сен., Чаш., Шарк., Шум.), *Заборныя Гумны* (Бр.), *Заборцы* (Гл., Док., Мёр.), *Нізкабор’е* (Віц.), *Конны Бор*, *Сухі Бор* (Пол.), *Саўскі Бор* (Леп.), *Сасновы Бор* (Рас.);

3) “дуб”: *Белая Дуброва* (Чаш.), *Дубавік* (Док.), *Дубавое* (Арш., Док., Тал. – 2, Шарк.), *Дубікава* (Гар.), *Дубіна* (Бр.), *Дубінец* (Уш.), *Дубкі* (Беш., Бр., Сен.), *Дубнікі* (Шарк.), *Дубніцы* (Арш.), *Дубнякі* (Пол., Сен.), *Дубовікі* (Рас., Шум.), *Дубовы Лог* (Чаш.), *Дубоўка* (Мёр. – 2, Пол., Шарк. – 2), *Дубоўшчына* (Гл.), *Дубрава* (Верх., Гар.), *Дубрáва* (Шум.), *Дубраўка* (Арш. – 2, Бр., Беш., Док. – 2, Пол., Уш.), *Дубраўкі* (Гар.), *Дубраўскае* (Шум.), Дуброва (Беш., Мёр., Паст., Чаш.), *Дубровіна* (Тал.), *Дубровіцы* (Чаш.), *Дубровы* (Верх.), *Дуброўка* (Лёз.), *Дуброўкі* (Чаш.),

Дуброўна (Дубр., Пол.), *Дуброўскія* (Тал.), *Дуброўшчына* (Паст.), *Дубы* (Верх.), *Задуброўе* (Віц.), *Савін Дуб* (Леп.).

Радзей сустракаюцца тапонімы, суадносныя з назвамі такіх дрэў, як бяроза, ліпа, яліна, сасна, і з назвамі бярозавых, ліпавых, сасновых і яловых лясоў: *Беразнякі* (Гар.), *Беразіно* (Док. – назва прыйшла праз гідранімію), *Беразнякі* (Гар.), *Беразнянка* (Шарк.), *Беразова* (Мёр.), *Падбярэззе* (Віц., Тал.); *Ліпава* (Гл., Мёр., Шарк.) *Ліпавая* (Пол.), *Ліпавец* (Уш., Чаш.), *Ліпаўкі* (Верх., Док., Уш.), *Ліпаўцы* (Віц.), *Ліплянск* (Сен.), *Ліпляні* (Гл.), *Ліпна* (Мёр., Сен.), *Лі́пнікі* (Паст., Шум.), *Ліпнікі́* (Док.), *Ліпніцы* (Мёр.), *Ліпск* (Док.), *Малыя Ліпнікі* (Тал.), *Сасновая* (Док.), *Сасновая Наспа* (Лёз.), *Сасновы Бор* (Рас.), *Сасноўка* (Арш., Віц., Гл., Пол.), *Сасноўцы* (Верх., Шарк.), *Сасноўцы* (Паст.), *Саснягі* (Леп.), *Саснякі* (Тал.), *Сасняны* (Беш.); *Еліна* (Арш.), *Ельна* (Мёр.), *Ельня* (Бр.), *Ельнякі* (Паст.), *Харошая Ель* (Док.).

Яшчэ меншай частотнасцю вызначаюцца айконімы, суадносныя з назвамі іншых дрэў: асіна – *Асінаўка* (Арш., Беш. – 2, Бр., Віц. – 2, Гл., Док., Дубр., Сен. – 2, Уш., Шарк.); *Асінаўшчына* (Док.), *Асінгарадок* (Паст.), *Асіннікі* (Док., Паст., Рас.); лаза – Лазовікі (Гл., Паст., Шарк.), Лазовы (Верх.), Лазоўка (Бр., Сен., Уш., Шарк.). Тры айконімы, якія з'яўляюцца назвамі чатырох населеных пунктаў, маюць корань "клён": *Клёнаўка* (Гар.), *Кляны* (Дубр., Шарк.), *Клянкі* (Тал.); два айконімы былі ўтвораны ад лексемы "гай": *Гаёўка* (Мёр.), *Гаі* (Верх.).

Літаратура

1. Жучкевич, В.А. Общая топонимика / В.А. Жучкевич. – Минск: Вышэйшая школа, 1980. – 284 с.

2. Назвы населеных пунктаў Рэспублікі Беларусь: Віцебская вобласць: нарматыўны даведнік / [У.М. Генкін, І.Л. Капылоў, В.П. Лемцюгова]. – Мінск: Тэхналогія, 2009. – 668 с.

Т.А. Грачыха (Віцебск)

ФАНЕТЫЧНЫЯ І МАРФАЛАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ГАВОРАК ШУМІЛІНСКАГА РАЁНА

Даследаванне асаблівасцей беларускіх народных гаворак – актуальная праблема беларускай дыялекталогіі. Гаворкі Віцебшчыны патрабуюць далейшага вывучэння і ўдакладнення. Шумілінскі раён – адзін з паўночна-ўсходніх раёнаў Віцебскай вобласці, які мяжуе на ўсходзе з Гарадоцкім і Віцебскім раёнамі, на захадзе – з Полацкім і Ушацкім, на поўдні – з Бешанковіцкім раёнам. Гаворкі Шумілінскага раёна адносяцца да ўсходняй (віцебска-магілёўскай) групы паўночна-ўсходняга дыялекту і знаходзяцца на поўначы дадзенай групы гаворак.

Крыніцай для даследавання фанетычных і марфалагічных асаблівасцей гаворак Шумілінскага раёна паслужыў фактычны дыялектны матэрыял, сабраны на аснове рэгіянальных слоўнікаў [1; 2], а таксама ў палявых ўмовах пры праходжанні студэнцкай дыялекталагічнай практыкі ў вёсках Мішкавічы, Крывое Сяло, Непароты, якія размешчаны на поўдні дадзенага раёна.

На фанетычным узроўні ў даследаваных гаворках Шумілінскага раёна выяўляюцца рысы, уласцівыя беларускай літаратурнай мове. Напрыклад, пашырана дзеканне і цеканне: *цясютка, чапніць, бываець, дзіўчаты, сідзелі, гліdзелі, дзень, людзямі, бацькі, абуць, цёплыя, ціпер;* асіміляцыя зычных па мяккасці: *зь дзіцёнкам, зь мякіны, зь мешкавіны, зьнімаць, есьці, разьбіць, жызьнь*; асіміляцыя па звонкасці і глухасці: *цяшка, нялёхка, ляхчэй, сусетка, місарупка, апсмалюць*; падаўжэнне зычных: *пячэнне, чцення, сьвінні, осінню*. У дадзеных гаворках адзначана поўная асіміляцыя ў спалучэнні гукаў [дн]: *халóнна* (*Нікаторых бацькі ў школу ні пускалі, калі было халонна.* Мішкавічы).

Найбольш значнае адрозненне сістэмы зычных мясцовых гаворак ад іншых беларускіх гаворак і літаратурнай мовы – гэта суіснаванне двух розных зычных гукаў [р] і [р’], што характэрна для віцебска-магілёўскай групы гаворак. Цвёрды гук [р] агульнаўжывальны ў маўленні вяскоўцаў, выяўляецца нават у русізмах: *нікаторых, ціперъшнія, пірамыіць, піратрэць, пърадък, ціпер, урэмя, цітрадзь, інцірэсны, чырашчур, электрыка, тры, стары, грыбы, буракі, бъръвікі* і інш. (*Была яшчэ маладухай, дык хадзіла на вечарыны, як ціпер гэта дыскатэкамі называюць*. Крывое Сяло).

Мяккі зычны [р’] ужываецца ў гаворках на поўдні Шумілінскага раёна непаслядоўна, што можа ўказваць на іх пераходнасць да полацкай (заходняй) групы гаворак паўночна-ўсходняга дыялекту, дзе пашырана цвёрдая фанема /р/: *гурькі, грібоў, на абріўках* і інш. (*Пісалі на нейкіх абріўках старых газет.* Мішкавічы; *Ёсьць у нас лес нідалёка, там многа расцець грібоў.* Мішкавічы).

Сістэму ненаціскнога вакалізму вызначаных гаворак Шумілінскага раёна, як і ўсяго паўночна-ўсходняга дыялекту, характарызуе дысімілятыўнае аканне і яканне. Пад уплывам якаснай рэдукцыі адбываецца распадабненне галосных аднолькавага пад’ёму пад націскам і ў першым складзе перад націскам, пры гэтым распадабненне можа назірацца і ў іншых ненаціскных складах. Дысімілятыўнае аканне ўласціва віцебска-магілёўскай групе гаворак. Пры ім у першым складзе перад націскам пасля цвёрдых і зацвярдзелых зычных, калі пад націскам [а], вымаўляецца не [а], а гук няпоўнага ўтварэння [ъ]: *въйнá, дъвáй, пъжáр, къпáць, въдá, кръсáўцы, зъймáцца, пъстáвіць, пъслі́* і інш. (*А хочыцца пъкъпáцца ў гр адах.* Мішкавічы; *Сёліта праз гэтыя пъжáры выгърка намнога большая* . Мішкавічы). Аднак калі пад націскам знаходзяцца іншыя галосныя, у пер-

шым пераднаціскным складзе вымаўляецца [а]: *пасмо́трым, каро́вы, вайны́, хадзі́ў, паспе́ў.* (*Да вайны́ ў школу я хадзі́ў нядоўга* . Мішкавічы). Дысімілятыўнае аканне ў дадзеных вёсках пашырана таксама ў пераднаціскных і паслянаціскных складах, у якіх галосныя [а] і [о] пасля цвёрдых зычных супалі ў гуку [ъ]: *пъмъга́лі, пъбла́мвъла* і інш. Рэдукцыя адзначаецца нават тады, калі ў моцнай пазіцыі знаходзіцца не [а], а іншы галосны: *бъсяко́м, пъра́дък, чарні́лъмі, дзе́лълі, вы́ръслі, зъдаду́ць, пъмідо́ры, пънасе́іла, на скъвърадзе́ , пънадзе́нуць, мълады́я, бъръвікі́, пъдасі́нъвікі* і інш. (*Ёсьць разныя гры́бы: сыраешкі, мъсляты, лісічкі, падбяро́зъвікі, пъдасі́нъвікі, бъръвікі́.* Мішкавічы; *Глумны ён чълаве́к : гърба́тъга магіла справіць.* Мішкавічы).

У даследаваных гаворках Шумілінскага раёна пашырана дысімілятыўнае яканне пасля мяккіх зычных. Калі ў слове ў моцнай пазіцыі [а], то ў першым складзе перад націскам пасля мяккіх зычных вымаўляецца [і]: *дзіўча́ты, німа́, цьвіта́мі, усігда́, зімля́, дзіржа́лі* і інш. **(***Събіралася яшчэ вечарам уся мъладзёш , палілі касьцёр каля лесу , пелі песьні, дзіўча́ты як завядуць , а прыгожа, ажно душой аддыхаеш.* Крывое Сяло). Калі ў моцнай пазіцыі знаходзяцца іншыя галосныя, то ў першым пераднаціскным складзе вымаўляецца [а]: *нядо́ўга, яшчэ́, вясно́й, цьвято́ў, усягды́* і інш. (*Яшчэ́ вясно́й у гароччыку пънасеіла цьвято́ў.* Мішкавічы). У дадзеных гаворках выяўляецца дысімілятыўнае яканне віцебскага падтыпу: [і] вымаўляецца ў першым складзе перад націскам і тады, калі ў моцнай пазіцыі знаходзяцца гукі [е], [о], нават [і], [у], у тым ліку і ў іншых ненаціскных складах: *ціпе́р, ціпе́ръшнія, к міне́ , сідзе́лі, глідзе́лі, сёліта, нідалёка, папіро́сы, піратрэ́ць, у Ві́ціпску , міхані́чныя, місару́пка* і інш. (*Унучычка міне́ ўсё піраро́біць: й на гародзі, й у хаці.* Мішкавічы).

У марфалагічным плане адзначаюцца наступныя асаблівасці вызначаных гаворак: пад уплывам рускай мовы і яе гаворак у формах меснага і давальнага склонаў адзіночнага ліку ў некаторых назоўніках I і II скланення не назіраецца чаргавання заднеязычных [г], [к], [х] са свісцячымі [з’], [ц], [с’]: *на руке, матке, к сусетке, у кладоўкі* (*Нада было ў руке дзіржаць вірацяно.* Непароты; *У кладоўкі цэлая гірлянда банак.* Мішкавічы). У месным склоне адзіночнага ліку для назоўнікаў I і II скланенняў ужываецца канчатак -і: *у прошлым годзі, у калхозі, на караўлоці, на фермі, у калхозі, у гародзі, у школі, у класі* і інш. **(***У гэтым адным класі мы былі разных узрастоў: ат сямі гадоў дъ адзінаццаці.* Мішкавічы; *У гародзі ўсё пъполіць, пъпыліваіць.* Мішкавічы). У адушаўлёных назоўніках множнага ліку вінавальны склон супаў з назоўным: *пасьвілі коні, каровы* (*Дзіцёнкі нашы пасьвілі й коні, й каровы, грабілі сена.* Мішкавічы).

Формы 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга і будучага простага часу дзеясловаў I спражэння абвеснага ладу маюць фіналь -ць. Гэта адна з асноўных марфалагічных асаблівасцей паўночна-ўсходняга дыялекту: *жывець, ідзець, дзелыіць, расцець, прыіжджаіць, прыедзіць, складзець, навяд-*

зецъ, пасеіць, цячэць (*У хаці пъпрыбіраіць, пасьцелі пъвътрысаіць, пъперасушыць, усё піратрэць, пірамыіць.* Мішкавічы; *Жнеш, а жарка, пот цячэць, а нікуды не дзеніся.* Крывое Сяло). У формах 3 асобы множнага ліку для дзеясловаў II спражэння характэрны канчаткі –уць (-юць): *папросюць, топюць, жаруць, варуць, сушуць, схопюць, апсмалюць* **(***Грыбы ў нас жаруць, варуць***.** *Мае ўнукі просюць блінчыкі з грыбамі*. Мішкавічы). У формах 2-й асобы адзіночнага ліку і 1-й асобы множнага ліку для дзеясловаў I спражэння пад уплывам дысімілятыўнага акання і якання ўжываюцца канчаткі -іш (-ыш), -ім (-ым): *купляіш, трэпіш, чэшыш, здзелыім, ля́жым, аддыхаім* і інш. **(***Як лён самнеш, тады трэпіш.* Непароты). Для зваротных дзеясловаў характэрны постфіксы -сь, -ся, -сі: *прыбіралісь, пъаткармілісь, хацелась, радъвълісі, асвоіўся, жаніўся* і інш. (*Дзе гэтыя мухіны так пъаткармілісь?* Мішкавічы; *Як мы радъвълісі, калі атгадованых сьвіней забівалі*. Непароты). Сустракаецца ўсечаная форма ёсь (*У стацьвінах ёсь такія выраскі, на іх кладзецца лаўка, дзе сядзіць ткалля.* Непароты). Адзначаюцца формы дзеясловаў, якія з'яўляюцца акцэнтнымі варыянтамі ў адносінах да літаратурных адпаведнікаў: *забе́руць, сабе́рымся, убе́руць, ро́білі, паро́білі:* (*На той сьвет усё роўна грошай не забе́рыш.* Непароты; *Сабе́рымся ў бальшой хаці , мальцы на гармоніку як дадуць, а мы з дзеўкамі ўжо выплясываім.* Крывое Сяло). Дзеепрыслоўе закончанага трывання прошлага часу можа ўжывацца ў ролі простага выказніка, што з'яўляецца дыялектнай асаблівасцю паўночна-ўсходніх гаворак (*Як ужо ўсё падзелаўшы, пътом садзімся есьці.* Мішкавічы).

У вызначаных гаворках адзначаюцца формы прыметнікаў, неасабовых займеннікаў мужчынскага роду назоўнага склону на -ій (-ый), -ей: *бальшы́й, ма́лый, другі́й, таке́й*, аднак больш пашыранымі з'яўляюцца формы на -і (-ы): *ро́дны, го́дны, но́вы, бальшы́* і інш**. (***Кірмаш у нас бальшы́й быў*. Непароты; *А праўнучык мой йшчэ ма́лый* . Мішкавічы; *Ат таке́й смажаніны ўсе давольныя.* Мішкавічы). Як і ў літаратурнай мове, ужываюцца поўныя формы на -ыя ў множным ліку: *худы́я, ма́лыя, гэ́тыя, на́шыя* і інш. (*Курыцы былі й бальшы́ я, й ма́лыя*. Мішкавічы). Адзначаны формы на -я для прыметнікаў і неасабовых займеннікаў ніякага роду, што можна патлумачыць уплывам дысімілятыўна-недысімілятыўнага акання і якання пераходнага тыпу (*У цёплыя ўрэмя хадзілі бъсяком*. Мішкавічы; *Што ты зьвякаіш пра тоя, чаго ні было.* Мішкавічы; *Здароўе ўжо ні тоя.* Мішкавічы). Гэта асаблівасць збліжае гаворкі поўдня Шумілінскага раёна з полацкай групай гаворак.

Пашыраны займеннікі і прыслоўі, якія не ўласцівы літаратурнай мове: *цяпе́рака, ціпе́ркацька, ту́тачка, нама́шака, е́тык* (*Хацім цяпе́рака шкапок новы купіць*. Непароты; *Мы зь ім ту́тачка ўсе абапкі абабралі*. Непароты; *А ціпе́ркацька вунь і сэрца баліць , хадакі плоха йдуць. Як гэта дальшы жыць?* Мішкавічы).

Зафіксаваны спецыфічныя формы ўтварэння вышэйшай ступені параўнання прыслоўяў: *лепій, лучшы, больш ўсяго, дальшы, паглупшы, раньшы* (*Каб ніткі лепій адбеліваліся , робілі лугу.* Непароты; *Я больш ўсяго люблю мъцімаціку.* Мішкавічы).

У гаворках пашырана часціца *ні*: *ні знаў, ні магу, ні люблю, ні ўсігда, ні дзяржы, ні хадзі, ні скора, ні хочуць* і інш. (*Абуць нам ні ўсігда было чаго.* Мішкавічы; *Ні хадзі туды, там мшары бальшушчыя.* Мішкавічы; *У тоя ўрэмя нам хворсы ні нада былі.* Крывое Сяло). Замест прыназоўніка *да* ўжываецца рускамоўны прыназоўнік *к* у спалучэнні *к міне* (*Скора прыедзіць к міне мая віндэшычка – гэта ўнучычка. Яна к міне на лета прыіжджаіць зь дзіцёнкам сваім.* Мішкавічы).

Такім чынам, на аснове фанетычнага і марфалагічнага аналізу гаворак даследаваных вёсак, размешчаных на поўдні Шумілінскага раёна, вызначаны спецыфічныя асаблівасці, характэрныя для віцебска-магілёўскай групы і паўночна-ўсходняга дыялекту: дысімілятыўнае аканне і дысімілятыўнае віцебскае яканне, адрозненне [р] і [р’], фіналь -ць у формах 3-й асобы адзіночнага ліку цяперашняга і будучага простага часу дзеясловаў І спражэння абвеснага ладу, постфіксы -сь, -сі ў зваротных дзеясловах і інш. Таксама выяўлены некаторыя асаблівасці пераходнага тыпу, якія збліжаюць дадзеныя гаворкі з полацкай групай гаворак.

Літаратура

1. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2012. – Ч. 1. – 304 с.

2. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / А.С. Дзядова (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М. Машэрава”, 2014. – Ч. 2. – 358 с.

А.В. Гурчонак (Полацк)

АПРОШЧАННЕ І ПЕРАРАСКЛАДАННЕ ЯК ВЫНІК ПРАЦЭСАЎ ЛЕКСІЧНАЙ ДЭЭТЫМАЛАГІЗАЦЫІ

Разглядаючы асаблівасці моватворчай дзейнасці чалавека, І. Бадуэн дэ Куртэнэ адзначаў, што запас моўных формаў у сувязі з уласцівым ім зместам назапашваецца выпадкова, шляхам асацыяцый, шляхам злучэння ўяўленняў, а нервоваму цэнтру, мозгу ў дачыненні да мовы ўласцівая здольнасць ажыццяўлення сіметрыі, гармоніі паміж зместам і формай. У гэтым вучоны бачыў абумоўленасць моўнага стану, а таксама прычыны моўных зменаў [3, с. 226].

Заканамернымі з’яўляюцца змены ва ўспрыманні носьбітамі мовы асобных лексем, іх валентнасці і сэнсавай сувязі з іншымі лексемамі. Вынікам гэтага можа стаць з’ява страты словам матываванасці і, адпаведна, змены ў яго структуры: словы, вытворныя для аднаго пакалення носьбітаў, могуць стаць невытворнымі для ўспрымання наступнага пака-

лення. Такім чынам адбываецца разрыў сэнсавых сувязей паміж роднаснымі словамі, а першапачаткова матываваная назва становіцца нематываванай. На з'яву страты матываванасці адным з першых звярнуў увагу А. Патабня. Ён адрозніваў паняцці "ўнутраная форма слова" і "ўяўленне" (этымалагічнае значэнне слова, этымон): "Уяўленне складае абавязковую стыхію слова, якое ўзнікае, але для далейшага жыцця слова яно не неабходнае" [4, с. 8]. Інакш кажучы, без матывацыі словы могуць існаваць, але ўзнікнуць без яе яны практычна не могуць.

Страту этымалагічнай матываванасці лексем прынята называць дээтымалагізацыяй. Гэты тэрмін быў прапанаваны Л. Булахоўскім у працах "Дээтымалагізацыя ў рускай мове" (1949) і "Тыпы дээтымалагізацыі ў рускай мове" (1953).

Што да беларускага мовазнаўства, то паняцце дээтымалагізацыі ў агульных рысах раскрыта ў акадэмічнай "Граматыцы беларускай мовы" (1962). З'яву дээтымалагізацыі характарызуе Л. Шакун у дапаможніку "Словаўтварэнне" (1978). Г. Цыхун разглядае дээтымалагізацыю побач з намінацыяй як вынік спецыфічнай трансфармацыі характару апошняй. Апісаннем лексічнай дээтымалагізацыі назоўнікаў з прасторавым значэннем у сучаснай беларускай мове займаецца І. Купцэвіч.

Даследаванне дээтымалагізацыі слоў непарыўна звязана з выяўленнем іх этымонаў. Этымоны дазваляюць не толькі фармальна ўстанавіць гнёзды роднасных слоў, але і вызначыць сутнасць асацыяцый пры пераносе вядомых назваў на назвы новых з'яў. Дадзеная інфармацыя дазваляе лепш зразумець маўленчую філасофію народа. Актуальнасць даследавання марфемных змен слоў, выкліканых стратай матываванасці – дээтымалагізацыяй, вызначаецца таксама яго ўключанасцю ў агульную парадыгму сучасных матывалагічных даследаванняў і недастатковай распрацаванасцю праблемы ў беларускім мовазнаўстве.

Матэрыялам даследавання выбраны корпус лексем, якія перажылі дээтымалагізацыю і па гэтай прычыне зведалі гістарычныя змены ў падзеле на марфемы. Аналіз структуры лексем праводзіўся паводле "Марфемнага слоўніка беларускай мовы" [2].

Структурны аналіз сучасных этымонімаў дае магчымасць вызначыць віды змен, якія адбыліся ў іх структуры. Так, у некалькіх словах заўважана перараскладанне – перагрупоўка марфемнага складу, пры якой гук або некалькі гукаў адрываюцца ад адной марфемы і далучаюцца да другой. Так, словы *бальшав-ік* і *меншав-ік* маюць вытворную аснову з суфіксам *-ік,* які абазначае асобу з пэўнай якасцю. Гістарычна ж у гэтых словах былі суфіксы *-ш-* і *-авік-*, апошні з якіх зведаў перараскладанне: яго частка *-ав-* далучылася да кораня. Перараскладанне заўважаем і ў слове *сняда-нак* (раней *сн-яд-а-н-ак*). Суфікс *-а-* ўвайшоў у склад кораня.

Для абсалютнай большасці этымонімаў характэрна апрошчанне. Так, побач з перараскладаннем у прыведзеных вышэй словах адбываецца і ап-

рошчанне – злучэнне некалькіх марфем у адну ў выніку страты сэнсавай сувязі з першасным словаўтваральным коранем. Таму суфікс *-ш-*, які ўказвае на форму ступені параўнання прыметніка, утвораную пры дапамозе суплетыўнай асновы (*вялікі – большы, малы – меншы, дрэнны – горшы, добры – лепшы*), у сучаснай мове нельга вылучыць у словах *бальшавік* і *меншавік*. У слове ж *сняданак* зліліся ў адзін прыметнікавы суфікс *-н-* і назоўнікавы *-ак-*.

Т. Аркадзьева вылучае віды апрошчання ў залежнасці ад часткі слова, у якой яно адбылося – прэфіксальнае, суфіксальнае і прэфіксальна-суфіксальнае [1, с. 12]. Працэс прэфіксальнага апрошчання закранае першнаперш назоўнікі. З коранем злучыліся прыстаўкі ў назоўніках аддзеяслоўнага паходжання: *аб-(аба-) (абавяз-ак – аба-вяз-ак, абарот – аб-варот, абед – аб-ед, аблічч-а – аб-лічч-а, абоддз-е – аб-воддз-е, абоз – аб-воз, або-і – а-бо-і); у- (урон – у-рон); пры- (прыгон – пры-гон, прыіск – пры-іск, прырод-а – пры-род-а, прыбой – пры-бой, прыбор – пры-бор); па-(павад-к-а – па-вад-к-а); на- (народ – на-род, нарыс – на-рыс, насос – на-сос); с- (склад – с-клад, скрух-а – с-крух-а).*

Прыстаўка *па-* злучылася з коранем у некаторых назоўніках, якія першапачаткова былі ўтвораны прыставачным спосабам ад назоўнікаў: *па-дол – па-дол, падвал – пад-вал, падвод-а – пад-вод-а, паверх – па-верх, паветр-а – па-ветр-а, паблаж-к-а – па-блаж-к-а.* Сустракаецца прыстаўка *па-* і ў аддзеяслоўных дэрыватах: *паводз-ін-ы – па-водз-ін-ы, павой – па-вой* (ад *віць, віцца*).

У некаторых словах адзначана зліццё дзвюх прыставак з коранем: *удосыць – у-до-сыць, спогадзь – с-по-гадзь, споведзь – с-по-ведзь, спакус-а – с-па-кус-а*, а ў некаторых – зрашчэнне дзвюх прыставак без удзелу кораня: *неда-вер-ак – не-да-вер-ак* (сюды можна аднесці ўсе словы з прыстаўкай *неда-*). Значна менш выпадкаў зліцця прыстаўкі і кораня ў іншых часцінах мовы: *завяшч-а-ць – за-вяшч-а-ць*.

Суфіксальнае апрошчанне на беларускай глебе мае сваю спецыфіку. Так, можна адзначыць суфіксы, якія зліліся з коранем у назоўніках жаночага і ніякага роду: суфікс *-к-* (*клічк-а – кліч-к-а, конк-а – кон-к-а, чыгунк-а – чыгун-к-а*), суфікс *-л-* (*мыл-а – мы-л-а, крыл-о – кры-л-о, дул-а – ду-л-а, дупл-о – дуп-л-о, жыл-а – жы-л-а*), суфіксы *-ц-, -ш-* (*кальц-о – каль-ц-о, мышц-а – мыш-ц-а, крыш-а – кры-ш-а)*; у назоўніках мужчынскага роду: суфіксы *-ык-* (*мужык – муж-ык*), *-ец-* (*купец – куп-ец, канец – кан-ец, дубец – дуб-ец*), *-ок-* (*кусок – кус-ок, канёк – кан-ёк*). Значна менш прыметнікаў з суфіксальным апрошчаннем: *карав-ы – кар-ав-ы, статн-ы – стат-н-ы, паважн-ы – па-важ-н-ы.*

У некаторых словах назіраецца зліццё з коранем двух суфіксаў: *трапкач – трап-к-ач, старшын-а – стар-ш-ын-а, старшын-я – стар-ш-ын-я, кашалёк – каш-ал-ёк, вінтоўк-а – вінт-оў-к-а.*

Можна адзначыць апрошчанне паміж суфіксамі без удзелу кораня: *судз-імасць – судз-ім-асць, дубров-а – дуб-р-ов-а, рж-эўнік – рж-эў-н-ік, лазутчык – лаз-ут-чык.* У некаторых выпадках на фоне апрошчання адбываецца сцяжэнне гукаў: *цэн-асн-ы – цэн-аст-н-ы.*

Лічым не зусім дакладным, у некаторай ступені фармальным азначэнне такога віду апрошчання, як прэфіксальна-суфіксальнае, пры якім адбылося зліццё прэфікса і суфікса з коранем. Тлумачыцца гэта наступным. Калі ўжываецца падобны тэрмін для абазначэння спосабу словаўтварэння, то гэта апраўдана, бо і прыстаўка, і суфікс удзельнічаюць ва ўтварэнні слова адначасова. Пры фіксацыі ж апрошчання нельга дакладна ўстанавіць, адначасова ці ў розны час адбывалася апрошчанне на сумежжы “прыстаўка-корань” і “корань-суфікс” аднаго і таго ж слова. Тым не менш можна заўважыць словы, у якіх і прыстаўка, і суфікс зліліся з коранем: *участак – у-част-ак, сукупн-асць – су-куп-н-асць, сподак – с-под-ак, прыбытак – пры-бы-т-ак, прыгаж-осць – пры-гаж-осць, прытомн-асць – пры-том-н-асць, пошвырак – по-швыр-ак, поспех – по-спе-х, падстав-а – пад-ста-в-а, паводз-ін-ы – па-водз-ін-ы, напарстак – на-парст-ак, празрыст-а – пра-зр-ыст-а, падсобн-ы – пад-соб-н-ы*. Абсалютная большасць гэтых слоў – назоўнікі.

У некаторых словах апрошчанне адбылося ў складаных словах з некалькімі каранямі: *цемрашал – цем-р-а-шал, сёння – сяго-дня, сёлет-а – сяго-лет-а, рэчаісн-асць – рэч-а-іс-н-асць, двурушнік – дв-у-руш-нік.*

Аналіз слоў, якія поўнасцю страцілі сувязь з этымонам, часта дае магчымасць зразумець асацыяцыі нашых продкаў пры вобразным пераносе значэння слоў. Напрыклад, лексема *падаплёк-а* (гіст. *пада-плёк-а*) мае этымалагічную сувязь з назоўнікам *плячо*, бо прамое значэнне ўстарэлага слова *падаплёка* – ‘падкладка ў сялянскай сарочцы’ [5].

Лексема *закон* (гіст. *за-кон*) мае этымалагічную сувязь са словам *канец*, якое мае адзін этымалагічны корань са словам *начало*. Такім чынам, нашы продкі надавалі паняццю *закон* значэнне нечага першаснага, адпраўнога, пачатковага.

Лексема *кале-ць – кал-е-ць* мае адзін этымалагічны корань са словамі *кол, калоць*. *Акалець* – гэта значыць зрабіцца цвёрдым, застылым, як *кол* – адколаты кавалак дрэва.

Непаслядоўным, на нашу думку, у марфемным слоўніку з’яўляецца вызначэнне марфемнай структуры назваў грыбоў: *бар-ав-ік, ліс-іч-к-а* і *апеньк-а, казляк,* аднатыпных назваў асоб мужчынскага полу: *знахар* (гіст. *з-на-х-ар*) і *жы-хар.* Далёка не ўсе словы, якія страцілі сваю матываванасць, пазначаны ў слоўніку паметай “гіст.” Так, яўная этымалагічная сувязь існуе паміж словамі *каравы, карыта* і *карычневы*, аднак этымалагічная структура слова *карычневы* не паказана. Не адзначана сувязь з этымонам назваў месяцаў, хоць яна відавочная і сёння.

Такім чынам, дээтымалагізацыя – гэта заканамерны працэс мовы, якая знаходзіцца ў стане развіцця. Адным з вынікаў гэтага працэсу з'яўляецца змена марфемнай структуры слоў, якая выражаецца ў апрошчанні і перараскладанні.

Літаратура

1. Аркадьева, Т.Г. Этимонимы в лексической системе современного русского языка: учебное пособие к спецкурсу / Т.Г. Аркадьева. – Ленинград: ЛГПИ им. А.И. Герцена, 1990. – 74 с.

2. Бардовіч, А.М. Марфемны слоўнік беларускай мовы / А.М. Бардовіч, Л.М. Шакун. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск: Выш. шк., 1989. – 718 с.

3. Бодуэн де Куртенэ, И.А. Избранные труды по общему языкознанию: в 2 т. / И.А. Бодуэн де Куртенэ. – М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. – Т. 1. – 391 с.

4. Потебня, А.А. Из записок по русской грамматике / А.А. Потебня. – М.: Учпедгиз, 1958.– Т. 1–2. – 536 с.

5. Этимологический словарь русского языка. Фасмер Макс (онлайн версия). – Рэжым доступу: http://www.classes.ru/all-russian/russian-dictionary-Vasmer-term-9819.htm. – Дата доступу: 27.09.2015.

А.С. Дзядова, Т.А. Васільева (Віцебск)

ПРЫРОДА ПРАЗ ПРЫЗМУ СЕМАНТЫЧНЫХ ДЫЯЛЕКТЫЗМАЎ У ГАВОРКАХ ВІЦЕБШЧЫНЫ

У гаворках Віцебшчыны ў колькасных адносінах семантычныя дыялектызмы ўтвараюць адну з самых значных груп дыялектнай лексікі. Многія лексічныя адзінкі гаворак Падзвіння, якія супадаюць па сваёй знешняй форме са словамі беларускай літаратурнай мовы, але маюць іншае значэнне ў дыялектнай мове жыхароў нашага рэгіёна, уяўляюць сабой дастаткова цікавы і арыгінальны слоўны матэрыял, які сведчыць пра самабытнасць жывой народнай мовы беларусаў і характарызуе яе як спецыфічную нацыянальна-культурную з'яву.

Крыніцай нашага даследавання паслужыў "Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны" [1; 2], падрыхтаваны і выдадзены калектывам кафедры беларускага мовазнаўства Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П.М. Машэрава на працягу 2012–2014 гг. Семантычныя дыялектызмы, выяўленыя ў мове вясковых жыхароў Віцебскай вобласці, прадстаўлены разнастайным у плане зместу лексічным матэрыялам. Гэта словы, якія характарызуюць чалавека ў фізічных і псіхічных адносінах, сельскагаспадарчая і земляробчая лексіка, побытавыя найменні і інш. Даволі вялікай (больш за 100 найменняў) і цікавай у плане значэння з'яўляецца тэматычная група семантычных дыялектызмаў, якія характарызуюць прыроду Беларусі. Паводле свайго значэння найменні дадзенага тэматычнага кола падзелены намі на тры лексіка-семантычныя групы: 1) назвы раслiннага і жывёльнага свету; 2) назвы з'яў прыроды; 3) назвы прасторавых паняццяў.

У склад першай лексіка-семантычнай групы, кампаненты якой намінуюць раслінны свет, уваходзяць назвы травяністых раслін і дрэў. Напрыклад, ***ба́ба*** ‘дзьмухавец’, ***валы́нка*** ‘васілёк’, ***вясёлка*** ‘бяроза ў час цвіцення’, ***добро́*** ‘агульная назва злакавых раслін; жыта’, ***дзед*** ‘дзьмухавец’, ***дупля́нка*** ‘дуплаватае дрэва’, ***залату́ха*** ‘фіялка’, ***казёл*** ‘казялец, люцік’, ***калато́ўка*** ‘скрыпень’, ***кругля́к*** ‘асака’, ***кроў*** ‘зверабой’; ***лісто́ўка*** ‘лістоўніца’, ***свіну́шка*** ‘расліна сівец’, ***слон*** ‘сланечнік’ і інш. У склад дыялектызмаў, якія абазначаюць гародніну і яе часткі, уваходзяць такія лексемы, як ***віто́к*** ‘качан капусты’, ***двайні́к*** ‘агурок-спарыш’, ***бараду́*** ‘тонкія карэньчыкі бульбы ці цыбулі’, ***былі́на*** ‘бульбоўнік, сцябло бульбы’, ***каза́*** ‘каліва цыбулі’ і інш. Даволі шырока ў гаворках паўночнай часткі Беларусі бытуюць семантычныя дыялектызмы, якія з’яўляюцца назвамі грыбоў: ***бара́н*** ‘грыбы курачкі’, ***бяля́к*** 1) ‘баравік’; 2) ‘белы грузд’; 3) ‘шампіньён’, ***вавёрка*** ‘грыб лісічка’, ***вясёлка*** ‘грыб смаржок’, ***дажджаві́к*** ‘порхаўка’, ***добра́к*** ‘баравік’, ***кабы́ла*** ‘грыб валуй’, ***казёл*** ‘грыб казляк, масляк’, ***ку́бак*** ‘малады баравік’, ***свіння́*** 1) ‘свінушка, грыб сямейства свінухавых’; 2) ‘чорны грузд’ і інш. Разгледзім ужыванне асобных дыялектызмаў на канкрэтным моўным матэрыяле. Напрыклад: *У свата* ***добро́*** *ў клеці ў мяхах стаіць.* (Азёркі Гар.) [1, с. 169]; ***Кроў*** *за гародам у нас – збірай ды сушы*. (Горкі Леп.) [1, с. 262]; *Вырвала адну* ***казу́*** *з градкі, дык маленькая цыбулька яшчэ*. (Шылкі Сен.) [1, с. 223]; ***Кабы́лы*** *ўпярод не бралі, а цяпер во ядуць*. (Пралетарыя Уш.) [1, с. 221].

Назвы прадстаўнікоў жывёльнага свету ўяўляюць у дыялектнай мове Віцебшчыны таксама разгалінаваную сістэму лексічных адзінак. Гэта найменні свойскіх жывёл тыпу ***бу́кса*** ‘бязрогая жывёліна’, ***казу́ля*** ‘каза́’, ***карві́целька*** ‘карова’; назвы птушак: ***сакату́ха*** ‘сарока’; ***свісту́н*** ‘салавей’; народныя іхтыялагічныя найменні: ***каласаві́к*** ‘лешч’, ***кале́ка*** ‘мянтуз’, ***страказа́*** ‘падкаменшчык’, ***су́чка*** ‘рыба шчыпоўка’; найменні прадстаўнікоў энтамафаўны: ***ба́бка*** ‘страказа’, ***гад*** ‘каларадскі жук’, ***зык*** ‘авадзень’, ***казёл*** ‘конік’, ***сава́*** ‘дзікая пчала’, ***стрэ́лка*** ‘страказа’ і інш.

Лексіка-семантычная група назваў з’яў прыроды ўключае ў свой склад такія лексемы, як ***аблО́га*** ‘дождж абложны, абкладны’, ***бага́ч*** ‘вогнішча, агонь’, ***бара́н*** ‘баранчыкі, вялікія хвалі на возеры’, ***ёмка*** ‘холадна, марозна’, ***ле́я*** ‘лівень, заліўны дождж’, ***лунь*** ‘яркі маладзік; месячнае святло’, ***лядо́ўня*** ‘моцны холад’, ***бяля́к, на́вісь*** ‘туман’, ***стрэ́лка*** ‘лядзяк’, ***стыль*** ‘вельмі халоднае надвор’е з ветрам; халадэча’, ***по́рхаўка*** ‘сняжынка’, ***по́ршань*** ‘дробны сняжок’. Напрыклад: *У лесе хуценька разлажыў* ***бага́ч****, каб спекчы бульбы.* (Руць Чаш.) [1, с. 60]; *На дварэ такая* ***лунь****, што хоць іголкі збірай*. (Пестуніца Віц.) [1, с. 294]; ***Стрэ́лкі*** *– ета сасулькі, што вісяць на крышэ.* (Грабяніца Віц.) [2, с. 283].

У лексіка-семантычную групу назваў прасторавых паняццяў уваходзяць найменні прыроднага асяроддзя, якія называюць месца або характарызуюць асаблівасці прыродна-ландшафтнага характару. Напрыклад,

апу́ха ‘ўзлесак’, ***ба́ба*** ‘дрыгва’, ***бук*** ‘вір, глыбокае месца на рацэ’, ***во́ка*** ‘бездань, прорва’, ***во́лак*** ‘вузкая прасека праз лес’, ***навіна́*** ‘папар’, ***паго́н*** ‘паласа зямлі’, ***падо́л*** ‘месца на рацэ, дзе мыюць бялізну’, ***па́йка*** ‘ўчастак, надзел зямлі, выдзелены для сенакосу’, ***памёт*** ‘запушчаная зямля’, ***пла́ха*** ‘ўчастак вялікіх памераў, прызначаны для сельскагаспадарчых культур’, ***рад*** ‘пракос’, ***ралля́*** ‘зямля, зямельны ўчастак, надзел’, ***ста́ўка*** ‘сажалка’, ***трасу́ха*** ‘балота’, ***цагельня*** ‘ўзгорыстае месца, дзе раней знаходзіўся цагельны завод’ і інш. Праілюструем функцыянаванне некаторых прыведзеных вышэй семантычных дыялектызмаў у гаворках Віцебшчыны на канкрэтных прыкладах: *У нас* ***у бу́ку*** *малец у прошлым гаду ўтапіўся.* (Баева Дубр.) [1, с. 96]; *Панясу* ***на падо́л*** *і памыю ўсё там, хоць і далекавата.* (Рэдзькі Дубр.) [2, с.88]; *У маткі нашай многа* ***ралліі́*** *было* (Зорнікі Беш.) [2, с. 223]; *Луг обшчый, а як падзелюць, то называюць “твая* ***па́йка”, “мая па́йка”***. (Грышаны Віц.) [2, с. 97].

Паколькі ландшафтнай асаблівасцю Беларусі з’яўляецца вялікая колькасць балоцістых мясцін, невыпадкова, што сярод найменняў зямнога рэльефу шырока ўжываюцца на Віцебшчыне сінанімічныя семантычныя дыялектызмы, якія намінуюць балота: ***ба́ба, во́ка, га́ла, трасу́ха*** і інш. Агульнасцю семантычнага кампанента аб’яднаны таксама паміж сабой значэнні назваў прасторавых паняццяў, якія семантызуюць земляробчую дзейнасць беларусаў: ***навіна́, паго́н, па́йка, памёт, пла́ха, ралля́.*** У парадыгматычныя адносіны ўступаюць паміж сабой лексічныя адзінкі ***ба́ба*** і ***дзед*** са значэннем ‘дзьмухавец’, а таксама назоўнікі ***бяля́к*** і ***дабра́к*** са значэннем ‘баравік’, ***віто́к*** і ***крыша́н*** са значэннем ‘качан капусты’. Трэба адзначыць, што ў іх аснову пакладзены розныя матывацыйныя прыметы. У значэннях прыведзеных сінанімічных назваў на першы план выступаюць розныя семантычныя кампаненты. Напрыклад, у дыялектызме ***бяля́к*** актуалізуецца семантычны кампанент ‘белы’, у той час як у назоўніку ***дабра́к*** з такім жа значэннем ‘баравік’ актуалізавана сема ‘добры, прыдатны для яды, ядомы’.

Значная частка семантычных дыялектызмаў даследаванай тэматычнай групы “прырода” мае даволі празрыстую матывацыю. Напрыклад, выразнымі матывацыйнымі асновамі характарызуюцца назоўнікі ***вясёлка*** ‘бяроза ў час цвіцення’ (матывуецца прыметнікам *вясёлы* ‘які выклікае, нараджае весялосць’); ***дажджавіќ[1]*** ‘грыб порхаўка’ і ***дажджавіќ[2]*** ‘дажджавы чарвяк’ (амонімы, матываваныя назоўнікам *дождж* ‘атмасферныя ападкі’); ***дупля́нка*** ‘дуплаватае дрэва’ (паходзіць ад назоўніка *дупло* ‘пустата ў ствале дрэвы на месцы драўніны, якая выгніла’); ***лісто́ўка*** ‘лістоўніца’ (матывуецца назоўнікам *ліст* ‘частка расліны’), ***крыша́н*** ‘качан капусты’ (паходзіць ад дзеяслова *крышыць* ‘наразаць дробнымі кавалкамі’), ***лядо́ўня*** ‘моцны холад’ (матывуецца словам *лёд* ‘вада, якая замерзла і перайшла ў цвёрды стан’); ***лея*** ‘лівень, заліўны дождж’ (этымалагічна звязана з дзеясловам *ліць* ‘вельмі моцна цячы, ісці’). Дыя-

лектызмы ***на́вісь*** ‘туман’ і ***спе́шка*** ‘скараспелка, гатунак ранняй бульбы’ адпаведна семантычна звязаны з дзеясловамі *навіса́ць* ‘апускацца, размяшчацца нізка над чым-небудзь’ і *спяшацца* ‘старацца зрабіць што-небудзь як мага хутчэй’. Выразную матывацыю маюць таксама словы ***аблога*** ‘дождж абложны, абкладны’ (ад *аблажыць* ‘пакрыць суцэльнай масай чаго-небудзь, абвалачы’); ***га́ла*** ‘голае месца’ (ад *голы* ‘чысты, без раслiннага покрыва’); ***сакату́ха*** ‘сарока’ (ад *сакатаць* ‘кудахтаць, утвараць сокат (пра курэй)’, ***свісту́н*** ‘салавей’ (ад *свістаць* ‘утвараць свіст’), ***трасу́ха*** ‘балота’ (ад *трэсціся* ‘часта хістацца, калаціцца’) і інш.

Некаторыя даследаваныя семантычныя дыялектызмы на ўзроўні жывой дыялектнай мовы ўступаюць паміж сабой у аманімічныя адносіны. Гэта можна канстатаваць у адносінах да такіх слоў-амонімаў, як ***ба́ба***[1] ‘дзьмухавец’ і ***ба́ба***[2] ‘дрыгва’; ***казёл***[1] ‘казялец, люцік’, ***казёл***[2] ‘насякомае конік’, ***казёл***[3] ‘грыб казляк; масляк’, ***казёл***[4] ‘гронка’; ***свіну́шка***[1] ‘дробная бульба, прызначаная на корм жывёле’ і ***свіну́шка***[2] ‘расліна сівец’.

Сярод кампанентаў прааналізаванай тэматычнай групы сустракаюцца полісемантычныя лексемы. Напрыклад, ***бяля́к*** 1) ‘баравік’; 2) ‘белы грузд’; 3) ‘шампіньён’, ***га́ла*** 1) ‘голае месца, чыстая прастора’; 2) ‘забалочаная сенажаць сярод лесу’, ***каса́*** 1) ‘сцябло агурочніку’; 2) ‘бацвінне моркві’; 3) ‘пляцёнка цыбулі’, ***свіння́*** 1) ‘свінушка; грыб сямейства свінухавых з пласціністай шапкай жоўтага, бурага або лілова-шэрага колеру’; 2) ‘чорны грузд’.

Многія семантычныя дыялектызмы ўтвораны шляхам метафарызацыі. Так, сустракаецца з’ява вобразнага пераасэнсавання паводле знешняга выгляду, формы, колеру ці іншых уласцівасцей: ***барада́*** ‘тонкія карэньчыкі бульбы, цыбулі’ (параўн. літ. *барада́* ‘валасяное покрыва ніжняй часткі твару ў мужчын’), ***вітО́к*** ‘качан капусты’ (параўн. літ. *вітО́к* ‘адзін абарот спіралі’), ***ку́бак*** ‘малады баравік’ (параўн. літ. *кубак* ‘невялікая, звычайна з ручкай, пасудзіна для піцця’), ***вавёрка*** ‘грыб лісічка’ (параўн. літ. *вавёрка* ‘пушысты звярок рыжага колеру’), ***стрэ́лка***[1] ‘лядзяк’ і ***стрэ́лка***[2] ‘страказа’ (параўн. літ. *стрэлка* ‘тонкая і вузкая пласцінка, якая паварочваецца на восі і паказвае час ці напрамак у розных вымяральных прыборах’).

На аснове метанімічнага пераносу ўтварыліся такія нешматлікія семантычныя дыялектызмы, як ***ралля́*** ‘зямля, зямельны ўчастак, надзел’ (параўн. літ. *ралля́* ‘ўзаранае поле, узараная глеба’), ***цагЕ́льня*** ‘ўзгорыстае месца, дзе раней знаходзіўся цагельны завод’ (параўн. літ. *цагЕ́льня* ‘прадпрыемства па вырабе цэглы, цагельны завод’).

Як сведчыць даследаваны лексічны матэрыл, семантычныя дыялектызмы, якія ў гаворках Віцебшчыны рэпрэзентуюць прыроду, выяўляюць у сваім значэнні не толькі асаблівасці раслiннага і жывёльнага свету, кліматычных умоў Беларусі, але і пэўныя прыродныя рэаліі, звязаныя з паўсядзённым жыццём і побытам нашага народа, яго працай на зямлі, і ў

сілу сваёй намінатыўнай функцыі нясуць у сабе цікавую этнакультурную інфармацыю пра беларусаў і асаблівасці іх светапогляду.

Літаратура

1. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / Л.І. Злобін (рэд.) [і інш.]. – Віцебск: УА “ВДУ імя П.М.Машэрава”, 2012. – Ч. 1. – 304 с.

2. Рэгіянальны слоўнік Віцебшчыны: у 2 ч. / склад.: Г.К. Семянькова, Т.А. Грачыха, А.С. Дзядова [і інш.]; пад рэд. А.С. Дзядовай. – Віцебск: ВДУ імя П.М. Машэрава, 2014. – Ч. 2. – 358 с.

Д.В. Дзятко (Мінск)

ПЕРЫЯДЫЗАЦЫЯ ГІСТОРЫІ І ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ БЕЛАРУСКАЙ ЛЕКСІКАГРАФІІ

Для сучаснага мовазнаўства неаспрэчным фактам з’яўляецца існаванне лексікаграфіі як самастойнай галіны лінгвістычных ведаў, якая вызначаецца наяўнасцю асаблівых тэхналогій, методык, метадаў апрацоўкі моўнага матэрыялу, гэта значыць валодае ўласнай метадалогіяй.

Выразна метадалагічны характар носіць пытанне пра перыядызацыю гісторыі развіцця лексікаграфіі. Яго значэнне выходзіць далёка за межы зручнасці даследавання, якая мае вузка ўтылітарную скіраванасць і абумоўліваецца суб’ектыўнымі мэтамі і абставінамі.

Навуковы падыход патрабуе не толькі аналізу прынцыпаў апісання моўных фактаў у сучасным мовазнаўстве, але і прадугледжвае вывучэнне самога працэсу іх гістарычнага станаўлення. Таму несупярэчлівая перыядызацыя гісторыі айчыннай лексікаграфіі павінна мець аб’ектыўны характар, адлюстроўваць логіку яе развіцця і тым самым вызначаць арыенціры, акрэсліваць вектары даследавання на перспектыву.

1. Найважнейшае значэнне пры стварэнні перыядызацыі развіцця любой навукі належыць крытэрыям, якія пакладзены ў аснову такой перыядызацыі. У праекцыі на тэорыю і практыку беларускай лексікаграфіі ролю такіх крытэрыяў, на наш погляд, могуць адыграць наступныя прынцыпы:

а) прынцып рэфлексійнасці – адлюстраванне моўных адзінак у слоўніку з пазіцый індывідуальнага навуковага стылю мыслення лексікографа;

б) прынцып сістэмнасці – прадстаўленне мовы ў слоўніку ў выглядзе сістэмнай структуры;

в) прынцып шматаспектнасці – увасабленне ў лексікаграфіі рознанакіраваных звестак пра мову;

г) прынцып парадыгматычнасці – прадстаўленне фактаў мовы ў адзінстве розных іх рэалізацый;

д) прынцып дыскурсіўнасці – лінгвістычнае апісанне моўных адзінак з улікам іх функцыянавання ў маўленчай прасторы;

е) прынцып тэхналагічнасці – выкарыстанне сістэм і спосабаў аўтаматызаванай апрацоўкі і ўпарадкавання моўнага матэрыялу.

Пералічаныя крытэрыі дазваляюць у агульным працэсе станаўлення метадаў і прыёмаў лексікаграфічнага апісання беларускай мовы вылучыць наступныя перыяды:

а) XIII ст. – XVIII ст.; б) XIX ст. – пач. XX ст.; в) 1920-я гг.; г) 1930-я гг.; д) канец 1940-х гг. – 1980-я гг.; е) 1990-я гг. – наш час.

№	*Характэрныя асаблівасці* / *Перыяд*	рэфлексійнасць	сістэмнасць	шматаспектнасць	парадыгма-тычнасць	дыскурсіўнасць	тэхналагічнасць
1.	XIII ст. – XVIII ст.	max	–	–	–	–	–
2.	XIX ст. – пач. XX ст.	max	min	min	–	–	–
3.	1920-я гг.	max	max	min	–	min	–
4.	1930-я гг.	min	min	min	–	min	–
5.	Канец 1940-х – 1980-я гг.	max	max	max	max	max	min
6.	1990-я гг. – наш час.	max	max	max	max	max	max

Названыя перыяды не з’яўляюцца аднароднымі з пункту гледжання зацікаўленасці дзяржавы і грамадства ў выніках працэсу ўпарадкавання лексікі. Іх спецыфічныя асаблівасці адлюстраваны ў прыведзенай табліцы (“max” – уласціва ў значнай ступені, “min” – уласціва ў некаторай ступені, “–” – не ўласціва).

Перыяд I (XIII ст. – XVIII ст.): лексікаграфія як асобная галіна навукі адсутнічае; асноўная роля ў стварэнні слоўнікаў належыць канкрэтным асобам; мова прадстаўляецца не сістэмна – адлюстроўваюцца толькі пэўныя факты (напр., незразумелыя словы); лексікаграфічнае апісанне закранае некаторыя аспекты функцыянавання моўных адзінак (напр., паходжанне слова і значэнне); фіксуюцца канкрэтныя моўныя формы, сувязі паміж рознымі формамі моўнай адзінкі не з’яўляюцца вызначальнымі; пры характарыстыцы моўнай адзінкі ўлічваецца яе роля толькі ў пэўным тэксце.

Перыяд II (XIX ст. – пач. XX ст.): беларуская лексікаграфія развіваецца ў межах расійскай лексікаграфічнай традыцыі; асноўная роля ў стварэнні слоўнікаў належыць канкрэтным асобам; мова апісваецца несістэмна: адлюстроўваюцца толькі пэўныя факты; лексікаграфічнае апісанне закранае асобныя аспекты функцыянавання моўных адзінак; фіксуюцца канкрэтныя моўныя формы, сувязі паміж рознымі формамі

моўнай адзінкі не з’яўляюцца вызначальнымі; пры апісанні моўных адзінак улічваецца толькі іх роля ў пэўным тэксце.

Перыяд III (1920-я гг.): інтэнсіўнае развіццё беларускай лексікаграфіі; асноўная роля ў стварэнні слоўнікаў належыць канкрэтным асобам, праца якіх каардынуецца навуковымі структурамі; імкненне да сістэмнага апісання з улікам функцыянавання моўных адзінак; фіксуюцца канкрэтныя моўныя формы, сувязі паміж імі не з’яўляюцца вызначальнымі; пры апісанні моўнай адзінкі звяртаецца ўвага на яе ролю ў розных тэкстах.

Перыяд IV (1930-я гг.): запаволенае развіццё беларускай лексікаграфіі; асноўная роля ў стварэнні слоўнікаў належыць навуковым структурам; моўныя адзінкі лексікаграфуюцца з улікам іх камунікатыўных характарыстык (як адзінкі перакладных слоўнікаў); несістэмнае апісанне мовы; фіксуюцца канкрэтныя моўныя формы, сувязі паміж рознымі формамі моўнай адзінкі не з’яўляюцца вызначальнымі; пры апісанні моўнай адзінкі ўлічваецца толькі яе роля ў пэўным тэксце.

Перыяд V (канец 1940-х – 1980-я гг.): асноўная роля ў стварэнні слоўнікаў належыць навуковым структурам і аўтарскім калектывам; мова апісваецца сістэмна і шматаспектна; пры лексікаграфаванні ўлічваецца, што моўная адзінка з’яўляецца сукупнасцю розных яе формаў, якія рэалізуюцца ў вуснай і пісьмовай камунікацыі; робяцца спробы аўтаматызаваць працэс стварэння слоўнікаў (напр., ствараюцца канкардансы).

Перыяд VI (1990-я гг. – наш час): асноўная роля ў стварэнні слоўнікаў належыць навуковым структурам і аўтарскім калектывам; мова апісваецца сістэмна і шматаспектна; пры лексікаграфаванні ўлічваецца, што моўная адзінка з’яўляецца сукупнасцю розных яе формаў, якія рэалізуюцца ў вуснай і пісьмовай камунікацыі; актыўнае выкарыстанне праграмна-тэхнічных сродкаў пры лексікаграфаванні, стварэнне электронных слоўнікаў.

2. На сучасным этапе сістэма і структура беларускай мовы дастаткова поўна ахарактарызаваны ў шматлікіх лексікаграфічных выданнях. Усяго беларускімі і замежнымі лінгвістамі ўкладзена больш за 2000 слоўнікаў, розных паводле зместу, аб’ёму і асаблівасцей апісання моўных адзінак.

Разам з тым рэальная моўная практыка ставіць перад лексікографамі новыя задачы, найбольш важнымі з якіх з’яўляюцца:

а) стварэнне максімальна поўнага тлумачальнага слоўніка беларускай мовы, які адлюстроўваў бы лексіку нацыянальнай мовы XX–XXI стст.;

б) абнаўленне існуючых перакладных слоўнікаў (найперш руска-беларускага і беларуска-рускага), дапаўненне іх рэестраў новай лексікай;

в) падрыхтоўка зводнага слоўніка лексікі беларускіх народных гаворак;

г) завяршэнне пачатых праектаў (“Гістарычны слоўнік беларускай мовы”, “Этымалагічны слоўнік беларускай мовы”, “Анамастычны слоўнік Гродзеншчыны” і інш.) і падрыхтоўка кампактных выданняў, якія б

уключалі найбольш ужывальную лексіку (напр., аднатомнага этымалагічнага слоўніка);

д) укладанне серыі слоўнікаў (перакладных і тлумачальных), якія б адлюстроўвалі сучасны стан беларускай тэрміналогіі;

е) выданне шэрагу слоўнікаў мовы найбольш аўтарытэтных беларускіх пісьменнікаў (Якуба Коласа, М. Багдановіча, Кузьмы Чорнага, Максіма Танка, У. Караткевіча, В. Быкава, Р. Барадуліна і інш.);

ж) стварэнне серыі кампактных нарматыўных слоўнікаў розных тыпаў для школьнікаў і студэнтаў;

з) распрацоўка новых электронных слоўнікаў і пераход на электронныя носьбіты існуючых слоўнікаў беларускай мовы і інш.

Вырашэнне гэтых задач магчымае толькі ва ўмовах добрай распрацаванасці мовазнаўчай тэорыі ў цэлым і сістэмнай тэорыі лексікаграфіі – у прыватнасці.

К.А. Зайцава (Віцебск)

РЭГІЯНАЛЬНАЯ АНТРАПАНІМІЯ ЯК АБ'ЕКТ АНАМАСТЫЧНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

На сучасным этапе развіцця навукі актывізавалася ўвага да рэгіянальных даследаванняў амаль ва ўсіх сферах: палітыцы, філасофіі, гісторыі, у тым ліку і лінгвістыцы. Рэгіяналістыка – інтэгральная навука, якая адлюстроўвае сінтэз розных навук у падыходзе да рэгіянальных даследаванняў. Рэгіянальныя даследаванні прадугледжваюць вывучэнне асобных заканамернасцей вызначанай галіны не толькі паміж абласцямі розных краін, але і паміж сельскімі, раённымі і абласнымі рэгіёнамі ў межах адной краіны. Кожны рэгіён – гэта асобная тэрыторыя, якая адрозніваецца і выдзяляецца сукупнасцю гістарычных, эканамічных, палітычных і нацыянальных асаблівасцей.

Мэта артыкула – зрабіць агляд навуковых прац, прысвечаных пытанням рэгіянальных даследаванняў. Пры даследаванні прымяняліся аналітычны і дэскрыптыўны метады. Матэрыялам паслужылі працы, прысвечаныя актуальным праблемам рэгіянальных даследаванняў.

У сучасным свеце ўрбанізацыі актуальным уяўляецца вывучэнне і фіксацыя анамастычных адзінак кожнага рэгіёна, і яшчэ большай каштоўнасцю з'яўляецца палявы метад збору інфармацыі. На думку прафесара У.А. Дзергачова, рэгіяналістыка – гэта навука аб цэласных тэрытарыяльных аб'яднаннях, якія валодаюць цывілізацыйным (сацыякультурным) кодам на макрарэгіянальным, рэгіянальным і субрэгіянальным узроўнях. Рэгіяналістыка можа разглядацца як "макрадысцыпліна, якая аперыруе абагульненымі, кантрольнымі вынікамі ў рамках галіновых прыродазнаўчых і гуманітарных дысцыплін" [1]. Па словах У.М. Стралец-

кага, у такой інтэрпрэтацыі рэгіяналістыка выступае ў ролі сувязнага звяна, якое аб'ядноўвае самыя розныя напрамкі рэгіянальных даследаванняў [6, с. 3]. Н.У. Падольская таксама выдзяляе асобна тэрмін "рэгіянальная анамастыка" [5, с. 103]. Акрамя таго аўтар выдзяляе яшчэ адзін тэрмін, звязаны з папярэднім, – "анамастычны арэал"– вобласць распаўсюджання аднаго анамастычнага факта або з'явы, якая была ўстаноўлена ў выніку анамастычнага даследавання дадзенай тэрыторыі [5, с. 101]. Вызначыўшы асноўныя прыкметы рэгіяналістыкі як навукі, можна даць азначэнне тэрміна ў дачыненні да антрапаніміі. *Антрапанімная рэгіяналістыка* – кірунак у сістэме анамастычных даследаванняў, які характарызуецца спецыфічнай цэласнасцю і займаецца вывучэннем заканамернасцей функцыянавання асобных тыпаў антрапонімаў асобнага рэгіёна ў розных аспектах з улікам храналагічных паказчыкаў. Антрапанімнае рэгіянальнае даследаванне не можа прэтэндаваць на глыбіню і дакладнасць вывучэння без уліку гісторыі рэгіёна. У.М. Стралецкі ўказвае, што паколькі адзінства рэгіёна мысліцца як агульнасць людзей, то пры такім даследаванні мясцовасці проста немагчыма абысціся без уліку фактару гістарычнай спадчыны. Тэрытарыяльныя супольнасці людзей – катэгорыі, якія развіваюцца не проста зменліва, але і перманентна, і не выпадкова, што адно з самых распаўсюджаных паняццяў у рэгіяналістыцы – гэта паняцце хранатопа (прастора + час). Часавая дамінанта ў рэгіянальным аналізе не менш важная, чым прасторавая" [6, с. 4]. Вызначальныя рысы любога рэгіёна наўпрост залежаць не толькі ад яго сучаснага, але і ад мінулага.

Даволі актыўна філалагічная рэгіяналістыка развіваецца ў Расіі і Беларусі. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя былі закладзены асновы рэгіянальнай антрапаніміі ў працы М.М. Тупікова "Слоўнік старажытнарускіх уласных асабовых імён", дзе на аснове фактычнага матэрыялу аўтар устанавіў арэалы бытавання канкрэтных антрапанімных асноў [7].

Рэгіянальная антрапаніміка як асобны кірунак мае сваю методыку даследавання асобных арэалаў. Многія арэальныя анамастычныя даследаванні праводзяцца на аснове прац і методык беларускіх вучоных. Г.М. Мезенка займаецца вывучэннем антрапанімікона Віцебшчыны XVII ст.; даследаваннем паходжання імёнаў, прозвішчаў і мянушак на Віцебшчыне займаюцца В.М. Ляшкевіч, Г.К. Семянькова. На матэрыяле мясцовай дзелавой пісьменнасці В.М. Ляшкевіч разгледзела антрапанімную сістэму Віцебшчыны і Магілёўшчыны XVI – XVII стст. Публікацыі Г.К. Семянковай ахопліваюць структуру, семантыку, геаграфію прозвішчаў і мянушак на тэрыторыі паўночнай Беларусі. Імяннік беларускага пагранічча (тэрыторыя Браслаўскага, Верхнядзвінскага, Расонскага, Мёрскага, Лёзненскага раёнаў) даследуе Ю.М. Галкоўская. Цэнтральныя раёны Віцебшчыны застаюцца маладаследаванымі. На тэрыторыі Брэстчыны і Гродзеншчыны паходжаннем антрапонімаў, іх скланеннем, праблемамі словаўтварэння займаюцца Т.М. Аліферчык, С.Ф. Бут-Гусаім, З.І Макаранка, І.А. Шумская і Г.К. Усціновіч. А.А. Лукашанец у публікацыях "Лакальная сістэма ўласных

асабовых імён” і “Родавыя (спадчынныя) найменні ў сістэме мясцовага антрапанімікону” [3; 4] разглядае сістэму традыцыйных беларускіх уласных асабовых імён адной з вёсак цэнтральнага раёна Міншчыны. Т.А. Карніеўская ў кандыдацкай дысертацыі прааналізавала іменаслоў Гомеля другой паловы XX стагоддзя [2]. Новым кірункам у вывучэнні анамастыкі з’яўляецца анамастычная лексікаграфія. Яе вывучэннем актыўна займаецца С.У. Шахоўская, якая распрацавала тыпалогію онімных слоўнікаў з улікам аб’екта лексікаграфічнага апісання і спецыфікі іх структуры, вызначыла асноўныя вектары развіцця сучаснай анамастычнай лексікаграфіі Беларусі [8].

Актуалізацыю адзначанага ракурсу анамастычнай навукі дэманструюць рэгіянальныя канферэнцыі “Анамастыка ў Смаленску і Віцебску”, “Ономастика Поволжья”, часопіс “Филологическая регионалистика”. У апошні час актывізавалася ўвага да краязнаўчых першакрыніц, асабліва каштоўным застаецца палявы метад збору фактычнага матэрыялу. У гэтым рэчышчы працуюць буйныя анамастычныя школы цэнтральных раёнаў Расіі – Растоў-на-Доне (Л.М. Шчацінін), Волагда (С.М. Смольнікаў), Перм (А.М. Палякова, Т.А. Сіроткіна), Урал (А.П. Беразовіч, М.Э. Рут), Казань (Г.Ф. Саттараў) і інш. Актыўна працуюць Лабараторыя рэгіянальнай анамастыкі ў Рэспубліцы Адыгея (Р.Ю. Намітокава) і навуковая школа рэгіянальнай анамастыкі ў Рэспубліцы Бурацыя (Л.В. Шулунова). Значны ўклад у развіццё рэгіянальнай украінскай анамастыкі ўнеслі прадстаўнікі Данецкай анамастычнай школы пад кіраўніцтвам Я.С. Оціна – Г.П. Лукаш, Я.В. Філатава. Рэгіянальная антрапанімія Украіны стала аб’ектам даследавання такіх вучоных, як А.Я. Бучко, М.А. Дзямчук, І.М. Жалязняк, П.П. Чучка, Л.М. Верхавых. Ля вытокаў латышскай анамастычнай навукі стаяла В. Дамбэ, анамастычныя ідэі прафесара распрацоўваюцца яе паслядоўнікамі А. Бушасам, П. Балодзісам, літоўскімі даследчыкамі Г. Блажэнай, А. Клявінскай.

З вывучэннем антрапонімаў рэгіянальнай лакацыі ў Польшчы звязаны імёны З. Абрамовіч, І. Мытнік (антрапанімія польска-ўкраінскага памежжа), К. Рымута, С. Роспанда, Я. Баўко, М. Койдар, М. Малец.

Такім чынам, рэгіянальная антрапанімія ўяўляе сабой асобны аб’ект анамастычных даследаванняў, якія шырока прадстаўлены не толькі на славянскай тэрыторыі, але і за яе межамі. Па выніках аналізу антрапаніміі асобных тэрыторый Беларусі можна меркаваць аб стане вывучанасці гэтых тэрыторый, аб характары рэгіянальных даследаванняў. Вывучэнне антрапанімікону асобнай тэрыторыі дазваляе выявіць не толькі асаблівасці мовы ў цэлым, але і лінгвістычную спецыфіку даследаванага рэгіёна.

Літаратура

1. Дергачев, В.А. Регионалистика [Электронный ресурс] / В.А. Дергачев. – Режим доступа: http://dergachev.ru/book-7/00.html. – Дата доступа: 25.08.2015.

2. Карніеўская, Т.А. Іменаслоў Гомеля другой паловы XX ст.: фарміраванне, паходжанне, функцыянаванне: аўтарэф. дыс. … канд. філал. навук: 10.02.01 / Т.А. Карніеўская; ІМЛ НАН Беларусі. – Мінск, 2011. – 21 с.

3. Лукашанец, А. Лакальная сістэма ўласных асабовых імён / А. Лукашанец // Studia Slawistyczne 1: Nazewnictwo na pograniczach etniczno-językowych. – Białystok, 1999. – S. 186–198.

4. Лукашанец, А. Родавыя (спадчынныя) найменні ў сістэме мясцовага антрапанімікону / А. Лукашанец // Studia Slawistyczne 2: Nazwy osobowe na pograniczach kulturowych. – Bialystok: Libra, 2000. – S. 89–97.

5. Подольская, Н.В. Словарь русской ономастической терминологии / Н.В. Подольская. – 2-е изд., перераб. и доп. – М., 1988.

6. Стрелецкий, В.Н. Историческая география и регионалистика: пути и перспективы взаимодействия / В.Н. Стрелецкий // Псковский регионологический журнал. – Псков, 2007. – № 5. – С. 3–13.

7. Тупиков, Н.М. Словарь древнерусских личных собственных имён / Н.М. Тупиков; [предисловие Ф.Б.Успенского]. – Москва: Языки славянских культур, 2005. – 1032 с.

8. Шахоўская, Т.У. Беларуская анамастычная лексікаграфія: фарміраванне, сучасны стан, вектары развіцця / Т.У. Шахоўская. – Мінск: Красн. звезда, 2012. – 257 с.

В.Э. Зіманскі, А.Г. Арцямёнак (Віцебск)

АСАБЛІВАСЦІ ЎЖЫВАННЯ АСАБОВЫХ НАЗОЎНІКАЎ ФЛАРЫСТЫЧНАГА ПАХОДЖАННЯ Ў БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ

Праект стварэння навукі пра мову на антрапалагічнай аснове ўпершыню быў распрацаваны В. Гумбальтам у XIX стагоддзі. “Чалавек становіцца чалавекам толькі праз мову, у якой дзейнічаюць творчыя першасілы чалавека, яго глыбінныя магчымасці. Мова ёсць адзіная духоўная энергія народа” [1, с. 314].

Мова створана па мерцы чалавека, таму і павінна вывучацца па гэтай мерцы – у гэтым асноўны сэнс папулярнай ідэі аб антрапацэнтрычнай лінгвістыцы, галоўная задача якой – выявіць, якім паўстае чалавек і этнас у моўнай адзінцы, моўных структурах, у самім ладзе мовы, якая ім створана і якой ён карыстаецца [2, с. 64].

Ідэя антрапацэнтрычнай лінгвістыкі не новая. “Спазнай мову, і ты спазнаеш таго, хто на ёй гаворыць” – гэтая агульнавядомая ісціна актуальная і ў наш час. Мовазнаўства канца XX – пачатку XXI ст. засяроджвае асноўную ўвагу на семантыцы, плённае вывучэнне якой немагчыма ў адрыве ад “чалавечага фактару”.

У сучасным мовазнаўстве ёсць нямала прац, прысвечаных разгляду асабовых назоўнікаў фаўністычнага паходжання, дзе даследчыкі спрабуць вызначыць суадносіны мовы і мыслення, мовы і пазнання, мовы і культуры праз прызму зоамарфічных метафар і параўнанняў [3; 4; 5]. Разам з тым назоўнікі фларыстычнага паходжання застаюцца амаль цалкам па-за ўвагай айчынных навукоўцаў, хоць, на наш погляд, пры дапамозе такіх найменняў выражаюцца разнастайныя адносіны, пачуцці, разумовыя здольнасці, псіхічны і фізічны стан, рысы характару чалавека і інш. Гэта

тэма распрацоўваецца сёння ў асноўным на матэрыяле іншых моў [6; 7]. Таму падаецца актуальным разгледзець асабовыя намінацыі, матывацыйнай базай якіх паслужылі беларускія лексічныя адзінкі з фларыстычнай прыродазнаўчай дэфініцыяй.

Мэтай артыкула з'яўляецца вызначэнне найбольш прадуктыўных фларыстычных намінацый, якія кладуцца ў аснову метафарычных найменняў асоб, і выяўленне іх стылёвых асаблівасцей.

Матэрыялам для даследавання паслужылі фальклорныя творы (узоры каляндарна-абрадавай, сямейна-абрадавай паэзіі, казкі, прыказкі, прымаўкі), мастацкія тэксты, а таксама "Тлумачальны слоўнік беларускай мовы" ў 5 тамах. Аналіз матывацыйнай базы слоў дазволіў акрэсліць шэсць груп асабовых назоўнікаў, утвораных ад назваў раслін і іх частак.

Адным з пашыраных спосабаў утварэння асабовых назоўнікаў з'яўляецца лексіка-семантычны, г. зн. метафарычнае або метанімічнае пераасэнсаванне зыходнай лексемы. Найбольшую цікавасць у гэтым плане выклікаюць метафарычныя назвы, якія адлюстроўваюць вобразны характар мыслення чалавека, яго здольнасць бачыць падобнае ў прадметах і з'явах рэчаіснасці.

Метафара з'яўляецца ўніверсальным механізмам самаўсведамлення асобы ў навакольным свеце і стварэння дадатковых сэнсаў. Чалавек, назіраючы за аб'ектамі жывой і нежывой прыроды, часта пераносіць іх характэрныя прыметы і назвы на іншых людзей. Характар гэтага пераносу ў значнай ступені залежыць ад культуры пэўнага народа, прыродных і гістарычных умоў яго бытавання.

Утварэнне метафарычных намінацый адбываецца на аснове лексем, якія абазначаюць: а) дрэвы: [Вучань:] – *Настаўніца-**калінка,** калі абедаць будзем?* [12, с. 68]; б) грыбы: *Дзяўчаткі мае, **сыраежачкі,** пасаліў бы я вас, няма дзежачкі* [8, с. 797]; *Хадзіў **спарыш** па вуліцы… А ніхто **спарыша** ў двор не завець* [9, с. 251]; в) кветкі: *І мамачка, мая **кветка,** не аддавай замуж улетку, я за зімку збяру сілку* [9, с. 112]; *Ты прыйдзі ка мне вясною, **кветкаю** прыйдзі; Зацвіці красой са мною, думку разбудзі…* [11, с. 47]; г) травы: *Я ў мастацкім агародзе Толькі марная трава. А якая? Смех, дый годзе: Я – пякучка-**крапіва*** [10, с. 32]; д) ягады: *Да зялёнай каліны Прыляцела зязюля; Да дзяўчыны-**маліны** Удаваўся Януля* [11, с. 48]; е) часткі раслін: *Ты прыйдзі ка мне улетку, **Коласам** прыйдзі; Песняй жніўнай на палетку Думку саладзі…* [11, с. 47].

У прыведзеных прыкладах пераважае станоўчая канатацыя лексем фларыстычнага паходжання: яны выражаюць пераважна адабрэнне, ласкальныя ці паважлівыя адносіны суб'екта маўлення да аб'екта апісання. Толькі ў вершы выдатнага сатырыка К. Крапівы з пэўнай доляй самаіроніі раскрываецца ўласны "гаваркі" псеўданім аўтара. Тут можна прыгадаць фларыстычны псеўданім яшчэ аднаго класіка беларускай літаратуры – Якуба Коласа.

Хутчэй нейтральную стылістычную афарбоўку мае намінацыя *спарыш*, але магчыма, што ў дадзеным выпадку рэалізуецца значэнне ‘міфічная істота ў выглядзе чорта ці птушкі, што прыносіць багацце або садзейнічае чараўнікам’, якое ўзыходзіць да базавай лексемы *спор* ‘прыбытак, удача, поспех’ [13, с. 262]. Выразнай этнакультурнай адметнасцю вылучаюцца найменні *каласкі* ‘мужчыны’ і *калінкі* ‘жанчыны’ ў цыкле твораў У. Ліпскага пра аўцюкоўцаў [12].

Як паказвае праведзены аналіз, фларыстычная метафара здольная адлюстроўваць самыя розныя бакі жыцця чалавека, яго думкі і пачуцці, даваць трапную характарыстыку канкрэтным асобам. Можна меркаваць, што ў нашых продкаў здаўна існаваў своеасаблівы код успрымання рэчаіснасці праз прызму раслін. Так, выключна пра чалавека ідзе гаворка ў фраземах і прыказках кшталту *аднаго поля ягады; не нашага поля ягада; гнілое дзерава доўга жыве; яблыка красівае, але ў сярэдзіне гнілае; дуб вялікі, да дуплаваты*.

Па нашых назіраннях, лексемы падобнага тыпу найбольш часта і яскрава прадстаўлены ў вершах Янкі Купалы і Кандрата Крапівы, дзе аўтары спасылаюцца на народныя песні, якія можна лічыць сапраўднымі крыніцамі ўзнікнення асабовых назоўнікаў фларыстычнага паходжання.

Літаратура

1. Гумбольдт, В. Избранные труды по языкознанию / В. Гумбольт. – М.: Прогресс, 1984. – 397 с.
2. Караулов, Ю.Н. Так что же такое “языковая личность”? / Ю.Н. Караулов // Этническое и языковое самосознание: материалы конференции. – М.: Институт нар. России, 1995. – С. 63–65.
3. Дуличенко, Л.В. Антрополексемы с негативным значением и их лексикографическое описание: Автореф. дис. … канд. филол. наук / Л.В. Дуличенко. – Санкт-Петербург, 2000. – 16 с.
4. Росинене, С.-Г.И. Характеристика человека зоонимами в литовском языке: Автореф. дис. канд. филол. наук // С.-Г.И. Росинене. – Вильнюс, 1978. – 21 с.
5. Рыжкина, О.А. Лексико-семантическая группа зооморфизмов с общим семантическим компонентом "неловкий" / О.А. Рыжкина // Актуальные проблемы лексикологии и словообразования. – 1978 . – Вып.7 . – С. 25–33.
6. Шевчик, А.В. Образные зоонимы русского и английского языков: общность и специфика / А.В. Шевчик // Вестник Томского государственного университета. – 2011. – № 343. – С. 30–33.
7. Бебчук, Е.М. Образный компонент в лексическом значении русского существительного: автореф. дис. … канд. филол. наук / Е.М. Бебчук. – Воронеж, 1991. – 16 с.
8. Беларускі фальклор: хрэстаматыя: вучэб. дапам. для філал. фак. ВНУ / склад. К.П. Кабашнікаў і інш. – 4-е выд., перапрац. – Мн.: Выш. шк., 1996. – 856 с.
9. Жніўныя песні / АН Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору. – Мн.: Навука і тэхніка, 1993. – 238 с.
10. Крапіва, К. Збор твораў у 6 т. Т. 1. Вершы, байкі, эпіграмы, паэмы / К. Крапіва. – Мн.: Маст. літ., 1997. – 462 с.
11. Купала, Я. Поўны збор твораў. У 9 т. Т. 3. Вершы, пераклады 1911 – 1914 / Я. Купала. – Мн.: Маст. літ., 1997. – 342 с.

12. Ліпскі, У. Аўцюкоўцы: Аповесць пра калінак ды каласкоў, якія гаруюць і жартуюць / У. Ліпскі. – Мн.: Маст. літ., 1995. – 223 с.

13. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 12. С / уклад. Р.М. Малько, Г.А. Цыхун. – Мн.: Беларус. навука, 2008. – 366 с.

А.А. Калеснікава (Мінск)

КАНЦЭПТУАЛЬНАЯ АПАЗІЦЫЯ “СВОЙ” – “ЧУЖЫ” Ў БЕЛАРУСКІХ ПАРЭМІЯХ З КАМПАНЕНТАМ “ДОМ”

Палярныя катэгорыі “левы” – “правы”, “мужчынскі” – “жаночы”, “верх” – “ніз”, “пусты” – “поўны”, “жыццё” – “смерць”, “дабро” – “зло”, “космас” – “хаос” пранізваюць культуру любога народа, выступаюць універсальнымі сродкамі пазнання рэчаіснасці. Адным з найстаражытнейшых і фундаментальных супрацьпастаўленняў з’яўляецца канцэптуальная апазіцыя “свой” – “чужы”. Параўноўваючы сваё і чужое, чалавек выдзяляе падабенства і адрозненні, дае адрозненням эмацыянальную ацэнку, пры якой усё сваё прызнаецца нормай, а ўсё чужое атрымлівае крытычную ацэнку як дзіўнае, недастатковае, перабольшанае, небяспечнае, смешнае, брыдкае і г. д. [3, с. 5].

Матэрыялам нашага даследавання сталі беларускія парэміі з лексемамі *дом, хата, двор* і іх дэрыватамі (656 адзінак), якія з’яўляюцца часткай намінатыўнага поля канцэпту “дом”. Сабраныя парэміялагічныя адзінкі выразна падзяляюцца на некалькі груп.

1. Дом як локус “свайго”, роднага, носьбіт станоўчай канатацыі. У такім выпадку дом, хата, двор надзяляюцца якасцямі жывых аб’ектаў: *Дамоўка не вораг: калі ні прыдзеш, заўсёды прыме*; *Без хазяіна і дом сірата* [6]; *Двор без гаспадара плача* [2]; часткі дома, яго атрыбуты таксама персаніфікуюцца: *Дома і вуглы дапамагаюць* [1]; *У сваёй хаце і вуглы дапамагаюць* [2]; *У сваёй хаце і качарга маці*; *У сваёй хаце і качарга помач* [6]. Дом з’яўляецца закрытай прасторай для чужых людзей: *На вуліцу з хаты смецця не вынось* [2]*; З хаты смецця не вынось на чужы падворак* [2], [6]; *Сваю гразь удома апалосквай*; *Не расказывай нікому, што робіцца ў дому; Што ў маём дому, то ніц да таго нікому* [6]. У парэміялагічных адзінках адлюстроўваецца выразна індывідуальны характар пабудовы сямейных стасункаў, іх аўтаномнасць: *Ваша хата, ваша і праўда*; *Ва ўсякай хаце свая печ* [2]; *Усякай хаце па печы; Што двор, то нораў; Што ні дзярэўня – вера, што ні дом – толк; Што ні хата, то свой комін* [6].

2. “Чужое”, прастора па-за межамі дому, локус небяспечнага, дрэннага, адмоўнага, негатыўнага. Жыццё на чужыне, у чужым доме ўяўляецца цяжкім, адзінокім, непаўнацэнным, небяспечным і можа атаясамлівацца са смерцю: *Зашлі за Дунай – і двару не думай; Не дай бог у чужой хаце жыць, у чужой печы паліць* [6]; *Хата чужая – свякруха ліхая;*

Чужая хата горш за ката [2]; *Чужая хата не грэе; З'ехаў на чужыну, як звaліўся ў дамавіну* [6]. Негатыўную ацэнку ў народным светаўспрыманні атрымлівае і працяглае знаходжанне па-за межамі дому, выкліканае службай у войску, наёмнай працай і іншымі жыццёвымі абставінамі: *Хто хоча гора нажыць, няхай ідзе да двара служыць* [2]; *Чужую хату тапіць – свае вочы сляпіць; Ваяка ваюе, а жонка дома гаруе; Салдат ваюе, а дзеці дома гаруюць; Лепей дома касою касіць, чым у войску ранец насіць; Лепей дома хлеб аўсяны, як на вайне пытляваны* [6].

3. Прамежкавая зона паміж "сваім" і "чужым". Дарога ў міфалогіі беларусаў увасабляе сувязь з іншасветам і светам памерлых [5, с. 140-141], таму даволі часта ў парэміялагічных адзінках названы канцэпт выступае як небяспечная з'ява, супрацьпастаўляецца дамашняй, асвоенай прасторы, выклікае розніцу ў паводзінах чалавека ў доме і па-за яго межамі: *Знаем, калі выбіраемся з дому, а калі назад – бог ведае; Калі не ведаеш дарогі, не выязджай з дому; Высока сарока лятае, ды дома не начуе; Сарока напрамкі (напрасткі) лятае, ды дома ніколі не бывае; Хто дарогу кружыць, ніколі не тужыць, а хто прастуе, удома не начуе; Не можна верыць каню ў дарозе, мужыку ў астрозе, а жонцы дома* [6]; *Хто па дарогах ходзіць, хаты з сабою не носіць* [2]. Апазіцыя "свой" – "чужы" назіраецца і ў парэміях, прысвечаных неабходнасці чалавека рэалізаваць сябе па-за межамі дому, у знешнім свеце. У такіх адзінках падкрэсліваецца абавязковая ідэя вяртання з гасцей, з падарожжа або з працы на чужыне ў сваю дамашнюю прастору: *Абышоў усе ломы, ды й зноў да дому; Дай Божа прадаваць, абы ў дома начаваць; З ліхога торгу хаця б з носам дамоў; Да свае дамоўкі няма астаноўкі* [1]; *Дзе ні блудзім, а ўсё дамоў будзем; Дзе ні бывай, дому не мінай; Дзень выганяе з хаты, а ноч прыганяе; У людзях шануюць, але дома начуюць; Хоць бы морам плылі, абы б скарэй ва дварэ былі; Якая ні рада, а дадому ісці нада; У гасцях добра, а дома лепш; У гасцях каша, а дома кулеш, да за кашу лепш* [6].

У пагранічным становішчы паміж "сваімі" і "чужымі" аказваюцца новыя члены сям'і і людзі, якія часова ўваходзяць у прастору дому, абмежаваную ці закрытую для несваякоў. Так, у беларускіх парэміях назіраецца пераважна негатыўнае стаўленне да нявесткі і да зяця-прымака: *Калі ў хаце завядзецца нявесціна лыжка, то не будзе старому ложка; Дзе нявесткі ў хаце тры, там няма вады ў вядры* [6]; *Датуль нявестка была міла, пакуль бруд з хаты насіла* [2]; *Няма ў хаце сала й малака, дык няма й прымака; Пусці зяця, калі няма чорта ў хаце* [6].

Значнае месца ў парэміялагічным фондзе займаюць адзінкі, у якіх рэпрэзентуецца канцэпт "госць". У народнай традыцыі госць – гэта асоба, якая злучае сферы "свайго" і "чужога", з'яўляецца прадстаўніком "іншага" свету, выклікае шэраг рытуальных дзеянняў жыхароў хаты. У значнай колькасці беларускіх парэмій традыцыйна ўсхваляецца гасціннасць гаспадароў: *Госць на парог – радасць у хату*; *Госць у дом, бог у дом* [1];

Дарагая тая хата, дзе любяць госця і (й) свята; Хата багата, але гасцей малавата [2]; *Хата гасцямі багата* [6]. Разам з тым госць можа ўспрымацца як негатыўная, непажаданая з'ява: *Госць на двор, і бяда на двор* [6]. Для гасцей распрацавана пэўная сістэма правілаў: *Калі госць, так гасці, а двара не касці: пастаўлю на парог, пакажу сем дарог* [6]; *Прыйшлі ў маю (нашу) хату і (ды) б'юць майго (нашага) тату* [4]; *У сваёй хаце будзь гаспадаром, а ў чужой ягнём* [1]; *Усяк знай сябе, указывай дома; Будзьце, як дома, але не забывайце, што ў гасцях* [6]. Асабліва трэба памятаць аб працягласці часу гасцявання: *Бессаромнага госця скваркамі з хаты не выпрасіш; Госць па абедзе дамоў едзе; Госць першы дзень – золата, другі – серабро, а трэці – медзь, хоць і з двару едзь; Напрасіліся злыдні на тры дні, а цяпер і з хаты не выжанеш* [6].

У парэміялагічных адзінках з кампанентам "дом" назіраецца амбівалентнае стаўленне да суседзяў: *Не купі двара, а купі суседа; Хто мае суседку ў хату пусціць, то няхай лепей бо́рану на том месцы паставіць; Пусці суседа ў хату, то сам выбірайся з хаты* [6]. Негатыўную ацэнку атрымліваюць чужыя людзі, якія ўваходзяць у абмежаваную прастору дому на доўгі час: *Аднаго Юрку ўпусцілі, а ўся хата заюрылася; Бадай, ніхто добры не сядзеў у чужой хаце; Дольніка на двор не бяры* [6]; *Чым кватаранта ўзяць, лепей барану ў хаце паставіць* [2].

Значную колькасць беларускага парэміялагічнага фонду складаюць адзінкі, у якіх выразна рэпрэзентуецца апазіцыя двух гештальтаў "сваё" і "чужое". Часта пры гэтым "сваё" выступае найбольш жаданым, прыярытэтным, нават калі яно з'яўляецца відавочна горшым па сваіх якасцях: *Дома і салома ядома, а на чужыне і гарачы тук стыне; Мілей свая хатка, як чужая вёска; Как ні харашо на Дану, да не так, як у сваім даму; Лепей дома на саломе, чым замужам на падушках* [6].

У шэрагу парэмій адлюстроўваецца даволі спакойнае стаўленне чалавека да непазбежнасці смерці. Пераход у свет памерлых асэнсоўваецца як перасяленне ў "апошні" дом: *Жывому хата, а пакойнаму магіла* [6]; *Жывы не без хаты, а мёртвы не без магілы (не без труны)* [2]; *Плач – не плач, а з дому прач* [1]; *Прыйшла пара – ідзі з двара* [2]; *Усе* ***дадому*** *пойдуць, але лепш пазней* [6].

Прыкладамі парушэння канцэптуальнай апазіцыі "свой" – "чужы" з'яўляюцца сітуацыі, апісаныя ў парэміях *І ў сваёй хаце не вольна* [2], [6] і *Ён госцем у сваім двары бывае* [2]. У прыведзеных адзінках назіраецца кагнітыўны дысананс, неадпаведнасць паміж прывычнымі кагніцыямі. Парушэнне гармоніі паміж "сваім" і "чужым" адзначаецца і ў парэміях *Я не я і хата не мая* [1]; *Я не я, хата не мая, і гаспадар не я* [2], якія ўжываюцца для выражэння крайняй ступені адчужанасці ад пэўнай падзеі ці з'явы, нежадання прымаць удзел у канфліктных сітуацыях.

Такім чынам, аналіз парэміялагічных адзінак з лексемамі *дом, хата, двор* і іх дэрыватамі, якія ўваходзяць у склад намінатыўнага поля канцэпту “дом”, дазволіў зрабіць наступныя высновы:

1) дом, дамашняя, асвоеная прастора, якая можа семантычна пашырацца да памераў радзімы, традыцыйна маркіруецца як “сваё”, асабістае, станоўчае, роднае, ідэальнае, эталоннае;

2) прастора па-за межамі дому, чужы дом, жыццё на чужыне маркіруецца як “чужое”, негатыўнае, небяспечнае, непаўнацэннае;

3) уваходжанне ў закрытую дамашнюю прастору іншых людзей (гасцей, новых членаў сям’і, суседзяў і г.д.) можа ўспрымацца як патэнцыйная пагроза яе стабільнаму функцыянаванню;

4) архетыпічнае дзяленне свету на “свой” і “чужы” з’яўляецца важным сродкам пазнання і структурацыі прасторы, уплывае на псіхалагічны стан чалавека, рэгулюе яго паводзіны.

Літаратура

1. Аксамітаў, А. Прыказкі і прымаўкі: Тлумач. слоўн. бел. прык. і прым. з арх., кафедр. збораў, рэд. выд. XIX і XX стст. – 2-е выд., дапрац. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 320 с.
2. Беларускія прыказкі, прымаўкі, фразеалагізмы / склад. Ф. Янкоўскі. – 3-е выд., дапрац., дап. – Мінск: Навука і тэхніка, 1992. – 491 с.
3. Иная ментальность / В.И. Карасик [и др.]. – М.: Гнозис, 2005. – 352 с.
4. Лепешаў, І.Я. Этымалагічны слоўнік прыказак / І.Я. Лепешаў. – Мінск: Вышэйшая школа, 2014. – 141 с.
5. Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; рэд. Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – 607 с.
6. Прыказкі і прымаўкі: У 2 кн. / рэд. А.С. Фядосік. – Мінск: Навука і тэхніка, 1976. – Кн. 1–2.

В.А. Кірпічэнка, Г.К. Семянькова (Віцебск)

АСАБЛІВАСЦІ СЕМАНТЫКІ АДАНТРАПАНІМНЫХ НЕАФІЦЫЙНЫХ УРБАНОНІМАЎ БЕЛАРУСІ

Вывучэнне найменняў гарадскіх аб’ектаў з’яўляецца важным, бо ўрбанонімы – “гэта як бы згустак усіх тапанімічных тыпаў” [2, с. 15]. У большасці прац апісваецца афіцыйная ўрбананіміка. Неафіцыйныя ж назвы акумулююць народную семантыку, светапогляд, у іх адбіваецца менталітэт і мысленне народа. У сувязі з гэтым праведзенае намі даследаванне з’яўляецца актуальным. Мэта – выяўленне асаблівасцяў семантыкі адантрапанімных неафіцыйных урбанонімаў Беларусі.

Матэрыялам для даследавання паслужылі запісы неафіцыйных найменняў гарадскіх аб’ектаў двух гарадоў Беларусі – Віцебска і Мінска. Матэрыял быў сабраны на працягу 2014 – 2015 гг. шляхам апытання прадстаўнікоў розных узростаў (ад 16 да 82 гадоў), сацыяльных груп і колаў інтарэсаў. У анкетаванні прынялі ўдзел 43 чалавекі: 30 віцяблян і 13 мінчукоў. У выніку было сабрана 200 неафіцыйных урбанонімаў, з іх

107 бытуюць на тэрыторыі Мінска, 93 – на тэрыторыі Віцебска. Метады даследавання – апісальны, колькасны, апытанне, анкетаванне.

Паводле семантыкі ўсе неафіцыйныя ўрбанонімы дзеляцца на 10 груп: найменні гарадскіх аб'ектаў, дадзеныя па іх колеры, форме, падабенстве да шырокавядомых збудаванняў, месцы знаходжання, асаблівасцях функцыянавання, рэльефу, ландшафту, заснаваныя на з'яве метаніміі, адантрапанімныя, у аснове якіх ляжыць гістарычная матывацыя, утвораныя ад афіцыйных назваў шляхам скарачэння.

Разгледзім самую вялікую па колькасці прыкладаў групу – адантрапанімныя ўрбанонімы. Названая група з'яўляецца не толькі адной з самых вялікіх па колькасці прадстаўленых у ёй адзінак (33 урбанонімы, што складае 16 % ад агульнай колькасці найменняў), але і самай багатай па колькасці прадстаўленых у ёй падгруп (3):

1) найменні забудовы, дадзеныя па прозвішчы яе архітэктара; гэта самая нешматлікая падгрупа, якая налічвае 2 прыклады, ці 1 % ад агульнай колькасці сабраных найменняў:

Асмалоўка – раён вуліц Кісялёва і Камуністычнай названы так па імені архітэктара забудовы – М.С. Асмалоўскага (Мінск),

Дом Мусінскага – дом "На Нямізе", архітэктарам якога з'яўляецца С.С. Мусінскі (Мінск);

2) адыменныя і адпрозвішчныя неафіцыйныя ўрбанонімы; падгрупа складаецца з 12 найменняў, утвораных ад імёнаў, прозвішчаў, мянушак рэальных людзей і герояў літаратурных твораў:

Аляксандарплац – плошча Перамогі, якая была рэканструявана ў 2009 – 2010 гг.; названа плошча па імені ініцыятара яе рэканструкцыі – на той час губернатара Віцебскай вобласці Аляксандра Мікалаевіча Косінца (Віцебск),

Башня Святога Лаўрэнція, Башня Цанавы – невялікая вежа на будынку Камітэта дзяржаўнай бяспекі Рэспублікі Беларусь; назву атрымала ад імені Лаўрэнція Цанавы, намесніка Лаўрэнція Берыі ў Беларусі (Мінск),

Вольга – гандлёвы цэнтр "Мега", на месцы якога раней знаходзіўся гандлёвы дом "Вольга" (Віцебск),

Гімназія Пушкіна – скарочаная назва Дзяржаўнай установы адукацыі "Гімназія № 3 г. Віцебска імя А.С. Пушкіна",

Колас – Нацыянальны акадэмічны драматычны тэатр імя Якуба Коласа (Віцебск),

Маргуша – былая невялікая харчовая крама побач з інтэрнатамі Беларускага інстытута механізацыі сельскай гаспадаркі, у 80-х гадах тут працавала жанчына, якая міжвольна міргала вачамі, што і стала прычынай для ўзнікнення прыведзенай назвы аб'екта (Мінск),

Машэрава, Машэрка, Машэрык – установа адукацыі "Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава",

Паніка, Панікоўка – сквер побач з рэзідэнцыяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь і тэатрам імя Янкі Купалы, назва паходзіць ад скульптурнай

кампазіцыі фантана (хлопчык з лебедзем); жыхары Мінска параўноўваюць хлопчыка з Панікоўскім, а лебедзя – з гуссю (“Золотой телёнок”, аўтары І. Ільф і Я. Пятроў); неафіцыйнае найменне ўзнікла на аснове асацыяцый з вядомым творам і яго героямі (Мінск).

Як відаць, найменні падгрупы прадстаўлены пераважна назоўнікамі (9 прыкладаў з 12), двойчы сустракаюцца назвы, пабудаваныя па мадэлі *“назоўнік” + “назоўнік”,* адзінкавым з’яўляецца спалучэнне *“назоўнік” + “прыметнік” + “назоўнік”*;

3) скарочаныя ўрбанонімы, у аснове якіх імёны ці прозвішчы вядомых людзей; падгрупа прадстаўлена 19 найменнямі (9,5 % ад агульнай колькасці сабранага матэрыялу), якія з’яўляюцца вынікам скарачэння афіцыйных адтапанімных назваў гарадскіх лінейных аб’ектаў:

Гагры – раён вуліцы Гагарына (Віцебск),

Герцуха – вуліца Герцэна (Віцебск),

Казлабродская – назва вуліц Казлова і Даўгабародскай, адна з’яўляецца працягам другой (Мінск),

Каржы – раён вуліцы Каржанеўскага (Мінск),

Карлачка – вуліца Карла Лібкнехта (Мінск),

Карлуха – раён вуліцы Карла Маркса (Віцебск),

Кароста – вуліца Карастаянавай (Мінск),

Курлы-Мурлы – вуліца Карла Маркса (Мінск),

Маяк – сквер Маякоўскага (Віцебск),

Маякоўка – вуліца Маякоўскага (Мінск),

Пушка – раён станцыі метро Пушкінская (Мінск),

Ракасы – праспект Ракасоўскага (Мінск),

Розачка – вуліца Розы Люксембург (Мінск),

Церахі, Цераха – раён вуліцы Церашковай (Віцебск),

Чарняхоўка, Чарняхі – раён праспекта Чарняхоўскага (Віцебск),

Юрка, Юр’еўка – лесапарк Юр’ева горка (Віцебск).

Падгрупа складаецца ў асноўным з назоўнікаў. Характэрна, што назоўнікі ў форме множнага ліку і назоўнікі ў форме адзіночнага ліку прыкладна супадаюць па колькасці;

Такім чынам, група адантрапанімных найменняў з’яўляецца самай прадуктыўнай сярод семантычных груп неафіцыйных урбанонімаў Беларусі. У аснову такіх назваў пакладзена, як правіла, відазмененае (утворанае шляхам скарачэння, скарачэння і далучэння фарманта і інш.) афіцыйнае найменне. Адантрапанімныя адзінкі амаль пазбаўлены эмацыйнасці, метафарычнасці.

Прынцыпы намінацыі афіцыйнай урбананіміі Беларусі, выдзеленыя Г.М. Мезенка [1, с. 92], могуць быць прыменены і да неафіцыйнай урбананіміі. З чатырох прынцыпаў намінацыі ў групе адантрапанімных найменняў праяўляецца толькі два – назва аб’екта па сувязі з чалавекам (у найбольшай колькасці прыкладаў), назва аб’екта па адносінах да іншых значных аб’ектаў (у нешматлікіх адзінках). У прааналізаванай групе не

выяўлены прынцып намінацыі аб’екта па ўласцівых яму асаблівасцях і якасцях (аднак у іншых семантычных групах неафіцыйных урбанонімаў гэты прынцып з’яўляецца дамінуючым) і прынцып намінацыі па сувязі аб’екта з абстрактным паняццем (у іншых групах таксама выяўляецца).

У сувязі са сказаным нельга не пагадзіцца з Г.М. Мезенка, што “матывацыя ўрбаноніма абумоўлена не толькі прыродай названага аб’екта, суб’ектыўным бачаннем стваральніка ўрбананімнай адзінкі, але і лексіка-семантычнымі рэсурсамі ўрбананімнай і анімічнай сістэмы” [1, с. 95].

Літаратура

1. Белорусская ономастика. Топонимия: учеб. пособие для студентов учреждений высшего образования по филологическим специальностям / А.М. Мезенко [и др.]; под общ. ред. А.М. Мезенко. – Минск: Элайда, 2012. – 260 с.

2. Суперанская, А.В. Что такое топонимика? Из истории географических названий / А.В. Суперанская. – Москва: Наука, 1984. – 182 с.

Т.А. Кісель (Брэст)

ДЭНДРОНІМЫ Ў КАНТЭКСЦЕ АПАВЯДАННЯЎ ВЯЧАСЛАВА АДАМЧЫКА

Чалавек і прырода, мінулае і сучаснае, радасць і гора, каханне і здрада – свет, які ўмела і непаўторна стварае ў апавяданнях вядомы беларускі празаік Вячаслаў Адамчык. Праз апісанне ўбачанага і ўласна перажытага, праз побытавыя сцэны і пейзажныя замалёўкі, што часта набываюць сімвалічнае значэнне, аўтар стварае рэальнасць, у якой жывуць героі яго твораў. Асаблівую ўвагу пры гэтым Вячаслаў Адамчык надае рэчам, дробязям, што, на першы погляд, могуць падацца не абавязковымі, але для аўтара кожная з іх набывае сімвалічны сэнс. Такая аўтарская ўвага да дэталяў прасочваецца і праз частае выкарыстанне ў творах разнастайнай фітанімічнай лексікі. Тут адзначаюцца назвы лясных і садовых дрэў і кустоў, траў, кветак і ягад, збожжавых, агародных і кармавых культур.

У дадзеным артыкуле прадстаўлены найменні лясных і паркавых дрэў і кустоў, якія ўжываюцца ў апавяданнях Вячаслава Адамчыка. Для аналізу былі ўзяты апавяданні са зборніка “Песня: апавяданні” [1].

Сярод зафіксаваных дэндронімаў пераважаюць агульнапрынятыя назвы (*бэз, бяроза, вярба, каліна, каштан* і інш.). Адзінкавыя найменні маюць дыялектныя варыянты ўжывання (*арабіна, топаль, ялавец*) і памяншальна-ласкальныя формы (*бярэзінка, ліпка, хвойка*). Аналізуемыя фітонімы могуць ужывацца як у адзіночным (*бярэзіна, сасна, таполя, хвойка* і інш.), так і множным ліку (*асіны, бярэзіны, дубы, сосны* і інш.). Усе яны арганічна ўведзены аўтарам у апісанні акаляючага свету сваіх герояў, дапамагаюць стварыць жывыя малюнкі прыроды. Сведчаннем гэтага будуць наступныя прыклады.

Алешына: *Старая алешына з колам на вяршку (мусіць, зацягнуў Марцін для буслоў, але на ім крычалі, аж давячыся, вароны) берагла гэты грудок ад паводкі* (“Дзікі голуб”) [1, с. 49]; *Недзе з алешыны, з камля, падала на ваду і бездапаможна церабілася чорная малюсенькая мурашка…* (“Жывая вада”) [1, с. 133]; *Пад навіслаю старою алешынаю кружылася жоўтая шапка пены* (“Салодкія яблыкі”) [1, с. 149].

Асіна: *Лес там-сям быў жаўтаваты – на асінах і бярэзінах чэзла лісце* (“Дзікі голуб”) [1, с. 44].

Бэз: *У нас каля бэзу яшчэ гарэў і абвальваўся плот* (“Два злоты”) [1, с. 111]; *Мястэчка было мокрае, соннае: па гонце на стрэхах, па цёмным бэзе ў гародчыках холадна расіў дождж* (“Кароль Нябожа”) [1, с.161]; *Мы сядзелі на двары ля густога яловага частакола, дзе да кусціка бэзу прытулілася нізкая лавачка* (“Зоня”) [1, с. 251]; *Ён, гэты стары ў зялёным аксамітным моху куст бэзу помніць мяне* (“Сцежка на расходніку”) [1, с. 334].

Бяроза: *Пры лясах у лягчыне шарэла нашая вёска, жоўклі бярозы пад хатамі* (“Урок арыфметыкі”) [1, с. 20].

Бярэзіна: *На нашай бярэзіне на белых павуцінах гайдаліся зялёныя чарвякі, абрываліся, нячутна падалі на траву* (“Раяль з адламаным вечкам”) [1, с. 12]; *У Хведаравых на надворку расла старая бяроза, і ўсе ў вёсцы казалі на гэтае месца “пад бярэзінаю”* (“Салодкія яблыкі”) [1, с. 146]; *Ён зноў пачуў радасць, што сядзіць дома за ясеневым сталом з вялікімі шчылінамі і што ў хаце, як і некалі, пахне вільгаццю, кустамі, і што з хаты відаць перацвілы бэз, бярэзіну з пажоўклым спаднізу лісцем, страху суседняе хаты і нахілены комін, як некалі* (“Аржаны колас”) [1, с. 267–268]; *Абвешаныя мігатлівымі зорамі, чуйна драмалі заінелыя бярэзіны* (“Сон у калядную ноч”) [1, с. 366].

Бярэзінка: *А тут, дзе стаяла некалі хата, горбаю ляжала патрушчаная цэгла, між яе выбілася трава і паднялася ўжо высокая бярэзінка…* (“Дзікі голуб”) [1, с. 70]; *Я любіў гэтую праменькую, з адзінокімі прахожымі сцежку, што абягала самотны цётчын хутар з недакончанаю хатаю ці, праўдзівей, толькі з выведзеным пад бэлькі зрубам, з гумном і нізкім хлявом, за якім узнёсла шапацела трапяткая бярэзінка* (“Сцежка на расходніку”) [1, с. 321].

Вербалоз: *На рагу могілак, ужо на гэты бок плота, чуе вясну гонкі вербалоз: на яго карычневых пасынках набрынялі каткі, і з іх, як вата з рубца, лезе серабрысты пушок* (“Антак – Фэляк”) [1, с. 272].

Вярба: *Некалі тут, пад вярбою, – цяпер яна старая, у тоўсты яе камель глыбока паўрастаў калючы дрот, – майго дзеда Івана Шайбака да смерці напалохала Віктукова Марыся…*(“Жывая вада”) [1, с. 134]; *Сценка спусцілася з груда, і было відаць балотца: гнуліся ў адзін бок і густа блішчалі сівізною вербы* (“Кароль Нябожа”) [1, с. 174]; *Піць ваду бегала аж да завоінкі на балота, пад старую вярбу* (“Сонечны зайчык”) [1, с. 238]; *Дабегшы да бе-*

рага, затрапяталася, як птушка, якой няма куды дзецца, але ўбачыла пахіленую вярбу і спрытна пырхнула на дрэва (“Зоня”) [1, с. 250];

Дуб: *І я потым схадзіў, ужо разам з дзецьмі, і нарваў торбу гэтага лякарства: яно расло на дубах, вісела зеленаватымі карункамі на камлях, усё болей з таго боку, дзе няма сонца, і высока ад зямлі* (“Дзікі голуб”) [1, с. 59]; *Наўкруга ўздымаюцца белыя заснежаныя пагоркі з замглёнымі ўпадзінамі дуброў і пералескаў, з чорнымі адзінокімі дубамі*…(“Сон у калядную ноч”) [1, с. 367].

Елка: *За плотам стаіць высокая ссохлая елка; кара на ёй аблупілася, камель зрабіўся шэры і патрэскаўся, як слуп* (“Антак – Фэляк”) [1, с. 272].

Каліна: *І мне нават пачынала здавацца, што там, за Янэчкаваю хатаю, за белым, як на шырокім стале абрусам, балотцам, у шэрасіняватай смузе маладога алешніку дрыжыць ад гаку сякеры гэтыя тонкія, з чырванню рэдзенькіх перамерзлых ягад шэрыя каліны, абярнуўшыся ў нешта жывое – у маладых сястрыц*… (“На тутэйшай зямлі”) [1, с. 199].

Каштан: *Мы бяром услончык і ідзём садзіцца пад малады лапушысты са зрэзанай верхавінай, знявечаны каштан*… (“Удава”) [1, с. 311].

Клён: …*Мы выйшлі на хмураваты асенні двор, засыпаны жоўтабарвовым лісцем са старога, сумна нахіленага над школаю клёна, каб ужо навучыцца па камандзе ваенрука браць вінтоўку “на плечо!”, а потым – “к ноге!”* (“Альціст з местачковай аркестры”) [1, с. 352].

Ліпа: *Ліпа, размахваючы голлем, зашалясцела мацней* (“Млечны Шлях”) [1, с. 220]; *Цяжкі лабаты самазвал з трыма жоўтымі агеньчыкамі на блакітнай кабіне з моцным гулам і пранізліва-вострым візгам тармазоў рэзка звярнуў убок, ломячы трубчатую агароджу і дзве маладзенькія чорнакарычневыя ліпы* (“Сон у калядную ноч”) [1, с. 396–397].

Ліпка: *Сярод двара, недалёка ад котлішча, зелянела таўставатая ліпка з адламаным вяршком – я ўжо і не помню, ці расла яна тут* (“Дзікі голуб”) [1, с. 70].

Рабіна, арабіна: *Па пяску слаўся падбел, цвіў белымі чачоткамі, як у рабіны, крываўнік, і гнала ў гору асот*… (“Дзікі голуб”) [1, с. 49]; *І на гарышчы густа і цёпла запахла арабінаю і бэзам* (“Сонечны зайчык”) [1, с. 241].

Сасна: *За школаю едкім, удушлівым гарам пахла свежае пажарышча, і ў тонкай сасне маладою цягучаю смалою заплываў незаржавелы асколак ад бомбы* (“Урок арыфметыкі”) [1, с. 16]; *У класе наставала цішыня, толькі за вокнамі тамліва шумелі і роўна пахіставаліся блізкія сосны, і на апошняй парце, змарыўшыся за доўгі перапынак, густа адсопваўся Капейка* (“Урок арыфметыкі”) [1, с. 17]; *Над галавою ў сосняў трашчалі сухім галлём сытыя гракі, укладваючыся нанач, трывожна-рэдка крычалі ў густой цемнаце* (“Дзень ранняе восені”) [1, с. 119].

Таполя, топаль: *Пад акном, песцячыся на цёплым сонцы, зазелянела таполя, і яе настоены на паветры гаркаваты пах разам з вільгаццю зямлі і камяніцы панаваў тут, у зацішным кутку чытальнай залы* (“Млечны Шлях”) [1, с. 224–225]; *З някрытага грузавіка, з дашчанай яго скрыні туды, пад топаль, выгружалася яшчэ адна сям’я…* (“Альціст з местачковай аркестры”) [1, с. 340]; … *На дварэ было азыравата пасля ўчарашняга дажджу, вастраваты вецер шумеў цёмна-зялёным маладым таполям за страхою чужое хаты* (“Аржаны колас”) [1, с. 266].

Хвойка, хвоечка: *Сабаку перанялі за маладымі хвоечкамі…* (“Дзікі голуб”) [1, с. 66]; *Там, дзе некалі былі маладыя хвоечкі, цяпер маўкліва цямнеў сіваваты малады лясок…* (“Дзікі голуб”) [1, с. 70]; *У разорах падымаюцца абвешаныя радужнай сінявата-залацістай павуцінай, натапыраныя, як кацяняты, пасаджаныя вясною хвоечкі* (“Сцежка на расходніку”) [1, с. 333]; *Што на тым месцы, дзе цяпер рэчка падмывае сыпкі груд, дзе расце крывая хвойка, … стаяла некалі хата* (“Жывая вада”) [1, с. 135].

Шыпшына: *Толькі адзінока сумаваў разложысты кусцік шыпшыны, і на ім чырванелі спелыя ягады* (“Дзікі голуб”) [1, с. 70]; *На шыпшыне ліняў і асыпаўся цвет – самая цёплая пара лета* (“Кароль Нябожа”) [1, с. 175].

Явар: *Сухім звонкім срэбрам пераліваўся явар за зрубам…* (“Аржаны колас”) [1, с. 271].

Ядловец, ялавец: *У хатах не было агню, цёмна маўчалі рэдкія ядлаўцы за вёскаю* (“Аржаны колас”) [1, с. 261]; *Далей, калі перайсці густы непрацярэблены хвойнік і замыты вадою і зарослы ядлоўцамі яр, абапал якога была процьма баравікоў, а пад чэзлымі ядлоўцамі вылежаных зайчыных заўсёды цёплых ямак у касмычках пуху, сумавала яшчэ адна хата з нізкім саламяным лобам* (“Сцежка на расходніку”) [1, с. 327]; *…Зямля на гэты бок Азярышча ялавела і не ўраблялася гадамі, на ёй нават не хацеў расці ялавец – у канцы дзедавага поля сядзела тры прысадзістыя кусты* (“Два злоты”) [1, с. 81].

Язмін: *Выйшла з хаты палоць гарод і пачула, што за плотам, за кустом цёмнага язміну, нехта ікае* (“Там, на хутары”) [1, с. 31].

Ясень: *Каля варухлівых, запаленых агнём восені, светла-залацістых ясеняў у апалым, чуйна-шапаткім лісці стаяў баец у шарым даўгаватым шынялі…* (“Альціст з местачковай аркестры”) [1, с. 354].

Сярод дэндронімаў у апавяданнях Вячаслава Адамчыка па частаце ўжывання колькасна вылучаюцца найменні *бярэзіна* (23,5 %), *бэз* (15 %) і *алешына* (8 %). Зафіксаваны такія адзінкавыя найменні, як *вербалоз, клён, каштан, елка, явар, язмін*. Усяго ж было адзначана 139 выпадкаў ужывання лексем для называння 20 відаў лясных і паркавых дрэў і кустоў.

Літаратура

1. Адамчык, В.У. Песня: апавяданні / Вячаслаў Адамчык. – Мінск: Маст. літ., 2013. – 398 с.

О.А. Климкович (Витебск)

ЯЗЫК И СТИЛЬ ВИТЕБСКИХ ЗАВЕЩАНИЙ ВТОРОЙ ПОЛОВИНЫ XVI ВЕКА

Одним из актуальных направлений лингвистических исследований начала XXI века является историческая стилистика, в рамках которой проводится изучение стилистического своеобразия деловых документов XIV–XVIII вв., созданных в разных регионах. Обзор основных направлений, идей и концепций русской региональной этнолингвистики деловой письменности XX – начала XXI в. представлен в работе О.В. Никитина [2], в которой упоминаются исследования Н.Г. Благовой, В.П. Строговой, Л.Я. Костючук, С.А. Копорского, Н.С. Бондарчук, В.Я. Дерягина, Е.Н. Борисовой, Л.А. Глинкиной, Н.В. Викторовой и др.

Деловые документы, созданные на старобелорусском языке, и в аспекте исторической лингвистики, и в аспекте региональной этнолингвистики исследованы недостаточно. Изучение книг Литовской Метрики с позиций исторической стилистики осуществляется в работах Н.В. Полещук, отдельные языковые уровни региональных деловых памятников охарактеризованы в исследованиях А.К. Антоновича, И.В. Будько, Э.В. Ярмоленко, И.И. Кремко и др.

Следует, однако, отметить, что в начале XXI века в Беларуси активизировалась работа по введению в научный оборот деловых документов эпохи средневековья: опубликованы книги Литовской Метрики, сотрудниками Национального исторического архива Беларуси А.Ф. Александровой, О.В. Бобковой, И.М. Бобер опубликован сборник «Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі)», в который включены тексты 116 духовных завещаний из фондов Брестского, Слонимского и Витебского земских судов, Брестского, Слонимского и Минского городских судов, Могилевского магистрата. К витебским завещаниям относится 15 документов, датированных 1559–1597 гг., 13 документов написано от имени мужчин и 2 документа от имени женщин. Из мужчин составителями завещаний были земяне (9 документов), земские ловчие (1 документ), конные мещане (1 документ), витебские городничие (2 документа). «Тэстаменты складалі ў прысутнасці земскага ці гродскага ўраду, ці аднаго з ураднікаў і двух шляхцічаў (Статут ВКЛ 1588 г. Р. 8. Арт. 2). Пасля смерці тэстатара дакументы актыкоўваліся ў гродскім ці земскім судах, часам пераактыкоўваліся ў кнігі Галоўнага Трыбунала ВКЛ» [2, с. 30].

В данной статье остановимся на особенностях структурной и языковой организации зачина витебских завещаний.

Зачин 15 исследованных актовых текстов состоял из блоков со значением сакрализации, извещения и завещания.

Блок со значением сакрализации состоит из формулы-посвящения Богу и вербализуется конструкциями разной степени распространенности: *Во имѧ Wтца и Сына и Светого Дѹха. Амин (ТБ, № 48, 1597, с. 253); Во имѧ Г(о)с(по)да Бога Всемогѹщого во Троици Единого, Wтцы и Сына и Светого Дѹха. Амин (ТБ, № 44, 1596, с. 236); Во имѧ Wтъца и | [Сына] и [Све]того Дѹха, Светое Живоначалное Нерозьделимое Трои[цы]. [Амин]ъ. Станъсе кѹ вечъноѥ речы (ТБ, № 36, 1594, с. 192).*

Значение извещения в представленных завещаниях может быть выражено как самостоятельным блоком, так и частью блока со значением завещания. Извещение отмечено в 12 документах. Способы вербализации данного смыслового блока достаточно разнообразны. В полную конструкцию со значением извещения входили именование составителя завещания, извещение, волеизъявление, указание типа документа, именование адресатов.

Именование составителя завещания включало в себя местоимение *я*, факультативную формулу *рабъ божии,* трехчленную модель антропонима (имя, отчество и фамилия составителя документа) и приложение, содержащее подробную характеристику социального статуса завещателя и места его проживания: *земенинъ г(о)с(по)д(а)рьскиѥ воеводства Витебъского (ТБ, № 35, без даты, с. 187); ловъчыѥ земъскиѥ воеводъства Витебского (ТБ, № 37, 1594, с. 197); мещанин г(о)с(по)д(а)рьскиѥ конныѥ места Витебского (ТБ, № 39, 1594, с. 212); городничиѥ Его К(о)р(олевское) М(и)л(ости) замку воеводства Витебского (ТБ, № 44, 1596, с. 236).*

Центр конструкции со значением извещения состоит из формулы *чинити явно* и одного из глаголов: *вызнавати (№№ 39, 44, 45, 46), ознаймовати (№№ 37, 48), сознавати (№ 35): Ѩ, раб Божиѥ Мартинъ Wлексеевич Совеиковски, мещанин г(о)с(по)д(а)рьскиѥ конныѥ места Витебского, вызноваю и чиню ѧвно тым моим тестаментомъ wстаточное воли моее (ТБ, № 39, 1594, с. 212); Ѩ, рабъ Божьи и Христа Его, Стефанъ Тимофеевичъ Лѹскина, ловъчыѥ земъскиѥ воеводъства Витебского, wзнаимѹю и чыню ѧвно wстаточнѹю волю мою сим тестаментомъ своимъ кожьдомѹ зособна, хто бы его ведати алъбо читаючы, слышати хотелъ, нинешъние и напотомъ бѹдѹчые (ТБ, № 37, 1594, с. 197); Ѩ, Дмитръ Ивановичъ Wлизаровича, земенинъ г(о)с(по)д(а)рьскиѥ воеводства Витебъского, чыню ѧвно и созъноваю тымъ моимъ тестаментомъ wстаточъное воли моее всимъ вобецъ и кожъдому зособъна, кому бы w томъ приналежало ведати (ТБ, № 35, б/д, с. 187).*

Волеизъявление представлено устойчивыми сочетаниями *wстаточъное воли моее (ТБ, № 44, 1596, с. 236); wстатнее воли моее (ТБ, № 45, 1596, с. 240); wстаточнѹю волю мою (ТБ, № 48, 1597, с. 253).*

Указание типа документа вербализуется устойчивыми сочетаниями *тымъ моимъ тестаментом (ТБ, № 48, 1597, с. 253); сим тестаментом*

ТБ, № 45, 1596, с. 240); сим моим тестаментом (ТБ, № 46, 1596, с. 246), сим тестаментомъ своимъ (ТБ, № 37, 1594, с. 197).

Именование адресатов вербализуется конструкциями, содержащими обобщенные формулы *всимъ вобецъ и кожъдому зособъна*, части, в которых эти формулы детализируются *кому бы ѡ томъ приналежало ведати (ТБ, № 35, б/д, с. 187); кому бы его ведать належало (ТБ, № 48, 1597, с. 253); хто бы его ведати алъбо читаючы, слышати хотелъ (ТБ, № 37, 1594, с. 197)*, и формулы для обозначения потомков: *нинешъние и напотомъ бѫдѫчые (ТБ, № 37, 1594, с. 197): Ѧ, рабъ Божьи и Христа Его … ѡзнаимѫю и чыню явно ѡстаточнѫю волю мою сим тестаментомъ своимъ кожьдомѵ зособна, хто бы его ведати алъбо читаючы, слышати хотелъ, нинешъние и напотомъ бѫдѫчые (ТБ, № 37, 1594, с. 197).*

Смысловой блок со значением завещания включал в себя именование завещателя, описание процесса составления документа, указания на дееспособность завещателя, добровольность составления акта, описание причин составления документа, к которым следует отнести ссылку на понимание неизбежности смерти, высказывание желания не порождать конфликты между родными и близкими после смерти завещателя, указание на то, что составитель завещания болеет.

Описание процесса составления завещания вербализуется устойчивым сочетанием *пишу сес мои тестаменъть (ТБ, № 39, 1594, с. 212)* или сочетаниями *так розправую ѡстатнею волею моею печатую (ТБ, № 40, 1595, с. 217); ѡдно самъ по своеи доброи воли чиню сес тестамент ѡстатнее воли моее (ТБ, № 41, 1595, с. 222).*

Указание на дееспособность завещателя представлено формулами с существительными *розум, память, смысл, здоровье: при доброи памети и зѫполного розѫмѵ (ТБ, № 34, 1559, с. 183); будучи ещѣ при добром розѫме и зѫполном смыслѣ (ТБ, № 35, б/д, с. 187); бѫдѫчы есми на сес часъ з ласки Божеи ѵ способномъ здоровью и зѫполънымъ розѫмомъ своимъ ѡстаточьноѡ ѵваженьем, з доброю паметью (ТБ, № 37, 1594, с. 197).*

Указание на добровольность составления документа вводится в текст завещаний формулами с существительными *воля, примушенье, намова*: *сам по своеи доброи воли кром жадного(о) примушенѧ и людское намовы (ТБ, № 39, 159, с. 212); не с примушенѧ, ани чыее намовы, але сама по доброи воли своеи (ТБ, № 47, б/д, с. 250); не* з *жадного примушенѧ албо намовы, ѡдно самъ по своеи доброи воли (ТБ, № 41, 1595, с. 222).*

Понимание неизбежности смерти для каждого человека вербализуется конструкциями разной степени распространенности: *и разѫмеючы то, иж кождыи ч(о)л(о)в(е)къ мешкаючы на том недзном, мизерномъ а дочесном свете естъ певнеиши смерти, а нижели чог(о) иншого (ТБ, № 35, б/д, с. 187); бачечи непевность жывота людского на семъ свете, кгды* ж *кож-*

*дыи чоловекъ е*ст *потданыи смерти, а тело его ку скаженю (ТБ, № 38, 1594, с. 205).*

Указание на то, что составитель завещания болеет, содержится в 10 актах: *бѫдѫчы wбъдароныи wтъ Пана Бога хоробою своею (ТБ, № 34, 1559, с. 183); иж гa, бѫдучы wт П(а)на Бога хоробою навежоныи (ТБ, № 46, 1596, с. 246); wт Г(о)с(по)да Б(о)га навежоныи хоробою, лежучи на смертельноı постели (ТБ, № 39, 1594, с. 212).*

Высказывание желания не порождать конфликты между родными и близкими после смерти завещателя вербализуется конструкциями разного типа: *бо ведаючы тежъ то, ижь по смерти людъскоı w маетность дочесьнѫю посполите бываютъ розърѫхи и ростырки немалые, чомѫ в час забегаючы, гa, грешныи, приводечы по собе прига̀тели свои до пока̀ и до доброго порадъкѫ, абы по животе моемъ w ѫбогѫю маетность мою набытѫю никоторых ростырковъ и гневѫне мели, жило межы | кревъными прига̀телми моими, такъ з малжонкою моею […]пани дочъка моя̀, такъ и внѫчата мои промежь себе, але на томъ переставали, што комѫ wтписано и wзначоно бѫдетъ симъ тестаментомъ моимъ (ТБ, № 37, 1594, с. 197); иж што маю кому по животе своем ѫбогою маетность свою, такъ рѫхомую, гако и нерѫхомѫю wтписати, ѫходечи того, абы по моемъ животе жона и прига̀тели мои w ѫбогоı маетности моеи межи собою жадного ростырку и посварy не мели (ТБ, № 39, 1594, с. 212).*

Литература

1. Гардзееў, М.Ю. Шляхецкія тэстаменты у актавай кнізе полацкага магістрата за 1656 – 1657 гады / М.Ю. Гардзееў, Н.У. Сліж // Вестн. Полоц. гос. ун-та. Сер. А, Гуманитарные науки. – Новополоцк: ПГУ, 2013. – № 1. – С. 37 – 41.

2. Никитин, О.В. Региональная этнолингвистика памятников деловой письменности XX – начала XXI вв.: имена, идеи, концепции / О.В. Никитин [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.portal-slovo.ru/philology/47839.php. – Дата доступа: 20.06.2015.

3. ТБ – Тастаменты шляхты і мяшчан Беларусі другой паловы XVI ст. (з актавых кніг Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі) / склад.: А.Ф. Аляксандрава, В.У. Бабкова, І.М. Бобер; Нац. гіст. архіў Беларусі. – Мінск, 2012. – 736 с.

М.М. Круталевіч, В.В. Урбан (Мінск)

БЕЛАРУСКАЯ СПАРТЫЎНАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ: ДЭРЫВАЦЫЙНЫ АСПЕКТ

Утварэнне новых лексічных адзінак адбываецца паводле пэўных правілаў словаўтварэння, якія адлюстроўваюць дэрывацыйныя нормы беларускай літаратурнай мовы. Пры ўтварэнні тэрмінаў выкарыстоўваюцца тыя ж самыя спосабы, тыпы, мадэлі і дэрывацыйныя сродкі, што і пры ўтварэнні агульнаўжывальнай лексікі. Толькі, у адрозненне ад

агульнаўжывальных лексічных адзінак, тэрміны – гэта штучныя дэрываты, якія не ўтвараюцца ва ўласным сэнсе гэтага слова, а “ствараюцца”. Даследаванне ўтварэння і функцыянавання тэрмінаадзінак у мове з’яўляецца надзвычай актуальным: у беларускім мовазнаўстве пытанням, звязаным з вывучэннем тэрміналагічнай лексікі розных галін навукі, прысвечаны працы Л.М. Акатавай, А.С. Аксамітава, С.М. Аніськовай, Л.А. Антанюк, М.Г. Антанюк, М.У. Бураковай, Д.В. Дзятко, В.Г. Захаравай, А.І. Калечыц, Т.В. Капейко, В.П. Краснея, А.М. Лапкоўскай, А.С. Лаўшук, Ю.М. Лук’янюк, В.А. Ляшчынскай, Л.М. Мінаковай, А.М. Палуян, П.У. Сцяцко і інш. Асаблівую цікавасць выклікаюць пытанні тэрмінаўтварэння спартыўнай тэрміналогіі ў беларускай мове ў сувязі з актыўным пашырэннем яе выкарыстання ў сферы грамадскага жыцця Беларусі на сучасным этапе.

Усе беларускія спартыўныя (фізкультурна-спартыўныя) тэрміны ўтвараюцца паводле **марфемных** і **немарфемных** спосабаў словаўтварэння.

Марфемнае словаўтварэнне з’яўляецца найбольш пашыраным спосабам папаўнення тэрміналагічнай лексікі і характарызуецца ўтварэннем слоў на базе ўжо існуючых у мове асноў пры дапамозе разнастайных словаўтваральных афіксаў. Сярод марфемных спосабаў тэрмінаўтварэння вылучаюцца:

1. ***Суфіксальны спосаб***, калі да ўтваральнай асновы далучаецца суфікс (у тым ліку і нулявы). У межах марфемнага словаўтварэння гэта вельмі прадуктыўны спосаб утварэння тэрмінаў, пры выкарыстанні якога ў дэрывацыйныя адносіны ўступаюць як уласнабеларускія, так і запазычаныя марфемы. Суфіксальным спосабам ад уласных і агульных найменняў утвараюцца спартыўныя тэрміны з канкрэтным і адцягненым значэннямі, пры гэтым найчасцей выкарыстоўваюцца ў якасці дэрывацыйнага сродку суфіксы *-асць*, *-нн-*, *-енн-*, *-к-* і некаторыя іншыя: *адаптыўнасць*, *актыўнасць*, *балансаванне*, *плаванне*, *укіданне*, *выездка*, *барацьба*, *галопам*, *гіравік*, *гоначнік*, *вясляр*, *зачэпка*, *скачок*, *распасоўка*, *размінка*, *падача* і г. д. Даволі шырока выкарыстоўваюцца іншамоўныя ўтваральныя асновы і суфіксы *-іст-*, *-атар-*, *-ацыj-*, *-ызм-* і інш.: *бар’ерыст*, *тэнісіст*, *фіналіст*, *градацыя*, *класіфікатар*, *каментатар*, *байкер*, *дэфармацыя*, *фінішаваць* і г. д. Значная колькасць тэрмінаў утворана шляхам нулявой суфіксацыі. Як правіла, гэта аддзеяслоўныя найменні тыпу *выхад*, *заплыў*, *заход*, *допуск*, *дотык*, *абмер*, *перанос* і г. д.

2. ***Постфіксальны спосаб***, калі да ўтваральнай асновы (слова) далучаецца постфікс. У тэрміналагічнай сістэме фізічнай культуры і спорту гэта даволі прадуктыўны спосаб словаўтварэння: *адаптавацца*, *групавацца*, *згінацца*, *купацца*, *размінацца*, *узважвацца*, *рухацца* і г. д.

3. ***Суфіксальна-постфіксальны спосаб***, калі да ўтваральнай асновы адначасова далучаюцца суфікс і постфікс. Адзначаецца ў адзінкавых сло-

вах, якія ў пэўных кантэкстах набываюць тэрміналагічнае значэнне: *мроіцца* (ад *мроя*) і інш.

4. ***Прэфіксальны*** (***прыставачны***) ***спосаб***, калі да ўтваральнага слова далучаецца прэфікс (прыстаўка). Утварэнне тэрмінаў з галіны фізічнай культуры і спорту ажыццяўляецца пры дапамозе спрадвечных і іншамоўных прэфіксаў (прыставак) *без-*, *звыш-*, *дэ-* (*дэз-*), *супер-*, *экстра-* і іншых: *звышдалёкі*, *дэзадаптацыя*, *дэкампенсацыя*, *падгрупа*, *перагуляць*, *прыцэліцца*, *суперкубак*, *экстраклас*.

5. ***Прэфіксальна-суфіксальны*** (***прыставачна-суфіксальны***) ***спосаб***, калі да вытворнай асновы адначасова далучаюцца прэфікс (прыстаўка) і суфікс. Для фізкультурна-спартыўнай тэрміналагічнай сістэмы характэрны ўтварэнні тыпу *ўкругавую*, *накаленнік*, *наезнік*, *прыцішыць* і г. д.

6. ***Прэфіксальна-постфіксальны*** (***прыставачна-постфіксальны***) ***спосаб***, калі да вытворнай асновы адначасова далучаюцца прэфікс (прыстаўка) і постфікс: *адгуляцца* (ад *гуляць*), *даскакацца* (ад *скакаць*), *дакранацца* (ад *кранаць* ‘датыкацца, дакранацца да каго-, чаго-н.’), *задыхацца* (ад *дыхаць*), *наплавацца* (ад *плаваць*) і інш.

7. ***Спосаб асноваскладання***, калі дзве ўтваральныя асновы аб’ядноўваюцца ў адно слова пры дапамозе злучальнай марфемы. Спецыялізаваныя слоўнікі і тэксты на спартыўную тэматыку фіксуюць такія дэрываты: *самамасаж*, *самавалоданне*, *узаемакантроль* і інш.

8. ***Спосаб асноваскладання з суфіксацыяй***, калі дзве ўтваральныя асновы аб’ядноўваюцца ў адно слова пры дапамозе злучальнай марфемы з адначасовым далучэннем суфікса. У тэрмінасістэме фізічнай культуры і спорту выкарыстоўваюцца такія ўтварэнні: *шасцізарадны*, *сцяганосец*, *доўгачасовы*, *аднаклубнік* і інш.

Немарфемныя спосабы тэрмінаўтварэння таксама вызначаюцца даволі высокай ступенню прадуктыўнасці. Да іх адносяцца:

1. ***Спосаб словаскладання***, калі складанае слова ўтвараецца шляхам аб’яднання двух самастойных слоў у адно: *інструктар-метадыст*, *грот-мачта*, *гратэск-наезніца*, *каманда-чэмпіён* і інш.

2. ***Спосаб утварэння складанаскарочаных слоў*** (***абрэвіяцыя***) – складанне частак слоў, якія ўваходзяць у зыходнае словазлучэнне. Гэта могуць быць назвы першых літар або гукаў некалькіх слоў, спалучэнне частак слоў або цэлага слова і часткі, спалучэнне цэлага слова і назваў першых літар астатніх слоў, а таксама некаторыя іншыя спалучэнні. Найбольш прадуктыўнымі ў разглядаемай тэрміналагічнай сістэме з’яўляюцца ініцыяльныя абрэвіятуры, сярод якіх пашыраны двух-, трох-, чатырохлітарныя скарачэнні: *ФК* (фізічная культура), *МАК* (Міжнародны алімпійскі камітэт), *ФІФА* (Міжнародная федэрацыя футбола), *ФІСУ* (Міжнародная федэрацыя ўніверсітэцкага спорту), *ДТСААФ* (Добраахвотнае таварыства садзейнічання арміі, авіяцыі і флоту) і інш. У шэрагу выпадкаў назіраецца колькаснае несупадзенне літарных і слоўных

кампанентаў у варыянтных парах: *РЦФВС* (Рэспубліканскі цэнтр фізічнага выхавання і спорту навучэнцаў і студэнтаў), *ІГФ* (Міжнародная федэрацыя ручнога мяча), *ФІБА* (Міжнародная федэрацыя баскетбола) і інш. Такое несупадзенне назіраецца ў тых выпадках, калі ў складзе тэрміналагічных словазлучэнняў прысутнічаюць складанааформленыя дапаможныя кампаненты, а таксама калі існуе несупадзенне ў беларускамоўным перакладзе з рускай ці англійскай мовы. Акрамя таго сустракаюцца і іншыя варыянты складанаскарочаных слоў-тэрмінаў: *фотафініш*, *веладарожка* і інш.

3. ***Лексіка-семантычны спосаб*** (або ***тэрміналагізацыя***) – развіццё спецыяльных значэнняў у словах нацыянальнай мовы, утварэнне амонімаў у выніку распаду мнагазначнасці. Пры дапамозе гэтага спосабу тэрміны ўтвараюцца пастаянна з рознай інтэнсіўнасцю ў розныя перыяды. У аснове тэрміналагізацыі – метафара (перанос значэння ў выніку прыпадабнення па форме, функцыі, становішчы). Напрыклад, *кубак* – ‘невялікая, звычайна з ручкай, фарфоравая гліняная ці іншая пасудзіна для піцця’ і *кубак* – ‘спартыўны прыз з каштоўнага матэрыялу, што ўручаецца пераможцу ў спартыўных спаборніцтвах’; *лаўка* (разм.) – ‘невялікая гандлёвы магазін’ і *лаўка* – ‘прыстасаванне для сядзення на некалькі чалавек у выглядзе дошкі на ножках’ (*лаўка для запасных*, *лаўка для штрафнікоў*).

4. ***Уласналексічны спосаб*** – запазычанне слоў-тэрмінаў з іншых моў (***калькаванне***). Тэрмінолагі вылучаюць гэты спосаб як асобны, бо ў тэрмінатворчасці, на іх думку, усе тэрміны вытворныя: “Паколькі любая тэрміналогія з’яўляецца штучным утварэннем, усе тэрмінаадзінкі незалежна ад іх марфемнай структуры з’яўляюцца вытворнымі” [1, с. 43]. Для тэрміналагічнай сістэмы фізічнай культуры і спорту названы спосаб з’яўляецца самым прадуктыўным. Сярод запазычанняў – тэрміны з элементамі грэчаскага, лацінскага і англійска-амерыканскага паходжання, а таксама з іншых моў: *біядынамікабія* (грэч.), *макрацыкл* (грэч.), *фізіялогія* (грэч.), *інтэрвал* (лац.), *экс-чэмпіён* (лац.), *суперрэкорд* (лац.), *атака* (франц.), *крос* (англ.), *ралі* (англ.), *гольф* (англ.), *картынг* (англ.), *кёрлінг* (англ.), *інсайд* (англ.), *лайнсмен* (англ.), *форвард* (англ.), *кроль* (англ.), *батэрфляй* (англ.), *бокс* (англ.), *кікбоксінг* (англ.), *трэнінг* (англ.), *спарынг* (англ.), *рынг* (англ.), *трэк* (англ.), *пас* (англ.), *пенальці* (англ.), *прэсінг* (англ.), *гол* (англ.), *дрыблінг* (англ.), *хет-трык* (англ.), *аперкот* (англ.), *афсайд* (англ.), *фініш* (англ.), *гейм* (англ.), *раўнд* (англ.), *сэт* (англ.), *тайм-аўт* (англ.), *стаер* (англ.), *накдаўн* (англ.) і шматлікія іншыя.

5. ***Марфолага-сінтаксічны спосаб*** (часам у навуковай літаратуры гэты спосаб называецца ***транспазіцыя*** або ***канверсія***) – утварэнне новага слова шляхам пераходу слова з адной часціны мовы ў іншую. Для фізкультурна-спартыўнай тэрміналогіі такі спосаб словаўтварэння не вызначаецца прадуктыўнасцю: *нападаючы* і інш.

6. ***Сінтаксічны спосаб*** – спалучэнне некалькіх слоў у шматкампанентныя тэрміналагічныя словазлучэнні. Шматслоўным тэрмінам, якія

займаюць значнае месца ў любой рэальнай тэрміналогіі, уласціва камбінаванне асобных кампанентаў у адпаведнасці з разнастайнымі мадэлямі. Перавага пры гэтым аддаецца двух- і трохкампанентным спалучэнням слоў з назоўнікам у якасці апорнага кампанента, хоць у беларускай мове пашыраны і словазлучэнні з большай колькасцю кампанентаў: *падача бакавая, падача ў аўт, падача без свістка, падача верхняя бакавая, падача без вярчэння мяча, падача за межы пляцоўкі, падача корпуса конніка ўперад, дарожка канькабежная, дарожка скачковая акрабатычная, дарожка са штучным пакрыццём, грабок плыўца доўгі сілавы, перадача ў скачку, перадача дзвюма рукамі, перадача ў адзін дотык, перадача ў разрэз* і інш.

Сінтаксічны спосаб, як і іншыя спосабы ўтварэння тэрмінаў, мае свае адметныя рысы. У прыватнасці, амаль усе тэрміны-словазлучэнні ствараюцца ў форме іменных словазлучэнняў субстантыўнага характару. Прадуктыўнасць састаўных найменняў выклікаецца тэндэнцыяй моўнага развіцця, паколькі пры ўтварэнні тэрмінаў гэтым спосабам не прыцягваецца новы моўны матэрыял і не ствараюцца новыя моўныя адзінкі, а выкарыстоўваюцца ўжо існуючыя, на базе якіх і з'яўляюцца састаўныя тэрміны-словазлучэнні.

У залежнасці ад сінтаксічнай структуры вылучаюцца адпаведныя мадэлі ўтварэння мнагаслоўных тэрмінаў. Сярод такіх мадэлей самымі прадуктыўнымі з'яўляюцца:

– *назоўнік + прыметнік / дзеепрыметнік*: *алюр хуткі* (*поўны, роўны, скарочаны, збаўлены, падвоены, паскораны*); *аэробіка базавая* (*інтэрвальная, класічная, аздараўленчая, сілавая*); *байдарка вучэбная* (*турысцкая, драўляная*); *басейн глыбокі* (*вяслярны, дзіцячы, закрыты, комплексны, кароткі*); *заезд індывідуальны* (*кваліфікацыйны, кантрольны, матчавы, адборачны, парны*) і г. д.;

– *назоўнік + назоўнік*: *абарона варотаў* (*карзіны*); *інтэнсіўнасць бегу, каляндар гульняў, дотык рукой, катэгорыя турніру, клас скачка, каманда гасцей, лідар каманды, спыненне мяча* і г.д.

Сустракаюцца і іншыя мадэлі сінтаксічнага тэрмінаўтварэння, напрыклад: *чаравікі для фігурнага катання, брас з доўгім слізганнем, кідок дзвюма рукамі, кідок нахілам, гуляць у варотах* і г.д.

Такім чынам, найбольш прадуктыўным спосабам дэрывацыі спартыўнай тэрміналогіі з'яўляецца марфемнае ўтварэнне. Актыўнае папаўненне фізкультурна-спартыўнай тэрміналагічнай сістэмы адбываецца таксама за кошт уласналексічнага спосабу тэрмінаўтварэння, запазычвання тэрмінаў з іншых моў. Пры запазычанні тэрмінаў назіраецца поўная або частковая іх марфемна-словаўтваральная адаптацыя ў беларускай мове. У працэсе папаўнення беларускай тэрміналогіі значную ролю адыгрываюць запазычаныя словаўтваральныя элементы, якія даволі часта ўступаюць у дэрывацыйныя сувязі з уласнабеларускімі моўнымі адзінкамі. Акрамя таго,

фактычны матэрыял сведчыць аб вялікай прадуктыўнасці сінтаксічнага спосабу ўтварэння тэрмінаў-словазлучэнняў. Перавага ва ўтварэнні тэрмінаў-словазлучэнняў аддаецца двух- і трохкампанентным комплексным найменням з назоўнікам у якасці апорнага кампанента.

Літаратура

1. Беларуская мова. Прафесійная лексіка для педагогаў: вучэбны дапаможнік / Д.В. Дзятко [і інш.]; пад рэд. Д.В. Дзятко. – Мінск: Беларусь, 2012. – 231 с.

Ж.П. Курдзека (Віцебск), **Л.У. Селібірава** (Горкі)

АСАБЛІВАСЦІ СЛОВАЎТВАРЭННЯ НЕКАТОРЫХ ДЫЯЛЕКТНЫХ СЛОЎ (НА МАТЭРЫЯЛЕ РЭГІЯНАЛЬНАЙ ЛЕКСІКІ ГЛЫБОЦКАГА РАЁНА ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

Адной з актуальных праблем сучаснай лінгвістыкі з’яўляецца аналіз дыялектных лексічных адзінак, даследаванне і выяўленне асаблівасцей словаўтварэння разнастайных дыялектных найменняў.

У артыкуле ставіцца за мэту разгледзець асноўныя спосабы ўтварэння дыялектных слоў, вызначыць віды афіксальных марфем, што маюць месца ў складзе вытворных дыялектных лексем.

У якасці крыніцы даследавання выступаюць лексічныя адзінкі, запісаныя ад Рындзёнак Алены Антонаўны, 1947 года нараджэння, мясцовай жыхаркі г. Глыбокае Віцебскай вобласці. Усяго сабрана і прааналізавана 54 дыялектныя словы (значэнне лексем падаецца са слоў Рындзёнак Алены Антонаўны).

Аналіз сабранага фактычнага матэрыялу дае магчымасць размежаваць дыялектныя словы па трох асноўных спосабах словаўтварэння.

І. Суфіксальны спосаб.

Пры дапамозе суфіксаў утвораны наступныя дыялектныя лексічныя адзінкі:

1) назоўнік *абраза-**нік**-і* (кароткія боцікі альбо штаны) – ад дзеяслова *абразаць (абрэзаць)*;
2) назоўнік *аўтобус-**нік*** (вадзіцель аўтобуса) – ад *аўтобус*;
3) назоўнік *бамб-**элак*** (вялікая бутэлька віна) – ад слова *бомба* (так ў народзе называюць бутэльку віна або гарэлкі);
4) назоўнік *бі-**тк**-а* (мухалоўка) – ад дзеяслова *біць*;
5) назоўнік *благ-**оцц**-е* (благія малыя дзеці) – ад прыметніка *благі*;
6) назоўнік *гарбуз-**янк**-а* (гарбузовая каша) – вытворнае ад *гарбуз*;
7) назоўнік *гумов-**ік**-і* (гумовыя боты) – ад прыметніка *гумовы*;
8) назоўнік *дзял-**к**-а* (маленькі агародчык) – ад дзеяслова *дзяліць*;
9) зборны назоўнік *жул-**ябі**-я* (жулік, хуліган) – ад слова *жулік*;
10) назоўнік *звяр-**ыдл**-а* (страшны чалавек) – вытворнае ад *звер*;

11) назоўнік *кат-**анк**-а* (балючае біццё, мучанне) – ад дзеяслова *катаваць*;

12) назоўнік *халадз-**ёнк**-а* (халодная вада) – ад прыметніка *халодны*;

13) назоўнік *крав-**янк**-а* (каўбаса з крыві і круп) – ад слова *кроў*;

14) назоўнік *збюр-**к**-а* (сход, збор людзей) – вытворнае ад *збор*.

II. Прэфіксальны спосаб.

Пры дапамозе прэфіксальных марфем утвораны адзінкавыя дыялектныя словы, напрыклад, назоўнікі ***абэ**-рва*, ***ато**-рва* (вельмі хуткая, спрытная жанчына), якія матывуюцца дзеясловам *рваць*.

III. Прэфіксальна-суфіксальны спосаб.

Пры дапамозе конфіксаў утвораны наступныя дыялектныя лексемы:

1) назоўнік ***аб**-мыл-**ак*** (маленькі кавалачак мыла) – ад слова *мыла*;

2) дзеяслоў ***вы**-ладн-**е**-ць* (стаць прыгожым, ладным) – вытворнае ад прыметніка *ладны*;

3) назоўнік ***па**-пліц-**ак*** (рукзак) – ад слова *плечы* (чаргаванне *і//е, ц//ч*).

Пэўнае месца сярод прааналізаваных слоў займаюць лексемы, у якіх даволі складана вылучыць утваральную аснову. Такія лексічныя адзінкі, на нашу думку, можна аднесці да невытворных, напрыклад, *альвас* (алоэ), *вайлакі* (валёнкі), *габэльчык* (рубанак), *гвэгаць* (чаго-небудзь шмат пакласці ў талерку), *дафіляда* (свята, збор людзей), *атымалка* (анучка, якой прыбіраюць стол, губка, сцірка), *калавурыць* (сцерагчы), *іспоткі* (рукавічкі), *згрэбла* (гультаяваты чалавек), *збяёдаваць* (згубіць, страціць), *вэрла* (недарэчны чалавек), *выбэнда* (чалавек з амбіцыямі), *куліжанка* (сяброўка, прыяцелька), *лайтруга* (абібок, лянівец, лодар, трупень), *лахаць* (хадзіць без мэты, блукаць), *лацно* (добра, зручна), *лёзны* (пяшчотны, ласкавы, душэўны, шчыры, слязлівы), *ляндрынкі* (цукеркі-ледзянцы), *малюдынка* (модніца, фарсуха), *недацёпа* (бязвольны чалавек), *халтама* (бесклапотны, бестурботны чалавек), *халтаміцца* (свавольнічаць, спяшацца), *пляўдурыць* (распаўсюджваць плёткі), *трылузіць* (брахаць, плесці, малоць пустое), *незмірона* (незлічона, безліч, процьма, поўна), *неданкнента* (недатыкальны чалавек, недатыка), *няхлюя* (тупіца, доўбня), *падцяробак* (чалавек малога росту), *парсаць* (гойсаць), *паўцагелак* (чалавек невялікага росту), *пшыблэнда* (прыблуда, прыблуднік), *трахамуддзе* (асабістыя рэчы: абутак, адзенне), *трэхла* (пусты чалавек), *тумарнік* (пануры, хмурны чалавек), *забадзяцца* (вымазацца).

На падставе праведзенага аналізу можна зрабіць некаторыя вывады:

1) дыялектныя словы, распаўсюджаныя ў адзначаным рэгіёне, вылучаюцца сваёй выразнасцю, яркасцю, непаўторнасцю;

2) сярод разгледжаных лексічных адзінак асноўную масу складаюць назоўнікі (41 адзінка – 76 %), значна менш дзеясловаў (10 адзінак – 18 %),

а таксама ў вельмі малой колькасці прадстаўлены прыслоўі (2 адзінкі – 4 %) і прыметнікі (1 адзінка – 2 %);

3) большая частка дыялектных слоў з'яўляецца невытворнымі лексічнымі адзінкамі (35 слоў – 64 %), і гэта зразумела: вельмі складана вызначыць, якім словам матывуецца тая ці іншая дыялектная лексема; з астатніх 19 вытворных адзінак суфіксальным спосабам утвораны 14 слоў (26 %), прэфіксальным – толькі 2 словы (4 %), прэфіксальна-суфіксальным – 3 словы (6 %); як відаць, найбольш прадуктыўным спосабам словаўтварэння ў дыялектнай мове, як і ў сучаснай беларускай літаратурнай мове, з'яўляецца суфіксальны спосаб;

4) у гаворцы Глыбоччыны прысутнічае даволі шмат слоў, запазычаных з польскай мовы, што абумоўлена гістарычна (беларускія землі пэўны час знаходзіліся пад уладай Польшчы), напрыклад, *пшыблэнда*, *выбэнда*, *звярыдла*, *неданкнента*, *куліжанка*, *ляндрынкі*, *папліцак* і інш.

Літаратура

1. Беларуская мова: энцыклапедыя / пад рэд. А.Я. Міхневіча. – Мінск: Беларуская энцыклапедыя, 1994. – 654 с.

2. Слоўнік беларускай мовы / пад рэд. А.А. Лукашанца, В.П. Русак. – Мінск: Беларуская навука, 2012. – 916 с.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: у 5 т., 6 кн. / пад агульнай рэд. К.К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск: Бел. Сав. Энцыклапедыя імя П. Броўкі, 1977 – 1984. – 5 т., 6 кн.

4. Шакун, Л.М. Словаўтварэнне: вучэбны дапаможнік для філалагічных факультэтаў ВНУ / Л.М. Шакун. – Мінск: Вышэйшая школа, 1978. – 128 с.

І.М. Курловіч (Горкі)

ДА ПЫТАННЯ АБ ПРЫСЛОЎЯХ НА *-СКИ (-СКЫ), -ЦКИ* Ў ПОМНІКАХ СТАРАБЕЛАРУСКАЙ ПІСЬМЕННАСЦІ

У помніках старабеларускага пісьменства невялікую ў колькасных адносінах групу ўтвараюць прыслоўі, якія, на думку М.Г. Булахава, суадносяцца з былой формай творнага склону множнага ліку кароткіх прыметнікаў. У старабеларускай мове гэты тып прыслоўяў шырокага распаўсюджання не атрымаў. (Далей усе прыклады з помнікаў пісьменства прыводзяцца паводле "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы" ў адаптаваным выглядзе, г. зн. без захавання арыгінальнага графіка-арфаграфічнага афармлення. У дужках у неабходных выпадках пазначаюцца розныя варыянты прыведзенай лексічнай адзінкі). Сустракаюцца наступныя ўтварэнні: ***дружески, еврейски, жолнерски, зверски, литовски, московски, росийски, росски, рыцэрски, славенски, суседски, скотски***: *свойственне: **Дружески**.....Власне* (Бяр. 143–144); *Александриа, **Евреиски**, но: Гневом запалене, або забаронене* (Бяр., 227); *Некси зналися къ тому тыи два, ижь тамъ ездили **жолнерски** и брали* (КСД, 1459, 1520); *Безсловесне: **Зверски**,*

нелюдзку (Бяр., 2); *Петель: Чески и Руски Когутъ… певень.* ***Литовски,*** *Петухъ* (Бяр., 133); *Кляпина: Всякое древо нагненое,* ***московски*** *нарицается* (Бяр., 64); ***россійски*** *и Полски стрелба великая зовется* (Бяр., 39); *камень многоценныи* ***Росски****, яхонтъ* (Бяр., 318) і інш.

У старабеларускай мове выдзяляецца значная група слоў, у складзе якіх можна вылучыць аснову на ***-ски (-скы), -цки (-цкы)*** з прэфіксам ***по-***. Як лічыць М.Г. Булахаў, у такіх утварэннях адбылося аб'яднанне старой формы творнага склону множнага ліку кароткіх прыметнікаў і прыназоўніка, які ўжываўся пераважна ў давальным склоне: ***по братерски****: упоминаючи ихъ по братерски, штобъ ся о тые обиды управа стала* (АЗР, IV, 307, 1608); ***по гусарски, по козацки***: *всего почту людей служебныхъ тысечу пятьсотъ коней ездныхъ* ***по гусарски*** *и* ***по козацки*** (АЗР, III, 212, 1577); ***по жолнерски***: *слуги того Петра и Яновы, справившиеся* ***по жолнерски****, приехавши на люди мои, домы ихъ зграбили* (КСД, 1459, 1520); ***по лицемерски****: прото не* ***полицемерски****, але съ хути и от правды вси стіи къ богу сію прозбу говорили* (Будны, 202б); ***по калдеиски***: *теж тыи книжата з вансъ принесли книги с собою* ***по жидовски*** *и* ***по калдеискі*** *писане* (Валх., 40б) і інш.

У выніку дээтымалагізацыі старой формы творнага склону гэтыя прыслоўі даволі часта "даафармляліся" на ўзор поўных прыметнікаў: ***по греческии (по греческыи), по жидовскии, по евреискии, по рускии (по рускыи), потатарскии, по християнскии, по цесарскии.*** Параўн.: *Все оное штокольве духомъ стымъ писали Пророци…* ***по греческии*** *Вивліа зовуть* (Будны, 109б); *тогда месяца перъваго иже словеть* ***поевреискии*** *Нисанъ … верженъ естъ жребеи до сосуда* (Скар., КЕ, 8); *шлюбъ* ***по жидовскии*** *назарей зовут* (Бельск., 62б); *сии суть третие книги …****по рускии*** *исказуется Песнь Песням* (Скар. ПП, 1б); *потомъ убравшися въ синий колпакъ* ***по татарскии****, с Петромъ Семецкимъ за ся поведилъ зрайци, а не брату моему, ино тотъ дьяконъ есть мой слуга* (АВК, XXI, 155б, 1556–1557); *много лиха хрестяном учынили и не* ***по християнскии*** *мучыли люди* (Рач., 322); *Феодора цесаровая всех духовных… до полацу курия на учту и обед возвала и гойне их* ***по цесарский*** *честовала* (Бельск., 369).

У лінгвістычнай літаратуры сустракаюцца розныя погляды адносна часу ўзнікнення прыслоўяў з прыназоўнікам-прэфіксам **по-**. Напрыклад, А.І. Яновіч з'яўленне **по-** адносіць да XIV стагоддзя [4]. Беспрыставачныя ўтварэнні на **-ски (-скы)** у старабеларускай мове выкарыстоўваліся найперш у помніках кніжнаславянскай традыцыі. Параўн., ***еллински, приетельски (приятелски), паганьски*** і інш. *Цата:* ***еллински****, динаръ, нарицателне, що десят въ собе маетъ. Собствне грош, що десят пенязей платит* (Бяр, 201); *Приискръно: …щире,* ***приятелски****, брацко, ведле права* (Бяр., 124); *верою хсвою хвалишиися. а* ***паганьски*** *живоущи* (Чэцця, 354).

У помніках старабеларускага пісьменства прадстаўлены таксама адзінкавыя выпадкі прыслоўяў на **-ски** з прэфіксам **не-**: ***нехристиански,***

нечеловечески. Параўн., *крыжъ на церкви врубленый* ***нехрістиански*** *и несбожне ... по самый жолобъ одтявши ... и иные речи многіе церковные одобрали* (АВК, III, 16, 1592); *хрстианы* ***нечеловеческы*** *мучиша* (Віл., 449б).

Побач з кароткай формай давальнага склону адзіночнага ліку прыметнікаў з прыназоўнікам **по- (па-)** адбылася адвербіялізацыя з адпаведнай поўнай формы: **по влоску, по египетску, по иудейску, по кашубску, по мужицку, по простацку, по немецку, по отцовску** і інш.: *обыватели тамошныи* ***по кгрецку***, ***по турецку*** *и* ***по словенску****, а над морем в местех портовых* ***по влоску*** *мовят* (Стрыйк., 422б); *Дала ему имя Мойсей от воды, бо мож вода* ***по египецку*** (Бельск., 41); *Станиславъ Крупицки з именей своихъ ... ставилъ 6 коней збройно* ***по кашубску*** (ПВЛ, 382, 1565); *Не мовъ до насъ* ***по иудейску*** *коли слышитъ людъ который естъ на муре* (Хран., 344); *Зъ ними ночные схажки, убираючисе иначей* ***по мужицку*** *лявалъ* (АСД, VI, 123, 1608); *Неискусне: Нетрафне,* ***по простацку****, недосведчене* (Бяр., 92); *для тогож оное место* ***по немецку*** *названо Страшпуркгъ* (Атыла, 184); ***по отцовску*** *въ мясти а не въ розгневанью, подчасъ света руины, и вже при сконанйю* (Лям., 18).

У помніках іншай жанравай прыналежнасці, што знаходзіліся пад уплывам народна-гутарковага маўлення, выяўляюцца канкурэнтныя тыпы прыслоўных утварэнняў ад прыметнікавых асноў з суфіксам **-ск-** і прыставачных форм на **-ску** / **-ски**. Параўн., ***по гречески*** **– по греческу**: *Колько ест заповедей божіихъ…десять, и для того е зовуть десятословиемъ,* ***по гречески*** *декалогосъ* (Будны, 2), *найдешъ статиръ глоса: такъ некоторую монету звалі:* ***по греческу*** (Цяп., 24); **по литовски – по литовску**: *reczenny czernec Lawrasz,* ***po Litowsku*** *zowemy Rymont a po Rusku Wasiley* (Бых., 489*); другие редко* ***по литовски*** *умеют* (Стрыйк., 518); **по руски – по руску**: *которого листу копіа такая с полского* ***поруски*** (Дыяр., 174б*), якожъ я самъ есми свое печать приложилъ и власную руку свою* ***по руску*** *подписалъ* (АВК, XXI, 166–167, 1556), **по словенски – по словенску**: *Доконана ест сіа книга зовемая греческимъ языком Катихисіс, а* ***по словенски*** *оглашеніе* (Будны, 251б*), Іисус поеврейску,* ***пословенску*** *Спасъ або Спаситель, а по руску Збавитель* (Калист, II, 175); **по угорски – по угорску**: *зовуть* ***по-угорску*** *Кэленфеуульдэ* (Атыла, 174), *Атыльля тогды, которого* ***по угорски*** *зовуть Этэле, был середнего узросту* (Атыла, 178–179) і іншыя.

У сучаснай беларускай мове прыслоўі ад прыметнікаў на **-ск-** , як правіла, сустракаюцца рэдка. Як адзначае П.П. Шуба, нязначная колькасць такіх прыслоўяў тлумачыцца тым, што ад прыметнікаў з суфіксам **-ск-** інтэнсіўна адбываецца ўтварэнне прыслоўяў з прыназоўнікам **па** і формай давальнага склону [3, с. 87]. Напрыклад, *па-беларуску, па-бацькоўску, па-восеньску, па-мужчынску, па-польску, па-суседску, па-сялянску, па-яўрэйску* і інш. Параўн.: *”Ды калі ты не бязродны сын – Гавары са мной* ***па-беларуску!”*** (Я. Янішчыц. Гавары са мной па-беларуску); *Ман слухаў*

кашаль таварыша, і ў яго ***па-бацькоўску*** *балела сэрца* (І. Шамякін. Ахвяры); ***Па-восеньску*** *ціха ляжала далячынь, неба было нізкае, шэрае, пахла застарэлым бульбоўнікам* (Я. Скрыган. Адданасць); *Для яе не дачка – сыны аказаліся адрэзанымі кавалкамі. Так яна марыла, каб яны засталіся на гаспадарцы і па-свойму,* ***па-мужчынску*** *прадоўжылі яе справу…* (І. Шамякін. Гандлярка і паэт); *"У Гародні тады было шмат аўтэнтычных мясцовых беларусаў, тады гаварылі яшчэ на вуліцах* ***па-беларуску, па-яўрэйску, па-польску"*** (А. Пяткевіч. Сцежкамі В. Быкава); *Гадаючы пра гэта, узрушаны яшчэ ўбачаным і адчутым, Башлыкоў цяжкавата сачыў за тым, як Глушак цырымонна,* ***па-сялянску*** *падступаўся да гаспадароў…* (І. Мележ. Завеі, снежань…); ***Па-суседску*** *з табой, мой гаючы аер, Затравела сівыя ўзышлі палыны* (М. Мятліцкі. Аер). Акрамя таго, на думку П.П. Шубы, пад уплывам рускай мовы ў сучаснай беларускай мове развіваецца ўтварэнне прыслоўяў на **-скі (-цкі)** тыпу *мастацкі, майстэрскі* ад прыметнікаў з суфіксам **-ск-** (і вытворнымі ад яго). Сустракаюцца адзінкавыя прыслоўі тыпу *варварска, забіяцка, заліхвацка, зверска, мастацка* і іншыя. Параўн.*: – Я табе падабаюся? –* ***заліхвацка*** *падкруціў вус. – мне падабаецца атаман Дзяргач, – рэзка прамовіла Ганя* (Л. Дайнека. Ілоты); *Нік бліснуў вачыма: – Здоровэнькі булы, –* ***забіяцка****, але ветліва звярнуўся ён да таджыкі* (А. Пантушэвіч. Прыгоды); ***Мастацка*** *пераканаўчыя, рэалістычныя пейзажы … стварыў Лынькоў і ў апавяданнях ваеннага часу* (У. Агіевіч. Творчасць Міхася Лынькова) і інш.

Літаратура

1. Булахов, М.Г. К характеристике словообразовательных типов наречий в старобелорусском письменном языке / М.Г. Булахов // Вопросы исторической лексикологии и лексикографии восточнославянских языков. – М., 1974. – С. 312–319.

2. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 4, 5, 7, 8, 9, 10, 17, 18,19, 22, 24–30 / рэд. А.М. Булыка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1984 – 2010.

3. Шуба, П.П. Прыслоўе ў беларускай мове / П.П. Шуба. – Мінск: Выдавецтва Акадэміі навук БССР, 1962. – 193 с.

4. Яновіч, А.І. Прыслоўі на -ьски ў гісторыі рускай і беларускай моў / А.І. Яновіч // Беларуская мова і мовазнаўства. Міжвуз. зб. Вып. 3. – Мінск, 1975. – С. 143–151.

А.А. Лавицкий (Витебск)

ДВУЯЗЫЧНАЯ РЕГИОНАЛЬНАЯ ГАЗЕТА БЕЛАРУСИ: СТИЛИСТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

Отличительной особенностью коммуникативного пространства большинства региональных газет Беларуси является его двуязычная основа, которая позволяет двум языковым системам (белорусской и русской) не просто параллельно друг другу сосуществовать на газетной полосе, но и активно взаимодействовать и влиять друг на друга. Такой языковой симбиоз проявляется на различных лингвистических и экстралингвистических

уровнях коммуникативной структуры печатных СМИ. Однако, в первую очередь, с нашей точки зрения, процессы языкового взаимодействия отражаются на стилистике публицистического текста.

Для верификации вынесенного положения остановимся подробнее на анализе стилистических особенностей современной двуязычной белорусской региональной газеты «Витебские вести».

Стилистические особенности региональной газеты отражают различные средства выразительности (тропы), наличие которых в газетных материалах, а также их структура, особенности позволяют типологически дифференцировать различные жанры. Оценочные и воздействующие особенности лексических языковых средств рассматриваются в работах А.Н. Баранова, П.Б. Паршина, М.Р. Желтухиной, Б.А. Зильберта, Е.А. Поповой, О.С. Синепуповой, О.Б. Сиротининой, А.Д. Швейцера и др. К стилистическим критериям можно также отнести использование типичных для газетного текста штампов, клише, устойчивых сочетаний, употребление языковых единиц межстилевого характера, возникновение новых лексических элементов.

В публикациях рассматриваемого издания из названных средств наиболее широко употребляются штампы и канцеляризмы, которые повсеместно используются журналистами и на белорусском, и на русском языках: *прайшло чарговае пасяджэнне / прошло очередное заседание; пачалася рэалізацыя / начата реализация; разгледжаны пытанні / рассмотрены вопросы; прынята рашэнне / принято решение* и т.д.

В текстах «Витебских вестей» встречаются различные тропы, не характерные для жанров публицистического стиля. Чаще такой прием используется в публикациях опроса, интервью, писем в редакцию, комментария и др., реже различные тропы используются в несвойственных для них материалах заметки, сообщения, репортажа. Среди стилистических средств языковой выразительности в медиатекстах в различных контекстах встречаются **фразеологизмы** (*кулаками пасля бойкі …; таўчэнне вады ў ступе; ліць ваду не млын / а воз и ныне там; во весь голос, давать себе отчет; держать в руках; закрывать глаза; камня на камне не оставить* и др.); **метафоры** (*лекі для эканамічнай хваробы; <…>; планка свабоды сумлення ўжо на крытычным узроўні; <…> накрыла выбухам эмоцый / Уровень, на котором находилось предприятие – если не дно, то где-то близко <…>; <…>, что ни решение, то поворот в бездну; <…> сразу волна решительности накрыла местную власть*; **аллегории** (*гэтыя сцены бачылі <…>; <…> усё магчыма было з'есці толькі вачамі /«У таких людей сердце раскрывает свои объятья для <…>; <…> даже разваливающийся бюст вождя мирового пролетариата готов заплакать»* и др.).

Интерес в рамках стилистического подхода вызывают также исследования, посвященные особенностям функционирования синтаксических конструкций в тексте (Э.М. Береговская, Н.С. Валгина, И.Т. Вепрева, В.Г. Кос-

томаров, Л.П. Крысин, Н.А. Купина, Т.В. Матвеева, О.А. Михайлова, Е.В. Покровская, А.С. Попова и др.). К наиболее распространенным синтаксическим конструкциям исследуемого двуязычного издания относятся:

– **парцелляции** (стилистический прием, состоящий в таком расчленении единой синтаксической структуры предложения, при котором она воплощается не в одной, а в нескольких интонационно-смысловых речевых единицах или фразах): *Паспрабаваць сябе ў спорце вырашыў сам. Доўга не думаў. Пайшоў на тэніс; К выезду ў поле рыхтаваліся ўсю зіму. Рамантавалі. Куплялі. Думалі… / Сначала работал на предприятии. Уволился. Трудовую не забрал...; Товар теперь презентабельный. Популярный на рынке.*

– **усеченные конструкции**: *Каб ведаў, дзе…; Згубіў паперы і… / Работаем под охраной и без…; Вне поля зрения…*; *Весна – пора цветов и королев…*

– **эллиптические предложения** (структурирующиеся на основе пропуска глагольного сказуемого): *Першы паказ – першая спроба; Дайдзем – выйграем / Новые статусы – новые возможности; Против дачных воров – единым фронтом; За хамство – штраф*.

В газете «Витебские вести» встречаются стилистические приемы использования броских, но двусмысленных по содержанию заголовков (выявлены только на русском языке), которые могут расходиться с содержанием материала (*И природа пополняет бюджет* (о возможностях кредитования малого бизнеса); *Однобокую цензуру долой!* (о проблемах в пригородных дачных кооперативах).

Для языка витебских СМИ характерна языковая интерференция (смешение русского и белорусского языков); реже используются русские слова в белорусских текстах: *А па-руску яр – гэта 1) «овраг», 2) «обрыв», 3) «яр»*; Чаще – наоборот: *В Венесуэле создадут Белорусский торговый дом, где будут продавать товары «зроблена ў Беларусі»*; *В субботу все идут на рынок, даже если не «купляць» что-нибудь, то хоть себя показать*; *Многим языковая практика пришлась по вкусу в прямом смысле слова. В столовой часто спрашивали «бульбу» и «салат з морквы»*; *«Даражэнькія» гости пожаловали, как по расписанию»*.

Рассмотрев практический материал (более 30 случаев употребления белорусских слов в русских текстах и более 20 белорусских контекстов с русскими лексическими единицами), мы пришли к выводу, что явление интерференции – это не следствие языковой неграмотности носителей языка, а сознательный выбор языковых средств с целью оптимального выражения смысла, порожденного стремлением журналиста к точности и ясности.

Часто в язык витебского издания «вторгается» городское просторечие. Из наших эмпирических выкладок следует, что язык региональных СМИ изменился настолько, что можно говорить о возникновении новых явлений в лексике (*Шукалі ўсёй вёскай, а ён <u>зашыўся</u> ў саду; Пасля адказа з*

адміністрацыі настрапаліла паперу ў іспалкам / Когда ребенка тащат к бабушке в деревню <…>; <…> могут прямо так и ответить: «Нам по фигу!»; <…> засекли прямо с «урожаем» в руках; <…> такие вещи принято назвать «понтовыми» и в речевом этикете (повсеместно в газетных текстах встречаются такие выражения, как *беражыце сябе, з клопатам пра вас / все образуется, будьте здоровы, будьте счастливы, храни Вас Бог* и др.).

Высокий количественный показатель таких примеров позволяет рассматривать приведенные примеры не как нарушение нормы, а как закономерные изменения, происходящие в рамках регионального публицистического дискурса.

Таким образом, рассмотренный практический материал показывает, что в двуязычной региональной прессе Беларуси используемые языки имеют сходные стилистические особенности: употребление одинаковых тропов и синтаксических конструкций. Сказанное подтверждает, что использование белорусского и русского языков в публицистических текстах взаимообогащает их стилистические структуры, а также позволяет журналистам создавать уникальные тропы, основанные на прямой интерференции текстов различных языковых систем.

С.В. Ліпніцкая (Мінск)

АСАБЛІВАСЦІ ФАРМІРАВАННЯ БАЛГАРСКА-БЕЛАРУСКІХ МОЎНЫХ АДПАВЕДНІКАЎ ПРЫ ПЕРАДАЧЫ НАМЕНКЛАТУРНЫХ ГЕАГРАФІЧНЫХ ТЭРМІНАЎ

У Інстытуце мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук у рамках дамовы з Беларускім рэспубліканскім фондам фундаментальных даследаванняў выконваецца праект «Распрацоўка тэарэтычных асноў і алгарытма міжмоўнай перадачы тапаніміі славянскіх краін на беларускую мову». Мэтай праекта з’яўляецца распрацоўка тэарэтычных прынцыпаў, методыкі і правіл рэгулярнай практычнай перадачы ўласных геаграфічных назваў заходне- і паўднёваславянскіх краін на беларускую мову з улікам міжнародных стандартаў і культурна-лінгвістычных асаблівасцей мовы-донара і мовы-рэцыпіента.

Важнай і неад’емнай часткай працэсу ўніфікацыі і стандартызацыі перадачы іншамоўнай тапаніміі на нацыянальныя мовы з’яўляецца распрацоўка прынцыпаў і алгарытму міжмоўнай перадачы наменклатурных геаграфічных тэрмінаў.

У сучаснай моўнай практыцы паняцце «наменклатурны геаграфічны тэрмін» (разам з такімі тэрміналагічнымі спалучэннямі, як «мясцовы геаграфічны тэрмін», «народны геаграфічны тэрмін», «тапанімічны тэрмін», «геаграфічны тэрмін», «родавы тэрмін») выкарыстоўваецца для абазначэння апелятыўных лексем, якія маюць вузкаспецыялізаваную

накіраванасць і паказваюць на род аб’екта, адносячы аднародныя прадметы да таго ці іншага класа (гэта словы тыпу *сéло, бърчина, вдън, гребен, дере, долина, езеро, падина, редица, селище, возера, даліна, горад, рака, пустыня, мыс, востраў* і інш.).

Наменклатурныя геаграфічныя тэрміны ўваходзяць у якасці структурнага элемента ў склад вялікай колькасці геаграфічных назваў. Гэта звязана з тым, што самая першая класіфікацыя, якую ажыццяўляе чалавек пры надзяленні аб’екта іменем, — гэта вызначэнне тыпу аб’екта, абазначэнне характэрных асаблівасцей ландшафту, што адлюстроўваецца ў выкарыстанні таго ці іншага наменклатурнага геаграфічнага тэрміна.

Па класіфікацыі В. А. Жучкевіча выдзяляюцца два тыпы наменклатурных геаграфічных тэрмінаў: абагульняючыя і дэталізуючыя.

Да абагульняючых адносяцца агульнавядомыя тэрміны, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння агульных паняццяў і маюць адпаведнікі ва ўсіх мовах: *остров – востраў, езеро – возера, град – горад* і інш.

Дэталізуючымі з’яўляюцца тэрміны, якія выкарыстоўваюцца для абазначэння асобных паняццяў, вядомых толькі на пэўнай тэрыторыі, у канкрэтных геаграфічных ландшафтах. Так, напрыклад, у балгарскай мове функцыянуе некалькі тэрмінаў, якія маюць значэнне ‘балота, багна, балоцістая мясцовасць’ (*блато, балта, мочур, батак, мочурище),* ‘узвышша, узгорак’ (*рид, възвишение, вис, чука, хълм, баир, бърдо, височина)* і інш.

Наменклатурныя геаграфічныя тэрміны, як адзначае Э. М. Мурзаеў, з’яўляюцца «той часткай складаных геаграфічных назваў (а іх большасць) фізіка-геаграфічных аб’ектаў, якія вызначаюць сэнсавае значэнне тапонімаў» [6, с. 10–11]. Веданне такіх структурных асаблівасцей тапонімаў у першую чаргу неабходна для вывучэння этымалогіі той ці іншай геаграфічнай назвы, аднак менавіта наяўнасць і характар выражэння наменклатурнага тэрміна ў структуры тапоніма выклікае пэўныя цяжкасці пры міжмоўнай перадачы ўласных геаграфічных назваў.

Наменклатурны геаграфічны тэрмін можа функцыянаваць у якасці самастойнай адзінкі або ўваходзіць у склад геаграфічнай назвы. Таму ўзаемасувязь паміж тапонімам і наменклатурным геаграфічным тэрмінам характарызуецца як сувязь паміж адзінкай мовы, якая аб’ядноўвае аднародныя прадметы ў клас (наменклатурны геаграфічны тэрмін), і той адзінкай, якая выкарыстоўваецца для дыферынцыяцыі аднародных прадметаў унутры аднаго класа (уласнае імя). «Калі геаграфічныя тэрміны абазначаюць, то тапонімы прама называюць» [5, с. 252], – піша Е. Курыловіч. Спецыфіка гэтай сувязі заключаецца ў адсутнасці выразнай мяжы паміж вышэй названымі групамі лексічных адзінак: тэрміны могуць свабодна выкарыстоўвацца ў якасці тапонімаў, а апошнія, у сваю чаргу, пераходзіць у разрад тэрмінаў. Такім чынам, геаграфічная назва змяшчае два абавязковыя элементы – «экспліцытна выражаны прапрыяльны (уласна

тапонім) і апелятыўны, які толькі маецца на ўвазе (агульнае імя, якое паказвае на від аб’екта, абазначанага ўласным імем)» [4].

Формы сувязі наменклатурных геаграфічных тэрмінаў з геаграфічнымі назвамі разнастайныя. Так, для тапанімікону Балгарыі найбольш характэрнымі з’яўляюцца наступныя:

1) Геаграфічны тэрмін уваходзіць у склад геаграфічнай назвы, вызначаючы яго прыналежнасць да таго ці іншага геаграфічнага аб’екта: *Връшка чука* (“чука” – камяністае узвышша), *Росен баир* (“баир” – узгорак), *Бургаско езеро* (“езеро” – возера), *Осоговска планина* (“планина” – гара), *Дунавската равнина* (“равнина” – раўніна), *Бебровска река* (“река” – рака) і інш. Геаграфічныя тэрміны ў дадзеным выпадку становяцца азначальным элементам наймення.

2) Геаграфічны тэрмін у сваёй зыходнай форме пераходзіць у тапонім без якіх-небудзь дадатковых анамастычных фармантаў: *Седловина (“седловина”* – седлавіна*), Сипей (“сипей”* – стромкі горны схіл*), Скалица (“скалица”* – уцёс, скала*), Рудина (“рудина”* – горная паляна), *Вис (“вис”* – узвышша, узгорак), *Бърдо (“бърдо”* – гара, узгорак), *Рът (“рът”* – прадаўгаваты узгорак) і інш. Наменклатурны геаграфічны тэрмін (*седловина, сипей, скалица, рудина, вис, бърдо, рът* і інш.) яшчэ не з’яўляецца геаграфічнай назвай, гэта апелятыў, які выкарыстоўваецца для абазначэння пэўнага асобнага геаграфічнага паняцця. Аднак у кожным тэрміне закладзена патэнцыяльная магчымасць анімізацыі і адпаведна далучэння да разраду ўласных геграфічных назваў. Адзначым, што без дадатковых тлумачальных слоў часцей за ўсё ў геаграфічныя назвы пераходзяць мясцовыя тэрміны, якія рэдка ўжываюцца і вядомыя толькі на абмежаванай тэрыторыі.

3) Геаграфічны тэрмін можа выкарыстоўвацца ў якасці кампанента складаных тапанімічных утварэнняў, часцей за ўсё – назваў населеных пунктаў, страчваючы пры гэтым свой наменклатурны характар: *Равна гора (“гора”* – лес, гай, дубрава*), Бяла слатина (“слатина”* – крыніца*),* *Вонѐща вода̀ (“вода”* – канал, канава*), Добра поляна (“поляна”* – шырокая раўніна*), Бобов дол (“дол”* – даліна*)* – усё гэта айконімы.

4) Геаграфічны тэрмін у складзе складанага тапоніма можа пераўтварацца ў службовы фармант (дакладней тапафармант і часцей за ўсё суфікс – *-поле, -дере, -градчик, -град, -дол, -зем, -селец*). Адбываецца гэта на аснове таго, што гэтыя элементы без асаблівых цяжкасцей вылучаюцца ў складзе тапоніма і валодаюць здольнасцю утвараць неабмежаваную колькасць найменняў, акрамя таго, яны рэгулярна паўтараюцца і маюць пэўнае лексічнае значэнне (паказваюць на від геаграфічнага аб’екта). Так, напрыклад, у якасці тапафарманта можна разглядаць фіналь *-дере,* якая мела першапачатковае значэнне ‘яр, роў, сухадол’, а зараз з’яўляецца састаўным кампанентам шэрагу назваў рэк (*Казълдере, Узундере, Чинардере, Бакърдере*). Разам з тым былі выяўлены выпадкі, калі з дапамогай

вышэй названага кампанента ўтвараліся полілексемныя тапонімы: *Селското дере, Калушко дере, Мечкино дере, Аланско дере.*

Прааналізаваны матэрыял паказаў, што часцей за ўсё для перадачы балгарскіх наменклатурных геаграфічных тэрмінаў на беларускую мову выкарыстоўваюцца два спосабы — практычная транскрыпцыя і пераклад. Пры дапамозе перакладу часцей за ўсё перадаюцца абагульняючыя геаграфічныя тэрміны, якія суправаджаюць тапонімы, паколькі яны выражаюць больш агульныя паняцці і не "прымацаваны" да пэўнага месца (могуць стаяць перад назваю або пасля яе): *нос Калиакра* – мыс Каліакра, *река Марица* – рака Марыца, *езерото Сребърна* – возера Срэбрына, *язовир Искър* – вадасховішча Іскыр, *Бургаско езеро* – Бургаскае возера.

Шляхам практычнай транскрыпцыі, як правіла, перадаюцца наменклатурныя геаграфічныя тэрміны, калі яны нясуць у сабе спецыфічную характарыстыку аб'екта, так званыя дэталізуючыя тэрміны. Яны звычайна не маюць дакладных адпаведнікаў у іншых мовах і характарызуюць асаблівасці прыроды, уласцівыя толькі той мясцовасці, дзе гэты тэрмін ужываецца. Аднак прааналізаваны матэрыял паказвае, што пры фарміраванні балгарска-беларускіх моўных адпаведнікаў, як правіла, такім чынам перадаюцца тапанімічныя ўтварэнні з геаграфічным тэрмінам, які страціў свой наменклатурны характар (тып тэрміна ў дадзеным выпадку не мае значэння). Так, напрыклад, назвы населеных пунктаў *Равна гора*, *Бяла слатина, Вонеща вода, Добра поляна, Бобов дол, Черни рид, Две могилы (*дзе *"гора"* – лес, *"слатина"* – крыніца, *"вода"* – канал, канава, *"поляна"* – шырокая раўніна, *"дол"* – даліна, *"рид"* – узвышша, узгорак, *"могила"* – невялікае ўзвышша, узгорак) перадаюцца як *Равна гора, Бяла слаціна, Ванешта вада, Добра паляна, Бабоў дол, Чэрні рыд, Дзве магілы* і інш. Не перакладаецца і тэрмін *"дере"*, калі ён з'яўляецца структурным кампанентам полілексемнага тапоніма: *Мечкино дере* – рака Мечкіна дэрэ.

Засваенне балгарскіх геаграфічных назваў адбываецца не толькі на фанетычным, але і на арфаграфічным узроўні, таму важным пытаннем з'яўляецца і напісанне слова (асобна, разам або праз дэфіс; з вялікай ці з малой літары). Прааналізаваны матэрыял сведчыць, што звычайна напісанне ўласнай геаграфічнай назвы ў беларускай мове супадае з зыходным напісаннем у балгарскай мове і асаблівых цяжкасцей не выклікае, аднак былі выяўлены некаторыя супярэчнасці. Так, напрыклад, назвы рэк *Бели Вит* і *Черни Вит* па-беларуску пішуцца праз дэфіс *Белі-Віт, Чэрні-Віт.*

Такім чынам, прааналізаваны матэрыял паказаў, што на выбар спосабу перадачы наменклатурнага геаграфічнага тэрміна ў значнай ступені ўплывае тып тэрміна (абагульняючы або дэталізуючы), форма сувязі наменклатурнага геаграфічнага тэрміна з геаграфічнай назвай і структура геаграфічнай назвы з пункту погляду словаўтварэння. Галоўным патрабаваннем пры перадачы наменклатурных геаграфічных тэрмінаў застаецца

аднастайнасць пісьмовай фіксацыі адных і тых жа лексічных адзінак сродкамі беларускай мовы (за выключэннем традыцыйных найменняў).

Літаратура

1. Григорян, Э.А. Словарь местных географических терминов болгарского и македонского языков / Э.А. Григорян. – Ереван: Айастан, 1975. – 260 с.
2. Жучкевич, В.А. Общая топонимика : учебное пособие / А.В. Жучкевич. – 3-е изд. – Мінск., Вышэйшая школа, 1980. – 288 с.
3. Карпенко, Ю.А. Топонимы и географические термины (вопросы взаимодействия) / Ю.А. Карпенко // Вопросы географии: сб. науч. ст.; под ред. Е.М. Поспелова. – М.: Мысль, 1970. – с. 36 – 45.
4. Копач, А.І. Роля геаграфічных тэрмінаў у гелонімах Беларусі і ЗША / А.І. Копач // Весці НАН Беларусі. Сер. гуманітарных навук. – № 1. – С. 113–120. – URL: http://elib.bsu.by/handle/123456789/9074. – Дата доступу: 11.05.2015.
5. Курилович, Е. Очерки по лингвистике: Сборник статей / Е. Курилович. – М.: Изд-во иностр. лит., 1962. – 456 с.
6. Мурзаев, Э.М. Словарь народных географических терминов / Э.М. Мурзаев. – М.: Мысль, 1984. – 656 с.

А.А. Лукашанец (Мінск)

ДЗЯРЖАЎНАЕ ДВУХМОЎЕ І ПРАБЛЕМЫ БЕЛАРУСКАМОЎНАЙ АДУКАЦЫІ

1. Дзяржаўнае беларуска-рускае двухмоўе ў нашай краіне ў адпаведнасці з міжнароднымі стандартамі прадугледжвае строгае выкананне моўнага заканадаўства, накіраванага на парытэтнае функцыянаванне абедзвюх дзяржаўных моў ва ўсіх сферах афіцыйных зносін і забеспячэнне з боку дзяржавы неад'емнага права кожнага грамадзяніна свабодна карыстацца любой дзяржаўнай мовай. Відавочна, што існуюць лінгвістычныя, прававыя, сацыяльна-псіхалагічныя і інш. аспекты строгага выканання гэтых прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя. Сярод іх у сённяшніх умовах найбольш важнымі, відавочна, трэба лічыць адукацыйныя, адказнасць за выкананне якіх кладзецца перш за ўсё на плечы дзяржаўнай сістэмы адукацыі ў Рэспубліцы Беларусь.

Сярод адукацыйных аспектаў забеспячэння прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя найбольш важнымі трэба лічыць два наступныя:

– фарміраванне дастатковай моўнай (беларускамоўнай!) кампетэнцыі соцыуму;

– забеспячэнне ў адпаведнасці з Канстытуцыяй Рэспублікі Беларусь, Законам Рэспублікі Беларусь "Аб мовах у Рэспубліцы Беларусь", а таксама Дэкларацыяй аб правах чалавека права грамадзяніна атрымліваць адукацыю на роднай нацыянальнай (у нашым выпадку беларускай!) мове.

2. Фарміраванне неабходнай моўнай кампетэнцыі грамадзяніна ў двухмоўным грамадстве мае выключна важнае значэнне:

а) для забеспячэння права грамадзяніна карыстацца любой дзяржаўнай мовай у залежнасці ад сваіх моўных густаў і схільнасцей і канкрэтнай маўленчай сітуацыі;

б) для забеспячэння псіхалагічнага камфорту пры неабходнасці выбару той ці іншай дзяржаўнай мовы для камунікацыі.

З улікам існуючай моўнай сітуацыі і рэалій моўнага жыцця ў краіне адзначанае набывае асаблівую актуальнасць.

Па-першае, належная двухмоўная (у першую чаргу, беларускамоўная!) кампетэнцыя неабходна кожнаму грамадзяніну Рэспублікі Беларусь, паколькі яна істотна пашырае яго культурную і інфармацыйную прастору і забяспечвае магчымасць моўных паводзін у адпаведнасці з камунікатыўнай сітуацыяй, што з'яўляецца неабходным фактарам псіхалагічнага камфорту асобы.

Па-другое, дастатковая двухмоўная (у першую чаргу, беларускамоўная!) кампетэнцыя найперш неабходна для службовых асоб усіх узроўняў, якія па сваім статусе прадстаўнікоў дзяржаўных органаў кіравання павінны забяспечыць кожнаму грамадзяніну права выкарыстоўваць любую (у тым ліку ці нават у першую чаргу беларускую!) мову ў сваёй дзейнасці. У прынцыпе, дасканалае валоданне абедзвюма дзяржаўнымі – беларускай і рускай – мовамі службовымі асобамі ў нашым грамадстве павінна стаць абавязковым патрабаваннем прафесійнай адпаведнасці займаемай пасадзе.

Па-трэцяе, дастатковая двухмоўная кампетэнцыя таксама неабходна работнікам вытворчай сферы, якія вырабляюць тавары народнага спажывання, харчовыя прадукты, лекавыя прэпараты і інш., для таго каб на іх таварах абавязкова ўтрымлівалася неабходная інфармацыя на абедзвюх дзяржаўных мовах. Абсалютна непрымальнай для незалежнай дзяржавы з'яўляецца сітуацыя, калі на прадукцыі, вырабленай на беларускіх прадпрыемствах і для беларускага спажыўца, утрымліваецца інфармацыя для спажыўца на рускай і казахскай мовах, але адсутнічае на беларускай. Гэтым самым не толькі парушаецца гарантаванае Канстытуцыяй права грамадзяніна атрымліваць неабходную інфармацыю на дзяржаўнай мове, але і прыніжаецца роля Беларусі як суверэннай краіны.

Па-чацвёртае, дастатковая двухмоўная кампетэнцыя неабходна для работнікаў сферы паслуг, без чаго таксама немагчыма забяспечыць права грамадзяніна карыстацца той ці іншай дзяржаўнай мовай у гэтай важнай паўсядзённай сферы камунікацыі.

Нарэшце, па-пятае, неабходны ўзровень валодання беларускай мовай грамадствам у цэлым забяспечвае індывідуальнае пачуццё годнасці асобы і калектыўнае пачуццё годнасці нацыі, якая ўсведамляе каштоўнасць і значнасць важнейшых нацыянальных атрыбутаў дзяржаўнасці, незалежнасці і адметнасці і сваімі моўнымі паводзінамі можа гэта сцвярджаць. Гэты мо-

мант вельмі важны ў сучасных умовах для захавання пачуцця моўнай талерантнасці і павагі да моўных густаў і схільнасцей субяседніка.

Выключна важная роля ў забеспячэнні беларускамоўнай кампетэнцыі сучаснага грамадства, безумоўна, належыць сістэме дзяржаўнай адукацыі. Можна без перабольшання сцвярджаць, што менавіта ў працэсе школьнага навучання сёння пераважная большасць падрастаючага пакалення набывае першыя сістэмныя веды па беларускай мове і практычныя навыкі беларускага маўлення. Больш таго, пры належных адносінах да выкладання беларускай мовы як вучэбнага прадмета з боку настаўнікаў і авалоданні ёю з боку вучняў кожны выпускнік сярэдняй школы незалежна ад мовы навучання можа атрымаць дастатковыя навыкі, каб пры неабходнасці свабодна выкарыстоўваць беларускую мову як рэальны сродак зносін. На жаль, прыходзіцца толькі канстатаваць, што недахоп беларускамоўнага асяроддзя і нізкая запатрабаванасць беларускай мовы як сродку зносін часта зводзяць на нішто набытыя ў школе веды па беларускай мове.

3. Другі аспект выканання прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя ў краіне звязаны з забеспячэннем права грамадзян атрымліваць адукацыю (у першую чаргу школьную) на дзяржаўнай (беларускай!) мове. На сённяшні дзень гэты аспект у сістэме дзяржаўнай адукацыі фармальна забяспечваецца функцыянаваннем школ і класаў з беларускай мовай навучання. Аднак у рэальнасці існуючыя ў адносінах да атрымання адукацыі на беларускай мове праблемы дазваляюць гаварыць практычна аб моўнай (беларускамоўнай!) дыскрымінацыі ў гэтай сферы.

Па-першае, суадносіны беларускамоўных і рускамоўных школ і колькасці навучэнцаў у іх далёка не на карысць беларускай мовы. Дзеля справядлівасці трэба сказаць, што такое становішча ў значнай ступені адлюстроўвае рэальную запатрабаванасць беларускай мовы як мовы школьнага навучання. Ды і самі фармальна беларускамоўныя школы, як паказваюць факты, далёка не заўсёды адпавядаюць свайму статусу беларускамоўных.

Па-другое, колькасць і тэрытарыяльнае размяшчэнне існуючых беларускамоўных школ і класаў не дазваляе бацькам, якія жадаюць, каб іх дзеці вучыліся ў школе па-беларуску, рэальна гэта ажыццявіць. Аднак праблема не вычэрпваецца толькі гэтым.

Трэцяй, найбольш важнай у гэтых адносінах трэба лічыць, безумоўна, праблему кадравага і вучэбна-метадычнага забеспячэння працэсу беларускамоўнага навучання ў школе, што з’яўляецца выключнай прэрагатывай дзяржаўных органаў адукацыі. Так склалася, што ў нашай краіне сёння фактычна не рыхтуюцца беларускамоўныя педагагічныя кадры для сістэмы дашкольнай і школьнай адукацыі. Пагэтаму спецыялісты, якія трапляюць у навучальныя ўстановы з беларускай мовай навучання ці выхавання, фактычна не гатовы выкладаць вучэбныя прадметы на

дзяржаўнай беларускай мове, за выключэннем, зразумела, такіх прадметаў, як беларуская мова і беларуская літаратура.

Акрамя таго, тыя спецыялісты, якія маюць жаданне, могуць або вымушаны весці выкладанне на беларускай мове, аказваюцца ў значна больш складаных умовах, чым іх калегі, якія працуюць ва ўстановах адукацыі з рускай мовай выкладання.

Так, Міністэрства адукацыі, хоць часта, як паказвае практыка, са спазненнем, але забяспечвае ўстановы адукацыі беларускамоўнымі падручнікамі па асноўных вучэбных прадметах. Праўда, застаецца пытанне аб беларускамоўных падручніках па замежных мовах. Аднак зусім па-іншаму абстаіць справа з іншымі дапаможнымі вучэбнымі матэрыяламі, якія ўваходзяць у абавязковы пералік вучэбна-метадычнага комплексу. Таму настаўнікі, напрыклад, фізікі ці матэматыкі павінны карыстацца на ўроках дапаможнымі рускамоўнымі матэрыяламі, што з'яўляецца парушэннем моўнага рэжыму, ці спецыяльна іх перапрацоўваць пры падрыхтоўцы да ўрокаў. Больш таго, і самім вучням недаступны ўсе неабходныя дапаможныя матэрыялы на мове навучання. Гэта вельмі важны і істотны момант забеспячэння прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя ў сферы адукацыі і псіхалагічнага камфорту вучня.

4. Такім чынам, у адпаведнасці з прынцыпамі дзяржаўнага двухмоўя і еўрапейскімі стандартамі правоў чалавека ў сферы моўнага жыцця, а таксама дзеля забеспячэння бесканфліктнага існавання беларускага грамадства на сучасным этапе развіцця і ўмацавання беларускай дзяржаўнасці неадкладнымі ў сферы адукацыі трэба лічыць наступныя задачы.

1. Забеспячэнне ў працэсе атрымання адукацыі належнай беларускамоўнай кампетэнцыі спецыялістаў, асабліва педагагічных кадраў.

2. Стварэнне поўнай беларускамоўнай вучэбна-метадычнай базы для ўсіх узроўняў адукацыі.

Першачарговымі крокамі для дасягнення гэтых задач павінны стаць:

а) істотнае павелічэнне вучэбных гадзін курса "Прафесійная лексіка" па ўсіх без выключэння спецыяльнасцях ВНУ, асабліва педагагічнага профілю;

б) распрацоўка сучасных руска-беларускіх слоўнікаў навуковай тэрміналогіі па асноўных галінах вытворчасці, у першую чаргу харчовай і медыцынскай;

в) распрацоўка поўнага комплексу сучасных руска-беларускіх слоўнікаў навуковай тэрміналогіі для школ па ўсіх без выключэння вучэбных прадметах;

г) абавязковае стварэнне поўнага камплекта беларускамоўных нарматыўных прававых дакументаў для забеспячэння адукацыйнага працэсу і вучэбна-метадычных комплексаў па ўсіх без выключэння вучэбных прадметах агульнаадукацыйнай школы, у тым ліку па замежных мовах;

д) абавязкове стварэнне агульнадаступных электронных варыянтаў усіх названых вышэй нарматыўных прававых дакументаў і вучэбна-метадычных матэрыялаў;

е) з улікам сучаснай моўнай сітуацыі і практычнай адсутнасці беларускамоўнага асяроддзя ў адукацыйнай сферы істотна павялічыць колькасць вучэбных гадзін у школе на вучэбныя прадметы “Беларуская мова” і “Беларуская літаратура”;

ж) з мэтай павышэння прэстыжу беларускамоўнага навучання і заахвочвання педагагічных кадраў распрацаваць і ўвесці ў дзеянне сістэму фінансавага заахвочвання школьных настаўнікаў, якія выкладаюць вучэбныя прадметы на беларускай мове;

з) пры падрыхтоўцы педагагічных кадраў прадугледзець абавязковае правядзенне студэнтамі ўрокаў і іншых мерапрыемстваў на беларускай мове ў час педагагічнай практыкі.

Як уяўляецца, выкананне гэтых мер дазволіць забяспечыць выкананне прынцыпаў дзяржаўнага двухмоўя ў нашай краіне, права грамадзяніна на атрыманне адукацыі на любой дзяржаўнай мове ў двухмоўным грамадстве, а таксама павысіць беларукамоўную кампетэнцыю сучаснага беларускага грамадства, што з’яўляецца важнейшым фактарам псіхалагічнага камфорту асобы і годнасці нацыі, а таксама ўмацуе прэстыж Рэспублікі Беларусь як прававой дэмакратычнай дзяржавы, якая паспяхова ўключаецца ў еўрапейскую сістэму адукацыі, паважае свае нацыянальныя каштоўнасці і інтэгруецца ў еўрапейскую і сусветную супольнасць, захоўваючы нацыянальную адметнасць.

С.М. Лясовіч (Полацк)

ЗНАКІ БЕЛАРУСКАЙ КУЛЬТУРЫ Ў ПАЭЗІІ УЛАДЗІМІРА КАРАТКЕВІЧА

Можна меркаваць, што мастацкі вобраз – гэта мадыфікацыя ўжо наяўных знакавых адносін. Культурныя сэнсы часта абумоўліваюць спецыфіку вобразнай сістэмы. У выніку «ўзаемадзеяння мовы і культуры, дзвюх семіятычных сістэм, культурная інфармацыя кадзіруецца моўнымі сродкамі, а моўныя знакі атрымліваюць здольнасць выконваць функцыю знакаў культуры» [4, с. 14]. Пад знакамі культуры мы будзем разумець тыя моўныя адзінкі, у якіх яскрава адбіліся культурныя ўяўленні народа, прычым наяўная культурная інфармацыя абагачае сэнс моўнай адзінкі, вобраза.

Узаемадзеянне знакавых сістэм прадуктыўна адбываецца ў словатворчасці лепшых прадстаўнікоў нацыянальнай літаратуры, сярод якіх і У. Караткевіч, такая спадчына заслугоўвае асаблівай увагі.

Пры аналізе культурных знакаў, на наш погляд, трэба разгледзець у першую чаргу вобразны складнік паэзіі, бо вобразы своеасабліва

прадстаўляюць індывідуальна-аўтарскую перапрацоўку нацыянальнай карціны свету, пазначаюць культурна значныя для аўтара рэаліі.

Старажытныя ўяўленні народа занатаваны ў такіх частках культуры, як міфалогія і фальклор, з якімі У. Караткевіч добра быў знаёмы. Кажан – жывёла, шырока прадстаўленая ў міфалагічных вераваннях беларусаў. Згодна з народнымі ўяўленнямі, «калі кажан сядзе на падлетка, той перастане расці» [3, с. 208]. Аўтар выкарыстоўвае сему пашкоджання, звязаную з вобразам кажана ў міфалогіі: «*О, чаму ты,* ***кажан****, / Не крануў мяне ў годы дзяцінства, / Каб не вырасла сэрца, / Каб вочы не бачылі боль*?» («Паўлюк Багрым»). У вершы паэт называе органы цела – сэрца, вочы, якія традыцыйна ў культуры выступаюць транслятарамі душэўнага стану.

За вобразам кажана замацавана пераважна адмоўная канатацыя, яго называлі «начным чортам», таму невыпадкова ў вершы «Дэман» аўтар малюе вобраз чалавека «*з* ***кажановымі*** *крыламі*».

Часам міфалагічныя вобразы праз метанімічны перанос станавіліся здабыткам мовы, папаўнялі шэраг безэквівалентнай лексікі. Так, напрыклад, сталася з лексемай карачун: «*У ланцугі нас кавалі, / Каб пад палкай нам быў* ***карачун»*** («Паўлюк Багрым»). У дыялектным маўленні беларусаў гэтай лексемай абазначалі смерць, прычым праз персаніфікацыю так жа і называлі дэманалагічную істоту. «Прадстаўнікі міфалагічнай школы XIX ст. … бачылі ў Карачуне бога падзем'я, які змагаўся з Перуном» [3, с. 225], але зараз гэта слова ўжываецца толькі як агульны назоўнік.

У беларускай міфалогіі існавала паданне пра змяінага цара, згаданага ў вершах як М. Багдановічам, так і У. Караткевічам: «*Вось карона ў рацэ заблішчэла, / Хтось плыве, як туман, на вадзе, / Па дарозе, ад месяца белай, Цар змяіны кудысьці паўзе*» («Матчына душа»). Пры згадванні змяінага цара з'яўляецца асацыяцыя менавіта з вужом, бо існуе паданне і пра Вужынага караля. Акрамя таго, даныя палявых даследаванняў сведчаць, што ў некаторых мясцінах па тэрыторыі Беларусі «вужамі называлі ўсіх паўзуноў» [3, с. 93]. Мяркуем, што ў моўнай карціне свету беларусаў вуж з'яўляецца прататыпічнай істотай змяі. Цікава, што абодва аўтары – У. Караткевіч і М. Багдановіч – ужываюць побач у кантэксце каларонім «белы» («Залаты ражок яму / Я ўраню с кароны, / І праз **белу** палатніну Дальш мы папаўзём» («Змяіны цар»). У паданні не сказана, што палатно, на якое скідвае карону змяіны цар, павінна быць белым [3, с. 192]. Верагодна, колеравыя асацыяцыі з'яўляюцца ў сувязі з рытуальнасцю белага колеру.

Назвы традыцыйных танцаў беларусаў неаднаразова сустракаюцца ў вершах У. Караткевіча: «*Пяткі* ***"Янку"*** *прывычна чаканілі, / Пахла мёдам мурожнае сена.*»; «*Жанчыны сечкамі таўкуць бадзёра, / Як быццам спора выбіваюць такт / Для нейкай небывала хуткай* ***полькі***» («На пачатку дарог»). У апошнім прыкладзе танец выступае эталонам для параўнання на аснове падабенства паводле хуткасці і рытмічнасці рухаў. Можна казаць

пра актуалізацыю акцыянальнага культурнага кода для пабудовы вобразнай сістэмы верша.

Гэта не адзінкавае параўнанне, дзе вобраз параўнання ўтрымлівае культурную інфармацыю: «*Край цяжка сыты, **як пастух на Юр'я**...*» («Трызненне мужыцкага Брэйгеля»). З гэтым народным святам звязваўся першы выпас жывёлы. «Запасванне на Юр'е станавілася і святам пастухоў – для іх гаспадары рыхтавалі добрыя закускі, а тыя на пашы ладзілі сабе пачастунак» [3, с. 536]. Можна меркаваць, што асновай для параўнання служаць фонавыя веды, знаёмства з народнымі традыцыямі.

У вершах адлюстраваны звычаі беларускіх сялян: «*Залатоўку узяўшы ў рукі, / Дзед шпурляў яе ў **"божае вогнішча"**, / Каб сухоты пусцілі ўнука*» («У тую ноч»). Устойлівы выраз «божае вогнішча» не зафіксаваны ў фразеалагічных слоўніках, хаця з тэксту носьбіт мовы беспамылкова прыгадае свята Купалле, з якім звязана сакралізацыя агню ў час летняга сонцастаяння.

Пры згадванні яшчэ аднаго свята ў кантэксце з лексемай «выкуп» прыгадваецца абрад сватання: «*Бо на **каляды**, ў святочнай хаце, / Ў хаце каханай і дарагой / Ў бацькавы куфры разлезлік багаты / Кіне свой выкуп потнай рукой*» («Перакаці-поле»). «Сватаць ехалі ў аўторак, чацвер, суботу або напярэдадні якога-небудзь свята ўначы без папярэдняй дамоўленасці або пасля яе» [3, с. 451]. Мяркуем, што аўтар невыпадкова абраў для вырашальнай падзеі свята Калядаў, у сувязі з якім існаваў звычай варажыць і вызначаць свой лёс, гэта ўзмацняе трагічнасць падзей.

Паэт схільны да мадыфікацыі традыцыйных уяўленняў з мэтай падпарадкавання вобразаў мастацкай задуме: «***Душы забітых – аблокі** – вітаюць зару*» («Надпіс на камені над крыніцай»). Згодна з традыцыйнымі ўяўленнямі, душа чалавека магла ператварацца ў істоту, звязаную з паветранай стыхіяй. Аўтар прапанаваў сваю інтэрпрэтацыю, атаясаміўшы душы з самой паветранай стыхіяй – аблокамі.

Так званыя этнаграфізмы таксама выступаюць знакамі культуры ў паэтычным тэксце: «*Жанчыны тут сышліся **"талакою"** / Дапамагчы нашаткаваць капусты...*» («На пачатку дарог»). Талакой беларусы называлі даўні народны звычай калектыўнай дапамогі ў гаспадарчых работах. Аўтар выкарыстаў гэтыя лексему з метанімічным пераносам (называе гэтым словам не звычай, а значную колькасць жанчын) для таго, каб падкрэсліць менавіта важную рысу народнага характару – калектывізм.

Коды культуры могуць рэалізоўвацца ў метафарах, прычым яны «заўсёды нацыянальна дэтэрмінаваны і абумоўліваюцца канкрэтнай культурай» [2, с. 232]. Самабытныя вобразы метафар У. Караткевіча выклікаюць шэраг асацыяцый, звязаных з міфалагічным складнікам культуры: «*Пасля студзеня ўладна прыходзіць **май, / Гучна звонячы ў сонечны шчыт***» («Спуск з гор»). Аўтарская персаніфікацыя мая, на нашу думку, невыпадковая. У маі адзначаюцца святы Ярылы і Юр'я, багоў, якія маюць

блізкія па гучанні імёны (этымалагізуюцца ад славянскага *jara ‘вясна’ [3, с. 545]), белы колер адзення, маюць падобныя рысы. «На ноўгарадскім абразе «Чудо Георгия о Змие» пачатку XIV ст. святы Юры трымае шчыт з выяваю сонца ў выглядзе чалавечага твару ў фас» [3, с. 544], таму, мяркуем, сувязь мая і сонечнага шчыта мае міфалагічныя падставы.

Яшчэ адзін спосаб прадстаўлення культурных знакаў у мастацкім тэксце звязаны з паняццем прэцэдэнтнасці. Прэцэдэнтнасць выступае як спосаб далучэння асобы да вядомых і сфарміраваных у грамадстве мадэляў паводзін і сітуацый. Прэцэдэнтыня імёны вельмі часта суадносяцца з тым ці іншым тыпам паводзін, прадстаўляюць каштоўнасныя арыенціры. З дапамогай прэцэдэнтнага імя аўтар на кагнітыўным і эмацыйным узроўні ўзнаўляе пэўна акрэслены вядомы чытачу змест.

З некалькіх узроўняў прэцэдэнтнасці, якія вылучае Д. Гудкоў, пры разглядзе знакаў беларускай культуры нас будуць цікавіць нацыянальна-прэцэдэнтныя феномены, што «вядомыя любому сярэдняму прадстаўніку той ці іншай лінгвакультурнай супольнасці і ўваходзяць у кагнітыўную базу гэтай супольнасці» [1, с. 103].

Імя Купалы выступае прэцэдэнтным і сімвалізуе сабой далучэнне да беларускай культуры, а імя яго вядомай гераіні Паўлінкі выклікае ў свядомасці носьбітаў мовы тыпаж беларускага жаночага характару маладой дасціпнай жанчыны: «*Дарослым будзе ён чытаць* ***Купалу****, / І замест юнай, з'едлівай* ***Паўлінкі*** */ Паўстане гэты сталы добры твар...*» («На пачатку дарог»).

«Паэма пра явар і каліну» – мастацкае ўвасабленне народнай балады, узор прэцэдэнтнага тэксту. «Явар часта выступае ў пары з жаночым дрэвам... вырастаюць на могілках атручаных маткай сына і нявесткі...» [3, с. 539]. Каліна ўспрымаецца «як нешчаслівае дрэва, якое паўстала ад загінуўшай жанчыны і якое звязалася са смерцю» [3, с. 212]. Аўтар па-свойму пераасэнсоўвае гэты прэцэдэнтны тэкст, які становіцца асновай аповеду, звязанага з гістарычнымі падзеямі войнаў з прусакамі гарадзенцаў. Культурныя знакі «явар» і «каліна», згаданыя разам, прадказваюць трагічны фінал.

Для У. Караткевіча культура ў першую чаргу ўвасоблена ў кнігах. Яны неаднойчы згадваюцца як вытокі жыццёвага вопыту і скарб, які будзе з чалавекам да апошняга: «*Вось кніжкі гэтыя ля тоўстых ножак: "Савось-распуснік", "Пра сабаку Бума", "Пра пана-жываглота", "Вярнідуб"...*» («На пачатку дарог»); «*Выходзіць пад бомбы ў дарогу, Захапіўшы з сабою Акрым шчоткі зубной Багдановіча, Танка, Купалу, І Коласа, й Панчанку, / І Эклезіяста, / І – ў сэрцы – бога*» («Кнігі»). У першым кантэксце згаданы кнігі, якія сапраўды можна разглядаць не толькі як аўтарскі індывідуальны вопыт, а як прэцэдэнтныя адзінкі са значэннем першых узораў мастацтва слова, якія далучаюць маленькага беларуса да свету кніжнасці. У другім кантэксце аўтар называе знакавыя імёны беларускай літаратуры, якія

метанімічна называюць кнігу, а таксама адну з самых філасофскіх кніг Бібліі. Прычым згадка кніг побач з такой празаічнай рэччу, як зубная шчотка, падкрэслівае надзённую патрэбу ў іх.

Некаторыя гістарычныя падзеі падаюцца знакавымі нашчадкам, становяцца прыкладам ці то вялікай адвагі і годнасці, ці то вялікай ганьбы і гора. Такія рэаліі ўваходзяць у скарбонку канцэптуальнай карціны свету народа і могуць выступаць у нацыянальнай культуры як прэцэдэнтныя сітуацыі: «*Чалавек чытаў старажытныя кнігі / Пра зямлю, дзе буялі агонь і меч, / Пра крывавую бітву над соннай Нямігай / І смяротны запал крутагорскіх сеч*» («Слова пра чалавечнасць»). Аўтар як сімвал войнаў, што зведала беларуская зямля, абірае бітву на Нямізе – адну з самых вялікіх і крывавых міжусобных боек Русі і Крутагорскую міфічную бітву паміж войскам Вялікага Княства Літоўскага і татарамі.

Прааналізаваны матэрыял сведчыць пра ўмелае спалучэнне У. Караткевічам розных знакавых адносін для стварэння ў мастацкіх вобразах паэзіі адзінак, якія валодаюць вялікім інфарматыўным патэнцыялам знакаў культуры, па якіх можна вывучаць асаблівасці беларускай нацыянальнай культуры.

Літаратура

1. Гудков, Д.Б. Теория и практика межкультурной коммуникации / Д.Б. Гудков. – М.: ИТДГК «Гнозис», 2003. – 288 с.

2. Красных, В.В. Этнопсихолингвистика и лингвокультурология: курс лекций / В.В. Красных. – М.: ИТДГК «Гнозис», 2002. – 284 с.

3. Міфалогія беларусаў: Энцыкл. слоўн. / склад. І. Клімковіч, В. Аўтушка; навук. рэд. Т. Валодзінай, С. Санько. – Мінск: Беларусь, 2011. – 607 с.

4. Телия, В.Н. Первоочередные задачи и методологические проблемы исследования фразеологического состава языка в контексте культуры / В.Н. Телия // Фразеология в контексте культуры. – М.: Шк. «Яз. рус. культуры», 1999. – С. 13 – 24.

Г.І. Малько (Горкі)

ЗЕМЛЕЎПАРАДКАВАЛЬНАЯ ТЭРМІНАЛОГІЯ І ЯЕ АСАБЛІВАСЦІ

У вырашэнні пытанняў, звязаных з рацыянальным выкарыстаннем земляў, важную ролю адыгрываюць землеўпарадкаванне і зямельнае заканадаўства.

Тэрміналогія землеўпарадкавання – гэта частка слоўнікавага запасу беларускай мовы, якая ўключае назвы спецыяльных паняццяў: геадэзічных прылад і інструментаў; картаграфічных, інжынерна-тэхнічных, інвентарызацыйных работ, працэсаў і г.д.

Тэрміналогію землеўпарадкавання можна падзяліць на *агульнанавуковую, міжгаліновую* і *вузкаспецыяльную.*

Агульнанавуковая тэрміналагічная лексіка землеўпарадкавання – гэта тэрміны, якія характарызуюць працу ўстаноў землеўпарадкавання, сродкі працы, колькасныя паказчыкі работы вытворчасці, удасканаленне вытворчага працэсу: *інтэнсіфікацыя, рабочы працэс, вытворчы рэжым работы, сродкі працы, упарадкаванне тэрыторыі, адміністрацыйна-тэрытарыяльнае дзяленне, рацыянальнае выкарыстанне земляў, зямельнае заканадаўства* і інш.

Міжгаліновая тэрміналагічная лексіка называе навуковыя паняцці ўсіх дысцыплін землеўпарадкавання. Міжгаліновыя тэрміны абазначаюць:

– ***арганізацыі:*** *Дзяржаўны камітэт па зямельных рэсурсах, геадэзіі і картаграфіі Рэспублікі Беларусь; Беларускі навукова-ўкараняльны цэнтр па землеўпарадкаванні, геадэзічная служба, дзяржаўная геадэзічная сетка;* ***назвы дакументаў, карт:*** *акт землеўпарадчага абследавання, праектна-каштарысная дакументацыя, праекцыя картаграфічная, пасведчанне на права часовага карыстання зямлёй, тапаграфічны план, дзяржаўная геадэзічная сетка, карта зямельна-ўліковая, Дзяржаўная зямельнакадастравая кніга; Дзяржаўны акт на права пажыццёвага спадчыннага ўладання зямлёй, Дзяржаўны акт на права прыватнай уласнасці на зямлю, Дзяржаўны акт на права пастаяннага ўладання (карыстання) зямлёй, дароўная на зямлю;* ***назвы прыбораў:*** *пантограф, дальнамерная рэйка, складны метр, вышынямер, схіламер;* ***работы па землеўпарадкаванні:*** *бягучы ўлік земляў, таксаванне, пратычкоўванне, звярстанне земляў, тэрасаванне схілаў, трасаванне, арашэнне, асушэнне, пашпартызацыя земляў, картаграфаванне, занаванне тэрыторыі, нівеліраванне, межаванне, здымка, тахеаметрыя, генералізацыя карты;* ***назвы спецыялістаў па землеўпарадкаванні:*** *каморнік (землямер), інжынер-землеўпарадкавальнік, інспектар, тапограф, інжынер-геадэзіст, інжынер-картограф, таксатар, межавік*; ***назвы адзінак вымярэння плошчы зямельных участкаў і даўжыні:*** *ар, акр, гектар, сотка, дэцыметр, сантыметр, метр, кіламетр, цаля.*

Вузкаспецыяльная тэрміналагічная лексіка выражае паняцці асобна ўзятай дысцыпліны. У якасці прыкладу прыводзім тэрміны дысцыпліны “Геадэзічнае забеспячэнне кадастру”: *нівелір, глухі нівелір, нівелірная рэйка, рэпер, рэпітар, гіпсометр, тальвег, тэадаліт, тахеометр, бусоль, эклімётр, пікет, пікетаж, алідада, алідадны круг, верньер, кракі, астралябія, візір, лімб.*

Лексіка-семантычная характарыстыка землеўпарадкавальных тэрмінаў адлюстроўвае ўзаемаадносіны тэрміналагічных адзінак: сінанімічныя, аманімічныя, антанімічныя, мнагазначнасць.

У землеўпарадкавальнай тэрміналогіі можна выдзеліць некалькі груп тэрмінаў-сінонімаў:

– ***два іншамоўныя тэрміны:*** *кадзіраванне – шыфраванне, верньер – ноніус, абрыс – план, маніторынг – кантроль* і інш.; ***іншамоўны і ўласны***

тэрмін: *нівелір – узровень, ватэрпас – грунтвага, гарызонт – пазем – кругавід, гарызанталь – паземнік, ландшафт – краявід, эскіз – накід, пляц – плошча, альтытуда – абсалютная вышыня;* ***два ўласныя тэрміны:*** *выпуклая лінза – пукатая лінза, мяжа – рыса, домаўладальнік – домаўласнік, відарыс – выява, уладкоўваць – абсталёўваць, тычка – вешка – вяха, адвес – строма, палетка – сетачка памеравая, насечка – зарубка, нявязка – нязладжанасць, земляробства – рольніцтва.*

Вылучаюцца ***словаўтваральныя*** тэрміны-сінонімы (адрозніваюцца словаўтваральнымі марфемамі): *арэнда – ранда, увагнутая – угнутая лінза, межавацца – межаваць, адвод – адвядзенне, адмяраць – адмерваць, вызначальнік – вызначнік, схілісты – нахілены, раянаванне – раяніраванне, землеўпарадчык – землеўпарадкавальнік* і інш.; ***сінтаксічныя*** тэрміны-сінонімы (суадносныя паводле будовы і значэння): *маніторынг земляў – кантроль земляў, надзел зямлі – участак зямлі, падзорная труба – гляджальная труба.*

У землеўпарадкавальнай тэрміналогіі сустракаюцца і тэрміны-антонімы: ***лексічныя*** (розныя лексемы з супрацьлеглым значэннем): *азімут просты – азімут адваротны, унутраны вугал – вонкавы вугал, першаснае землеўладанне – другаснае землеўладанне, рухомая маёмасць – нерухомая маёмасць, дваякаўвагнутая лінза – дваякавыпуклая лінза* інш.; ***словаўтваральныя*** (з антанімічнымі часткамі слоў – запазычанымі ці ўласнабеларускімі асновамі і прэфіксамі): *выгнутая лінза – увагнутая лінза, карта буйнамаштабная – карта дробнамаштабная* і інш.

Тэрміны-амонімы часцей за ўсё адносяцца да розных тэрміналагічных сістэм (іх называюць міжнавуковымі амонімамі): ***банкет, акт.***

Мнагазначнасць у тэрміналогіі землеўпарадкавання – заканамерная з’ява, пра што сведчаць прыведзеныя прыклады: ***аксіёметр, абрыс, азімут, алідада, бусоль, верньер, візір, візіраваць, лімб, пантограф, пікет, планшэт, рэпер, тапаграфія***.

Землеўпарадкавальныя тэрміны ўтвараюцца рознымі спосабамі.

1. Лексіка-семантычны спосаб звязаны з тэрміналагізацыяй агульналітаратурных слоў, якія шляхам пераасэнсавання набываюць новае тэрміналагічнае значэнне: агульнаўжывальныя словы ***тычка, тычкаваць, межаваць, метка, башмак нівелірны, ножка штатыва, банкет, сетка*** і іншыя страцілі сваю бытавую выразнасць, набылі строга акрэсленае спецыяльнае значэнне.

2. Сінтаксічны спосаб – спосаб утварэння тэрмінаў шляхам рознага тыпу спалучэнняў. Найбольшая колькасць тэрмінаў утворана па мадэлях: прыметнік + назоўнік, назоўнік + назоўнік і назоўнік + прыметнік + назоўнік: *нівелірная метка, геадэзічная здымка, адваротны азімут, кантрасны відарыс, абсталяванне населеных пунктаў, вось візіравання, зямельная справаздача, першаснае землеўладанне, рэжым карыстання зямлёй, бягучы ўлік земляў, нулявы штрых верньера* і інш.

3. Марфалагічны спосаб

Значнае месца ва ўтварэнні землеўпарадкавальных тэрмінаў займае ***суфіксацыя***. Найбольш прадуктыўнымі з'яўляюцца наступныя суфіксы:

-нн-, -энн-, -к-: *візіраванне, межаванне, нівеліраванне, нівеліроўка, абвалаванне, вырысоўванне, земляванне, тычкаванне, звярстанне, картаграфаванне, тэрасаванне, рэкагнасцыроўка, землеўладальніцкі;* ***-льнік-, -ік-,***

-іст-: *упарадкавальнік, геадэзіст, межавік;* ***-чык, -шчык:*** *нівеліроўшчык;*

-льн-, -н-, -ав-: *тахеаметрычны, тэадалітны, мензульны, бусольны, межавы, схіламерны, кадастравы, грунтавы, нівелірны, пантаграфаваць, тэрасаваць, рэкагнасцыровачны.*

Прэфіксацыя займае меншае месца ва ўтварэнні землеўпарадкавальных тэрмінаў у параўнанні з суфіксацыяй: ***вы-:*** *вытычкаваць, вырысаваць;* ***не- (ня-):*** *нявязка* (у плошчах), *неградуяваны;* ***без- (бяз-)*** *і* ***бес- (бяс-):*** *беззямельны;* ***пра-:*** *пранівеліраваць, пратычкаваць;* ***а-:*** *аслупаваць*; ***за-:*** *закартаграфаваць;* ***з-:*** *звярстаць.*

Аснова- і словаскладанне займае значнае месца ва ўтварэнні землеўпарадкавальных тэрмінаў. Асноваскладанне можа спалучацца з суфіксацыяй: *вышынямер, схіламер, схілапаказальнік, землеапісанне, землеўласнік, землеўпарадчык, землеўладанне, землеўладальнік, землекарыстальнік, зямельнакадастравы, зямельнаўліковы, картаграма, картаграфія, фотатэадаліт, фотатапаграфія, тэлеметр, буйнамаштабны.*

Сучасная беларуская землеўпарадкавальная тэрміналогія разнастайная паводле паходжання. Да ***ўласнамоўных тэрмінаў*** адносяцца многія словы, якія ўзыходзяць да праславянскіх і агульнаўсходнеславянскіх лексем (***землеапісанне, вышынямер, адмежаванне, палетка, метка***).

У "Старабеларускім лексіконе" сустрэліся землеўпарадкавальныя тэрміны ***волочникъ***; ***делина***; ***детчына***; ***дуктъ***; ***жеребей***; ***инвентаръ (инвентарь)***; ***кгрунтъ;*** ***комора***; ***коморникъ***; ***копец***; ***крокъ***; ***линия***; ***лыко***; ***поделити в лыко***; ***мерникъ***; ***место***; ***миля***; ***моргъ***; ***подкоморский судъ***; ***подкоморый***; ***прутовщина***; ***прутъ***; ***пустовщина***; ***раженье***; ***ражоный***; ***реза***; ***сажень***; ***соха***; ***стопа***; ***тыка, тычка***; ***цаля***; ***шнуръ, снуръ***.

Значную частку землеўпарадкавальнай тэрміналогіі складаюць ***запазычаныя тэрміны***:

1) з нямецкай мовы: абрыс (*Abriß* – чарцёж, план); ***візір*** (*Visier*); ***візіраваць*** (*visieren*); ***кіпрэгель*** (*Kippregel*); ***ландшафт*** (*Landschaft* – пейзаж, від, краіна, правінцыя < *Land* – краіна, зямля, раўніна); ***рэйсшына*** (*Reißschiene*); ***тальвег*** (*Talweg – Tal* даліна + *Weg* – дарога);

2) з французскай мовы: бусоль (*boussole*); ***верньер = ноніус*** – па імені П. Вернье (P. Vernier); ***кадастр*** (*cadastre* < сярэд.-грэч. *katas tichon* – ліст, рэестр); ***кракі*** (*croquis*); ***нівелір*** (*niveler – niveau* – узровень); ***пікет*** (*piquet*); ***пікетаж*** (*piquetage*); ***планшэт*** (*planchette*); ***рэпер*** (*repère*);

3) з грэчаскай мовы: астралябія (*astrolabion – astron* зорка + *labē* схопліванне); ***геадэзія*** (*geodaisia* – падзел зямлі); ***гіпсаметрыя*** (*hypsos* вышыня + *метрыя); **палігонаметрыя*** (*polygōnos* < *poly* многа + *gōnia* – вугал + *метрыя*); ***пантограф*** (*pan (pantos)* – увесь, усякі + *граф*); ***страбаскоп*** (*strobes* кружэнне, віхор + *скоп*); ***тахеометр*** (*tachys (tacheos)* хуткі + *метр*); ***тэадаліт*** (*theaomai* разглядваю + *dolichos* доўгі); ***экліметр*** (*ekklinō* адхіляю + *метр*);

4) з лацінскай мовы: арэнда (*arenda*); ***курвіметр*** (*curvus (curvi)* – крывы + *метр*); ***лімб*** (*limbus* – кропка, кайма); ***мензула*** (*mensula*); ***цэнз*** (*census*);

5) з англійскай мовы: маніторынг;

6) з арабскай мовы: азімут (*as-simut* – мн. ад *as-samt* – дарога); ***алідада***;

7) з польскай мовы: каморнік (*komornik*, ад *komora* < лац.*camara*); ***каштарыс*** (*kosztorys* ад *koszt* < чэш. *košt* < с.-в.-н. *kost, koste*).

Такім чынам, землеўпарадкавальныя тэрміны з'яўляюцца разнастайнымі па значэнні, паходжанні, спосабах словаўтварэння і займаюць важнае месца ў лексічнай сістэме беларускай мовы.

Літаратура

1. Краткий русско-белорусский словарь землеустроителя / В.Ф. Дудко, Г.В. Дудко, О.П. Зенькович; под ред. О.П. Зенькович. – Минск: БКГО «Геодезия», 1997. – 78 с.

2. Прыгодзіч, М.Р. Старабеларускі лексікон. Падручны перакладны слоўнік / М.Р. Прыгодзіч, Г.К. Ціванова. – Мінск: Беларускае выдавецкае таварыства "Хата", 1997. – 175 с.

3. Руска-беларускі слоўнік сельскагаспадарчай тэрміналогіі / М.В. Бірыла, Г.У. Арашонкава, В.А. Бабкова [і інш.]; пад рэд. М.В. Бірылы, Г.У. Арашонкавай. – Мінск: Ураджай, 1994. – 560 с.

А.А. Марозава (Мінск)

ВАРЫЯНТЫ *БУРШТЫН* І *ЯНТАР*: ДА ПРАБЛЕМЫ ЛЕКСІЧНАЙ НОРМЫ

На працягу стагоддзяў беларускія землі развіваліся, займаючы сярэдзіннае становішча паміж землямі літоўскімі, польскімі і рускімі. Таму значная роля ў іх развіцці належала ўзаемаўплыву культур, якое суправаджалася кантактаваннем моў, што знайшло сваё адлюстраванне ў лексічнай сістэме сучаснай беларускай мовы.

Агульнасць матэрыяльнай культуры выяўлялася, сярод іншага, у тым, што прадстаўнікі заможных саслоўяў у якасці ўпрыгожанняў насілі рэчы, зробленыя са скамянелай смалы. І хоць падобныя вырабы археолагі знаходзяць і на тэрыторыі сучаснай Беларусі, словы для іх абазначэння ў беларускую мову прыйшлі ў выніку запазычання з суседніх моў. Паколькі

моў-крыніц было некалькі, а словы служылі для называння адной прыроднай рэаліі, натуральным чынам складваліся ўмовы для канкурэнцыі намінацый, а значыць і для адносін лексічнай варыянтнасці. У сучаснай беларускай мове такімі лексічнымі варыянтамі з'яўляюцца лексемы *бурштын* і *янтар*.

Функцыянаванне слова *бурштын* засведчана ў мове ўжо ў старабеларускі перыяд. У "Лексіконе славенароскім" Памвы Бярынды (Куцейна, 1653) знаходзім указанне на яго як на агульную назву для ўсіх скамянелых смол хвойных дрэў. Атрымліваецца, што назва *бурштын* уступала ў гіпанімічныя адносіны з астатнімі найменнямі, утвараючы своеасаблівую іерархічную структуру. Цікавым падаецца той факт, што запазычанае слова *бурштын* служыць для тлумачэння слова *илектронъ*, якое ў сваю чаргу таксама з'яўляецца запазычаннем і мае тоеснае значэнне. Відаць, грэцызм успрымаўся як адзнака кніжнага стылю, паколькі ў названы перыяд перасталі карыстацца ў пісьмовай і перакладчыцкай практыцы грэчаскай мовай. На першы план выйшла мова польская як крыніца новай лексікі і як мова-пасрэдніца паміж старабеларускай і заходнееўрапейскімі.

Указаннем на мову-крыніцу слова *бурштын* служыць збег зычных (ршт), характэрны для лексікі германскага паходжання. Аднак у вызначэнні шляху запазычання думкі даследчыкаў разыходзяцца. Большасць указвае, што запазычанне адбылося праз польскую мову: (польскае bursztyn) з ніжненямецкай (Bornstēn, ням. Bernstein, літаральна 'палаючы камень') [6, с. 421]. Аднак, зыходзячы з націску, можна вывесці слова непасрэдна з нямецкай мовы. Назва магла быць запазычана адначасова ў польскую і беларускую мовы разам з вырабамі з бурштыну ў выніку гандлёвых сувязей.

У XIX ст. у якасці агульнага найменя для скамянелай смалы хвойных дрэў захавалася толькі слова *бурштын*. Да таго ж за працяглы час яго бытавання ў мове ўжо сфарміравалася гняздо аднакаранёвых лексем. Так, у слоўніку І.І. Насовіча побач са словам *бурштынъ* [3, с. 39] адзначаны таксама вытворныя ад гэтага ж кораня *брушты*нка, брушты*нный, брушты*новый* [3, с. 35]. Акрамя таго, паступова слова *бурштын* пачало з'яўляцца на старонках навуковых выданняў не толькі ўласналінгвістычнага характару. У 1881 г. выйшла ў свет кніга М. Нікіфароўскага "Очерки простонародного житья-бытья в Витебской Белоруссии" (Віцебск, 1895). Гэтае выданне стала адной з першых этнаграфічных крыніц, у якой абазначыліся межы тэрытарыяльнага функцыянавання лексемы на беларускіх землях.

На мяжы XIX і XX стст. словы *бурштын* і *янтар* яшчэ не ўступілі ў адносіны варыянтнасці. Слова *янтар*, нягледзячы на яго вядомасць на тэрыторыі рассялення беларусаў, ужывалася ў асноўным не для патрэб прамой намінацыі, а толькі як сродак тлумачэння лексемы *бурштын* праз падбор сіноніма з блізкароднаснай мовы. Спрыяльным часам для пашырэння намінацыйнай магчымасці слова *янтар* у мове стаў нашаніўскі пе-

рыяд, калі склаліся ўмовы для шырокага ўжывання без абмежавання лексікі самага рознага кшталту. У гэты перыяд абодва варыянты атрымалі роўныя магчымасці для замацавання ў мове ў якасці лексічнай нормы, аднак сітуацыя не змянілася. Матэрыялы газеты “Наша ніва” не ўтрымліваюць выпадкаў выкарыстання ні слова *бурштын*, ні слова *янтар*. Адпаведна, нельга вызначыць ні частату іх ужывання, ні функцыянальную ролю кожнага са слоў. Незапатрабаванасць у лексемах можна патлумачыць тым, што ў акрэслены час у самім грамадстве не існавала попыту на каштоўныя вырабы з дадзенага матэрыялу.

Найменні выступалі толькі як прадмет лінгвістычных даследаванняў у навуковых працах (праца В. Вольскага “Пра словы нямецкага паходжання ў беларускай мове”, перакладныя слоўнікі 20-х гг., выпускі навуковай тэрміналогіі). Ва ўсіх згаданых крыніцах паслядоўна прасочваецца адна заканамернасць – дакладнае аднясенне слова *бурштын* да беларускамоўнага, а слова *янтар* – да рускамоўнага сродку: *Янтарь – бурштын, бруштын, янтар* [4, с. 703]; *янтарь – бурштын* [1, с. 243].

Толькі пачынаючы з 30-х гг. XX ст. слова *янтар* усё часцей пачало ўжывацца як варыянт да слова *бурштын*. Перагрупаванне лексікі было выклікана зменамі ў моўнай палітыцы СССР, накіраванай на збліжэнне моў. Паколькі лексема *янтар* з’яўляецца агульнай для лексічнага фонду рускай і беларускай моў, на працягу ўсяго савецкага перыяду яе функцыянаванне вызначалася найбольшай актыўнасцю. Пры гэтым неабходна адзначыць некалькі момантаў адносна спецыфікі ўжывання варыянтаў *янтар* і *бурштын*.

Па-першае, словы засталіся прыналежнасцю літаратурнай формы нацыянальнай мовы. У дыялектных слоўніках XX ст. (Чэрвеньшчыны, усходняй Магілёўшчыны, Брэстчыны, Тураўскім, Мінска-маладзечанскіх гаворак, Ф.М. Янкоўскага і інш.) няма фіксацыі ніводнага з іх. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак таксама не ілюструе распаўсюджанне слоў на тэрыторыі Беларусі, паколькі на момант яго складання вырабы з бурштыну не былі важнай часткай традыцыйнага быту насельніцтва.

Па-другое, у літаратуры савецкага перыяду варыянты *бурштын* і *янтар* ужываліся ў асноўным для стварэння мастацкага вобраза. Прыём пабудаваны на тым, што ў лексічным значэнні слоў ёсць указанне на жоўты колер: *бурштын* ‘скамянелая, жоўтая, празрыстая смала хвойных дрэў, якая ўжываецца для вырабу розных аздоб’ [5, т. 1, с. 424] і *янтар* ‘скамянелая, звычайна жоўтага колеру розных адценняў, смала хвойных дрэў, якая ўжываецца для вырабу розных аздоб; бурштын’ [5, т. 5, кн. 2, с. 501].

Іменна адсылка да колеру ляжыць у аснове лексічнага значэння. Можна заўважыць, што азначэнні абодвух назваў амаль цалкам дубліруюцца. Розніца заключаецца ў тым, што слова *бурштын* тлумачыцца апісальным спосабам, а слова *янтар* двума спосабамі: асноўным – апісальным і дадатковым – праз падбор іншамоўнага адпаведніка. Гэтая

розніца якраз і ўказвае на нераўнапраўнае функцыянаванне варыянтаў у мове, калі перавага аддаецца аднаму з іх, у дадзеным выпадку слову *бурштын*. Падобным чынам адлюстраваны абодва словы ў Беларускай Савецкай энцыклапедыі і Беларускай энцыклапедыі (слова *янтар* уводзіцца пры дапамозе спасылкі *тое, што і*), у перакладных руска-беларускіх слоўніках слова *янтар* (*янтарны*) ставіцца на другое месца.

Перакладныя слоўнікі пачатку XXI ст. яшчэ фіксуюць абодва варыянты, аднак на першае месца паслядоўна ставіцца слова *бурштын* і вытворныя ад яго. Значыць, у сучаснай беларускай мове перавага аддаецца лексеме *бурштын*, якая ў апошнія дзесяцігоддзі пачала ўжывацца ва ўсіх значэннях і кантэкстах (*бурштынавы пакой, кіслата, масла*). Слова застаецца актыўным лексічным сродкам пераважна ў публіцыстычных тэкстах: *Дзюсельдорфскае архітэктурнае бюро Rhode-Kellermann-Wawrowski прапанавала ў якасці асноўнай мастацкай тэмы для арэны ў партовым Гданьску вобраз* ***бурштыну****, якім славіцца Балтыйскае мора* (Наша Ніва. – 2012. – 13 чэрвеня. – С. 11). У мастацкіх тэкстах па-ранейшаму служыць для стварэння вобраза на аснове метафарычнага пераносу (паводле колеру, формы, структуры): *Хто слязу залатую з веяў / у* ***бурштын*** *пераплавіць змог?* (Э. Акулін. Марыя Магдалена // Літаратурная Беларусь. – 2012. – 21 снежня. – С. 13).

Матэрыялы беларускага нацыянальнага корпуса змяшчаюць 88 ілюстрацый ужывання варыянта *бурштын* і толькі 7 – *янтар*. Пры гэтым у палове выпадкаў слова ўжываецца як уласнае імя (мянушка, назва магазіна), або як указанне на матэрыял (камень або гатунак). Ці з'яўляецца гэта паказчыкам таго, што ў функцыянаванні слова *янтар* назіраецца тэндэнцыя да выхаду яго з актыўнага фонду беларускай мовы? Магчыма, адказ на гэтае пытанне даўно даў Уладзімір Караткевіч у сваім эсэ "Казкі Янтарнай краіны": *"Паміж латгальскімі азёрамі і Балтыйскім морам ляжыць* ***Янтарная*** *краіна. І ўсё на гэтай зямлі мае* ***янтарны*** *колер. І валасы ў людзей, і свежыя зрубы, і нават ніва…"* [2, с. 14]. Пасля публікацыі аўтару часта задавалі пытанне: чаму ён выкарыстаў словы *янтарны* і *янтар*, а не бурштын. У адным з інтэрв'ю прагучала наступнае абгрунтаванне: эсэ прысвечана Латвіі, што абумовіла выбар варыянта. Паколькі янтар заўсёды лічыўся адной з візітных картак гэтай краіны, можна лічыць, што слова выступае ў якасці экзатызма пры апісанні мясцовага каларыту. Слова *янтар* з'яўляецца балтызмам па паходжанні і разам з тым вядомае лексічнай сістэме беларускай мовы. Таму і сёння яго ўжыванне ў падобных кантэкстах лагічна апраўдана: *Шмат мерапрыемстваў праводзілася і ў Мінску: выстаўка латвійскага* ***бурштыну****, выстаўка сучаснага латвійскага мастацтва, тыдзень латвійскага кіно…* (ЛіМ. – 2015. – 26 чэрвеня. – С. 2).

Ва ўсходнеславянскіх мовах статус слоў *бурштын* і *янтар* неаднолькавы: у беларускай і ўкраінскай слова *бурштын* належыць да

агульнаўжывальнай лексікі, а ў рускай мове адпаведнікам да яго выступае слова *янтарь*. Гістарычныя ўмовы развіцця беларускай мовы і дзеянне экстралінгвістычных фактараў спрыялі актыўнаму пашырэнню слова *янтар* як альтэрнатыўнага наймення. Аднак на сучасным этапе яно пачало страчваць актуальнасць і выходзіць з актыўнага ўжытку. На практыцы перавага аддаецца лексеме *буршты*н, якая пачала ўжывацца як адзіны лексічны сродак ва ўсіх кантэкстах.

Літаратура

1. Беларуская навуковая тэрміналёгія ў 4-х кнігах. Кн. 4. – Практычны беларускі вайсковы слоўнік (1927). – Менск: Arche, 2010. – С. 7 – 256.
2. Караткевіч, У. Казкі Янтарнай краіны / У. Караткевіч // Збор твораў: у 8 т. Т. 8. – Кн. 2. – Мінск, 1991. – С. 14–47.
3. Насовіч, І.І. Слоўнік беларускай мовы / І.І. Насовіч. – Мінск: Беларус. Сав. Энцыклапедыя, 1983. – 792 с.
4. Некрашэвіч, С. Расійска-беларускі слоўнік. Выданне другое, папраўленае / С. Некрашэвіч, М. Байкоў. – Менск, 2010. – 704 с.
5. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: У 5 т. / АН БССР. Ін-т мовазнаўства імя Якуба Коласа. Пад агульн. рэд. К.К. Атраховіча (Кандрата Крапівы). – Мінск: БелСЭ, 1977 – 1983.
6. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 1. А–Б / [В.У. Мартынаў, А.Я. Супрун, Г.А. Цыхун і інш.; рэд. В.У. Мартынаў]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978. – 440 с.

В.А. Маслова (Витебск)

ЯЗЫК И НАРОД: НАРОДООБРАЗУЮЩАЯ ФУНКЦИЯ ЯЗЫКА

Исследование языковых явлений во взаимосвязи с сознанием, мышлением, духовной жизнью и культурой человека, его национальной психологией и историей позволяет по-новому представить наиболее значимые проблемы современной лингвистики. Мы полностью солидарны с позицией В.И. Постоваловой, которая считает, что антропологическая программа изучения языка выдвигает на первый план проблемы, касающиеся раскрытия взаимосвязи человека и его языковой активности; проблемы соотношения языка и духовной деятельности человека, языка и мышления (сознания), языка и ценностей человека, языка и культуры, языка и познания, языка и общества и т.д. (Постовалова 1995, с. 343).

Наблюдения над языком позволяют понять глубину национального сознания, которое есть по своей сути языковое сознание. Именно язык позволяет обнаружить радикальную смену культурных ориентиров, культурных кодов, которые формируют человека, его мировидение и характер. Доказано, что в языковых единицах отображена ментальность человека во всем многообразии ее проявлений.

Язык загадочен и уникален не только своей глубиной, но и своей народообразующей способностью. В самой системе языка есть механизмы самосохранения, самозащиты и саморазвития. Он есть креативная сущность, т.к. человек получил от Бога возможность творить посредством слова. По Библии, именно Слово станет главным свидетелем на Божьем Суде: «Говорю же вам, что за всякое праздное слово, какое скажут люди, дадут они ответ в день суда: ибо от слов своих оправдаешься и от слов своих осудишься» (Евангелие. Мф. 12: 36–37). Ничто из услышанного и сказанного не проходит мимо человека, оно оставляет на нем печать, некое подобие матрицы, хранящейся в самых потаенных глубинах памяти. Слово – это как бы «зарубка», которая метит не предмет, не явление, а некий смысл, связанный с этим явлением, тем самым оно заряжает энергией предмет, делая его своим, познанным, определяет его место в своем бытии, ибо слово – «максимально напряженное осмысления бытия» (Маковский, 1996, с. 40).

Каждый новый носитель языка формирует свое видение мира не на основе самостоятельной переработки своих мыслей и переживаний, а в рамках закрепленного в понятиях языка опыта его предков, который зафиксирован в мифах и архетипах. Особенно значимы, например, для белорусов мифы о природе.

Специфика восприятия природной среды русскими и белорусами хорошо просматривается сквозь призму ассоциаций. В качестве слов-стимулов нами были взяты важные концепты славянской ментальности - *поле, даль, душа, судьба, тоска, удаль, воля* (Сукаленко, 1992), а также *лес* и *река*. Так, в русской культуре ***поле*** ассоциируется с признаками “*раздольное”, “чистое”, “красивое*”, оценочными словами “*радость”, “воля”* и др. Национально-культурная специфика ***поля*** у белорусов представлена в номинациях “*праца*”, “*пот”, “надзел”, “жытняе”, “васількі*” и т. д.

Лес и река русскими осознаются прежде всего как место отдыха: на стимул ***река*** наиболее частыми были ответы “*солнце”, “прохлада”, “купаться*”, а на слово-стимул ***лес*** получены реакции “*густой”, “зеленый”, “дремучий”, “темный”, “шумит*”. Для белорусов и ***лес,*** и ***река*** являются неотъемлемой частью их повседневной жизни: ***лес*** вызывал реакции “*ягоды”, “грибы”, “звери*”, а ***река*** – “*рыба”, “вода*” и др.

Собранные нами в ассоциативном эксперименте языковые факты позволили подтвердить выдвинутую философами (А.А. Брудным и другими) гипотезу: **отношение людей к природе есть превращенная форма их отношения друг к другу**. Она универсальна для большинства языков и примером могут служить многочисленные метафоры, доказывающие, что видение природных явлений становится метафорическим: *солнце садится, листья шепчутся, дождь идет, погода капризная; цвяты гавораць, рэчка стогне пад ільдом* и др. Почти за каждой из этих метафор – миф, мифологема, архетип. Например, *слепой дождь*. В Полесье существует несколько

групп поверий об этом дожде (Азимов, 1983). *Слепой* потому, что не видит, как светит солнце; слепота в мифологиях ряда народов свидетельствует об особой магической силе (Мифы народов..., 1982).

Метафорический подход к природе традиционно связывают с антропоморфизмом – особым взглядом на мир сквозь призму человека. Относящиеся сюда метафоры, как правило, недолговечны, они быстро стираются, т.е. перестают восприниматься как метафоры и прочно входят в язык, в культуру. Данные метафорические номинации приводят к быстрому угасанию образа, это подчеркивает Н.Д. Арутюнова, когда пишет об идентифицирующих метафорах.

Белорусский язык дает богатейший материал по метафорам данного типа. Так, *бярозы трасуць лісцем, лісце шапацела, дождж шапатаў, ліпы стогнуць, мароз шчэрыцца, мяцель грае, холад запусціў сваю ледзяную руку, хваляў хор* и др. Таким образом, "природные" метафоры этого типа одинаково хорошо представлены и в русском, и в белорусском языках, хотя в их номенклатуре встречаются различия. Так, русский фразеологизм *радужные мечты* трудно перевести на белорусский язык даже описательными средствами, ибо в белорусском языке "работает" иная внутренняя форма (ВФ), а следовательно, иные смыслы (по-белорусски радуга – *вясёлка*). Для русских радуга – это красивое явление, которое не может быть плохим, а потому оно усиливает и расцвечивает "хорошее" слово *мечты*, с радугой у русских связаны "хорошие" мифы, как объясняла Э. Тайлор, "...мифология примитивных обществ опирается по преимуществу на реальную и осязательную аналогию" (Тайлор, 1989, с. 138).

Мир природы входит в язык и другим путем - с помощью "обратной метафоры". Для восточнославянского обыденного сознания и языка характерны факты, в которых явления природы, природные стихии используются для описания духовного мира человека, его поведения, внешности: *мора бяды, мора слёз, адлягло ад сэрца, рэкі крыві.* Однако, большинство подобных метафор остаются пока авторскими, окказиональными. Например, *давялося сербануць ліха* (В. Быков), *свет душы* (М. Богданович), *здрада гняздзіцца* (Я. Купала), *крыўда каменем лягла* (Я. Купала), *голас зямлі, стогн пушчы, бары трасуцца помстаю* (Я. Колас).

Не становясь языковыми, антропоцентрические метафоры создают особый поэтический мир, в котором живет белорус:

Каханне ў сэрцы гэтак сеяў,
А жаць прыйшлося пракляцце (Я. Купала).
Праталіны баюць казкі (Я. Купала).
Поле смяецца (М. Богданович).

Антропоцентрические метафоры играют важную роль в членении действительности, в построении языковой картины мира. Сопоставляя такие метафоры, мы делаем выводы о многих психологических и социальных явлениях, например, о том, какие реалии действительности устойчиво

связываются ассоциациями в сознании членов языкового коллектива и, соответственно, как бы получают новое имя.

Язык дает нам основание видеть связь с далекими явлениями, в мире никак не связанными, но глубоко сидящими в ментальности народа. Так, снег – это *белые мухи* (ср. выражение *до белых мух*, т.е. до зимы).

Следовательно, язык не просто называет то, что есть в культуре, не просто выражает и формирует культуру, как бы прорастая в нее, но и сам развивается в культуре.

Человек стоит в центре языковой картины мира как начало отсчета всех категориальных координат языка и как мера языковой картины мира.

Следует обратить внимание на то, что при антропологическом подходе к изучению языка эксплицитно провозглашается принцип постижения языка в тесной связи с бытием человека. Существует несколько подходов к решению проблемы учета антропологической природы языка и способах строить науку о языке на антропологических основаниях.

Развивая данное гумбольдтовское направление, мы пришли к выводу, что мир, отраженный сквозь призму механизма вторичных ощущений, – это главный фактор, который определяет универсальность и специфику любой конкретной национальной языковой картины мира. При этом важным обстоятельством является разграничение универсального человеческого фактора и национальной специфики в различных языковых картинах мира.

По Л. Гумилеву, существует этническое поле, которое имеет присущий только ему ритм. Этот ритм задает пассионарность, которая есть "биохимическая энергия живого вещества биосферы", она также активно формирует национальный характер. Динамика характера формируется под влиянием динамики внешней действительности, проявление тех или иных черт зависит не только от опыта, но и от требований, предъявляемых человеку в данный момент, от ситуации, в которой он находится и даже от географии его проживания.

Но и язык связывает людей в нацию/этнос. Создаваемая языком модель мира есть субъективный образ объективного мира, она несет в себе черты человеческого способа миропостижения (Сукаленко, 1992), т.е. антропоцентризма, который пронизывает весь язык. Национальный язык отражает определенный способ восприятия и концептуализиции мира. Совокупность значений языка составляет единую систему взглядов, своего рода коллективную философию, которая навязывается в качестве обязательной всем носителям языка. «Свойственный языку способ концептуализации действительности (взгляд на мир) отчасти универсален, отчасти национально специфичен, так что носители разных языков могут видеть мир немного по-разному, через призму своих языков» (Апресян 1995, с. 39). Поэтому, как сказал французский исследователь К. Ажеж, «лингвистика, изучая самое человеческое, что есть в человеке, никак не может быть замкнутой областью знания…» (Ажеж 2003, с.42).

Итак, язык имеет социальную природу, зависит от мировоззрения человека, содержания и характера его деятельности, от общества, в котором человек живет и действует, от активного взаимодействия с другими членами этого общества. Но и человек зависит от языка, который формирует его душу и сознание. Отсюда важность сохранения национального языка.

Литература

1. Ажеж, К. Человек говорящий. Вклад лингвистики в гуманитарные науки / К. Ажеж. – М., 2003.

2. Азимов, Э.Г. Из полесской народной метеорологии. Слепой дождь / Э.Г. Азимов // Полесский этнолингвистический сборник. – М., 1983.

3. Апресян Ю.Д. Образ человека по данным языка: попытка системного описания / Ю.Д. Апресян // ВЯ. – 1995. – № 1.

4. Евангелие от Матфея // Евангелие. – М., 1992.

5. Маковский, М.М. Сравнительный словарь мифологической символики в индоевропейских языках: Образ мира и миры образов / М.М. Маковский. – М.: Гуманит. изд. центр ВЛАДОС, 1996. – 416 с.

6. Мифы народов мира. Т. 1–2. – М., 1980–1982.

7. Постовалова, В.И. Наука о языке в свете идеала цельного знания / В.И. Постовалова // Язык и наука конца 20 века / под ред. Ю.С. Степанова. – М.: Ин-т языкознания РАН, 1995. – С. 341 – 420.

8. Сукаленко, Н.И. Отражение обыденного сознания в образной языковой картине мира / Н.И. Сукаленко. – Киев, 1992.

9. Тайлор, Э.Б. Первобытная культура / Э.Б. Тайлор. – М., 1989.

Г.М. Мезенка (Віцебск)

НАЗВЫ ГАРАДОЎ У ВІКАНІМНЫМ АДЛЮСТРАВАННІ: АПАЗІЦЫЯ ‘СВАЁ / ЧУЖОЕ’

Комплекснае і ўсебаковае вывучэнне ўласных імён, якія функцыянуюць у межах сельскіх населеных пунктаў і служаць для найменя розных аб’ектаў, – адна з актуальных задач сучаснай тапанімікі, якая тлумачыцца тым, што віконімы, з’яўляючыся словамі натуральнай мовы, фарміруюць асобны фрагмент моўнай карціны свету, у якім спецыфічным чынам адлюстроўваецца светабачанне і светаразуменне народа, яго культура і гісторыя. Істотна адрозніваючыся ад гарадской, сельская анімічная прастора фарміруецца па пэўных заканамернасцях, якія падобны ў вёсак з аднолькавымі культурнымі і сацыяльнымі ўмовамі жыцця. Адным з састаўных элементаў сістэмы віконімаў з’яўляюцца назвы лінейных аб’ектаў, што эксплікуюць інфармацыю прасторавага кода культуры. А ўспрыняцце прасторы, як вядома, – адна з важнейшых частак этнічнай мадэлі свету.

Матэрыялам даследавання паслужылі віконімы вёсак Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцей Рэспублікі Беларусь.

Мэта даследавання – выяўленне асаблівасцей адлюстравання апазіцыі ‘сваё / чужое’ ў назвах унутрысельскіх лінейных аб’ектаў, утвораных ад імён гарадоў.

З пачаткам фарміравання сістэм унутрысельскіх назваў узнікла традыцыя называць дарогі, што пачыналіся на ўскраінах сёл, а пазней вуліцы і завулкі, што размяшчаліся ў любым раёне населенага пункта, найменнямі тых гарадоў, у бок якіх яны вялі, гэта значыць замацавалася тэндэнцыя стварэння віконімаў ад айконімаў – назваў гарадоў і іншых паселішчаў, напрыклад, *Ружанская вул.* у в. Магілёўцы Брэсцкай вобл.; *Гомельская вул.* у в. Губічы Гомельскай вобл., *Браслаўская вул.* у в. Мяжаны Віцебскай вобл. і да т.п. Адзначым, што ў асобных паселішчах ад аднаго айконіма мог утварацца не адзін, а нават два і болей віконімы. Так, у в. Яжаўкі Брэсцкай вобл. побач існуюць *Лунінецкая вул.* і *Лунінецкі завул*.

У прыведзеных, як і ў іншых віконімах, утвораных ад айконімаў, знаходзіць адлюстраванне прасторавая мадэль, якая рэалізуе ідэю канца прасторы. Пры гэтым ідэя пачатку слаба адзначана ў віканіміі, паколькі пачаткам з’яўляецца само паселішча, якое не патрабуе дадатковай маркіроўкі. Праўда, тут неабходна агаварыцца, бо існуе нямала выпадкаў, калі ў населеным пункце можна знайсці назвы вуліц і завулкаў, аднайменных з самім паселішчам. Напрыклад, у в. Біцялёва Віцебскай вобл. ёсць *Біцялёўская вул*. Такая сітуацыя не парушае апазіцыі пачатак / канец, бо ў падобных выпадках назва вуліцы з’яўлялася менавіта дзеля таго, каб падкрэсліць, што гэта прастора – канец паселішча, апошняя частка яго, якая яшчэ ўваходзіць у склад вёскі ці пасёлка. Наогул ідэя канца вельмі папулярная ў тапанімічнай прасторы, паколькі яна абумоўліваецца існаваннем дакладных межаў паміж сваёй / асвоенай і чужой / неасвоенай прасторай і значнасцю самой ідэі мяжы [1, с. 122]. Усё, што знаходзіцца па-за межамі паселішча, успрымалася як чужое.

Адзначым, што на ўскраінах населенага пункта ад аднаго айконіма звычайна ўтвараўся толькі адзін віконім.

Разгледзім асаблівасці функцыянавання назваў гэтага тыпу трох абласцей Рэспублікі Беларусь – размешчаных па дыяганалі з паўночнага ўсходу на паўднёвы захад і ўздоўж мяжы з РФ (Віцебскай, Брэсцкай, а таксама Гомельскай). У віканімнай сістэме Брэсцкай вобласці ў пачатку XXI ст. намі зафіксавана 64 назвы лінейных унутрысельскіх аб’ектаў, дадзеных па найменнях 62-х беларускіх (96,8%), аднаго рускага (*Маскоўская вул*. – в. Вітчын) і аднаго англійскага (*вул.Лондан* – в. Цна) горада. Паказальна, што пераважная большасць з іх (58) – утварэнні ад 8-мі асціонімаў Брэсцкай вобласці: Бярозы (*Бярозаўская вул* – в. Пешкі, в. Першамайская, в. Стрыгінь і інш.), Брэста (*Брэсцкая вул., Брэсцкі завул*. – в. Багданаўка, в. Дзятлава і інш.), Ганцавічаў (*Ганцавіцкая вул*. – в. Бостынь), Лунінца (*Лунінецкая вул*. – в. Бостынь), Пінска (*Пінская вул., Пінскі завул*. – в. Лобча, в. Бобрык і інш.), Пружан (*Пружанская вул., Пружанскі завул*. –

в. Лыскава, в. Шарашова і інш.), Ружан (*Ружанская вул.* – в. Магілёўцы, в. Асошнікі і інш.), Століна (*Столінская вул.* – в. Вуйвічы, в. Манькавічы і інш.); двух Віцебскай – Гарадка (*Гарадоцкая вул.* – в. Лахва) і Глыбокага (*Глыбоцкая вул.* – в. Папялёва); аднаго Гомельскай – Нароўлі (*Нараўлянская вул.* – в. Першамайская) – і аднаго Мінскай – Любані (*Любанская вул.* – в. Мокрава). Пры гэтым калі большасць з прыгаданых назваў утворана ад найменняў населеных пунктаў, у напрамку да якіх вуліцы вядуць, то апошнія з пералічаных сваёй асновай абавязаны асцiонімам іншых абласцей, у прыватнасці Віцебскай, з якой Брэсцкая нават агульных межаў не мае.

Цікава, што не назва Брэста – цэнтра Брэсцкай вобласці, – а найменне г. Пінска найчасцей знаходзім у структуры віконімаў згаданага рэгіёна: назва *Пінская вул.* задзейнічана ў 23-х паселішчах вобласці, *Пінскі завул.* – у адным. Прычыны такой віканімнай сітуацыі яшчэ давядзецца высвятляць.

У віканіміконе Віцебскай вобласці функцыянуюць 87 адзінак, утвораных ад назваў гарадоў, з якіх 78 (89,7%) ад беларускіх і 9 (10,3%) ад рускіх. У адрозненне ад вышэй разгледжанай сістэмы, у віцебскай рэпрэзентавана больш назваў рускіх гарадоў – былога Ленінграда (*Ленінградская шаша* – в. Бараўляны, *Ленінградская вул.* – в. Камень, в. Бабінавічы, *Ленінградскі завул.* – г.п. Себеж), Масквы (*Маскоўская вул.* – в. Замошша, в. Залессе), Рудні (*Руднянская вул.* – в. Фарынава) і нават Ахоцка (*Ахоцкая вул.* – в. Калягі), што, верагодна, тлумачыцца блізкасцю мяжы з РФ. Што да назваў, утвораных ад найменняў гарадоў Віцебшчыны, то іх у працэнтных адносінах менш (88,5%), чым адпаведных (утвораных ад найменняў паўднёвага-захадніх гарадоў) на Брэстчыне (93,6%).

Нельга не адзначыць, што менавіта назва Віцебска, у адрозненне ад наймення цэнтра Брэсцкай вобласці, часцей за іншыя выступае словаўтваральнай асновай для найменняў унутрысельскіх лінейных аб'ектаў: віконім *Віцебская вул., Віцебскі завул., 1-ы Віцебскі завул., 2-і Віцебскі завул., 3-і Віцебскі завул.* у аналізаваным арэале зарэгістраваны 24 разы ў вёсках Адаменкі, Андрэеўшчына, Астроўна, Баронікі, Будзілава, Вымна, Высачаны, Вядзерава, Задуброўе, Заронава, Іменне, Кароўка, Косава, Любшына, Палудзеткі, Слабада, Смальяны, Тарасенкі, Тулава, Уна, г.п. Себеж, г.п. Янавічы .

У сістэме віканімаў Гомельскай вобласці намі зарэгістравана толькі 47 назваў, утвораных ад найменняў гарадоў, 44 з якіх (93,6%) – ад беларускіх і толькі тры (6,4%) ад сталіцы РФ г. Масква. Як і ў раней прааналізаваных віканімных сістэмах, тут большасць з назваў унутрысельскіх аб'ектаў суадносіцца з імёнамі гарадоў свайго арэала – Брагіна, Веткі, Гомеля, Добруша, Кармы, Мазыра, Нароўлі, Рагачова, Турава, Хойнікаў, Чонак.

Аналізуючы выкарыстаныя ў віканіміі трох абласцей назвы гарадоў, якія паслужылі асновамі для ўтварэння наймення лінейных унутрысельскіх

аб’ектаў, можам адзначыць, што ад 89,7 да 96,8% з іх – гарады Рэспублікі Беларусь. У адрозненне ад урбананіміі, у аналізуемым разрадзе тапонімаў амаль адсутнічаюць найменні, прысвоеныя ў гонар якіх-небудзь населеных пунктаў. Усё гэта – сведчанне таго, што і ў наш час, як і ў былыя часы, беларусам уласціва даволі моцная ўпадоба да родных месцаў, а гэта значыць, што ў апазіцыі *сваё / чужое* далёка не ўсё, што знаходзіцца па-за межамі паселішча, успрымаецца як чужое.

Вывучэнне віканімаў Брэсцкай, Віцебскай і Гомельскай абласцей Беларусі, суадносных з найменнямі гарадоў, у чарговы раз сведчыць аб тым, што адной з форм прасторавага канструявання свету ў свядомасці чалавека з’яўляецца паняцце геаграфічнай прасторы, якое, узнікаючы ў пэўных гістарычных умовах, “атрымлівае розныя контуры ў залежнасці ад характару агульных мадэлей свету, часткай якіх яно з’яўляецца” [2, с. 297].

Такім чынам, анімічныя сістэмы вёсак маюць, безумоўна, сваю спецыфіку, таму неабходны іх далейшы ўсебаковы аналіз. Зварот да вывучэння сельскіх анімічных сістэм будзе садзейнічаць фарміраванню цэласнага погляду на асаблівасці віканімнага і ўрбананімнага сектараў тапаніміі Беларусі.

Літаратура

1. Березович, Е.Л. Русская топонимия в этнолингвистическом аспекте: Пространство и человек / Е.Л. Березович; под ред. А.К. Матвеева. – 2-е изд. – М.: Книжный дом «ЛИБРОКОМ», 2009. – 328 с.

2. Лотман, Ю.М. Семиосфера / Ю.М. Лотман. – СПб.: Искусство, 2000. – 704 с.

П.А. Міхайлаў (Мінск)

БЕЛАРУСЫ І БЕЛАРУСКАЯ МОВА Ў ПОЛЬШЧЫ І КРАІНАХ БАЛТЫІ

Беларуская мова ў замежных краінах мае два асноўныя аспекты выкарыстання: ***прыкладны*** – як на ёй, так і на дзяржаўных мовах ствараюцца падручнікі па беларускай мове для вучняў і для студэнтаў ВНУ, выдаюцца навучальныя граматыкі і слоўнікі; ***навукова-даследчы*** – беларуская мова выступае як аб’ект навуковага вывучэння, друкуюцца шматлікія манаграфіі, слоўнікі і нават лінгвістычныя атласы. Прадстаўнікі беларускай дыяспары і мясцовыя навукоўцы ажыццяўляюць шырокую асветніцкую працу па захаванні нацыянальна-культурнай адметнасці беларусаў, даследаванні беларускай мовы, культуры, этнаграфічных асаблівасцей, ствараюць мастацкія творы, на беларускай мове друкуюць часопісы, газеты, разнастайныя навуковыя працы (частка з іх выходзіць на англійскай, нямецкай і іншых мовах).

З ліку памежных з Беларуссю краін найбольш актыўна даследуецца беларуская мова ў ***Польшчы***, дзе беларусы здаўна кампактна пражываюць на Беласточчыне, а таксама ў іншых рэгіёнах краіны і складаюць тут на-

цыянальную меншасць (па розных звестках на тэрыторыі Беласточчыны пражывае ад 250 да 400 тысяч беларусаў). Тут працуюць беларускамоўныя школы, ствараюцца і выдаюцца падручнікі (М. Гайдук, Л. Гайдук, А. Баршчэўскі і інш.). Настаўнікаў для школ рыхтуюць найперш у Варшаўскім (з 1956 г.) і ў Беластоцкім (з 1990 гг.) універсітэтах, дзе працуюць кафедры беларускай філалогіі. Акрамя гэтага вывучаюць беларускую мову таксама ў Люблінскім (імя М. Складоўскай-Кюры і каталіцкім), Кракаўскім і некаторых іншых універсітэтах Польшчы.

Важныя навуковыя даследаванні па беларусістыцы ажыццяўляюцца як супрацоўнікамі аддзела беларускай філалогіі Інстытута славяназнаўства Польскай акадэміі навук, так і выкладчыкамі ВНУ. З ліку акадэмічных даследаванняў найперш варта адзначыць дзесяцітомны “Атлас усходнеславянскіх гаворак Беласточчыны” (1980 – 2012), шэраг анамастычных слоўнікаў М. Кандрацюка па тапаніміцы Беласточчыны і бібліяграфію анамастычных даследаванняў ўсходнеславянскіх моў [4], сумесныя выданні з беларускімі вучонымі “Падручнага польска-беларускага слоўніка” (1962, А. Абрэмска-Яблонска і М.В. Бірыла), пяцітомнага “Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча” (1978 – 1986), дзе змешчаны дыялектныя матэрыялы з беларускіх гаворак Беласточчыны і інш. Выкладчыкі ВНУ апублікавалі манаграфіі па словаўтварэнні ў гаворках Беласточчыны (2002, М. Саевіч), даследаванне па асаблівасцях націску назоўнікаў у беларускай мове (1978, Э. Смулкова), групоўцы гаворак Беласточчыны і іх фанетычнай сістэме (1960, 1968, С. Глінка), выдалі двухтомны слоўнік тапонімаў паўночна-ўсходняй Польшчы (1992, Н. Баршчэўска, Я. Глушкоўска, Т. Ясіньска, Э. Смулкова), Слоўнік лінгвістычнай тэрміналогіі (беларуска-руска-польскі і польска-руска-беларускі, 1994; Э. Юравец, Я. Насовіч, Л. Панфілюк, П. Сцяцко, М. Тарасюк), чатырохтомны “Слоўнік *a tegro* сучаснай беларускай мовы” (1988 – 1989; А. Барташэвіч, І. Камендацка) і інш. Даследуецца гісторыя функцыянавання беларускай мовы як мовы нацыянальнай меншасці на тэрыторыі Польшчы і яе сучасны стан [1]. Ствараюцца шматлікія арыгінальныя вучэбныя дапаможнікі для студэнтаў па беларускай мове ў розных ВНУ Польшчы (Р. Калета, А. Грэсь, Беласток, 2012; Л. Сегень, Беласток, 2007; Т. Рот-Жаброўскі, Люблін, 1991 – 1992; Н. Саевіч, Люблін, 2000; Д. Клябанаў, Кракаў, 2010; А. Філіновіч, Беласток, 2007 і інш.), па фанетыцы і фаналогіі сучаснай беларускай мовы ў параўнанні з польскай і рускай фанетычнымі сістэмамі (Э. Смулкова, Варшава; В. Чэкмонас, Вільнюс, 1988), беларускай дыялекталогіі (Н. Баршчэўска, М. Янковяк, Варшава, 2012) і многія іншыя. З 1998 г. Варшаўскі ўніверсітэт выдае навуковы штогоднік “Acta Albaruthenica”, дзе друкуюцца артыкулы польскіх, беларускіх і замежных вучоных па літаратуры, мове, культуры і гісторыі нашага народа. Публікуюцца аналагічныя выданні ў Беластоцкім, Люблінскім і іншых універсітэтах. Польскія навукоўцы даследуюць актуальныя пытанні выкладання беларускай мовы як замежнай [3].

У 1956 г. у Польшчы створана *Беларускае грамадска-культурнае таварыства*, выдаюцца беларускамоўныя газета "*Ніва*" і штогоднік "*Беларускі каляндар*" (1957 г.), дзейнічае літаратурна-мастацкае аб'яднанне "*Белавежа*" (1958 г.), *Беларускае аб'яднанне студэнтаў* (1981 г.), *Беларускае культурна-асветнае таварыства "Хатка*" ў Гданьску (1992 г.), беларускі гурток у Ольштыне, шэраг беларускіх выдавецтваў і інш. У Варшаве з 1992 г. працуе беларуская рэдакцыя польскага радыё. Даследаваннямі беларускай мовы, літаратуры, гісторыі, культуры ў Польшчы займаюцца Л. Асоўскі, С. Глінка, А. Барташэвіч, Н. Баршчэўска, А. Баршчэўскі, Я. Глушкоўска, М. Кандрацюк, І. Марынякова, А. Мірановіч, Я. Мірановіч, Л. Пісарэк, М. Саевіч, П. Смачыньскі, Я. Сяткоўскі, Ю. Туронак, М. Чурак і многія іншыя. Друкуюць беларускамоўныя мастацкія творы Н. Артымовіч, А. Барскі, Г. Валкавыцкі, М. Гайдук, У. Гайдук, Я. Жамойцін, М. Лукша, Я. Чыквін, М. Шаховіч, В. Швед, С. Яновіч і іншыя.

На тэрыторыі ***Латвіі*** па розных звестках пражывае ад 90 да 120 тысяч беларусаў, што складае каля 4% жыхароў краіны. Пераважная большасць з іх – гэта мігранты з этнічна беларускіх земляў, якія пасяліліся тут пачынаючы з другой паловы 19 ст., калі Латгалія знаходзілася ў складзе Беларускай і Віцебскай губерняў. Як адзначае М.Янковяк, найбольш беларусаў пражывае цяпер у паўднёвай частцы Латгаліі (20,6 тыс.) і ў вялікіх гарадах – Рызе (33 тыс.), Даўгаўпілсе (9 тыс.), Ялгаве (3,8 тыс.), Лібаве (3,2 тыс) і некаторых іншых [6, с. 62]. Зараз у Рызе дзейнічаюць беларускамоўная школа, *Латвійскае таварыства беларускай культуры "Сьвітанак"* (1988), *Аб'яднанне мастакоў-беларусаў Балтыі "Маю гонар"* (1991), выдаецца беларуская газета "*Прамень*" (1994). У Даўгаўпілскім універсітэце выкладаецца беларуская мова, а ў мясцовай газеце "*Latgales Laiks*" ("Час Латгаліі") змяшчаецца беларускамоўная старонка "Беларус Латгаліі". Акрамя таго, у Даўгаўпілсе дзейнічае беларускае культурна-асветнае аб'яднанне *"Уздым"* (1993), беларуская нядзельная школа, таварыства культуры *"Латвія – Беларусь"* (1996) і інш. Адзін раз на месяц (па серадах) на канале *"Doma Laukums"* гучыць паўгадзінная перадача па-беларуску. Польскі даследчык М. Янковяк у 2009 г. апублікаваў сацыялінгвістычнае даследаванне пра беларускія гаворкі ў Краслаўскім раёне Латвіі [6]. Выкарыстоўвалі беларускую мову ў лексікалагічных працах Б.Э. Лауманэ, Ю.А. Лаучутэ, А.С. Рэкена і інш. У канфесійнай сферы беларуская мова часцей ужываецца ў беларусаў-католікаў (беларускамоўныя малітоўнікі, звароты, аб'явы ксяндзоў і інш.).

Адметнасцю функцыянавання беларускай мовы ў ***Літве*** з'яўляецца тое, што яшчэ з часоў Вялікага Княства Літоўскага і да 1-й сусветнай вайны сацыяльна-эканамічнае, нацыянальнае і культурнае развіццё беларусаў і літоўцаў праходзіла ў адзінай дзяржаўнай прасторы. Паводле літоўскіх статыстычных звестак у сярэдзіне 1990-х гг. у Літве (пераважна ў Віленскім краі) жыло больш за 50 тысяч беларусаў, што складае каля 1,5%

насельніцтва краіны [2, с. 312]. Зараз “беларусы ў Літве з’яўляюцца трэцяй па велічыні нацыянальнай меншасцю пасля палякаў і рускіх і сканцэнтраваны пераважна ў вялікіх гарадах” [5, с. 78].

Здаўна для беларусаў галоўным асяродкам была Вільня, дзе працавалі агульныя дзяржаўныя і культурныя ўстановы, у тым ліку Віленскі ўніверсітэт і Віленская брацкая друкарня. Напрыканцы 1990-х гг. 20 ст. у Літве (Вільнюс, Вісагінас, Шальчынінкай, Швянчоніс і інш.) дзейнічала каля 15 культурных арганізацый, у т.л. *Таварыства беларускай культуры*, *Таварыства беларускай мовы*, *Таварыства беларускай школы* і інш., выдаваліся газеты *“Наша ніва”*, *“Рунь”*, *“Беларускія навіны”* і інш., гучалі беларускамоўныя праграмы на літоўскім радыё і тэлебачанні. Акрамя таго, беларускамоўныя старонкі ў канцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. друкаваліся і ў іншых газетах: *“Советская Литва”*, *“Эхо Литвы”*, *“Czerwony Sztandar”*, *“Kurjer Wileński”* і інш. У Віленскім педагагічным універсітэце на факультэце славістыкі дзейнічае кафедра беларускай філалогіі і міжкультурных камунікацый, працуе сярэдняя школа імя Ф. Скарыны (Вільнюс), ёсць класы з выкладаннем беларускай мовы як прадмета ў рускамоўнай школе г.Вісагінаса, існуе шэраг гурткоў і факультатываў па вывучэнні беларускай мовы ў нядзельных школах розных літоўскіх гарадоў. У Вільнюсе з 1998 г. працуе выдавецтва Таварыства беларускай культуры *“Рунь”*. Выкарыстоўваецца беларуская мова і ў набажэнстве як вернікамі каталіцкай канфесіі (касцёл св. Барталамея ў Вільнюсе, ксёндз Я. Шуткевіч), так і праваслаўнай (царква св. Мікалая ў Вільнюсе, айцец В. Навінскі), а таксама і ў іншых прыходах. У Вісагінасе і іншых гарадах Літвы праходзяць выставы твораў мастакоў-беларусаў, фестывалі беларускай песні, выдаецца беларускамоўная перыёдыка і інш.

Асноўным аб’ектам навуковых даследаванняў з’яўляюцца асаблівасці беларускіх гаворак на тэрыторыі Літвы, узаемадзеянне беларускай мовы з іншымі мовамі, сацыялінгвістычныя аспекты функцыянавання беларускай мовы ў Літве. Гэтым пытанням прысвечаны даследаванні літоўскіх вучоных А. Грынавецкене, А. Ванагаса, А. Відугірыса, В. Чэкмонаса, латышкі Б. Лаўчуце, аўстрыйца Г. Бідэра, паляка Б. Нававейскага, беларускі Л. Плыгаўкі і інш., беларускіх вучоных Ф.Д. Клімчука, Ю.Ф. Мацкевіч, І.П. Кавальчук, Я.М. Рамановіч, А.І. Чабярук, Г.У. Арашонкавай. Выдадзена сумесная беларуска-літоўска-польская праца “Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча” (у 5-ці тамах, 1978–1986), дзе змешчаны багаты матэрыял з беларускіх гаворак на тэрыторыі Літвы, манаграфічнае даследаванне Л. Плыгаўкі [5], трохтомная праца А. Ванагаса з аналізам літоўскіх гідронімаў, дзе выкарыстаны беларускі матэрыял (1970–1981), і інш.

Літаратура

1. Barszczewska, N. Język białoruski w Polsce – historia I stan obecny / N. Barszczewska // Acta Polono-Ruthenika. – 2009. – № 14. – S. 339–351; Barszczewska, N. Zakres użycia języka białoruskiego na przełomie XX – XXI wieku / / N. Barszczewska //

Acta Albaruthenika. – 2014. – № 14. – S. 87 – 98; Баршчэўская, Н. Сітуацыя беларускай мовы ў Польшчы / Н.Баршчэўская // Belarusika= Albaruthenika. – 2012. – № 32. – С. 342–353 і інш.

2. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 9. – Мінск: БелЭН, 1999. – 560 с.

3. Kaleta, R. Kilka uwag o nauczaniu polaków języka białoruskiego jako obcego / R. Kaleta // Беларуска-польскія моўныя, літаратурныя, гістарычныя і культурныя сувязі: Зб. арт. – Мінск: Кнігазбор, 2015. – С. 69–78.

4. Kondratiuk, M. Urzędowe i gwarowe nazwy miejscowości Białostocczyzny / M. Kondratiuk. – Białystok: BTH, 2011. – 367 s.; Kondratiuk, M. Gwarowe nazwy miejscowości Białostocczyzny w układzie alfabetycznym / M. Kondratiuk. – Białystok: Fundacja im. Księcia Konstantego Ostrogskiego, 2014. – 2014. – 333 s.; Kondratiuk, M. Bibliografia onomastyki wschodniosłowianskiej do roku 1965 włacznie / M. Kondratiuk // Białystok: Wyd-wo Filii Uniwersytetu Warszawskiego, 1997. – 295 b. і інш.

5. Плыгаўка, Л. Беларуская мова ў Літве: сацыякультурны і лінгвістычны аспекты / Л. Плыгаўка. – Вільня [Вільнюс]: Vilniaus pedagoginio universiteto leidykla, 2009. – 339 s.

6. Янковяк, М. Беларускія гаворкі ў Краслаўскім раёне Латвіі: сацыялінгвістычнае даследаванне / М.Янковяк. – Смаленск, 2015. – 288 с.

А.Г. Міхалевіч, Н.Р. Мордас (Мінск)

СТЫЛІСТЫЧНАЕ БАГАЦЦЕ ЭКСПРЭСІЎНЫХ СІНТАКСІЧНЫХ ФІГУР У МАСТАЦКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Кожны твор мастацкай літаратуры, асабліва празаічны, уяўляе сабой арганічнае адзінства інфарматыўнага і эмацыянальна-экспрэсіўнага аспектаў. Для выражэння ў пісьмовай форме гэтага адзінства выкарыстоўваюцца шматлікія моўна-выяўленчыя, функцыянальна-стылістычныя сродкі, кожны з якіх у залежнасці ад мэты паведамлення ці ўсяго тэксту, ці асобных яго кампанентаў можа выконваць разнастайную функцыю.

Паколькі на розных этапах развіцця мова беларускай мастацкай літаратуры вызначалася актыўным узаемадзеяннем, з аднаго боку, з нарматыўна ўсвядомленай літаратурнай мовай, а з другога – з вуснымі гаворкамі, то беларускай мастацкай прозе атрымалі заканамернае пашырэнне экспрэсіўныя сродкі размоўнага (гутарковага) стылю. Свядомае, мэтанакіраванае іх выкарыстанне матывуецца мастацкімі задачамі пісьменніка: такія сродкі перадаюць у тэксце (кантэксце) разнастайныя стылістычныя і эмацыянальна-экспрэсіўныя адценні.

Лінгвістычныя і літаратуразнаўчыя даследаванні апошніх дзесяцігоддзяў паказалі, што мову беларускай мастацкай прозы вызначае шырокае ўжыванне згаданых адзінак на сінтаксічным узроўні. Адна з прычын таго, несумненна, у ідэйна-тэматычнай накіраванасці твораў: многія з іх прысвечаны паказу гістарычнага мінулага і сучасных праблем беларускай вёскі, што аб’ектыўна патрабуе ад празаікаў ствараць ілюзію поўнай рэчаіснасці, рэальнага жыцця, народных характараў і быту.

Для рэалізацыі гэтага беларускія празаікі выпрацавалі своеасаблівы падыход да кампазіцыйнага афармлення раманаў і аповесцей, максімальна наблізіўшы апавяданне да персанажа. У адрозненне ад літаратуры 50-х гадоў мінулага стагоддзя, дзе пункт гледжання праяўляўся толькі эпізадычна, зараз назіраецца тэндэнцыя распаўсюдзіць пазіцыю цэнтральнага героя на ўсе канструктыўныя элементы твора. Адлюстраванне рэчаіснасці ў такім ракурсе дазваляе не толькі стварыць аб'ектыўнае апісанне, але і спалучыць яго з аўтарскім паказам героя, аналізам яго думак, перажыванняў, пачуццяў.

Нярэдка ў празаічных творах, дзе апавяданне вядзецца ад імя персанажа, назіраецца пашырэнне колькасці магчымых пунктаў гледжання на апісанне. Гэта робіцца празаікамі не толькі для таго, каб пераадолець суб'ектывізм, але і з тым, каб паказаць адну і тую ж з'яву ў розных аспектах, пашырыць апісанне, даць магчымасць выказацца розным дзеючым асобам. Акрамя таго, экспрэсіўныя сінтаксічныя адзінкі дазваляюць актыўна ўздзейнічаць на чытача. Спынімся на характарыстыцы адной разнавіднасці такіх адзінак – на экспрэсіўных фігурах.

Пад тэрмінам "фігура", запазычаным з лацінскай мовы, мы разумеем адзін з прыёмаў узмацнення эмацыянальнай выразнасці маўлення, сінтаксічную канструкцыю, якая ў пэўных адносінах адрозніваецца ад агульнапрынятых сінтаксічных нормаў. Такія канструкцыі вызначаюцца спецыфічным структурным афармленнем словазлучэння, сказа ці групы сказаў у кантэксце і выконваюць важныя стылістычныя функцыі.

Агульнапрынятым з'яўляецца выдзяленне сярод экспрэсіўных сінтаксічных фігур наступных груп, якія атрымалі пашырэнне ў мастацкай прозе Івана Мікалаевіча Пташнікава, аўтара шэрагу раманаў і аповесцей ("Тартак", "Лонва", "Найдорф", "Мсціжы", "Алімпіяда" і інш.), прысвечаных пераважна апісанню падзей Вялікай Айчыннай вайны: фігуры павелічэння аб'ёму выказвання; фігуры памяншэння аб'ёму выказвання; фігуры размяшчэння і перастаноўкі; уласнарытарычныя фігуры.

Фігуры павелічэння аб'ёму выказвання вызначаюцца наяўнасцю ў структуры выказвання лішніх з пункту гледжання асноўнай семантыкі элементаў. Такія фігуры ўжываюцца пераважна ў апісанні тых сітуацый, калі асоба, якой належыць паведамленне, ставіць за мэту свядома падкрэсліць эмацыянальны характар асобных моўных кампанентаў ці нават прэдыкатыўных частак, выдзеліць іх інтанацыйна з агульнай плыні гаворкі. Сярод такіх фігур найбольш пашырана сінтаксічная анафара – паўтор у пачатку сказаў. У аўтарскай мове яна выконвае пераважна раздзяляльна-выдзяляльную функцыю і можа паказваць, напрыклад, на працягласць і інтэнсіўнасць дзеяння: ***Блішчалі*** *на дарозе ад сонца вінтоўкі і аўтаматы, як чорнае шкло.* ***Блішчалі****, што выпацканыя ў дзёгаць, чорныя прыклады.* ***Блішчалі*** *ўгары ў пыле штыкі – нажы – і чорныя скрыначкі на плячах у немцаў, мусіць, з патронамі.* ***Блішчалі*** *каскі, вялікія, з чыгуны, у*

якіх дома вараць свінням бульбу. ***Блішчалі*** *плешкі да балтоў на касках, белыя, што вышараваныя ў пяску…* [1, с. 168]. У мове герояў такая фігура выконвае функцыю выдзялення семантычна важнага кампанента: – ***Не лёг бы****, брат, на пясок…* ***Не лёг****… І* ***не лягу****…* [1, с. 71].

Пашыраным ў мастацкай літаратуры з'яўляецца і анадыплозіс – экспрэсіўная фігура, у якой канец аднаго сказа паўтараецца ў пачатку другога. Для дыялагічнай мовы герояў уласцівы паўтор выказніка ў канструкцыі-адказе, што належыць аднаму і таму герою: – *…Дык знай: на менінгіт каня не спішу.* ***Недагледзеў****?* ***Недагледзеў.*** *Адвічай сам* [2, с. 210]. У аўтарскай мове такі паўтор дазваляе празаіку перадаць думкі героя ў іх дынамізме, падкрэсліць нязмушанасць і, акрамя таго, даць вычарпальную характарыстыку герою: *Глядзеў Завішнюк на вазоны, на старыя фотакарткі Грасыльдзінай сям'і і* ***думаў. Думаў*** *зусім пра другое: пра лес, пра Сырніцу…* ***Думаў*** *пра Юрку Даліну, думаў, што цяжка даводзіцца хлопцу…* [2, с. 69]. Нярэдкім з'яўляецца і спецыфічнае выкарыстанне анадыплозісу: у складзе састаўнога іменнага выказніка аўтар змяняе мадальнасць выказальнага слова, выражанага прыметнікам: *Пень быў* ***высокі. Вышэй*** *калена, і дым з яго валіў, што з коміна* [1, с. 217].

Частым у творах Івана Пташнікава выступае паўтор кампанентаў у канцы сказаў. Такая сінтаксічная фігура мае месца пераважна ў мове персанажаў для ўзмацнення сэнсавага выдзялення: – *Не ідзі! – Алёша аж крычаў, забыўшыся на ўсё. – Яма* ***ў крыві****… Пясок* ***у крыві****… Пальцы мае* ***ў крыві****…* [1, с. 249].

Сярод фігур павелічэння аб'ёму выказвання выдзяляецца і сегментацыя. Яна, выконваючы функцыю дадатковай інфарматыўнасці, прадугледжвае раздзяленне канструкцыі на дзве самастойныя часткі, кожная з якіх вызначаецца наяўнасцю адзінак з аднолькавай семантыкай: *Алёша ўбачыў, што* ***рабочыя*** *сядзяць і за сталом – шырокім і доўгім, якія бываюць толькі ў вёсцы на вялікую сям'ю, – мусіць,* ***тыя, што асталяваліся ў Юлькі: чалавек восем*** [1, с. 239].

Фігуры з памяншэннем аб'ёму выказвання, абумоўленыя тэндэнцыяй да эканоміі моўных сродкаў, дазваляюць максімальна перадаць змест пры мінімальнай затраце моўных сродкаў. Яны праяўляюцца ў структурах са шматлікімі варыянтамі пропуску моўных кампанентаў: асобных членаў сказа, прэдыкатыўных частак, спецыяльных моўных паказчыкаў сэнсавых адносін. Да фігур памяншэння аб'ёму выказвання адносіцца эліпсіс: – ***На зямлю! Дзяцей на зямлю!*** *– закрычаў Махорка, не чуючы самога сябе, і пабег назад, да падвод* [1, с. 172]. У мове твораў аўтара пераважаюць эліптычныя канструкцыі, якія ўключаюць дзейнік і акалічнасць месца і выражаюць запытанне: *Канэцкі быў змоўк, пасля зноў закрычаў: –* ***Дзе дарожніцы?*** *Чаму не далі?* [2, с. 212]. Згаданыя канструкцыі вызначаюцца пропускам выказніка, які няма патрэбы ўзнаўляць ні з сітуацыі, пададзенай у кантэксце, ні з самога кантэксту.

Як стылістычны прыём мастацкай прозы эліптычныя канструкцыі дазваляюць акцэнтаваць увагу чытача на асабліва важных для разумення ідэйнай задумы аўтара моўных элементах, больш лаканічна аформіць тэкст, падкрэсліць яго рытмамелодыку.

Сярод фігур з памяншэннем аб'ёму выказвання выдзяляецца і асіндэтон – сінтаксічная фігура, у якой прапушчаны злучнікі, што прыводзіць да афармлення бяззлучнікавых канструкцый з галоўным і залежным прэдыкатыўнымі комплексамі: *Помніць Андрэй, паставілі былі банькі дачцэ, прынёсшы ад Балюты, - сваіх не было: Верка сама ставіла на карасіне – не памагло… У вайну многа хто памёр у вёсцы - людзей не лячылі…*[2, с. 401]. Варта адзначыць, што ў творах Івана Пташнікава пераважаюць старанна адабраныя двухчленныя бяззлучнікавыя канструкцыі, у якіх залежны прэдыкатыўны комплекс мае пераважна прычыннае, тлумачальнае, субстантыўна-азначальнае і дэтэрмінатыўна-часавае значэнне: *Добра ўжо было відаць: немцы ў касках – блішчалі галовы на сонцы* [1, с. 226]. Маючы структурную аналогію з канструкцыямі гутарковай мовы, канструкцыі з асіндэтонам набываюць у мастацкай прозе спецыфічную стылістычную маркіроўку ў залежнасці ад парадку размяшчэння залежнага прэдыкатыўнага комплекса ў адносінах да галоўнага. На стылістычна матываванае ўжыванне бяззлучнікавых канструкцый у розных тыпах моўнага выкладу аказвае ўплыў таксама факт супадзення-несупадзення дэнататаў дзейнікаў у састаўных прэдыкатыўных комплексах, які вызначае і асаблівасці пастаноўкі знакаў прыпынку паміж кампанентамі.

Да ліку фігур размяшчэння і перастаноўкі адносіцца перш за ўсё парцэляцыя. Гэты своеасаблівы прыём экспрэсіўнага сінтаксісу перадае асаблівасці гутарковай мовы, што фарміруецца ў працэсе разгортвання думкі і не з'яўляецца загадзя абдуманай. Як сінтаксічная адзінка парцэляваная канструкцыя самастойна аформлена, хоць сэнсава залежыць ад усяго выказвання, асабліва папярэдняга кантэксту: *Над лесам у тым баку, дзе чырванела неба, ляцелі вароны.* ***Жменькай, памалу-памалу кратаючы крыллем*** [1, с. 168]. "*Пойдуць зноў…* ***І на Рабы Калодзеж, і сюды, на Пячное****… Дацямна далекавата…" – падумаў Жаваранка, паглядзеўшы на чырвонае сонца над лесам* [1, с. 222]. Дадзеная сінтаксічная фігура надае выказванню большую выразнасць, экспрэсіўнасць, дапамагае акцэнтаваць увагу чытача на асобных дэталях. Парцэляцыя цесна звязана з інверсіяй.

Найменшай частотнасцю ўжывання ў мастацкай прозе вызначаюцца ўласнарытарычныя фігуры, такія, як рытарычнае пытанне, рытарычны зварот, перыяд і інш. Аднак мае месца афармленне няўласна-простай мовы, за кошт чаго паглыбляецца драматызм у паказе пэўных падзей, становіцца больш выразным адлюстраванне самых разнастайных абставін, з пункту гледжання розных герояў: *Юзюк недзе ўжо за Дзвінасай. Пайшоў без яе, Тані.* ***Як жа яна магла пайсці з Юзюком… Кінуць у балоце матку? Мала***

што ў балоце людзі… Як гэта пайсці ўдваіх з Юзюком? Каб усе відзелі?.. [1, с. 40].

Праведзены аналіз дазваляе сцвярджаць, што беларуская мастацкая літаратура характарызуецца разнастайнасцю экспрэсіўных стылістычных фігур, за кошт чаго аўтары дасягаюць пастаўленых мэт, ствараючы гарманічныя паводле зместу і формы творы.

Літаратура

1. Пташнікаў, Іван. Выбраныя творы: у 2 т. Т. 1 / Іван Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 460 с.

2. Пташнікаў, Іван. Выбраныя творы: у 2 т. Т. 2 / Іван Пташнікаў. – Мінск: Маст. літ., 1980. – 523 с.

Т.Л. Памазенка (Мінск)

НЕВЯДОМЫ СЛОЎНІК АЛЯКСАНДРА РУЖАНЦОВА: СТРУКТУРНА-ЗМЕСТАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ

Адным з найбольш прыкметных дзеячаў беларускай эміграцыі мінулага стагоддзя можна назваць Аляксандра Ружанцова (1893−1966), беларуска-літоўскага афіцэра, бібліёграфа, паэта, перакладчыка, калекцыянера, даследчыка гісторыі вайсковых фарміраванняў, вядомага таксама пад літаратурным псеўданімам Алесь Смалянец. Асоба А. Ружанцова не раз станавілася аб’ектам навуковага вывучэння. Увагу многіх даследчыкаў (А. Антонаў, А. Бяляцкі, Л. Данене, В. Тумаш і інш.) прыцягвала складаная біяграфія навукоўца, яго грамадская і культурна-асветніцкая дзейнасць.

Варта згадаць, што А. Ружанцоў родам з пасёлка Вязьма Смаленскай губерні. Пасля заканчэння вяземскай гімназіі ў 1911 г. ён паступіў на гісторыка-філасофскі факультэт Маскоўскага ўніверсітэта, а ў 1914 − у Маскоўскую Аляксееўскую вайсковую школу. У пачатку першай сусветнай вайны быў накіраваны на нямецкі фронт, дзе служыў у IV пяхотным палку, потым у званні камандзіра (1918) вёў баявыя дзеянні ў Беларусі і Літве. У 1919 г. перайшоў на літоўскі бок і ўзначаліў у рангу маёра Першую беларускую роту, што брала ўдзел у змаганні з польскімі і бальшавіцкімі сіламі. За гераізм у баях з чырвоналатышскімі войскамі ўзнагароджаны ордэнам «Крыж Пагоні». У верасні 1920 г. атрымаў пасаду кіраўніка навастворанага Беларускага асобнага батальёна. У літоўскай арміі служыў да 1940 г., выконваючы функцыі пажарнага інспектара (арганізаваў 32 вайскова-пажарныя брыгады, падрыхтаваў службовыя інструкцыі). Воінскі абавязак А. Ружанцоў удала сумяшчаў з актыўнай грамадскай дзейнасцю: 1921−1940 − дырэктар Цэнтральнай вайсковай бібліятэкі ў Коўне; з 1931 – заснавальнік і віцэ-старшыня Таварыства бібліятэкараў Літвы (разам з В. Біржышкам), загадчык справаў Інстытуту бібліяграфіі; з 1940 − загадчык Кабінету бібліяграфіі ў Цэнтральнай

бібліятэцы Акадэміі навук Літвы. У 1944 г. вучоны пакінуў Вільню (з прыбліжэннем фронту) і выехаў на пастаяннае жыхарства ў заходнія краіны. Пасля заканчэння вайны сям'я Ружанцовых знайшла сабе прытулак у лагеры для перамешчаных асоб у горадзе Мемінгене (Баварыі), дзе навуковец разам з генералам-маёрам К. Езавітавым працаваў у штабе беларускага вайсковага аддзелу, супрацоўнічаў з літоўскім і беларускім друкам і арганізаваў Літоўскую службу бібліяграфіі па збіранні эмігранцкіх выданняў (захоўваюцца ў літоўскіх архівах Швейцарыі і Чыкага). У 1949 г. прыбыў у ЗША (мястэчка Дэнвіл, штат Ілінойс), дзе да апошніх гадоў свайго жыцця працягваў займацца праблемамі літоўскай і беларускай бібліяграфічнай справы [5, с. 41−42].

Такім чынам, А. Ружанцоў з'яўляўся «афіцэрам армій трох краін, на працягу жыцця змяніў тры грамадзянствы, у выніку сусветных войнаў двойчы свядома прымаў статус эмігранта» [2, с. 476].

Абсяг зацікаўленняў Ружанцова даволі значны і шматгранны. Гэта ў першую чаргу **бібліятэка-** і **бібліяграфазнаўства** («Каталог цэнтральнай вайсковай бібліятэкі 1922 − 1932 гг., 1933 – 1938 гг.», «Літоўская вайсковая бібліяграфія 1917 − 1922 гг.» (1923), «Часці Літоўскага войска ў XVIII ст. (Вайсковы Архіў)» (1926), «Са спраў 1812 − 1913 гг. Архіва гарадской управы Коўна» (1929), «Перыёдыка Літвы 1929 − 1930 гг.» (1930), «Каталог кніг Фонду Друку» (1930), «Абэцэдны паказальнік "Бібліяграфічных ведамасцей» (1931), «Разнавіднасці газет, тыражы і літоўская перыёдыка» (1933), спецыяльныя паказальнікі часопісаў «Гаспадарка Літвы», «Шлях праўды»; у эміграцыі − спіс гістарычных артыкулаў часопіса «Рэха», аналітычны паказальнік часопіса «Веда», аналітычны паказальнік друкаў БІНІМа («Запісаў» і «Конадняў») і інш.); **ваенная гісторыя** (артыкулы і кнігі «Пажары ў Коўне ў 1812 г.» (1930), «Са спраў паўстання 1831 г.» (1931), «Кніжкі агню» (1932), «Польскія палкі на нашым фронце» (1935), «Коўна ў паўстаннях 1831 і 1863 − 1864 гг.» (1937) і інш.); **літаратура** (вершаваныя творы «Зрання ў акопах», «На старой дзялянцы», «На фронце», «Пасля палону», «Прад атакай», «Расстрэл», «Хворы я. Душа ў мяне хварэе…»; пераклады з беларускай мовы на літоўскую і наадварот «Бяздоннае багацце» В. Ластоўскага (1947), «Францішак Скарына» Ю. Віцьбіча (1947), творы Я. Купалы, Я. Коласа, Ядвігіна Ш. і інш.); **рэдактарская справа** (заснавальнік і рэдактар шэрагу вайсковых газет і часопісаў, такіх як «Браславская стенная газета» (1919 − 1920), «Варта Бацькаўшчыны» (1920), «Беларус вайсковы» (1921), «Светазар» (1921 − 1922) і інш.; бібліяграфічнага часопісу «Кніжная паліца» (1945 −1966, 16 тыс. літ. выд.); рэдактар беларускіх артыкулаў першых тамоў «Літоўскай энцыклапедыі» і інш.); **мастацтва** і **экслібрыстыка** (уладальнік вялікага збору кніжных знакаў вайсковых бібліятэк Еўропы, ініцыятар стварэння экслібрысаў для

бібліятэкі Галоўнага штаба Літоўскай арміі, якія пазней увайшлі ў залаты фонд кніжнага знака Літвы).

На жаль, для шырокай навуковай грамадскасці застаюцца невядомыя беларускія працы А. Ружанцова, што абумоўлена ў першую чаргу іх дэцэнтралізаваным захоўваннем. Увогуле, паэтычная і лексікаграфічная спадчына вучонага не атрымала дастатковага апісання ў сучасны час, што робіць заяўленую аўтарам тэму надзвычай актуальнай.

Варта зазначыць, што ў Коўне ў 1921 г. Ружанцовым завершаны двухмоўны літоўска-беларускі слоўнік ваенных тэрмінаў «**Каманды і назовы ў беларускіх аддзелах Літоўскага войска**» (28 старонак), які не быў апублікаваны і захоўваецца ў бібліятэцы імя Урублеўскіх Літоўскай акадэміі навук (Вільнюс) [4]. Мэта артыкула – даследаваць структурна-зместавыя асаблівасці вайсковага слоўніка А. Ружанцова, акрэсліць яго ролю ў гісторыі беларускай перакладной тэрмінаграфіі першай паловы XX ст. Актуальнасць тэматыкі абумоўлена тым, што перакладны слоўнік навукоўца ўпершыню з'яўляецца прадметам спецыяльнага вывучэння. У цэлым, праведзенае даследаванне дазволіла не толькі глыбей раскрыць лексікаграфічную значнасць названай працы, але і спрыяла вызначэнню некаторых заканамернасцяў у працэсе фарміравання беларускай тэрміналогіі ў даваенны перыяд, асэнсаванню асноўных метадалагічных прынцыпаў стварэння беларускіх перакладных слоўнікаў з уключэннем тэрміналагічнага матэрыялу. Тым больш, што лексікаграфічны твор аўтара прысвечаны важнаму перыяду ў гісторыі беларускай літаратурнай мовы, калі яе лексічная сістэма знаходзілася ў стане эвалюцыі, што спрыяла фарміраванню тэрмінасістэм, у тым ліку і ваеннай. Увогуле, слоўнікавы склад нацыянальнай мовы з прычыны яго рухомасці, зменлівасці ставіць перад даследчыкамі розныя пытанні (спецыялізацыя лексікі, яе пашырэнне, уплыў розных фактараў лінгвістычнага і экстралінгвістычнага парадку), рашэнне якіх неаднаразова выклікала палеміку ў навуковым асяроддзі і застаецца надзвычай важным і на сённяшні дзень.

Навуковую значнасць рукапісу прадстаўляе багаты лексічны матэрыял, паколькі «тэматычнае спасціжэнне лексікі нацыянальнай мовы, семантыкі намінацый, адценняў і канатацый адкрывае сакрэты слова, дае магчымасць зазірнуць у яго сэнсавую глыбіню» [6, с. 3]. Тым больш, што ваенная тэматыка актуальная для любога часу і любога народа, паколькі з'яўляецца часткай моўнай карціны свету і гістарычнай памяці нацыі. Як піша С. Алексіевіч, якая прысвяціла шмат сваіх твораў тэме вайны і яе наступстваў, «... чалавечае жыццё не бясконцае, падоўжыць яго можа толькі памяць, якая адна толькі перамагае час» [1, с. 4]. В. Паваляеў у сваім даследаванні «Вайна як сацыяльная з'ява» справядліва заўважае: «Вайна не проста садзейнічае развіццю чалавечага грамадства, вайна інтэграваная ў жыццё грамадства» [3, с. 3]. Адсюль відавочна, што гістарычная памяць

любога народа знаходзіць сваё адлюстраванне ў мове, найперш у яе лексічнай сістэме.

Корпус спецыяльных адзінак слоўніка складаецца з двух раздзелаў: першую частку, пабудаваную па тэматычным прынцыпу, утвараюць каманды: 1. *Паадзінае вучэньне (постаць бяз стрэльбы; звароты; рухі; постаць са стрэльбай; стрэляньне; стрэльбовыя ўхваты).* 2. *Шэрэнговае вучэньне (рыхтаваньне і лічэньне шэрэнгу; разчыненьне, зчыненьне і рыхтаваньне ў два шэрэнга; рух шэрэнгу; зьмена кірунку).* 3. *Узводнае вучэньне (рыхтаваньне і лічэньне; выраўнаньне і звароты ўзводу; узьваеньне і вырыхтаваньне радоў; састаўленьне стрэльбаў; рухі і зьмена кірунку разьвінутага ўзводу; калёна, яе рыхтаваньне, перарыхтаваньне і разьвіненьне; рухі і зьмена кірунку калёны; стрэляньне; вольны рыхт; перабеганьне; стрэляньне ў ланцугу; рухі ланцугу).* 4. *Вучэньне кампаніі.* 5. *Вучэньне батальёну.*

У другой частцы паводле лацінскага алфавіта змешчаны ваенныя тэрміны (каля 300 лексем). Асноўныя тэматычныя групы ваеннай лексікі лічым неабходным прадставіць наступным чынам:

1. Паняцці, якія абазначаюць ваенна-прафесійную дзейнасць:

- найменні тэхнікі, зброі рознага выкарыстання і яе частак (*абоз, абойма, аброць, веха, гармата, дзіда, дротавыя перашкоды, куля, меч, паходня, самахотнік, стрэльба, стрэльбовыя казлы, шабля, штых* і інш.);
- ваенныя дзеянні і аперацыі (*абарона, абаронная заслона, вызваляць, выходнае становішчэ, дапамога, забіць, паходная заслона, камандаваць, камандзераваць, паход, прыстрэліваньне, пытаць, сачэнне, стрэл, узмацніць, уцечка, цэленьне* і інш.);
- ваенныя вучэнні (*адданне гонару, баявы набой, баявы рыхт, вучэньне, выканаўчая каманда, даклад, загад, зчынены рыхт, камандаваць, ланцуг, рухі ланцугу, парад, пералічка, прысяга, разьвінуты рыхт, рухі шарэнгу, рыхтавацца, салютацыйнае стрэляньне, стралецкі ланцуг, уздваіваньне і рыхтаваньне радоў, трохлінейка, урачысты ход, шарэнг* і інш.);
- званні, пасады і прафесіі ваеннаслужачых, статус у грамадстве (*арыштант, бомбакід, вартавы падстаршыня, вартаўнічы, воін, вывядовец, ганец, гарматнікі, днявальні, дудар, жаўнер, збраёвы майсцер, лекарскі памочнік, музыкавод, намесьнік, падвартаўнік, падстаршыновая варта, палонны, пісар, пістмавод, пхач, следзяч, старшыня, рыхтовы жаўнер, рэкрут, узводны, ураднік, чужаземец* і інш.);
- назвы родаў войск, іх злучэнняў *(абозовая кампанія, абаронны аддзел, армія, войска, запас, кіруючы аддзел, узвод, чольны аддзел* і інш.).

2. Паняцці, якія адлюстроўваюць ваенна-бытавы бок жыцця ваеннаслужачых:

- месца службы і адпачынку: *вайсковая частка, ганак, жаўнерня, канцэлярыя, магазын, склад* і інш.;

- казарменны быт (ежа, адзенне, зацікаўленні і г.д.): *вайсковыя адзнакі, заява, звычай, коўдра, маляванне, пераклад, перапіска, пісулька, пэнсія, скрынка, рура, харч, харчовыя грошы, шафа, электрычная лямпа* і інш.);
- міжасобасныя адносіны, якасныя характарыстыкі ваеннаслужачых (*адмысловы, бязьпечнік, вымаганне, даўбіш, няпісьменны, нярыхтовы, падуладны, паслушнасць, сваевольны, скарга, хуткасць, рэшучасьць, камешканне, моц, убогі, сябра, прэзэс і інш.*).

3. Грамадска-палітычныя паняцці (*абавязак, грамадзскі, грамадзянін, дзяржаўны скарб, дзяржаўныя ўстановы, пасольства, пастанова, суд, судовыя ўстановы, улада, уласнасць, урад, харугва і інш.*).

Мікраструктура слоўнікавага артыкула спрошчаная і выражана загалоўнай лексемай і перакладнымі эквівалентамі.

Асноўным структурным кампанентам слоўнікавага артыкула ў лексікаграфічных працах з'яўляецца лема (загалоўная лексема). У слоўніку аўтара функцыі лем выконваюць: назоўнікі, прыметнікі, дзеясловы і яго формы, лічэбнікі, прыслоўі, тэрміналагічныя словазлучэнні: *аддзелёны, ваяводзіць, дзяржаўныя ўстановы, кленчачы, лежачы, мэта, пэўны, уходзячая папера, хутка, шкада* і інш. У залежнасці ад структуры тэрміны вылучаюць: невытворныя (*кут, рыхт, сябра*), вытворныя (*паходня, пісулька, тэрміновы*), складаныя (*бомбакід, поўдзень-захад, поўдзень-усход, сваевольны, трохлінейка*). Тэрміналагічныя словазлучэнні ў асноўным прадстаўлены субстантыўнымі злучэннямі, да прыкладу, *адданне гонару, дротавыя перашкоды, стралецкі ланцуг, тэрмін службы.*

У лексікаграфічным творы знаходзіць выражэнне пераважна прамая форма прадстаўлення тэрміналагічных словазлучэнняў (*выканаўчая каманда, судовыя ўстановы*) і толькі зрэдку − адваротная (*аддаць у згадзе, лічыцца па сьпісу*). Інверсія звычайна выкарыстоўваецца ў мэтах акцэнтавання ўвагі на апорным слове ў спалучэнні тэрмінаадзінак.

Некаторыя спецыяльныя лексемы ў рэестравай частцы маюць некалькі фармальных разнавіднасцей тыпу *веха* і *вешка, ураднік* і *ўрадовец, твердзь* і *твярдыня*. Фанетычныя і марфалагічныя варыянты размяшчаюцца пасля асноўнай формы тэрміна ў структуры аднаго слоўнікавага артыкула.

Семантыка загалоўных лексем раскрываецца шляхам падбору поўных або частковых эквівалентаў для кожнага слова і яго значэння. У вобласці тэрмінаграфіі поўнымі эквівалентамі называюць тэрміны, якія абазначаюць адно паняцце, г. зн. дэфініцыі якіх супадаюць, да прыкладу: *apsauga – абарона, baustė − запас, įstaiga − установа*. Частковая эквівалентнасць мае месца ў тэрмінаадзінках з сінанімічнымі адносінамі: *mokumas − вучэнне, муштра; nelaiskvė − палон, няволя*. Безэквівалентныя лексемы не маюць адпаведнікаў у мове-транслятары, таму выкарыстоўваюцца розныя прыёмы для перакладу такіх слоў. У дадзеным

выпадку аўтар ужывае апісальны спосаб: *pinklės – дротавыя перашкоды, slaptžodis – тайная слова*.

Галоўнымі недахопамі працы, на наш погляд, можна лічыць невялікі памер слоўніка і адсутнасць уводнага апарату да яго (правілы карыстання даведнікам, алфавіт і г.д.), парушэнне строгіх правілаў адбору слоў (у слоўнік уключаны некаторыя агульнаўжывальныя словы, словы з экспрэсіўным значэннем, дублетныя і варыянтныя адзінкі), адсутнасць сістэмы акцэнталагічных і граматычныя памет, інфармацыі пра амонімы і полісемантныя паняцці, павярхоўны пераклад некаторых тэрмінаў і інш.

Нягледзячы на адзначаныя пралікі, супастаўляльны слоўнік аўтара мае лінгвістычную каштоўнасць. Менавіта А. Ружанцовым зроблены першыя спробы распрацоўкі і сістэматызацыі ваеннай лексікі беларускай мовы, што мела істотнае значэнне на этапе станаўлення паняційнага фонду мовазнаўчай навукі ў першай палове XX ст. Спецыяльныя лексемы, сабраныя і апрацаваныя аўтарам у рукапісе, інфармуюць пра розныя сферы жыццядзейнасці беларускага народа: сацыяльную структуру грамадства (назвы пасад, званняў), развіццё прадукцыйных сіл (на прыкладзе найменняў зброі), эвалюцыю ваеннага мастацтва (назвы пэўных ваенных дзеянняў, аперацый), гісторыю фарміравання воінскіх сіл (абазначэння воінскіх частак, злучэнняў), стаўленне народа да воінаў (назвы, якія характарызуюць іх), сістэма патрыятычнага выхавання моладзі (найменні ваенізаваных звычаяў, традыцый) і г.д. Таму лексікаграфічная характарыстыка адзінак ваеннай справы служыць значнай прыступкай у працэсе апісання і вывучэння ўсяго слоўнікавага складу сучаснай нацыянальнай літаратурнай мовы.

Літаратура

1. Алексиевич, С. У войны не женское лицо / С. Алексиевич. – М.: Пальмира, 2004. – 91 с.

2. Антонаў, А. Аляксандр Ружанцоў: Накіды да біяграфіі / А. Антонаў // Беларускі гістарычны агляд. – 2009. – Т. 16. Сш. 2 (31). – С. 476–512.

3. Поваляев, В. Война как социальное явление: дисс. ... канд. философ. наук: 09.00.11 / В. Поваляев; МГПУ. − Самара, 2007. − 145 с.

4. Ружанцоў, А. Каманды і назовы ў беларускіх аддзелах Літоўскага войска. Рукапіс / А. Ружанцоў // LMAVB RS. F21-531. – 28 с.

5. Тумаш, В. Аляксандра Ружанец-Ружанцоў. Да 60-годдзя жыцця / В. Тумаш // Запісы Беларускага інстытута навукі і мастацтва. − 1954. − № 1(5). − Ч. III. − С. 41−43.

6. Шаўчэнка, М. Рэлігійная лексіка ў беларускай мове: манаграфія / М.М. Шаўчэнка. – Мазыр: УА МДПУ, 2005. − 95 с.

К.С. Півавар (Віцебск)

КРЫТЭРЫІ ВЫЛУЧЭННЯ КЛЮЧАВЫХ КАНЦЭПТАЎ У БЕЛАРУСКАЙ МОЎНАЙ ПРАСТОРЫ

Вывучэнне ключавых канцэптаў асобных лінгвакультур – сродак пранікнення ў ментальнасць народа, разумення культурных асаблівасцей, норм і правіл паводзін у пэўным соцыуме. У ключавых канцэптах увасоблены найважнейшыя, базавыя каштоўнасці нацыянальна-культурных супольнасцей. Абранае тэрміналагічнае абазначэнне пабудавана на вельмі ўдалай метафары (“ключы” да культуры”) і, відавочна, таму актыўна ўжываецца многімі даследчыкамі (А. Вяжбіцкая, В. Карасік, В. Маслава, М. Піменава і інш.).

Мэта артыкула: даць азначэнне тэрміну ‘ключавы канцэпт’, размежаваць яго з сінанімічнымі паняццямі; на аснове аналізу навуковай літаратуры прывесці крытэрыі вылучэння ключавых канцэптаў і прымяніць іх да беларускай моўнай прасторы.

У антрапалагічна арыентаваных накірунках лінгвістыкі існуе вялікая колькасць азначэнняў канцэпту, абагульняючы якія можна выдзеліць асноўныя прыкметы канцэпту: яго ментальную прыроду, магчымасць акумуляваць веды этнасу пра навакольную рэчаіснасць, а таксама знаходзіць выражэнне ў мове. Такім чынам, канцэпт уяўляе сабой ментальную рэпрэзентацыю ведаў чалавека пра рэчаіснасць.

Адкрытым у сучасным мовазнаўстве з’яўляецца пытанне пра колькасць канцэптаў у канцэптуальнай карціне свету. Меркаванне, што канцэптам можа стаць амаль кожнае слова (М.У. Піменава) супрацьстаіць пункту гледжання, што канцэптаў у нацыянальнай карціне свету не больш за некалькі соцень (Ю.С. Сцяпанаў, С.Р. Варкачоў). Аднак большасць даследчыкаў выдзяляе набор ключавых канцэптаў у канцэптуальнай карціне свету нацый.

Ключавы канцэпт – гэта агульнакультурные знакавые паняцце, асабліва важные і паказальнае для асобна ўзятай супольнасці. Некаторыя ключавыя канцэпты могуць аналізавацца як цэнтральныя кропкі, вакол якіх арганізаваны цэлыя галіны культуры. Сінанімічным да паняцця ‘ключавы канцэпт’ з’яўляецца тэрмін ‘канстанта культуры’ – канцэпт, які з’яўляецца ў глыбокай старажытнасці і прасочваецца праз погляды сучасных носьбітаў мовы; “нейкі пастаянны прынцып культуры” (Ю.С. Сцяпанаў, С.Г. Праскурын). У азначэнні падкрэсліваецца архаічнасць канстантаў культуры, аднак ключавым канцэптам культуры можа стаць і адносна “новае” паняцце. Напрыклад, практыцы вырошчвання бульбы на землях Беларусі некалькі стагоддзяў, аднак папулярнасць гэтай расліны відавочная, што прасочваецца ў наяўнасці крылатых выразаў *Бульба – другі хлеб*, мностве назваў страў з бульбы (*дранікі, клёцкі, камы,*

калдуны, бабка – многія з прыведзеных лексем з'яўляюцца безэквівалентнымі ў дачыненні да іншых моў), шматлікіх вершаў беларускіх пісьменнікаў пра бульбу (Р. Барадулін "Чышчу бульбу", "Паляць бульбоўнік", С. Законнікаў "Капаюць бульбу землякі", П. Панчанка "Бульба"), нават мянушка беларуса – бульбаш – ператварылася ў нацыянальны брэнд.

На сённяшні дзень пытанне методыкі выяўлення найбольш важных ключавых канцэптаў культуры таго ці іншага этнасу недастаткова распрацавана. Даволі часта даследчыкі абапіраюцца на ўласную інтуіцыю пры ўстанаўленні важнасці таго ці іншага канцэпту для пэўнай культуры. А. Вяжбіцкая заўважае, што не існуе аніякай аб'ектыўнай працэдуры, якая б дазволіла лагічным шляхам вызначыць набор ключавых канцэптаў культуры. У сувязі з гэтым яна прапаноўвае даследчыкам абапірацца на шэраг фактараў, у першую чаргу "культурную распрацаванасць", пад якой А. Вяжбіцкая разумее лексічную распрацаванасць якой-небудзь галіны, прадстаўленасць яе ў слоўніку [2, с. 28–30]. Другім індыкатарам ключавой ролі канцэпту з'яўляецца яго частае фігураванне ў паўсядзенным маўленні, а таксама (у якасці тэмы) у народнай і "высокай" літаратуры [2, с. 27–37].

Дж. Лакоф да ліку фундаментальных адносіць канцэпты, звязаныя з іншымі канцэптамі канцэптуальнай сістэмы і вызначаюць іх арганізацыю, напрыклад, канцэпты прасторы і часу. У сувязі з гэтым дадзеныя канцэпты звычайна становяцца часткай граматыкі мовы [4, с. 308].

Апісваючы ключавыя ідэі рускай моўнай карціны свету, Г.А. Залізняк, А.Д. Шмялёў, І.Б. Лявонціна фармулююць наступныя крытэрыі іх вылучэння: "Тое, што пэўная ідэя з'яўляецца для дадзенай мовы ключавой, пацвярджаецца, з аднаго боку, тым, што гэтая ідэя паўтараецца ў значэнні іншых слоў і выразаў, а таксама часам сінтаксічных канструкцый і нават словаўтваральных мадэлей, а з другога боку, тым, што менавіта гэтыя словы горш за іншыя перакладаюцца на замежныя мовы [3, с. 10].

На думку В.А. Маславай, да ключавых канцэптаў культуры адносяцца такія абстрактныя імёны, як "Сумленне, Лёс, Воля, Доля, Грэх, Закон, Свабода, Інтэлігенцыя, Радзіма і пад." [5, с. 137].

Ключавымі канцэптамі культуры мы называем абумоўленыя ёю ядзерныя адзінкі карціны свету, якія валодаюць асаблівай значнасцю як для пэўнай моўнай асобы, так і для лінгвакультурнай супольнасці ў цэлым. Пры вызначэнні канцэпту як ключавога намі ўлічваецца шэраг прымет:

1) высокая частотнасць ключавых слоў, якія актуалізуюць сэнсы ключавога канцэпту. Маюцца на ўвазе не толькі дадзеныя частотных слоўнікаў (зразумела, самымі частотнымі лексемамі будуць службовыя часціны мовы, хоць роля такіх слоўнікаў у вылучэнні ключавых слоў вялікая), але і паўтаральнасць пэўных паняццяў у розных відах дыскурсу: мастацкі, публіцыстычны, навуковы. Так, на старонках газет і часопісаў, мастацкай літаратуры, у асобнай галіне ведаў – беларусазнаўстве –

апісваецца нацыянальны характар беларусаў, паходжанне, воблік, культура. Несумненна, канцэпт *народ* адносіцца да ліку ключавых у беларускай моўнай прасторы.

2) намінатыўна-марфалагічная дробнасць канцэптаў. Напрыклад, пры вызначэнні намінатыўнага поля канцэпту Радзіма намі вылучана больш за дзясятак лексем-рэпрэзентатараў: *Радзіма, Беларусь, Белая Русь, Айчына, Бацькаўшчына, наша краіна, родная зямля, дзяржава, родны куток, зямля бацькоў (продкаў), мілы кут маіх дзядоў, межы родныя, наша ціхая старонка, Літва-Беларусь, родная прадзедава мяжа, маці наша* і інш.

3) здольнасць фарміраваць фразеалагічныя гнёзды; шырокае выкарыстанне ў складзе прыказак і прымавак. Інфармацыю пра тое, якім сферам аддаецца перавага ў той ці іншай моўнай прасторы, можна атрымаць з ідэаграфічнага слоўніка. Л.Г. Бабенка, якая займаецца ідэаграфічным апісаннем лексікі рускай мовы, разглядае такі спосаб найважнейшым у вылучэнні ключавых канцэптаў мовы [1].

4) выкарыстанне ў прэцэдэнтных тэкстах культуры – тэкстах, якія з'яўляюцца найбольш значнымі для культуры. У асобным даследаванні намі выдзелена і апісана дзевяць ключавых канцэптаў беларускай літаратуры: *Радзіма, народ, воля, мова, сям'я, час, прастора, каханне, шчасце*. З упэўненасцю можам аднесці іх да ліку ключавых у беларускай моўнай прасторы ў цэлым.

5) наяўнасць у ключавых слоў своеасаблівых канцэптуальных значэнняў, звязаных з адлюстраваннем светаўспрыняцця і светапогляду нацыі. Напрыклад, пры апісанні канцэпту *шчасце* дадаткова трэба патлумачыць змест лексемы *папараць-кветка* або які дадатковы сэнс мае рэпрэзентант канцэпту сям'я *бацькоўская буслянка*.

Абапіраючыся на вышэйпрыведзеныя крытэрыі, вылучым наступныя тры групы ключавых канцэптаў беларускай моўнай прасторы.

Да першай групы адносяцца фундаментальныя агульначалавечыя канцэпты, якія валодаюць экзістэнцыяльнай значнасцю як для адной асобы, так і для чалавечых супольнасцей у цэлым. Да такіх канцэптаў у першую чаргу трэба аднесці канцэпты *час* і *прастора*, *лік*, *смерць* і інш. Прысутнасць дадзеных канцэптаў ва ўсіх культурах свету забяспечвае магчымасць узаемаразумення паміж народамі. Г. Вяжбіцкая уключае дадзеныя канцэпты ў спіс універсальных першасных сэнсаў [2, с. 53].

Другую групу ўтвараюць канцэпты, якія існуюць ва ўсіх або большасці культур, але з'яўляюцца асабліва значнымі для канкрэтнай дадзенай культуры. Напрыклад, канцэпты *мова* і *воля* ў нацыянальнай карціне свету беларусаў актуальныя з прычыны цяжкага і доўгага шляху беларусаў да незалежнасці, права гаварыць на роднай мове. Магчыма, кожны народ зазнаў*, але беларускі народ, не па сваёй волі задзейнічаны ў шматлікія войны, мемарыязаваў*.

Да трэцяй групы адносяцца этнаспецыфічныя, унікальныя канцэпты дадзенай культуры. Цяжкасць перакладу лексічных рэпрэзентантаў падобных канцэптаў на іншыя мовы з'яўляецца, напэўна, асноўным крытэрыем іх выдзялення. На нашу думку, у беларускай моўнай прасторы такімі канцэптамі могуць выступіць *талака, хата*. Агульнапрызнана, што існуюць спецыфічныя для пэўных культур паняцці, напрыклад, А. Вяжбіцкая вылучае для нямецкай культуры як ключавое слова пунктуальнасць, для рускай – душа, сум (рус. – тоска), лёс (рус. – судьба) [2]. Для амерыканскай культуры такім паняццем можа выступаць прыватнасць (англ. – privacy) і інш. Пры апісанні беларускай ментальнасці на аснове мастацкай літаратуры нацыянальна спецыфічнымі рысамі сярод іншых мы вылучылі лагоднасць, пакорлівасць, ціхмянасць, дабрадушнасць, згаворлівасць, рахманасць, чым пацвердзілі меркаванні шматлікіх этнолагаў (Э. Дубянецкі, Л. Лыч і інш). З гэтага вынікае, што *рахманасць* – нацыянальна спецыфічны канцэпт, варты асобнага даследавання не толькі ў мастацкіх тэкстах, але і ў масавай культуры (асабліва ў анекдотах пра беларусаў).

Такім чынам, ключавымі канцэптамі становяцца толькі тыя з'явы рэчаіснасці, якія актуальныя і каштоўныя для дадзенай культуры, маюць вялікую колькасць моўных адзінак для сваёй фіксацыі, з'яўляюцца тэмай прыказак і прымавак, паэтычных і празаічных тэкстаў. Яны з'яўляюцца свайго роду знакамі, эмблемамі, паказваюць на сітуацыю, веды.

Літаратура

1. Бабенко, Л.Г. Идеографическое описание русской лексики как способ выявления базовых категорий и ключевых концептов / Л.Г. Бабенко / Электронный ресурс. – Режим доступа:http://www.philol.msu.ru/~rlc2007/pdf/16.pdf Дата доступа: 15.07.2015.
2. Вежбицкая, А. Понимание культур через посредство ключевых слов / А. Вежбицкая. – Москва: Языки славянской культуры, 2001. – 287 с.
3. Зализняк, А.А. Ключевые идеи русской языковой картины мира / А.А. Зализняк, И.Б. Левонтина, А.Д. Шмелев. – Москва: Языки славянской культуры, 2005. – 525 с.
4. Лакофф, Дж. Женщины, огонь и опасные вещи. Что категории языка говорят нам о мышлении. – Москва: Языки славянской культуры, 2004. – 792 с.
5. Маслова, В.А. Лингвокультурология : учеб. пособие / В.А. Маслова. – Москва: Academia, 2001. – 208 с.
6. Півавар, К. "Сын герояў і багоў": канцэпт *народ* у мове беларускай літаратуры / К. Півавар // Роднае слова. – 2014. – № 8. – С. 34–38.

І.В. Піваварчык (Гродна)

ЭТЫКЕТНЫЯ МАЎЛЕНЧЫЯ ЖАНРЫ РЭЛІГІЙНАГА ДЫСКУРСУ (НА ПРЫКЛАДЗЕ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯЎ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ)

Маўленчы этыкет з’яўляецца важным элементам любой культуры, бо культура кожнага народа накладае адбітак на этыкетную мадэль паводзін. Развіццё сучаснага грамадства абумоўлівае дэталёвае вывучэнне этыкетных мадэляў паводзін з тым, каб пазбегнуць камунікатыўных няўдач і знайсці эфектыўныя шляхі ўзаемадзеяння, тым больш у такой сферы камунікатыўнай дзейнасці, як царкоўна-рэлігійная камунікацыя, цікавасць да якой узрастае з году ў год па прычыне павелічэння сацыяльнага ўплыву рэлігіі.

Нераспрацаваным застаецца пытанне функцыянавання жанраў рэлігійнага дыскурсу, хоць можна гаварыць аб традыцыі вывучэння жанраў, якія рэалізуюцца ў царкоўна-рэлігійнай сферы зносін (працы М. Войтак, Л.І. Мацько, М.Б. Растаргуевай і інш.). Выдзяленне жанраў у рэлігійным дыскурсе з’яўляецца цяжкім па наступных прычынах: 1) складанага характару камунікацыі, у межах якой выказванне выходзіць за свае рамкі і становіцца падзеяй; 2) складанага характару ілакутыўнага матэрыялу, сукупнасці інтэнцый, якія выяўляюць складаныя канфігурацыі [6, с. 5].

Этыкетныя маўленчыя жанры прыводзіць у сваёй класіфікацыі Т.В. Шмялёва, якая ў залежнасці ад камунікатыўнай мэты выдзяляе чатыры маўленчыя жанры: інфармацыйны, ацэначны, этыкетны і імператыўны [7, с. 81–82].

Этыкетны маўленчы жанр – гэта замацаваныя ўстойлівыя моўныя рэакцыі на стандартныя сітуацыі зносін, камунікатыўная мэта якіх – устанаўленне, падтрымка і перапыненне зносін паміж удзельнікамі камунікацыі ў адпаведнасці з прынятымі ў грамадстве традыцыямі і нормамі маўленчага этыкету. Этыкетныя жанры – гэта жанры, якія абслугоўваюць тыповыя сітуацыі, звязаныя з рытуалізаванымі сацыяльнымі адносінамі паміж людзьмі. Да асноўных этыкетных маўленчых жанраў адносяцца прывітанне, развітанне, зварот, знаёмства, віншаванне, пажаданне, падзяка, прабачэнне, згода/нязгода, запрашэнне, спачуванне, камплімент [2, с. 110].

Этыкетныя маўленчыя жанры падрабязна даследавала ў сваіх працах Т.В. Тарасенка, якая выдзеліла некалькі груп дадзенага жанру: 1) этыкетныя жанры быцця; 2) этыкетныя жанры-рэакцыі на падзеі з футуральнай перспектывай; 3) этыкетныя жанры-рэакцыі на падзеі з перфектнай перспектывай [4, с. 12]. Аўтар вызначыла прыкметы, характэрныя для дадзеных жанраў: 1) яны ўяўляюць сабой рэакцыю на

падзею; 2) рэакцыя на падзею мае перфектную перспектыву; 3) рэалізуюцца дзеясловамі-перфарматывамі [5, с. 283].

Даследчыкамі прааналізавана функцыянаванне этыкетных маўленчых жанраў у розных сферах зносін: размоўна-бытавой, у творах вуснай народнай творчасці і мастацкай літаратуры. Аднак функцыянаванне этыкетных жанраў у масавай камунікацыі, у прыватнасці, у газетнай практыцы амаль не прыцягвала ўвагі даследчыкаў. У дадзеным артыкуле прадставім асаблівасці функцыянавання маўленчых этыкетных жанраў у рэлігійных выданнях Гродзенскай вобласці: штомесячнай газеце праваслаўнага епархіяльнага кіравання “Гродненские епархиальные ведомости” і газеце рымска-каталіцкай дыяцэзіі “Слова жыцця” за перыяд з 2010 па 2015 гг. Адразу адзначым, што этыкетныя жанры дастаткова папулярныя ў рэлігійных выданнях, арыентаваныя на падтрымку кантакту, прыносяць у медыятэкст асаблівую эмацыйную танальнасць.

Заканамерна, што на старонках газетных выданняў прадстаўлены такі этыкетны жанр, як рэлігійнае **пасланне**. Адрасантамі жанру паслання могуць быць толькі асобы, якія займаюць вышэйшыя пасады ў рэлігійнай іерархіі – епіскап/біскуп, архірэй, якія выступаюць як кіраўнікі і займаюць высокае становішча. Пасланне епіскапаў сваім вернікам і грамадзянам краіны з’яўляецца, несумненна, інстуцыянальным жанрам і ўяўляе сабой статусна-індэксальныя зносіны на ўзроўні “святар – вернікі – усе грамадзяне краіны”. На думку даследчыкаў, у змест рэлігійных пасланняў уваходзяць два кампаненты: дыктумны (звязаны з падзеямі) і модусны змест [1, с.84]. У сукупнасці дыктумны кампанент і модусны змест утвараюць складаны маўленчы жанр паслання [3, с. 85].

Сярод камунікатыўных падзей, якія патрабуюць рэалізацыі этыкетнага жанру пастырскага паслання, найперш вылучым галоўныя рэлігійныя святы – Пасху і Нараджэнне Хрыстова (ілюстрацыйны матэрыял падаецца з захаваннем арфаграфіі і пунктуацыі арыгіналу): *Пастырскае слова на Божае нараджэнне; Пажаданні Ксёндза Біскупа А. К. на свята Божага Нараджэння; Пастырскае слова на Свята Уваскрасення Пана; Слова дапаможнага біскупа на Святы Уваскрасення Пана; Пасхальное поздравление архиепископа Гродненского и Волковысского А.; Поздравление архиепископа А.с праздником Рождества Христова; Пасхальнае віншаванне архіепіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага А.; Віншаванне высокапраасвяшчэннейшага А., архіепіскапа Гродзенскага і Ваўкавыскага, з нагоды свята Нараджэння Хрыстова.*

Аналіз царкоўных пасланняў паказаў расшырэнне рэферэнцыйнай асновы жанра: пасланні могуць прысвячацца іншым рэлігійным святам, значным падзеям з жыцця царквы і грамадска значным падзеям, напр.: *Пастырскі ліст кс. біскупа А.К. на пачатак новага навучальнага года; Пастарскае пасланне арцыбіскупа Т. на нядзелю пакліканняў да святарства; Пастырскае пасланне Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі на*

ўрачыстасць Звеставанння Пана; Пастарскае пасланне Канферэнцыі Каталіцкіх Біскупаў у Беларусі з нагоды Х Нацыянальнага дня "Caritas"; Пастарскі ліст кс. біскупа А.К. на вялікі пост 2013 г.; Прывітальнае слова Патрыяршага Экзарха ўсяе Беларусі ўдзельнікам урачыстасцяў, прысвечаных Дню беларускага пісьменства; Пасхальнае пасланне архіепіскапа Гродзенскага і Ваўкавысскага А.; Приветственное слово архиепископа Гродненского и Волковысского А. участникам форума «Quo vadis?». Прыведзеныя прыклады дазваляюць гаварыць пра тое, што жанр паслання ў розных канфесійных выданнях мае свае кагнітыўныя і лінгвапрагматычныя адрозненні: у каталіцкім выданні дыктумная кампанента больш разнастайная.

Такім чынам, дыктумны бок паслання абумоўлены тэмай, а модусны кампанент зместу рэалізуецца праз віншаванне, пажаданне, настаўленне, якія супадаюць з асноўнымі інтэнцыямі паслання і ствараюць святочны настрой, эмацыйна ўздзейнічаюць на чытачоў.

У рэлігійнай газетнай практыцы дастаткова запатрабаваным з'яўляецца жанр **віншавання**. На апошняй паласе выданняў змешчаны рубрыкі "Поздравляем" ("Гродненские епархиальные ведомости") і "Ад шчырага сэрца" ("Слова жыцця"), якія ўтрымліваюць віншаванні і пажаданні, а таксама спачуванні. Т.В.Тарасенка пры даследаванні свецкіх віншаванняў выдзеліла дзве групы падзей па адносінах да адрасата: 1) падзеі, звязаныя з адрасатам непасрэдна (напр., дзень нараджэння) і 2) падзеі, звязаныя з адрасатам апасродкавана (напр., Дзень маці) [5, с. 285]. Паколькі свецкія і рэлігійныя святы не супадаюць, то не супадаюць і віншаванні, звязаныя з імі.

У першую групу ўключаюцца віншаванні з днём нараджэння. Віншаванні ў каталіцкім выданні змяшчаюцца ў кожным нумары газеты, а ў адным нумары можа быць да 20 віншаванняў: *Паважанаму Ксяндзу Пробашчу Ю.Ё. з нагоды Дня нараджэння; Вялебны Ксёндз В.Б. ! Прыміце шчырыя віншаванні з нагоды Дня нараджэння!; Паважаны Ксёндз К. М.! З нагоды 55-годдзя…* У праваслаўнай газеце "Гродненские епархиальные ведомости" ў рубрыцы "Поздравляем" жанр віншавання з'яўляецца дастаткова рэдка: *С 6 января 1999 года настоятелем храма Преображения Господня в г.п. Острино Щучинского благочиния служит протоиерей А.Т. 30 марта нашему батюшке исполнилось 48 лет со дня рождения. Мы, прихожане Преображенского храма и духовные чада о. А., хотим поздравить его с Днем Рождения!*

Сярод духавенства прынята святкаваць не столькі дні нараджэння, як імяніны, г.зн. дзень памяці знакамітага святога: *Яго Эксцэленцыі Ксяндзу Біскупу А.Дз. з нагоды надыходзячых Імянін; Паважанаму Ксяндзу Пробашчу Ч.П. з нагоды Імянін.*

Трэцяя падзя, з якой віншуюць святара – віншаванне з хіратаніяй, г.зн. прыняццем святарскага ці манаскага сану: *Яго Эксцэленцыі Ксяндзу*

Біскупу А.Я. з нагоды атрымання біскупскай сакры складаем самыя шчырыя пажаданні; Яго Эксцэленцыі Ксяндзу Біскупу А.К. з нагоды чарговай гадавіны біскупскіх пасвячэнняў; Яго Эксцэленцыі Ксяндзу Біскупу Ю.С. з нагоды гадавіны біскупскіх пасвячэнняў перасылаем сардэчныя пажаданні. Паважанаму Ксяндзу Рэдактару П.С. з нагоды 11-й гадавіны святарскіх пасвячэнняў і надыходзячых Імянін.

Другую групу складаюць віншаванні, матываваныя падзеямі, звязанымі з адрасатам апасродкавана. Дыктумны змест віншавання можа быць прадстаўлены рэлігійнымі святамі і "прафесійным" святам – Днём святара: *Яго Эксцэленцыі Ксяндзу Біскупу А.К. з нагоды Дня святара і свят Уваскрасення Пана; Дарагім Сёстрам Агнешцы, Аліцыі і Караліне з нагоды свят Божага Нараджэння; Паважанаму Ксяндзу В.С., Шаноўным Сёстрам Ганне, Агнешцы і Удаве Сабіне з нагоды свята Маці Божай Грамнічнай перасылаем.*

Этыкетны жанр **спачуванне** з'яўляецца важным для рэлігійнай камунікацыі ў газетнай перыёдыцы. Выражэнне спачування носіць афіцыйны характар, найчасцей выражаецца святарам, іх блізкім і родным, таксама кансэкраваным асобам: *Паважанаму Ксяндзу В.Х. у сувязі са смерцю любімага Бацькі перасылаем словы спачування і хрысціянскай падтрымкі, спалучаныя з малітва; Паважаны Айцец Ю.С.! Парафіяне з Карэліч і Варончы падтрымліваюць Вас малітвай у хвіліну смутку і болю, а таксама просяць Бога прыняць у сваё Валадарства Вашу любімую маму Уладзіславу; Паважанаму Ксяндзу В.Л.і яго сястры Марыі перасылаем словы жалю і спачування ў сувязі з адыходам да дому Айца любімай Мамы.* Жанр спачування ў праваслаўным рэлігійным выданні намі не выяўлены.

Праведзены агналіз сведчыць, што ў канфесійных выданнях Гродзеншчыны этыкетныя маўленчыя жанры пасланне, віншаванне і спачуванне прадстаўлены нераўназначна. У каталіцкім выданні "Слова жыцця" палітра этыкетных жанраў больш разнастайная, колькасна шматлікая. Маўленчыя этыкетныя жанры ў газеце павінны ўстанаўляць кантакты, ствараць цеснае ўзаемадзеянне з чытачом. Газета "Слова жыцця" паспяхова вырашае гэтую задачу, захоўваючы ва ўсіх сваіх нумарах жанравую разнастайнасць і падтрымліваючы цікавасць чытачоў да перыядычнага выдання.

Літаратура

1. Орехова, Д. В. Церковно-религиозный и политический типы дискурса сквозь призму диалогичности (на материале жанра послания): дис. канд. филол. наук: 10.02.01 / Д.В. Орехова; Рос. ун-т Дружбы народов. – М., 2015. – 251 с.

2. Седов, К.Ф. Жанр и коммуникативная компетенция / К.Ф. Седов // Хорошая речь. – Саратов: Изд-во Сарат. ун-та, 2001. – С. 107 – 118.

3. Со, Ын Ён. Речевой жанр современного церковно-религиозного послания: дис. … канд. филол. наук : 10.02.01/ Ын Ён Со. – М., 2000. – 188 с.

4. Тарасенко, Т.В. Этикетные жанры русской речи: благодарность, извинение, поздравление, соболезнование: автореф. дис. … канд. филол. наук: 10.02.01 / Т.В Тарасенко; Красноярский гос. ун-т. – Красноярск, 1999. – 21 с.
5. Тарасенко, Т.В. Этикетные речевые жанры: опыт описания (на примере описания жанра поздравления) / Т.В Тарасенко // Жанры речи: сб. науч. ст. – Саратов: ГосУНЦ «Колледж», 2002. – Вып. 3. – С. 282 – 289.
6. Худякова, Е.С. Социальная обусловленность системы жанров жанровой компетенции в церковно-религиозной сфере (на примере текстов Русской Православной Церкви и Украинской Православной Церкви Московского Патриархата): автореф. дис. канд. филол. наук: 10.02.01 / Е.С. Худякова; Пермский гос. ун-т. – Пермь, 2009. – 19 с.
7. Шмелева, Т.В. Модель речевого жанра / Т.В. Шмелева // Антология речевых жанров: повседневная коммуникация. – М.: Лабиринт, 2007. – С.81 – 90.

А.М. Пісарэнка (Мінск)

СТРУКТУРНА-ГРАМАТЫЧНАЯ І ЭКСПРЭСІЎНАЯ ТРАНСФАРМАЦЫЯ ЎСТОЙЛІВЫХ ВЫРАЗАЎ У КАНТЭКСЦЕ МАСТАЦКАГА МАЎЛЕННЯ

Адным з самых экспрэсіўных сродкаў мастацкага маўлення любога падстылю і жанру з’яўляюцца ўстойлівыя выразы. Пісьменнікі, фалькларысты, мовазнаўцы слушна называюць іх “самацветамі роднай мовы”, залацінкамі народнай мудрасці”: такія выразы “ажыўляюць” маўленне, робяць яго, з аднаго боку, сціслым, дакладным, а з другога – вобразным і выразным (як і іншыя ўстойлівыя выразы, яны не ствараюцца ў працэсе маўлення, кожны раз ужываюцца ў падобных / аднолькавых сітуацыях з мэтай не толькі назваць з’яву, прадмет, якасць, дзеянне ці інш., а яшчэ і ахарактарызаваць іх, выказаць ацэнку аўтара). Аднак, у параўнанні з іншымі ўстойлівымі выразамі, сфера выкарыстання фразеалагізмаў найчасцей – сацыяльна-бытавая (гутарковы стыль) і сацыяльна-эстэтычная (мастацкі стыль). Што да мастацкага маўлення, то і тут не кожнаму персанажу аўтар “можа дазволіць” іх ужыванне, асабліва гэта тычыцца тых фразем, якія маюць зніжаную эмацыянальна-экспрэсіўную афарбоўку. Аўтар павінен ведаць не толькі значэнне выразаў, але і адчуваць тую маўленчую сітуацыю, у якой яны могуць быць выкарыстаны. Так, для прыкладу можна ўзяць твор Георгія Марчука “Прыгоды Несцеркі”, дзе галоўныя персанажы Аксён-каваль і Патыліца-шляхціц. Сродкамі стылізацыі іх маўлення аўтар абірае ўстойлівыя выразы з размоўнай ці прастамоўнай афарбоўкай. Але варта памятаць, што фразема ў кантэксце мастацкага ці іншага маўлення – адзінка поліфункцыянальная: у аналізуемым тэксце мэта іх ужывання заключаецца не толькі ў тым, каб праз індывідуальнасць маўлення паказаць спецыфіку характару персанажа. Акрамя ўсяго, аўтар праз “віртуознае” ўжыванне ўстойлівых народных выразаў надае твору пэўную маўленчую танальнасць, стварае гумарыстычны, іранічны каларыт, не пакідаючы чытача раўнадушным: А к с ё н: *І не пытай, братка,* ***была і***

кабыла лыса, і жарабё рабое, з'еў воўк абое**; Што ж часам і **кляча далёка скача**; Госці дарагія, **з аднаго вала дзвюх шкур не дзяруць; П а т ы л і ца. ***З такой жыткі працягнеш лыткі**; І наша шляхта **не лыкам шыта**. Багацця вакол, Матка Боская, **сто гадоў курам кляваці**.* Як відаць, хоць *шляхта не лыкам шыта*, але маўленне чалавека само за сябе гаворыць: што пан, што каваль – не шляхетна размаўляюць абодва. Іншыя персанажы – дачка каваля Анця і сам Несцерка – таксама без фразем не абыходзяцца: А н ц я (плюе на партрэт пана і працірае яго): ***Каб табе горка стала, каб табе памяць адабрала, каб ты смалы набраўся, каб ты кашулі сваёй баяўся, каб ты да вечара не дажыў; У роднай хаце хоць галодны, але ж свабодны***; Н е с ц е р к а. *Яснавяльможны пане, і хацеў бы вам сказаць, **як з крыжа знялі, як маслічкам па душы, як за галіну ўчапіўся, як з дзеўкаю ажаніўся**, ды не магу, бо **як з ланцуга сарваўся, як камень на шыю**; Хадзем, Анця, **адна галавешка і ў печы не гарыць, а дзве – і ў полі не тухнуць; Воран ворану вока не выклюе; Дай бог нашаму цяляці ваўка з'есці**.*

Як відаць нават з гэтых прыкладаў, устойлівыя выразы склалі аснову маўленчай палітры персанажаў: праз іх ампліфікацыю з дакладнай выразнасцю перадаюцца думкі і пачуцці дзейных асоб, падкрэсліваецца іх сацыяльны статус (такі ён і шляхціц, калі яго прозвішча Патыліца, а маўленне насычана не "шляхетнымі", а размоўнымі фраземамі).

Менавіта ў мове мастацкага і гутарковага стыляў фразеалагізмы, як вядома, ужываюцца з дзвюма функцыямі – узуальнай і аказіянальнай. Сутнасць першай у тым, што агульнавядомыя выразы без змен у структуры і з традыцыйным зместам выступаюць у якасці сродку стылізацыі маўлення персанажа (названы факт быў праілюстраваны вышэй), магчыма, з'яўляюцца кампанентам маўлення персанажа / лірычнага героя ці самога аўтара: *Мне б зараз выць, **валасы на сабе рваць**, а я куру яго папяроску, і **хоць бы што**…; Але дывізію вашу расфарміравалі ўжо… **Канцоў не знойдзеш**; Думаў як-небудзь **ціхай сапай** да канца вайны пратупаць* (А. Дудараў); ***Няма** ўзгадненням **канца і краю**, / плывуць паперы то ўверх, то ўніз… / А нараджаюцца і паміраюць / Людзі без рэзалюцый і віз* (С. Законнікаў); *Да Нарачанкі-вёскі **рукой падаць*** (І. Пташнікаў); *Коцяцца пад лёгкім павевам ветрыка зялёныя хвалі, коцяцца і коцяцца, і **няма ім ні канца, ні краю*** (Р. Ігнаценка).

Аказіянальная функцыя ўстойлівых выразаў рэалізуецца, як вядома, праз структурныя змяненні ці праз кантэкстуальныя сэнсавыя прырашчэнні, што ўплывае на іх эстэтычную вартасць, узмацняе стылістычны эфект, які яны надаюць радкам. Ацаніць жа эстэтычную вартасць трансфармаваных выразаў магчыма толькі ў тым выпадку, калі слухачу / чытачу вядома першааснова / першавыраз, які стаў аб'ектам маўленчай творчасці пісьменніка. Выразы з аказіянальнай функцыяй заўсёды больш яскрава, больш эмацыйна перадаюць аўтарскі настрой.

Аказіянальная функцыя рэалізуецца праз асацыяцыі пісьменніка адносна зместу фраземы, сітуацыі, у якой выраз выкарыстоўваецца, а таксама адносна рыс характару таго ці іншага персанажа. Трансфармацыя фразем мастацкага маўлення можа адбывацца праз:

1) пашырэнне кампанентнага складу выраза – увядзенне новага (аднаго ці больш) кампанентаў у яго структуру: *Зноў тэлефонныя званкі сквяруцца поўначчу затрачанай. / -- Ты жыў яшчэ, сякі-такі? / Ну,* ***да*** **прыемнага** ***пабачання!..*** (М. Танк); *Пад імі дол даўно затрэсла, / Ды ўсе ні з месца, як адзін. /* ***Зубамі*** **штучнымі** *за крэсла /* ***Чапляецца*** *пенсійны чын* (С. Законнікаў); ***Хай*** *ім будзе* ***пухам зямля*** **чужая***, а вам дай Бог выжыць; Я не праліў* ***ні кроплі*** **нявіннай** ***крыві*** (А. Дудараў); 2) ужыванне двух устойлівых выразаў у невялікім кантэксце, у выніку чаго ўтвараецца стылістычная фігура – каламбур: *Ці гэта я* ***ўпёрся рогам****, / Ці* ***рогі настаўляеш мне****?* (А. Зэкаў); 3) стварэнне незвычайнага кантэксту, у выніку чаго агульнавядомы фразеалагізм набывае абноўленае гучанне, чым падкрэсліваецца індывідуальнасць аўтарскіх пачуццяў і ацэнак: *Сам ты пяць разоў быў паранены і два разы кантужаны і* ***лёг касцьмі*** **на чужой зямлі** *перад канцом вайны…* (А. Дудараў); – *Ты падарыла* ***добры дзень****, / Дык* **падары** ***і*** **ноч** (М. Танк); *Мы з табой /* ***з'елі пуд солі****, / але ў мяне / і сёння / такое адчуванне, /* **што гэта быў цукар***; Усё жыццё / я* **стараўся / азарыць цябе святлом***. / Аказалася ж, што* ***зацьміў свет*** (А. Зэкаў); *За народную капейку я гатоў не толькі* **валасы палажыць***, але і* ***галаву… Яго галаву****, канечне!..* (А. Макаёнак); – *Тут вы, таварыш Пыльчанка,* ***пацэлілі****, як кажуць,* ***як яблычак.*** **Але не ў мой***; Дунец пажартаваў: "****Па душы нашы****". Таму Пыльчанка адказаў сакратару з працягам жарту:* – **Душы нашы цяжкія. Грахоў у нас многа** (І. Шамякін); 4) замену кампанента ці змену яго формы ўстойлівага выразу, што таксама надае выказванню эфект навізны, незвычайнасці: *Кошка ледзь* ***цягае*** **лапы***. / Як жа мышцы кошку сцапаць?; І пшаніцу, і ячмень / Аглядае дбайна чмель, /* ***Паспытаць на свой*** **"зубок"** */ хоча кожны каласок* (А. Зэкаў); *Заходзіць сонца. Бусел вяртаецца з купінай у дзюбе.* ***Век жыві – век*** **будуйся** (Я. Брыль); *Пяць кіламетраў* ***з гаўкам*** (Р. Барадулін); К а р а в а й. *…Ён яшчэ… сёння проста* ***подзвіг*** **адмачыў** (А. Макаёнак); – *Вам не здаецца, прафесар, што вы ператвараеце нас у* ***паддоследных трусоў****? – А ты хочаш быць толькі героем? Не, брат,* **пабудзь** *і* **трусікам***. Героем ты ўжо быў (І.* Шамякін); 5) выкарыстанне вобразнай асновы фразеалагізма, якое таксама разлічана на тое, што чытач ведае значэнне першавыразу: ***Маўчанне*** */ Ніколі не было / І* ***не будзе золатам****. / Яно – або / У шмат разоў даражэйшае. / Або – нічога не вартае* (М. Танк) – у выніку аўтарскага жыццёвага вопыту, разваг над каштоўнасцямі чалавека адбылася трансфармацыя агульнавядомага выраза: *Маўчанне – золата; Ты мой ясны хлеб і каханы май, / Песня продкаў, нашчадкаў палі, / Без цябе, не з табой – не патрэбен мне рай, /* **На душы, ў небясі. На зямлі**

(У. Караткевіч) – трансфармуецца біблейскі выраз *“Да святится имя Твое, да приидет Царствие Твое, да будет воля Твоя, яко на небеси и на земли”*; *Васілёк, ідзі сюды, я з цябе* ***вяровачку буду віць*** (А. Макаёнак) – зменены выраз: *вяроўкі віць*; *А мой сын мяккі, добры. Ён* ***пападзе пад каблук****. Ды яшчэ* ***пад шпільку*** (А. Макаёнак) – зменены выраз *трапіць пад каблук*.

Калі разглядаць фразеалогію ў шырокім значэнні слова, то варта яшчэ сказаць і пра такія ўстойлівыя выразы, як прыказкі і афарызмы. Прычым агульнавядомыя выразы з трапным зместам таксама могуць выкарыстоўвацца ў спецыфічным аўтарскім кантэксце, што трансфармуе, часам удакладняе іх змест ці, найчасцей, той стылістычны эфект, які аўтары хацелі атрымаць у адпаведнай маўленчай сітуацыі: ***Мой родны кут, / Як ты мне мілы, / Ды*** **назву вымавіць тваю / Не маю сілы** (з газеты); *Як па зорках, / па расе / Твой апошні шлях праляжа. /* ***Памірай, а жыта сей. /*** **Рунь пра сейбіта раскажа** (А. Сыс).

Шматлікія выразы мастацкага маўлення яшчэ чакаюць свайго прызнання: у выніку частага выкарыстання яны могуць набыць “крылатасць”: выразы, вартыя цытавання, заўсёды поўныя глыбокага сэнсу, які навідавоку, і тады іх можна разумець літаральна, або яны маюць глыбокі падтэкст (у іх, як і ў прыказках, можа гаварыцца пра адно, а падразумяваецца зусім іншае): *Калі дабро пасею на загоне. / Закаласяцца і дабром палі* (Л. Геніюш); *Не дай Бог вам дажыць да такога, / Калі сябра ваш ворагам стане* (Я. Сіпакоў); *Кожны носіць сваё неба з сабою* (У. Караткевіч); *Пустацвет не саспеліць крамяных пладоў* (С. Законнікаў); *Каб грыбы былі смачныя, дык ваўкі не бегалі б з лесу авечак хапаць; Улічы, старшыня, што ўзнагарода ўзвышае не столькі таго, хто яе атрымлівае, колькі таго, хто яе дае* (А. Макаёнак); *Ніякія веды не ратуюць ад душэўных пакут, калі хварэе* ***тваё*** *дзіця* (І. Шамякін).

Аднак для таго, каб выраз набыў “крылатасць”, грамадства павінна мець адпаведны інтэлектуальны ўзровень, быць начытаным хаця праз інтэрнэт-рэсурсы; акрамя таго, выраз можа быць запатрабаваны грамадствам, калі “сугучны” часу, сітуацыі, душэўнаму стану носьбітаў мовы: *Не ўсякая птушка ўмее сяліцца і жыць высока* (Н. Мацяш); *Рупячыся ў кляцьбе, / помні і пра сябе* (Р. Барадулін); *Не ўсё, што расце, расце для яды, і ўсё, што расце, расце не адною ядою* (А. Разанаў); *Аднак і сярод людзей, як і сярод сабак, часам ёсць такія тыпы: радаслоўная – цудоўная, а морда брыдкая* (Я. Сіпакоў).

Такім чынам, устойлівыя выразы як адзін з прадуктыўных сродкаў мастацкага маўлення ўзмацняюць яго эстэтычную вартасць. Асаблівай выразнасцю валодаюць выразы, апрацаваныя “майстрамі слова.”

Т.Р. Рамза (Мінск)

АРЫЕНТАВАНАЕ НА ЛІТАРАТУРНУЮ НОРМУ ГУТАРКОВАЕ МАЎЛЕННЕ: ТЭРМІН І ЯГО СУТНАСЦЬ

Спецыфіка моўнай сітуацыі ў Беларусі – сітуацыі камунікатыўна незбалансаванага двухмоўя – актуалізуе патрэбу ў даследаванні вусных формаў функцыянавання сучаснай беларускай мовы ў гарадскім моўным асяроддзі. Вывучэнне беларускага штодзённага маўлення гараджан дапаможа больш дэталёва і аб'ектыўна вызначыцца (а) са стратыфікацыяй гарадскіх вусных ідыёмаў, (б) з сутнасцю тэрміна *беларускае гутарковае маўленне,* (в) са статусам такога маўлення ў адносінах да іншых вусных формаў існавання беларускай мовы. Вядома, што тэрмін *гутарковае маўленне* (ГМ) у беларускім навуковым дыскурсе мае два фактычна процілеглыя значэнні: 1) вуснае неафіцыйнае маўленне, у тым ліку і дыялектнае; 2) неафіцыйнае штодзённае маўленне носьбітаў беларускай літаратурнай мовы.

Штодзённае неафіцыйнае маўленне носьбітаў беларускай літаратурнай мовы не было яшчэ аб'ектам даследавання ў беларускім і славянскім мовазнаўстве, у параўнанні, з аднаго боку, з дэталёвым апісаннем нормаў вуснай афіцыйнай кадыфікавана-літаратурнай беларускай мовы; а з другога боку, з дастаткова поўным апісаннем дыялектнай беларускай мовы, а таксама грунтоўнымі захадамі ў аналізе гарадскога змешанага руска-беларускага маўлення. І дыялектнае, і змешанае маўленне з'яўляюцца вуснымі ідыёмамі, якія адносяцца да субстандарту; па-за ўвагаю навукоўцаў застаецца узус штодзённага маўлення інтэлігенцыі, які ў іншых навуковых дыскурсах разглядаецца ў межах літаратурнага стандарту.

Надзённасць даследавання неафіцыйнага гарадскога ГМ зыходзіць і з нераспрацаванасці ў беларускім мовазначым дыскурсе паняцця *гутарковы узус* адносна прынятых тэрмінаў і паняццяў *кадыфікаваная норма* і *дыялектны узус.* Фіксацыя ж узуальных заканамернасцей маўлення інтэлігенцыі важная з некалькіх прычын: (1) для пашырэння і паглыблення ведаў пра спецыфіку самога гэтага ідыёму, (2) для разумення працэсаў, якія адбываюцца ў руска-беларускім гарадскім (у нашым выпадку мінскім) моўным кантынууме, (3) для авалодання рознымі рэгістрамі беларускай мовы як самімі беларусамі, так і замежнікамі. Паколькі, як адзначаюць спецыялісты, носьбітамі літаратурнай мовы можна называць толькі тых людзей, хто валодае як кніжнай моваю, так і гутарковым маўленнем: «Валоданне толькі адной разнавіднасцю і не валоданне другой успрымаецца як анамалія, прычым невалоданне гутарковым маўленнем асабліва кідаецца ў вочы» [1, с. 42].

Для праведзенага даследавання былі спецыяльна выбраны інфарманты-філолагі з вышэйшай адукацыяй, якія працуюць у сферы

філалогіі (выключэннем быў толькі адзін чалавек, які пасля ВНУ і працы па спецыяльнасці атрымаў дадатковую адукацыю і цяпер працуе як медработнік, але ад беларускай мовы ў штодзённым жыцці не адмовіўся). У спантанных дыялогах і палілогах у розных сітуацыях штодзённага камунікавання прынялі ўдзел 20 чалавек ва ўзросце 30-45 гадоў. Тэмы гутарак загадзя не агаворваліся і не планаваліся, а ўзнікалі ў залежнасці ад сітуацыі. Інфарманты (выкладчыкі ВНУ і навуковыя супрацоўнікі, у тым ліку і з вучонымі ступенямі) выбіраліся з некалькіх прычын:

1) беларуская мова для іх – мова звычайнага (звыклага) штодзённага камунікавання ў сямейных, сяброўскіх і неафіцыйных працоўных стасунках;

2) гэта людзі, якія добра ведаюць кадыфікаваныя нормы і беларускай, і рускай моў, а таксама дыялектны узус, а значыць, можна быць пэўным, што інфармант добра арыентуецца ў стылістычных паняццях: кадыфікаванае / некадыфікаванае, літаратурнае / дыялектнае; афіцыйнае / размоўнае і пад. Гэты крытэрый лічу вельмі істотным, бо незалежна ад адукацыі і прафесіі стыхія спантаннага неафіцыйнага маўлення ўраўноўвае фактычна ўсіх моўцаў, і перадусім у вымаўленні, паколькі яно найбольш аўтаматызаванае.

3) Філолагі (інтэлігенцыя) як носьбіты беларускай літаратурнай мовы з'яўляюцца «лідарамі» (у разуменні замежных даследчыкаў О. Есперсена, Э. Хаугена), г.зн. «яны разглядаюцца як годныя пераймання, і таму яны маюць прэстыж» [3, с. 462]; (у еўрапейскай традыцыі, як вядома, лідары – гэта эліта, якая мае пячатку багацця, ці ўлады, ці паходжання, ці адукацыі; або ўсяго адначасова).

Названыя прычыны, на маю думку, дазваляюць сцвярджаць, што штодзённае спантаннае маўленне такіх інфармантаў рэпрэзентатыўнае для абагульняльных высноў.

Штодзённае непадрыхтаванае гутарковае маўленне носьбітаў беларускай літаратурнай мовы – інтэлігенцыі – з'яўляецца неад'емным складнікам кантынууму вусных ідыёмаў горада Мінска. Незалежна ад колькасці такіх носьбітаў – гэта маўленне *лідараў*, якое служыць арыенцірам для іншых, хто хацеў бы ці стараецца гаварыць у штодзённым жыцці па-беларуску. Таму такое маўленне правамерна разглядаць і тэрміналагізаваць як *гутарковы стандарт* (узор). Крытэрый для такога тэрміна пазамоўны – сацыяльны статус носьбітаў: у пераважнай ступені гэта высокаадукаваная і нацыянальна арыентаваная інтэлігенцыя. Злакалізаванасць гутарковага маўлення найперш у інтэлігенцкай страце надае гэтаму тыпу штодзённага камунікавання самы высокі прэстыж сярод гарадскога і сельскага насельніцтва, а з другога боку, выразна проціпастаўляе яго агульнараспаўсюджаным тыпам вуснага гарадскога камунікавання, найперш нацыялекту і руска-беларускаму змешанаму маўленню.

З пункту гледжання ўласна лінгвістычнага, штодзённае маўленне інтэлігенцыі мэтазгодна тэрміналагізаваць і як *арыентаванае на літаратурную мову гутарковае маўленне*. «Кампрамісны» дадатак *арыентаванае на літаратурную мову* адлюстроўвае рэальны стан такога маўлення і падаецца найбольш прыдатным, калі ўлічыць навуковыя дыскусіі ў іншых мовазнаўчых дыскурсах адносна сутнасці тэрмінаў для літаратурных разнавіднасцей кадыфікаваных моў: *русская разговорная речь, hovorová čeština, hovorová slovenčina*. Маецца на ўвазе, наколькі літаратурнае такое літаратурнае маўленне, таму штораз даследчыкам даводзілася гаварыць пра пэўныя выключэнні (гл., напр. у А.А. Земскай, Д.М. Шмялёва, Л.П. Крысіна, В.Б. Сірацінай, В.А. Лапцевай і інш.). Адсюль і «новыя» стратыфікацыі нацыянальных моў, якія прапануюцца ў польскім, расійскім, чэшскім, славацкім і іншых навуковых дыскурсах.

У сваіх вызначальных фанетычных рысах *гутарковы стандарт* дублюе прадпісальныя нормы, якія адзначаныя беларускімі навукоўцамі ў дачыненні да вуснай афіцыйнай літаратурна-кадыфікаванай мовы: аканне і яканне, дзеканне і цеканне, зеканне і секанне, *г* фрыкатыўны, *ў* кароткі, цвёрдаэрасць, зацвярдзелыя зычныя і інш. Як сведчыць эмпірычны матэрыял, інфарманты і ў штодзённым неафіцыйным маўленні пераважна захоўваюць гэтыя нормы. Аднак узус гутарковага стандарту адрозніваецца большая варыятыўнасць некаторых рыс (нагадаем, уласцівая і кадыфікаванай беларускай мове як адносна новай літаратурнай мове), і пераемнасць заканамернасцей (перадусім фанетычных і сінтаксічных) дыялектнай беларускай мовы, і, урэшце, ужо ўсталяваны ўласны узус.

Выявілася, што найбольшыя транфармацыі, абумоўленыя і артыкуляцыйнымі характарыстыкамі, і пазіцыйным становішчам (пасля мяккіх зычных) зазнае галосны [а], у выніку чаго ўзуальнай заканамернасцю гутарковай арфаэпіі нароўні з моцным яканнем становіцца іканне. Яно ўласцівае найперш частотным і ўжо фактычна лексікалізаваным адзінкам – т.зв. «фанетычным фразеалагізмам» (Л.Ц. Выгонная): *не, няма, няхай, цяпер, цябе, мяне* і інш. Іканне ў штодзённым маўленні інфармантаў-філолагаў сведчыць, з аднаго боку, пра ўстойлівасць і пераемнасць фанетычных заканамернасцей вуснай беларускай мовы, а з другога боку, пра ўсталяванне стабільнага гутарковага узусу. У эмпірычным матэрыяле працэнт ікання ў падлеглых аналізу словаформах складае каля 30%, выключэнне складае адмоўная часціца *не*, якая ў першым пераднаціскным складзе вымаўляецца як *ні* (больш за 50%).

Як паказалі вынікі праведзенага даследавання [1], заканамернасцямі гутарковага маўлення з’яўляюцца і такія мадыфікацыі зычных гукаў на стыку слоў і марфем, якія або спарадычныя, або немагчымыя ў вуснай літаратурна-кадыфікаванай беларускай мове, сярод іх:

• паралельнае ўжыванне нароўні з выбухным [ґ] фрыкатыўнага [ɣ] у даўніх запазычаннях тыпу *мазгі, гвалт, агрэст, ганак*, што сведчыць пра абсалютную адаптацыю гэтых лексем у сістэме беларускай мовы;

• варыятыўнасць вымаўлення слова *гэта* без пачатковага гука, што мае трывалы дыялектны грунт, напр.: *зь не́йкай там нні ве́даю што* ***э́та****/ але́* ***э́та*** *ні ску́ра//;* ***э́та*** *ш пра́ца зь людзьмі́ /* ***гэ́та*** *ш не скла́дваецца за го́т//*;

• частотнасць выбухнога [ґ], што наўпрост звязана з частотнасцю выкарыстання пэўных слоў і яго пазіцыяй як парнага па звонкасці глухому гуку [*к*] на стыку службовых ці службовага і знамянальнага слоў (*я́*[ґ]*бы, та́*[ґ]*бы, ды*[ґ] *гэ́та*); (Такое вымаўленне – норма і для кадыфікаванай мовы, але пра пашыранасць самога гука – выбухнога [ґ] – можна гаварыць менавіта ў дачыненні да ГМ, бо названыя вышэй спалучэнні з часціцамі і ім падобныя фанетычныя словы ўласцівыя найперш неафіцыйнаму маўленню, а не афіцыйна-кніжнай мове.);

• вымаўленне [ў] кароткага пасля зычных і паўзы: 15% выкарыстання прыназоўніка *ў* (гэта больш за 1000 ужыванняў) прыпадае на не характэрныя для літаратурна-кадыфікаванай мовы пазіцыі: 12% складае яго ўжыванне пасля паўзы і 3% – пасля зычных, напр. напр.: *аа... дык пачка́йце/* ***ў*** *ва́с* ***ў*** *адны́м флако́ не ўсё ?; гэ́та ста́ нцыя гудага́ й і ат ста́ нцыі шэсь кіламе́траў прае́хаць* ***ўбок****/ там бу́ дзе ээ ... сяло гудага́ й і вот там гэ́та ўсё знахо́дзіцца//; у чы́м* ***ўве́сь*** *пры́нцып?*;

• ужыванне мадыфікаваных формаў слова *ёсць* на стыку слоў, абумоўленае і фанетычнымі характарыстыкамі пачатковага зычнага наступнага слова, і лагічным націскам, і тэмпам маўлення, напр. *сао́рак пяць квадра́таў/ ці со́рак шэсць* [шэсць] *дзе́-та двух́пакаёўка// ну але́ ж двух* ***ёзь двух!****; і ў ціэ* ***ёсьсёньня*** *пары? тут/ на факульта́ це?; нне/ там* ***ёжжаш*** [ёсць жа ж] *таварыства карэ́йцаў белару́скіх/ і та́м гэ́тыя ку́рсы//*;

• больш частае выкарыстанне рэдукаваных формаў лічэбнікаў 50, 60, 70, 80, што выклікана меншай стараннасцю моўцы і артыкуляцыйнай лёгкасцю вымаўлення саміх формаў (напр., *пядзьдзяся́т* вымавіць не так лёгка, як *піісят*), напр.: *ну/ у ва́ш жа ш і ро́ст не ме́тр* ***шээся́т****//; і ўсё ш такі* ***се́мсят*** *ты́сяч ро́зьніцы//; яна́ ні мяня́ецца/ сто* ***пііся́т*** *кілава́т//*.

Літаратура

1. Крысин, Л.П. Социолингвистические аспекты изучения современного русского языка / Л.П. Крысин; отв. ред. Ю.Д. Дешериев. – М.: Наука, 1989. – 186 с.

2. Рамза, Т.Р. Беларускае гутарковае маўленне ў славянскім кантэксце / Т.Р. Рамза. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2014. – 256 с.

3. Хауген, Э. Лингвистика и языковое планирование / Э. Хауген // Новое в лингвистике. – М.: Прогресс, 1975. – Вып. VII : Социолингвистика. – С. 441 – 472.

Л.В. Рычкова (Гродна)

ЛЕКСІКА РЭЛІГІЙНАЙ ТЭМАТЫКІ Ў БЕЛАРУСКАМОЎНЫХ ТЭКСТАХ СМІ ГРОДЗЕНШЧЫНЫ І ЯЕ ЛЕКСІКАГРАФІЧНАЕ АДЛЮСТРАВАННЕ

У межах міжнароднага беларуска-расійскага праекта “Сацыяльна значымая лексіка тэрміналагічнага і прафесійнага характару ў рускай і беларускай мовах”, які рэалізуецца Інстытутам рускай мовы імя В.У. Вінаградава РАН з расійскага боку, а з беларускага боку – кафедрай агульнага і славянскага мовазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы пры падтрымцы супрацоўнікаў Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі, беларускімі навукоўцамі распрацоўваецца слоўнік сацыяльна значымай тэрміналогіі беларускай мовы, прызначаны для карыстальнікаў-неспецыялістаў. Сацыяльна значымай пры гэтым лічыцца, перш за ўсё, тая спецыяльная лексіка, якая адлюстроўвае сацыяльна-культурна абумоўленыя каштоўнасці менавіта беларускага шматэтнічнага і поліканфесійнага соцыуму. Гэта азначае, што сацыяпрагматычны аспект з’яўляецца вызначальным пры адборы спецыяльных лексем для будучага слоўніка.

Рэлігійныя каштоўнасці, традыцыйна ўласцівыя беларускаму менталітэту і духоўнасці беларусаў (дастаткова звярнуцца да ідыяматычнага фонду мовы, каб у гэтым упэўніцца), наўмысна жорстка выкрэсліваліся з шэрагу каштоўнасцей, што падтрымліваліся савецкай дзяржавай. Гэта відаць не толькі з атэістычнай прапаганды і кадравай палітыкі ў дачыненні да вернікаў, але і са зместу агульнафілалагічных і спецыяльных тэрміналагічных тлумачальных слоўнікаў, што выдаваліся ў тыя часы і якімі і сёння па-ранейшаму карыстаюцца грамадзяне незалежнай Рэспублікі Беларусь, у якой, нарэшце, рэлігійныя каштоўнасці занялі адпаведнае сучаснай дэмакратычнай еўрапейскай краіне месца і свабода веравызнання абараняецца законам. Такім чынам, лексіка рэлігійнай тэматыкі, пэўна, павінна знайсці сваё месца ў слоўніку сацыяльна значымай беларускай спецыяльнай лексікі.

У падрыхтоўцы любога лексікаграфічнага выдання (і электронныя выданні тут не складаюць выключэння) найважнейшую ролю адыгрывае этап фарміравання ўласна слоўніка / лексікона, гэта значыць спісу тых адзінак, якія падлягаюць апісанню. Менавіта ад асаблівасцей гэтых адзінак у значнай ступені залежыць як мікраструктура, так і макраструктура будучага слоўніка. Пры гэтым “рашучым момантам для адбору тэрмінаў … павінна быць не важнасць тэрміна ў сістэме паняццяў данай навукі або галіны тэхнікі, а яго грамадская роля” [4, с. 178] (тут і далей пераклад наш. – Л.Р.).

У адрозненне ад тых тлумачальных слоўнікаў беларускай мовы, якія складаліся ў савецкі час на ўзор рускамоўных слоўнікаў, што, на думку некаторых спецыялістаў, мела вынікам фармальнае капіраванне “ключавых характарыстык лепшых рускіх слоўнікаў у працэсе складання слоўнікаў беларускай мовы” [9, с. 39] (але было зусім магчымым з пункту гледжання фарміравання спісу адзінак для лексікаграфіравання, бо слоўнікі павінны былі трансліраваць тоесную сістэму каштоўнасцей савецкай дзяржавы), пры складанні слоўніка беларускай сацыяльна значымай лексікі нельга абапірацца на спіс лексічных адзінак расійскага боку, бо сістэмы каштоўнасцей Беларусі і Расіі з’яўляюцца блізкімі, але не тоеснымі. Акрамя агульных каштоўнасцей, ёсць таксама нацыянальныя, існаванне і падтрымка якіх абумоўлены канкрэтна-гістарычнымі і сацыяльна-культурнымі фактарамі, што фарміруюць дзяржаўны ландшафт Беларусі як маладой незалежнай дзяржавы з вялікай гісторыяй.

Асаблівасцю лексікі рэлігійнай тэматыкі з’яўляецца яе актыўнае ўжыванне ў сродках масавай інфармацыі, у грамадска-палітычных дакументах і ў мастацкай літаратуры. Разам з іншай спецыяльнай лексікай яна ў той ці іншай ступені ўключаецца ў агульнафілалагічныя (лінгвістычныя) слоўнікі развітых нацыянальных моў, у тым ліку ў тлумачальныя слоўнікі, якія адрасаваны “шырокаму колу карыстальнікаў” [1, с. 55]. Тым не менш, пакуль не вызначаны статус і характар спецыяльнай лексікі, што падлягае ўключэнню ў тлумачальныя слоўнікі, як і “правілы” яе лексікаграфічнага апісання.

Для тлумачальных слоўнікаў, адрасаваных “шырокаму колу карыстальнікаў”, важным фактарам, што спрыяе правільнаму разуменню лексемы, з’яўляецца наяўнасць аўтэнтычнага ілюстрацыйнага моўнага матэрыялу, які адлюстроўвае функцыянаванне той адзінкі, што тлумачыцца, непасрэдна ў тэксце. Такім моўным матэрыялам для лексікі рэлігійнай тэматыкі ва ўмовах сучаснай Беларусі служаць тэксты СМІ. Аб’ектыўнасць адбору лексічных адзінак можа быць забяспечана выкарыстаннем корпусных тэхналогій. Для Гродзеншчыны гэта стала магчымым, таму што ў межах супрацоўніцтва з аддзелам карпусной лінгвістыкі і лінгвістычнай паэтыкі Інстытута рускай мовы імя В.У. Вінаградава РАН (непасрэднымі стваральнікамі Нацыянальнага корпуса рускай мовы) на працягу 2013 – 2015 гг. вучонымі кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы быў створаны ілюстрацыйны лінгвістычны корпус на матэрыяле рэгіянальных СМІ аб’ёмам каля 2111000 словаўжыванняў (далей – Корпус). Корпус уяўляе сабой арыгінальны электронны моўны рэсурс, у якім цалкам захавалася адпаведнасць зыходнаму моўнаму матэрыялу, таму яго можна лічыць аўтэнтычным у дачыненні да узусу ўзаемадзеяння моў у гродзенскіх СМІ. Як адзначала вядомая расійская даследчыца Г.П. Нешчыменка, узус СМІ “наглядна адлюстроўвае рух моўнай матэрыі, а таксама новыя тэндэнцыі ў развіцці моўнай сітуацыі, дакладна рэагуе на

змяненні сацыяльных і генерацыйных прапорцый у грамадстве, на прагрэс у навукова-тэхнічным аснашчэнні інфармацыйна-камунікатыўных кантактаў як ва ўнутрыэтнічнай, так і ў міжэтнічнай прасторы" [3, с. 98].

Калі не лічыць нешматлікіх украпленняў польскай, англійскай, лацінскай і некаторых іншых моў (больш падрабязна гл. у [5]), Корпус можна лічыць двухмоўным (руска-беларускім) электронным паўнатэкставым рэсурсам, беларускамоўная частка якога не перавышае 800000 словаўжыванняў. Асаблівасцю Корпуса з'яўляецца яго змешаны характар: у рускамоўных тэкстах могуць назірацца беларускамоўныя ўкрапленні, а ў беларускамоўных тэкстах – рускамоўныя. Пры гэтым адлюстроўваюцца асаблівасці маўлення, якія "характэрны для маўлення менавіта адукаваных людзей, якія валодаюць нормамі" [2, с. 189], факты "трасянкі" сустракаюцца даволі рэдка. Апошняя, тым не менш, назіраецца ў такіх выпадках, "калі элементы абедзвюх моў дасягаюць такой ступені змешанасці, што ўтвараюць ужо трэцюю якасць, не толькі пазбаўленую нарматыўнасці, але і такую, якая не мае яшчэ свайго ўласнага узусу, гэта значыць, што яе можна апісваць выключна як з'яву ідыялектную" [10, с. 91].

Паколькі Корпус з'яўляецца размечаным моўным рэсурсам (пра гэта больш падрабязна гл. у [6]), для пошуку патэнцыяльных тэкстаў, што змяшчаюць лексіку рэлігійнай тэматыкі, былі выкарыстаны магчымасці менавіта тэматычнай разметкі. Тэксты выключна рэлігійнай тэматыкі сустрэліся толькі ў чатырох выданнях з тых, што ўключаны ў Корпус, (падаюцца ў алфавітным парадку): "Астравецкая праўда", "Бераставіцкая газета", "Іўеўскі край", "Свіслацкая газета". Найбольш актыўна адлюстроўваюць рэлігійную тэматыку "Бераставіцкая газета" (на беларускай і рускай мовах) і "Свіслацкая газета" (на рускай і – менш – на беларускай мове). Па змесце тэксты размеркаваліся толькі па дзвюх хрысціянскіх канфесіях: каталіцтва (выключна беларускамоўныя тэксты з элементамі лаціны) і праваслаўе (выключна рускамоўныя тэксты). Не адлюстроўваюць разнастайнасць канфесій, уласцівую сучаснай Беларусі, "Астравецкая праўда" і "Іўеўскі край" (былі знойдзены выключна беларускамоўныя тэксты, звязаныя з каталіцтвам). Асабліва дзіўна гэта для газеты "Іўеўскі край", паколькі Іўеўскі раён – гэта спрадвечнае месца пасялення беларускіх татар, і нават у гады савецкай улады там дзейнічала мусульманская мячэць.

Наступным крокам аналізу з'явілася стварэнне частотных слоўнікаў на падставе беларускамоўнай часткі Корпуса. Уручную былі прагледжаны частотныя спісы словаўжыванняў, што дазволіла высветліць наступнае: 1) значную перавагу спецыяльнай лексікі, звязанай з касцёлам (пры гэтым абсалютным "частотным" лідарам з'яўляецца постаць *ксяндза*), у параўнанні з іншымі веравызнаннямі; 2) наяўнасць спецыяльнай лексікі агульнарэлігійнага плана (*рэлігія*, *канфесія*, *малітва*, *паломніцтва*,

місіянер і інш.); 3) шматлікую групу спецыяльных лексем, агульных для хрысціянства (*бог*, *багародзіца*, *біблія*, *царква*, *епіскап*, *святар*, *вікарый*, *епархія*, *уваскрэсенне* і мн. інш., у тым ліку прэцэдэнтныя імёны; сярод рэлігійных свят найбольш асветлена *Пасха* і ў меншай ступені – *Ражство*); 4) даволі прадстаўнічую групу лексікі, звязаную з праваслаўем (*іерэй*, *псалтыр*, *бацюшка* і інш.); наяўнасць невялікага кола лексем мусульманскай тэматыкі (*Мухамед*, *мячэць*, *імам*, *муфцій* – адзначым, што Тлумачальны слоўнік беларускай мовы дае варыянт *муфтый* [7] – і інш.); 5) нешматлікасць лексікі, што звязана з яўрэйскай рэлігіяй (*іўдзейскі, гасанна* – нарматыўнае: *асанна*, *шабас*, *хэдэр* – у Тлумачальным слоўніку беларускай мовы *хедар* [8]); 6) толькі згадваюцца такія рэлігійныя плыні, як пратэстантызм (*пратэстанты*) і грэка-католікі (*грэка-каталіцкая*); 7) даволі пашыранай з'яўляецца група лексем, што адлюстроўвае традыцыі, якія ўзыходзяць да часоў політэізму.

Зварот да агульнага частотнага спісу словаформаў дазволіў таксама вызначыць усе выпадкі арфаграфічнай варыятыўнасці ў перадачы прэцэдэнтных імёнаў і назваў, што таксама трэба будзе адзначыць у слоўніку сацыяльна значымай беларускай спецыяльнай лексікі.

Падрыхтавана ў межах навуковага праекта, які выконваецца пры падтрымцы БРФФД (грант Г15Р-29).

Літаратура

1. Крысин, Л.П. Терминологическая лексика в современных лингвистических словарях / Л.П. Крысин // Терминология и знание: материалы II Междунар. симпозиума, Москва, 21 – 22 мая 2010 г. – М.: Азбуковник, 2010. – С. 54–62.

2. Мечковская, Н.Б. Постсоветский русский язык: новые черты в социолингвистическом статусе / Н.Б. Мечковская // Мовы і культуры Беларусі: Нарысы. – Мінск, 2008. – С. 178 – 195.

3. Нещименко, Г.П. Динамика речевого стандарта современной публичной вербальной коммуникации: проблемы, тенденции развития / Г. П. Нещименко // Вопросы языкознания, 2001. – № 1. – С. 98–132.

4. Ожегов, С.И. Лексикология. Лексикография. Культура речи / С. И. Ожегов. – М.: Высш. школа, 1974. – 352 с.

5. Рычкова, Л.В. «Диалог» языков на страницах СМИ Гродненщины [Электронный ресурс] / Л.В. Рычкова, А.Ю. Станкевич // Актуальные проблемы теории дискурса: материалы Междунар. электр. конф., Актюбинск, 30 мая 2014 г. / «Actual problems of the theory of discourse» proceedings of the international scientific e-conference, May 30, 2014. – Актобе: Актюбинский региональный гос. ун-т им. К. Журбанова. – С. 51–61. [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http: //arsu.kz/sites/default/files/docs/sbornik_30062014.pdf. – Дата доступа: 07.06.2014.

6. Рычкова, Л.В. Многоцелевой лингвистический корпус региональных СМИ / Л.В. Рычкова, А.Ю. Станкевич // Информационно-коммуникативные технологии в лингвистике, лингводидактике и межкультурной коммуникации: сб. науч. ст. – Вып. 6. – М-во образования и науки РФ [и др.]; под ред. А.Л. Назаренко. – М.: Центр Дистанц. Образования: Факультет иностр. яз. и регионоведения МГУ им. М.В. Ломоносова; Изд-во «Университетская книга», 2014. – С. 488 – 497.

7. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. – Т. 3. – Мінск: Галоўная рэдакцыя Беларускай савецкай энцыклапедыі, 1979. – С. 184.

8. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. – Т. 5. (Кн. 2). – Мінск: Выдавецтва ”Беларуская савецкая энцыклапедыя імя Петруся Броўкі”, 1994. – С. 191.

9. Щербин, В.К. История и перспективы развития белорусской лексикографической традиции / В.К. Щербин // Теория и история славянской лексикографии. Научные материалы к XIV съезду славистов. – М.: ИРЯ РАН, 2008. – С. 11 – 43.

10. Smułkowa, E. Dwujęzyczność po białorusku: bilingwizm, dygłosja, czy coś innego? / E. Smułkowa // Język i tożsamość na pograniczu kultur. – Białystok, 2000. – S. 90–100.

Г.К. Семянькова (Віцебск)

ДАКЛАДНАСЦЬ ЯК АДМЕТНАЯ КАМУНІКАТЫЎНАЯ ЯКАСЦЬ МАЎЛЕННЯ

Дакладнасць – такая камунікатыўная якасць маўлення, якая прадугледжвае адпаведнасць яго сэнсавага боку (плана зместу) адлюстраванай рэчаіснасці і праяўляецца ва ўменні знаходзіць адэкватнае слоўнае выражэнне паняцця. Такім чынам, дакладнасць уяўляе сабой уменне правільна адлюстроўваць рэчаіснасць і правільна выказваць думкі і афармляць іх пры дапамозе слоў [2, с. 134].

Дакладнасць залежыць ад правільнасці словаўжывання, ад выбару слова, якое найбольш адпавядае названаму ім прадмету ці з’яве, зместу выказвання і яго мэце. Пры выбары слова неабходна ўлічваць яго семантыку, стылістычную прыналежнасць, сферу ўжывання.

Так, напрыклад, назоўнік *рэзюмэ* ў літаратурнай мове мае значэнне ‘кароткі вывад са сказанага, напісанага’, таму ўжыванне гэтага назоўніка будзе да месца ў кантэксце *рэзюмэ аўтарэферата, даклада, артыкула*. Часам у маўленні названая лексема выкарыстоўваецца для абазначэння вынікаў дзеянняў, мерапрыемстваў, падзей: *рэзюмэ чэмпіяната, турніра, спаборніцтваў* (правільна: *вынікі чэмпіяната, турніра, спаборніцтваў*).

Як слушна заўважае М.В. Абабурка, рускім дзеясловам *открывать* і *закрывать* у беларускай мове адпавядаюць розныя лексемы: *адчыняць – зачыняць* (вароты, дзверы), *расплюшчыць – заплюшчыць* (вочы), *адкаркаваць – закаркаваць* (бутэльку), *расканвертаваць – заканвертаваць* (ліст), *разгортваць – загортваць, згортваць* (кнігу, парасон, сшытак) [1, с. 25]. Адценні значэнняў кожнага са слоў уплываюць на спалучальнасць лексем, таму веданне гэтых асаблівасцяў дазваляе зрабіць маўленне дакладным і разнастайным.

Цяжкасці ўзнікаюць пры выбары слова з групы сінанімічных або паранімічных адзінак: *Я ўчора* ***страціла*** *ключ ад кватэры* (правільна *згубіла ключ*); *Конь* ***залыпаў*** *губамі і пачаў чухаць старому спіну* (правільна *заварушыў губамі*).

М.В. Абабурка таксама звяртае ўвагу на выпадкі неразмежавання значэнняў амонімаў і паронімаў людзьмі, што не клапоцяцца пра культуру свайго маўлення, таму з іх вуснаў можна пачуць *выразаць апендыцыт* (правільна *выразаць апендыкс*), *кампасіраваць талон* (правільна *кампасціраваць талон*), *асабовы погляд, уклад* (правільна *асабісты погляд, уклад*) [1, с. 26].

Сугучнасць паронімаў выкарыстоўваецца для стварэння стылістычнага эфекту, служыць сродкам гумару і сатыры. Паранімія пакладзена ў аснову своеасаблівага стылістычнага прыёму ў мастацкім творы – *паранама́зіі*, сутнасць якога ў наўмысным збліжэнні сугучных слоў. Паранамазія выкарыстоўваецца для стварэння гукавых эфектаў у паэтычных творах: *Стары плытагон, веснаходам* ***асмужаны****, / Вяжаш плыты гнуткай* ***віцінай Віцьбы****, / Апошнюю дзеліш з сябрамі* ***асьмушку*** *– / Дымкам самакрутак да Рыгі* ***віцца*** (Р. Барадулін), скорагаворках: *Паўка пакаваў пакупкі пакупнікам у пакункі; Жвавы вожык жыва жуку пашыў кажух.* Для большай выразнасці выказвання, стварэння каламбураў і камічных эфектаў лексічныя значэнні такіх слоў супастаўляюцца ці супрацьпастаўляюцца: *Хто* ***ўладарыць****, той і* ***ўдарыць*** (П. Панчанка); *Людзі трымаюць* ***ордар*** *так, як трымаюць* ***ордэн*** (А. Вярцінскі).

Даволі пашыраны гэты прыём у загалоўках фельетонаў і публіцыстычных артыкулаў: *«У гармоніі з гармонікам», «Ён быў паэт апальны ці апалены?..», «Фермы і фірмы», «Камбінатар з камбіната», «Рэформа будзе, калі будуць рэфарматары», «Журавіны ў Журавінцы».*

Дакладнасць маўлення прадугледжвае пэўныя патрабаванні да спецыяльнай лексікі. Так, тэрміны павінны быць адназначнымі ў межах дадзенай тэрмінасістэмы, сціслымі, нейтральнымі з эмацыйна-экспрэсіўнага пункту погляду, мець дакладны змест. Аднак пералічаныя патрабаванні захоўваюцца не заўсёды, гэта абцяжарвае зносіны ў навуцы, тэхніцы, упраўленні. Мнагазначныя тэрміны прыходзіцца ўжываць у такім слоўным кантэксце, які дазваляе выявіць іх дакладны змест, што часам прыводзіць да слоўнага лішку, да паралельнага выкарыстання тэрмінаў-сінонімаў: *палаталізаваныя (мяккія) зычныя.*

Замена тэрміна адпаведнай абрэвіятурай не павінна выклікаць цяжкасці пры ўспрыманні і расшыфроўцы яе, і тым больш – непатрэбных асацыяцый. Разгледзім вытрымку з аб’явы, змешчанай на дзвярах паліклінікі (значыць, тэкст разлічаны на масавага чытача): *«19 июня 2008 года с 10.00 до 17.00 Всеобластная акция: “НОРМАЛЬНОЕ АД – ЗДОРОВЬЕ НАЦИИ”. Если хотите измерить свое АД, приходите по адресу…».* Шчыра кажучы, аднаго прачытання аб’явы было недастаткова, каб зразумець, што размова ідзе пра артэрыяльны ціск, а не пра пекла. Прычына неразумення – запіс тэрміна абрэвіятурай, а назвы акцыі – вялікімі літарамі.

Вузкаспецыяльныя тэрміны, ужытыя па-за сферай, для якой яны характэрны, абавязкова патрабуюць тлумачэння: калі тэрміны не зразумелыя

адрасату, яны не выконваюць інфарматыўную функцыю і перашкаджаюць успрыняццю і разуменню тэксту, а значыць, пазбаўляюць тэкст даступнасці.

Дакладнасць маўлення патрабуе не толькі ведання значэння слоў, але і ўмення ўлічваць іх спалучальнасць – здольнасць уступаць у кантэкст з іншымі словамі. Несвабодная спалучальнасць абмяжоўвае кантэкст слова, патрабуе побач з ім толькі асобных слоў: *дасягнутыя недахопы* (лексема *недахопы* не спалучаецца са словам *дасягнутыя*), *паменшыць узровень* (трэба *знізіць узровень*). Частка такіх памылак дапускаецца ў выніку змешвання двух блізкіх па семантыцы словазлучэнняў: *аплаціце за праезд* (трэба *заплаціце за праезд* або *аплаціце праезд*), *заняць першынство* (трэба *завяваць першынство* або *заняць першае месца*).

Стылістычная спалучальнасць звязана са стылістычнай афарбоўкай моўных сродкаў. Так, стылістычна афарбаваныя адзінкі свабодна спалучаюцца са словамі з такой жа афарбоўкай. І наадварот, стылістычна нейтральныя словы свабодна спалучаюцца толькі з нейтральнымі. У сказе *Дзяржаўнай праграмай прадугледжаны дадатковы выпуск садавінаягадных натуральных вінаў, моцных вінаў палепшанай якасці, якія выцясняць танныя віны нізкіх гатункаў, так званае чарніла, барматуху* словы маюць кніжную ці стылістычна нейтральную афарбоўку, таму лексемы *чарніла* і *барматуха* праз сваю зніжаную стылістычную канатацыю выбіваюцца з кантэксту кніжнай лексікі. У сувязі з гэтым іх выкарыстанне бачыцца нам немэтазгодным, недарэчным, тым больш што ніякай новай інфармацыі яны не нясуць, а толькі з’яўляюцца стылістычнымі сінонімамі да выразу *танныя віны нізкіх гатункаў.*

Такім чынам, назавём прычыны недакладнасці, двухсэнсоўнасці, незразумеласці выказвання: няўмелае выкарыстанне сінонімаў, паронімаў, тэрмінаў, мнагазначных слоў, амонімаў; ужыванне слоў у неўласцівым для літаратурнай мовы значэнні; парушэнне нормаў лексічнай, граматычнай і стылістычнай спалучальнасці слоў; міжмоўная лексіка-семантычная інтэрферэнцыя ва ўмовах білінгвізму; слоўная збыткоўнасць; слоўная недастатковасць.

Хуткае і дакладнае ўспрыманне маўлення абцяжарваецца таксама наступнымі недахопамі ў яго структуры: 1) нанізванне склонаў; 2) парушэнне парадку слоў у сказе: *Патрабуецца на пастаянную работу супрацоўнік для аддзела, які мае вышэйшую адукацыю;* 3) вялікая колькасць пабочных і аднародных членаў сказа, адасобленых канструкцый, даданых частак, што робіць сказ надзвычай цяжкім для ўспрыняцця: …*Толькі ў ціхія ночы пад раніцу, калі ападала раса і туман засцілаў усё на свеце, аж не было відаць платоў за хатамі і высокага, як дастаць рукой, гарбатага, што мядзведзь, сланечніку ў гародчыку, рабілася свежа і сыра.*

У розных стылях патрабаванні да ступені праяўлення дакладнасці неаднолькавыя. З усіх стыляў найменшая дакладнасць уласціва

размоўнаму стылю, асноўнай формай рэалізацыі якога з’яўляецца вусная мова. Умовы вусных зносін (найперш непадрыхтаванасць, экспромтнасць) прыводзяць да таго, што ў гэтым стылі часта дапускаюцца недакладнасці. Аднак непасрэдны характар зносін дазваляе іх удакладніць (суразмоўца задае ўдакладняльнае пытанне ці сам аўтар заўважае дапушчаны недахоп і выпраўляецца). Узаемаразуменню дапамагаюць таксама жэсты, міміка, рухі.

Пісьмовае ж маўленне пазбаўлена такіх магчымасцей, таму яно павінна быць зразумелым і дакладным. Вось чаму да тэкстаў кніжных стыляў, якія рэалізуюцца пераважна ў пісьмовай форме, прад’яўляюцца больш жорсткія патрабаванні адносна дакладнасці.

У афіцыйна-справавым стылі недапушчальныя двухсэнсоўнасць, суб’ектывізм і іншыя праявы недакладнасці, бо яны звязаны з парушэннем функцыі рэгулявання прававых адносін.

У навуковым стылі асаблівыя патрабаванні прад’яўляюцца да дакладнасці паняццяў, тэрмінаў, фармулёвак, апісання эксперыментаў і іх вынікаў. Захаванне гэтых умоў і забяспечвае выніковасць навуковых адносін.

У публіцыстычным і мастацкім стылях дакладнасць уяўляе даволі складаную з’яву, звязаную з неабходнасцю не толькі правільна выказаць думку, але і ўздзейнічаць на пачуцці адрасата. Дакладнасць тут вызначаецца найперш адпаведнасцю слова вобразнаму зместу. Таму нярэдка назіраецца пашырэнне межаў лексічнай спалучальнасці: *Туды, у казку на Раство, дзе* ***снегу шэпт*** *і елак харство, дзе* ***парасон нябёсаў*** *дакрануўся да зямлі – і* ***зоры пакаціліся*** *па свеце* (А. Багамолава).

Мастацкае маўленне своеасаблівае, бо ў ім прадметная і паняційная дакладнасць грунтуецца на вобразнай дакладнасці, якая часцей за ўсё будуецца на рэчыўным (рэальным), словаўтваральным і эстэтычным значэннях слова [1, с. 23].

Парушэнне прадметнай дакладнасці ў мастацкім стылі тлумачыцца тым, што мастацкі твор не з’яўляецца люстраным адбіткам рэальнасці. Аднак кожны сапраўдны мастак слова імкнецца як мага больш дакладна паказаць рэальнасць, сведчаннем чаго з’яўляюцца розныя рэдакцыі аднаго і таго ж твора. Параўнаем, напрыклад, два варыянты сказаў з камедыі Янкі Купалы “Паўлінка”: *Ён-то нічога, але тата – дык жыўцом бы яго* ***спаліў.*** *– Ён-то нічога, але тата – дык жыўцом бы яго* ***з’еў.***

Такім чынам, дакладнасць мастацкага стылю ствараецца рэалізацыяй у слове задумы аўтара, а таксама адпаведнасцю слова не толькі прадмету ці з’яве, што апісваюцца, але і ідэйна-эстэтычнай ацэнцы прадмета.

Літаратура

1. Абабурка, М.В. Культура беларускай мовы / М.В. Абабурка. – Мн.: Выш. шк., 1994. – 122 с.

2. Плещенко, Т.П. Стилистика и культура речи: учеб. пособие / Т.П. Плещенко, Н.В. Федотова, Р.Г. Чечет; под ред. П.П. Шубы. – Мн.: ТетраСистемс, 2001. – 544 с.

Т.И. Синкевич (Витебск)

ОЗЕРО БУЖЕ: ИСТОРИЯ И СОВРЕМЕННОСТЬ

Озеро Буже находится в Браславском районе Витебской области, в 4,8 км от границы с Латвией, примерно в 7,4 км на северо-запад от г. Браслав, между деревнями Бужаны и Марьянполье. Входит в Браславскую группу озер, в состав национального парка Браславские озера и относится к бассейну р. Друйка. Озеро эвтрофное, подпрудного типа. Берега преимущественно возвышенные, песчано-галечниковые и каменистые, местами завалуненные, поросшие кустарником и редколесьем. Окружено обширной поймой. Мелководье узкое, преимущественно песчаное. Слабо зарастает. Наибольшие глубины находятся в западной части озера, неподалеку от берега. Соединено ручьями с озерами Савонар, Рака и Урбановское (Безымянное). Это общие сведения о гидрообъекте. Но какова этимология названия озера? Как оно получило такое необычное для Витебщины название? Есть легенда, раскрывающая это странное для Беларуси название озера.

В наполеоновскую войну 1812 года на территории Беларуси, по дороге на Вильнюс, двигалось несколько императорских обозов отступавшей французской армии. Охрану одного из них, содержащего только деревянные ящики с золотыми монетами, возглавлял молодой французский офицер по фамилии Буже. Обозы двигались днем и ночью, спеша уйти от лихих казаков атамана Платова. В одну из ночей, в районе местечка Плещеницы, обоз Буже, заблудившись, оторвался от основных сил и двинулся севернее – по дороге на Браслав. Через два дня французы поняли свою ошибку, но продолжили путь вперед, поскольку в их тылах уже находились русские войска. Наконец, обессилевшие, они наткнулись на какое-то большое озеро. Стоял поздний октябрь, но уже ударили первые морозы, и мелководье озера было покрыто льдом. Верный императорской присяге, Буже решил утопить ящики с золотыми монетами в озере. По льду он переправил ящики сначала на остров, а затем баграми охрана стала спихивать их в полыньи возле берегов острова. После этого вконец обессилевшие солдаты во главе с Буже замерзли. Спасся лишь один из конюхов, следы которого в истории затерялись. После войны эмиссары русского императора пытались найти сокровища, основав поселение на берегу озера, получившее название Бужаны. Но безуспешно. Позже на берегу озера, якобы, были найдены трупы французов и перезахоронены, а возвышенность на полуострове вблизи деревни Бужаны местные жители именуют «французскими могилками». А в конце прошлого века приезжали два француза, показывавшие местным жителям рисунок, похожий на силуэт перевернутой белочки и спрашивали, где в окрестностях есть такой остров. А теперь взгляните на контуры самого большого из озерных островов и вы увидите, что он вам напоминает. Таким образом, если верить легенде, то озеро по-

лучило наименование по фамилии француза Буже, да и поселение на его берегу носит название Бужаны.

С точки зрения лингвистики это название родственно лтш. bau~gurs "возвышение, холм", bugurai~ns "бугристый", bauga "поплавок на рыбачьей сети", лтш. budzis "шишка, желвак"; далее, вероятно, др.-инд. bhugnaŕs "гнутый", нов.-в.-н. biegen, гот. biugan; см. Эндзелин, ЖМНП, 1910, июль, стр. 200 и сл.; М. – Э. 1, 267; Буга, РФВ 67, 233; Ильинский, РФВ 62, 258; Сб. Харьк. Общ. 19, 253 и сл. Последний сюда же относит *Буг* I и *бгать* и т. д. Неприемлемо, во всяком случае, старое толкование *бугогор* из тюрк.: ср. чагат. bJgri "кривой, изогнутый", тур. bJgri "горб", учитывая наличие балт. формы (вопреки Бернекеру 1, 97; Маценауэру, LF 7, 17; Mi. TEl., Доп. 2, 90; Преобр. 1, 50); см. Траут. [3].

Сюда же можно отнести и названия Бужа – левый приток реки Пры (бассейн Оки). Река Бужа, один из истоков Пры, вытекает из озера Исихра на уровне 134 м, течет узкой лентой среди болот, торфяников и лесов на юг и впадает в озеро Святое на уровне 112 м.

Возможно сопоставление этого наименования и с названием напитка «буза» у древнего восточно-финского племени меря, проживающего в Волго-Окском междуречье (на территории современной Московской, Владимирской, Ивановской, Ярославской и Костромской областей), носителей дьяковской культуры. По мере распространения славян на северо-восток (начиная с IX в. на территорию мери) племя оказалось в их сфере влияния и ко 2-й половине IX в. было ассимилировано. Но в культуре людей, проживающих на меренских землях, остались проявления материальных памятников этого исчезнувшего народа, в том числе и напиток «буза». Этим напитком было ржаное пиво, которое называли буза или бужа – брага, приготовляемая на ржаном солоде (мерянская буза, бужа – брага, выпивали ее в праздники, это был мутный напиток). В наименовании озера сохранилось, вероятно, со значением «мутная вода», «буза», и тогда это метонимический перенос.

У М. Маковского читаем: «Бужа – божественная нить связи миров: пращуров, современников и потомков; подземного, земного и небесного; прошлого, настоящего и будущего; артерия жизни, черпающая силу из этих миров [3].

К этой группе названий можно также отнести и названия озера Бужа в бас. р. Друйка пр. пр. З. Двины в Браславском р-не (Бел. Энц.), озеро Буза в бас. р. Дрисса пр. пр З. Двины в Россонском р-не (Бел. Энц.), озеро Бузянка – в бас. р. Свольна пр. Дриссы в Верхнедвинском р-не, озеро Бужское в Брестском р-не Брестской области и др. [6].

Возможно также сопоставление названия с рус. диал. буга «речной берег, поросший вербой», болг. «маленький вир» [1].

Мы полагаем, что все же в названиях озер должны быть отображены прежде всего физико-географические реалии и явления природы, что было

характерно для мышления и синкретичного мировосприятия человека в древности.

Понять содержание и значение названий озер можно, опираясь на разнообразные исторические, типологические и лингвистические данные, но при этом важно изучение не только самих объектов, но и окружающего их ландшафта, а также нематериального наследия традиционной культуры.

Литература

1. Даль, В.И. Толковый словарь живого великорусского языка в 4 т. / В.И. Даль. – М., 1976 –1980.

2. Иванов, В.В., Топоров, В.Н. Исследования в области славянских древностей / В.В. Иванов, В.Н. Топоров. – М., 1974.

3. Маковский, М.М. Язык – миф – культура. Символы жизни и жизнь символов / М.М. Маковский. – М., 1997.

4. Фасмер, М. Этимологический словарь русского языка: в 4 т. / М. Фасмер. – М., 1986–1987.

5. Назвы азёраў Беларусі: слоўнік / С.У. Шахоўская; навук. рэд. П.А. Міхайлаў. – Мінск, 2014.

6. Беларуская Энцыклапедыя: у 18 т. – Мінск: БелЭн, 1996 – 2004.

7. БКБ – Блакітная кніга Беларусі: энцыклапедыя – Мінск: БелЭн, 1994. – 415 с.

Т.І. Скікевіч (Горкі)

ГІСТАРЫЧНЫ АСПЕКТ ФАРМІРАВАННЯ БЕЛАРУСКАЙ СЕЛЬСКАГАСПАДАРЧАЙ ТЭРМІНАЛОГІІ

Узнікненне і фарміраванне беларускай тэрміналогіі, і ў тым ліку сельскагаспадарчай, – працяглы і перарывісты працэс. Розныя фактары, як адмоўныя, так і станоўчыя, на працягу стагоддзяў уплывалі на яе развіццё. Так, у XIV–XVI ст. фарміраванню беларускай тэрміналогіі садзейнічала тое, што старабеларуская мова была дзяржаўнай мовай у Вялікім Княстве Літоўскім. Акрамя таго, вялікі ўплыў на фарміраванне навуковай тэрміналогіі аказала ўзнікненне і распаўсюджанне кнігадрукавання, якое ў значнай ступені садзейнічала выпрацоўцы лексічных нормаў, пашырэнню слоўнікавага складу, замацаванню намінацый новых навуковых паняццяў.

Сельскагаспадарчая лексіка, у адрозненне ад іншых галіновых тэрмінасістэм, адзінкі якіх часта з’яўляюцца незразумелымі непрафесіяналам з прычыны рэдкага з імі сутыкнення (машынабудаўнічыя, астранамічныя і інш. тэрмінаадзінкі), абазначае паняцці, якія бытуюць не толькі ў вузкапрафесійным асяроддзі, але і вядомыя шырокаму колу моўнікаў. Таму многія сельскагаспадарчыя тэрміны, якія выкарыстоўваліся ў старабеларускай мове для намінацыі зямельных уладанняў, прылад апрацоўкі зямлі, разнастайных працэсаў сяўбы і ўборкі ўраджаю, асоб, занятых у сельскай гаспадарцы, хатняй жывёлы і г. д., з’яўляюцца агульнымі

для ўсіх усходнеславянскіх моў: *борона, жито, косити, копати, молотити, овесъ, аранье, сеянье, снопъ, ярица, конь, корова, кочьтъ, клювъ, крило* і інш.

У параўнанні з іншымі галінамі сельскагаспадарчая тэрміналогія характарызуецца асабліва вялікай ступенню варыятыўнасці і сінанімічнасці. У значнай меры гэта можна растлумачыць тым, што ў сінанімічных радах гэтай тэрміналогіі знайшлі адлюстраванне працэсы ўзаемапранікнення (у выніку практычнага выкарыстання) элементаў лексікі старажытнарускай, жывой беларускай, польскай моў і разнастайных мясцовых гаворак, напрыклад: *служба, потяглъ, потугъ, подымье* – для абазначэння цяглавага сялянскага землеўладання; *дворище, подворье, избище, селище, садиба* – для абазначэння месца размяшчэння сялянскай хаты з гаспадарчымі прыбудовамі. Сустракаюцца пары, якія складаюцца з тэрміна ўсходнеславянскага паходжання і паланізма: *именье – маёнтокъ.*

У канцы XVII ст. беларуская мова была забаронена і выцеснена з афіцыйнай сферы польскай і лацінскай мовамі. А затым негатыўныя адносіны да яе царскага ўрада Расіі ў XVIII–XIX стст. адмоўна ўздзейнічалі на працэс фарміравання тэрміналагічнай лексікі.

Беларуская навуковая тэрміналогія пачала фарміравацца ў самым пачатку XX стагоддзя, калі адрадзілася кнігадрукаванне, з'явіліся кнігі, газеты, навуковыя і навукова-папулярныя брашуры на беларускай мове.

Пачатак сельскагаспадарчай навукі на Беларусі звязаны са стварэннем у 1840 г. Горыгорацкай земляробчай школы, якая ў 1848 г. была ператвораная ў інстытут з правам універсітэта, дзе выкладаліся прадметы, звязаныя з прыёмамі апрацоўкі глебы, разнастайных працэсаў сяўбы і ўборкі ўраджаю, землеўладкаваннем, упраўленнем маёнткамі і інш. Аднак навучальныя дапаможнікі, якія выкарыстоўваліся ў вучэбным працэсе, былі рускамоўнымі, і таму сельскагаспадарчая тэрміналогія таксама была руская. Толькі ў пачатку XX стагоддзя з'яўляюцца першыя беларускамоўныя працы па сельскагаспадарчых навуках.

Пэўную ролю ў фарміраванні тэрміналагічных адзінак у гэты час адыграла беларуская грамадска-палітычная, навукова-папулярная і літаратурна-мастацкая газета "Наша ніва", якая пачала легальна выдавацца ў выніку адмены забароны на беларускую мову з 1905 года. Менавіта на яе старонках друкаваліся артыкулы на эканамічныя, гістарычныя, сельскагаспадарчыя, біялагічныя, навукова-тэхнічныя і іншыя тэмы. Дзякуючы "Нашай ніве" паступова зараджаўся навуковы стыль беларускай мовы, з'яўляліся новыя для беларускага грамадства тэрміны і паняцці.

Дзякуючы таму, што ў 1912–1915 гг. выдаваўся спецыяльны сельскагаспадарчы часопіс "Саха" (Вільня, Мінск), які ў сваёй моўнай практыцы арыентаваўся на "Нашу ніву", у беларускай мове з'явілася значная колькасць новых слоў, што абазначалі прадметы і з'явы ў галіне сельскай гаспадаркі: *абганяць (бульбу), абрабляць, адкармліванне, віка, вырыванне, землядзелле, зялёнасць, мінеральны, размнажванне, сенасушка, хлебароб-*

ства, аграном, аграрны, барана, клець і інш. І хоць спецыяльная тэрміналогія канкрэтных галін навукі была прадстаўлена дастаткова сціпла, тым не менш беларуская мова папаўняла свой слоўнікавы запас з існуючых крыніц шляхам запазычвання, калькавання і г.д.

Фарміраванне нацыянальнай тэрміналогіі ў межах новай літаратурнай мовы прыпадае на 1920 – 30-я гады, калі беларуская мова набыла статус дзяржаўнай мовы, актыўна ішлі працэсы беларусізацыі і востра паўстала праблема пераводу навучання на беларускую мову.

У лютым 1921 г. была створана Навукова-тэрміналагічная камісія пры Народным камісарыяце асветы Беларусі, якая занялася распрацоўкай тэрміналогіі па ўсіх дысцыплінах у галіне дакладных і гуманітарных навук. У 1922 годзе быў створаны Інстытут беларускай культуры, а ў 1929 г. – Інстытут навуковай мовы пры Беларускай акадэміі навук.

Вынікам працы Навуковай тэрміналагічнай камісіі сталі кароткія слоўнікі тэрмінаў па розных галінах навук, у тым ліку і сельскагаспадарчай тэрміналогіі. Істотнай рысай гэтай тэрміналогіі была “высокая ступень варыятыўнасці, абумоўленая, перш за ўсё, падачай часткі запазычаных тэрмінаў разам з беларускімі лексемамі або неалагізмамі” [Антанюк, 37].

Сцяпан Некрашэвіч, Вацлаў Ластоўскі, Якуб Колас, Янка Купала, Змітрок Бядуля, Язэп Лёсік, Мікола Байкоў, Максім Гарэцкі, Леў Дашкевіч, Мікола Азбукін і дзясяткі іншых паспелі выдаць каля 30 тэрміналагічных слоўнікаў, сярод якіх шэсць належаць сельскагаспадарчай галіне. Гэта «Ботаніка (Агульная ботаніка (анатомія, морфолёгія, і фізіолёгія расьлін) і спэцыяльная (сыстэматыка расьлін)» (1924), «Слоўнік лясных тэрмінаў» (1926), «Назовы жывёл» (1927), «Слоўнік глебазнаўчае тэрмінолёгіі» (1927), «Слоўнік сельска-гаспадарчае тэрмінолёгіі» (1928), «Слоўнік тэрміналёгіі агульнае расьлінагадоўлі» (1930).

Неабходна сказаць, што асобныя працы па сельскагаспадарчай тэрміналогіі ў выглядзе невялікіх слоўнікаў і тэрміналагічных падборак друкаваліся і незалежна ад выпускаў БНТ. Як, напрыклад, Слоўнік сельскагаспадарчай тэрмінолёгіі ў ліку 1674 тэрмінаў (Мінск, 1929); “Беларуска-польска-расейска-лацінскі батанічны слоўнік” Зоські Верас; Фядзюшын А.У. Матэрыялы да беларускай народнай заалагічнай тэрміналогіі. Спіс назваў птушак і некаторых рыб // Навуковы зборнік Інстытуту Беларускай культуры. – Мінск, 1925. – С. 188 – 196; Ганчарык М.М. Беларускія назовы расьлін // Працы навуковага таварыства па вывучэньню Беларусі пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскага гаспадарства ў Горках. – Горкі, 1927. Т. 2. – С. 194–216; Т. 4. – С. 1–28.

Асаблівую ўвагу хочацца звярнуць на працу Навуковага таварыства пры Беларускай дзяржаўнай акадэміі сельскай гаспадаркі ў Горках, якое актыўна працавала па стварэнні беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі з сярэдзіны 20-х гг. У склад таварыства ўваходзілі не толькі мовазнаўцы, але і спецыялісты па аграноміі, землеўпарадкаванні,

зоаінжынеры і інш. У сувязі з пераходам на беларускую мову выкладання выкладчыкі актыўна ўключыліся ў працу па напісанні навуковых артыкулаў на беларускай мове. У друкарні акадэміі выдаваліся зборнікі навуковых прац: “Працы Горы-Гарэцкага навуковага таварыства” (на бел. мове), “Запіскі Беларускае дзяржаўнае акадэміі сельскае гаспадаркі імя Кастрычніцкавай Рэвалюцыі” (на беларускай і рускай мовах).

У вышэйпазначаных зборніках навуковых прац на беларускай мове пішуць такія вядомыя вучоныя, як А.І. Кайгародаў, Ц.М. Годнеў (“Клімат Беларусі”), К.Г. Рэнард (“Да пытаньня аб клясыфікацыі садовых гатункаў юргіні”), А.Л. Новікаў (“Папярэдні сьпіс дрэўных куставых і паўкуставых расьлін”), Г.А. Паўлаў (“Матар’ялы да вывучэньня ўтрыманьня мясцовага малочнага быдла і мэтысаў мясцовага з пародзістым быдлам”) і інш.

З цягам часу беларуская сельскагаспадарчая тэрміналогія развівалася і ўдасканальвалася. Але ў 30–40-я гады праца па стварэнні беларускай тэрміналогіі, у тым ліку і сельскагаспадарчай, амаль спынілася. І пасля вайны не было агульнага цэнтра па распрацоўцы тэрміналагічнай лексікі. Значную ролю ў нармалізацыі беларускай тэрміналогіі адыгралі “Руска-беларускі слоўнік” (1953), “Беларуска-рускі слоўнік” (1962), “Тлумачальны слоўнік беларускай мовы” (1977–1984) і некаторыя іншыя.

У гэты час так і не з’явіліся лексікаграфічныя выданні, прысвечаныя непасрэдна сельскагаспадарчай тэрміналогіі. Толькі ў канцы 50-х гг. слоўнікавая праца на Беларусі актывізавалася. У сектары тэрміналогіі, створаным у 1955 годзе ў Інстытуце мовазнаўства АН Беларусі, была складзена картатэка і падрыхтаваны рукапіс руска-беларускага слоўніка сельскагаспадарчай тэрміналогіі.

Зразумела, што навукі, звязаныя з сельскай гаспадаркай, не стаялі на месцы, з’явілася шмат новых паняццяў, для абазначэння якіх былі ўтвораны і новыя тэрміны. Акрамя лінгвістычных крыніц, сельскагаспадарчыя тэрміны ўваходзяць у склад энцыклапедычных галіновых слоўнікаў. Значную ролю ў фарміраванні беларускай навуковай сельскагаспадарчай тэрміналогіі ў 70–80 гг. адыграла праца над складаннем «Беларускай Савецкай Энцыклапедыі», «Энцыклапедыі прыроды Беларусі», «Тлумачальным слоўнікам беларускай мовы» і новымі рэдакцыямі беларуска-рускага і руска-беларускага слоўнікаў.

На працягу XX ст. сельскагаспадарчая тэрміналогія не аднойчы з’яўлялася прадметам апісання мовазнаўцаў-лексікографаў, якія прыклалі шмат намаганняў, каб выпрацаваць нарматыўную навуковую сельскагаспадарчую тэрміналогію. Вядомыя шматлікія слоўнікі, прысвечаныя розным галінам сельскагаспадарчай справы, таму «шмат у чым не маюць падстаў нараканні на нераспрацаванасць тэрміналогіі на беларускай мове, якія нярэдка гучаць з вуснаў тых, хто адмаўляе ў праве на жыццё беларускамоўнай навуцы і беларускамоўнаму навучанню» [3].

У 90-я гг. у сувязі з прыняццем «Закона аб мовах у БССР» і пераходам выкладання шэрагу дысцыплін у ВНУ на беларускую мову з'явілася неабходнасць у стварэнні найперш перакладных тэрміналагічных слоўнікаў, а пазней і тлумачальных. Мовазнаўцы разам са спецыялістамі розных сельскагаспадарчых галін ведаў актыўна ўключыліся ў працу па распрацоўцы такіх слоўнікаў, якія адзін за адным выходзілі з друку.

На сучасным этапе асноўныя адзінкі беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі прадстаўлены ў «Руска-беларускім слоўніку сельскагаспадарчай тэрміналогіі» пад рэдакцыяй М.В. Бірылы і Г.У. Арашонкавай (Мінск, 1994).

Акрамя таго, пытанні беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі знайшлі сваё адлюстраванне ў навуковых працах беларускіх мовазнаўцаў, дысертацыйных даследаваннях, прысвечаных гісторыка-тэматычнаму вывучэнню галіновай лексікі, сярод якіх: *Лапкоўская А.М.* Сучасная беларуская батанічная тэрміналогія. – Гродна, 2007; *Лаўшук Д.А.* Структурна-семантычная характарыстыка сучаснай беларускай сельскагаспадарчай тэрміналогіі: дыс. канд. філ. навук. – Мінск, 2003; *Лаўрыновіч Н.В.* Лексіка-семантычная арганізацыя і структурна-дэрывацыйная тыпалогія сучаснай беларускай заалагічнай тэрміналогіі (2012); *Макарэвіч М.М.* Лексіка народных промыслаў і рамёстваў у гісторыі беларускай сельскагаспадарчай і прамысловай тэрміналогіі: дыс. канд. філ. навук. – Мінск, 2012.

На сучасным этапе развіцця тэрміналагічнай справы на Беларусі асаблівую актуальнасць набываюць пытанні ўдасканалення і ўпарадкавання як тэрміналогіі ў цэлым, так і сельскагаспадарчай галіновай тэрмінасістэмы.

Літаратура

1. Антанюк, Л.А. Беларуская навуковая тэрміналогія: фарміраванне, структура, упарадкаванне, канструяванне, функцыянаванне / Л.А. Антанюк. – Мінск: Навука і тэхніка, 1987.

2. Красней, В.П. Беларуская тэрміналогія: зб. артыкулаў; рэдкал.: Э.А. Ялоўская (адк. рэд.) [і інш.]; навук. рэд. М.Р. Прыгодзіч. – Мінск, 2011.

3. Цыхун, Г. Беларуская тэрміналогія ў тэрміналагічных слоўніках (1918–1998) / Г. Цыхун // Беларуская тэрміналогія. Вып. 1.: Тэрміналагічныя слоўнікі (асобныя выданні). – Мінск, 2000.

Т.В. Скребнева (Витебск)

ИМЯ *ТАТЬЯНА* В СОЦИОСФЕРЕ ВИТЕБСКОГО РЕГИОНА

Работа выполнена при финансовой поддержке БРФФИ в рамках гранта «Неофициальный ономастикон в социосфере Витебского региона» (номер гос. рег. 20142540 от 10.10.2014) и имеет целью установление особенностей функционирования женского личного имени *Татьяна* как репрезентанта культурного пространства Витебщины. Актуальность иссле-

дования обусловлена, во-первых, лингвокультурологической ориентированностью современных лингвистических изысканий, во-вторых, возросшим вниманием социума к проблемам бытия личных имен, их прагматическому потенциалу. Так, 22 января 2015 г. в г. Витебске состоялась акция «Талант быть Татьяной», объединившая около полусотни женщин, носящих указанное имя, и посвященная известным в городе Татьянам, среди которых Татьяна Ивановская, редактор телевизионных программ, Татьяна Лихачева, заслуженная артистка Беларуси, и многие другие. Проект широко освещался в прессе и на телевидении. «Гарантированные подарки для каждой Татьяны» обещал МТБанк, открывший свой филиал в Витебске 25 января 2015 г. (http://www.mtbank.by/about/newspage/25-yanvarya-dvojnoj-prazdnik-v-Vitebske).

Материалом для исследования послужили актовые записи о рождении по Витебску и Витебскому району во 2-й половине XX – начале XXI в. (21 760 единиц), «Список абонентов витебской телефонной сети» (1996 г.), справочник «Храмы и приходы Витебской православной епархии» (2002 г.). В процессе исследования нами использовались следующие методы: инвентаризации и систематизации языкового материала, описательный, количественный.

Имя *Татьяна* этимологически восходит к греческому либо латинскому языку и, по данным А.К. Устинович, известно на территории Беларуси с XVI в. в вариантах *Тацяна, Татьяна, Таца, Тоця, Тося, Тацуха* [4, с. 193]. О.М. Ляшкевич, исследовавшая письменные памятники Витебщины XVI–XVIII вв., отмечала, что названное имя в регионе являлось малоупотребительным [2, с. 41]. В то же время А.Ю. Пуцыкович, подвергнувшая анализу антропонимикон «Памятных книжек Витебской губернии на 1861 – 1914 гг.», приводит имя *Татьяна* в списке частых женских именований [3, с. 167, 168]. Возрастание популярности антропонима характерно для 2-й половины XX в. В сельской местности (Витебский район) на протяжении 40 – 90-х гг. XX в. имя *Татьяна* располагалось в пределах первой десятки самых частотных именований, в областном центре пик повышенной популярности антропонима пришелся на 50 – 80-е гг. XX в. Ранговый номер имени в пределах первой десятки представлен в приведенной ниже таблице, прочерк в соответствующих графах свидетельствует о том, что имя не входило в число десяти лидирующих антропонимов.

Таблица – Ранг имени *Татьяна* в рамках первой десятки популярных именований

Срез	1941–44	1954	1964	1974	1984	1994
Витебск	–	3	3	3	2	–
Витебский район	7	3	3	4	3	10

Как видно из таблицы, некоторое ослабление внимания имядателей к названному антропониму начинается в период перестройки и соответствует общим тенденциям развития личной антропонимии региона на данном этапе (активизация выделительной функции имени, стремление к расширению репертуара, снижение концентрации, интерес номинаторов к редким каноническим и иноязычным антропонимным единицам). Вместе с тем имя *Татьяна* на Витебщине на протяжении 2-й половины XX в. характеризуется устойчивостью употребления, а, как известно, традиционность и преемственность именослова во многом поддерживается за счет фонда устойчивых именований. В 1-м десятилетии XXI в. (срез 2004 г. по Витебскому району и 2010 г. по г. Витебску) имя *Татьяна* в первую десятку самых популярных личных антропонимов не входит.

Региональный спектр неофициальных форм указанного именования широк и включает в себя следующие единицы: *Танёк, Танечка, Танька, Таньча, Танюндель, Танюха, Танюш, Танюша, Танюшечка, Танюшка, Таня, Тасенька, Таська, Тася, Татьянка, Татьянчик, Туня, Танюсик, Таньча, Танюха* [1].

Имя *Татьяна* представлено в разных подсистемах регионального ономастикона: оно лежит в основе фамилии *Татьянин*, экклезионима *храм во имя Святой Мученицы Татианы* (Витебск), эргонима *свадебный салон «Татьяна»* (Витебск). В сознании языкового коллектива данное имя неразрывно связано с Татьяниным днем (25 января), которому в земледельческом календаре сопутствуют некоторые приметы*: Снегапад на Таццяну – даждлівае лета; На Таццяну марозна і неба яснае – да ўраджаю*.

Прецедентными в Витебском регионе являются имена *Аржанниковой Татьяны Петровны*, чемпиона мира в командном первенстве по спортивной гимнастике (1978 г.), *Белошапко Татьяны Михайловны*, баскетболистки, олимпийской чемпионки (1980 г.), модели *Тани Дягилевой,* свидетельством чего выступают посвященные им рубрики раздела «Известные люди Витебска» электронной «Витебской энциклопедии» (evitebsk.com.).

Таким образом, женское имя *Татьяна* актуально в сфере духовной культуры витебского региона, отличается популярностью, устойчивостью, прецедентностью, представлено в разных подсистемах локального ономастикона.

Литература

1. Лисова, И.А. Функционирование имени Татьяна в неофициальном именнике жителей Белорусского Поозерья и Смоленщины / И.А. Лисова // Материалы докладов 48 Междунар. науч.-техн. конф. преподавателей и студентов, посвященной 50-летию университета. В 2 т. Т. 1 / УО «ВГТУ». – Витебск, 2015. – С. 62–64.

2. Мезенка, Г.М. Віцебшчына ва ўласных імёнах: мінулае і сучаснасць: манаграфія / Г.М. Мезенка, В.М. Ляшкевіч, Г.К. Семянькова. – Віцебск: Выд-ва УА «ВДУ імя П.М. Машэрава», 2006. – 238 с.

3. Пуцыкович, А.Ю. Динамика женского антропонимикона Витебской губернии II пол. XIX – нач. XX в. (на материале Памятных книжек Витебской губернии) /

А.Ю. Пуцыкович // Ономастика в Смоленске и Витебске: проблемы и перспективы исследования: материалы Междунар. науч.-практ. конф., Смоленск, 17–18 марта 2015 г. / отв. ред. И.А. Королёва. – Смоленск: Изд-во СмолГУ, 2015. – С. 166 –170.

4. Усціновіч, А.К. Слоўнік асабовых уласных імён / А.К. Усціновіч. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2011. – 240 с.

Т.П. Слесарева (Витебск)

БЕЛОРУСИЗМЫ В ПОЭТИЧЕСКОМ НАСЛЕДИИ Н.И. РЫЛЕНКОВА: МОРФОЛОГО-СЕМАНТИЧЕСКИЙ АСПЕКТ

Зубрил я правила грамматики,
А влек меня родной язык.
Н. Рыленков

В истории русской литературы XX века Николай Иванович Рыленков (1909–1969) занимает видное место. Поэт унаследовал в своем творчестве лучшие традиции русской национальной культуры. Он хорошо известен как лирик, писавший о родной природе, Родине, об искусстве, истории и современности, о нравственных проблемах.

Рыленков родился в деревне Алексеевке Рославльского уезда Смоленской области.

По признанию самого поэта, ему всегда казались удивительно точными и емкими слова крестьянского обихода. Это и определило языковой колорит лирики Н. Рыленкова, ведь в говоре смоленского крестьянина затейливо переплелись и русское, и украинское, и белорусское начала. Немаловажную роль в этом сыграло и местоположение Смоленщины, граничащей с семью областями. Из Смоленской земли тонкой ниточкой начинается Днепр, связывающий воедино Смоленскую область с Белоруссией.

Взаимодействие белорусской и русской культур и языков имеет свои специфические черты в силу общности исторических судеб белорусского и русского народов, родства и близости систем двух языков.

В 570 стихотворениях Рыленкова нами выявлено около 80 белорусизмов, среди которых встретились имена существительные (*рушник, пригожесть, кринка, хата, стреха, година, завируха, чарка* и др.), глаголы (*чуять, ладить, пособить, оборонять, покликать* и др.), имена прилагательные (*летошний, пригожий/ая*), наречия (*шибче, завчера*).

Под белорусизмом мы будем понимать принадлежащий системе белорусского языка элемент, употребленный в тексте на русском языке.

К белорусизмам относятся: а) слова белорусского языка, не имеющие полностью совпадающих по форме и содержанию соответствий в русском языке; б) слова белорусского языка, имеющие соответствующие по форме и содержанию слова на русском языке; слова русского языка имеют иную стилистическую окраску либо принадлежат к областной лексике;

в) слова белорусского языка, имеющие соответствия по форме в русском языке при несовпадении объема значений [6].

В стихах Н.И. Рыленкова жизнь природы глубоко сливается с думами о жизни вообще. И пейзаж возникает только во имя внутреннего мира человека. Поэт ощущает природу как откровение и поэтому пишет о ней без громких слов, выражая застенчивую красу России. А белорусизмы в стихотворениях, по замыслу автора, помогают раскрытию поэтической метафоры.

Кто по росе не замочил колена,
Не ел кулеш, что варят косари, –
Тот не *почует* свежести зари
В клочке сухого *летошнего* сена [4, с. 346].

В толковом словаре русского языка Д.Н. Ушакова слово «летошний» трактуется как «прошлогодний» (простореч., обл.) [5]. Это значение совпадает со значением такого же прилагательного в белорусском языке.

В толковом словаре русского языка Ефремовой Т.Ф. чуять – значит 1) а) Чувствовать, познавать органами чувств (обычно обонянием). б) перен. разг. Внутренне ощущать (о человеке). 2) а) перен. разг. (обычно что-л. неприятное). б) Знать, сознавать [1].

В таком же значении этот глагол употреблен автором в анализируемых стихотворениях 9 раз. Например,

По снежку по хрусткому,
Чуя ветра прыть,
Любо сердцу русскому
В санках прокатить [4, с. 86].

…мы могли
Слышать мирное пение птицы,
Чуять запах весенней земли [4, с. 95].

Еще одно прилагательное, попавшее в поле зрения, – *пригожий /ая*:

Видишь – день погожий да *пригожий*
Разогнал туман с окрестных троп [3, с. 55].

Ты пройдись, *пригожая,*
По тропинкам хоженым [4, с. 41] –

в толковом словаре русского языка Ефремовой Т.Ф. определяется как 1) нар.-поэт. Красивый, миловидный, с привлекательной внешностью; 2) ясный, теплый, солнечный (о погоде); 3) устар. Такой, как требуется, а в толковом словаре белорусского языка как 1) который приносит наслаждение своим внешним видом, определяется гармонией красок, линий, форм; 2) который имеет богатое внутреннее содержание, определяется внутренней прелестью; 3) неодобрительно. Эффектный внешне, но бессодержательный.

Среди глаголов достаточно частотным (3 словоупотребления) оказался *ладить*, что означает 1) разг. неперех. Жить дружно, в согласии, быть в ладу с кем-л. 2) а) местн. перех. Изготовлять, мастерить, строить.

б) Приводить в порядок, налаживать. в) Настраивать (музыкальный инструмент). 3) разг.-сниж. Намереваться, готовиться (обычно с инфинитивом). 4) разг.-сниж. Стараться, норовить. 5) разг.-сниж. перех. Говорить одно и то же; твердить.

То для внучки *ладит* душегрейку [3, с. 279].
Недаром издавно заведено,
Что свадьбы *ладятся* у нас,
Когда дары свои заветные
Зима выносит напоказ [4, с. 421].

В белорусском языке подобный глагол выступает в тех же лексических значениях.

Нами зафиксированы разовые употребления таких глаголов, как *покликать, пособить, голосить, оборонять*:

Лучше пусть засохнет мята
От тоски девичьей,
Чем тебя я на закате
Позову-*покличу* [4, с. 204].
А посмотрит – у невесток дети,
Надо каждой *пособить* немножко [3, с. 279].
Но вновь у каждого колодца
Навзрыд Россия *голосит!* [3, с. 273]
Отец на фронт уехал –
Москву *оборонять* [3, с. 259].

В толковом словаре С. Ожегова оборонять – защищать, отражая нападение противника. В белорусском языке значение данного глагола шире: 1. Отбивать нападение, предохранять от нападения, неприязненных или враждебных действий. 2. Выступать на суде в качестве защитника. 3. На специальном заседании добиваться признания достоинства научной работы, дипломного проекта с целью получить соответствующую квалификацию [2].

Более широкую семантику в белорусском языке имеет и существительное *росстань*. Если толковый словарь русского языка Ефремовой Т.Ф. определяет росстань как перекресток двух дорог, то в толковом словаре белорусского языка находим I 1. Действие по значению глагола расставаться – расстаться; разлука. 2. Время, проведенное далеко от близких. II Место перекрестка двух или нескольких дорог.

Из камня высеченный идол
У *росстаней* стоял века [3, с. 128].
А когда сошла ты на вокзале,
Мы пошли на *росстани* встречать [3, с. 57].

Белорусское слово может нести в художественном произведении чрезвычайно важную эстетическую нагрузку. Таковым, например, является белорусское *хата.* В народном белорусском сознании «хата» – символ величайшей ценности.

Слово *хата* встречается в большинстве славянских языков: украинском, белорусском, русском, польском, чешском и словацком. В русском языке употребление этого слова означало плохую избу. С.И. Ожегов, Н.Ю. Шведова в толковом словаре русского языка указывают: хата, -ы, ас. На Украине, в Белоруссии, на юге России: крестьянский дом.

У стариков суровых
Перенимал я хитрую науку,
Как строить *хаты* [3, с. 156].
А я в тревоге молодой
Сказал «прости» отцовской *хате* [3, с. 32].

В целом белорусизмы-существительные, которые использует Н. Рыленков, не различаются семантикой в русском и белорусском языках:
Там закопаны в землю большие молочные *кринки* [3, с. 77]. Вышивала широкие *рушники* [3, с. 63]. Соберутся девушки на *роздых* [3, с. 57]. Заснул *с устатку* до рассвета [3, с. 382]. Вновь сентябрь поджигает сухую листву на осинах // Рдеет каплями крови на кочках брусники в *гаю* [3, с. 120]. С утра мороз, а днем *стреха* косая // Звенит капелью, птиц сводя с ума [4, с. 134]. Слышишь полных *чарок* звон? [4, с. 198] И не слышит вьюги-*завирухи* [3, с. 279].

Таким образом, мы видим, что слова белорусского языка, встречающиеся в текстах Н. Рыленкова, имеют в основном соответствующие по форме и содержанию слова в русском языке.

Литература

1. Ефремова, Т.Ф. Толковый словарь русского языка / Т.Ф. Ефремова. – М., 2009.
2. Ожегов, С.И. Толковый словарь русского языка / С.И. Ожегов, Н.Ю. Шведова. – М., 1992.
3. Рыленков, Н.И. Избранные произведения. В 2-х томах. Т. 1 / Н.И. Рыленков. – М., 1974. – 464 с.
4. Рыленков, Н.И. Избранные произведения. В 2-х томах. Т. 2 / Н.И. Рыленков. – М., 1974. – 512 с.
5. Ушаков, Д.Н. Толковый словарь русского языка / Д.Н. Ушаков. – М., 2000.
6. http://www.bsu.by/Cache/pdf/216973.pdf.

Н.А. Снігірова (Мінск)

З ВОПЫТУ АНАЛІЗУ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКІХ АРЭАЛЬНЫХ СЫХОДЖАННЯЎ

Ва ўмовах міждыялектных і міжмоўных кантактаў на тэрыторыі моўна-культурнага польска-беларускага пагранічча можна сустрэць розныя тыпы арэальных сыходжанняў. Аналіз лексіка-семантычных з’яў, адзначаных у паўночна-ўсходніх гаворках Польшчы, выявіў характэрныя інавацыі, прастымуляваныя як агульнымі арэальнымі і ўнутрымоўнымі

заканамернасцямі, так і асаблівасцямі кантактнай, заходне-ўсходнеславянскай і балта-славянскай, зоны.

Сярод польска-беларускіх лексіка-семантычных супадзенняў вылучаецца лексема ***skaracz***, разгледжаная Э. Коніш падчас ажыццяўлення супастаўляльнага даследавання лексікі “Słownika gwar polskich” [15] і “Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі” [7], [16, с. 68]. Згодна з апісаннем Я. Карловіча, назва *skaracz* мае значэнне ‘ручнік з вышыўкай на канцах або фрэнзлямі; вісіць у хаце пастаянна і служыць усім жыхарам’, паходзіць ад Трок, Ліды, Свяньцян [15, т. 5, с. 140]. Акрамя таго, па дадзеных Э. Коніш, лексема *skaracz* ‘ручнік з фрэнзлямі або вышыўкай на канцах, для агульнага карыстання ў хаце’ характарызуецца як дыялектызм беларускага паходжання [16, с. 68]. Арэал адпаведнай польскаму слову з’явы – *скарач* – распаўсюджаны пераважна на тэрыторыі паўднёва-заходняй Беларусі [6, т. 4, к. 184, 186]. У адпаведнасці з тлумачэннем “Слоўніка беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі” назва можа абазначаць: ‘кавалак палатна з канцамі асновы, які застаецца пасля заканчэння ткання’, ‘канец палатна з заплеценымі хвастамі’, ‘брудная ануча’ [7, т. 4, с. 439 – 440]. “Этымалагічны слоўнік беларускай мовы” [13], акрамя вышэй прыведзеных значэнняў слова *скарач*, называе ‘ручнік з апошняга куска палатна, якое выткана на канцах з “анучамі”, г. зн. з ніткамі, якія недатканыя і звіваюцца ў шнуркі’, ‘абрус, якім накрываюць хлебную дзяжу’, ‘тоўстае палатно’, ‘перан. брудны чалавек; хто выпэцканы’ [13, т. 12, с. 117]. Падобная семантыка ўласціва лексеме *скарач*, уключанай у склад “Дыялектнага слоўніка Брэстчыны” [6]: ‘ручнік’, ‘канец палатна разам з ніткамі, якія застаюцца недатканымі і звіваюцца ў шнуркі’ [3, с. 204]. Паводле лексічных матэрыялаў А.П. Цыхуна, сабраных на Гродзеншчыне, *скара́ч* – гэта ‘абрус, настольнік’: “*У нас пасьля Вялікадня кожны гаспадар браў косьці сь сьвянцонага, закручваў у скарач і нёс на сваё поля закопваць*” [10, с. 129]. Але ў Мастоўскім, Навагрудскім, Карэліцкім р-нах *скара́ч* абазначае ‘ручнік’ [11, с. 53]. У Верхнядзвінскім р-не словы *скара́ч*, *скыра́ч* зафіксаваны ў значэнні ‘ануча, якой вымаюць гаршкі з печы’ [12, с. 160]. На Мсціслаўшчыне аднакарэнны дзеяслоў *скаравець* ужываецца з семантыкай ‘зрабіцца брудным, закарэлым’ [14, с. 214]. У той жа час роднасны словам *скарач* і *скаравець* назоўнік *скарачка* вядомы са значэннем ‘кужэльны ручнік’ на Гродзеншчыне [9, с. 434]. Вышэй выкладзеныя факты з’яўляюцца сведчаннем таго, што на беларускай тэрыторыі лексема *скарач* функцыянуе з багатай і разнастайнай семантыкай, выкарыстоўваючыся больш прадуктыўна ў параўнанні з польскай мовай.

Лексічная адзінка *скарач* кваліфікавана Г.А. Цыхуном як балтызм, вядомы на абмежаванай тэрыторыі, у прыватнасці – на тэрыторыі Гродзенскай вобласці (параўн. літоўскае *skarà* ‘(вялікая) хустка’) [11, с. 53]. Ю.А. Лаучутэ параўноўвае слова *skaracz* з літоўскага *skarà* ‘кавалак матэрыі’, *skarõčius* ‘ручнік, абрус’ і падкрэслівае: “магчыма, што прыведзеная дыялектная форма з’яўляецца адваротным запазычаннем з беларускай мовы. У такім выпадку

крыніцай запазычання ў славянскія мовы магло быць літоўскае *skarà* ‘*вялікая хустка*’, параўн. таксама *skarinìs, skarinỹs* ‘*ручнік*’” [5, с. 38], [13, т. 12, с. 117]. Даследчыца адносіць лексему *skarinis* да шэрагу балтызмаў у адной славянскай мове – польскай [5, с. 38].

У сувязі з недастатковай, паводле меркавання складальнікаў “Этымалагічнага слоўніка беларускай мовы”, аргументаванасцю балцкай этымалогіі цікавымі падаюцца спробы звязаць слова з серба-харвацкім дыялектным *škora* ‘вузел, пятля’, *skȍrak* ‘тс’, польскім дыялектным *skory* ‘вузлікі на моцна скручаным шнурку’, што паводле асноўнай прыкметы ‘апошні кавалак палатна з заплеценымі ў вузлы канцамі асновы’ дазваляе рэканструяваць зыходнае **skora* ‘вузялок, пятля’ (параўн. індаеўрапейскае **sker-* ‘круціць, скручваць’), якое можна разглядаць як раннюю праславянскую інавацыю, выцесненую амонімам **skora* ‘кара, шалупайка, шкарлупа, скура’ ” [13, т. 12, с. 118]. В. Непакупны бачыць працяг слова ў палескай форме з метатэзай *роскáч* ‘тс’ [13, т. 12, с. 118].

Славянскія рэфлексы праславянскага **(s)korakъ* маюць моцна разгалінаваную семантыку [4, с. 265]. У якасці інтэгральных семантычных прымет для іх могуць быць прызнаны, згодна з думкай Р.М. Казловай, ‘крывы, раздвоены’, ‘крывы, выгнуты, хвалісты’, ‘крывы, сагнуты, выпуклы’, якія правамоцна характарызаваць як зыходныя з індаеўрапейскага кораня **(s)ker* ‘круціць, вярцець, згінаць’ [4, с. 265]. Таму можна разглядаць беларуска-польскае лексіка-семантычнае супадзенне *скарач* / *skaracz* як утварэнне, якое ўзнікла на базе **(s)korakъ, *(s)koraka* ў выніку суфіксальнага пашырэння.

Функцыянаванне фарманта *-ач / -acz* у прадметным значэнні звязана з выкарыстаннем яго амаль усімі славянскімі мовамі для ўтварэння назваў прадметаў у асноўным па працэсуальнай прымеце [2, с. 65]. У польскай мове суфікс *-acz* служыць у першую чаргу для ўтварэння nomina instrumenti (*drapacz, łamacz, wyrywacz*…), для ўтварэння іншых лексіка-семантычных груп ён выкарыстоўваецца рэдка [2, с. 66]. Сярод гэтых імёнаў назвы прадметаў гаспадарча-бытавога прызначэння, утвораныя з удзелам суфікса *-ач*, асабліва актыўныя ў беларускай дыялектнай мове. Беларускі рэгіянальны (Брэстчына, Гродзеншчына) тып утварэння назваў канкрэтных прадметаў паводле ўласцівасцей, аб’ектаў або выніку дзеяння з’яўляецца прадуктыўным (напрыклад *скарáч* ‘скарэлы ручнік’, *курáч* ‘нагар на кноце’, *сукáч* ‘ссуканая пятля’, *кіváч* ‘маятнік’, *трапáч* ‘жменя атрэпанага лёну’...) [8, с. 32]. Разам з тым утварэнне найменняў прадметаў паводле іх прызначэння ад асноў дзеясловаў (*дзяркач, пугач, сякач, цягач*...) малапрадуктыўнае ў літаратурнай мове [1, с. 102]. Большай прадуктыўнасцю яно характарызуецца ў гаворках як беларускай, так і польскай мовы. Разыходжанні ў актыўнасці і сферы выкарыстання фарманта *-ач / -acz* у гэтых мовах даюць падставы меркаваць, што інавацыя *skaracz* утворана пад уплывам словаўтваральных сродкаў, асабліва актыўных у беларускіх дыялектах. Дастаткова шырокае прымяненне фарманта, ужывальнасць якога як суфікса прадметнасці абмежаваная ў польскіх дыялектах, указ-

вае на магчымасць запазычання з беларускай мовы. Дадзеную гіпотэзу таксама пацвярджае арэальны малюнак з'явы, адсочаны на беларускай тэрыторыі.

З вышэй выкладзенага вынікае, што ў польскіх гаворках лексема *skaracz* засвоіла толькі адно значэнне, якое "ў адносінах да асноўнага беларускага значэння звужана: 'адпаведным чынам завершаны кавалак палатна для выцірання рук' " [16, с. 68]. Таму лексіка-семантычнае новаўтварэнне *skaracz* у польскай мове можа быць інтэрпрэтавана як сістэмная інавацыя беларуска-літоўскага паходжання, утвораная ад літоўскага *skarà* марфалагічным спосабам пры дапамозе прадуктыўнага ў памежных беларускіх гаворках суфікса *-ач /-acz*.

Літаратура

1. Беларуская граматыка: у 2 ч. / АН БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэд. М.В. Бірыла, П.П. Шуба. – Мінск: Навука і тэхніка, 1985. – Ч. 1: Фаналогія. Арфаэпія. Марфалогія. Словаўтварэнне. Націск. – 431 с.
2. Вендина, Т.И. Дифференциация славянских языков по данным словообразования / Т.И. Вендина. – М.: Наука, 1990. – 168 с.
3. Дыялектны слоўнік Брэстчыны / склад.: М.М. Аляхновіч [і інш.]. – Мінск: Навука і тэхніка, 1989. – 294 с.
4. Козлова, Р.М. Прасл. *(s)*korakъ*, *(s)*koraka* и их рефлексы в славянских языках / Р.М. Козлова // Общеславянский лингвистический атлас: материалы и исслед., 1982 / АН СССР, Ин-т рус. яз.; отв. ред. В.В. Иванов. – М., 1985. – С. 265–271.
5. Лаучюте, Ю.А. Словарь балтизмов в славянских языках / Ю.А. Лаучюте; Акад. наук СССР, Ин-т языкознания. – Л.: Наука, 1982. – 211 с.
6. Лексічны атлас беларускіх народных гаворак: у 5 т. / Акад. навук Беларусі, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэдкал.: М.В. Бірыла (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Фонд фундам. даслед. Рэсп. Беларусь, Кам. геадэзіі пры Савеце Міністраў Рэсп. Беларусь, 1993–1998. – 5 т.
7. Слоўнік беларускіх гаворак паўночна-заходняй Беларусі і яе пагранічча: у 5 т. / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа ; уклад.: Ю.Ф. Мацкевіч [і інш.]; пад рэд. Ю.Ф. Мацкевіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1979–1986. – 5 т.
8. Сцяцко, П.У. Беларускае народнае словаўтварэнне: афіксальныя назоўнікі / П.У. Сцяцко; рэд. М.В. Бірыла. – Мінск: Навука і тэхніка, 1977. – 320 с.
9. Сцяшковіч, Т.Ф. Слоўнік Гродзенскай вобласці / Т.Ф. Сцяшковіч. – Мінск: Навука і тэхніка, 1983. – 671 с.
10. Цыхун, А.П. Скарбы народнай мовы: з лексічнай спадчыны насельнікаў Гродзенскага раёну: кніга-слоўнік / А.П. Цыхун; Гродзен. дзярж. ун-т. – Гродна, 1993. – 244 с.
11. Цыхун, Г.А. Адказы на анкету па праблеме «Лексічныя балтызмы ў беларускай мове» / Г.А. Цыхун // Лексічныя балтызмы ў беларускай мове: матэрыялы для абмеркавання / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск, 1969. – С. 49–53.
12. Шаталава, Л.Ф. Беларускае дыялектнае слова / Л.Ф. Шаталава / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа; рэд. Г.У. Арашонкава. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 208 с.
13. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы / Акад. навук БССР, Ін-т мовазнаўства імя Я. Коласа. – Мінск: Навука і тэхніка, 1978– . – 13 т.
14. Юрчанка, Г.Ф. Сучаснае народнае слова: з гаворкі Мсціслаўшчыны: слоўнік / Г.Ф. Юрчанка; рэд. А.А. Крывіцкі. – Мінск: Навука і тэхніка, 1988. – 256 с.

15. Karłowicz, J. Słownikgwarpolskich: w 6 t. / ułożył J. Karłowicz. – Kraków: Akad. Umiejętności, 1900–1911. – 6 t.

16. Konisz, E. O polsko-białoruskich zbieżnościach leksykalno-semantycznych udokumentowanych w słownikach gwarowych: Jana Karłowicza oraz północno-zachodniej Białorusi i jej pogranicza (na wybranych przykładach) / E. Konisz // Studia linguistica in honorem Stanislae Stachowski / red. E. Mańczak-Wohfeld.– Kraków, 2000. – S. 61–71.

І.А. Струц (Мінск)

РАЦЫЯНАЛЬНАЕ І ЭМАЦЫЯНАЛЬНАЕ Ў СІМВОЛІЦЫ КОЛЕРАКОДАЎ *ЗЯЛЁНЫ, ЖОЎТЫ* І *ШЭРЫ*

Колер як моўны знак ужываецца пісьменнікамі для вобразнага адлюстравання рэчаіснасці. Аднак паступова «мастацкае выкарыстанне слова імкнецца да таго, каб адарвацца ад знака, стаць сімвалам», які ўжо «валодае асаблівай сэнсавай глыбінёй, зададзенай кантэкстам культуры» [9, с. 15]. Колерасімвал становіцца свайго роду канцэптам, які «базуецца на вобразе» [2, с. 337] і адначасова выступае «індыкатарам этнічнай спецыфікі дзейнасці розуму» [6, с. 78]. Такая асаблівасць колеравай семантыкі ярка праяўляецца ў мове твораў беларускіх паэтаў першай трэці XX стагоддзя, літаратурная дзейнасць якіх разнастайна і поўна адлюстравала ўздым адраджэння нацыянальнай беларускай культуры і свядомасці ў пачатку XX ст., стала штуршком для далейшага развіцця беларускай мовы і літаратуры.

Прадметам даследавання ў дадзеным артыкуле выступаюць лексемы са значэннем зялёнага, жоўтага і шэрага колеру ў складзе колеравобразнай намінацыі, іх сімволіка-асацыятыўны патэнцыял.

Агульныя заўвагі пра сувязь колеракодаў *зялёны, жоўты* і *шэры.*

Як вядома, *зялёны* і *жоўты* знаходзяцца побач у колеравым коле: зялёны колер – сярэдні паміж жоўтым і блакітным. Да таго ж слова *зялёны* паходзіць ад таго самага кораня, што і слова *жоўты* [1, с. 85]. У народнай культуры старажытных славян таксама зафіксаваны выпадкі ўспрымання «зялёнага колеру як ‘бліскучага’, ‘які ззяе’, падобнага да жоўтага і залатога» [8, с. 305].

Сувязь *зялёнага* і *шэрага* будзе зразумелай, калі ўзгадаць, што зялёны і шэры паводле няўласных якасцей адносяцца да ліку халодных. Як правіла, тэрмічныя асацыяцыі з дадзенымі колеравамі адзінкамі ў кантэксце мастацкага твора актывізуюць сімвалічнае выкарыстанне каларонімаў для адлюстравання эмацыянальна-псіхалагічнай характарыстыкі рэалій, стану чалавека. Прычым менавіта адмоўная канатацыя выступае адным з асноўных элементаў у збліжэнні семантыкі лексем *шэры* і *зялёны* (напрыклад, *«…у карунках **зялёных** – туга ў футарале…»* (У. Дубоўка) – *«…у колерах **шэрых** туга…»* (А. Дудар).

Як бачна з матэрыялу, у паэтычнай мове значэнне жоўтага колеру можа перадавацца колеранайменнямі *залаты, залацісты*, *пазалота* і г.д., шэрага – *срэбраны*, *срэбны*, *серабрысты*, *срэбра* і г. д. Непасрэдна з вобразна-асацыятыўнай парай *жоўты – залаты* і *шэры – срэбраны* звязаны міфапаэтычныя ўяўленні старажытных славян пра золата, якое паходзіла ад сонца, і серабро, якое паходзіла ад месяца [5, с. 107], а ў цэлым і тое, і другое ад нябесных свяцілаў. Атаясамленне залатога з сонечным святлом, сярэбранага – з месячным знаходзім і ў творах беларускіх аўтараў: *«сонца* ***златакудрае***» (М. Чарот) – «*…**срэбраны** серп пазірае са ўзвышша…*» (Я. Колас).

Аднак сэнсавая «роднасць» *зялёнага*, *жоўтага* і *шэрага* абумоўлена не толькі гістарычна. Вынікі аналізу семантычнай структуры згаданых колеракодаў дазваляюць сцвярджаць яшчэ адну прычыну сувязі трох (на першы погляд зусім розных) колеракодаў – наяўнасць так званага рацыянальнага і эмацыянальнага пачаткаў у колеравай сімволіцы зялёнага, жоўтага і шэрага.

Рацыянальнае ў сімволіцы колеракодаў, або *зелень* вясны, *золата* восені, *срэбра* зімы.

Варта падкрэсліць, што зялёны і жоўты – гэта цалкам прыродныя колеры. У асацыятыўным плане <u>*зялёны*</u> можна разглядаць як колер раслiннага свету, вясны і інш. (*«Ізноў вясна, зноў* ***зелень*** *руцянее…»* (Ц. Гартны); *«У белым убраньні зіма, / вясна – / у* ***зялёным*** *адзеньні…»* (П. Глебка); <u>*жоўты*</u> – колер сонца, пяску, восені і інш. (*«[сонца] узышло ў бліскучай шаці /* ***Залатое*** */ І пястуець… / Усё жывое…»* (А. Гарун), *«На пясок на* ***жоўты****… / я … галаву схілю…»* (У. Дубоўка), «***Ажоўклая*** *восень, плаксівая восень, – / Гэтакай сумнай даўно ня было…»* (Я. Пушча). «Дух прыроды» прысутнічае і ў спалучэннях элементаў колеракода <u>*шэры*</u> з некаторымі групамі артэфактаў. Так, напрыклад, адценні шэрага дапамагаюць аўтарам па-мастацку дэталізаваць апісанне зімовай пары (*«Бяроза* ***сіва****, / У мароз прыбрата…»* (Цётка), «*…**срэбны** сьнег іскрыцца…»* (Я. Купала), перадаць харaство зорнага неба (*«Зазьзяе* ***серабром*** *іголак / Зор грамада…»* (М. Багдановіч) або ахарактарызаваць «зыбскі іздрог» [4, с. 149] аб’ектаў воднай прасторы (*«…**серабрыстая** рэчка плыла…»* (К. Буйло), «***Стальлю*** *возера блішчыць…»* (Я. Колас) і г.д.

Ва ўсіх адлюстраваных вышэй прыкладах відавочны рацыянальны падыход у колеравобразным апісанні навакольнага асяроддзя, сутнасць якога праяўляецца ў імкненні аўтараў звязаць *зялёны*, *жоўты* і *шэры* з канкрэтнымі прадметамі або з’явамі прыроды.

З матэрыялу бачна, што паэты несвядома атаясамліваюць цыклічнасць у прыродзе з біялагічным часам чалавека: *зялёны* тон вясны – з маладосцю, юнацтвам (напрыклад, *«[Алесь] – зусім дзіця, блазнота, /* ***Зелен****, як пурышка…»* (Я. Колас), часам росквіту, аднаўлення і духоўнага адраджэння, а ў цэлым з жыццём, яго моцай *(«Вясна прыйшла!.. / У бляску*

сонца, у ***зеляніне****, / У прыгажосьці, у ярыне, / Сама – пекнасьць…»* (А. Гарун), *«Жыцьцё маё… / з лісьцём* ***зялёным*** *песьні заспявае…»* (У. Дубоўка); *жоўты* і *шэры* тон восені – са старасцю, затуханнем, тленнем, распадам і як вынік – са смерцю («*Бачыў сьмерць і прыкрую сьлізоту, – / Гэта кроў асеньняй* ***пазалоты****, / Гэта боль надломанай душы…*» (П. Трус), «*...Ад вякоў струхнелы* ***сівы*** *бор…*» (М. Чарот), *«И кепска бабульцы: /* ***Сивая****, худая… / ...зйолки збирая…»* (Я. Купала), *«Ня скажа ліпаў выцьвіўшая* ***медзь*** */ Пра тое – што калісьці адзьвінела, / Што будзе ў* ***шэрані*** *над сьцежкамі зьвінець…»* (Т. Кляшторны).

Эмацыянальнае ў сімволіцы колеракодаў, або інверсія *зялёнага* і *жоўтага*, пасіўнасць *шэрага.*

Вядома, што «колер можа дзякуючы асацыяцыям набываць пэўную эмацыянальную афарбоўку або выклікаць тыя ці іншыя пачуцці ў залежнасці ад вопыту, набытага чалавекам пры ўспрыманні колеру і адпаведнага прадмета» [10, с. 103].

Як паказвае матэрыял, колеракоды *зялёны, жоўты і шэры* – гэта эмацыянальна-экспрэсіўныя элементы колеравобразнай сістэмы, здольныя ўступаць у рознага віду сувязі з семантычнымі канкрэтызатарамі настрою, стану чалавека. Напрыклад, колеравобраз суму: *«Люблю больш я /* ***залатазвонны*** *сум…»* (Я. Пушча); колеравобраз журбы: «*Грае гучная труба, / Нібы* ***срэбранаю*** *хваляй / З гушчару плыве журба…»* (Я. Колас), *«Песьні, песьні!.. / Ваш нясьмелы напеў не абрэжа /* ***срэбраковаых*** *струн журбы…»* (А.Дудар); колеравобраз жалю: *«Жаль заплятаецца ў* ***сівыя*** *косы…»* (М. Лужанін); колеравобраз тугі: *«…тугу жыцьцё ў лісьці* ***пазалаціла...****»* (У. Дубоўка); колеравобраз расчараванасці, безвыходнасці: *«Жыцьцё – глыбінь!.. / На глыбіні / Ты бачыш / Цёмны свой адбітак, /* ***Зялёнай*** *цінаю / Пакрыты…»* (П. Трус), *«Чаму-ж мой сьвет гэтакі* ***шэры****?..»* (К. Буйло), *«Жыцьцё маё!.. / Прадоньне* ***шыза-цёмнае…****»* (У. Дубоўка).

Што датычыцца колеракодаў *жоўты* і *зялёны*, то яны валодаюць дваістым характарам уздзеяння на чытача. Такая ўласцівасць колераваў адзінкі ў навуковай літаратуры атрымала назву “інверсія колеру” [7]. Аднак калі інверсія *зялёнага* тлумачыцца амбівалентнасцю колераваў сімволікі асноўнага элемента колеравага рада (напрыклад, зялёная радасць – зялёны сум: *«Жыцьцё на крывавых руцінах, / А радасьць у віхры* ***зялёным…****»* (Я. Пушча) – *«На іхніх [пасялкоўцаў] тварах смутак* ***зелянеў****, / Нібы вада ў астоеных затонах…»* (Т. Кляшторны), то інверсія *жоўтага* ўяўляе сабой больш складаны працэс. Так, дамінанта колеравага рада – лексема *жоўты* – звычайна ўжываецца з адмоўнай канатацыяй і ўдзельнічае ў стварэнні колеравобраза нешчаслівага лёсу *(«Ой ты,доля мая невясёлая! / Мая доля –* ***пажоўклы*** *быльнёг!..»* (П. Трус) або асацыюецца са смуткам, журбой і пад. («***…жоўкне*** *смутак…»* (У. Дубоўка), *«Мае вочы журбу утапілі / У ...****пажоўклай*** *лісьтве…»* (П. Трус). Розныя ж адценні жоўтага, наадварот, прызначаны для колераабазначэння пачуцця радасці і шчасця:

«…радасьць-сьмех, / Як ***цьвет асеньніх зораў…»*** (П. Трус), *«…шчасьця палае прасьвет, / Як самага* ***сонейка цьвет…»*** (Я. Купала). Акрамя гэтага, у вершаваных творах беларускіх аўтараў колеравобраз шчасця сімвалічна звязаны з колеравобразам сонца: *«Доўга людзі ў дзень блудзілі / Крыўду, сьлёзы, кроў пладзілі, / Ўсё ня ўмелі жыць, / А сягоньня ўжо ня тое, – / Ўсходзе сонца з****алатое / Роўна ўсім сьвяціць…»*** (Я. Купала). І невыпадкова, бо сонца са старажытных часоў «лічылася боствам добрым, міласэрным». Паступова «імя яго зрабілася сінонімам шчасця» [3, с. 27]. Пад уздзеяннем сацыяльна-палітычных змен у грамадстве на пачатку XX ст. адбываецца далейшая трансфармацыя семантыкі каларонім*а залаты. Залаты* пачынае асацыятыўна збліжацца са словам *вольны* і ўжывацца ў значэнні ‘*шчаслівы, таму што вольны*’: *«І абшар нашай вольнай краіны / Ясным сонцам увесь* ***азалоціцца…»*** (М. Чарот). У выніку да першапачатковай пары *сонца – золата* далучыліся новыя паняцці, якія сталі членамі адзінага сінінімічнага рада: *сонца – золата (залаты) – шчасце (шчаслівы) – воля (вольны).*

У заключэнне адзначым, што разгледжаны намі матэрыял адносна характару праяўлення рацыянальнага і эмацыянальнага пачаткаў у сімволіцы колеракодаў *зялёны, жоўты* і *шэры* сведчыць пра арыгінальнасць, складанасць і мнагазначнасць мастацкага мыслення паэтаў, дапамагае дакрануцца да глыбіні чалавечай свядомасці і праз індывідуальна-асабовую культурную дзейнасць выявіць вобразна-сімвалічны патэнцыял, а таксама спецыфіку традыцыйных колеравых прыярытэтаў беларускага народа.

Літаратура

1. Абрагімовіч, М. Жоўты, зялёны, аранжавы, памяранцавы: з гісторыі слоў / М. Абрагімовіч. – Роднае слова. – 2007. – № 12. – С. 85 – 86.
2. Арутюнова, Н.Д. Язык и мир человека / Н.Д. Арутюнова. – 2-е изд., испр. – М.: Языки русск. кул-ры, 1999. – 896 с.
3. Афанасьев, А.Н. Мифология Древней Руси / А.Н. Афанасьев. – М.: Изд-во Эксмо, 2006. – 608 с.
4. Белый, А. Мастерство Гоголя: Исследование / А. Белый. – М.: МАЛП, 1996. – 351 с.
5. Кабашнікаў, К. Малыя жанры беларускага фальклору ў славянскім кантэксце / К. Кабашнікаў. – Мн.: Беларуская навука, 1998. – 240 с.
6. Каспяровіч, В.В. Тэорыя сімвалаў абрадавай паэзіі і класіфікацыя функцый вясельнай сімволікі / В.В. Каспяровіч // Весці НАН Беларусі. Серыя гуманітарных навук. – 2005. – № 5. – С. 77–82.
7. Конон, В.В. Особенности языка художественных произведений Д.С. Мережковского (Сравнения цвето- и светообозначения): автореф. дис. ... канд. филол. наук: 10.02.02 / Белорус. гос. пед. ун-т им. Максима Танка. – Мн., 2002. – 19 с.
8. Славянские древности: Этнолингвистический словарь в 5-ти томах / под ред. Н.И. Толстого. – Т. 2: Д – К. – М.: Международные отношения, 1999. – 704 с.
9. Сырица, Г.С. От текста к слову: учебное пособие / Г.С. Сырица. – Даугавпилс: Saule, 2005. – 295 с.
10. Цойгнер, Г. Учение о цвете: Попул. очерк / Г. Цойгнер. – М.: Стройиздат, 1971. – 159 с.

К.Р. Федарцова (Гомель)

СКАРЫНЕ ЦІ *СКАРЫНУ*: ПРАБЛЕМА СКЛАНЕННЯ ЗНАКАМІТАГА ПРОЗВІШЧА

Уласныя імёны і прозвішчы складаюць асобную, даволі вялікую групу слоў, якія ўстойліва бытуюць у грамадстве, пастаянна пераходзячы ад пакалення да пакалення, ад аднаго народа да другога. Устойлівасць гэтай лексікі прадвызначае і ўстойлівасць напісання імён і прозвішчаў у адпаведнасці са стабільнымі, праверанымі часам правіламі.

Пытанне стабілізацыі правапісных нормаў сучаснай беларускай літаратурнай мовы часткова знята, дзякуючы падрыхтаваным і дзеючым з 2010 г. “Правілам беларускай арфаграфіі і пунктуацыі”. На жаль, змены ў граматычных правілах чакаюць свайго часу. У прыватнасці, пытанні, звязаныя са склонавымі канчаткамі ў некаторых прозвішчах, заўсёды выклікалі цяжкасці, а ў выніку – памылкі. Але адна справа, калі размова ідзе пра рэдкаўжывальныя прозвішчы, а зусім іншая, калі маем разнабой у напісанні агульнавядомых прозвішчаў.

Так, асоба Францыска Скарыны вядома не толькі ўсходнім славянам, але і ўсяму свету. Аднак аказваецца, што мы, беларусы, дакладна не ведаем, як скланяецца прозвішча нашага знакамітага асветніка. Здаецца, на падставе “Слоўніка асабовых уласных імён” [1], у якім прыводзіцца скланенне і гэтага прозвішча, праблема павінна быць вырашана: “Калі прозвішчамі служаць назвы прадметаў жаночага роду (за выключэннем прозвішчаў на ***-ь*** і ненаціскныя ***-га, -ка, -ха***), то такія прозвішчы скланяюцца незалежна ад роду іх носьбітаў па тыпу адпаведных агульных назоўнікаў з мяккай, цвёрдай і зацвярдзелай асновамі, напрыклад: *Н. Скарына, Р. Скарыны, Д. Скарыне, В. Скарыну, Т. Скарынай, М. аб Скарыне*” [1, с. 165 – 166].

Аднак артыкул В. Лемцюговай прымушае не пагадзіцца з суаднясеннем паходжання прозвішча Скарына з назвай прадмета жаночага роду. “Адны робяць вытворным яго ад прыметніка “скорый” (“хуткі, шпаркі”), іншыя – ад слова “скора” (“шкура, сырая скура”) (“Слоўнік” У. Даля)... А яшчэ існуе думка, што імя Скарына ўтворана ад слова “скарына”, “скарынка” (пра хлеб). Усе гэтыя версіі абвяргае навука антрапаніміка” [2, с. 14]. Далей В. Лемцюгова прыводзіць вынік навуковага даследавання польскага анамаста М. Малец, дзе даказана, што прозвішча Скарына з’яўляецца скарочаным варыянтам старажытнаславянскіх (дахрысціянскіх) састаўных імён з пачатковай часткай **Скор-**, напр.: *Скарамір, Скараслаў, Скаралюб* і пад.

Прыведзеныя вышэй звесткі даюць падставу аднесці прозвішча Скарына да іншай групы слоў паводле іх скланення. “Калі прозвішчамі служаць назвы прадметаў ніякага роду, а таксама назвы прадметаў, род якіх

выразна не выступае, то такія прозвішчы скланяюцца толькі тады, калі іх носьбітамі з'яўляюцца асобы мужчынскага роду" [1, с. 167]. Праскланяем прозвішча ***Скарына*** на ўзор скланення прозвішча ***Купала***, якое прыведзена М.Р. Суднікам: *Н. Купала, Скарына; Р. Купалы, Скарыны; Д. Купалу, Скарыну; В. Купалу, Скарыну; Т. Купалам, Скарынам; М. аб Купалу, аб Скарыну*. Лічым менавіта гэты варыянт правільным.

Як жа прасочваецца аднастайнасць у скланенні прозвішча ***Скарына*** ў навуковай і мастацкай літаратуры? На жаль, аднастайнасці мы не назіраем. Так, у навуковым выданні "Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум" заўважаем розную пазіцыю суаўтараў: у сваіх раздзелах Б.А. Плотнікаў скланяе не атаясамліваючы паходжанне прозвішча з назоўнікам жаночага роду: "...пачынаецца з перакладу біблейскіх кніг на старабеларускую мову Ф. Скарынам" [3, с. 441]; з гэтым, верагодна, не згодна Л.А. Антанюк: "Усходнеславянскае друкаванне, пачатае Ф. Скарынай" [3, с. 353]; "...уведзены Францыскам Скарынай" [3, с. 358].

Падтрымліваюць пазіцыю Б.А. Плотнікава Г.Я. Галенчанка, М.Б. Батвіннік: "Раздзел, прысвечаны Скарыну..." [4, с. 14]; "Асноўнае процідзеянне Скарыну..." [Тамсама]; "...прычыны спынення Скарынам друкарскай дзейнасці" [4, с. 18]; "...супрацоўнічалі са Скарынам" [4, с. 63]; "Выданне Францыскам Скарынам Бібліі..." [5, с. 5]; "закладзены падмурак кнігадрукавання... Францыскам Скарынам" [5, с. 23].

А. Лойка ў сваім рамане-эсэ "Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае" ў давальным склоне выбірае канчатак ***-е*** на ўзор скланення прозвішчаў па назвах прадметаў жаночага роду, напр.: "бог заўсёды знаходзіў яму, Скарыне..." [6, с. 39]; "Скарыне" [6, с. 47, 156]. Канчатак жа творнага склону ***-ам*** тоесны канчатку прозвішча ***Купала***, напр.: "далучыць народ свой, мову яго да вышынь ім, Скарынам, узятых..." [6, с. 17]; "Скарынам" [6, с. 20, 132]. На с. 94 заўважаны разнабой у выбары канчаткаў гэтай склонавай формы, параўн.: "парадкавасць падачы заставак Скарынам" і "такі выбар Скарынаю свайго знаку". Якая прычына варыянтнага канчатка і да якой жа групы слоў аднёс А. Лойка прозвішча Скарына, не зразумела. Паколькі раз у давальным склоне быў канчатак ***-е***, то ў творным павінен быць канчатак ***-ай (-аю)***, параўн.: *Бульбе, Бульбай (-аю)*. Калі ж форма давальнага склону з канчаткам ***-у***, то форма творнага склону павінна мець канчатак ***-ам***, параўн.: *Купалам, Сапегам.*

Такім чынам, пытаннямі склонавых канчаткаў прозвішчаў неабходна працягваць займацца, бо праблема застаецца нявырашанай. Аўтарам новых выданняў неабходна быць вельмі ўважлівымі пры напісанні сваіх твораў, а карэктарам падчас падрыхтоўкі літаратуры да друку. Але пры гэтым усе моманты па скланенні ўласных імён і прозвішчаў варта ўнармаваць і на афіцыйным узроўні ўнесці ўдакладненні.

Аналіз склонавых канчаткаў прозвішча *Скарына* паказаў, што змяненне ўласных імён з'яўляецца справай не толькі асабістай, але і грамад-

скай. Таму неабходна да гэтага пласта лексікі адносіцца асабліва беражліва і ўважліва, захоўваючы лепшыя традыцыі і ўсебакова аналізуючы навуковыя адкрыцці, каб не дапусціць памылак, недакладнасцей ці непаразуменняў.

Літаратура

1. Слоўнік асабовых уласных імён / уклад. М.Р. Суднік; навук. рэд. А.А. Лукашанец. – 2-е выд., выпр. і дапрац. – Мінск: Бел. навука, 2005. – 176 с.

2. Лемцюгова, В. На трех китах / В. Лемтюгова // Советская Белоруссия. – 2014. – 22 нояб. – С. 14.

3. Плотнікаў, Б.А. Беларуская мова. Лінгвістычны кампендыум / Б.А. Плотнікаў, Л.А. Антанюк. – Мінск: Інтэрпрэссэрвіс : Кніжны Дом, 2003. – 672 с.

4. Галенчанка, Г.Я. Францыск Скарына – беларускі і ўсходнеславянскі першадрукар / Г.Я. Галенчанка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1993. – 280 с.

5. Батвіннік, М.Б. Азбука на ўсе часы / М.Б. Батвіннік. – Мінск: Бел. навука, 2003. – 288 с.

6. Лойка, А. Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае / А. Лойка: Раман-эсэ. – Мінск: Маст. літ., 1990. – 382 с.

В.В. Шунейка (Мінск)

СЕМАНТЫКА-СТЫЛІСТЫЧНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА КАЛАМБУРА Ў ГАЗЕТНЫХ ЖАНРАХ

У апошнія гады публіцыстыка мяняе прыёмы атрымання і падачы інфармацыі, спосабы ўздзеяння на аўдыторыю. Канкурэнтаздольнасць, жаданне атрымаць шырокую чытацкую аўдыторыю з’яўляюцца характэрнымі прыметамі сучасных СМІ, якія ўплываюць на характар самой публіцыстыкі. У цяперашні час адбываюцца змены ў традыцыйнай трактоўцы газетна-публіцыстычнага стылю як стылю, які аб’ядноўвае ў сабе стандартнасць у выкладзе матэрыялу і экспрэсіўнасць. Экспрэсіўныя сродкі набываюць інтэлектуальную абвостранасць, стандартныя – становяцца асновай гульнявога трансфармавання і ўдзельнічаюць у фарміраванні выразных сродкаў.

Як вядома, экспрэсіўнасць фарміруецца ў працэсе тэкстаўтварэння праз адбор з вялікай колькасці патэнцыяльных сродкаў, якія б садзейнічалі найлепшаму рашэнню камунікатыўнай задачы, пастаўленай перад аўтарам. Вядомы даследчык газетна-публіцыстычнага стылю В.Р. Кастамараў зазначае, што “…для ўсіх масмедыйных тэкстаў актуальная задача “ўтрымання аўдыторыі”, прычым аўдыторыі масавай і пры неабмежавана разнастайнай тэматыцы” [2, с. 14]. Каб зацікавіць чытача, прымусіць яго “спажыць” усе факты з навін, журналісты імкнуцца ствараць займальныя і арыгінальныя газетна-інфармацыйныя тэксты, выкарыстоўваючы ўвесь арсенал сродкаў выразнасці.

Моўная гульня, асноўным відам якой з'яўляецца каламбур [1, с. 21–22], у якасці такога сродку арыентавана менавіта на прыцягненне і ўтрыманне ўвагі чытача шляхам дэманстрацыі дасціпнасці.

У навуковай літаратуры пад каламбурам разумеецца "разнавіднасць моўнай гульні з устаноўкай на камічны эфект, канструктыўную аснову якой складаюць стылістычныя фігуры, якія абапіраюцца на такія парадыгматычныя адносіны ў лексіцы, як полісемія, аманімія, паранімія (у шырокім сэнсе, уключаючы паранамазію) і антанімія" [3, с. 233–234]. Думаецца, для газетнай публіцыстыкі не заўсёды праграміруецца ўстаноўка на камічны эфект. Зыходзячы са спецыфікі газетна-публіцыстычнаг стылю (у прыватнасці надзённасць, нават злабадзённасць узнятых тэм), журналіст можа выкарыстоўваць такую моўную гульню для выказвання, напрыклад, з'едлівай іроніі ці захаплення.

Каламбур звычайна будуецца на сумяшчэнні прамога і пераноснага значэння слова ці на супадзенні гучання слоў (словазлучэнняў) з рознымі значэннямі, у выніку чаго адбываецца сэнсавы зрух. Думка, выражаная ў каламбурнай форме, выглядае больш яскравай, вострай; журналіст звяртае ўвагу чытача на абыгранае слова: *Сяргей Крапівін* ***слова*** *– любіць! Паверце на* ***слова****... (ЛіМ, 14.03.1997); Якім бачыцца вам яго Верхні і Ніжні замкі, набярэжная Дзвіны, плошча Свабоды, з-за якой і разгараецца сыр-бор: маўляў, на старажытным, намоленым вякамі месцы паўстануць будынкі з ігральнымі аўтаматамі, забягалаўкі. Можа, сапраўды хопіць нам ужо* ***аднарукіх і двухрукіх бандытаў*** *у прамым і пераносным значэнні гэтых слоў, якія будуць абіраць люд, узаконеныя дыскатэкі з часта амаральнымі, разбураючымі юныя душы і мазгі відовішчамі? (Віцебскі рабочы, 23.01.2007).*

Моўная гульня, рэалізаваная з дапамогай уласна семантычных рэсурсаў лексікі, дастаткова разнастайная. Сэнсавая двухпланавасць і навізна семантычнага напаўнення мнагазначных лексічных адзінак, якія абыгрываюцца ў газетных артыкулах, надаюць тэксту запамінальнасць і забяспечваюць яго выразнасць і вобразнасць. Так, у прыведзеных ніжэй прыкладах сутыкаюцца прамыя і пераносныя значэнні слоў *пякельны – '1. гл.* пекла. *2. перан.* Вельмі моцны, а таксама нясцерпны (пра што-н. непрыемнае; *разм.)*' [4, с. 528], *зялёненькі* – ад *зялёны* '1. Колеру травы, лісця. 5. *перан.* Нявопытны з прычыны маладосці'[4, с. 251], прычым у трэцім сказе змест лексемы *ёмісты* раскрываецца ў самім тэксце: *Бо нічога звыкла* ***пякельнага*** *сцэна сабой не ўяўляе, і побытавасць, вонкавая побытавасць пакутаў мусіць уразіць гледача мацней за дарагія эфекты сучаснай сцэнаграфіі (яны б* ***пякельна*** *разарылі маладзечанскую драму на доўгія гады) (ЛіМ, 14.03.1997); Зноў і зноў гартаю ладны,* ***зялёненькі альманах*** *з чорнай выявай ладдзі на ім і думаю, што далёка ўжо не* ***зялёненькія*** *яго* ***аўтары****, а ў поўным росквіце сіл і творчых магчымасцей (Віцебскі рабочы, 11.01.2007); Дзённік (запісы адносяцца да 1996-2—1 гадоў) і завяршае*

ёмісты *фаліянт (**ёмісты**, канешне ж, не толькі па памерах, але і па думках, уражаннях, занатаваных творцам) (Звязда, 27.12.2002).*

Трэба заўважыць, што полісемічнымі могуць быць і цэлыя спалучэнні слоў. У сказе *Улада ў Хольчы **на месцы**. На сваім (Местное самоуправление, 24.08.2005)* абыгрываюцца два значэнні выразу ***на месцы –*** *быць на месцы* ‘знаходзіцца на працы’ і *быць на сваім месцы* ‘поўнасцю адпавядаць пасадзе, жыццёваму прызначэнню і г.д.’ Такое супастаўленне значэнняў многазначных слоў у загалоўку адразу прыцягвае ўвагу чытача і выклікае адпаведны настрой пры ўспрыняцці зместу артыкула; можна сказаць, што журналіст экспліцытна ўплывае на ацэнку інфармацыі, бо абодва значэнні выкарыстанага словазлучэння маюць меліяратыўную афарбоўку.

Для стварэння каламбура журналісты выкарыстоўваюць і аманімічныя словы. Аманімія дзейнічае на аснове асацыяцыі па гукавым падабенстве. У такіх каламбурах абыгрываецца гукавое супадзенне амонімаў, у выніку чаго адбываецца сэнсавы зрух. Сумяшчаючы сугучныя словы, публіцысты як бы збліжаюць і тыя прадметы, паняцці, якія імі абазначаны. Такі прыём з’яўляецца сродкам актуалізацыі, стварэння публіцыстычнай завостранасці: *Садовае таварыства назвалі **“Сябры”**. А самі **сябры**, згодна нармальнай чалавечай псіхалогіі, сталі выштукоўваць адзін перад адным гмахі… (ЛіМ, 16.08.2002.).* У прыведзеным прыкладзе моўная гульня заснавана на абыгрыванні прамога – ‘той, хто звязаны з кім-н. сяброўствам’ [4, с. 646] – і кантэкстуальнага – ‘удзельнік таварыства “Сябры”’ – значэнняў лексемы *сябар/сябры*. І адно, і другое значэнні па-за кантэкстам з’яўляюцца стылістычна нейтральнымі, аднак у гэтым выказванні набываюць выразна негатыўную ацэнку і адценне з’едлівай іроніі. У тэксце *Некалі, у больш маладыя гады, і сам Фіськовіч іграў на трубе ў аркестры. Цяпер яна, пакрытая пылам, ляжыць на верхняй паліцы ў шафе. Не да **трубы**. І, як ён цяпер жартуе: “Самому ледзь не была **труба!**” (Віцебскі рабочы, 25.05.1999)* сутыкаюцца свабоднае намінатыўнае (‘музычны духавы інструмент’) і фразеалагічна звязанае (‘пагібель’) значэнні выдзеленага слова. Ужыты ў такім слоўным акружэнні, каламбур набывае адценне жарту і надае тэксту такую ж афарбоўку.

Элементам моўнай гульні можна лічыць аказіянальна-аўтарскія ўтварэнні, ці індывідуальна-аўтарскія неалагізмы. Персанальна-асобасныя складнікі слоў, уведзеных у газетныя тэксты, маюць мінімальную прадказальнасць, і таму такія словы не замацаваныя моўнай традыцыяй. З прычыны нечаканасці і адзінкавасці яны робяць выкладзеную інфармацыю больш запамінальнай, вобразнай і тым самым засяроджваюць увагу на парададзеным здарэнні або сітуацыі. Трэба заўважыць, што такія словаформы тэматычна прымацоўваюцца да тэксту, гэта значыць іх сэнс поўна раскрываецца ў самім кантэксце. Цесная сувязь са зместавым ядром тэксту, з якога такія словы як бы вырастаюць, робіць іх дарэчнымі і вельмі

выразнымі. Яскравы прыклад такога выкарыстання назіраецца ў наступным сказе: *А.Н. Жаркоў піша:" Добра, што ёсць яшчэ сумленныя людзі, жывыя сведкі савецкага жыцця, якія маюць смеласць публічна абвяргаць паклёп на мінулае, які брудным патокам льецца на нашы галовы з айчынных "дэмакратычных" газет і з расійскай* ***тэлеканалізацыі*** *(Віцебскі рабочы, 13.02.1999).* Як бачым, тут сутыкаюцца дзве лексемы з коранем **канал** – тэлеканал ('тэлевізійная лінія сувязі, камунікацыі') і каналізацыя ('сістэма труб, падземных каналаў для выдалення нечыстот') [4, с. 271]. Менавіта абыгрыванне гукавога падабенства гэтых слоў, а таксама папярэдні кантэкст, які падрыхтаваў чытача да ўспрыняцця каламбура, і стварае экспрэсіўны эфект і выяўляе стаўленне аўтара да названай рэаліі.

Такім чынам, моўная гульня, асноўным відам якой з'яўляецца каламбур, складнікамі якога могуць выступаць мнагазначныя словы, амонімы і аказіянальна-аўтарскія ўтварэнні, уносіць у газетны тэкст стылістычную разнастайнасць, робіць яго "жывым"; лёгка ўспрымаецца і абвастрае выказаную думку, выдзяляе, адцяняе сэнсавыя і эмацыянальна-экспрэсіўныя акцэнты публіцыстычнага выказвання.

Літаратура

1. Вороничев, О.Е. Каламбур как феномен русской экспрессивной речи: дис. … д-ра филол. наук: 10.02.01. / О.Е. Вороничев, Моск. гос. пед. ун-т. – М., 2014. – 723 с.
2. Костомаров, В.Г. Тексты в масс-медиа / В.Г. Костомаров // Журналистика и культура русской речи. – 2004. – № 2.
3. Сковородников, А.П. Каламбур // Культура русской речи: Энциклопедический словарь-справочник / Под ред. Л.Ю. Иванова, А.П. Сковородникова, Е.Н. Ширяева и др. – М.: Флинта: Наука, 2003. – С. 233 – 235.
4. Тлумачальны слоўнік беларускай літаратурнай мовы / пад рэд. М.Р. Судніка, М.Н. Крыўко. – 3-е выд. – Мн.: БелЭн, 2002. – 784 с.

Л І Т А Р А Т У Р А З Н А Ў С Т В А

Т.У. Аляксеева (Віцебск)

ГІСТАРЫЧНАЯ ПРАЎДА АЛЕСЯ ПЕТРАШКЕВІЧА (НА МАТЭРЫЯЛЕ КНІГІ “ЗДРАПЕЖАНАЯ ЗЯМЛЯ”)

У беларускай драматургіі значнае месца адведзена адлюстраванню мінулага. Паказальная ў гэтым плане творчасць Алеся Петрашкевіча, якая з'яўляецца аб'ектам увагі шматлікіх даследчыкаў. С. Лаўшук, П. Васючэнка, Л. Савік, І. Цішчанка, М. Шаўлоўская неаднаразова звярталіся да разгляду спадчыны аўтара. Слушна выказваецца наконт яго твораў Патук Т.: “У п'есах цытуюцца сапраўдныя гістарычныя дакументы, там бруіць жывое жыццё. Вобразы Вітаўта і Каліноўскага, Астрожскага і Купалы, Мураўёва і Глінскага напісаны так рэалістычна, пераканаўча, жыццёва, што значна адрозніваюцца ад пэўных трафарэтаў. Яны не падобныя на ўласныя партрэты ў гістарычных падручніках –гэта людзі са сваімі перакананнямі, каштоўнасцямі, недахопамі” [1, с. 24]. У драмах і трагедыях Петрашкевіча назіраецца імкненне пракаменціраваць ход гістарычных падзей, аднак пры гэтым ён не адыходзіць ад фактаграфічнага матэрыялу. Сам пісьменнік сцвярджае так: “Мы дрэнна ведаем сваю гісторыю. Сапраўдную гісторыю ад нас хавалі і ў царскі, і ў савецкі час. Гістарычная праўда была нявыгадна. Для мяне як драматурга вельмі важна, каб людзі ўспрымалі сваю гісторыю эмацыянальна” [2, с. 7]. Ён заклапочаны лёсам дзяржавы, становішчам нашай краіны сярод іншых. Мастак слова заўсёды верны сваёй задуме: перадаць сапраўдныя факты.

У кнізе “Здрапежаная зямля” дэталёва апісваюцца шматлікія войны і паўстанні, самыя значныя і ўплывовыя фігуры, падкрэсліваюцца іх асноўныя рысы характару. Творы скампанаваны адпаведна храналагічнай паслядоўнасці. Удала падабраны назвы частак кніг: “Супрацьборства” і “Вынішчэнне”. У першай ідзе аповед пра часы Вялікага княства Літоўскага, калі гэтая дзяржава мела самастойнасць; а ў другой частцы разглядаюцца шматлікія войны на нашай зямлі, правядзенне палітыкі русіфікацыі, жорсткае панаванне Івана ІІІ, Васіля ІІІ, Аляксея Міхайлавіча, Пятра І, Кацярыны ІІ.

Драматург часам ідэалізуе галоўных персанажаў, засяроджвае ўвагу на станоўчых якасцях чалавека. Усё гэта падпарадкавана адной мэце: раскрыць напружанае змаганне беларускага насельніцтва за волю і незалежнасць. З дакументальнай дакладнасцю пададзены ў кнізе вобразы Льва Сапегі, Кейстута, Тадэвуша Касцюшкі, Януша Радзівіла, Жыгімонта, Ягайлы, Івана Гальшанскага, Міхала Клеафаса Агінскага і многіх іншых.

Паўстанне Глінскага – самае буйное палітычнае выступленне на тэрыторыі беларускіх зямель пасля феадальнай вайны 30-х гадоў XV стагоддзя. Міхал Глінскі быў у свой час набліжаны да князя Аляксандра, лічыўся адукаваным, тонкім палітыкам. Адкрыта вёў барацьбу з ваяводам трокскім Янам Забярэзінскім, пачаў выступаць супраць Жыгімонта. Вядома, што з гэтай мэтай ён заручыўся падтрымкай Масковіі. Дэмарш Глінскага закончыўся няўдачай. У 1514 годзе пад Оршай гетман Астрожскі разбіў ушчэнт войскі ўсходніх суседзяў. Менавіта гэтыя падзеі ляглі ў аснову п'есы "Расплата за здраду". Адчуваецца рэлігійнасць персанажаў, сляпая вера ў Бога. Петрашкевіч засяроджвае ўвагу на варожасці паміж Маскоўскім князем Іванам III і Аляксандрам–каралём Польшчы і ВКЛ. У творы пастаянна гучаць заклікі да змагання, да абароны Радзімы.

У п'есе "Час усё адкрые" галоўнымі героямі з'яўляюцца Януш Радзівіл – вялікі гетман ВКЛ, Аляксей Міхайлавіч – цар Русі, Ян Казімір – кароль Польшчы, Шарамецьеў – ваявода маскоўскі. Характарызуецца час занатавання шведска-ліцвінскай уніі. Януш Радзівіл жадае захаваць вольным ВКЛ, а само пагадненне са шведамі ўспрымае як часовую з'яву: "Прыйдзе час і ўсё адкрые людзям. І людзі зразумеюць, што Радзівілы са сваімі паплечнікамі ратавалі свой край, як маглі, ад поўнай загубы і спадзяваліся на лепшае" [3, с. 203]. Ілюструецца палітычная гульня Расіі з Рэччу Паспалітай. Думаецца, што дамінуючая ідэя кнігі "Здрапежаная зямля" Алеся Петрашкевіча заключаецца ў словах Януша Радзівіла: "Цывілізаваны свет запыніў дыханне і чакае, ці хопіць у насяленцаў падмандатнай тэрыторыі жадання, здольнасціі мудрасці пераадолець вякамі прывітую памяркоўнасць, млявасць і абыякавасць да свайго далейшага лёсу і зрабіць вырашальны выбар – ці заставацца народам, нацыяй і вярнуцца да сваіх каранёў, ці запрадацца, а затым рассеяцца і распыліцца паміж чужымі абрабаванымі прапітымі народамі на прасцягах той Азіёпы пад двухгаловым крумкачом" [3, с. 206]. Сапраўды, на працягу многіх стагоддзяў перад нашай краінай стаяла гэта дылема. Бацькаўшчына прайшла доўгіі складаны шлях да свайго суверэнітэту, захавала сваю самабытнасць. Вялікая заслуга ў гэтым славутых барацьбітоў краіны, якія вялі за сабою народ.

Варта адзначыць, што Алесь Петрашкевіч ужывае вытрымкі з дакументаў, не перайначвае сапраўдныя факты гісторыі. Гэта дадае п'есам канкрэтыкі, большай насычанасці, шматфарбнасці, набліжае да тагачаснай атмасферы. Пра гэта сведчаць драмы "Каралеўска-царская пастка" (пра ўтварэнне Рэчы Паспалітай) і "Рупнасць дзяржаўцы" (пра прыняцце Статута ВКЛ).

Яскрава створаны тут вобраз Льва Сапегі – падканцлера ВКЛ, які жыў у час рэфармацыі позняга гуманізму на тэрыторыі Беларусі. Вялікай заслугай яго было бачанне прычын палітычнага і культурнага заняпаду краіны. Гэта актыўная, дзейсная асоба. Барацьба Сапегі з уніяй акрэслілася

ў працы над III-м Статутам, праз які праводзілася ідэя ўмацавання прававога парадку. Усе дзяржаўныя органы абавязаны былі дзейнічаць толькіў адпаведнасці з законам.

Палітычныя інтрыгі паміж Кейстутам і Ягайлам апісвае драматург у трагедыі “Крыжовы шлях на Грунвальд”. Характэрна для твора частая змена падзей, месца дзеяння: Трокі, Мальбург, Крэва, Вільня, Гародня, Кракаў і іншыя. Петрашкевіча цікавіць матывацыя ўчынкаў герояў, іх асабістыя і грамадскія імкненні. Аб’яднанне Ягайлы і Вітаўта супраць Тэўтонскага ордэна аўтар лічыць лагічным і правільным дзеяннем.

Пісьменнік засяроджвае ўвагу не толькі на дзяржаўных справах сваіх персанажаў, а і на іх асабістых пачуццях. Прыкладам гэтаму з’яўляецца вобраз расійскай імператрыцы Кацярыны II у драме “Развітанне з Радзімай”. Гераіня прызнаецца: “У свеце няма нічога лепшага і больш прыстойнага, чым дружба і каханне; выключыць іх з жыцця – усё роўна, што пазбавіць свет сонечнага святла” [3, с. 210]. У творы раскрываецца яе тонкі разлік, востры розум, багаты жыццёвы досвед, веданне законаў, псіхалогіі. Удала раскрыты ў п’есе і герой вызваленчай барацьбы ў Амерыцы і паўстання 1794 года на Беларусі Тадэвуш Касцюшка.

Такім жа змагаром за волю паўстае і Кастусь Каліноўскі ў п'есе “Рыцар свабоды”. Драматург дакладна перадае атмасферу паўстання 1863 года, уводзіць у тэкст сам маніфест часовага ўрада Літвы і Беларусі, у якім насельніцтва заклікалася падняцца на ўзброеную барацьбу, жыхары аб'яўляліся раўнапраўнымі грамадзянамі незалежна ад нацыянальнасці і веравызнання. Галоўны герой выпісаны шчырым, мужным абаронцам правоў беларуса. У яго думках, дзеяннях прасочваюцца паводзіны інтэлігентнага, выхаванага чалавека. Змагар вельмі спадзяецца на рэвалюцыйную дзейнасць, на выданне газеты “Мужыцкая праўда”. Яго словы гучаць як палымяныя заклікі, лозунгі: “Дзецюкі! Гэта барацьба святая, яна за цэласнасць распаласаваных тваіх земляў, за ўласнасць абяздоленых у сваёй Айчыне сыноў, святая кроў, гераічна пралітая за свабоду і роўнасць усіх вызнанняў, традыцый і мовы тваіх братоў!.. Няма часу марудзіць, нам нельга ўжо цягнуць далей” [3, с. 270]. Паралельна з развіццём грамадскіх падзей падаецца і любоўная лінія: каханне Кастуся і Марысі Ямант. Гэта сапраўды чыстыя і светлыя адносіны, узаемны клопат і давер. Дваццацішасцігадовы юнак выклікае захапленне і павагу нават у Мураўёва. Каліноўскага прыгаварыў ваенны суд да вышэйшай меры пакарання. Аднак Алесь Петрашкевіч сцвярджае, што герой усёроўна застаўся пераможцам, з годнасцю вытрымаў допыты, нават паспеў “прынізіць” ворага.

Падзеі Слуцкага паўстання, з'езда 14 лістапада 1920 года сталі матэрыялам для трагедыі “Апошні збройны чын”. Вядома, што кіравалі з'ездам беларускія эсэры, якіх падтрымлівала большасць дэлегатаў. На ім была абрана Беларуская рада Случчыны на чале з У.М. Пракулевічам. Драматург аналізуе пралікі тагачаснага кіраўніцтва, негатыўнай з’явай пагаднення

паміж Расіяй і Польшчай (Рыжскі мірны дагавор) лічыць адыход тэрыторыі Заходняй Беларусі да Польшчы.

Гістарычная трагедыя “Наканавана быць Прарокам” А. Петрашкевіча раскрывае час барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам. У 30-я гг. XX стагоддзя ідэя нацыянальнага Адраджэння аб'явілася крымінальнай. Творчая інтэлігенцыя, лепшыя дзяржаўныя дзеячы аказаліся ў засценках ДПУ. З дакументальнай дакладнасцю распавядаецца ў п'есе пра напружаны час у жыцці Я. Купалы, праўдзіва перадаецца жудасная атмасфера ў грамадстве. Апісаны ў творы і размовы героя з Я. Коласам і У. Ігнатоўскім. Відавочна, што хвалюе іх тагачасны рэжым, становішча народа. Усевалад Макаравіч падкрэслівае, што назіраецца генацыд супраць беларусаў: “Пачынаюць, як бачыце, з вынішчэння рыцараў Адраджэння. А іх яшчэ так нямнога… Так мала!” [3, с. 409]. Удала ўведзены ў мастацкую тканіну п’есы вершы і артыкулы класіка, што дапамагае найбольш глыбока ўсвядоміць асноўны накірунак ідэй Янкі Купалы. Як бачна, ён паўстае змагаром за самабытнасць беларусаў, нацыянальнае самавызначэнне. Відавочная яго павага да свайго этнасу, патрыятызм, непрымірымасць да нацыянальнага прыгнёту.

П’еса “Дагарэла свечачка” прысвечана аўтарам матулі, напісана як маналог беларускі. Падаецца плач нашай краіны па сваіх дзецях. Аўтар ілюструе перыяд эвакуацыі людзей пасля Чарнобыля з забруджаных тэрыторый. Згадваюцца такія гістарычныя перыяды, як улада Чырвонай Арміі, кіраўніцтва Сталіна, стварэнне калгасаў, Вялікая Айчынная вайна. Прысутнічае ў сюжэце твора і малітва галоўнай гераіні Марфы, якая не жадае развітвацца са сваім родным кутком. Гаспадыня запальвае сваю хату і кладзецца ў дамавіну. Гэтым учынкам пацвярджаецца яе няскоранасць лёсу, абставінам. Драматург пераконвае, што беларусаў не знішчыць.

Такім чынам, гістарычныя п'есы Алеся Петрашкевіча з кнігі “Здрапежаная зямля” маюць інфармацыйны змест, раскрываюць шырокую панараму тагачасных падзей, узнаўляюць фактаграфічныя матэрыялы, дапамагаюць усведамленню нацыянальнай годнасці, умацаванню беларускай самасвядомасці, характарызуюць рыцараў нацыянальнага руху. Пісьменнік звярнуў увагу на найбольш значныя паўстанні і войны XIV–XX стагоддзяў, выкарыстаў у сваіх трагедыях і драмах даследаванні вучоных у галіне гісторыі.

Літаратура

1. Патук, Т. Да юбілею Алеся Петрашкевіча / Т. Патук // Бібліятэка прапануе. – 2005. – № 2. – С. 24.

2. Петрашкевіч, А. Ці можна пагадзіцца з Шэкспірам? Тэма для невялікай аднаактоўкі, якую, магчыма, напіша драматург Алесь Петрашкевіч / А. Петрашкевіч; гутарыла Таццяна Падаляк // Звязда. – 29 красавіка. – 2000. – С. 7.

3. Петрашкевіч, А. Здрапежаная зямля / А. Петрашкевіч. – Мінск: УП "Тэхнапрынт", 2003. – 448 с.

В.Ю. Бароўка (Віцебск)

ЭСТЭТЫЧНАЯ РЭПРЭЗЕНТАЦЫЯ ЭТНАНАЦЫЯНАЛЬНАЙ РЭЧАІСНАСЦІ Ў БЕЛАРУСКІМ РАМАНЕ XXI СТАГОДДЗЯ

Сучасныя айчынныя пісьменнікі шмат увагі надаюць эстэтычнай рэпрэзентацыі этнанацыянальнага свету ў самых разнастайных яго праявах. Дастаткова часта аўтары выкарыстоўваюць жанр рамана, які валодае багатымі магчымасцямі для ўвасаблення жыццёвых рэалій, чалавечых пачуццяў, змен у матэрыяльнай і духоўнай сферах. Вядомы чэшскі пісьменнік Мілан Кундэра не без іроніі заўважыў: “Адзінае, што застаецца нам перад тварам такой непазбежнай паразы, якую завуць жыццём, – гэта паспрабаваць яго зразумець. У гэтым і ёсць права на існаванне рамана” [1, с. 22]. Сапраўды, таленавіты раманіст дазваляе з новага боку ўбачыць добра знаёмыя рэчы. Наратыўныя стратэгіі, шляхі і спосабы рэпрэзентацыі пісьменнікамі этнанацыянальных рэалій у сучасным рамане заслугоўваюць увагі, бо дазваляюць паглыбіць агульнапрынятыя ўяўленні пра спецыфіку нацыянальнай прозы.

Пачатак XXI стагоддзя – перыяд пераацэнкі даўняга і нядаўняга мінулага, далейшага асэнсавання шляхоў нацыянальнай ідэнтыфікацыі беларусаў. Ён знайшоў яскравае аналітычнае ўвасабленне ў рамане Віктара Казько “Бунт незапатрабаванага праху” (2001), творы пра памкненне галоўнага героя Германна-Германа-Юркі-Жоркі-Макрыяна Говара (пералік імён своеасабліва пазначаў шлях персанажа да самаідэнтыфікацыі. – В.Б.) устанавіць свой радавод. Вобраз Говара абагульняльны, за яго лёсам бачыцца лёс цэлага пакалення, народжанага ў пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя. Германн-Макрыян – дэнацыяналізаваны самімі абставінамі існавання беларус, які ў сталасці падсвядома цягнецца да спасціжэння сваіх “каранёў”. Пісьменнік удала спалучыў сіметрычны і асіметрычны этнатопы, арганічна ўвёў у мастацкую тканіну рамана этнаграфічна-бытавы матэрыял, метафарызаваў яго, падпарадкаваў інтэрыярызацыі мастацкай прасторы і часу. Паўсядзённасць у рамане В. Казько прадстае грозным выпрабаваннем для чалавека, сілай, што ўладарна дыктуе асобе жорсткія правілы паводзін. У творы паказаны асноўныя складнікі быту савецкага чалавека і традыцыйнага быту вясковага і гарадскога беларуса, якія, з аднаго боку, прывівалі чалавеку сацыяльную пасіўнасць, а з другога – развівалі бытавую актыўнасць. Этнаграфічна-побытавы фон у рамане набывае выразны падтэкставы характар, калі аўтар пераносіць свайго героя на постчарнобыльскае Палессе, расказвае, як Германн разам з жонкай з сімвалічным іменем Надзея нанава абжывае гэты кут, садзіць сад. Тым самым аўтарам падкрэсліваецца мэтанакіраванасць, жыццёвая сіла чалавека, які ўрэшце знайшоў бацькаўшчыну і працуе дзеля яе будучыні. Экспрэсіўна пададзеныя семантычна амбівалентныя побытавыя і пейзаж-

ныя вобразы (хата, могілкі, балота, сад) істотна ўзмацнялі інтэлектуальны пачатак у рамане, аповед пра драматычны лёс пакалення, народжанага напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны. Мастацкая пераацэнка апошніх дзясяцігоддзяў савецкага мінулага ў сатырычных фарбах была праведзена Юрыем Станкевічам у рамане-фантасмагорыі "Ліст у галактыку «Млечны шлях»" (2002), дзе аўтар праз прыёмы фантасмагорыі акцэнтаваў нівеліроўку нацыянальнай спецыфікі ў дзяржаве, якая афіцыйна праваз-вяшчала парытэт інтэрнацыяналізму і патрыятызму, а неафіцыйна атаясамлівала патрыятызм з вар'яцтвам і шкодніцтвам.

Вялікае месца ў сучасным рамане па-ранейшаму займае тэма беларускага мінулага. Мастацка-асветніцкаму спасціжэнню ў рэтраспектыўным плане нацыянальнай рэчаіснасці і нацыянальнага характару беларусаў прысвечаны раман-жыціе "Пакліканыя" (2002) пра Еўфрасінню Полацкую Валянціны Коўтун, "Вяшчун Гедзіміна" (2001) пра станаўленне Вялікага княства Літоўскага Вольгі Іпатавай, дзе этнанацыянальныя рэаліі пададзены праз мастацкі этнаграфізм, які тыпізуе абставіны і стварае эмацыянальна-прыўзнятую атмасферу. Непарыўнасць мінулага і сучаснасці артыкулявалася ў рамане Алеся Наварыча "Літоўскі воўк" (2003), напоўненым інтэртэкстуальнасцю, алюзіямі на падзеі мяжы XX і XXI стагоддзяў, пабудаваным на перасячэнні сюжэтных матываў беларускай літаратуры і публіцыстыкі XIX–XX стагоддзяў, рускай класічнай літаратуры XIX стагоддзя. Падзеі ў творы адбываюцца на Палессі напярэдадні, падчас і пасля паўстання 1863 года, неадназначнасцю канатацый надзяляецца вобраз ваўкалака. З аднаго боку, ваўкалакамі ў пачатку твора называюць рабаўнікоў, што пасяліліся ў лесе. З другога боку, ваўкалакі – людзі, якія хутка мяняюць свае перакананні (шляхціцы Стась Буевіч і Ежы Урбановіч). Па-трэцяе, ваўкалакам за прыродны розум, незвычайныя для жывёлы паводзіны лічаць ваўка па мянушцы "Інсургент". Інсургент – метафарычнае абагульненне характару беларуса, у якім пераплецены дабро і зло, здаровы сэнс і сляпыя інстынкты, любоў і нянавісць. Воўк-ваўкалак цэніць свабоду, ненавідзіць здраду, найвышэйшай каштоўнасцю для яго, як для паўстанцаў Каліноўскага, з'яўляецца свабода. Светаадчуванне, рысы характару, духоўная атмасфера і яе ўплыў на асобу з акцэнтаваннем цеснай сувязі гістарычных часоў па-мастацку ўзнаўляліся ў сімбіятычна скампанаваных традыцыйных і разам з тым эксперыментальных раманах Людмілы Рублеўскай "Золата забытых магіл" (2004), "Скокі смерці" (2005), "Забіць нягодніка, альбо Гульня ў Альбарутэнію" (2007), "Сутарэнні Ромула" (2010), "Дагератып" (2014), дзе дарэчна перапляталіся прыёмы рэалістычнай, рамантычнай і постмадэрнісцкай паэтыкі, прыгодніцкія элементы і аналітыка. Услед за пісьменнікам Уладзімірам Караткевічам і філосафам Уладзімірам Конанам пісьменніца даводзіць, што беларусам уласцівы рыцарства, сіла духу, што яны маюць не толькі трывалыя "мужыцкія", але і шляхецкія "карані", якія не дазваляюць

паступіцца сваім чалавечым гонарам. Лейтматывам раманаў пісьменніцы выступае ідэя захавання гістарычнай памяці, што замінае сучаснаму чалавеку ператварыцца ў асобу без роду і племені.

Традыцыйнай формай выяўлення нацыянальнай рэчаіснасці і нацыянальнага характару ў беларускай прозе па-ранейшаму выступае форма сямейна-бытавой хронікі. Яна надзвычай арганічная ў цыкле раманаў Уладзіміра Гніламёдава "Уліс з Прускі" (2001), "Расія" (2007), "Вяртанне" (2008), "Валошкі на мяжы" (2014), "Вайна" (2014). Выбар сямейна-бытавой хронікі дэтэрмінаваў шырокі этнакампаратыўны план, ужыванне элементаў асіметрычнага этнатопу ў раманах "Уліс з Прускі", дзе беларусы параўноўваюцца з амерыканцамі, і "Расія", дзе супастаўляюцца беларусы і рускія. Лёсы герояў падаюцца пісьменнікам на фоне драматычных падзей нацыянальнай гісторыі: эміграцыйнага руху ў пачатку XX стагоддзя, першай сусветнай вайны, наступстваў Рыжскага мірнага дагавора, другой сусветнай вайны. Гісторыя сям'і і гісторыя народа з рамантызацыяй лепшых рыс характару суайчыннікаў – цэнтральныя ў рамане "Зубрэвіцкая сага" (2007) Янкі Сіпакова. Як вядома, сага – старадаўняя скандынаўская форма аповеду, надзеленая эпічнай прастатой, гістарычным і бытавым рэалізмам. У рамане, што складаўся з апавяданняў, пісьменнік падаў прыватны варыянт гісторыі ў дыяхронным ракурсе, апаэтызаваў патрыятызм, высокія маральныя прынцыпы і якасці сваіх суайчыннікаў. Навелістычная форма аповеду, аўтабіяграфічны матэрыял, паказ лёсу адной сям'і праз дынаміку пакаленняў – характэрныя рысы невялікага па аб'ёме рамана "Дом" (2003) Адама Глобуса, які аднойчы зазначыў, што ў аснове беларускай нацыянальнай ідэі павінна знаходзіцца ідэя дому як сям'і.

Мастацкі аналіз сучаснасці і сучасніка, феномена індывідуальнай экзістэнцыі як праявы экзістэнцыі народа – прадмет эстэтычнага даследавання ў рамане "Менада і яе сатыры" (2008) Алены Брава, у "рамане ў аповедах" "Рыбін горад" (2007) Наталкі Бабінай, у "рамане ў трох мемуарах" "Імя грушы" (2005) Сяргея Балахонава, дзе згушчэнне фарбаў, іронія і сацыяльны гратэск – дамінантныя сродкі рэпрэзентацыі сацыяльна-бытавых рэалій. Фантастыка як сродак увасаблення нацыянальнага свету шырока выкарыстана ў рамане Юрыя Станкевіча "Пятая цэнтурыя, трыццаць другі катрэн" (2005) у рамане-роздуме пра сучаснасць, пра будучыню чалавецтва, пра асновы светаўладкавання, пра ролю навуковых ідэй і маральных імператываў у грамадстве. Сістэма персанажаў у рамане накіравана на дэталёвае асэнсаванне грамадства, падтэкставае па характары ўказанне на род заняткаў персанажаў: рэпарцёр, аўдытар, філосаф, бібліятэкарка. Паказальна, што сярод іх няма стваральнікаў, а толькі фіксатар і асвятляльнік падзей, правяральшчык, асэнсавальнік і чалавек з пэўным узроўнем культурнага досведу. Пытанні будучыні беларусаў і чалавецтва ўвогуле, існавання нацыянальнага ва ўмовах інтэнсіўнай глабалізацыі адметнае мастацкае вырашэнне знайшлі ў рамане-антыўтопіі Ю. Станкевіча

“П’яўка” (2010). Гэтаму твору ўласціва мастацкае выяўленне глыбінь чалавечага інтэлекту і псіхікі, песімізм у ацэнцы перспектыў захавання асобнага этнасу/народа ва ўмовах татальнай глабалізацыі і мультыкультуралізму. Празаік шляхам выкарыстання рэмінісцэнцый з Джорджа Оруэла і Герберта Уэлса ўвасобіў вызначальныя прыкметы верагоднай змрочнай будучыні чалавецтва: стварэнне новай цывілізацыі, панаванне звыродніцкай, паводле пісьменніцкай інтэрпрэтацыі, ідэалогіі мультыкультуралізму, апакаліптычнае па сваіх перспектывах развіццё мультырасавага грамадства, узрастанне энтрапіі традыцыйных хрысціянскіх каштоўнасцей. З дапамогай сацыяльнага гратэску Станкевіч даводзіць, што ў так званым Новым Эдэме (новым райскім садзе – В.Б.) пануе закон джунгляў з неабмежаваным правам мацнейшага і татальная дэмагогія.

Лёс духоўнай спадчыны, будучыня айчыннай літаратуры, роздум пра нацыянальны характар беларуса, пра жыццё, літаратуру і іх узаемадзеянне – пытанні, што вылучаюць раманы “Рэвізія” (2004), “Мяжа” (2008) Андрэя Федарэнкі. Пафасам “Рэвізіі”, у якой для пераканаўчасці эстэтычнай аргументацыі аўтар удала выкарыстаў інтэртэкстуальнасць, этнаграфічны і літаратурны метакантэксты, сталі сцвярджэнні аб адставанні нацыянальнай літаратуры ад жыцця, аб празмернай схільнасці аўтараў да распрацоўкі традыцыйных тэм і вобразаў, аб ігнараванні пісьменнікамі новых шляхоў мастацкага ўвасаблення чалавека і рэчаіснасці. “Мяжа” – раман-эсэ з элементамі аўтабіяграфіі, споведзі перад чытачамі, дзе апавядальнік дзеліцца меркаваннямі пра ідэальны варыянт літаратуры і асэнсоўвае стан сучаснай рэальнай нацыянальнай літаратуры, апавядае пра гісторыю стварэння некаторых сваіх твораў, наракае на няўдзячнасць пісьменніцкай працы: “Людзі вакол жывуць – ты адлюстроўваеш гэтае жыццё, усё піхаеш, усё ўкладваеш, як пракляты, самае лепшае сваё ў нейкі беспрацэнтны, банкруцкі банк – без надзеі на аддачу…” [2, с. 7].

Адлюстраванне этнанацыянальных рэалій галоўным чынам пад уплывам іманентных прычын у сучасным беларускім рамане ўсё больш і больш набывае эксперыментальны характар, асабліва ў творчасці аўтараў маладога пакалення. Празаікі часта звяртаюцца да выяўленчых магчымасцей жанраў сямейна-бытавога рамана, антыўтопіі, фантасмагорыі, эсэ, парабалы, асіметрычнага этнатопу, метаапісанняў, алюзій, рэмінісцэнцый, даследуюць характар і лёс беларусаў у дыяхронным і сінхронным этнакампаратыўным планах.

Літаратура

1. Кундера, М. Занавес / М. Кундера. – СПб.: Азбука-классика, 2010. – 240 с.

2. Федарэнка, А. Мяжа: раман / А. Федарэнка. – Мінск: Літаратура і мастацтва, 2011. – 264 с.

Г.У. Васюк (Гродна)

ПАЛЕМІЧНАЯ ПРОЗА ФОЦІЯ: ПАСТАНОЎКА ПРАБЛЕМЫ

Канстантынопальскі патрыярх Фоцій (820–891 гг.) – цэнтральная фігура Македонскага Адраджэння ў Візантыі, а можа і ўсёй візантыйскай культуры. Знакаміты французскі візантыніст Поль Лемерль піша пра яго так: "…Гэты чалавек быў настолькі таленавіты, быць можа, геніяльны, і развіў такую дзіўную актыўнасць, задавальняючы сваю гэтак жывую дапытлівасць, што і з нашага пункту гледжання ён набывае значнасць адпаведна сваім выключным вартасцям. Ён узвышаецца над гэтым вялікім IX стагоддзем Візантыі, які ў цараваннях Феафіла, Міхаіла III і Васіля I ужо змяшчае зародак бліскучага апагею наступнага стагоддзя" [1, с. 260].

Вядомы савецкі і рускі даследчык культуры С.С. Аверынцаў сцвярджае, што "пара Фоція – гэта час, калі візантыйская культура, прайшоўшы праз крызіс, робіць нейкі неабходны і неадменны выбар, калі закладваюцца асновы для ўздыму інтэлектуальнага жыцця на некалькі стагоддзяў наперад" [2, с. 44].

Нарадзіўся Фоцій у заможнай арыстакратычнай сям'і ў сталіцы Візантыйскай імперыі. Сярод яго родзічаў быў патрыях Тарасій, прыхільнік ушанавання святых абразоў. Фоцій атрымаў бліскучую адукацыю, дасканальна ведаў граматыку, паэтыку, рыторыку, медыцыну. Сродкі дазвалялі яму купляць розныя кнігі [3, с. 12]. Фоцій займаў высокія дзяржаўныя пасады. Службовую кар'еру чыноўніка ён пачаў у імператарскай канцылярыі і дасягнуў там самай вышэйшай пасады – протаасікрыта. Гэта давала магчымасць стаць патрыярхам [1, с. 268]. Будучы вельмі адукаваным чалавекам, Фоцій выкладаў розныя навукі. Сярод яго вучняў былі людзі з самых вышэйшых слаёў грамадства: ён навучаў імператара Міхаіла і Канстанціна Філосафа. У 858 годзе Фоцій, яшчэ будучы свецкім, быў узведзены на патрыяршы трон, прайшоўшы за шэсць дзен паслядоўна праз усе ніжэйшыя ступені святарства ад чытальніка да біскупа. У тым, што свецкі выхаваны чалавек быў абраны патрыярхам, не было нічога незвычайнага – у гісторыі візантыйскай царквы ўжо былі такія выпадкі (патрыярхі Тарасій і Нікіфар) [4, с. 26].

Фоцій, перш за ўсё, вядомы як аўтар «Мірыябібліёна» («Бібліятэкі»). Праца складаецца з аглядаў кніг, прачытаных Фоціем і яго вучнямі, гэта 279 канспектаў ("кодэксаў"), дзе ўпамінаецца каля 400 назваў кніг. Дзякуючы «Мірыябібліёну» мы маем звесткі пра многія творы антычнасці, якія ў іншым выглядзе да нас не дайшлі. «Мірыябібліён» падвёў вынікі развіцця візантыйскай культуры ў папярэдні перыяд, як бы даў яму ацэнку.

Акрамя "Мірыябібліёна" патрыярх Фоцій напісаў шэраг сачыненняў на богаслоўскія тэмы, вядома шмат яго казанняў, а таксама лістоў па дыпламатычных і багаслоўскіх пытаннях.

Асноўнае палемічнае сачыненне Фоція “Містагогія Св. Духа”. У ім абвяргаецца вучэнне рымска-каталіцкай царквы пра паходжанне Св. Духа. Аднак, крытыка дагматыкі і абрадаў заходняга хрысціянства была прадпрынята Фоціем значна раней, яшчэ ў перыяд яго першага патрыяршаства (858–867 гг.) у “Энцыкліцы ўсходнім патрыярхам”.

Сучасны даследчык палемічных сачыненняў Фоція Т. Хайнталер сцвярджае: “Энцыкліка” тэматычна прадугледжвае сабор 867 г., скідае папу Мікалая I (858–867) і падвяргае яго анафеме. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што, нягледзячы на ўсе праблемы, звязаныя з гэтым саборам, акты якога былі знішчаны па загадзе IV Канстанцінопальскага сабора (869/870), – гэтая энцыкліка фармулюе тыя абвінавачванні, якія пасля сталі выкарыстоўвацца супраць лацінян” [5, с. 46].

Задоўга да Т. Хайнталера падобную думку выказаў знакаміты расійскі візантыніст Ф. Успенскі. Вучоны адзначаў, што да 866 года адносіцца “найважнейшы з царкоўна-палітычнага пункту гледжання помнік – акружное пасланне Фоція да прадстаўнікоў Усходніх цэркваў, у якім Канстанцінопальскі патрыярх рашуча і беспаваротна паставіў пытанне аб дагматычных рознасцях у веравучэнні паміж Заходняй і Усходняй Царквамі...” [6, с. 106]. У працы Ф. Успенскага прыведена ў перакладзе з грэчаскай мовы на рускую большая частка “Энцыклікі усходнім патрыярхам”.

Узнікненню рэлігійнай палемікі паміж Захадам і Усходам хрысціянскага свету садзейнічалі вострыя супярэчнасці ў пытанні хрышчэння балгар. Менавіта ў гэты час візантыйская царква звярнула ўвагу на дагматычныя і абрадавыя розніцы ў рымскай і усходніх царквах.

У першую чаргу было закранута пытанне аб “філіокве.” Яно не было новым. Як лічыць І. Мейендорф: “Ужо ў IV стагоддзі разуменне Тройцы грэкамі і лацінянамі было розным. Заходні падыход сфармаваўся ў дыспуце з арыянствам: ні той, ні іншы бок не сумняваліся ў тым, што Айцец, Сын і Святы Дух – тры розныя Асобы, але арыяне адмаўлялі іх адзінасутнасць. У багаслоўі айцоў-кападакійцаў кропкай пачатку і асноўнай рэальнасцю былі тры Асобы, тры боскія істоты, і таямніца Бажаства пачыналася з вызнання Пятра (Мц. 16:17), з зацвярджэння веры ў боскасць Хрыста – гэта значыць аднаго з боскіх асоб. Заходняе троічнае багаслоўе фармулюецца ў кнізе блажэннага Аўгусціна пра Тройцу (De Trinitate) і ўяўляе сабой філасофскае вызначэнне Бога як адзінай Сутнасці, у сярэдзіне якой Асобы вызначаюцца як унутрыбоскія «адносіны» (relationes)” [7, с. 337].

Упершыню на афіцыйным узроўні прыстаўка “філіокве” была ўведзена ў Сімвал веры на III Таледскім саборы ў маі 589 года, калі іспанскі кароль Рэкарэд адрокся ад арыянскай ерэсі. Яна задумвалася як спецыяльнае падкрэсліванне боскай сутнасці Іісуса Хрыста ў процівагу арыянскаму сцвярджэнню. У часы Фоція “філіокве” ў большай ступені прызнавалася толькі царквой на Пірэнэйскім паўвостраве і не стала

афіцыйным вучэннем усёй рымска-каталіцкай царквы. Візантыйская царква доўгі час адносілася да гэтага заходняга дагматычнага новаўвядзення цярпіма. Аднак сутыкнене падчас хрышчэння Балгарыі выклікалі яго вострую крытыку з боку Фоція. Таксама былі раскрытыкаваныя і несумяшчальныя з практыкай візантыйскай царквы заходнія царкоўныя абрады.

Фоцій напісаў "Энцыкліку ўсходнім патрыярхам " згодна з канонамі хрысціянскай палемічнай літаратуры. Галоўнымі аргументамі ў палеміцы паміж хрысціянамі былі спасылкі на Святое Пісанне, апостальскія правілы, пастановы сабораў, богалоўскія аўтарытэты.

У пачатку свайго паслання Фоцій сцвярджае, што шматлікія ерасі былі пераможаныя баганоснымі мужамі, якія "лязом духа" … "адсеклі самосейнае дурное пустазелле і далі ў чысціні ўзрастаць ніве Царкоўнай" [8]. У дадзеным выпадку палеміст спасылаецца на Новы Запавет, пасланне апостала Паўла да Эфесян (6:17). Спасылкі на Святое Пісанне сустракаюцца і ў іншых частках "Энцыклікі".Таксама ў пачатку свайго паслання Фоцій звяртаецца да аўтарытэта першых чатырох Усяленскіх сабораў.

Затым ён пераходзіць да праблемы хрышчэння балгар і, абапіраючыся на Біблію, піша, што не прайшло і двух гадоў пасле гэтай падзеі, як "мужы і злосныя бязбожнікі … мужы, з цемры вынырнуўшыя, – бо яны былі спараджэннем заходняга краю,…напаўшы на народ новазацверджаны ў пабожнасці… нібы маланка або землятрус, або моцны град, а дакладней сказаць – як дзікі вяпрук, падрываючы і капытамі, і іклами, … разбурылі, знішчыўшы, лазу Госпада каханую і новапасаджаную" [8].

Пасля пераліку рымскіх абрадавых новаўвядзенняў Фоцій пераходзіць да дагматычных пытанняў. Вяршыня ўсяго зла – гэта спроба рымскіх місіянераў у Балгарыі змяніць Сімвал веры. Абурэнню палеміста няма меры: "Але ж не толькі ў гэтым яны праявілі сваё вар'яцтва, але калі ёсць якая-небудзь мяжа злу – накіраваліся да яго. Бо, на самай справе, у дадатак да згаданых бязглуздзіц на сам святы Сімвал веры, незнішчальны зацверджаны ўсімі саборнымі і ўсяленскімі пастановамі, спакусіліся яны – ох ужо гэтыя інтрыгі злыдня! – падрабляць фальшывай гульнёй розуму і прыпісанымі словамі, прыдумаўшы ў празмерным нахабстве сваім навіну, быццам Святы Дух зыходзіць не толькі ад Айца, але і ад Сына. Хто чуў калі-небудзь, каб падобныя прамовы прамаўляў хоць хто-небудзь з бязбожных? Якая каварная змяя зрыгнула такое ў сэрца іх?" [8].

Для крытыкі "філіокве" Фоцій выкарыстоўвае палемічны прыём – звядзенне да абсурднага (reductio ad absurdum). Т. Харнталер лічыць адным з найбольш істотных аргументаў Фоція сцвярджэнне: "Тое, што ўсё, не з'яўляецца агульным для ўсяе Тройцы, павінна быць уласціва толькі аднаму" [5, с. 50].

Такім чынам, ужо ў "Энцыкліцы" Фоцій даў крытыку "філіокве". Галоўныя яе моманты зводзіліся да того, што заходняе хрысціянства парушае манархію Бога-Айца, зводзіць Тройцу да двоіцы.

Сачыненні патрыярха Фоція супраць рымскай царквы сустрэлі на Захадзе хрысціянскага свету адпор. Цікава, што заходнееўрапейскія палемісты, як адначае сучасны расійскі даследчык дадзенай праблемы А.В. Бармін, асноўныя аргументы бяруць не са Святога Пісання, а з прац айцоў царквы. Фоцій пры ўсёй сваёй адукаванасці гэтага не зрабіў [9, с. 99].

Аднак, Фоцій узняў такія пытанні, вызначыў такія шляхі крытыкі абрадаў і дагматыкі рымска-каталіцкай царквы, што яны перажылі яго надоўга. Кожны раз, калі ўзнікалі новыя супярэчнасці паміж Захадам і Ўсходам хрысціянскага свету, аргументацыя і высновы Канстантынопальскага патрыярха станавіліся актуальнымі.

Літаратура

1. Лемерль, П. Первый византийский гуманизм. Замечания и заметки об образовании и культуре в Византии от начала до X века / П. Лемерль. – СПб.: «Свое издательство», 2012. – 490 с.
2. Аверинцев, С.С. Философия VIII – XII вв. / С.С. Аверинцев // Культура Византии. Вторая половина VII–XII в. – М.: «Наука», 1989. – С. 36 – 59.
3. Каждан, А.И. История византийской литературы (850 – 1000 гг.). Эпоха византийского энциклопедизма / А. И. Каждан. – СПб: Алетейя, 2012. – 376 с.
4. Лебедев, А.П. История разделения церквей в IX, X, XI веках / А.П. Лебедев. – СПб.: Алетейя, 2001. – 320 с.
5. Хайнталер, Т. Энциклика Фотия патриархам Востока. Проект антилатинской полемики / Т. Хайнталер // Вестник ПСТГУ. – 2011. - Вып. 6. – С. 45–56.
6. Успенский, Ф.И. История Византийской империи: в 5 т. / Ф.И. Успенский. – М.:ООО “Издательство Астрель”, ООО “ИздательствоАСТ”, 2001 – 2002. – Т. 3: Период Македонской династии (867 – 1057). – 800 с.
7. Мейендорф, Иоанн (протоиерей). Введение в святоотеческое богословие / Иоанн Мейендорф (протоиерей). – Минск: Лучи Софии, 2001. – 384 с.
8. Окружное послание патриарха Фотия [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.hristianstvo.in/ru/content/ – Дата доступа: 15.09. 2015.
9. Бармин, А.В. Полемика и схизма / А.В. Бармин. – М.: Институт философии, теологии и истории св. Фомы, 2006. – 648 с.

Т.У. Ганчарова-Цынкевіч (Мінск)

АСВЕТНІЦКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ЦЁТКІ

Сярод беларускіх пісьменнікаў пачатку XX стагоддзя імя Цёткі (Алаізы Сцяпанаўны Пашкевіч) займае адно з цэнтральных месцаў. Разам з Янкам Купалам, Якубам Коласам, Максімам Багдановічам, Змітраком Бядулем, Карусём Каганцом і іншымі мастакамі слова Цётка ўзначаліла рэвалюцыйна-дэмакратычны напрамак у беларускай літаратуры, сваімі творамі садзейнічала станаўленню нацыянальнай класікі, а яе жыццёвы і творчы шлях стаў сімвалам усяго адраджэнскага руху таго часу.

Паэтка верыла, што народ – творца гісторыі і што будучае – у яго руках, таму імкнулася далучыць беларускі народ да культуры, якой дасягнула чалавечае грамадства.

У 1906 годзе Цётка загаварыла аб небходнасці адкрыцця народных школ, у якіх бы дзеці вучыліся на роднай мове, і гэта дазволіла бы хутчэй асвоіць не толькі адукацыю, але і культуру іншых народаў. У артыкуле “Як нам вучыцца” пісала: “…Калі пачнуць у нас уводзіць новыя начальныя школы, трэба, канечне, каб дзяцей у іх навучалі па-беларуску, каб тлумачылі ім усё па-тутэйшаму, па-свойму, як дзеці гавораць з бацькамі і як найлягчэй разумеюць. Тады дзеці і чытаць скарэй навучацца, і пазнаюць лягчэй іншыя мовы – расейску ды польску. Дзеля таго ўсе беларусы і ўсе, хто хоча даць народу праўдзівую навуку, павінны дамагацца для беларусаў начальнай школы” [2, с. 174].

У гэтым артыкуле асветніца выступіла і ў абарону нацыянальнай мовы: “Доўга мы, беларусы, цураліся сваёй мовы і, як кажуць, хаваліся з ёю за печ перад чужымі людзьмі. Вось і злажылася нейкая дурная пагаворка, што наша мова хамска, брыдка, што на ёй не можна гаварыць з вучоным чалавекам, ані пісаць кніжак, як на іншых “далікатных” мовах. Але гэта толькі выдумка.” [2, с. 174].

Выступаючы за неабходнасць адукацыі на роднай мове, Цётка пачала працу над складаннем кніжак для дзяцей. На пачатку XX стагоддзя яна была першай у гэтай справе сярод беларускіх пісьменнікаў.

Пад псеўданімам Тымчасовы ў 1906 годзе пісьменніца выдала кніжку на беларускай мове лацінскімі літарамі “Гасцінец для малых дзяцей”. Тут былі змешчаны сем невялікіх апавяданняў у перакладзе з украінскай мовы і некалькі прыказак, прымавак, загадак.

Змест гэтых апавяданняў даваў магчымасць прывіць дзецям пачуццё любові да чалавека працы, навучыць дзяцей па-сапраўднаму шанаваць сяброўства (“Рыжая”, “Неспадзяваны гасцінец”). У іншых апавяданнях гэтай кніжачкі расказвалася аб птушках, раслінах, з’явах прыроды (“Расінка на рожы”, “Лебедзь”).

У тым жа 1906 годзе ў Пецербурзе выдавецкая суполка “Загляне сонца і ў наша ваконца” выдала “Беларускі лемантар, або Першую навуку чытання” (без указання аўтарства Цёткі), а затым “Першае чытанне для дзетак беларусаў” (аўтарства Цёткі ўжо было засведчана).

“Беларускі лемантар…” быў адрасаваны настаўнікам. У ім даваліся парады, як трэба вучыць чытаць дзяцей, ён арыентаваў настаўнікаў і вучняў на адпаведныя правілы правапісання, а таксама тут былі змешчаны і тэксты для чытання.

“Першае чытанне для дзетак беларусаў” нагадвала падручнік-хрэстаматыю, куды ўключаліся вершы, загадкі, апавяданні, нарысы, казкі, прыпеўкі, прыказкі. Гэты падручнік выдаваўся двойчы: лацінкаю і кірыліцай. Частка матэрыялаў, уключаных у гэтую кніжачку, – аўтарскія,

напісаныя для “Першага чытання”, а частка – апрацоўка народнай творчасці пісьменніцай і адаптацыя фальклору да дзіцячага ўзросту. Усе творы чытанкі разлічаны на тое, каб выхаваць у падрастаючага пакалення любоў да сваёй радзімы, да роднай прыроды і акаляючага свету.

Так, напрыклад, вершы “Сынок маленькі”, “Мой сад”, “Лес”, “Родная вёска”, змешчаныя Цёткай у гэтай кніжачцы, уражваюць глыбокім лірызмам, пачуццём цеплыні і шчырасці. Для ўзору прывядзём радкі з твора “Мой сад”:

Стаіць мой сад пад белым цветам:
Нарцыс, стыдлівых поўны крас,
Звісае бэз ў акно букетам,
Тульпанаў куст расцвёў зараз.
...Люблю мой сад, як расцвітае,
Як салавей свой трэль вядзе,
Як цвет галінку прыгібае,
Як пчолка мёд адтуль нясе. [2, с. 154]

Захапленне роднай прыродай у вершы перарастае ў пачуццё вялікай любові да радзімы. Вершаваная прастора твора поўніцца адчуваннем квітнення і буяння жыцця. У ім чуецца сапраўдная песенная рапсодыя навакольнага свету. Паэтка захоплена цудам прыроды, у якой пануе суладнасць фарбаў, працэсаў і перыядаў.

Верш “Лес” напісаны ў форме звароту да лесу. Тут ён паўстае як жывая істота. Такімі рысамі паэтка надзяляе кожнае дрэва і тым самым стварае адпаведны казачны настрой, фарміруючы ў дзяцей вобразнае мысленне.

Беларускія краявіды ў вершах Цёткі выступаюць ва ўсёй сваёй прыгажосці. Аўтар з захапленнем малявала неабсяжныя прасторы, высокія хвоі і стромкія бярозы, велічныя лясы і шумлівыя рэкі, поўныя чароўнага хараства. З народных казак, апрацаваных пісьменніцай і ўключаных у “Першае чытанне для дзетак беларусаў”, мы знаходзім такія, як “Журавель і Чапля”, “Курыца і пятух”, “З прыску ды ў агонь”, “Пакуль не ў руках, не кажы, што тваё”, “Сварба”.

Ва ўсіх гэтых казках закранаюцца маральна-этычныя праблемы, якія могуць зацікавіць маленькага чалавека. На думку пісьменініцы, такія творы павінны былі садзейнічаць выхаванню будучых грамадзян беларускага краю, фарміраваць адпаведныя этычныя і эстэтычныя нормы паводзін.

Акрамя таго, Цётка ставіла задачу навучыць дзяцей правільна чытаць і вымаўляць, таму над кожным словам тэкста ставіла націскі. Гэта кніжка была сапраўды першай і вельмі карыснай для маленькіх чытачоў.

Такім чынам, сёння гэтыя падручнікі Цёткі, адрасаваныя дзецям, даюць падставу для разгляду іх як своеасаблівай нацыянальна-асветніцкай праграмы пісьменніцы.

У 1914 годзе Цётка бярэцца за выданне часопіса для моладзі – “Лучынка”. Гэта быў літаратурны штомесячнік на беларускай мове, які, па

архіўных дакументах (ЦДГА г. Санкт-Пецярбурга, фонд № 776, вопіс 22, справа 219), працаваў па наступнай праграме:

1. Аповесці, апавяданні, вершы, байкі.
2. Навукова-папулярныя артыкулы.
3. Артыкулы аб маралі.
4. Пагаворкі, загадкі, жарты, шарады і задачы.
5. Паштовая скрынка.
6. Аб’явы.

З гэтага дакумента відавочна, што афіцыйным рэдактарам часопіса быў А. Уласаў, аднак фактычным рэдактарам “Лучынкі” з’яўлялася Цётка.

Працуючы над выданнем “Лучынкі”, Цётка часта была незадаволена тым, што часопіс не мае свайго аблічча. Пра гэта яна пісала ў лісце да прафесара Б. Эпімаха-Шыпілы: “Лучынку запалілі, але покі што вельмі слаба яна тлее. Трэба больш агню ад маладых сіл. Дровы, з каторых цяпер шчапаецца “Лучынка”, залішне слязьмі-доляй нацягнула, дык слаба гарыць. Першы нумар выйшаў без аблічча ад незалежных ад нас прычын. Ратаваліся толькі, каб хаця як літаратурная кніжачка вышла не вельмі ліхая … Дзядзечка, клікніце кліч між беларускай маладзёжы, хай бярэцца да працы для пакіненых братоў і сёстраў у вёсцы…” [2, с. 216–217].

Падкрэсліваючы, што “Лучынка” выйшла без аблічча “па незалежных ад нас прычынах”, пісьменніца мела на ўвазе царскую цэнзуру.

У сваіх артыкулах, якія Цётка змяшчала ў гэтым часопісе, вектар яе ідэйных пошукаў заўсёды быў скіраваны ў асветніцкую, маральную і педагагічную плоскасць. Для прыкладу можна назваць такія артыкулы, як “Да вясковай моладзі беларускай”, “Шануйце роднае слова!”, “Аб душы маладзёжы”, “Да дзяўчатак”, “Да школьнай моладзі”. Пісьменніца заўсёды падкрэслівала, што на моладзі ляжыць вялікая адказнасць развіваць сваю родную мову, узбагачаць свой народ ведамі і культурай. Адсюль і запавет Цёткі развіваць у сабе любоў да чалавека, да народа, да радзімы.

У перыяд сваёй працы ў “Лучынцы” Цётка часта звярталася да жанра нарыса. У гэтым жанры напісаны яе “Успаміны з паездкі ў Фінляндыю”, “З дарогі”, “Гутаркі аб птушках”.

Нарысы пісьменніцы – не проста пералік вядомых фактаў, а ўзор асветніцка-педагагічных даследаванняў першай чвэрці XX стагоддзя.

Праца Цёткі ў часопісе, яе публікацыі на старонках гэтага выдання не толькі садзейнічалі развіццю пазнавальных і эстэтычных здольнасцей падрастаючага пакалення, але і выконвалі нацыянальна-выхаваўчую функцыю, спрыялі фарміраванню свядомасці беларускай моладзі, вучылі любіць сваю Радзіму і культуру.

Цётка стала пачынальніцай беларускай асветніцкай справы. Яна не толькі стварыла першыя беларускія падручнікі для дзяцей, але і заклала асновы асветніцкай беларускай методыкі. Творчасць пісьменніцы

ўзбагаціла філалагічную навуку і педагогіку ідэямі нацыянальнай асветы і распрацоўкай методыкі навучання ў нацыянальнай школе.

Літаратура

1. Каваленка, В.А. Вытокі. Уплывы. Паскоранасць / В.А. Каваленка. – Мінск: Навука і тэхніка, 1975. – 336 с.

2. Цётка. Выбраныя творы: уклад. В. Коўтун / Цётка. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2001. – 336 с.

Г.А. Гладкова (Віцебск)

ІДЭЙНА-МАСТАЦКІЯ АСАБЛІВАСЦІ ПАНЕГІРЫЧНАГА ВЕРША ІГНАЦІЯ ЯКСЫ БЫКОЎСКАГА “ЯСНАВЯЛЬМОЖНАМУ ПРАКОПУ БАГНЕЎСКАМУ…”

У 1807 годзе асобнай кнігай у Вільні (друкарня Віленскага ўніверсітэта, друкар Ёзаф Завадскі) быў выдадзены панегірычны верш польскамоўнага пісьменніка, выхадца з беларускіх земляў Ігнація Яксы Быкоўскага з нагоды прызначэння губернатарам Літоўска-Віленскай губерніі Пракопа Багмеўскага. Як вядома з гістарычных крыніц, дзейсны стацкі саветнік Пракоп Лукіч Багмеўскі займаў пасаду губернатара з 18 снежня 1806 года па 1808 год.

Як вынікае з аўтабіяграфіі І. Быкоўскага, у гэты час пісьменнік знаходзіўся ў спадчынным маёнтку Пяцеўшчына ў Мінскай губерніі пасля заканчэння вайсковай службы ў расійскай арміі і ўдзелу ў тагачасных ваенных кампаніях. Менавіта цяпер, пасля трывог нялёгкага ваеннага жыцця, літаратар пачаў актыўна працаваць над ўласнымі мастацкімі творамі.

Месца выдання верша “Яснавяльможнаму Пракопу Багнеўскаму…” невыпадковае. Як вынікае з біяграфіі І.Быкоўскага, значнай праблемай для рэгіянальнага пісьменніка пачатку XIX стагоддзя з’яўлялася магчымасць друку ўласных мастацкіх тэкстаў. І. Быкоўскі прыкладаў вялікія намаганні, каб апублікаваць сваю літаратурную спадчыну, пастаянна шукаў дапамогі ў гэтай справе, хадайнічаў перад князем А.К. Чартарыйскім аб пратэкцыі перад кіраўніком друкарні Віленскага ўніверсітэта Ёзафам Завадскім, сам звяртаўся да адміністрацыі згаданай установы з просьбай аказаць падтрымку з выданнем твораў [1, с. 216–218].

Цяжка ўпэўнена сказаць, чым выклікана фактычная памылка ў назве верша (прозвішча “Багмеўскі” запісана як “Багнеўскі”), верагодна, гэта магло стаць абдрукоўкай, незаўважанай пры наборы выдання.

Традыцыя прамаўляць хвалебныя словы ці ствараць панегірычныя вершы (оды) з нагоды святочных падзей і ў гонар высокіх асоб была надзвычай папулярнай у еўрапейскай літаратуры XVII стагоддзя, яна атрымала пашырэнне ў рускай літаратуры XVII–XVIII стагоддзяў (оды М. Ламаносава, панегірычная паэзія Г. Дзяржавіна і г.д.). У літаратурнай спадчыне

І.Быкоўскага знаходзім шэраг твораў-прысвячэнняў вядомым асобам эпохі, што дазваляе зрабіць выснову пра асаблівае месца панегірычнай лірыкі ў творчасці пісьменніка. Дастаткова прыгадаць урачыстае вершаванае прысвячэнне “Яснавяльможнаму Яну Фрызелю…”, якое адкрывае паэму І.Быкоўскага “Касцёл славы”, оду “Святлейшаму Імператару Расіі Паўлу І пры ўступленні на трон” і г.д.

Урачыстая вершаваная абвестка “Яснавяльможнаму Пракопу Багнеўскаму…” напісана з захаваннем традыцыйных элементаў панегірычнай паэзіі. Па традыцыі вершу папярэднічае лацінамоўны эпіграф (*Placere multis res est plena fortuna*), які акумулюе аўтарскую думку пра важнасць Фартуны ў лёсе кожнага чалавека.

З васьмі строф верша першыя тры з’яўляюцца ўмоўна вылучаным уступам, у якім паэт разважае над універсальным пытаннем рознай адоранасці людзей ад нараджэння: “*Lech nie każdemu dar przyrodzenia / Nadał sposoby tak zwrotne, / By wieńczył skutkiem tkliwe pragnienia, / Tworząc zamiary stokrotne*” (“*Але не кожны ад нараджэння / Надзелены такім дарам, / Здзяйсняць вялікія задумы - / Вынік чуллівых жаданняў”* [3, с. 1]. Паэт наракае, што большасць тых, хто “*falą na odwrót cofniony*” (“*адсунуты натоўпам назад*”), пачынаюць скардзіцца на свой лёс і падманутыя надзеі. І толькі адрасат верша (“*Ty tylko Panie!*”) вылучаецца сярод іншых сумленнасцю ў руху па кар’ернай лесвіцы: “*… bez innych zguby, / Doszedem stopnia szczęśliwie*” [3, с. 1].

У наступных чатырох строфах аўтарам падкрэслены лепшыя рысы дзеючага губернатара. Перш за ўсё, І. Быкоўскі вылучыў сціпласць П. Багмеўскага: “*Nie ty pragnąłeś dla się Urzędu, / Lech ciebie wartość szukała*” (“*Ты не шукаў для сябе пасады, / Цябе патрэба знайшла…*”) [3, с. 2]. Паэт адзначаў, што прызначаны губернатар не мае ўласнай карысці ад пасады, а гэта сведчыць пра дабрачыннасць і сумленнасць абранага кандыдата. Выкарыстоўваючы прыём адмоўнага параўнання, І. Быкоўскі ўзмацніў станоўчыя якасці адрасата, назваў П. Багмеўскага “ўзорам” кіраўніка, дадаўшы ў заўвагах вядомы лацінскі выраз “*non locus hominem sed homo locum ornat*” (“*не чалавек упрыгожвае месца, а месца ўпрыгожвае чалавека*”).

І. Быкоўскі ўвёў у мастацкую тканіну твора вобраз вяшчуна, прарока, які прадбачыць поспех дзяржаўнага дзеяча ў будучыні. Паказальны з пункту погляду ідэйнай накіраванасці апошні катрэн верша. Паэт прыгадвае асобу імператара Аляксандра Першага, які прадстаўлены ў творы пад імем “*Tytus drugi*” (“другі Ціт”) і названы ўзорным кіраўніком дзяржавы. На думку аўтара верша, вылучэнне П. Багмеўскага на пасаду губернатара – гэта жаданне імператара, каб варты гэтай пасады службоўца ішоў той жа дарогай дабрачыннасці.

Адзначым, што І. Быкоўскі ўжо звяртаўся ў сваёй творчасці да вобраза аднаго з самых вартых імператараў Рымскай імперыі Ціта. Дастатко-

ва ўзгадаць “Оду Фартуне”, дзе з Цітам параўнаны імператар Павел І. Сэнс такога параўнання заключаны ў атаясамліванні сучасных паэту кіраўнікоў дзяржавы з адным з самых вядомых гістарычных асоб – абагаўлёным рымскім імператарам Цітам Флавіем Веспасіянам (Цітам), на перыяд праўлення якога прыйшліся гады згоды сената і імператара. Як паведамляў старажытнарымскі пісьменнік Гай Светоній Транквіл, адзін з лепшых імператараў, вядомы ў гісторыі пад імем Боскі Ціт (Divus Titus), вызначаўся высокамаральнымі паводзінамі, быў прадбачлівым і мудрым палітыкам, уважлівым да патрэб простага народа [2].

Калі ўлічыць гістарычныя абставіны кіравання імператара Паўла І і яго наступніка Аляксандра І, то аўтарскае параўнанне абодвух кіраўнікоў з асобай рымскага імператара Ціта выклікае некаторую двухсэнсоўнасць. Верагодна, на думку І. Быкоўскага, узорнае панаванне Ціта Веспасіяна павінна быць арыенцірам для любога кіраўніка. Паэт аддаваў перавагу дзяржаўным інтарэсам над асабістымі маральнымі якасцямі кіруючых асоб, гэтым самым прызнаваў клопат пра дзяржаву першасным абавязкам імператара, апошні, на думку пісьменніка, павінен быць справядлівым і чалавечным, уважлівым да патрэб падданых. Падкрэслім, што мастацкія асаблівасці верша “Яснавяльможнаму Пракопу Багнеўскаму…” не вылучаюцца арыгінальнасцю. Аўтар кіруецца традыцыйнымі спосабамі стварэння вобразнасці, выкарыстоўвае прыём адмоўнага параўнання для акцэнтавання ўвагі на лепшых рысах характару дзяржаўнага дзеяча, а рытарычныя звароты насычаюць мастацкі твор асаблівай экспрэсіяй.

Такім чынам, урачыстая вершаваная абвестка з нагоды атрымання Пракопам Багмеўскім пасады губернатара Літоўска-Віленскай губерніі з’яўляецца яшчэ адным прыкладам панегірычнай паэзіі ў творчасці І. Быкоўскага, які дазваляе ўдакладніць асаблівасці мастацкага метаду пісьменніка і ўзбагачае айчыннае літаратуразнаўства фактычнай крыніцай са спадчыны малавядомага польскамоўнага аўтара Беларусі.

Літаратура

1. Гладкова, Г.А. Творчая спадчына Ігнація Быкоўскага ў кантэксце эпохі еўрапейскага Асветніцтва / Г.А. Гладкова. – Віцебск, 2015. – 219 с.

2. Светоний, Г.Т. Божественный Тит / Г.Т. Светоний // Жизнь двенадцати цезарей. – М., 1991. – С. 268 – 274.

3. Ignacy Bykowski. Do Jaśnie wielmożnego Prokopiusza Bagniewskiego gubernatora gubernii litewsko-wilenskiey aktualnego stanu konsyliarza. Radośne oświadczenie z otrzymanego stopnia gubernatora / I. Bykowski. – Wilno. – Roku 1807. – 2 s.

Л.Я. Глазман (Віцебск)

“МАЛАЯ” ПРОЗА ЯК ФОРМА АДЛЮСТРАВАННЯ САМАІДЭНТЫФІКАЦЫІ АСОБЫ (НА МАТЭРЫЯЛЕ ТВОРАЎ Л. АНДРЭЕВА І М. ГАРЭЦКАГА)

У творчай спадчыне і Леаніда Андрэева, і Максіма Гарэцкага – сучаснікаў, прадстаўнікоў дзвюх блізкіх культурна-літаратурных традыцый – даволі востра стаіць праблема асобаснай ідэнтыфікацыі. Пры гэтым яна знаходзіць найбольш шырокую рэалізацыю ў тэкстах “малой” апавядальнай формы. Гэта даволі заканамерна па некалькіх прычынах. Абодва аўтары пакінулі значную колькасць твораў “малой” прозы, што дазваляе ахапіць больш самаідэнтыфікацыйных тыпаў і зрабіць найбольш цэласны аналіз персанажаў мастацкага свету абодвух пісьменнікаў. Да таго ж, у “малой” прозе дзеянне звычайна ў большай ступені напружанае і сканцэнтраванае на мастацкай ідэі, чым у рамане ці аповесці, а тэкст характарызуецца *“центростремительностью системы персонажей и композиционного строя”* [6, с. 73–74]. Адпаведна, самаідэнтыфікацыя героя ў аналізуемай катэгорыі твораў лягчэй паддаецца фіксацыіі і аналізу. Нарэшце, дадзеная апавядальная форма ў пазначаных аўтараў мае шырокі жанравы дыяпазон.

У творчасці Максіма Гарэцкага праблемы светаўспрымання, самавызначэння і самаідэнтыфікацыі асобы актуалізуюцца ў наватарстве жанраў і разнастайных *“жанравых мадыфікацыях”* [4, с. 140]. Пісьменнік не проста эксперыментаваў з формай традыцыйных жанраў апавядання і навелы, ствараючы каляднае апавяданне (“У лазні” (1912)), псіхалагічнае апавяданне (“Маці” (1916), “Амерыканец” (1916)), апавяданне ў лістах, эпісталярнае (“У чым яго крыўда” (1914)), *“навэлу-памфлет”* [4, с. 138–140] (“Ашуканы палітрэдактар” (1929), “Прастуда містэра Рамзая” (1930)), *“сатырычны сказ”* [4, с. 139] (“Дурная галава” (1922)) і г.д., але ўзбагаціў айчынную літаратуру лірычнай і філасофскай прозай (замалёўкі “Цёмны лес” (1913), “Буйніцы і драбніцы” (1913), “Вясна” (1914), “[Кіславодскія замалёўкі]” (1917), інш.), стаў пачынальнікам шматлікіх жанраў такой папулярнай сёння мастацка-дакументальнай літаратуры.

У жанравай сістэме твораў “малых” формаў Леаніда Андрэева, акрамя традыцыйных апавядання і навелы з іх разнавіднасцямі, даследчыкі [3] адзначаюць прыпавесць (“Сцяна” (1901)), лірычную мініяцюру (“У цягніку” (1900), “З апавядання, якое ніколі не будзе скончана” (1907)), легенду (“Так было” (1905)), а таксама творы мастацка-публіцыстычнага характару (фельетоны, “Мае анекдоты” (1907), “Казачкі не зусім для дзяцей” (1907)), інш.

Самаідэнтыфікацыя асобы герояў і спосабы яе раскрыцця ў прозе пазначаных пісьменнікаў знаходзяць розныя ідэйна-мастацкія рашэнні, звязаныя з жанравай прыналежнасцю твора. Агульнажанравыя асаблівасці ад-

люстравання асобы можна дастаткова выразна ўбачыць у апавяданнях Андрэева і Гарэцкага, нягледзячы на максімальную абагульненасць жанравых характарыстык і разнастайнасць мадыфікацый дадзенага жанру. У адрозненне ад навелы, у апавяданні сюжэтастваральным элементам становіцца засяроджанасць на ўнутраным свеце персанажа, яго псіхалагічным партрэце (важным элементам якога з'яўляецца асобасная самаідэнтыфікацыя), унутраным канфлікце; падзеі адбываюцца па аб'ектыўнай неабходнасці, носяць матываваны характар (у навеле сюжэт кумулятыўны); фінал апавядання адкрыты [6, с. 83]. У такім кантэксце, нягледзячы на сацыяльна-псіхалагічную завостранасць апавяданняў Гарэцкага і філасофска-сімвалічную накіраванасць андрэеўскіх твораў, вылучаюцца жанравыя дамінанты, якія дазваляюць разглядаць тэксты пісьменнікаў у "адной плоскасці". Усе пералічаныя рысы, напрыклад, прысутнічаюць у апавяданнях "Іншаземец" (1902) Л. Андрэева і "Амерыканец" (1916) М. Гарэцкага. У цэнтры ўвагі аўтараў унутраны канфлікт героя, сутыкненне яго нацыянальнай самаідэнтыфікацыі, псіхалагічнага стану з рацыянальнымі перакананнямі. Па сутнасці, вырашальным этапам для герояў абодвух апавяданняў становіцца неабходнасць пазбаўлення ад маскі, ілжывай ідэнтычнасці, якія штурхаюць іх на памылковы шлях: разам з адмовай ад радзімы адмовіцца ад часткі сябе. Ледзь улоўны намёк Гарэцкага на вырашэнне героя вярнуцца ў Беларусь і крок прымірэння з жыццём іншаземца ў апавяданні Андрэева не пазбаўляюць фіналы ўласцівай жанру неадназначнасці, якая ставіць чытача перад ідэйным пытаннем твора.

У навеле, дзе над "унутраным" дзеяннем дамінуе знешняя падзейнасць, сутнасць персанажа становіцца відавочнай у выніку выпадковага збегу абставін – у адрозненне ад апавядання, дзе самаідэнтычнасць асобы часцей падаецца з пачатку і мае патэнцыял для свайго станаўлення і развіцця. Так, да вельмі нечаканых наступстваў прыводзіць жаданне паказацца арыгіналам дробнага чыноўніка з навелы "Арыгінальны чалавек" (1904) Л. Андрэева. Анекдатычная сітуацыя будуецца на парадоксе: герою ўдаецца стварыць уражанне, але ахвяраваць за гэта прыходзіцца ўласным жыццём і сапраўднай ідэнтычнасцю. Максім Гарэцкі ў гістарычнай навеле "Смачны заяц" (1921) адлюстроўвае збег абставін, у якіх выкрываецца жывёльны страх героя (прыгоннага кухара) за сябе і безуважнасць да лёсу тых, хто знаходзіцца з ім "у адной запрэжцы" (хлопчыка), у бесчалавечных умовах сацыяльнага прыгнёту.

У лірычнай мініяцюры з яе фрагментарнасцю, урыўкавымі разважаннямі, апісаннямі пачуццяў лірычнага героя, які часта набліжаны да аўтара, самаідэнтыфікацыя асобы наратара не падаецца спецыяльна як аб'ект пісьменніцкай увагі, але пра яе можна меркаваць па асобных фразах, настроі і ходу думак героя-апавядальніка. Напрыклад, філасофскае асэнсаванне жыццёвых падзей і ўсведамленне сябе ў пэўны момант жыцця ў замалёўцы "Ідуць усе – іду я…" (1919) Гарэцкага даюць чытачу магчы-

масць стварыць уяўленне пра асобу ў момант пошуку самаідэнтыфікацыі. Сугучнай замалёўкай з'яўляецца твор Андрэева "У цягніку", лірычны герой якога востра адчувае ілюзорнасць і прывіднасць жыцця, сваю (і ўвогуле чалавечую) непаўнату і недасканаласць. Часам мініяцюра можа набываць публіцыстычныя рысы, што заўважаем у творах "Стогны душы" (1913) Гарэцкага, "З апавядання, якое ніколі не будзе скончана" Андрэева. У іх адчуваецца актыўная аўтарская пазіцыя, а самаідэнтыфікацыя персанажа супадае з пісьменніцкай.

Апроч агульных для творчасці Л. Андрэева і М. Гарэцкага жанраў, проза кожнага з іх мае сваю жанравую спецыфіку, што найперш звязана са стылёвым выбарам аўтараў. Вядома, што Максім Гарэцкі належыць да пачынальнікаў багатай традыцыі дакументальна-мастацкай прозы ў беларускай літаратуры. З аднаго боку, імкненне пісьменніка да фактаграфізму стасуецца з агульнай для айчыннай літаратуры накіраванасцю, *"схільнасцю да эмпірыкі, да жыццёвай канкрэтыкі, якія рэалізуюць сябе праз побытавы і сацыяльны пласты"* [5, с. 187]. З другога боку, з'яўленне твораў дакументальнага характару абумовілі асаблівасці таленту пісьменніка, якому *"няма патрэбы нешта маляваць, называць для таго, каб адно выбудаваць выяўленчы рад. Ён з ходу мае справу ўжо не столькі з аб'ектамі, колькі з сэнсамі гэтых аб'ектаў"* [2, с. 26].

Яскравым узорам дакументальна-мастацкай прозы пісьменніка з'яўляюцца "Сібірскія абразкі" (1926–1928) – шматжанравы цыкл твораў, напісаных у форме дзённіка, якія аўтар паспеў апрацаваць у рознай ступені. Але нават у найменш апрацаваных тэкстах добра адчуваецца аўтарская думка, бо ў абразках (як і ў пазнейшых запісах "З запісной кніжкі 1930 года") не *як*, а *што* з'яўляецца галоўным аб'ектам пісьменніцкай увагі. У пазначаных творах паміж наратарам і аўтарам сувязь надзвычай цесная, таму самаідэнтыфікацыя персанажа практычна супадае з пісьменніцкай. Кожны іншы герой паўстае пераважна аб'ектам ўвагі "збоку": бо для аўтара ён не персанаж твора, а рэальная асоба. У жанравым дыяпазоне цыкла "Сібірскія абразкі" вылучаюцца творы, набліжаныя да апавяданняў ("Малы рызыкант", "Уцекачы", "Пад'езд (Раман у дарозе)", інш.), нарысаў ("Палонны", "Інтэлігенты", "Кветкі зла"), лірычнай замалёўкі ("[Максімава зязюля]"), сказа ("[Івашка Палачанін]"), запісак і г.д. Сярод "Сібірскіх абразкоў" жанрава вылучаецца абразок пра Івашку Палачаніна, напісаны ў сказавай манеры. Відавочна, што зварот да фальклорна-дыдактычнай формы звязаны з настроем наратара, а туга па родных мясцінах Івашкі набліжаецца да эмацыянальнага стану пісьменніка падчас вандравання ў Сібір. Аднак твор набывае сваю мастацкую самастойнасць: усведамленне героем уласнай прыналежнасці да родных мясцін, непарыўнай сувязі з *"радзімым Полацкам"* [1, с. 320] прыходзіць занадта позна, бо ён ужо *"радасць сваю па чужых прасторах рассеяў"*

[1, с. 320]. У трагічным канфлікце паміж самаідэнтычнасцю асобы і жыццёвымі абставінамі гучыць перасцераджэнне, павучэнне для чытача.

Калі Гарэцкі імкнецца да спасціжэння асобы і яе месца ў свеце праз прызму ўласнага вопыту, то для рускага пісьменніка характэрны іншасказальнасць, эмацыянальна-ацэначны стыль твораў, экспрэсіўнасць і іншыя рысы публіцыстычнай прозы. Адзначаныя рысы сустракаюцца не толькі ў многіх мастацкіх тэкстах Андрэева, але і ў творах мастацкай публіцыстыкі (фельетоны "Качаня" (1901), "Смерць Гулівера" (1911), цыклы твораў "Мае анекдоты", "Казачкі не зусім для дзяцей"). У іх спрошчанасць і высокая ступень абагуленасці характараў не дазваляюць разглядаць самаідэнтыфікацыю персанажаў, бо перад намі схематычны характар, а не паўнавартасная асоба. Задача пісьменніка – зрабіць відавочнымі заганы чалавека і грамадства, якія робяць жыццё карыкатурным, падобным на "лялечную" рэчаіснасць.

Такім чынам, зварот да "малой" апавядальнай формы дае магчымасці для шырокага аналізу варыянтаў самаідэнтыфікацыі асобы ў прозе абраных пісьменнікаў: самаўспрымання, набліжанага да аўтарскага; самаідэнтыфікацыі розных сацыяльных тыпаў праз апісанне псіхалагічнага стану персанажа; вывядзення дамінантных рыс характару героя з выпадковых сустрэч; раскрыцця ўнутранага свету персанажа ў выніку збегу абставін; дыдактычна-павучальнага адлюстравання. Творчасць Максіма Гарэцкага адзначаецца наяўнасцю ў многіх творах асобы апавядальніка з набліжанай да аўтарскай самаідэнтыфікацыяй, а таксама дакументальнай асновай некаторых твораў. Сярод жанрава-стылёвых адметнасцяў прозы рускага аўтара – яе алегарычны, часам прыпавесційны характар, экспрэсіўнасць, наяўнасць жанраў мастацкай публіцыстыкі.

Літаратура

1. Гарэцкі, М. Збор твораў. У 4 т. / М.І. Гарэцкі. – Мінск : Маст. літ., 1984. – Т. 1: Апавяданні 1913–1930. – 446 с.
2. Корань, Л. Дынаміка жанравых структур у беларускай прозе XX ст. / Л. Корань // Цукровы пеўнік: літ.-крытыч. арт. – Мінск: Маст. літ., 1996. – С. 5–155.
3. Московкина, И. И. Поэтика прозы Леонида Андреева. Жанровая система и художественный метод : автореф. дисс. … д-ра филол. наук : 10.01.01 / И. И. Московкина ; НАН Украины, Ин-т лит-ры им. Т.Г. Шевченко. – Киев, 1994. – 35 с.
4. Падстаўленка, В. Жанрава-стылёвы аспект гумарыстычна-сатырычных апавяданняў М. Гарэцкага 20-х гадоў XX стагоддзя / В. Падстаўленка // Гарэцкія чытанні : Матэрыялы дакладаў і паведамленняў на XI чытаннях (да 110-годдзя з дня нараджэння Максіма Гарэцкага). Мінск, 18 лютага 2003 г. / Калектыў аўтараў. – Мінск, 2004. – С. 136–141.
5. Стральцова, В. Аўтабіяграфічная проза / В. Стральцова // Тэрмапілы. Літаратурна-мастацкі і беларусазнаўчы часопіс. – 2000. – № 3. – С. 180–192.
6. Теория литературных жанров : учеб. пособие для студ. учреждений высш. проф. образования / М.Н. Дарвин, Д.М. Магомедова, Н.Д. Тамарченко, В.И. Тюпа; под ред. Н.Д. Тамарченко. – М.: Издательский центр "Академия", 2011. – 256 с.

Г.М. Друк (Мінск)

МАСТАЦКАЕ ВЫЯЎЛЕННЕ ДУШЫ ЖАНЧЫНЫ-ЛАГЕРНІЦЫ Ў “СПОВЕДЗІ” Л. ГЕНІЮШ І “МАЛІТВЕ ДА КАЛЫМЫ” В. КОЎТУН

У айчыннай літаратуры пра сталінскія рэпрэсіі адметнае месца займае “Споведзь” Л. Геніюш. І найперш таму, што ў гэтай кнізе трагедыя часоў культу асобы паказаная вачыма жанчыны, прычым жанчыны з адметным светаўспрыманнем і талентам. Сваю старонку ў гісторыі асэнсавання тэмы ГУЛАГу пакінула В. Коўтун, стварыўшы “Малітву да Калымы”. Супастаўленне дакументальна-аўтабіяграфічнага твора Л. Геніюш і літаратурнай містыфікацыі В. Коўтун дазволіць па-новаму паглядзець на праблему мастацкай свядомасці. У прыватнасці, на здольнасць аўтара ўжывацца ў “трэці” вобраз, выбудоўваць яго характар, на якасць спасціжэння чужога светаўспрымання, меру аб’ектыўнага паказу рэальнасці вачыма прыдуманага мастацкага суб’екта. Ім з’яўляецца вобраз Лесі Беларускі, ці лагерніцы Ларысы Марозавай, фактаў рэальнага існавання якой навукоўцы пакуль не адшукалі.

Калі ў “Споведзі” ўвасоблены рэальны лёс асобы з дакладнай гістарычнай геаграфіяй яе быцця, то ў паэтычным эпасе “Малітва да Калымы” гераіня не з’яўляецца носьбітам канкрэтнай біяграфіі. Хаця відавочным застаецца жаданне В. Коўтун надзяліць Лесю Беларуску асобнымі рысамі індывідуальнага чалавечага лёсу, у які яна сама, як і многія іншыя, па словах аўтара, спачатку шчыра паверылі. Дэталі зміфалагізаванай біяграфіі Ларысы Марозавай былі вядомы ёй дзякуючы найперш былому вязню Калымы В.Малагушу. Таму ў вершах прыгадваецца то Палессе, то Маладзечна, узнікаюць вобразы каханага, маці, сяброўак, сына, але гэтыя асобы не канкрэтызаваны ў творах (“Сястры”, “Маладзечна”, “Радкі аб любові”). Пасіўнае выкарыстанне мастацкіх сродкаў індывідуалізацыі не перашкодзіла стварэнню паўнакроўнага псіхалагічнага партрэта гераіні, якая ўспрымае свет адпаведна жаночай прыродзе і сутнасці. І разам з тым, адчувае, бачыць рэальнасць па-свойму, доказам чаму адметны характар вобразна-ідэйнага мыслення лірычнай гераіні.

У літаратуразнаўчых працах ужо адзначалася, што гераіня і Л. Геніюш, і Леся Беларуска ўспрымаюць свой час як катастрофу для ўсяго чалавецтва з прычыны маштабнага распаўсюджвання энергіі зла (Локун В.І. [1, с. 130], Нуждзіна Т.С. [2, с. 144], Чабан Т.К. [3, с. 7]). Духоўны свет літаратурнай гераіні раскрываецца пры дапамозе біблейскіх матываў і сімвалаў, кантрастных вобразаў: “неба” і “пекла”, “крыжа” і “аўтамата”, “царквы” і “турмы” – у Л. Геніюш; “коласа” і “сярпа”, “нівы” і “вечнай мерзлаты”, “дрэва” і “пілы”, “птушкі” і “крамлёўскага арла” – у В. Коўтун. Нават моцная жаночая натура, якой надзелены абедзьве гераіні, кранае

сваёй безабароннасцю перад жорсткаю сілаю абставінаў. У віры зацятага болю жыве Леся Беларуска, якая з горыччу канстатуе: “Я думала свет дабрыні… Ён вечны. / Але дайсці ўжо не магу да толку, / чаму стаў грубым ён, бесчалавечным?” [4, с. 105]. Адзін з падыходаў В. Коўтун да раскрыцця трагізму становішча жанчыны-вязня, яе душэўных пакутаў – зварот да традыцыйных вобразаў жаночай долі, народнай песні (вершы “Рута”, “Не чую”, “Не плач…”, “Гісторыя хваробы” і інш.). Як прыклад: “і крыжыкам, і гладдзю сум расшыты” [4, с. 109], “нам, паланянкам, вечна ў снежных сумётах ляжаць” [4, с. 111], “Песня смерці адна. Толькі пілы, сякеры…/ Сякеры і пілы! / Прорва думак, і болю, і гора гара” [4, с. 121]. Распаўсюджаны вобраз у вершах – застылага пагляду, замерзлай слязы, слязінкі-ільдзінкі. “Не плач пры іх! Не плач пры іх!” [4, с. 126], – спрабуе ўтаймаваць хвалю роспачы Леся Беларуска. Спавядаецца ў натуральным праяўленні жаночага болю, эмацыянальна насычаным у лексіцы, і Л. Геніюш: “схапіў мяне плач страшны, нялюдскі” [5, с. 369], “уцякаю недзе ў кут і раву, як жывёла” [5, с. 414], “у бараку я енчу” [5, с. 429].

Можна звярнуць увагу і на такі аспект жаночых пачуццяў, як перажыванне назаўсёды страчанага – маладосці, знешняй красы, радасці кахання, разбурэння сям’і і наогул родавых, чалавечых сувязяў. Л. Геніюш піша аб тым, што згуртаваная ёю “беларуская сям’я” ў лагеры не магла выносіць паху якой-небудзь парфумы, бо яна асацыіравалася з начальствам і насіллем, якое ад яго ж ішло. Але падаецца па-мастацку лагічным зварот В. Коўтун да стварэння зусім верагоднага для лагера эпізоду: жаночы барак забыў пра “голад “пайкі” і смурод бахіл” [4, с. 112], бо доктар-зэк прынёс ім “Красную Москву”. Для Л. Геніюш вартасць жыцця не вымяраецца прыгожай вопраткай, але не згадаць у сваім аповедзе пра аблічча, адзенне, у якое апраналі зэчак, на прысвоеныя нумары, яна не магла, бо бачыла ў гэтым адзін са спосабаў сістэмы прымусіць жанчыну забыць, што яна чалавек. Дзякуючы асобным штрыхам, дэталям і ў калымскім цыкле ствараецца праз такі ракурс паказу становішча лагерніцы трагедыйны вобраз Калымы: “у чунях сосны, у сцігматах драты” [4, с. 122]. Стрымана, нават скупа, калі ўжо і слёз не стае ад пякучага болю, а замест яго нараджаецца злосць, прагучыць для нашчадкаў праўда пра ГУЛАГ: “Мрояў нашых воблак залаты. / Я запісала ўсё – душой, і неаспрэчна! / Тут, на скрыжалях вечнай мерзлаты” [4, с. 109].

Рэаліі лагернага жыцця, побыт успрымаюцца жанчынай надзвычай абвострана, эмацыянальна ярка. У “Споведзі” Л. Геніюш вобраз лагера раскрываецца найперш праз канкрэтныя чалавечыя лёсы, аўтарскую ацэнку чужога выказвання, учынку, паводзінаў, а таксама праз каментарыі, бывае, іранічна-з’едлівыя, аб бытавых умовах (напрыклад, давалі сеннікі і падушкі са стружак, “як мерцвякам” [5, с. 399]). Метафарычныя вобразы, створаныя В. Коўтун, таксама ўражваюць сваёй экспрэсіўнай выразнасцю, нечаканасцю асацыятыўных сувязяў, псіхалагічнай канкрэтнай

напоўненасцю. У вершы “Малітва да Калымы” гераіня бачыць, як “месяц завіс залаты / акрайчыкам хлеба ўгары” [4, с. 104]. На лесапавале, дзе для сякер і пілаў “свята”, для чалавека “карá і мох, як пайка для салдата” [4, с. 113]. Не падлягае вымярэнню традыцыйнымі меркамі боль чалавека, які асуджаны дзесяць год трываць сітуацыю, “калі ўсцяж над табою – у дзірках брызент. / І ў паўсотню мароз – пад брызентам” [4, с. 120]. У вершы “Сланечнік” аўтар ідзе ад стварэння сітуацыйнага малюнка да заключэння думкі-ідэі ў абагульнены вобраз, які ў сваю чаргу ў апошніх радках становіцца эмацыянальна-акрэсленым, прадметна-адчувальным аж да фізічнага перажывання. Галодным вязням з перасыльнага этапа такія ж няшчасныя з зоны перакінулі цераз дрот сланечнік, які ў Лесі Беларускі нечакана асацыіруецца з лагерным існаваннем (“Касцей людскіх як шалупіння зернят, / Па ўсім этапе – налузала смерць”) і ўласным лёсам (“І толькі я пакінута на свеце / <…> Адна з тых семак, што чакала смерці / На нарах… На этапах, …на зубах!”).

Праблема здзеку са святога пачуцця мацярынства і яго натуральных праяў закранута ў калымскіх вершах В. Коўтун “Цішыня”, “Чаму?” і асабліва пранізліва гучыць у Л. Геніюш. Лёс сына Юркі, як і свой уласны лёс, быў ахвяраваны мужнай паэткай на алтар Бацькаўшчыны. Той факт, што яго трымалі ў зняволенні, спойвалі, скіроўвае да думкі пра выродлівае аблічча сталінізму: ведалі ка́ты, што́ жанчыне-маці будзе балець наймацней. Душэўны боль за лёс сына як грэх, як малітва становіцца скразным у раздзелах пра лагер. Л. Геніюш шчыра спагадае тым, у каго забіралі дзяцей у спецзону і не дазвалялі матулям з імі бачыцца, альбо наогул труцілі малых спецыяльнымі парашкамі.

У “Споведзі” і ў “Малітве да Калымы” перад намі жанчына-паэтка. У выніку вобраз-характар, душа гераіні раскрываюцца перад чытачом і іншымі гранямі: яна не толькі безабаронная, але і незвычайна смелая, унутрана свабодная, нязломная. Гераіня “Споведзі”, як і сама аўтар, уражвае ўменнем пераадольваць пачуццё страху перад усім і ўсімі, здольнасцю выяўляць культуру мыслення і паводзінаў пры любых абставінах, быць міласэрднай да жывога чалавека і іранічнай побач з “чалавекам-зверам”. У В. Коўтун “я” лагерніцы-паэткі раскрываецца ў вершах “Піяф”, “У лагерным бараку”, “Выстаю…”, “Нас выбірайце ў лідэры, мужчыны!”, “Аб сіле жаночай любві” і інш. Духоўныя пошукі гераіні ідуць ад думкі “каб свет паратаваць, што можа ліра / між чорнай ноччу і халодным днём?..” [4, с. 109] да ідэі пра ўласнае місіянерства. Як і ў “Споведзі”, узнікае адчуванне ўкрыжаванасці свайго лёсу: “Цвік забівае хтосьці ў ногі мне. / І ў галаву…І выцягнуць не можна” [4, с. 106].

Фарміраванне ўнутранай прасторы асобы і захаванне яе ад надзору сістэмы было складанай задачай ва ўмовах лагера, але неабходнай для выжывання чалавечага “я”. Сістэма духоўных каштоўнасцяў аўтара “Споведзі” і яе гераіні, таксама як і Лесі Беларускі, – гэта той свет, які

“чарнілі. Рабавалі. Гналі… / На плаху. Наразброд. На Калыму. / Аднак жа вышыню яго прызналі” [4, с. 108]. Праўда, воля, чалавечнасць, інтэлект, радзіма, братэрства ўсіх народаў – тое, што жанчына ратуе, як і гонар свой чалавечы, ва ўмовах несвабоды, што страшна страціць, калі “Дух ламаюць дзень пры дні” [4, с. 128]. Такі погляд на жыццё выяўляе чалавека з глыбока гістарычным мысленнем, гуманіста і патрыёта, дыктуе адпаведную пазіцыю – стаць “стаць дачкой і байцом” [4, с. 116]. На думку Т. Чабан, “Споведзь” Л. Геніюш адрозніваецца ад таго, што напісана пра сталінізм, менавіта светаўспрыманнем гераіні, якая адчувала сябе не ахвярай часу, а свядомым змагаром за нацыянальную ідэю і чалавечнасць [3, с. 7]. Гістарычна дальназоркай з’яўляецца і Леся Беларуска, якая, нібы духоўны сувязны паміж пакаленнямі, паўстае з невядомых, рэальна знішчаных на Калыме і ў іншых лагерах людзей, творцаў (“На прыцэле не я, а народ” [4, с. 111], “Я ж душы тут, як храмы, берагу” [4, с. 115], “Я – вораг гвалтоўных акцый, / хлусні і пагардлівых жэстаў. / Я – часцінка цывілізацыі / Ад Полацка і да Брэста” [4, с. 116], “як свечкі на вятрах тваіх, радзіма. / Ад Янкі… Алаізы… І – Максіма” [4, с. 129]).

У выніку параўнальнага аналізу асобных момантаў твораў Л. Геніюш і В. Коўтун можна звярнуць увагу на архетыповы для беларускай літаратуры характар жаночай пазіцыі ў сітуацыі выпрабаванняў ад Скарынаўскай Юдзіф да Л. Геніюш і самой В. Коўтун. Многія вершы ў калымскім цыкле настолькі абагульнена падаюць з’явы, што зместам мацней прывязаны да сучаснасці. Але гэта прыкмета якраз і вылучае сапраўдную літаратурную містыфікацыю як мастацкую з’яву – стварэнне вобраза суб’екта, калі ён не рэальная гістарычная асоба, паводле розных актуальных матэрыялаў. Часам праз выпадкова вылучаныя падсвядомасцю аўтара дэталі, праз якія адлюстроўваецца стыль самой эпохі, у дадзеным выпадку 90-х гг. XX ст., В. Коўтун стварыла арыгінальныя вобразы, паказала нават вядомае па-новаму ад імя дамысленай асобы. Аўтар літаратурнай містыфікацыі чула абышлася з жыццёвым матэрыялам і аб’ектыўна, тыпова перадала рэальнасць ГУЛАГа ў адпаведнасці са спецыфікай жанру, які быў выкарыстаны.

Літаратура

1. Локун, В.І. Малітва, звернутая да людзей / В.І. Локун // Маладосць. – 2010. – № 4. – С. 128–131.

2. Нуждзіна, Т.С. Лагерны міф і мастацкая рэальнасць: Паэтычны свет В.Коўтун на сумежжы стагоддзяў / Т.С. Нуждзіна // VII рэспубліканскія Калеснікаўскія чытанні: матэрыялы рэспубліканскай навуковай канферэнцыі (г. Брэст, 15 снежня 2009 г.): у 2 ч. / [пад агульнай рэдакцыяй А.С. Кавалюк]. – Брэст, 2010. – Ч. 1. – С. 141–147.

3. Чабан, Т.К. Споведзь нескаронага сэрца / Т.К. Чабан // Літ. і мастацтва. – 1990. – 6 ліп. (№ 27). – С. 6 –7.

4. Коўтун, В.М. Выбранае / В.М. Коўтун. – Мінск: Лімарыус, 2011. – 280 с.

5. Геніюш, Л. Выбраныя творы / уклад., прадм. і камент. М. Скоблы / Л. Геніюш. – Мінск: Беларускі кнігазбор, 2006. – 616 с.

Л.У. Іконнікава (Мінск)

РЭЦЭПЦЫЯ БІБЛЕЙСКІХ МАТЫВАЎ У П'ЕСАХ Г. МАРЧУКА І А. ДУДАРАВА

Біблейская тэматыка, хрысціянскія вобразы і сімвалы, пераасэнсаванне евангельскіх і старазапаветных сюжэтаў былі заўсёды адной з невычэрпных крыніц паглыбленага мастацкага адлюстравання з'яў рэчаіснасці і крытэрыем мастацкага ідэалу. Шматпланавая ўніверсальнасць евангельскага сюжэтна-вобразнага матэрыялу становіцца асновай узнікнення новых літаратурных твораў, своеасаблівых варыянтаў біблейскіх падзей, што дазваляе кожны раз пераасэнсоўваць значнасць біблейскай спадчыны. Пры звароце да традыцыйных вобразаў і сюжэтаў, якія, адпаведна, адлюстроўваюцца праз прызму пісьменніцкага светаўспрыняцця, адбываецца трансфармацыя іх унутранай і знешняй формы, што дазваляе рэцыпіентам меркаваць пра аўтарскія мастацкія і эстэтычныя арыенціры, прыярытэты і творчыя імкненні.

Кожны мастак слова па-рознаму выкарыстоўвае гэтыя магчымасці: нехта апелюе да шматмернасці і ўніверсальнасці біблейскіх вобразаў на ўзроўні сімволіка-алегарычнага сэнсу (А. Дудараў "Адцуранне"), хтосьці звяртаецца на падтэкставым, інтэртэкстуальным узроўні да дзеючых асоб бібліі (Г. Марчук "Дарога ў Іерусалім"). Але яднае іх усіх жаданне праз творчую трансфармацыю біблейскіх вобразаў і матываў сцвердзіць найбольш актуальныя і балючыя праблемы сённяшняга часу, такія як руйнаванне маральна-духоўнага здароўя нацыі, адцуранне ад сваёй спадчыны, адыход ад крыніцы сапраўднай духоўнасці, а таксама перараджэнне і адраджэнне душы чалавека.

Надзвычай асацыятыўная ў дадзеным ракурсе п'еса А. Дударава "Адцуранне", дзе драматург, спалучаючы два планы дзеяння – рэальны і іррэальны, – паказвае шлях да адраджэння чалавека, які заключаны ў любові да бліжняга, у спагадзе, у вяртанні да духоўных скарбаў. Рэальны план дзеяння адбываецца ў цэнтры ліквідацыі наступстваў Чарнобыльскай катастрофы, менавіта сюды прыходзяць "абраныя", тыя, каму наканавана памерці, каб пасля ўваскрэснуць з мэтай аднавіць здавалася ўжо безваротна страчанае і знішчанае – разбураную капліцу. Гэтыя людзі не адрозніваюцца чыстым сумленнем, наадварот, яны нясуць пэўны адбітак граху (злачынства, забойства). Разам з тым, яны – тыя, хто яшчэ не поўнасцю згубіў у сваёй душы чалавечнасць. Кожны з персанажаў – своеасаблівы сімвал-тып, які сцвярджае, з аднаго боку, заганы, а з іншага – сапраўдную духоўнасць.

Найбольш паказальным і біблейска суаднесеным на падтэкставым узроўні з'яўляецца вобраз Вешчуна, пасланца Бога. Т. Аўдоніна адзначае, што ён – "асаблівы персанаж, які нагадвае калектыўны вобраз, зборную

дзеючую асобу прадстаўлення” [1, с. 107]. Менавіта на яго аўтар ускладвае місію Прарока, які абуджае ў душах герояў даўно забытае. Бачыць гэтага героя могуць толькі тыя, хто памёр, ці тыя, хто знаходзіцца на тонкай мяжы жыцця і смерці. Вуснамі Вешчуна аўтар прамаўляе біблейскія прароцтвы, яго словы “вельмі часта нагадваюць ракавыя вершы Апакаліпсіса” [1, с. 108]. Напрыклад, наступныя: “Калі з дыму выйшла саранча, то сказана ёй, каб не рабіла шкоды траве зямной, і ніякай зеляніне, і ніякаму дрэву, а толькі адным людзям, што не маюць пячаці Боскай на чале сваім...<...> І дадзена ёй не забіваць іх, а толькі мучыць пяць месяцаў... <...> У тыя дні людзі будуць шукаць сьмерці, ды не знойдуць; пажадаюць памерці, ды сьмерць уцячэ ад іх...” [2, с. 10]. На яго руках Ліквідатар прачытае: “Каго Я люблю, тых віню і караю…” [2, с. 11]. У гэтым героі некаторыя персанажы пазнаюць “месію” (пра гэта сведчаць і раптоўныя з’яўленні і знікненні, і яго бачнасць толькі да абраных), што пашырае магчымасці пры інтэрпрэтацыі і дазваляе выходзіць на іншы, больш глыбокі, узровень сімвалічна-алегарычнага зместу твора.

Падобная да “Адцурання” ў адносінах рэцэпцыі біблейскага своеасаблівая п’еса Г. Марчука , яго “драматургічнае апавяданне” “Дарога ў Іерусалім” (1997). Асаблівасць твора заключаецца ў яго эпічнасці, які “хутчэй разлічаны для чытання, а не для пастаноўкі на сцэне” [5, с. 88]. Адметнае месца дзеяння – вечны горад ля славутай Сцяны Плачу. Іерусалім – горад трох рэлігій: іўдаізму, хрысціянства і ісламу, таму і героямі становяцца людзі дадзеных канфесій. А гэта, у сваю чаргу, дазваляе пісьменніку заглыбіцца ў анталагічнае даследаванне росшукаў шляхоў да Бога. У сваім дзённіку “Салодкія слёзы” мастак адзначае, што “мэта ўсіх рэлігій адна, метады – розныя: дапамагчы чалавеку як мага хутчэй адысці ад жывёльнага стану да пачатку боскага. Бог ёсць вобраз для пераймання” (тут і далей пераклад аўтара. – *Л.І.*) [4, с. 24]. Разважанні дзеючых асоб вызначаюцца філасафічнасцю і глыбінёй.

Асноўная ідэя твора ўкладваецца ў вусны рабіна (варыянт вобраза прарока), які на інтэртэкстуальным узроўні выяўляе сувязі з біблейскім габрэем Мардахэем, адным з асноўных дзеючых асоб кнігі “Эстэр” Старога Запавету. Прычым на сувязь рабіна і біблейскага персанажа ўказваецца ў тэксце п’есы, калі герой Г. Марчука сцвярджае: “Да зыходаў я звык” [3, с. 81]. Відавочна, што прадстаўнік габрэяў ХХ стагоддзя ніякім чынам не мог удзельнічаць у зыходзе, паколькі Мардахэй у свяшчэннай кнізе паказаны як выгнаннік у час Вавілонскага палону. Тыпалагічная сувязь персанажаў прасочваецца не толькі ў сугучнасці імён, але і ў імкненні абодвух да выратавання свайго народа, у служэнні Богу. Аднак прачытанне створанага драматургам вобраза не можа быць аднабаковым. Апрача сувязі з біблейскім героем аўтарам для надання большай значнасці і павелічэння асацыятыўных сувязей выкарыстоўваецца біблейскі міф пра вечнага жыда. Узаемасувязь міфічнага персанажа і рабіна выяўляецца ў іх

“вечнасці”, творца неаднаразова падкрэслівае гэтую асаблівасць: “Я перажыў вавіланян і асірыйцаў, рымлян, арабаў, персаў, крыжаносцаў, турак... Перажыву і англічан” [3, с. 81]. На гэтую ж якасць звяртае ўвагу і І. Штэйнер: “Складваецца ўражанне, што марчукоўскі герой несмяротны, бо ён практычна адзін і той жа ў лютым 1946 года і раніцай 1995 года” [5, с. 88].

Мардзехай нікога не асуджае, клапоціцца пра іншых і імкнецца прымірыць людзей, бо не бачыць розніцы паміж рэлігіямі, галоўнае – гэта чалавечая душа, якая верыць у Бога, жыве па агульначалавечых законах: “І чаму ўсе шукаюць тое, што нас раз’ядноўвае, і не бачаць ці бачыць не жадаюць тое, што можа нас аб’яднаць?” [3, с. 100]. Рабін не прымае жорсткі тэрор, што адзначае і І. Штэйнер: “Ён даволі неадназначна ўспрымае законы продкаў і па-філасофску разважае пра дылему: ці ваяваць са зброяй у руках за свабоду і незалежнасць, ці чакаць, калі нехта прынясе іх як дарунак” [5, с. 89]. Пазіцыя Мардзехая выяўляецца ў словах, звернутых да свайго вучня мастака Аарона, які выбраў шлях тэрарызму: «Ты, Аарон, з роду первасвяшчэнніка Аарона. Удзел твой не вінтоўка, а Агада, Агада і Талмуд. Лячыць людзей, іх душы, умацоўваць іх веру ты павінен не пралітай крывёй – словам. Ты памятаеш заснавальніка Давіда? І што Гасподзь тады яму сказаў? “Давід, жаданне тваё паставіць Храм на Храмавай гары я ўхваляю, але пакладзі на месца першы камень. Няхай Храм пабудуе сын твой Саламон”» [3, с. 82].

Пісьменнік уводзіць у тэкст урыўкі з Біблії, некаторыя малітвы, што садзейнічае не толькі стварэнню атмасферы п’есы, але і паказвае адносіны драматурга да хрысціянства. У гэтым творы Г. Марчука, як ні ў якім іншым, загучала на поўную моц ідэя хрысціянскай любові, мудрасці, непрыняцце тэрору. Рэлігія не можа служыць апраўданнем ваенных дзеянняў, гвалту і забойстваў.

Новыя грані ў творы набывае вырашэнне праблемы граху і пакарання, якая, як звяртаецца ўвага ў п’есе, не можа мець адназначнай трактоўкі. Так, у спрэчцы пра Флавія Мардзехай сцвярджае ідэю ўсёдаравання: «Канешне, пляма здрадніка і перабежчыка хавае ад гарачых выбар Бога, прызначэнне гісторыка, які вам ненавісны. Але не было б яго, не апыніся ён саветнікам у Васпасіяна, Ціта – і хто б напісаў нам “Іудзейскую вайну”? Ды я больш праўдзівых старонак любові, спачування і гордасці народу сваему не бачыў» [3, с. 82]. Таму ў кожным учынку трэба шукаць схаваныя сэнсы, якія могуць паказаць адваротны бок медаля.

Мастак раскрывае вобразы сваіх персанажаў праз супастаўленне: рабін Мардзехай і Аарон, манахіня Алена і ігумення Еўдакія, Фарух і араб-экстрэміст, Рональд і Джон. Адны з іх праяўляюць лепшыя якасці, здольны да разумення і ўсёдаравання, сімвалізуючы светлы бок чалавечай натуры, іншыя сталі на шлях цемры, неразумення, эгаізму, тэрору, у іх сэрцах зло пачынае паглынаць дабро. “Дарога ў Іерусалім” – гэта твор са складанымі

чалавечымі ўзаемадачыненнямі, з супрацьстаяннем характараў, суіснаваннем поруч з дабром зла, з чалавечнасцю і гуманізмам – абыякавасці.

У драме знаходзяць сваё адлюстраванне такія асноўныя хрысціянскія матывы, як пакутніцтва, хрысціянская любоў, дараванне, выкараненне зла, святло і цемра. Дадзены твор надзвычай асацыятыўны, напоўнены імпліцытным сэнсам. Сімвалам выступае сам горад Іерусалім, рабін на падтэкставым узроўні звязваецца з вобразам вечнага жыда, легенда пра якога ўведзена ў п'есу. Пэўным знакам з'яўляецца назва, якая заключае ў сабе важную сэнсавую нагрузку для інтэрпрэтацыі зместавага ўзроўню твора. Дарога ў Іерусалім – гэта шлях да ўнутранай раўнавагі, духоўнасці і сапраўднай веры. Біблейскі вобраз Мардахэя (у аўтарскай трактоўцы рабін Мардзехай) у гэтым творы выступае асновай, тым будаўнічым матэрыялам, на якім трымаецца п'еса і ўвасабляецца ідэя. Ён становіцца стрыжнем развіцця падзей, праз яго ўспрыняцце раскрываецца глыбіня маральнага і духоўнага стану сучаснага грамадства.

Такім чынам, аналіз драматургіі Г. Марчука і А. Дударава дазваляе меркаваць пра характар рэцэпцыі Біблії ў іх творчасці. П'есы канцэнтруюць у сваёй зместавай структуры найбольш важныя і значныя анталагічныя і філасофска-псіхалагічныя аспекты трансфармацыі біблейскіх вобразаў і матываў. У творах пераднаны традыцыйныя сюжэты і пласты нацыянальнай рэчаіснасці: беларускай у адносінах да А. Дударава і яўрэйскага свету ў "Дарозе ў Іерусалім" Г. Марчука, гэта дапамагае апошняму павялічваць ступень абагульнення ў творы. Біблейскі дыскурс уваходзіць у драматургію на ўзроўні падтэксту і асацыятыўных сувязяў, што спрыяе шматаспектнаму прачытанню падзей і вобразаў у плане нацыянальнага светабачання і светаўспрымання. Зварот да біблейскіх вобразаў дазваляе аўтарам не толькі больш глыбока даследаваць рэчаіснасць, але і выказваць свае філасофскія і духоўна-эстэтычныя погляды.

Літаратура

1. Аўдоніна, Т.В. Жыць на зямлі…(Філасофія быцця ў драматургіі А. Дударава і класічная традыцыя): манаграфія / Т.В. Аўдоніна. – Гомель : УА "ГДУ імя Ф. Скарыны, 2005. – 127 с.

2. Дудараў, А. Адцуранне / А. Дудараў // Беларусь. – 1994. – № 4. – С. 10 –13.

3. Марчук, Г. Дорога в Иерусалим / Г. Марчук // Неман. – 1997. – № 12. – С. 78–106.

4. Марчук, Г. Сладкие слёзы: дневник / Г. Марчук. – Минск: Адукацыя і выхаванне, 2010. – 248 с.

5. Штэйнер, І.Ф. Сусвет, убачаны здалёк: творчасць Георгія Марчука: манаграфія / І.Ф. Штэйнер. – Гомель : УА "ГДУ імя Ф. Скарыны", 2003. – 95 с.

Е.В. Крикливец (Витебск)

ПОСТИЖЕНИЕ СУЩНОСТИ НАЦИОНАЛЬНОГО ХАРАКТЕРА В РУССКОЙ И БЕЛОРУССКОЙ «ДЕРЕВЕНСКОЙ ПРОЗЕ»

В 60-е–70-е годы XX века в период кризиса «оттепели» в литературе зародилось течение, ориентированное на поиск глубинных основ народной жизни. Обращение к истокам народной культуры несло в себе идею нравственно-религиозного обновления, которая в определенном смысле была противопоставлена дискредитировавшей себя государственной идеологии. И русские, и белорусские писатели-«деревенщики», преодолев каноны соцреалистического метода, начинают в своих произведениях поднимать национально значимые проблемы, отстаивать идею национальной самобытности, раскрывать духовные основы национального характера. «Деревенская проза» в своем развитии претерпевает несколько этапов. Во второй половине 1950-х годов становится очевидно, что официальная советская литература далека от правдивого изображения послевоенной деревни. Одним из первых эту проблему поднял Ф. Абрамов в статье «Люди колхозной деревни в послевоенной литературе» (1954) [1]. Не случайно в эти годы появляется ряд произведений, отличающихся особой публицистичностью и социальной заостренностью конфликтов, основная цель которых – показать истинное положение дел в колхозе, «вскрыть» болевые точки. Отражение социально-экономического кризиса деревни стало предпосылкой для размышления о кризисе духовном, для поиска нравственных основ человеческого бытия. В литературе 1960-х годов происходит своего рода идеализация народной жизни. Залог нравственного возрождения виделся в «естественной» жизни в гармонии с природой, в традиционном патриархальном укладе, хранителем которого оставалось крестьянство даже после варварского разрушения общинного мира.

В нашей работе мы остановимся на повестях И. Пташникова «Іллюк Чачык» (1957) и В. Белова «Привычное дело» (1966). Эти произведения стали этапными для своих создателей и знаковыми для развития «деревенской прозы» в национальных литературах. И. Пташников и В. Белов социальный конфликт обозначают достаточно остро. Причины экономического кризиса деревни оба прозаика объясняют не только ошибками власти в области сельского хозяйства: в обоих произведениях есть упоминание о времени «великого перелома» – именно коллективизация стала причиной разрушения традиционного уклада народной жизни. Однако при всей остроте социальной проблематики в повестях И. Пташникова и В. Белова она служит фоном для развития основного конфликта – нравственно-психологического. Социальные аспекты как бы интровертируются, являясь поводом для поиска внутренней, глубинной опоры не в советской государственности, а в духовном мире человека. Отметим при этом, что герои

анализируемых повестей проделывают нелегкий путь нравственных исканий, преодоления духовного надлома, путь к пониманию самих себя. И не каждому этот путь оказывается под силу.

В нравственном смысле путь Ивана Дрынова и Ильи Чачика в повестях В. Белова и И. Пташникова начинается из одной «точки отсчета», но для первого героя этот путь становится путем эволюции, а для второго – деградации. «Привычное дело» открывается «размышлениями» Ивана Дрынова о том, что пьянство – в определенном смысле национальная черта русского человека, оправданная образом его жизни. Но нормой подобное поведение даже для небезгрешного Ивана Африкановича оказывается только на первый взгляд. После – просыпается чувство вины, наступает мучительное раскаяние, приходит понимание того, что искать утешения в выпивке – не выход. Несколько иначе осмысливается проблема пьянства на селе в повести И. Пташникова «Іллюк Чачык». Спиртное становится разменной монетой, способом решения любых «административных» вопросов. Устойчивая тяга к выпивке свидетельствует о необратимой деградации героя.

Иван Дрынов отличается от Чачика в первую очередь тем, что тяжелая послевоенная действительность, зачастую толкающая героя на неблаговидные поступки, не убивает в нем главного качества, свойственного лучшим представителям русского крестьянства – совестливости, глубинной нравственной чистоты. И оттого так мучительно подчиняется Иван Африканович обстоятельствам, вынуждающим его пойти против собственной совести, такое острое чувство стыда испытывает он, уличенный на незаконном покосе: «Забыл надеть шапку и с великим стыдом, качая головой, вышел на крыльцо. Ему было до того неловко, совестно, что уши долго еще горели. Словно ошпаренные самоварным кипятком» [2, с. 64].

Безусловной ценностью в патриархальном крестьянском мире считалась семья. Семейные взаимоотношения были мерилом самостоятельности (самодостаточности) личности. Исторические события первой половины XX века разрушили патриархальные устои, но даже в новых социально-экономических условиях семья продолжала осмысливаться как величайшая ценность. Духовную состоятельность своих героев В. Белов и И. Пташников проверяют семейным укладом, отношением к традиционным семейным ценностям. Семью Дрыновых трудно назвать патриархальной: держится она на женских плечах Катерины и ее матери Евстольи. Любовь Ивана Африкановича к жене граничит с беспомощностью. Он нуждается в ней, как ребенок в матери. Тем не менее, семейные отношения строятся на взаимной «горячей» [2, с. 24] любви, понимании и прощении. Именно осознание ответственности за семью и детей поможет Ивану Африкановичу в финале повести преодолеть созерцательность и прийти к миропониманию.В отличие от Ивана Африкановича, Чачик проверку семейными ценностями не выдерживает. Пьянство и бесхозяйственность героя приводят к разладу и взаимному неуважению. Давняя и тайная симпатия

Чачика к Гилене, из-за которой «Чачык, можна сказаць, і прыйшоў сюды ў прымы з суседняй вёскі» [3, с. 143], не находит своего развития. Причиной тому вновь оказывается недостойное поведение героя.

Помимо семейных идеалов основой народной нравственности выступает любовь к родной земле, к созидательному труду на ней, привязанность к своим корням, к малой родине. Иван Африканович, как истинный крестьянин, не может оставаться равнодушным при виде колхозного запустения: «У Ивана Африкановича болела душа при виде пыльного, поросшего молочником поля, вспаханные места были не намного черней невспаханных» [2, с. 84]. Главный герой повести «Іллюк Чачык» проводит четкую границу между понятиями «свое» и «колхозное». И. Пташников изображает психологию человека, озлобленного, утратившего веру во власть и официальную идеологию. Подобное художественное решение можно назвать новаторским для «бесконфликтной» советской литературы.

В начале повести образ конюха Чачика представляется двойственным. Герой словно находится на распутье и окончательный выбор своего пути ему еще предстоит сделать. Не только у читателей, но и у председателя колхоза Кузнецова теплится надежда на то, что болтун и сплетник Чачик сумеет осознать двусмысленность своего положения. Но вместо обращения к собственной совести и обретения внутренней гармонии с окружающими Чачик окончательно ожесточается, в своих неудачах винит кого угодно, но не себя, испытывает желание отомстить рачительному хозяину, бригадиру Петру Лучинку. Путь Чачика – путь нравственного разложения, потери себя.

Однако при внимательном прочтении повести И. Пташникова возникает мысль о том, что образ Чачика – это не только образ «лишнего» человека в возрождающемся советском колхозе. Именно Чачик напоминает Петру Лучинку о событиях коллективизации, затронувших семью нынешнего бригадира. Из уст Чачика звучат слова о «пустых» трудоднях, которые позволяют усомниться в результативности работы в колхозе. Он же высказывает и недоверие районному начальству. Можно предположить, что, не решаясь во второй половине 1950-х годов в открытую обозначить проблемы советской деревни, автор повести «делегирует» эту задачу своему герою, далеко не идеальному колхознику, человеку, утратившему духовную опору.

Итогом эстетических исканий В. Белова в середине 1960-х годов становится образ героя, которому удается выйти через страдания к попытке постижения мира. На протяжении всего повествования писатель не раз характеризует отношение русского крестьянина к своей личности, к своей судьбе как созерцательное или даже равнодушное. Вполне естественными оказываются в повести контекстуальные параллели мировосприятия Ивана Дрынова и его жены Катерины с неосознанностью их младшего, шестинедельного сына или «жизнеописанием» коровы Рогули. Очевидно, что жизненный путь Ивана Дрынова выступает здесь отражением исторического пути всего русского крестьянства, судьбу которого «решали всегда без не-

го». Любовь к родной земле и преданность ей, совестливость и нравственная чуткость и в то же время неспособность к волевым решениям – в этом кроется неоднозначность народного характера. Правда, В. Белов замечает, что созерцательность и податливость русского человека в критической ситуации уступает место отчаянной решимости, стихийному, устрашающему бунту против насилия. Писатель уверен: народ можно согнуть, но нельзя сломать, истребить. Способность человека к духовному возрождению, к продолжению «привычного дела» жизни сродни природному круговороту, которому нет конца. Повествовательная структура повести, как и жизнь русского крестьянина, подчинена этому круговороту. Осознание жизни как величайшей ценности и непротивление ее естественным законам помогает герою понять свое предназначение в мире.

Таким образом, и русский, и белорусский писатели обращаются к исследованию социальных и нравственных проблем послевоенной деревни. Прозаиков прежде всего волнует вопрос о морально-этических основах народной жизни. В. Белов и И. Пташников убеждены, что хранителем этих основ традиционно выступает крестьянство. Однако, создавая образы главных героев своих произведений, писатели далеки от идеализации. И. Пташников изображает деградацию человека, разуверившегося не только в государственной системе, но (что гораздо трагичнее) утратившего моральные ориентиры, отказавшегося от важнейших нравственных ценностей. Герой повести В. Белова, пройдя через страдания и оказавшись на грани гибели физической и духовной, осознает главное – ценность человеческой жизни, а значит, находит путь к возрождению.

Литература

1. Абрамов, Ф.А. Люди колхозной деревни в послевоенной литературе / Ф.А. Абрамов // Новый мир. – 1954. – № 3. – С. 210–231.

2. Белов, В.И. Повести и рассказы / В.И. Белов. – М. : Худож. лит, 1984. – 543 с.

3. Пташнікаў, І.М. Зерне падае не на камень. Зборнік аповесцей і апавяданняў / І.М. Пташнікаў. – Мінск : Дзяржвыд. БССР, 1959. – 250 с.

О.В. Лапатинская, Е.С. Белякова (Витебск)

СПЕЦИФИКА ЖАНРОВ ЛИТЕРАТУРЫ ВИРТУАЛЬНОГО ПРОСТРАНСТВА

Современную литературу виртуального пространства можно определить как литературу авторских художественных моделей. Разнообразие стилей, взаимосвязь и возникновение новых жанров, а также более тесное и продуктивное взаимодействие автора с читателем свидетельствует о свободе и существующих перспективах ее развития. В связи с появлением все большего числа разновидностей публикуемых ежедневно произведений в

интернете возникает необходимость в более глубоком рассмотрении особенностей жанров литературы виртуального пространства.

Целью нашего исследования является определение жанровой специфики произведений, опубликованных в интернете, а также выявление особенностей синтетических жанров.

Объектом исследования является литературное творчество белорусских и российских писателей в сети Интернет.

В работе используются метод сравнительного и текстового анализа, а также метод классификации.

Важной чертой современного литературного пространства является размывание границ между различными видами и жанрами. Все более характерной становится способность произведений к стилевым обновлениям и изменениям, а также отсутствие традиционных начала и конца, в связи с чем первоначальная жанровая структура произведения расширяется, повествование перестает быть линейным, читатель воспринимает произведение ассоциативно. Данные особенности дают возможность говорить о гипертекстуальности в литературе виртуального пространства [1, с. 12].

Под гипертекстуальностью понимается способность литературного произведения к организации текста таким образом, при котором внутри произведения сосуществует несколько текстов: художественный несущий текст и художественный интертекст, причем эти связанные между собой тексты рассматриваются как единое целое [2, с. 78]. Гипертекст можно разделить на несколько основных блоков. Актуальный текст – основной текст, который автор хочет донести до читателя. Претексты – это тексты, без знания которых невозможно понимание актуального текста. На эти тексты идут ссылки из актуального текста. Читатель может обращаться к ним для получения дополнительных знаний или не обращаться, если уже владеет необходимой информацией для понимания актуального текста. Посттексты – это тексты, порождённые читателями после прочтения актуального текста и опубликованные в интернете [3, с. 117].

В литературе виртуального пространства часто используются такие термины, как «приквел», «спин-офф», «сиквел». В приквеле речь идет о событиях, предшествующих основному повествованию, в сиквеле описываются последующие события, а спин-офф уделяет внимание чему-либо, что не было центральным и имело меньшую значимость по сравнению с основной линией.

И сиквел, и приквел, и спин-офф чаще всего являются посттекстами, однако они могут быть претекстами или актуальными текстами по отношению друг к другу. Так, написанный приквел часто становится претекстом для сиквела, а пишущийся спин-офф является актуальным текстом, в то время как приквел и сиквел становятся для него претекстами.

Исходя из того, что произведения литературы виртуального пространства массовые и содержат набор повествовательных архетипов, мож-

но говорить о том, что для каждого из них существует свой претекст. Претекст редко вводится в произведение целиком и в «чистом виде», главным образом он вербализуется пересказом, цитированием, намёком или реминисценцией. Таким образом, мы можем говорить об интертекстуальности произведений литературы виртуального пространства. Интертекстуальность в литературных произведениях рассматривается не только как межтекстовое взаимодействие с присутствием в одном тексте элементов другого, но и как его трансформация в новом текстовом пространстве, а также отношения между претекстом и актуальным текстом [4, с. 168].

Говоря об отношениях между произведениями и их взаимосвязи, стоит обратить внимание на то, что претекстами для большинства произведений литературы виртуального пространства являются зачастую произведения других жанров, и, взаимодействуя между собой, они создают уникальные и характерные только для виртуальной литературы жанры.

Данные текстовые взаимодействия становятся возможными благодаря гипертекстуальности в литературе виртуального пространства, а также массовости произведений самиздата и типичности встречающихся в них мотивов. В связи с этим можно говорить о характерных для какой-либо страны или же всемирно известных первичных образах – архетипах. В произведениях литературы виртуального пространства встречаются так называемые повествовательные архетипы.

Дж. Кавелти разработал метод изучения произведений массовой культуры, опираясь на синтез изучения жанров и повествовательных архетипов. Литературную формулу Кавелти определяет как «структуру повествовательных или драматургических конвенций, использованных в очень большом числе произведений» [5, с. 64].

Архетипы не существуют сами по себе, они воплощены в конкретном повествовании с помощью героев, обстановки действия и ситуаций, позволяющих усваивать значения производящей их культуры. Посредством литературных формул специфические стереотипы и символы соединяются с более общими повествовательными архетипами. Классификацию архетипов, предложенную Н. Фраем, Кавелти взял за основу и, исходя из нее, охарактеризовал основные типы литературных формул: «приключение», «любовная история», «тайна», «мелодрама», «фантастическая история» («чуждые существа и состояния»). Литературные формулы Кавелти можно использовать в качестве основы жанрового деления литературы виртуального пространства:

1. В приключенческом произведении герой, выполняя этически важную миссию, преодолевает препятствия и опасности, возникающие обычно в результате козней злодея. В литературе виртуального пространства выделяется жанр «Приключения» (Adventure), сюжет которого запутанный, сложный, а любовная линия чаще всего отсутствует. Претекстами литературы самиздата являются произведения любых жанров, а актуаль-

ные же тексты содержат повествовательные архетипы данной литературной формулы. К данным произведениям часто пишутся приквелы и сиквелы, которые также придерживаются данной литературной формулы. Спин-оффы же, напротив, чаще содержат любовную историю или мелодраму. Яркими примерами подобных произведений можно считать «Пирамиды богов» Андреева Никиты, «Берелех» Михайловой Марины, «Дороги истины» Радевич Евгения.

2. Любовная история – «женский» эквивалент приключенческой истории. Многие формулы этого типа сосредоточиваются на преодолении любящими социальных или психологических барьеров. Жанр «Любовный роман» (Romance) в литературе виртуального пространства является наименее синтетичным, так как повествовательные архетипы, встречающиеся в нем, наиболее ярко выражены и характерны зачастую лишь для данной литературной формулы («Лунная школа» Полянской Катерины, «Шанс на счастье» Кудриной Виктории, «Люблю тебя» Адрианны). Написание приквелов, сиквелов или же спин-оффов почти не характерно, но если они пишутся, то претекстами являются те же произведения, что и для актуального текста, а литературная формула такая же, как у актуального текста.

3. История о тайне представляет собой раскрытие секретов, ведущее к какому-либо вознаграждению героя. За исключением классического детектива этот жанр обычно не выступает в чистом виде, а встречается как дополнение к другим формулам, что говорит нам о синтетичности данного жанра и использовании различных претекстов для его создания. Примерами являются «Трибунал» Чирковой Веры, «Маренго» автора Aretta, «Железное алиби» Щемелинина Дениса.

4. Мелодраматические формулы описывают мир, полный насилия, но управляемый моральным принципом воздаяния. Главная характеристика мелодрамы – стремление показать осмысленность и справедливость мирового порядка демонстрации присущих аудитории образцов правильного и неправильного поведения. С данной литературной формулой в фанфикшене выделяется синтетический жанр Hirt / Comfort («Жизнь после» Травалатора, «На лезвии» Lady Irene), который содержит присущие ей повествовательные архетипы, однако каноном для данных произведений могут являться произведения различных жанров, и, взаимодействуя с претекстом, актуальный текст становится своеобразным вариантом данной литературной формулы. Приквелы, спин-оффы и сиквелы подобных произведений также синтетичны с точки зрения жанра.

5. Широко распространены также произведения о чуждых существах или «фантастические истории». Триллер, оккультизм, мистика, хоррор, фантастика, фэнтези и киберпанк являются основными жанрами данной литературной формулы. Такие жанры часто синтетичны, так как редко содержат только один мотив в литературе виртуального пространства. Претекстами данной литературной формулы также являются произведения

различных жанров, что благодаря интертекстуальности определяет присутствие в тексте черт, характерных для разных жанров. Примерами являются «Игра» Бобкова Владислава, «Единство» Аквателлы.

Таким образом, можно сделать вывод о том, что произведения литературы виртуального пространства массовы, в них использовано большое количество повествовательных архетипов. В своих произведениях авторы используют различные приемы и творческие установки, комбинируя их и создавая произведения с чертами различных жанров. Синтетические жанры в литературе виртуального пространства возможны благодаря гипертекстуальности и интертекстуальному характеру литературы подобного вида.

Литература

1. Landow, G. P. Hypertext. The Convergence of Contemporary Critical Theory and Technology [Электрон. ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://www.cyberartsweb.org/cpace/ ht/jhup/decenter.html. – Дата доступа: 19.10.2015.

2. Давыдова, К.В Гипертекстуальность как свойство художественного текста: На материале английских художественных текстов [Электрон. ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://www.dissercat.com/content/gipertekstualnost-kak-svoistvo-khudozhestvennogo-teksta-na-materiale-angliiskikh-khudozhestv#ixzz3pcLJbFmh. – Дата доступа: 20.10.2015.

3. Караулов, Ю.Н. Роль прецедентных текстов в структуре и функционировании языковой личности / Ю.Н. Караулов. – М., 1986. – 217 с.

4. Баширова, Н.З. Интертексты в современных английских газетных статьях (на материале произведений В. Шекспира) [Электрон. ресурс]. – 2015. – Режим доступа: http://www.zpu-journal.ru/zpu/2008_4/Bashirova.pdf. – Дата доступа: 18.10.2015.

5. Кавелти, Дж.Г. Изучение литературных формул (Cawelti J.G. Adventure, mystery and romance: Formula stories as art and popular culture/ Дж.Г. Кавелти. – Chicago, 1976. – 236 с.

М.С. Лаппо (Мінск)

УВАСАБЛЕННЕ ЎЯЎЛЕННЯЎ У. КАРАТКЕВІЧА ПРА БЕЛАРУСКІ НАЦЫЯНАЛЬНЫ ХАРАКТАР У ВОБРАЗАХ ГАЛОЎНЫХ ГЕРОЯЎ ПРОЗЫ ПІСЬМЕННІКА

Пра У. Караткевіча звычайна кажуць, што ён з'яўляецца «разбуральнікам» традыцыйных уяўленняў пра беларускі нацыянальны характар. Напрыклад, даследчыца К. Півавар адзначае: *«на нашу думку, Караткевіч стварыў канцэптуальна новае разуменне характару і сутнасці беларускага народа»* [10, с. 200]. Героі твораў пісьменніка – насамрэч «моцныя» персанажы, якія, дзейсныя і свядомыя, апынуліся *псіхалагічна супрацьлеглымі* тыпамі для беларусаў «нашаніўскага» дыскурсу – прыгнечаных, бездапаможных і «згубленых» ў свеце (*«Наш народ спявучы, таленавіты, горды»* [5, с. 323], «*Гляджу вакол – Божа мой, такі край, такія сэрцы ў простых людзей, такія песні, такая рыцарская мяккасць і чысціня і смеласць. Народ горды, таленавіты, страсны…»* [7, с. 634]).

У навукова-папулярным нарысе У. Караткевіча «Зямля пад белымі крыламі» апісанню характару беларусаў адведзены асобны раздзел, у якім пісьменнік выказвае думку, што меркаванне пра беларуса як пра «няшчасненькага», якое склалася ў 30-я гг. XIX ст. (напрыклад, верш М. Някрасава «Железная дорога»), ператварылася ў неабгрунтаваны грамадскі стэрэатып. У якасці доказу У. Караткевіч прыводзіць словы публіцыста Грузінскага: *«Ходячие представления о типе белорусского крестьянина рисуют его неказистым… тщедушным и придавленным тяжелой жизнью в болотистом бедном краю. Мои личные впечатления были не таковы. Я увидел белоруса крепкого телосложения, хотя и худощавым… но главное, я не заметил и следа угнетенности, забитости»* [цыт. па 4, с. 448]. Тэзіс «рахманасці» беларуса, адзначанай у «Полном географическом описании нашего отечества» (Санкт-Пецярбург, 1905 г.), У. Караткевіч таксама аспрэчвае, спасылаючыся на факты з гісторыі Вялікай Айчыннай вайны: *«“інертны” і “бязвольны” мясцовы чалавек пусціў пад адхон 11 128 саставаў з надпісам «Deutsche Reichsbahn». Так што рахманасць беларуса таксама да пары да часу. Пяройдзеш мяжу – і тваім ворагам будзе страшны чалавек»* [4, с. 452].

У нарысе У. Караткевіча сярод тыповых рысаў беларуса называюцца *свабодалюбства*, *утрапёная* любоў да працы, *кроўная* любоў да зямлі. Маркеры-эпітэты, што суправаджаюць характарыстыкі беларуса, ужо надаюць пэўную экспрэсію дачыненням беларуса з акаляючай яго рэчаіснасцю.

Паспрабуем параўнаць названыя рысы з тымі, што фіксуюцца сённяшнімі беларускімі сацыёлагамі. Працалюбства і любоў да зямлі сапраўды адзначаюцца большасцю даследчыкаў як тыповыя беларускія рысы характару. Свабодалюбства часцей за ўсё называецца сярод рыс, уласцівых беларусам у найменшай ступені. Так, напрыклад, у даследаванні В. Кірэенкі ў ліку найбольш нетыповых пералічваюцца імкненне да асабістай свабоды, індывідуалізм, прадпрымальнасць (вынаходлівасць), жаданне канкурыраваць, імкненне да хуткіх і радыкальных змяненняў [9, с. 155].

Аднак не ўсё так адназначна. Напрыклад, вынікі, атрыманыя Г. Гатальскай і Н. Ткач пры даследаванні этнічных аўтастэрэатыпаў у спалучэнні з гетэрастэрэатыпамі, фіксуюць даволі цікавую тэндэнцыю: па меркаванні саміх беларусаў, у рускіх, украінцаў і італьянцаў свабодалюбства выяўляецца ярчэй, аднак у параўнанні з палякамі і літоўцамі свабодалюбства ў беларускага народа выражана мацней [3, с. 34].

Натуральна, што, акцэнтуючы ўвагу на свабодалюбстве беларусаў, У. Караткевіч фактычна стварaў контрдыскурс у дачыненні да нашаніўскага дыскурсу, бо апошні, выканаўшы сваю гістарычную функцыю, ператварыўся ў «мёртвую форму», якая пачала рабіцца перашкодай для далейшага развіцця нацыянальнай супольнасці.

Дарэчы, свабодалюбівы беларускі герой разбураў не толькі этнічны аўтастэрэатып, але і гетэрастэрэатып таксама: нарыс «Зямля пад белымі крыламі» першапачаткова адрасаваўся ўкраінскім старшакласнікам і быў выдадзены ў Кіеве, а ўжо пазней – у Беларусі.

Па тым «наборы» рысаў характару беларуса, які У. Караткевіч прадставіў ў гэтым нарысе, досыць лёгка пазнаюцца галоўныя героі караткевічаўскіх твораў.

Адзін з тыпаў галоўнага героя – так званы герой-інтэлігент, які, у адрозненне ад ранейшых герояў-інтэлігентаў, ужо не «разрываецца паміж горадам і вёскай» (як герой Л. Калюгі з аповесці «Ні госць ні гаспадар») і не «пакутуе на раздвоенасць душы» (як герой аповесці М. Гарэцкага «Дзве душы»), а свядома і прафесійна займаецца сваёй справай.

Прадстаўнікамі нацыянальнай інтэлігенцыі ў творчасці У. Караткевіча выступаюць А. Беларэцкі, А. Косміч, А. Загорскі і іншыя персанажы, усе яны часткова – прататыпы самога аўтара. Інтэлігентнасць гэтых асобаў абавязкова пацвярджаецца аўтарам у творы згадкай аб славутых сваяках героя, што спрацоўвае на канцэпцыю «пераадолення сялянскасці». Тыпы названых герояў добра апісаныя даследчыкам П. Банцэвічам: *«…Мастак адкрыў чытачам духоўны свет маладога беларускага інтэлігента XX стагоддзя, падкрэсліў перавагу арыстакратызму над плябейскасцю, паказаў людзей з дваранскімі радаводамі…»* [1, с. 223].

Для другога тыпа караткевічаўскіх галоўных герояў, якіх даследчыца А. Барысеева адносіць да пікара [2], важную ролю адыгрываюць вынаходлівасць, пачуццё гумару, спалучэнне бытавой «заземленасці» з «узвышанасцю» духа (Г. Выліваха, Ю. Братчык).

Вядома, што распрацоўцы названых персанажаў У. Караткевіч аддаў шмат часу. Пра тое, што пісьменнік хацеў прадставіць у беларускай літаратуры адметнага героя, які б найбольш поўна раскрываў сутнасць характару беларуса, сведчылі мастацкія задумкі і разважанні У. Караткевіча. У лістах да М. Танка ён пісаў: *«Ну вось, скажам, французы маюць свой літаратурны тып, які з найбольшай паўнатой змалёўвае ўсю нацыю, немцы і іспанцы – таксама … А вось у нас гэтага няма. Назавіце мне тып, які ўсебакова адбіваў бы рысы лепшага нашага чалавека, яго талент, яго характар, яго барацьбу, які, так бы мовіць, нават часткова адбіваў бы гісторыю народа. Яго няма, але ён павінен з'явіцца…»* [7, с. 602].

У караткевічаўскіх «пікара» шмат заземленага, побытавага, яны – прыўкрасныя ў сваёй «неідэальнасці», вялікія аматары радасцяў жыцця. Г. Выліваха на пачатку «Ладдзі Роспачы» падаецца як *«хобаль, залётнік, піяка, задзіра, біток, бабздыр несамавіты»* [6, с. 160]. Дарэчы, сярод пералічаных рысаў ёсць як тыя, што даследчыкі фіксуюць у якасці тыповых негатыўных рысаў беларусаў (схільнасць да п'янства), так і тыя, што лічацца ўласцівымі беларусам у найменшай ступені (задзірыстасць). Характар Ю. Братчыка ў параўнанні з характарам Г. Вылівахі больш склада-

ны, паколькі зазнае эвалюцыю: з махляра (*«Не магло быць сумнення – гэты запылены прайдзісвет, гэтая шэльма, што гандлюе ўласным круцельствам, нібыта рабіў яго, кардынала, дабрэйшым»* [8, с. 90]) герой паступова ператвараецца ў сапраўднага «мужыцкага Хрыста» (*«Я галадаў ixнім голадам, і прагнуў, і мёрз, і памыляўся, і грашыў, і свят быў»* [8, с. 376]).

Абодва тыпы галоўных герояў У. Караткевіча (і «пікара», і герой-інтэлігент) – сваболюбівыя беларусы, якія «разрываюць шаблон» пакорнасці і рахманасці. Гэта яскрава пацвярджае дзейнасць персанажаў: А. Загорскі ўдзельнічае ў падрыхтоўцы паўстання 1863 г., становіцца паплечнікам і лепшым сябрам К. Каліноўскага – чалавека, мяркуючы па гістарычных звестках, «антырахманага»; Ю. Братчык узначальвае сярэднявечны «паўстанцкі» атрад, робіцца легендай для свайго народа; Г. Выліваха «падбухторвае» душы нябожчыкаў-беларусаў супраць самой Смерці.

Ва ўсіх творах перад чытачом – індывідуальнасць, герой-завадатар, які вядзе за сабой людзей, мае выразную канцэпцыю дзеянняў. Ягоныя вызначальныя рысы побач з сумленнасцю, адказнасцю, дабрынёй – бясстрашнасць і тое імкненне да свабоды, калі чалавек пераўзыходзіць патрэбы ўласнага «я», замкнёнасці на сваім унутраным свеце і пачынае мысліць маштабнымі катэгорыямі, у рэшце рэшт, калі ён фактычна адкрыта змагаецца за палітычную ўладу. Праўда, у творах У. Караткевіча гэтае змаганне за ўладу заўсёды пададзенае як рэакцыйнае – як адказ на ўціск, прыгнёт і несправядлівасць з боку пануючых колаў.

Шмат у чым «навізна» і «нетыповасць» беларускіх характараў у творах У. Караткевіча была абумоўлена той акалічнасцю, што ў сваёй творчасці пісьменнік не займаўся адлюстраваннем беларускага савецкага псіхатыпу, які аб'ектыўна існаваў на той час, а, паслядоўна канструюючы беларускі нацыянальны міф у межах рамантызму, звярнуўся да гістарычных падзей і распрацоўкі нацыянальнага літаратурнага героя, які, як ужо было адзначана, мусіў увасабляць найлепшыя рысы беларуса і працягваць сусветную літаратурную традыцыю.

Літаратура

1. Банцэвіч, П. К. Культурныя прыярытэты беларускай інтэлігенцыі ў кантэксце творчасці У. Караткевіча / П.К. Банцэвіч // Рэспубліканскія Купалаўскія чытанні: зб. навук. арт. / ГрДУ імя Я.Купалы; рэдкал.: У.І. Каяла (адк.рэд.) [і інш.]. – Гродна: ГрДУ, 2009. – 387 с.

2. Барысеева, А.А. Традыцыі пікарэскага рамана ў творчасці Рамэна Гары і Уладзіміра Караткевіча // Славянскія літаратуры ў кантэксце сусветнай : матэрыялы IX Міжнар. навук. канф., прысвеч. 70-годдзю філал. фак. БДУ, Мінск, 15–17 кастр. 2009 г. У 2 ч. Ч. 2 / пад рэд. праф. В.П. Рагойшы; рэдкал.: В.П. Рагойша [і інш]. – Мінск : Выд. цэнтр БДУ, 2010. – С. 226 – 230.

3. Гатальская, Г.В., Ткач, Н.М. Психологические особенности национального характера белорусов / Г.В. Гатальская, Н.М. Ткач // Псіхалогія. –№ 1 (58). – 2010. – С. 30 – 35.

4. Караткевіч, У. Зямля пад белымі крыламі / У. Караткевіч // Збор твораў: У 8 т. Т. 8, кн. 1. П'есы. Нарыс. – Мінск : Маст. літ., 1990. – С. 385–570.

5. Караткевіч, У. Каласы пад сярпом тваім / У. Караткевіч // Збор твораў. У 8 т. Т. 4. Кн. 1. – Мінск : Маст. літ., 1989. – 399 с.

6. Караткевіч, У. Ладдзя роспачы / У. Караткевіч // Збор твораў. У 25 т. Т. 5. Легенды. Навела. Паэма. Аповесць : 1960 – 1972 / Уладзімір Караткевіч ; падрыхт. тэкстаў і камент. Пятра Жаўняровіча і Анатоля Вераб'я ; рэд. тома Віктар Іўчанкаў. – Мінск : Маст. літ., 2013. – 541 с.

7. Караткевіч, У. Лісты / У. Караткевіч // У. Караткевіч. Выбраныя творы: уклад., прадм., камент. А. Вераб'я. – Мінск : Бел. кнігазбор, 2005. – С. 587–648.

8. Караткевіч, У. Хрыстос прызямліўся ў Гародні / У. Караткевіч // Збор твораў: У 8 т. Т. 6. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 494 с.

9. Кириенко, В.В. Белорусская ментальность: истоки, современность, перспективы / В.В. Кириенко. – Гомель : ГГТУ им. П.О. Сухого, 2009. – 319 с.

10. Півавар, К. С. Вербалізацыя канцэпту «беларускі народ» у творчасці У. Караткевіча / К.С. Півавар // Славянские народы и их культуры: традиции и современность: сб. науч. статей / редкол.: В.И. Коваль (отв. ред.) [и др.]; М-во образования РБ, Гомельский гос. ун-т им. Ф. Скорины. – Гомель: ГГУ им.Ф. Скорины, 2013. – 310 с.

Д.М. Лебядзевіч (Гродна)

ФАРСІМОЎНАЯ ПЕРСІДСКАЯ ПАЭЗІЯ (ДА ПЫТАННЯ МЕТРЫЧНЫХ І ЖАНРАВЫХ ФОРМ)

У гісторыі сусветнай літаратуры і культуры класічнай персідскай паэзіі належыць асаблівае, а ў многім, і вызначальвае месца. Персідская мова на працягу шасці стагоддзяў дала сярэднявечнаму свету высокія ўзоры фарсімоўнай паэзіі, якая прэзентавала сусветнай цывілізацыі яркую, шматгранную і самавітую літаратуру, зорка якой, прабіўшы цемру стагоддзяў, свеціць нам ва ўсім сваім шматкаляровым бляску і сёння.

Персідская фарсімоўная паэзія складае аснову іранскага Рэнесансу, які ўзнік у Іране і ў Сярэдняй Азіі ў 10–15 стст. Мова «фарсі» (персідская) з'яўляецца наватарскай моваю. Літаратура на гэтай мове ўзнікла ў 9 ст., пасля таго як у Іране і ў Сярэдняй Азіі ў выніку панавання Арабскага халіфата з'явілася новая рэлігія – іслам. Нягледзячы на тое, што ўся іранская культура была прасякнута ідэямі новай рэлігіі, у класічнай іранскай паэзіі 10–15 стст. адбывалася своеасаблівае адраджэнне старажытнай даісламскай традыцыі, узнікаў цудоўнейшы сінтэз старых і новых ідэй, матываў і вобразаў. Культурнай спадчынай для класікаў на фарсі была іранская антычная традыцыя – вусная народна-паэтычная творчасць, што бярэ пачатак з "бібліі" іранскіх народаў Авесты. Гуманістычная ідэя падымаецца ў класічнай іранскай паэзіі на новую ступень, знаходзіць новыя формы ў паэтычным слове, бо тое, што ў антычнай традыцыі праявілася толькі ў "зародку, прыняло ў класічнай паэзіі разгорнутую форму. Зародкі жанравых форм зліліся ў асноўныя жанры паэзіі з іх

разнавіднасцямі, захаваўшы разам з тым, у перапрацаваным выглядзе многія элементы антычнай традыцыі" [1, с. 132].

Персідская літаратура пастаянна звярталася да фальклорных і прамоўніцкіх жанраў, дзе чэрпала ідэі, сюжэты, вобразы, жанры і прыёмы. Менавіта фальклорныя творы, сцвярджае В.Б. Нікіціна, "служылі базай для афармлення і развіцця ўласна-мастацкай славеснай творчасці ў пісьмовай паэзіі і прозе, прамоўніцкае майстэрства – для развіцця літаратуры светапогляднага сінкрэтызму" [2, с. 9], што асабліва выявілася ў жанры класічнай дыдактычнай паэмы, дзе арганічна спалучыліся літаратурна-мастацкія і навуковыя, філасофскія і сацыяльна-палітычныя, эстэтычныя і рэлігійныя элементы.

Новая персідская літаратура, абапіраючыся на свае даісламскія мастацкія традыцыі, у той жа час ўвабрала ў сябе шмат чаго і ад літаратуры арабскай. Запазычваецца арабская сістэма жанраў і паэтыка, арабская лексіка, выкарыстоўваецца арабская графічная сістэма пісьма, арабскі алфавіт. Аднак, нягледзячы на гэта, паэтыка фарсімоўнай літаратуры становіцца кананізаванай, асабліва ў распрацоўцы тэарэтычных асноў верша, таму, як адзначае вядомы рускі арыенталіст XX стагоддзя І.С. Брагінскі, "склалася строгая паэтычная сістэма па трох раздзелах: аруз – метрыка, кафія – рыфма, бадзі – паэтычныя тропы і фігуры" [1, с. 133].

Асаблівага развіцця дасягнула эстэтыка гераічнага маснаві тыпу "Шах-намэ" і эстэтыка такіх малых форм, як рубаі, бейт, фард (аднарадкоўе), прытча, афарызм, разгорнутая загадка (лугз), тэнцона (муназара).

Паступова мова фарсі выходзіць за межы іранскіх народаў. Ужо ў канцы 10 ст. на ёй пішуць цюркі ў Сярэдняй Азіі, у 11 ст. ёю карыстаюцца ў Азербайджане, у 13 ст. на гэтай мове з'яўляецца паэзія ў Індыі, у 13–14 стст. фарсі пранікае ў Малую Азію (Турцыю). Мова фарсі з'яўляецца мовай навукі і мастацкай літаратуры ў курдаў, узбекаў, туркменаў.

І так, у 13–14 стст. ва ўсім мусульманскім Усходзе ўзнікае вялікі асяродак фарсімоўнай літаратуры, з якой ў 14–15 стст. выдзяляюцца самастойныя цюркамоўныя літаратуры: узбекская, азербайджанская, турэцкая і інш. А ў 16 ст. у выніку палітычнага і рэлігійнага разладу паміж Іранам і Бухарскім ханствам адбыўся падзел на самастойнае існаванне іранцаў і таджыкаў. У фарсімоўнай літаратуры адбываецца дыферэнцыяцыя. Яна дзеліцца на літаратуру таджыкскую (Сярэдняя Азія), персідскую (Іран), затым літаратуру паўночнай Індыі і пазней афганскую (на мове кабулі, роднаснай фарсі). Але першапачаткова (з 9 па 15 стст.) літаратура на фарсі была агульнай для ўсіх гэтых краін. Гэтыя два адгалінаванні іранцаў адыгралі вялікую ролю ў стварэнні фарсімоўнай паэзіі 9–15 стст., якая атрымала назву класічнай і зрабіла вялікі ўклад у сусветную літаратуру.

Яшчэ Гётэ сказаў аб іранскіх народах: «Яны назвалі вялікімі пяць паэтаў, тады калі сярод іншых, забракаваных імі, многія будуць лепшымі

за мяне» [3, с. 6]. Вось гэтыя пяць паэтаў фарсімоўнага Усходу – Рудакі, Фірдаусі, Нізамі, Саадзі, Хафіз, у творчасці якіх у класічнай форме і адлюстраваліся ўсе лепшыя дасягненні таджыкска-персідскай літаратуры. А побач з імі цэлае сузор'е іншых, не менш цудоўных і значных аўтараў: Ібн-Сіна, Гургані, Амар Хаям, Румі, Дэхлеві, Хагані, Джамі, Бабур, Фізулі і інш.

Асноўныя жанры персідскай класічнай паэзіі сфарміраваліся ў творчасці яе родапачынальніка Рудакі, у паэтычнай спадчыне якога мы знойдзем рубаі, урачыстую касыду, дыдактычнае маснаві, жанр кыт'а і газелі. Па сутнасці, "Адам паэтаў" фарсімоўнага Усходу акрэсліў для будучых вершатворцаў вядучыя праблемна-тэматычныя матывы: панегірычную прыдворную лірыку, анакрэантычную паэзію і філасофскую лірыку.

Паэзія на фарсі вызначаецца дзвюма рысамі: метрам, які заснаваны на колькасці і даўжыні складоў, і рыфмай. З арабамоўнай літаратуры Халіфата была запазычана сістэма верша «аруз» – квантытатыўнае метрычнае вершаскладанне, якое заснавана на чаргаванні доўгіх і кароткіх складоў. Адзінка верша – бейт (двуверш, вершаванае двухрадкоўе), што распадаецца на два паўвершы з аднолькавай колькасцю складоў ад 10 да 14 у кожным. Звычайна яны звязаны адной думкай, а іншы раз нават і фармальна (прыёмам паралелізма, сіметрыяй вобразаў і г.д.). Рыфмуюцца канцы кожнага двуверша. Часам яны могуць групавацца ў пары, тады рыфма звязвае не двувершы, а паўвершы, але пры гэтым двуверш мае іншую форму. Эпічная паэзія мае персідскае паходжанне, а лірычная – узыходзіць да арабскай традыцыі. Сістэма жанраў строга рэгламентавана і вызначана: у кожнага жанра — свой змест і свая форма.

Арабская літаратурная традыцыя аказала прыкметны ўплыў на такія лірычныя жанры фарсімоўнай паэзіі, як касыда, газель і кыт'а.

Касыда – гэта «мэтавы» верш панегірычнага, элегічнага, сатырычнага, рэлігійнага зместу (часцей за ўсё – урачыстая ода ў гонар манарха, дзяржаўнага дзеяча); налічвае не менш 15 бейтаў. Для касыды характэрна адпаведная кампазіцыйная структура: уступ – насіб (звычайна не звязаны з асноўным зместам: тут даецца апісанне прыроды, ці асабістых перажыванняў паэта, могуць быць і любоўна-анакрэантычныя матывы), затым ідзе галоўная частка (праслаўленне асобы, якой прысвечана касыда) і ў заключнай частцы – праслаўленне алаха. Схема рыфмоўкі – манарым (верш з адной скразной рыфмай) аа (у першым бейце) ва, са і г.д.

Газель – асноўная форма персідскай лірыкі, часцей любоўнага зместу (з гімнам віну, каханню, радасцям жыцця), парой містычнага і геданістычна-анакрэантычнага характару; схема рыфмоўкі такая ж, што і ў касыдзе: аа, ва, са. Многія даследчыкі сцвярджаюць, што газель узнікла з "насіба касыды" [4, с. 109]. Газель – любімы жанр Рудакі, Фірдаусі, Саадзі, Хафіза і многіх іншых паэтаў персідскай літаратуры. Прыкладна з 12 ста-

годдзя паэты Персіі ўключалі ў мастацкую тканіну газелі свой тахалус (псеўданім аўтара), які звычайна змяшчалі напрыканцы твора:

Хвала поэзии Хафиза, она – познанье божества.

За светлый дух, за прелесть речи везде его благодарят! [5, с. 358].

Кыт'а – урывак, фрагмент маральна-філасофскага характару з павучальным зместам; найменш рэгламентаваны па сваім змесце; схема рыфмоўкі, што і ў касыдзе, але без сумежнай рыфмы ў першым бейце: ва, са, da і г.д. Персідская кыт'а – камерны жанр, які паэты выкарыстоўвалі ў самым разнастайных мэтах і сітуацыях. Так, у форме кыт'а можна было скласці прашэнне, напісаць заяву, прызначыць спатканне, прызнацца ў каханні, папрасіць прабачэння, прамовіць застольны тост. Характэрным у гэтым сэнсе прыклад майстэрскай версіфікацыі кыт'а ў творчасці Джамі:

Я не сравню с небесною луной

Лицо земной луны – моей любимой,

Гляжу я на лицо луны земной,

Оно милей небесной несравнимо [5, с. 427].

Разам з тым, на ранніх этапах развіцця персідскай фарсімоўнай паэзіі з'явіліся і свае самастойныя формы. Гэта маснаві і рубаі. Маснаві — паэма, «чарада двувершаў» з парнай рыфмай (аа, вв, сс і г.д.); гэта іранская форма для вялікага твора дыдактычнага ці эпічнага зместу; асноўны памер – мутакарыб (старажытны вершаваны памер іранскага эпасу, у кожным паўвершы – 10–12 складоў); разнавіднасць маснаві: філасофска-дыдактычная паэма, любоўна-рамантычная паэма, гераічная паэма.

Жанр маснаві ў персідскай паэзіі багаты на такія яркія і самабытныя творчыя індывідуальнасці, як Фірдаусі, Нізамі, Гургані, Румі, Саадзі і інш. Так, "Шах-намэ" Фірдаусі – гэта адна з самых вялікіх паэм у сусветнай літаратуры. Паэма налічвае каля 60 тысяч бейтаў і па сваім аб'ёме ў некалькі разоў перавышае "Іліяду" і "Адысею" Гамера, узятых разам. У "Шах-намэ" адлюстравалася ўся эпапея чалавецтва, якая канкрэтызавана праз гісторыю Ірана, пачынаючы ад першых міфічных цароў і да канца эпохі Сасанідаў (7 ст.). Гераічныя і рамантычныя сюжэты "Шах-намэ" пазней сталі распрацоўвацца ў жанры маснаві.

Рубаі – чатырохрадкоўе, паэтычны афарызм – сентэнцыя філасофскага ці любоўнага зместу; жанр старажытны, чыста іранскі, даісламскі, вытокі ідуць з фальклору; схема рыфмоўкі: а а в а радзей – а а а а. Ва ўсім свеце праслаўлены вучоны і паэт Амар Хаям, які свае вершы пісаў толькі ў форме рубаі:

А мэта усяго тварэння – мы,

Вачэй спазнання азарэнне – мы,

Круг свету гэтага, нібы пярсцёнак,

Дзе лепшы камень без сумнення – мы [6, с. 15].

Драматычныя жанры ў фарсімоўнай літаратуры адсутнічаюць. Проза ў параўнанні з паэзіяй была развіта вельмі слаба, і прадстаўлена яна

гераічнымі і рыцарскімі раманамі, казкамі, анекдотамі, біяграфіямі, мемуарамі, перапіскай, творамі павучальнага характару.

Прыкметную ролю ў жанравым узбагачэнні персідскай паэзіі адыгралі такія традыцыйныя кананічныя вобразы, метафары і сімвалы, як Рустам, Фархад, Лейлі, Меджнун, Шырын, Іскандэр, Бустан, Гулістан, Ахрыман, Чаша Джамшыда, а таксама некаторыя эпізоды і вобразы з Карана. Звернем увагу на самыя істотныя. Так, Рустам – легендарны асілак, герой эпічных паданняў старажытных іранцаў, галоўны герой паэмы Фірдаусі "Шах-намэ" – сімвал мужнасці і мудрасці. Лейлі і Меджнун – героі ўсходняй легенды, каханне якіх скончылася трагічнай гібеллю абодвух. Героі сталі сімвалам закаханых. У літаратуры Старажытнага Усходу створаны цэлы шэраг паэм, прысвечаных Лейлі і Меджнуну. Вобраз хворага любоўю пакутніка (Меджнуна) стане традыцыйным у класічнай рамантычнай паэме ўсходняга Рэнесансу ў Нізамі, Руставелі, Джамі, Наваі, Фізулі і іншых паэтаў. Пад імем Іскандэра ў народную эпічную традыцыю Старажытнага Усходу ўвайшоў Аляксандр Македонскі. У іранскай традыцыі Іскандэр паказваўся то як узурпатар, які нішчыць свяшчэнную Авесту, то як нашчадак прэстола шаха, ідэальны цар. Іскандэру былі прысвечаны такія славутыя творы, як «Шах-намэ» Фірдаусі, «Іскандэр-намэ» Нізамі, «Вал Іскандэра» Наваі. Так, у адной з частак паэмы Фірдаусі «Шах-намэ» апісваюцца падзеі паўлегендарнага, паўгістарычнага характару, дзе паказваецца цараванне Дараба (персідскага цара Дарыя) і Іскандэра, які прыходзіць у Іран. Апавядаецца пра яго паходы ў Індыю, дзе ён сустракаецца з брахманамі, будуе вал для аховы краіны ад чужаземных ворагаў.

У асноўным у творах літаратуры Сярэднявечча і Старажытнага Усходу Іскандэр выступае ў ролі храбрага і добрага віцязя, у якога толькі моцны і непераможны праціўнік – ранняя і няўмольная смерць:

Взяли прах; на весы горсткой малой он пал.
Этот вес с весом камня нежданно совпал.
Мир лишь прах. Царь смущен был столь явным примером.
Станет прахом и то, что звалось Искандером [7, с. 706].

Гэтыя радкі Нізамі перадаюць трагічную тэму паданняў пра Аляксандра Вялікага ў сярэднявечнай літаратуры Старажытнага Усходу. Бустан – пладовы сад. Гулістан – сад ружаў, кветнік, ружоўнік. Гэта сімвал росквіту дзяржавы. "Бустан" і "Гулістан" – назва аднайменных зборнікаў паэта Саадзі. "Бустан" – дыдактычная паэма ў вершах, якая насычана маральна-філасофскімі сентэнцыямі на адпаведную тэму. "Гулістан" – зборнік прытчаў-апавяданняў, напісаных у вершах і прозе.

Паэма (маснаві) ці цыкл паэм звычайна складалі адну рукапісную кнігу – "намэ". Эпічныя паэмы, а дакладней – цыкл з пяці паэм, аб'ядноўваліся ў "Хамсэ" ("Пецярыцу"). Так, вяршыняй паэзіі на Усходзе лічыцца "Хамсэ" Нізамі з пяці паэм: "Скарбонка тайн", "Хасроў і Шырын", "Лейлі і Меджнун", "Сем прыгажунь", "Іскандэр-намэ" – своеасаблівы

эпічны цыкл, які вызначаецца кампазіцыйнай стройнасцю, ідэйна-мастацкім адзінствам, складанымі і глыбокімі філасофскімі праблемамі гуманістычнага і агульначалавечага зместу. Зборнік лірычных твораў аднаго аўтара называлі “дзіван”, вершы ў якім размяшчаліся па жанрах у адпаведнай паслядоўнасці (касыды, газелі, рубаі, кыт’а, бейты). “Тазкіра” была паэтычнай анталогіяй, зборнікам лірыкі розных аўтараў з дадаткам кароткіх біяграфічных звестак пра кожнага паэта. Зачастую гэтыя біяграфіі насілі легендарны характар, але яны з’яўляюцца асноўнымі біяграфічнымі і літаратурнымі крыніцамі пра паэтаў Старажытнага Усходу да нашага часу. Крыху пазней з’явіліся зборы твораў аднаго аўтара – “куліет”, якія змяшчалі як лірычныя, так і эпічныя яго творы. Пасля з’яўлення “Хамсэ” Нізамі шырокую папулярнасць у класічнай персідскай паэзіі набыў прыём “паэтычнага адказу” (“назірэ”) як на ўвесь твор “Пецярыцы”, так і на асобныя яго часткі. Гэтыя “адказы” складаліся з паэм, у якіх захоўваліся амаль усе асноўныя персанажы і сюжэтныя лініі з твораў папярэднікаў.

Вялікая ўвага ў фарсімоўнай паэзіі надавалася ўнутранай паэтычнай форме, удасканаленню мастацкай апрацоўкі верша, таму ў таджыкска-персідскай паэзіі кожны паэтычны твор павінен быў мець выразную сэнсавую і мастацкую дамінанту, названую «нукта». Глыбокая, змястоўная «нукта» абавязкова патрабавала выкарыстання старажытнаўсходніх фігур-тропаў. Усе тропы былі падначалены ідэі, думкам паэта. Пачуццё тут заўсёды знаходзіцца пад кантролем розуму. Паэтычны твор звычайна патрабаваў «расшыфроўкі», тлумачэння, разгадкі, каб зразумець яго глыбінны і ўнутраны сэнс.

Старажытнаўсходні паэт выказваў свае думкі інакш, чым паэт заходнееўрапейскі. Менавіта пагэтаму для стылю ўсходніх паэтаў характэрны арнаменталізм і празмерныя стылістычныя ўпрыгожванні, выкарыстанне і насаджэнне паралелізмаў і гіпербал, антытэз і разгорнутых параўнанняў, традыцыйных метафарычных вобразаў-сімвалаў, складаных эпітэтаў. Так, своеасаблівую ролю сімвалаў іграліптушкі. Кожны, хто знаёмы з персідскай паэзіяй, ведае пра салаўя, які нудзіцца аб ружы. На мове сімвалаў гэта душа, якая тужыць аб вечнай прыгажосці; салавей безупынна ўхваляе ружу, жаліцца на пакуты, пераносіць боль ад калючак. Сокал альбо белы ястраб стаў любімым сімвалам паэта Румі. Ён часта гаворыць пра душу як пра сокала, які ў выгнанні сярод варон. Голуб пастаянна шукае дарогу да сваёй каханай. Бусел увесь час набожна сведчыць: «Тваё гэта царства, Твой парадак, Табе хвала». Качка сімвалізуе чалавечае існаванне, якое напалову прывязана да зямлі, а напалову жыве ў акіяне Бога. Варона як сімвал матэрыяльнага свету, заўсёды асацыіруецца з непрыглядным зімовым ландшафтам зямной юдолі. Папугай выкарыстоўваўся як сімвал вучня.

Кветкі для паэтаў таксама былі моваю сімвалаў. Агульнапрыняты сімвал кахання, кветка пакут і шчасця — гэта ружа. Лілея ўхваляе Бога на

дзесяці мовах. Адначасова гэта сімвал пакорлівага рэлігійнага чалавека. Чырвоныя цюльпаны, магчыма, выраслі з сэрца закаханых.

З жывёл найбольш часта сустракаюцца ў творах вярблюд і слон. Вярблюд – сімвал набожнага чалавека, які цярпліва выконвае загады свайго гаспадара. Слон асацыіруецца з Індыяй. Ён звычайна трапляе ў палон у чужую краіну. І толькі ў сне бачыць сваю радзіму, але разарваўшы путы трапляе дадому. Да гэтага вобраза-сімвала звярталіся Хагані, Нізамі, Румі.

Персідскі паэт абавязаны быў прачытаць некалькі тысяч арабскіх і фарсімоўных радкоў, шмат з якіх ён павінен ведаць на памяць. Паэзія была вучонай прафесіяй, навукай навук. Мабыць, пагэтаму на Усходзе зачастую вучоны і паэт называліся адным словам – «Мудрэц».

У канцы зазначым, што намі прааналізаваны толькі асноўныя складнікі жанравай сістэмы персідскай літаратуры, некаторыя асаблівасці аб'яднання мастацкіх тэкстаў, а таксама асноўныя паэтычныя вобразы-сімвалы, але ўсё гэта ў сваёй сукупнасці і паасобку ўказвае на тое, як шэдэўры ліра-эпічнай, філасофска-этычнай, чарадзейна-фантастычнай класічнай фарсімоўнай паэзіі абагацілі сусветную літаратурную традыцыю і аказалі свой уплыў як на ўсходнюю, так і на заходнееўрапейскую літаратуру новых эпох. Паэтычнымі творамі класікаў Старажытнага Усходу захапляліся Гётэ, Байран, Гюго, Гегель, Пушкін, Фет, Ясенін, Максім Багдановіч і многія іншыя.

Літаратура

1. Брагинский, И.С. Иранское литературное наследие / И.С. Брагинский. – М.: Наука, 1984. – 295 с.

2. Литература Востока в средние века. – М.: Изд-во Московского университета, 1970. – 463 с.

3. Цыт. па кн.: Поэзия народов СССР IV–XVIII веков. – М.: Худ. лит., 1972. – 862 с.

4. Абдуллаева, Ф.И. Средневековая персидская поэзия / Ф.И. Абдуллаева. – СПб.: «Петербургское Востоковедение», 2001. – 208 с.

5. Ирано-таджикская поэзия. – М.: Худ. лит., 1974. – 621 с.

6. Хаям, Амар. Рубаі // Пераклад з фарсі-кабулі Рыгора Барадуліна / Амар Хаям. – Мінск: Маст. літ., 1989. – 95 с.

7. Низами. Пять поэм / Низами. – М.: Худ. лит., 1968. – 124 с.

Г.В. Навасельцава (Віцебск)

ДАКУМЕНТАЛЬНА-МАСТАЦКАЯ ІНТЭРПРЭТАЦЫЯ ГІСТОРЫІ ПРАЗАІКАМІ 1960-х – СЯРЭДЗІНЫ 1980-х ГАДОЎ

Дакументалізм – важная жанраўтваральная і тыпалагічная прыкмета твораў на гістарычную тэму. Сутнасць яго ў прамым уключэнні дакумента ў тэкст, стварэнні на аснове дакумента аўтарскай версіі падзей, максімальна набліжаных да дакумента. Адметнасць інтэрпрэтацыі гісторыі на дакументальнай аснове прадвызначаецца характарам дакументальнага

матэрыялу. Дакументальна-мастацкая проза была прадстаўлена ў творчасці беларускіх пісьменнікаў найперш гісторыка-біяграфічнымі творамі. Іх аўтары імкнуліся адлюстраваць узаемаадносіны асобы і народа. Шырока выкарыстоўвалі дакументальны матэрыял Сцяпан Александровіч, Лідзія Арабей, Эрнэст Ялугін, Міхась Стральцоў, Алег Лойка. Яны ўзнаўлялі вобразы выбітных дзеячаў культуры мінулага, падкрэслівалі іх выключна важнае месца ў беларускай гісторыі. Пачатак белетрызаванаму паказу жыццёвага шляху класікаў айчыннай літаратуры быў пакладзены аповесцю С. Александровіча «Ад роднае зямлі…» (1962), дзе расказвалася пра дзяцінства Я. Коласа. Пазней выйшлі аповесці «На шырокі прастор» (1972) пра юнацтва класіка, «Крыжавыя дарогі» пра яго жыццё на Куршчыне, «Сейбіт песні» пра сталыя гады. Характэрная рыса аповесцей С. Александровіча – спалучэнне паказу прыватнага жыцця і творчай дзейнасці, акцэнтацыя звычайнага і незвычайнага ў асобе пісьменніка.

На мастацкім абагульненні дакументальнага матэрыялу заснаваны творы Л. Арабей «На струнах буры» (1967), «Стану песняй» (1977), прысвечаныя Алаізе Пашкевіч. У першай аповесці пісьменніца галоўным чынам расказвала пра ўдзел Цёткі ў рэвалюцыйнай дзейнасці падчас працы ў Нова-Вілейцы, ілюстравала аповед цытатамі з мастацкіх твораў і з публіцыстыкі А. Пашкевіч. Адлюстраванне інтарэсаў Цёткі падкрэслівала шырыню яе інтэлектуальнага кругагляду, яе актыўную грамадзянскую пазіцыю ў грамадскім жыцці пачатку XX стагоддзя. Ідэалагічныя штампы часу, на жаль, адбіліся на трактоўцы Л. Арабей асобы Цёткі. Алаіза Пашкевіч у яе – гэта найперш змагар за сацыяльнае разняволенне народа, а ўжо пасля творца.

Дакументальная, па аўтарскім вызначэнні, аповесць «Стану песняй» – твор у жанравым плане сінтэтычны: тут ёсць элементы біяграфічнай аповесці, эсэ, літаратурнага партрэта. Л. Арабей больш увагі звярнула на месца Цёткі ў адраджэнскім руху. Цішку Гартнаму прысвяціў твор «Пасля нябыту» (1983) Э. Ялугін, дзе ў цэнтры – вобраз інтэлігента-творцы першай трэці XX стагоддзя на фоне значных грамадска-сацыяльных зрухаў. Зместам дакументальна-біяграфічнай аповесці Э. Ялугін акцэнтаваў драматызм лёсу старшыні першага ўрада БССР Зміцера Жылуновіча, вядомага ў беларускай літаратуры пад псеўданімам «Цішка Гартны». Прычына гэтага драматызму заключалася ў тым, што чалавек уступаў у невырашальны на той момант канфлікт з часам. Аўтарская ўвага ў дакументальнай аповесці Э. Ялугіна «Без эпітафіі» (1989) канцэнтравалася на гадах сталінскіх рэпрэсій, калі Цішка Гартны, дзіця і ахвяра свайго часу, быў беспадстаўна абвінавачаны і скончыў жыццё самагубствам. Характэрная рыса большасці гісторыка-біяграфічных твораў – вылучэнне на першы план грамадскай значнасці дзейнасці вядомага чалавека.

Актыўнай прысутнасцю аўтара-апавядальніка ў структуры твора вылучаліся «Загадка Багдановіча» (1968) Міхася Стральцова і «Як агонь,

як вада» (1984) Алега Лойкі. Абодва творы – эсэ, жанр, у якім пісьменнік у адвольнай форме разважае над пэўнымі праблемамі. Жанру эсэ характэрна падкрэсленая суб'ектыўнасць выказвання, свабодная кампазіцыйная структура твора [2]. «Загадка Багдановіча» напісана ў форме разважанняў пра месца пісьменніка ў жыцці, пра таямніцы творчасці. У трактоўцы пісьменніка, Максім Багдановіч – фенаменальная з'ява ў айчыннай літаратуры. «Як агонь, як вада» А. Лойкі – раман-эсэ, дзе біяграфія Купалы – мастацкая канва, якая дапаўняецца аўтарскай трактоўкай лёсу слыннага беларускага песняра. А. Лойка дастаткова падрабязна адлюстроўваў перыяды духоўнага сталення класіка айчыннай літаратуры. Пісьменніцкі дар празаік вызначаў як дар Божы, як абавязак перад народам. Выбар Іванам Луцэвічам пісьменніцкай дзейнасці, паводле А. Лойкі, быў падначалены высокай мэце адраджэння народнай памяці і народнай душы.

Жыццёвы і творчы шлях Купалы адлюстроўваўся аўтарам у непарыўным адзінстве з гісторыяй беларускай зямлі канца XIX – першай паловы XX стагоддзя. А. Лойка абапіраўся на багаты факталагічны матэрыял. Ён упершыню гаварыў пра трагічныя моманты з жыцця народнага песняра, у тым ліку пра таямніцу заўчаснай смерці. Напрыканцы твора ўвага апавядальніка засяродзілася на паказе духоўных пошукаў: народны паэт прадстаўлены ў творы прадаўжальнікам традыцый Яські-гаспадара з-пад Вільні і Мацея Бурачка, ідэйным выразнікам багатай на грамадскія зрухі эпохі, паэтам з ласкі Божай, які здолеў узняцца над сваім часам.

Рамантызацыя асобы Янкі Купалы спалучалася з рэалістычным паказам часу, грамадска-палітычных абставін пісьменніцкай дзейнасці. Творчай знаходкай А. Лойкі стаў прыём уключэння ў тканіну рамана-эсэ ўмоўнага інтэрв'ю з класікам, прыём дыялога праз дзесяцігоддзі. Ва ўмоўным інтэрв'ю Лойка прызнаўся, што некаторыя факты з біяграфіі паэта змяніў: «Я, напрыклад, у гэтай кнізе пра Вас падаў, нібы рэальныя, некалькі эпізодаў, якіх у самым Вашым жыцці не было. Вось яны: Вы самі не хадзілі да Мысаўскога ў дом Дворжыца – у рэдакцыю «Северо-Западного края»; я выдумаў таварыша, што вёў сход, каторы быў на самай яве не ў мінскіх металістаў, а на Барысаўскай запалкавай фабрыцы...» [3, с. 412]. Купала на гэта адказаў: «Можа, я недакладна ўспомню, але, здаецца, у Арыстоцеля так: «Задача паэта гаварыць не аб тым, што папраўдзе здарылася, але аб тым, што магло здарыцца, значыцца аб мажлівым па імавернасці або па неабходнасці». Калі ў Вас гэтае правіла вытрымана, то толькі чыстую праўду Вы сказалі» [3, с. 412]. Галоўны герой як асоба раскрываўся праз унутраныя маналогі.

Агульны тон аповеду ў творы эмацыянальны, як, напрыклад, у згадванні адносін паміж Я. Купалам і С. Палуянам: «Як было не палюбіць Купалу Палуяна! Чыстая, дзіцячая душа, сінія-сінія вочы, такі захоплены юнак, такі ў свае 19 год адданы справе, адраджэнню Беларусі, народу!» [3, с. 109].

Разнавіднасцю дакументальна-мастацкай прозы ў савецкай літаратуры таго перыяду з'яўлялася гісторыка-рэвалюцыйная проза. Ёй уласцівы паказ гістарычнага працэсу, стварэнне вобраза станоўчага героя, ушчыльненне гістарычнага часу, спалучэнне ў мастацкай структуры твора мінулага, сучаснасці і будучыні, адлюстраванне класавага абуджэння асобы, эпічны размах, шматпланавасць, публіцыстычнасць, вялікая ўвага да ўзаемаадносін асобы і асяроддзя. Пры гэтым чалавек і яго лёс нярэдка засланяліся абставінамі, прыватнае жыццё вядомай асобы – грамадскай дзейнасцю.

Паводле Д.Б. Дзеркача, спецыфіка гісторыка-рэвалюцыйнай прозы – у акцэнтаванні сацыяльнай сутнасці характараў, у імкненні ўбачыць індывідуальнае ў тым ці іншым сацыяльным тыпе [1, с. 52]. З пункту гледжання сучаснасці, гісторыка-рэвалюцыйная проза ў ідэйна-мастацкім асэнсаванні мінулага вылучалася зададзенасцю, абмежаванасцю тэматычнага дыяпазона. Яна вырашала не толькі гісторыка-літаратурныя, але і палітыка-ідэалагічныя задачы, давала ангажаваны сацыяльны зрэз рэчаіснасці. Пісьменнікі паказвалі стваральную дзейнасць мас, пераможную сілу рэвалюцыйных ідэй, якія пераўтвараюць грамадства і чалавека. Тыповы ўзор гісторыка-рэвалюцыйнай прозы – раман «Вецер веку» (1966) Іллі Гурскага. Сюжэт твора заснаваны на белетрызацыі гісторыі ў адпаведнасці з тагачаснай ідэалагічнай трактоўкай. Месцы дзеяння ў рамане – Петраград 1917 года, Заходні фронт, Беларусь.

Героі рамана – пераважна актыўныя ўдзельнікі падзей, прыхільнікі ідэй бальшавікоў Сяргей Галавін, Краеўскі, а таксама гістарычныя асобы (Фрунзе, Мяснікоў, Карнілаў, Будзённы, Дзяржынскі, Жылуновіч). Фрунзе ў рамане – прыхільнік незалежнасці Беларусі. Аўтар спрасціў спрэчку паміж Мясніковым і Жылуновічам, прадставіў Мяснікова ў ролі ідэйнага настаўніка Жылуновіча. Хроніка падзей рухае сюжэт твора, аўтар не даследуе, а ілюструе гістарычныя падзеі і абапіраецца на мастацкія штампы. Так, у адным з эпізодаў твора да Фрунзе звяртаецца селянін Касач, якога хвалюе зямельнае пытанне, і адразу ж атрымлівае гатовы адказ. Гэта традыцыйны прыём савецкай раманістыкі і кінематографа.

На фоне такіх твораў вылучаўся панарамнасцю і аналітызмам раман Івана Шамякіна «Петраград-Брэст» (1981–1983), дзе раскрываліся падзеі, звязаныя з падпісаннем Брэсцкага мірнага пагаднення паміж савецкай Расіяй і кайзераўскай Германіяй. Героі твора – дзеячы бальшавісцкай партыі Ленін, Крупская, Сталін, Троцкі, Бухарын, Зіноўеў, Каменеў, Бонч-Бруевіч і іншыя. Поруч з імі існуюць выдуманыя героі – бальшавісцкі агітатар Міра, камандзір палка, былы паручнік царскай арміі Сяргей Багуновіч, яго знаёмы Баляслаў Кручэўскі і іншыя. Сяргей ваяваў на Першай сусветнай вайне, рэвалюцыйныя падзеі заспелі яго на фронце. Салдаты абралі Багуновіча камандзірам палка. Сяргей ніяк не можа згадзіцца са сваёй каханай Мірай, што патрыятызм трэба выцесніць інтэрнацыяналізмам, ён любіць родную зямлю, хоча яе

абараняць, змагацца з немцамі. Міра, як і Троцкі (гэта яе ідэал рэвалюцыянера – Г.Н.), пераканана, што нямецкія салдаты пяройдуць на бок бальшавікоў. Смерць дзяўчыны падчас агітацыі кайзераўскіх салдат – сведчанне памылковасці яе пазіцыі.

Пісьменнік дэталёва прасочваў абставіны заключэння Брэсцкага міру, у тэкст рамана шырока ўводзіў вытрымкі з дакументаў таго перыяду. Ацэнка палітычных дзеячаў у рамане адпавядала афіцыйным ацэнкам тагачасных савецкіх гісторыкаў. У.І. Ленін паказваўся палітычным і маральным антыподам Л.Д. Троцкага. Хоць І. Шамякін паспрабаваў паказаць Леніна і прыватнай асобай, але не мог устрымацца ад рыторыкі тыпу: «Не, Ленін проста ўсё прадбачыў і ўзважваў на дакладных вагах тэарэтычнай мудрасці і рэвалюцыйнай інтуіцыі» [4, с. 84]. Параўнальна невялікае месца займае ў рамане адлюстраванне беларускага грамадскага руху, дзеячы якога характарызуюцца галоўным чынам негатыўна. Раман «Петраград-Брэст» – спроба ўзнавіць хроніку падзей, перадаць складаную палітру гістарычнай рэчаіснасці, аднак афіцыйныя ідэалагічныя ўстаноўкі не давалі магчымасці ўвасобіць беларускую гісторыю ў поўным аб'ёме.

Беларуская дакументальна-мастацкая проза скіроўвала ўвагу на першачарговае мастацкае асэнсаванне лёсу дзеячаў культуры, сюжэтаўтваральным элементам былі старонкі біяграфій выдатных людзей. І хоць мастацкія абагульненні рабіліся з улікам тагачасных ідэалагічных установак, аўтары ме мелі магчымасць аб'ектыўна ацаніць унёсак сваіх герояў у развіццё культуры.

Літаратура

1. Деркач, Б.Д. Современный историко-революционный роман (проблемы поэтики) / Б.Д. Деркач ; АН УССР Ин-т лит. им. Т.Г. Шевченко; отв. ред. И.А. Дзеверин. – Киев: Наук. думка, 1989. – 192 с.
2. Кайда, Л.Г. Эссе : стилистический портрет / Л.Г. Кайда. – М.: Флинта, 2008. – 184 с.
3. Лойка, А. Выбраныя творы : у 2 т. / А. Лойка. – Мінск: Маст. літ., 1992. – Т. 1: Як агонь, як вада… : раман-эсэ пра Янку Купалу. – 1992 . – 461 с.
4. Шамякін, І. Петраград-Брэст: гіст. раман / І. Шамякін. – Мінск : Беларусь, 1991. – 486 с.

Г.Ю. Новік (Мінск)

ЖАНРАВАЯ СТРУКТУРА АЎТАБІЯГРАФІЧНАЙ ПРОЗЫ ЯК АДНОЙ З РАЗНАВІДНАСЦЕЙ ЛІТАРАТУРЫ НОН-ФІКШН

Літаратура нон-фікшн характарызуецца шырокай жанрава-стылёвай разнастайнасцю, што абумоўлівае магчымасць яе дыферэнцыяцыі. У прыватнасці, існуе ўласна "непрыдуманая" літаратура: слоўнікі, даведнікі, навукова-папулярныя публікацыі, артыкулы, альманахі, планы, праекты, фотаздымкі, статуты, травелогі, кулінарныя кнігі і інш., – ад якой адмяжоўваецца такая плынь нон-фікшн, што ўзаемадзейнічае з мастацкай

літаратурай. У апошняй разнавіднасці тэкстаў, у сваю чаргу, вылучаюцца дзве выразныя групы – дакументальна-мастацкая і аўтабіяграфічная проза.

Пад апошняй Ф. Ляжон разумее “апавяданне ў прозе, якое вядзе які-небудзь рэальны чалавек пра сваё ўласнае быццё, з асаблівым акцэнтам на сваім індывідуальным жыцці, у прыватнасці, на гісторыі сваёй асобы” [1]. Як вынікае з разважанняў даследчыка, галоўная адметнасць такіх твораў – выкананне імі ролі пасярэдніка пры пераломванні ў свядомасці аўтара знешняга, падзейнага боку жыцця і ператварэння яго ва ўнутраны, маральны. На наш погляд, немалаважную ролю ў аўтадакументальных тэкстах адыгрывае адлюстраванне этапаў станаўлення асобы, таму найбольш поўнай падаецца дэфініцыя, прапанаваная Г. Раманавай: “<…> твор, асноўны змест якога складае выяўленне працэсу духоўна-маральнага развіцця асобы аўтара, заснаванага на асэнсаванні мінулага з пункту гледжання вопытнага, сталага чалавека, дасведчанага жыццём” [5, с. 196]. Разам з тым відавочна, што ўстаноўка на глыбокі жыццёвы вопыт стваральніка ў аўтабіяграфічнай прозе не з’яўляецца катэгарычнай, пра што сведчыць наяўнасць у яе жанрава-стылёвай структуры формы дзённіка, адметнай, у параўнанні з мемуарамі і споведдзю, нерэтраспектыўнасцю падачы матэрыялу, а таксама той факт, што ўзрост аўтараў, схільных да аўтабіяграфізму, паступова зніжаецца.

Асобныя даследчыкі лічаць, што сваёй жанравай дыферэнцыяцыяй аўтабіяграфічная проза абавязана перадусім аўтабіяграфіі, якая, паводле П. Чакалава, “за час свайго існавання спарадзіла некалькі роднасных мадыфікацый: дзённікі, нататкі, споведзі, успаміны, мемуары” [8]. Але больш пашыраным у літаратуразнаўчай навуцы з’яўляецца меркаванне пра раўнапраўныя адносіны паміж згаданымі даследчыкам жанрамі, пацвярджанае наяўнасцю ўнікальнага генезісу для кожнага з іх. Да прыкладу, форма дзённіка бярэ пачатак ад летапісаў, хаджэнняў, дзелавой дакументацыі; мемуары ўзыходзяць да жыцій і юрыдычных дакументаў (паказанняў сведак); літаратурная споведзь з’яўляецца відазмененай мадыфікацыяй аднайменнага рэлігійнага сакрамэнту.

На пачатку 1970-х гг. для абазначэння дзённікаў, нататак, успамінаў, аўтабіяграфій і споведзяў былі прапанаваныя тэрміны “аўтадакументальная проза” (А. Урбан) і “аўтадакументальныя жанры” (Л. Гінзбург). Сучасныя даследаванні адметныя пашыраным выкарыстаннем паняццяў “эгадакумент”, “сведчанні пра сябе”, “жыццяпісы” і інш. Першае з іх было ўведзена ў 1950-я гг. для чатырох асноўных тыпаў асабістых сведчанняў: аўтабіяграфій, мемуараў, дзённікаў і лістоў прыватнага зместу. Эгадакумент у шырокім сэнсе – твор, дзе відавочна прасочваецца наяўнасць “Я” ў якасці пэўнага суб’екта, які адначасова піша і прысутнічае ў тэксце. Больш за тое, своеасаблівая інтэрпрэтацыя пісьменнікам вобраза ўласнай асобы ў аўтабіяграфічнай прозе выносіцца на першы план. А. Ніколіна тлумачыць гэтую з’яву тым, што “да

аўтабіяграфічнага апавядання звяртаецца толькі такая асоба, якая ведае, што яна сабой уяўляе і чым жадае быць, якая выходзіць за межы простай адзінкавасці і ўсведамляе гэта" [2, с. 226]. В. Стральцова гэтаксама падкрэслівае значнасць асобы творцы і звязвае яе перадусім са ступенню мастацкасці матэрыялу, якая вызначаецца "не столькі характарам і якасцю апрацоўкі жыццёва-дакладнага матэрыялу, колькі самім маштабам творчай асобы аўтара, ракурсам і арыгінальнасцю яго мастацкага бачання" [6, с. 11]. Сярод выбітных дзеячоў беларускай культуры, схільных да стварэння аўтабіяграфічных тэкстаў, можна назваць Н. Гілевіча ("Дзённікі"), А. Луцкевіча ("Дзённік"), П. Бадунову ("Успаміны аб маім каханні"), Б. Тарашкевіча ("Автобиография Бронислава Адамовича Тарашкевича, члена КПП (КПЗБ) с 1925 года"), З. Азгура ("Незабыўнае"), В. Быкава ("Пункціры жыцця"), П. Мядзёлку ("Сцежкамі жыцця"), Л. Геніюш ("Споведзь") і інш.

Не менш каштоўнымі ў плане мастацкай вартасці з'яўляюцца некаторыя творы так званага інсітнага мастацтва. У дачыненні да аўтабіяграфічнай прозы пад імі разумеюцца тэксты, якія не прэтэндуюць на маштабнасць адлюстравання сваёй эпохі, засяроджаныя на перадачы шчырых пачуццяў аўтара, характарызуюцца перабольшанай увагай да другасных дэталяў, стылістычнай раскаванасцю і апавядальнасцю. "Інсітныя" творы нярэдка раскрываюць з нечаканага боку вядомыя з'явы і падзеі, адлюстраваныя ў "высокамастацкіх", а жыццеапісанні могуць быць не менш насычанымі і паказальнымі, чым у творах дзеячаў мастацтва. Яскравым прыкладам з'яўляецца дыярыуш "Востраў" Г. Матусевіч, у структуру якога ўключаныя ўспаміны, лісты і фотаздымкі. Аўтар, не з'яўляючыся прафесійным гісторыкам ці літаратарам, напісала ўнікальны па сваім каларыце, прасякнуты шчырым патрыятычным пафасам твор, дзякуючы вывучэнню якога можна наблізіцца да разумення светапогляду беларусаў канца XX стагоддзя.

Яшчэ адна адметнасць, абумоўленая іманентна закладзеным у тэкставую структуру аўтабіяграфічнай прозы эгацэнтрызмам – інтэнцыя на ідэалізацыю пратаганіста, якая вынікае з хаця і не поўнай адпаведнасці, але цеснай сувязі яго з аўтарам. Н. Ніколіна слушна сцвярджае, што "ўяўленне пра сябе самога <…> абапіраецца пераважна не столькі на прамыя самаацэнкі апавядальніка, колькі на ўяўленні іншых і часта з'яўляецца своеасаблівай інтэрыярызацыяй іх рэакцый на дадзеную асобу" [2, с. 230]. Гэта значыць, сродкам самаапісання і самахарактарыстыкі выступаюць ацэнкі дзейнасці апавядальніка іншымі асобамі нароўні з ацэначнымі выказваннямі творцы, адлюстраваннем ім пэўных з'яў і, нарэшце, уласных учынкаў і дзеянняў. Тым не менш нават пералічаныя аб'ектыўныя складнікі жыццёвага матэрыялу нярэдка набываюць адвольную апрацоўку, што падкрэсліваў В. Халізеў: "Звяртаючыся да "персанальнай" тэматыкі, аўтары нярэдка ствараюць свайго роду асабістыя міфы" [7, с. 50]. Прычына падобнай міфатворчасці – максімальная зацікаўленасць пісьменнікаў у створаным, своеасаблівая "прэзумпцыя праўдзівасці" [4, с. 11] (азначэнне

В. Нурковай), якая не заўсёды станоўча ўплывае на суаднесенасць апісанага з рэальнымі падзеямі.

Спалучэнне аўтарскай самарэфлексіі з ацэначнымі характарыстыкамі іншых персанажаў у аўтабіяграфічнай прозе нярэдка дапаўняецца характарыстыкай гістарычных сітуацый, прадметаў, ацэнкамі прачытаных кніг, твораў мастацтва, дзякуючы чаму алюстроўваюцца індывідуальныя асаблівасці асобы. У такім выпадку хранатоп твораў можа быць адметны аўтарскай сегментацыяй часу (як у “Лістах абляцелых” А. Жука, “Днях маіх, падарунках” К. Цвіркі і інш.) і, у адрозненне ад біяграфічных твораў, лёс герояў якіх ужо загадзя вядомы чытачу, адкрытасцю фіналу. Нарэшце, самая характэрная ўласцівасць – вядзенне нарацыі ад першай асобы, з чым звязанае, паводле Н. Ніколінай, “узаемадзеянне двух тыпаў экспрэсіі: лірычнай і іранічнай, – і адпаведна моўных сродкаў, што іх спараджаюць” [3, с. 59]. Калі лірычная экспрэсія выражаецца сродкамі экспрэсіўна-эмацыянальнай выразнасці, то іранічная ўзнікае пры несупадзенні ацэнак апавядальніка ў мінулым і цяперашнім часах, гэта значыць, сведчыць пра аўтарскае “двайное бачанне”.

Такім чынам, да аўтабіяграфічнай прозы адносяцца творы, у якіх пісьменнікі раскрываюць падрабязнасці ўласнага прыватнага жыцця з мэтай глыбейшага самаспазнання. Пры гэтым аўтар блізкі, але не тоесны герою, і яго пункт гледжання нярэдка спалучаецца з меркаваннямі іншых герояў. Сярод іншых характэрных рыс – пераважная рэтраспектыўнасць апісанняў, сумяшчэнне цяперашняга і мінулага часоў, адкрытасць фіналу, храналагічнасць, наяўнасць вымыслу, “станоўчасць” пратаганіста, што дазваляе кваліфікаваць аўтабіяграфічную прозу як адметную мастацкую з’яву з шырокім дыяпазонам іманентных уласцівасцей.

Літаратура

1. Лежён, Ф. В защиту автобиографии [Электронный ресурс] / Ф. Лежён. – Режим доступа: http://cyberleninka.ru/article/n/osmyslenie-zhanra-hudozhestvennoy-avtobiografii-v-nauchnoy-literature. – Дата доступа: 19.01.2015.

2. Николина, Н.А. Поэтика русской автобиографической прозы / Н.А. Николина. – М.: ФЛИНТА, 2011. – 424 с.

3. Николина, Н. Структура повествования в автобиографической прозе / Н. Николина // Русский язык в школе. –1986. – № 4. – С. 56–64.

4. Нуркова, В.В. Совершенное продолжается: психология автобиографической памяти личности / В.В. Нуркова. – М.: УРАО, 2000. – 320 с.

5. Романова, Г. Автобиографические жанры / Г. Романова // Литературная учёба. – 2003. – № 6. – С. 195 – 199.

6. Стральцова, В. Шлях да сябе: Сучасная аўтабіяграфічная проза як мастацкая сістэма / В.М. Стральцова. – Мінск: Бел. навука, 2002. – 112 с.

7. Хализев, В.Е. Теория литературы / В.Е. Хализев. – М.: Высшая школа, 2002. – 438 с.

8. Чекалов, П.К. Осмысление жанра художественной автобиографии в научной литературе [Электронный ресурс] / П.К. Чекалов. – Режим доступа: http://cyberleninka.ru/article/n/osmyslenie-zhanra-hudozhestvennoy-avtobiografii-v-nauchnoy-literature. – Дата доступа: 12.01.2015.

Т.С. Нуждзіна (Мазыр)

МАСТАЦКІ ФЕНОМЕН РАДАВОДНЫХ ВЫТОКАЎ ТВОРЦЫ Ў ДАКУМЕНТАЛЬНА-БІЯГРАФІЧНАЙ ПРОЗЕ НІЛА ГІЛЕВІЧА І ЯНКІ СІПАКОВА

Зразумець “душу” мастацкага твора, адчуць у ім не “аплікацыі”, а жывых людзей, магчыма пры адной умове. Спашлемся на думку Я. Сіпакова, якая стала фундаментальнай асновай яго мастацкага крэда: *“Твор можа адбыцца, калі ў стварэнні яго ўдзельнічае сэрца. Нішто не можа замяніць гэтай самай важнай дэталі з рыштунку любой мастацкай творчасці. Без сэрца, хоць рэч будзе і напісана, яна нікога не зможа ўсхваляваць; хоць героі і будуць народжаны, яны ніколі не змогуць стаць жывымі”* [3, с. 370].

Думка настолькі важная для разумення праблемы перастварэння жыццёвай канкрэтыкі ў мастацкую рэальнасць, што ў роздумах на адзіноце пра літаратуру, прыроду талента, творчы працэс пісьменнік вяртаецца да яе і тады, калі размова заходзіць пра галоўнае: якім духоўна-эмацыянальным патэнцыялам павінен валодаць аўтар, каб яго твор стаў для чытача адкрыццём вялікай праўды быцця народа і асобнага чалавека. Адштурхнуўшыся ад калісьці пачутай фразы, што чалавек – гэта суцэльнае сэрца, Я. Сіпакоў прапануе нам уявіць, якім жа павінна быць сэрца пісьменніка, “каб у ім змясціліся ўсе нягоды і радасці і сваёй зямлі, і цэлага свету” [3, с. 356].

І без усялякіх фантазій, уяўленняў адчуем глыбіню думкі пісьменніка Сіпакова, калі, як да крыніцы з чыстай, “жывой” вадой, прыпасці да балюча-праўдзівага слова народнага паэта Ніла Гілевіча. Слова-вобраз *сэрца* сустрэнецца не раз – гэтак, як *песня, дрэва, птушка, курган, крыж, пагост, навальніца, дождж* – у мастацка-вобразнай сістэме паэта (“Сэрца дзядзькі Рыгора” (да 80-годдзя Р.Р. Шырмы), “Сэрца Ігната Буйніцкага”, “Вярні!”, “Сэрца Лецечкі”, “Змучыў сэрца, схваробіў душу…”, “Здарэнне на беларускім Парнасе”, “Удакладненне ў адзін дакумент” і інш.). Словы захаплення ў адрас славутага Р. Шырмы, выказаныя паэтам і фальклярыстам Н. Гілевічам у 1972 годзе, сведчаць пра супадзенне поглядаў абодвух пісьменнікаў на абавязак сапраўднага творцы ўбіраць у сваё сэрца космас зямнога быцця чалавека і аголеным нервам ствараць свой мастацкі свет. Тады зусім па праву і адпаведнае пытанне: *“Дык якім жа павінен ён волатам быць, // Каб у сэрцы адным гэтак многа ўмясціць?”* [1, с. 245].

Тварыць сэрцам – гэта жыць на мяжы магчымага, таму і не вынесла сэрца Ігната Буйніцкага. У віхурным парыве танца *“схапіўся за сэрца і ўпаў на памосце…”* артыст: “*Сказалі: “Не вынесла сэрца нагрузкі. // Замнога ўвабрала; хацела – замнога…”* [2, с. 143].

Для нас, сучасных, большасць якіх жыве без трывожных дум за лёс і будучыню сваіх нашчадкаў і сваёй краіны, аўтар верша ўдакладніць прычыны трагедыі. Справа зусім не ў фізічным "*ператамленні*" артыста. Яго сэрца прагла адкрыць "*ганарліваму свету*" талент беларуса, яго "*плён самародны*", яго права на "*вольную волю*". А яшчэ вялікае сэрца вялікага творцы поўнілася "*радасцю буйнай, і ласкай, і жалем…*", бо ён разумеў, які нялёгкі выбраў шлях змагання за мару сваю, ідэалы свае – вось і "*разарвалася сэрца… ад болю*" [2, с. 143–144]. Тэмпература духоўнага напружання сэрца дасягнула крытычнай мяжы.

Часта да такой вось крытычнай мяжы звышчалавечага напружання душы і сэрца падступаецца і лірычны герой твораў Н. Гілевіча. Яшчэ на пачатку 70-х (паэт толькі "пераступіў" сваё саракагоддзе) пачуем скрушнае прызнанне, якому нельга не паверыць:

На край наш родны гледзячы,
На людзей, на дрэвы, на траву,
Мне здаецца,
Што я з сэрцам Лецечкі,
З хворым сэрцам Лецечкі жыву… [2, с. 243].

Глыбіня болю выказана з максімальным прадчуваннем роспачнага адчаю. Па-іншаму нельга, бо такія творцы, як Ф. Багушэвіч, Я. Купала, Н. Гілевіч або В. Казько жылі і жывуць па такой вось маштабна-ёмістай формуле творчасці – "*Усё ва мне і я ва ўсім*". Лаканічны і па-свойму змястоўны афарызм належыць Я. Сіпакову, па меркаванні якога – гэта *"самы неабходны, самы патрэбны творчы прынцып для пісьменніка*" [3, с. 342].

Абазначаны два істотныя моманты. Па-першае, праз багатае ўяўленне, інтэлектуальную дасведчанасць, пабуджаную памяць мінулага, праз гісторыю быцця многіх пакаленняў далёкіх продкаў і тых, хто па розных прычынах і ў розныя часы пакінуў зямлю, адкуль пачынаўся яго радаводны корань, вялікі, таленавіты творца перастварае мінулае так, нібы сваім быў сярод тых людзей, у тым часе і прасторы. Па-другое, бачыць і запамінаць, чуць і разумець рэаліі сучаснасці, праўдзіва ўвасобіўшы іх у мастацкім слове. Пры гэтым важна, каб у творы адбіліся "грымасы" нашай эпохі, якая сваімі нечаканымі і трагічнымі зігзагамі крэсліла лёсы як асобнага чалавека, адной краіны, а здаралася і так, што і лёс чалавецтва на пераломных этапах сучаснай гісторыі.

Другая частка выказвання Я. Сіпакова – "*я ва ўсім*" – скіроўвае ўвагу не толькі на адказнасць пісьменніка за выбар і сумленную трактоўку абраных жыццёвых праблем, але і на факт пазнавальнасці мастакоўскага "я" творцы, пазначанага індывідуальным знакам якасці, што якраз і з'яўляецца абавязковым гарантам запатрабаванасці твора ў чытацкім і навуковым асяроддзі. Каб у поўнай меры зразумець усёабдымнасць выслоўя "ўсё ва

мне”, трэба не толькі заглыбіцца ў мастацкі свет пісьменніка, але і ў рэаліі яго жыцця, яго асабістага лёсу.

На пачатку літаратурнай дарогі азначанае Сіпаковым “усё” дыктавалася прыродай таленту творцы, яго здольнасцю ўбіраць у душу і сэрца блізкі свет. У Н. Гілевіча ён пачынаўся з настроенасці ўсёй істоты на мелодыю народнай песні, на сціплае харство яе вобразаў, геніяльную прастату яе стылістыкі; у Я. Сіпакова – з абуджэння даверу да людзей, з удзячнасці за іх дабрыню і спагаду да яго сіроцкага лёсу і з асобай чуйнасці да прыроднага свету, яго разумнасці і дасканаласці. У кожнага з іх па-свойму заяўляў пра сябе і феномен радаводных вытокаў у мастацкай прасторы твораў. Няхай не адразу, а спакваля, паступова “прарастаў” памяццю продкаў – духоўнай, генетычнай, фальклорна-міфалагічнай або гістарычнай памяццю родных мясцін.

У залежнасці ад часу і характару быцця Н. Гілевіча ў літаратурным працэсе (паэзія, ліра-эпас, мастацка-біяграфічная проза, дакументальна-мемуарныя творы, эсэістыка) праблема мастацкага асвятлення пісьменнікам радаводных вытокаў героя-творцы, аўтара-апавядальніка набывае кожны раз больш змястоўнае сэнсавае напаўненне, мяняецца эмацыянальны рэгістр, вобразная палітра, пашыраецца прасторавы і часавы дыяпазон ахопу быційнай сутнасці продкаў.

На этапе станаўлення жыццёвай загартоўкі таленту радаводны пачатак творчай асобы раскрываецца на ўзроўні асэнсавання духоўнай спадчыны продкаў: далёкіх – праз далучэнне да песеннай культуры народа (“А ў полі вярба”, “На канцэрце ў сталіцы”, “Спадчына”, “А дзе ж тая крынічанька?”), а ў вершы “Парада маладым чытачам” аўтар рэкамендуе моладзі цікавіцца казачным эпасам:

Навукі мудрай – край там непачаты!
Таму й кажу вам: у жыцця на старце –
Чытайце казкі, хлопцы і дзяўчаты!
Старыя казачкі часцей чытайце! [1, с. 286].

Паэт-кніжнік, паэт-рамантык Н. Гілевіч выбудоўвае духоўна-творчы радавод свайго героя, пачатак якога і ў адчуванні роднасці душы з мастацкім словам З. Бядулі, М. Чарота, Я. Коласа. У вершы “Якуб Колас”, перагортваючы разам з героем тамы класіка, адкрываем тую аснову, на якой узнікае разуменне гістарычнай значнасці мастацкага вопыту пісьменніка і яго прысутнасці ў памяці і духоўных набытках новых пакаленняў – і сына, і ўнука, і праўнука, якія *“нібы ўласнае сэрца раскрыюць тамы”*, каб пазнаць нашай “*гісторыі мудрую праўду*” [1, с. 44–45].

Трэба сказаць і пра тое, што далучэнне да памяці продкаў, іх маральна-этычных прынцыпаў, эстэтычных ідэалаў адбываецца дзякуючы жанчыне, маці. Менавіта пра маці, пра вялікі род Гілевічаў, пра духоўныя скарбы і пра радаводныя вытокі таленту (на генетычнай аснове) паведае пісьменнік нямала цікавых фактаў у кнізе ўспамінаў “Між роспаччу і над-

зеяй”. Асабліва – пра дзеда Мікалая Рулькевіча, фантазёра, “несусветнага выдумляку”; пра апантанасць бацькі Сымона Пятровіча ідэямі будаўніцтва новага жыцця, а яшчэ пра яго вялікі “спеўны” талент. Як бачна, да такога адкрытага выяўлення сваёй повязі з памяццю продкаў Ніл Гілевіч прыйшоў на пачатку новага стагоддзя.

У той жа час памяць продкаў, дух продкаў у мастацкім таленце Я. Сіпакова выяўляюцца найперш праз асэнсаванне лёсу многіх пакаленняў яго землякоў, што пакінулі яркі след не толькі ў гісторыі сваёй мясцовасці, але і далёка за межамі роднай зямлі. Так, яго “Зубрэвіцкая сага” скіроўвае ўвагу на неабходнасць вярнуць у рэальнае сёння не толькі памяць пра неардынарную постаць Міткі Сякіры – “дзедзіча зямлі Зубрэвіцкай” [4, с. 86], але і расказаць пра падзеі эпохі Ягайлы і Вітаўта. Цікава, што аповед пра згаданую эпоху пачынаецца з філасофскіх роздумаў пра лёс травы: *“Кожную вясну нараджаліся травінкі, радаваліся свайму з’яўленню, квітнелі, цягнуліся да сонца, а ўвосень, хоць і не заўсёды паслухмяна паміралі <…>. Паміралі яны, паміралі іх дзеці, паміралі ўнукі, паміралі праўнукі”* [4, с. 85]. Выразная аналогія з лёсам людзей. Трава ў Сіпакова жывая, як і ўсё прыроднае ў яго мастацкім свеце. І калі складана расказаць пра лёс пакаленняў травы, то воляй свайго таленту, мастакоўскай фантазіяй, праз звесткі, што занатавала людская памяць, аўтар твора працягне нітачку сувязі-памяці з далёкага мінулага да сённяшніх Зубрэвіч, ад Міткі Сякіры, які называў сябе князем Дзмітрыем Зубрэвіцкім, да сябра апавядальніка са школьнай пары Міці Князева.

Спрабуючы раскрыць праблему памяці продкаў, яе прысутнасці ў сваім радаводным лёсе, у апавяданні “Хуткія Ногі” аўтар скіруе фантазію на міфалагічна-фальклорны родавы вытак таленту творцы – жыць адной душой з прыродай, як рабілі тыя, са стойбішча на Кургане, між Дняпром і Дзвіною, адкуль і пачаўся радавод Сіпаковых: *“… народзіцца пасля Анціп, Сямён, Хімка, знайдуцца таксама Пракоп і Яўхім’я, Іван і Васюта, якія народзяць Улляну і Данілу – маіх бацькоў”* [4, с. 26]. На пачатку апавядання аўтар двойчы згадае, што ён добра помніць усё, што адбывалася там, на Кургане, нібы бачыў усё на свае ўласныя вочы: *“Быццам бы і мой будан стаяў там, на выспе, недзе паміж сённяшнімі Дняпром і Друццю – памятаеце, першы справа ў стойбішчы, калі падымацца на выспу ад вялікай вады? Звычайна такі буданок, складзены з буйных костак маманта, накрыты шкурамі, і перад уваходам з двух бакоў – два вялікія, закручаныя ўсярэдзіну, павернутыя адзін да аднаго біўні, што тырчаць з мамантавых чарапоў…”* [4, с. 7]. Успрыняцце далёкага мінулага падаецца як на ўзроўні фальклорна-міфалагічнай памяці, так і навукова-інтэлектуальнай дасведчанасці пісьменніка, яго абазнанасці ва ўсім, што датычыцца быцця беларуса ў розных часавых параметрах і прасторавай адлегласці.

Такім чынам, феномен радаводных вытокаў у мастацкай трактоўцы такіх пісьменнікаў, як Ніл Гілевіч і Янка Сіпакоў, – з'ява цікавая і заслугоўвае самай сур'ёзнай даследчыцкай увагі.

Літаратура

1. Гілевіч, Н. Збор твораў: у 23 т. / Н. Гілевіч. – Мінск: ГА БТ «Кніга», 2003. – Т. 1: Вершы: 1946–1990. – 416 с.

2. Гілевіч, Н. Збор твораў: у 23 т. / Н. Гілевіч. – Мінск: ТДА "Пантограф", 2010. – Т. 2: Паэзія: 1991–2010. – 496 с.

3. Сіпакоў, Я. Выбраныя творы: у 2 т. / Я. Сіпакоў. – Мінск: Маст. літ., 1997. – Т. 2: Проза. – 414 с.

4. Сіпакоў, Я. Вецер на даху вагона: апавяданні, эсэ /Я. Сіпакоў. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 263 с.

В.Ф. Падстаўленка (Віцебск)

ІДЭЙНА-СТЫЛЯВАЯ СПЕЦЫФІКА ФІЛАСОФСКА-АЛЕГАРЫЧНЫХ АПАВЯДАННЯЎ ВАСІЛЯ БЫКАВА

Праблемы грамадскага жыцця ва ўсе часы хвалявалі мастакоў слова. Многія творцы апелявалі да сацыяльных пытанняў, каб аб'ектыўна вызначыць іх сутнасць, раскрыць пазачасавую актуальнасць адпаведных з'яў, прапанаваць механізмы іх пераадолення. Для вырашэння адзначаных задач пісьменнікі выкарыстоўвалі розныя мастацкія сродкі, але асабліва папулярнымі сярод іх былі ідэйна-стылявая завуаляванасць мастацкага тэксту і яго алегарычнасць.

Так, напрыклад, у рускай літаратуры канца XIX ст. сацыяльна-палітычныя аспекты праблематыкі знайшлі адлюстраванне ў алегарычных казках М.Я. Салтыкова-Шчадрына. У беларускай літаратуры такія спробы таксама мелі месца. У празаічных творах М. Багдановіча "Музыка", "Апокрыф", "Апавяданне аб іконніку і залатару…" па-філасофску раскрывалася праблема спалучэння паўсядзённасці і эстэтычных каштоўнасцяў. У першыя паслякастрычніцкія гады актуальныя маральна-этычныя пытанні вывучаліся Я. Коласам у зборніку "Казкі жыцця". У постсавецкі час В. Быкаў, Я. Сіпакоў, Ф. Сіўко і іншыя звярталіся да жанру філасофска-алегарычнага апавядання, жадаючы скіраваць чытача да глыбокага вырашэння негатыўных грамадскіх з'яў.

Філасофска-алегарычныя апавяданні Васіля Быкава канца 1990–пачатку 2000-х гадоў характарызуюцца сваёй відавочнай стылявой спецыфікай. Што цікава, у гэтых празаічных прыкладах аўтарскі стыль неаднародны, яго трансфармацыя перадусім дэтэрмінавана асаблівасцямі мастацкай сюжэтабудовы твораў. На падставе гэтага ў малой прозе Быкава можна вылучыць дзве групы: у першую ўваходзяць філасофска-алегарычныя апавяданні з хранікальна пабудаванымі сюжэтамі, а да дру-

гой групы метазгодна аднесці творы, сюжэты якіх падзейна сканцэнтраваныя (монападзейныя ўзоры).

Філасофска-алегарычным апавяданням Быкава з сюжэтнай хранікальнасцю ўласціва перавага падзейнасці над псіхалагізмам. Звернемся да прыкладаў. У “Маленькай чырвонай кветачцы” аўтарам даследуецца маральна-этычная праблема няўдзячнасці людзей, нават калі ім самааддана і шчыра дапамагаюць. Тут апавядаецца пра станаўленне народнага лідара, яго ўдзел у абароне ад ворага, трагічную смерць і здраду з боку раней адданых яму людзей. Цэнтральнымі вобразамі тут з’яўляюцца кіраўнік-змагар і народ. На працягу апавядання характар змагара захоўвае пазітыўную статычнасць, а вобраз народа – дынамічны: спачатку станоўча ацэнены аўтарам (за падтрымку кіраўніка і сумеснае змаганне), пасля – адмоўна (з-за здрады першапачатковым ідэям і знявагі памяці сапраўднага героя).

У апавяданні “Вежа” закранаецца пытанне адказнасці людзей за іх бязглуздыя ўчынкі. Сюжэтавызначальны стрыжань твора звязаны з гісторыяй будаўніцтва малазначнай вежы, якая з часам часткова разбурылася і засталася толькі напамінам пра алагічныя рашэнні ўладаў і выканаўцаў. Як і ў папярэднім творы, вобраз натоўпу таксама падаецца ў сэнсавай дынаміцы: ад негатыўных характарыстык (з-за пасіўнасці герояў, іх пакорлівасці, гатоўнасці выконваць любы загад) да станоўчых (пасля прабуджэння свядомасці ў частцы народа, спроб выступіць супраць будаўніцтва).

У “Пахаджанах” аўтарскія філасофскія ідэі звязаны з пошукам ідэальнага жыцця, да якога людзі імкнуцца на працягу ўсяго свайго існавання. Сюжэтастваральным базісам выступае аповед пра лёс племені, якое шукае лепшага, але нідзе яго не знаходзіць, і таму многія яго пакаленні бясплённа блукаць па свеце. Абагульненыя вобразы племені і яго правадыроў падаюцца статычна, у адмоўным плане, што падкрэслівае аўтарскі песімізм у спробе дасягнення ўтапічнай мары.

Розным аспектам вывучэння канцэптуальнай праблемы “асоба і грамадства” прысвечаны апавяданні “Тры словы нямых”, “Свіст”, “Герой”.

Так, у апошнім прыкладзе аўтар разважаў над лёсам самаахвярных людзей і знішчальнай сутнасцю кансерватыўных падыходаў. Падзейнасць у апавяданні не проста архаізуецца, яна міфалагізавана: адно старажытнае племя тэрарызаваў дракон, перамагчы якога змог толькі хлопец Кім. Гэтым герой парушыў спрадвечныя правілы, за што яго зняважылі і выгналі з племені. Цэнтральныя персанажы – Кім і дракон – з’яўляюцца антаганістамі, што сімвалізуюць вечныя пачаткі існавання: Дабро і Ліха. Аднак моцы Дабра недастаткова, каб пераадоліць усё магчымае Ліха, бо на радзіме пратаганісту давялося супрацьстаяць латэнтнаму негатыву – кансерватыўным перакананням супляменнікаў. Тут героя чакалі паражэнне і трагічны фінал. Відавочна вынікае, што загаловак твора мае дадатковую сумную іранічную канатацыю-характарыстыку Кіма.

Звернемся да другой празаічнай групы быкаўскіх апавяданняў з канцэнтрычнай сюжэтабудовай. Сюды ўваходзяць філасофска-алегарычныя прыклады, у якіх аддаецца перавага псіхалагічнаму раскрыццю персанажаў. Аўтар імкнецца паказаць унутраны свет герояў, асаблівасці іх светабачанняў, думкі і перажыванні ў пэўных жыццёвых абставінах.

Сюжэты такіх апавяданняў будуюцца варыянтна: а) асноўныя перыпетыі звязаны з гістарычна аддаленымі перыядамі (“Галоўны крыгсман”, “Насарогі ідуць”), б) пісьменнікам ствараецца алегарычны свет з адпаведнымі героямі (“Вуціны статак”, “Кошка і мышка”, “Хвастаты”), в) прыпавесційна змадэляваныя мастацкія карціны характарызуюцца храна-топнай набліжанасцю да беларускай сучаснасці (“Труба”, “Сцяна”, “Музыка”).

У межах данай групы апелюем да апавядання “Мурашкі”, дзе галоўная гісторыя і вобразы з’яўляюцца максімальна абагульненымі, пафілософску ёмістымі, а стыль твора сінкрэтычна знітоўвае рэалістычнасць і біблейскую іншасказальнасць. Тут раскрываецца праблемы амаральнасці існавання чалавечага грамадства, яго шкоднасці, адмежаванасці ад існых імператываў прыроды. Пан Бог, назіраючы за ўласным светам з бясконцымі войнамі, пачынае вагацца, ці варты чалавек статусу лепшага стварэння на Зямлі. У выніку здзяйсняецца своеасаблівы дослед-назіранне, пасля якога сусветная супольнасць павінна ўсур’ёз задумацца адносна будучыні. Прадстаўленыя ў апавяданні мастацкія карціны і вобразы раскрываюць аўтарскую гуманістычную пазіцыю, надаюць ёй асаблівую глыбіню і пераканаўчасць.

Такім чынам, прааналізаваўшы ідэйна-стылявыя асаблівасці філасофска-алегарычных апавяданняў Васіля Быкава, можна вылучыць іх наступныя заканамернасці:

1. У кожным з прааналізаваных празаічных прыкладаў прадстаўлена невялікая колькасць персанажаў (не больш за тры). Пазбяганне аўтарам шматвобразнасці тлумачыцца імкненнем найбольш істотна, дэталёва раскрыць сутнасць персанажа як носьбіта пэўных ідэй і маральных якасцяў.

2. Статычнасць з’яўляецца дамінуючай уласцівасцю характараў мастацкіх герояў. Гэта дазваляе чытачу ўсвядоміць алегарычнага персанажа як носьбіта пэўнай маральнай якасці, у сувязі з гэтым больш глыбока асэнсаваць яго псіхалогію і агульную мастацкую падтэкставасць, а аўтар атрымлівае магчымасць больш выразна сцвердзіць канцэптуальную ідэю.

3. Усе апавяданні прысвечаны раскрыццю маральна-этычных заган грамадства, прычым Быкаў звяртаецца да асэнсавання як праблем сучаснага яму жыцця, так і вечных пытанняў. Дадзеная асаблівасць указвае на імкненне пісьменніка даследаваць жыццё чалавецтва, выявіць яго недахопы. Дзеля дасягнення гэтай мэты Быкаў выкарыстоўваў значную колькасць адмоўных персанажаў і завяршаў многія апавяданні трагічна, што, думаец-

ца, правакавала большае суперажыванне чытачоў і павялічвала рэцэпцыю мастацкіх прыкладаў.

4. Нават у падзейна насычаных творах істотнае месца належыць псіхалагізму. Дадзеная асаблівасць абумоўлена аўтарскім рашэннем паглыбіцца ва ўнутраны свет чалавека, раскрыць яго псіхалогію і знайсці ў ёй карані амаральнасці. Раскрыццё псіхалагічнага стану персанажа дазваляе Быкаву паказаць героя ў развіцці (дынаміцы) ад першага сутыкнення з праблемай да выніку яе ўплыву.

5. Для згаданых вышэй апавяданняў уласцівы просты сюжэт, у якім асвятляецца кароткі момант з жыцця персанажаў, лёсавызначальны і значны.

6. Характэрна пераважнае выкарыстанне старажытных і сярэднявечных акалічнасцей, мінімальная апеляцыя да падзей, блізкіх па часе. Дзякуючы такой часавай спецыфіцы Быкаў па-філасофску абстрагаваўся ад сучаснасці, засяроджваўся на “вечнасці” праблематыкі твора. Зварот да даўніны стаў багатай крыніцай вобразаў у алегарычным сюжэце, што ў сваю чаргу дазволіла зрабіць пэўную гісторыю агульназразумелай і падтэкстава сімвалічнай.

7. У якасці наратара ва ўсіх творах выступаў аўтар, ад імя якога вядзецца апавяданне і раскрываецца псіхалогія персанажаў, дзякуючы чаму чытачом выразна ўсведамляецца пісьменніцкая пазіцыя, а таксама аргументавана дэманструецца інтраспектыўны свет персанажа.

8. Загалоўкі большасці апавяданняў намінатыўныя, тут толькі называюцца цэнтральныя персанажы або сімвалы, адсутнічае характарыстычная інфармацыя. З гэтага вынікае, што аўтар пазбягаў непажаданых асацыяцый да прачытання твора і скіроўваў чытача да самастойнага аналізу псіхалогіі літаратурнага героя.

9. Ідэйна і жанрава матывавана імкненне Быкава адмежавацца ад канкрэтнага часу і месца дзеяння ў творы, пісьменніцкая схільнасць да выкарыстання алегарычных вобразаў жывёл і прадметаў-сімвалаў. Гэта тлумачыцца агульнасветавым маштабам праблематыкі, жаданнем пазбегнуць лакальнай сканцэнтраванасці на сучасным грамадстве.

10. Варта адзначыць і аўтарскае выкарыстанне міфалагічна-казачных сюжэтаў, якія таксама дазвалялі абстрагавацца ад канкрэтнай рэчаіснасці, узмацнялі канцэптуальнасць мастацкіх эпізодаў.

Прааналізаваная малая проза В.Быкава з’яўляецца адметным прыкладам сучаснага беларускага філасофска-алегарычнага апавядання.

В.І. Русілка (Віцебск)

ТВОРЧАЯ СПАДЧЫНА ВІЦЕБСКАГА ПАЭТА А. САЛТУКА

Віцебскі паэт Алег Салтук (1946–2015) пакінуў пасля сябе вялікі творчы набытак, сабраны ў кнігах “Пачатак дня” (1974), “Працяг” (1977), “Святло зямлі” (1982), “На далонях жыцця” (1989), “Трывога лёсу” (1996), “Не разлюбі...” (выбранае, 2004), “На вейцы веку” (2006), “Дзве зары” (2011), “Вяртанне” (2014), шматлікіх публікацыях у рэспубліканскіх перыядычных выданнях. Лаўрэат Літаратурнай прэміі імя У. Караткевіча, прэміі Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі, прэміі “Залаты Купідон”, вядомы журналіст, які большую частку свайго жыцця працаваў у абласной газеце “Віцебскі рабочы”, А. Салтук многія гады быў значнай асобай у культурнай прасторы краіны.

Матыў вернасці сваім вытокам, іх жыццядайнай сілы, заўсёдная заклапочанасць лёсам роднай зямлі і землякоў-вяскоўцаў, імкненне зверыць уласнае жыццё з запаветамі продкаў – асноўны ідэйны стрыжань паэзіі А. Салтука. Усёй сваёй творчасцю, удумліва-сцішанай і публіцыстычна завостранай адначасова, па-грамадзянску заклапочанай і філасафічна заглыбленай, паэт засведчыў, што ён мае права на ўласны духоўны запавет дзецям і ўнукам: “На ўсё жыццё малітвай стаць павінна, / Дзе б ты ні быў і што б ты ні рабіў: / Не разлюбі Айчыну і Жанчыну, / І Род свой, і Народ не разлюбі!” [1, с. 215].

У праграмным вершы “Не разлюбі”, які даў назву кнізе А. Салтука, са спакойнай і годнай упэўненасцю сцвярджаюцца асноўныя жыццёвыя каштоўнасці, ад асабістага да ўсеагульнага. Нездарма словы Айчына і Жанчына, Род і Народ паяднаны ўнутранымі рыфмамі і напісаны з вялікай літары – яны для паэта святыні, якія неабходна берагчы.

У наш час такая адкрытая грамадзянскасць магла б успрымацца як нешта ўстарэлае, рытарычнае, аднак не ў кантэксце творчасці А. Салтука. Яшчэ ў 1983 г. крытык А. Кабаковіч справядліва зазначыла, што вершы адкрытага грамадзянскага гучання ў паэзіі А. Салтука прадыктаваны самой логікай светаадчування лірычнага героя. Паэт, які ўваходзіў у літаратуру ўжо сталым чалавекам, ніколі не мяняў сваіх перакананняў, не “перабудоўваўся” пад павевамі часу і не хаваў сваёй пазіцыі, нават калі яна ўспрымалася некім неадназначна. Ва ўсіх жыццёвых выпрабаваннях А. Салтук, па словах А. Русецкага, – “асоба з адкрытай і актыўнай творча-грамадзянскай пазіцыяй” [2, с. 190]. Магчыма, у гэтым і адбітак шматгадовай журналісцкай працы А. Салтука. Клапатліва працуючы над вершам, паэт праз увесь свой творчы лёс шчасліва пазбягаў драбнатэм’я і другаснасці, для яго заўсёды была ўласціва, па словах В. Яраца, “трывожная дабрыня ўспрыняцця жыцця” [3, с. 309]. Вершы А. Салтука шчодра заселены вобразамі канкрэтных людзей: вясковыя мудрацы – дзяды, ветэра-

ны мінулай вайны, бацька і маці, блізняткі сын і дачка, жонка, сёстры, сябры, равеснікі... І горкія рэаліі сённяшніх дзён: развядзёнкі, жабра́чкі... А. Салтук востра разумеў каштоўнасць кожнага жыцця, перажываў за нялёгкі лёс старых, якія мелі ад жыцця мала радасці і дажываюць лёс у адзіноце і чаканні ўвагі ад дзяцей альбо ў нязвыклых гарадскіх кватэрах. Паэт не стамляўся прасіць: “Не шкадуйце харошых слоў / Для людзей дарагіх...” [1, с. 246].

Матыў вяртання да вытокаў, роднай вёскі, бацькоў гучаў ва ўсіх кнігах А. Салтука, але ў апошніх зборніках ён выразна элегічны, што звязана і з асабістым (смерць маці), і з тым, што паміраюць, робяцца бязлюднымі вёскі (“Самота”, “Нічога нідзе не чутно”, “Хоць і дома, але зноў не спіцца”, “Таямніца”, “На карце вёскі больш няма...”). Уражваюць вобразы шмат разоў паўторанага “абымшэлага саду”, вёскі з “васьмі скасабочаных хат”, пасівелага сяла, па якім “тры начы і тры дні спраўляла памінкі завея” [1, с. 218].

Сімвалічны для паэзіі А. Салтука вобраз старога саду ў аднайменным вершы ўдала падкрэслены кампазіцыйнай знаходкай: апошні радок кожнага катрэна паўтараецца як першы ў наступнай страфе. Так у старым, запушчаным садзе пераплятаюцца карані і кроны дрэў, так у жыцці пераплятаецца пачатак і канец, маладосць і старасць, радасць і гора... Убачыць жа гэта дадзена толькі сапраўднаму паэту.

Ад маленькай радзімы паэт заканамерна пераходзіць да тэмы Айчыны, яе слаўнай гісторыі і няпростага сённяшняга дня. У лепшых вершах паэт пазбягае рыторыкі і дэкларацыйнасці дзякуючы шчырасці голаса і высокаму майстэрству вобразна-выяўленчага вырашэння тэмы: “Дзедаў тут стаяў калісьці дом. / Тут – таемнасць матчынага слова. / Тут мая Няпрадва, / Тут мой Дон, / Тут маё і поле Кулікова” [1, с. 108].

У гэтым вершы арганічна зліты і выразны зрокавы малюнак беларускага краявіду, і ўпэўненая, велічная інтанацыя, і асабісты ўспамін пра дзеда і маці, і дарэчная згадка гістарычных славянскіх каранёў.

Гістарызм мыслення, вернасць славянскім вытокам вызначаюць многія лепшыя вершы А. Салтука (“Беларусы”, “Памяці У. Караткевіча”, “Полацку”, “У вянок М. Багдановічу”, “Купалы Пакроўкі”, яркі і высока ацэнены крытыкай цыкл “Пскоўскія фрэскі”). У вершах апошніх гадоў тэма еднасці братніх славянскіх народаў – рускага, беларускага і ўкраінскага – становіцца асабліва актуальнай, гучыць па-мастацку пераканальна (“Тры волаты”, “Нам жыць не тужыць бы...”, “Як падступалі бітвы...”, “Ізборск”, “У Пскове – Русь...”, “Крыху пра сябе”).

У асобны набытак, значны як колькасна, так і якасна, вылучаюцца вершы на тэму Вялікай Айчыннай вайны, якая трывала ўвайшла ў генетычную памяць беларускага народа, як у памяць А. Салтука – праз лёс бацькі, цяжка параненага на вайне. У вершах на ваенную тэму А.Салтук выяўляе сябе сапраўдным майстрам паэтычнай дэталі: асколкі і ржавыя кулі ў дрэве,

бацькаў баявы медаль, што стаў цацкай для дзіцяці, пірамідкі помнікаў паабапал віцебскіх дарог, зарослыя акопы ў лясах... Кожная са шматлікіх дэталяў дае пачатак і пачуццёвую аснову разважанню: нашчадкі павінны захаваць тое, за што бацькі змагаліся не шкадуючы жыцця. З палемічнай завостранасцю думка гэтая сцвярджаецца ў паэме "Світальныя росы".

І ўсё ж калі ўважліва ўчытваешся ў паэзію А. Салтука, то заўважаеш, што ў ёй пераважаюць, не гучныя публіцыстычныя вершы, а ціхія рэфлексіі, напоўненыя філасофскімі пошукамі сэнсу чалавечага жыцця. ("Вечнасць", "Міг і вечнасць").

Паэт таленавіта, па-мастацку змястоўна паяднаў у сваіх вершах асабістае, сялянскае, побытавае з вечным, экзістэнцыйным: "жаць і жыць – як дыханне, як міг" [1, с. 161].

Вечнасць існуе ў вершах паэта ў цеснай еднасці з каханнем. З самага пачатку творчага шляху лірычнаму герою А. Салтука ўласцівы быў талент шчырага і прыгожага інтымнага пачуцця. Але калі малады паэт сцвярджаў эстэтыку шчаслівага кахання, то ў сталасці А. Салтук не хаваў ад чытача, што жыццё бывае даўжэйшым за каханне, і сапраўднае шчасце можна сустрэць і ў старасці, трэба захаваць толькі чулай душу. Эстэтыку позняга кахання сцвярджаць цяжэй, тым больш пры адсутнасці на тое беларускай літаратурнай традыцыі. Аднак інтымныя вершы сталага паэта – сапраўдная ўдача. Яны напоўнены трапяткім і асцярожна-далікатным пачуццём і напісаны як ціхая прачулая малітва: "Перабіраю пальчыкі, як пацеркі, / Твая рука ў маёй руцэ ляжыць" [1, с. 234].

Перавага сталасці ў тым, што паэт думае перш за ўсё не пра сябе, а пра каханую, якую называе "і рабыня мая, і княгіня". Зразумелая і ўнутраная палемічнасць слова "далюбіць", і сімвалічны сэнс удалага ключавога вобраза, паўторанага ў вершы (пальчыкі – ружанец). А. Салтуку ўдалося захаваць маладую свежасць пачуцця і дапоўніць яе мудрасцю сталасці, "блакітны сон, ружовы дым" юнацкага кахання шчасліва перайшоў у восеньскае "полымя калін".

Паэзія А. Салтука заўсёды была пазбаўлена імкнення паспець за літаратурнай модай. Вернасць традыцыі, адсутнасць штучных эксперыментаў – творчая пазіцыя паэта.

Лірычнаму герою А. Салтука было ўласціва трывожнае светаадчуванне сучасніка, ён палемічна адкрыты ў сваіх грамадзянскіх і палітычных перакананнях ("Я – левы: за сэрца лявей / Няма, мой браток, анічога" [1, с. 211]), ён мудры ў клопаце пра сваю зямлю, продкаў і нашчадкаў, далікатна-шчыры ў каханні... А. Салтук выявіў сябе як паэт высокай культуры верша, верны класічнай традыцыі беларускай паэзіі, які віртуозна валодаў майстэрствам стварэння паэтычнага вобраза, сімвала, мастацкай дэталі, кампазіцыі, гукапісу. Гэта паэт-лірык, якому не чужы быў і эпічна-паэмны пачатак (паэмы "Вішнёвы вір", "Спатканне", "Смутак памяці",

“Святло і цені”, “Світальныя росы”); перакладчык з рускай і ўкраінскай моў. Яго творчасць займае пачэснае месца ў беларускай паэзіі.

Літаратура

1. Салтук, А. Не разлюбі... / А. Салтук. Выбранае. – Мінск: Бел. кнігазбор, 2003. – 288 с.

2. Русецкі, А. У трывозе за Радзіму / А. Русецкі // Полымя. – 2003. – №8. – С. 189 – 193.

3. Ярац, В. Давяраючы перажытаму / В. Ярац // Полымя. – 1997. – № 8. – С. 307–310.

І.В. Саматой (Віцебск)

ЖАНЧЫНЫ БЕЛАРУСКА-ПОЛЬСКАГА ПАМЕЖЖА Ў ПРОЗЕ МІРЫ ЛУКШЫ

Паняцце “літаратура беларускага замежжа”, якое цесна ўвайшло ў шырокі ўжытак на пачатку 90-х гадоў XX ст., у першую чаргу суадносяць з творчасцю пісьменнікаў так званага “далёкага” замежжа – ЗША, Канады, Аўстраліі. Але ж беларуская літаратура развівалася ў маштабе ўсёй беларускай дыяспары, у тым ліку і польскай – на Беласточчыне, зямлі, на якой спрадвеку жылі беларусы. На пачатку XX стагоддзя беластоцкая літаратура не прызнавалася як арганічная частка беларускай літаратуры, нягледзячы на тое, што гэта зямля мела свае даўнія культурныя і кніжныя традыцыі, вылучыла са свайго асяроддзя многіх таленавітых паэтаў, пісьменнікаў, публіцыстаў. Агульнае і спецыфічнае стала відавочным у канцы пяцідзясятых гадоў, калі Беласток стаў адметным беларускім літаратурна-выдавецкім цэнтрам па-за межамі Бацькаўшчыны. Сведчанне гэтаму – выхад 3 сакавіка 1956 года газеты “Ніва”, стварэнне ў 1958 годзе Беларускага літаратурнага аб’яднання, якое пазней атрымала назву “Белавежа”, выхад шматлікіх альманахаў, часопісаў, кніг найбольш таленавітых аўтараў. І ўсё ж, нягледзячы на такое бурнае, плённае развіццё, беластоцкая літаратура пэўны час не прызнавалася афіцыйным беларускім літаратуразнаўствам. У апошнія гады ўзрасла зацікаўленасць да творчасці пісьменнікаў блізкага замежжа. Выйшаў шэраг літаратуразнаўчых прац, прысвечаных вывучэнню асноўных заканамернасцей і тэндэнцый развіцця сучаснай беластоцкай літаратуры (артыкулы А. Марціновіча, У. Гніламёдава, У. Конана, М. Тычыны, Т. Занеўскай, Г. Тычко, Г. Твараповіч, Л. Рублеўскай і інш.).

Літаратуру Беласточчыны многія даследчыкі (У. Конан, Я. Чыквін) параўноўваюць з літаратурай беларускіх адраджэнцаў пачатку XX стагоддзя ў плане стварэння архетыпу нацыі, неабходнага для яе самасцвярджэння ў кантэксце сусветнай культуры. Пацвярджэннем таму, як захаваўся, высвеціўся гэты архетып на разломе часу (старэнне і гібель вёскі, дэградацыя яе жыхароў, урбанізацыя горада-мегаполіса), з’яўляецца творчасць

такіх таленавітых беластоцкіх літаратараў, як Сакрат Яновіч, Ян Чыквін, Алесь Барскі, Віктар Швед, Надзея Артымовіч, Міра Лукша і інш. Змест іх твораў адзначаны пранікненнем у духоўны свет сучасніка, тонкім псіхалагізмам і заглыбленасцю ў даследаванне культурных традыцый і маральных праблем.

Літаратурная творчасць Міры Лукшы – журналісткі, празаіка, паэткі – прыкметная з'ява беларускамоўнага пісьменства ў Польшчы. Чытачу добра знаёмы яе празаічныя кнігі "Дзікі птах верабей" (1992), "Выспа" (1994) "Дзяўчынка і хмарка", (2000), "Бабскія гісторыі" (2001), "Гісторыі з белага свету" (2008) і паэтычныя зборнікі "Замова" (1993) і "Ёсць" (1995), "Жывінкі з глыбінкі", (2006), а таксама публікацыі ў часопісах "Першацвет", "Маладосць", "Тэрмапілы", газетах "Голас Радзімы", "Літаратура і мастацтва", "Ніва".

У паэзіі Міра Лукша-эксперыментатар, дзе слова мае поўную свабоду, дзе любая з'ява праяўляецца ў шматзначнасці, а сутнасць кожнай рэчы сваімі каранямі сягае ў вечнасць. У прозе ж не адмаўляе элементаў традыцыйнасці, а яе элегічныя апавяданні працягваюць традыцыі "нашаніўскай" навелістыкі. Глыбокія і трагічныя апавяданні Міры Лукшы з уласцівым ім схаваным псіхалагізмам прасякнуты мясцовым каларытам, які выяўляецца ў спалучэнні агульнанацыянальнага беларускага і адметнага, непаўторнага беластоцкага. Аб'ектам даследавання кароткіх апавяданняў з'яўляецца гістарычны лёс і сучаснае жыццё беларусаў, што жывуць у Польшчы, псіхалогія чалавека польска-беларускага памежжа.

Пераважная большасць герояў элегічных апавяданняў Міры Лукшы – жанчыны беластоцкіх вёсак, якія жывуць у складаны, няпросты час. Даследуючы іх характар, звычаі, лёсы, аўтар стварае цэлую галерэю псіхалагічных жаночых партрэтаў, сярод якіх пераважная большасць немаладых жанчын беластоцкай правінцыі, адкуль бярэ вытокі вечная мудрасць жыцця, дзе цесна перапляліся мінулае і сучаснае, старое і новае, жыццё і смерць. Вельмі ўдалымі атрымліваюцца партрэты старых, якія з'яўляюцца цэнтральнымі персанажамі апавяданняў. Пра іх жыццё расказвае аўтар або блізкі да героя чалавек. Вось, напрыклад, старая Тэкля "з чыстай душой ягняці" [1, с. 11], якая выгадавала семярых дзяцей, з кожнай нявестай дзялілася жаночымі сакрэтамі і ўласным вопытам. Памерла раптоўна, перад вяселлем малодшанькага, так і не даўшы згоды на шлюб сына з практычнай сквапнай Манькай, якая не мела патрэбы выслухоўваць парады свекрыві з "замурзанага хутара" [1, с. 12].

Здзіўляе сваёй сучаснасцю ўрбанізаваная бабуля, якая і ў Амерыцы была, але імкнецца да роднай хаты, да сваіх каранёў, ды і мужчына ёй спадабаўся, зноў жа свой, беларус ("Дом Паўліны"). Каб вылечыцца ад настальгіі, імчыцца на сваім васільковым "пэжо" яшчэ адна пажылая паязджанка Ліза аж з Парыжа да роднай вёскі Каўтух, якую пакінула трыццаць гадоў назад: "Ад сораму не магла сюды сабрацца, і страшна было.

А як жа мне хацелася вырвацца хоць на дзень з таго Парыжа, пахадзіць па грудках над Нарвай, пасядзець пад Ліпай… І дочкам паказаць зямлю, што ў Францыі нарадзіліся. Там іх Айчына” [1, с. 90] (“Ліза вярнулася ў Каўтух”).

Складаны лёс і гераіні Барбушы (“Барбуша”). Пасівела “ў маладосці, раптам, у адну ноч, казалі, калі яе хлопца ва Усходняй Прусіі немец забіў” [1, с. 5]. А падчас яе вяселля застрэліўся Герасім, малады хлопец, які вельмі кахаў Барбушу. Таму і жыла ціха, як не было яе, з вялікім цяжарам на сэрцы.

З неадпушчаным грахом доўга памірае дзявяностагадовая Катрына, “маленькая, сухенькая бабулька з сарамлівай усмешкай і добрымі вачыма” [1, с. 79] (“Камень”). Каменем на сумленні ляжыць віна за загубленае каханне лепшай сяброўкі Надзейкі. Урослы ў зямлю амшэлы валун за старой клуняй – сведка многіх гісторый і здарэнняў на гэтай зямлі.

З уласцівай ёй драматычнай вастрынёй, якая часам узмацняецца да трагічнага гучання, Міра Лукша разважае пра лёс вёскі і яе жыхароў, не ідэалізуючы вясковы побыт, бачыць задушанасць сялян працай і аб’ектыўнае імкненне жыць лепш, разумее трагедыю адзінокай душы.

Настрой большасці твораў Міры Лукшы мінорны, сумны, нават балючы. Асабліва ў тых апавяданнях, калі персанаж сам кажа пра сабе. Пісьменніца добра валодае сказавым стылем. Напрыклад, у апавяданні “Бабка Тахвіля, як дрэўца, павыкручванае ад старасці” жанчына, якая шмат пабачыла на сваім вяку, распеўным голасам ды іранічна-павучальным тонам выказваецца пра сённяшняе жыццё: “Але што праўда, то праўда – жывот патрэбен, калі чалавек на пасадзе. Ты адразу бачыш – які важны пан. Калі б і захацелі яго адтуль выкінуць з-за гэтага стала, то цяжка – важыць гэта бестыя нямала! А ў каго жывот вялікі, у таго і голас найчасцей адпаведны” [1, с. 43].

Маналогі старых жанчын аб іх жыццёвых універсітэтах, аб непатрэбнасці ў жыцці, аб адзінокай старасці, аб іх вінаватасці перад гарадскімі дзецьмі, якія “родную мову плюгавяць” [1, с. 66], гучаць у кароткіх апавяданнях “Дзетачка мая”, “Хто мяне так навучыў?”, “Гандзя”. Споведзь старасці і адзіноты, калі ў суседзях толькі напаўгалодны пацук, – так можна назваць гэтыя маналогі.

Асобную групу складаюць апавяданні, прысвечаныя праблемам сям’і, выхаванню дзяцей, у якіх зноў жа на першае месца выступаюць жанчыны. Няўдалае асабістае жыццё, пакручасты лёс аб’ядноўваюць працавітую прыгажуню Нінку, якой выракся сын (“Нінка, адно жыццё”), і мнагадзетную Зінку-пакінду, якая не выносіць адзіноты, шукаючы сваю долю (“Каму шчасце”), няшчасную Веру, якую цудам не загубіў разам з сынам муж-злодзей, і безыменную кабету-знахарку з апавядання “Душагрэйка”, забытую богам і людзьмі. Пісьменніца арганічна перадае

псіхалагічныя нюансы чалавечай асобы, таму верыцца, што гэтыя людзі сапраўды жылі ці жывуць.

Міру Лукшу хвалюе праблема маладога пакалення, якое цывілізацыя забірае з вёскі ў Беласток, Варшаву ці нават у Амерыку, Нямеччыну. На іх шляху сустракаюцца боль і горыч, якія нельга зразумець і растлумачыць. Таму няма ўзаемапаразумення паміж Нінкай і яе дачкой Данкай (“Сірата”), таму і бяжыць ад кахання маладзенькая Лілька, памятаючы горкі вопыт сваёй маці (“Сланечнік”). Маладыя не хочуць паўтараць памылак сваіх бацькоў, з усіх сіл імкнуцца ў горад, у іх не прынята пытацца дзе хто працуе, яны стараюцца “прыручыць час” [1, с. 49], які, кажучы радкамі з верша Міры Лукшы, “згарае ў вечары жанчыны”.

Праўдзівая рэальнасць, дакументалізм не зніжаюць мастацкую вартасць прозы пісьменніцы. І ў прозе яна застаецца паэтам. З вялікай павагай, асцярожнасцю, спагадай ставіцца да прататыпаў сваіх гераінь, якія часам жывуць зусім не ў паэтычных абставінах, але паэзія жыве ў іх уражаннях, жаданнях спасцігнуць сябе як непаўторную, непадзельную цэласнасць у гэтым свеце: “Такі свет прыгожы, светлы, чуеш – ён нават і называецца падобна: свет. І тым больш горка робіцца на душы, калі ты адзінокі, не маеш з кім усім дабром сваёй душы падзяліцца” [1, с. 26] (“Дзетачка мая…”).

Літаратура

1. Лукша, М. Дзікі птах верабей / М. Лукша. – Беласток: Белавежа, 1992. – 82 с.

А.А. Сафронава, С.П. Дабіжы (Горкі)

АСАБЛІВАСЦІ РЫТУАЛАЎ ВАРАЖБЫ НА ПАЛЕССІ

Варажба як адзін з самых істотных кампанентаў традыцыйнай духоўнай культуры беларусаў уяўляе сабой абрады і рытуалы, якія павінны былі прадказаць будучыню ці неабходныя паводзіны чалавека з дапамогаю звышнатуральнай сілы.

Разглядаючы рытуалы варажбы на Палессі, можна ўмоўна выдзеліць дзве групы варажбы: па-першае, варажба гаспадарчая, накіраваная на атрыманне ведаў пра будучы ўраджай, прыплод жывёлы; па-другое, варажба пра ўласнае здароўе, час смерці, а таксама пра важныя падзеі ў сям’і, пра лёс і замужжа. Абедзве групы варажбы закранаюць інтарэсы як кожнага пэўнага чалавека і яго сям’і, так і ўсёй вёскі ў цэлым.

У рамках каляднага перыяду можна варажыць у любы дзень, але большасць варожб, якія лічацца ў народзе “дакладнымі”, адбываецца на Каляды, на Шчадрэц, на Вадохрышча, гэта значыць у тэрміны, больш пэўна адзначаныя знакам мяжы, пераходу ад старага да новага.

На Палессі найбольш распаўсюджана варажба на Каляды. Прымеркаванасць варажбы менавіта да Калядаў абумоўлена спецыфікай гэтага часу: Каляды – гэта пераход ад старога да новага, калі, згодна з народнымі

ўяўленнямі, знікае мяжа паміж светам жывых і мёртвых, людзей і нячыстай сілы, калі ўзнікае магчымасць кантакту чалавека з “іншым” светам, дзе, як лічылася, пішуцца лёсы людзей.

Спрыяльнымі для дасягнення мэтаў варажбы лічыліся месцы нежылыя, «пагранічныя»: печ, парог, вароты, ростані і інш. [1, с. 67].

На Палессі часта адбывалася варажба ля калодзежа: замыкалі калодзеж, «дзеўкі вады бралі, коб жэніха ўстрэціць» (Верхні Церабяжоў, Адрыжын); на Новы год ля калодзежа рассыпалі збожжа: хто першы пройдзе, за таго і замуж ісці (Харомск). На дзень святога Васіля (19 снежня, ці 12 студзеня па ст. ст.) сеялі лён каля калодзежа (Дружылавічы); на дзень святога Андрэя сеялі каноплі (Аздамічы).

Дзяўчаты і незамужнія жанчыны варажылі пра свой лёс, суджанага, час і месца замужжа, выкарыстоўваючы наступныя атрыбуты: хлеб, соль, лучыну, куццю, нож, лыжкі, стары абутак; зорнае неба; саломінкі.

Любоўная варажба, у якой звычайна ўдзельнічала некалькі дзяўчат, адбывалася ў час зімовых святаў: на Каляды (Верхні Церабяжоў, Аніскавічы, Опаль, Адрыжын, Аздамічы); на Шчадрэц (Верхні Церабяжоў, Адрыжын); на Новы год (Дружылавічы); на Хрышчэнне (Верхні Церабяжоў), а таксама на Андрэя (30 лістапада, ці 13 снежня па ст. ст.), а таксама на Купалле.

Асаблівая роля ў варажбе належыць хлебу – сімвалу шчасця і дабрабыту. З хлебам пра замужжа і лёс варажылі на Шчадрэц. Трэба было адкусіць хлеба і выйсці на вуліцу паслухаць: дзе сабака забрэша, у той бок замуж ісці (Адрыжын); выпякалі хлеб і бралі яго з сабой на двор, назіралі, чый хлеб выбраў сабака, тая дзяўчына першая замуж выйдзе (Опаль).

Варажылі пра лёс або пра якія-небудзь важныя жыццёвыя сітуацыі з дапамогай хлеба, солі і лучыны (часам элементы мяняліся): над імі трымалі нітку, калі яна хістаецца ў бок хлеба і солі – гэта добра, добры знак, а калі нітка паварочвалася на лучыну – дрэнна (Аздамічы, Харомск).

З лыжкамі і куццёй варажылі на Каляды: куды ўпадзе лыжка, туды замуж пойдзеш (Урбаны); на Шчадрэц (лыжкі ўтыкалі ў куццю: чыя лыжка перавернецца, той памрэ (Опаль, Боркі, Дастоева).

Дзяўчаты выходзілі на вуліцу з рэшткамі куцці і слухалі, «дэ сабака забрахае, буде жаніх»; пад галаву клалі куццю: хто прыйдзе ў сне есці куццю, той і жаніх; кідалі лыжкі праз хату: калі пераляціць, значыць, выйдзе дзяўчына замуж; на стол кідалі лыжкі: чыя лыжка ўпадзе далей ад краю стала, тая дзяўчына далей ад дома замуж пойдзе; лыжкі ўтыкалі ў куццю, потым вынімалі і глядзелі: на чыю лыжку больш куцці наліпне, тая дзяўчына будзе багацейшая за ўсіх сваіх сябровак.

Са старым абуткам варажылі на Новы год: дзяўчаты кідалі «пасталы» і глядзелі: у які бок павернецца, туды дзяўчына замуж пойдзе (Верхні Церабяжоў); дзяўчаты абуваюцца навыперадкі і глядзяць, якая хутчэй абуе «пасталы», тая хутчэй замуж выйдзе (Дружылавічы); пасля «проводнэй

ніділі» (тыдзень пасля Вялікадня) неслі пасталы за вёску, там кідалі іх і глядзелі: у які бок яны павернутыя, у той бок выйдзе дзяўчына замуж (Адрыжын).

Увогуле здыманне абутку ў народнай культуры цесна звязана з разуменнем ступні як мяжы, той кропкі, якая наўпрост злучае чалавека з нізам, з іншасветам, забяспечвае максімальна поўнае далучэнне да звышнатуральнага [1, с. 50].

Праводзілі варажбу з божай кароўкай, бралі яе ў руку, загадвалі жаданне або задавалі пытанне пра каханне і замужжа, потым адпускалі і глядзелі: куды паляціць, туды і замуж ісці.

Варажылі і па зорным небе: у які бок скоціцца зорка, там жаніх (Радчыцк); калі зорка на небе схаваецца, то ў жыцці дзяўчыны будуць сур'ёзныя непрыемнасці або цяжкасці; калі зорка пачне рух, закружыцца або паляціць – поспех і шчасце (Верхні Церабяжоў).

Салому ці сена клалі на Каляды пад абрус і выцягвалі з-пад яго па адной саломінцы: чым раўнейшая і таўсцейшая саломіна, тым лепшы і багацейшы будзе ў дзяўчыны жаніх (Верхні Церабяжоў); чым даўжэйшая выцягнутая саломінка, тым даўжэй жыць будзе варажбітка (Азераўцы).

Варажылі нават "на сустрэчы". Калі на Каляды ноччу сустрэнеш мужчыну, выйдзеш замуж; цяжарная жанчына сустрэне мужчыну – народзіцца хлопчык, а жанчыну – народзіцца дзяўчынка (Верхні Церабяжоў, Харомск); калі ў гаспадыні целіцца карова, то будзе бычок або цялушачка, у залежнасці ад таго, каго сустрэнеш на вуліцы – мужчыну ці жанчыну (Аздамічы).

На другім месцы па папулярнасці і важнасці была варажба пра ўраджай. Праводзілі яе, выкарыстоўваючы наступныя атрыбуты: хлеб, куццю, стары абутак, зорнае неба, салому.

Вясной з хлебам ішлі ў поле, стараліся вызначыць, які будзе ўраджай: на Юр'я (6 траўня) з караваем ішлі ў поле, глядзелі, калі каравай хаваецца ў жыце, значыць, ураджай будзе добры (Аніскавічы); на Юр'я з хлебам абыходзілі жытняе поле (Дружылавічы, Опаль); на Купалу хлеб адносілі ў поле, пакідалі там.

Па зорным небе перад Калядамі вызначалі, ці будзе год ураджайны: калі шмат зор, то ўраджай будзе на збожжа (Харомск, Адрыжын). На Каляды, калі выцягвалі з-пад абруса салому ці сена, вызначалі ўраджай: хто выцягваў доўгую саломіну, у таго лён даўжэйшы будзе (Аніскавічы, Урбаны, Харомск, Адрыжын). Каб лён вырас добры не толькі варажылі, але і выконвалі некаторыя магічныя дзеянні: на Масленіцу каталіся з гары на санках і імкнуліся праехаць як мага далей (Урбаны); у насенне лёну клалі яйка як сімвал жыцця і пладароддзя (Адрыжын); апошнюю польку танцавалі «на лён» (Урбаны).

Калі ж сялянам хацелася даведацца, што ў новым годзе будзе добра расці, слалі абрус на стол, сыпалі рознае насенне, а раніцай, зняўшы абрус,

глядзелі: насенне якіх раслін застанецца на стале, тое і будзе добра расці (Аніскавічы). Як бачым, варажба выкарыстоўвае прыкметы паводле падабенства з чаканым або меркаваным.

Такім чынам, у вёсках Палесся, як і ў іншых рэгіёнах Беларусі, самай распаўсюджанай з'яўляецца варажба дзяўчат і жанчын пра далейшы лёс і замужжа. Цікава, што паўсюдна адзначаецца забарона на размовы падчас варажбы.

Ва ўсіх разгледжаных відах варажбы агульнымі з'яўляюцца атрыбуты, у ролі якіх выступаюць самыя звычайныя рэчы паўсядзённага сялянскага жыцця: хлеб, соль, куцця, стары абутак, саломіны і інш., якія ў працэсе варажбы набываюць новы, магічны сэнс. Тэхніка магічных аперацый пабудавана на ўстанаўленні адпаведнасці прадмета, атрыбута варажбы і яго значэнняў. Гэта адпаведнасць невыпадковая, паміж кожным знакам і яго інтэрпрэтацыяй ляжаць глыбокія светапоглядныя сувязі, якія абумоўліваюць сімвалізацыю адпаведнай рэаліі.

Літаратура

1. Беларуская міфалогія: энцыклапед. слоўн. / С. Санько, Т. Валодзіна, У. Васілевіч [і інш.] – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

2. Сержпутоўскі, А. Прымхі і забароны беларусаў-палешукоў / А. Сержпутоўскі. – Мінск, 1930. – 231 с.

О.Ф. Сенькова (Полоцк)

ОПЫТ ТРАНСФОРМАЦИИ АНТИТЕАТРА В СОВРЕМЕННОЙ АНГЛИЙСКОЙ И БЕЛОРУССКОЙ ДРАМАТУРГИИ

Переломный характер середины XX века нашел отражение не только в неоднородности и разобщенности социально-исторических контекстов, но и в многообразии художественных поисков. Драматургии, в силу её диалогической направленности, удаётся остро реагировать на изменения в обществе и, что не менее важно, транслировать эти метаморфозы наиболее актуальными средствами. 1950-е годы в Великобритании являются знаковыми как для всего литературного процесса, так и для театрального движения в частности: одновременно развивается бунтарская по своей природе драматургия «новой волны» (Джон Осборн, Арнольд Уэскер, Брендан Биэн, Роберт Болт) и продолжает набирать обороты эстетика театра абсурда (Самюэль Беккет).

Сходные историко-культурные тенденции наблюдаются и в белорусской драматургии в 1980–1990-е гг., когда в противовес устоявшимся, классическим пьесам начинают появляться первые драматургические опыты авангардного характера М. Араховского, И. Сидорука, А. Асташонка, Г. Богдановой и т.д. С одной стороны, это был вызов действительности, попытка осмыслить преобразования, обрушившиеся на человека начала

1990-х, с другой стороны, данный период характеризуется активным поиском новых творческих возможностей театра, попыткой «примерить» запрещенные «железным занавесом» западноевропейские тенденции. Поисковый характер драматургии, единичность возникновения экспериментальных пьес (многие авторы (Г. Богданова, И. Сидорук), по сути, вошли в историю современного литературного процесса как авторы одной пьесы) очерчивают начальный этап активного усвоения белорусской драматургией основных тенденций середины XX века. Несомненно, к основным приёмам, которые активно использовались белорусским театром указанного периода, относятся принципы театра абсурда.

Отметим, что и в английской драматургии под влиянием творческих открытий Самюэля Беккета наблюдаются тенденции усвоения опыта антитеатра, правда, в силу иных исторических особенностей, этот процесс выпадает на 1950–1960-е гг. Однако такое заимствование не вполне является целостным и поступательным, поскольку принципы, которые отразил Беккет в своём творчестве, усваиваются разными драматургами фрагментарно, воплощаясь в их индивидуальной манере: например, Джон Арден, драматург-реалист, улавливает и активно использует в своём творчестве мотивы угрозы, характерные для беккетовского театра, а творчество Нормана Симпсона вобрало в себя комическую составляющую абсурда.

Наиболее спорной фигурой, как развивающей беккетовские традиции, так и утверждающей собственный метод, является Гарольд Пинтер. Творчество Нобелевского лауреата 2005-го года представляет собой своеобразный синтез тенденций, присущих середине века, периоду, который называют «веком жестокости» [4, с. 40]. Примечательно, что драматург активно усваивает эстетические категории, характерные для творчества Беккета, однако трансформирует их, пропуская через натурализм действия (пьесы *«Сторож»*, *«Кухонный лифт»*) и психологические установки героев и заданных ситуаций (пьесы *«День рождения»*, *«Комната»*). Гарольд Пинтер следует не внутренней логике абсурда, когда это является основополагающей установкой, но использует внешние атрибуты антитеатра: марионеточные персонажи, довлеющая неизвестность, схематичность действия, языковая игра.

Драма-фарс *«Кухонный лифт»* иллюстрирует более разнообразную палитру элементов антитеатра: перед нами двое наемных убийц, которые томятся в ожидании очередного заказного убийства. Мотив ожидания «враждебного неизвестного» ещё более заострен, чем в предыдущих пьесах. Однако в отличие от гнетущего ожидания неизвестности в беккетовской пьесе *«В ожидании Годо»* пьеса Пинтера наполнена динамикой действия и необычной метафоричной развязкой (неизвестной жертвой оказывается один из гангстеров). Пьесы британского драматурга отражают взаимодействие модернистского и реалистичного мироощущения. Исследователь Е.Г. Доценко считает, что «драматургию Пинтера привлекательно назвать пост-модернистской в буквальном значении этого сочетания» [2,

с. 25]. Такое утверждение вполне оправдано, поскольку драматургу в эпоху экспериментальных веяний органично удаётся сочетать опыт модернистского мироощущения с постановкой психологических проблем перед современной публикой.

Эстетические категории антитеатра явились не только способом утверждения нового белорусского экспериментального театра, но и прочной основой для дальнейших художественных поисков. Так, плавно перетекая в современное нам время, тенденции театра абсурда прослеживаются и в «новой» белорусской драме. Как отмечает исследователь С.Я. Гончарова-Грабовская, «эту генерацию авторов объединяет стремление отразить негативные социальные проблемы постсоветского общества в новых формах драматургического языка» [1, с. 200].

Среди драматургов, активно использующих авангардный метод, можно отметить П. Пряжко, К. Стешика, Н. Халезина, Д. Строцева и др. Однако принципиальным моментом является то, что в творчестве многих современных авторов абсурд выступает не единственным художественным ориентиром, а как и в английской драме, сосуществует с целым спектром эстетических решений. В пьесах современных драматургов абсурд нередко становится преимущественно сюжетообразующей схемой пьесы, той «зловещей константой положения героев, с которыми ничего не может произойти» [3, с. 106]. Например, в пьесе П. Пряжко *«Запертая дверь»* активных действий, на первый взгляд, много: герои Наталья и Валерий показаны и в семейной, и в рабочей среде, диалоги перемежаются вставками из дома престарелых либо смежным действием с другими героями – Олей, Димой, Славой. Это персонажи-марионетки, действующие по заданной схеме, пустота их «активной» жизни напоминает пьесы Беккета и Ионеско, однако авторская ирония, сквозящая по отдельным ремаркам и описательным вставкам, показывает, как комедийные и реалистичные тенденции, соприкасаясь с театром абсурда, органично выкристаллизовываются в «новую драму».

Схожие примеры демонстрируют и иные пьесы молодого автора: *«Урожай», «Жизнь удалась», «Радуга в моём доме»* и т.д. Отметим, что драмы П. Пряжко, сочетая грубую иронию и жёсткую манеру отображения действительности, по тональности весьма близки к ранним «комедиям угрозы» Гарольда Пинтера. С поздним же творчеством автора, пьесами, сконцентрированными больше на внутреннем мире человека, перекликаются драмы К. Стешика. Такие пьесы, как *«Мужчина – Женщина – Пистолет», «Спасательные работы на берегу воображаемого моря», «Время быть пеплом»* и др., фиксируют хрупкость человеческих отношений, одиночество и потерянность в этом мире. Как и в пьесах Пинтера (*«Предательство», «Легкая боль», «Лунный свет»*), в драмах белорусского драматурга показаны разрушенные отношения и безнадёжные семьи, однако, в противовес Пинтеру, белорусскому автору удаётся сохранить веру в способность человека преодолеть рутинность своей жизни и попытаться выбраться из заданных обстоятельствами рамок.

Несомненно, опыт ирландского драматурга Сэмюэля Беккета сыграл огромную роль при формировании английского театра второй половины XX века: «реформы в английской драме в течение полувека во многом отталкиваются от Беккета, демонстрируя при этом самостоятельную и бесспорную значимость художественного эксперимента» [2, с. 4].

Схожие мотивы находят себя как на раннем этапе становления экспериментального белорусского театра, так и в реалиях современности. Однако опыт трансформации основных принципов антитеатра (отсутствие сюжетного построения, схематичность персонажей, абсурд как единственная характеристика происходящего, корреляция комического и трагического, нагнетание статики и неопределенности, стремление подвергнуть зрителя «шоковой терапии» и т.д.) и в английской драматургии (в интерпретации Гарольда Пинтера), и в современном варианте «новой» белорусской драмы отражает индивидуальный авторский метод, помогает глубже понять национальную составляющую пьес. Так, в отличии от английских драм, решающих экзистенциальные проблемы человека, белорусские драматурги пытаются не только «диагностировать» проблемы, с которыми сталкивается современный человек, но и вывести его из статического состояния.

Таким образом, уникальный авторский опыт трансформации антитеатра репрезентирует многообразие художественных поисков и умелое сочетание реалистичной и модернистской парадигм художественности.

Литература

1. Гончарова-Грабовская, С.Я. «Новая драма» в современной русскоязычной драматургии Беларуси / С.Я. Гончарова-Грабовская // Русская и белорусская литературы на рубеже XX–XXI вв.: сборник научных статей. В 2 ч. Ч. 2 / под ред. С.Я. Гончаровой-Грабовской. – Минск: РИВШ, 2010. – С. 200 – 207.

2. Доценко, Е.Г. С. Беккет и проблема условности в современной английской драме: автореф. дис. на соиск. учен. степ. д-ра филол. наук: 10.01.03 / Е.Г. Доценко; [Урал. гос. пед. ун-т]. – Екатеринбург, 2006. – 39 с.

3. Лапин, И.Л. Компендиум по истории зарубежной литературы: Античность, Средневековье и Возрождение. Современность: курс лекций / И.Л. Лапин. – Витебск: УО «ВГУ им. П.М. Машерова», 2008. – 149 с.

4. Nicholson, S. Modern British Playwriting: The 1960's: Voices, Documents, New Interpretations / S. Nicholson. – London, Bloomsbury Publishing PLC, 2012. – 353 p.

Л.В. Скибицкая (Брест)

ОЧЕРК В СИСТЕМЕ РЕГИОНАЛЬНОЙ ПЕЧАТИ БРЕСТЧИНЫ: ЖАНРОВО-СТИЛЕВЫЕ ОСОБЕННОСТИ

О том, что газетный очерк сегодня переживает не лучшие времена, пишут отечественные и российские журналисты-теоретики (Л. Кройчик, А. Тертычный, М. Ким, др.), говорят практики (М. Шиманский [5], И. Лисочник, М. Токарева [1]). Бытует точка зрения о «смерти» этого жанра, объективные причины чему находят как в изменении жанровой систе-

мы современной журналистики, ориентированной на оперативное формирование новостного потока, так и в запросах аудитории, уставшей от идеологизированных очерковых героев советского времени.

В 2012 г. нами было проведено исследование тенденций функционирования очеркового жанра на материале прессы Беларуси и России («СБ. Беларусь сегодня» и «Известия», «Літаратура і мастацтва» и «Литературная газета») [4]. Результаты исследования продемонстрировали, что основные жанровые разновидности очерка (путевой, портретный, проблемный) в количественном отношении неравнозначно представлены в печатных изданиях Беларуси и России. Портретному и проблемному очеркам принадлежат ведущие позиции в жанровой системе современного очерка. Путевая разновидность редко появляется на страницах печатных изданий.

Статистика 2012 г. выявила еще одну закономерность: количество очерковых материалов хотя и снижается, однако о «смерти» газетного очерка говорить рано. Для подтверждения (или опровержения) данного тезиса мы обратились к исследованию тенденций функционирования очерка в жанровой системе региональной прессы. Эмпирическую базу составили выпуски региональных газет Брестчины «Заря», «Народная трыбуна» и «Вечерний Брест» за май-июнь 2015 г.

Региональная пресса – особая сфера СМИ, имеющая давние традиции, стремящаяся больше к сохранению, чем к отходу от устоявшихся канонов. В отличие от республиканской или специализированной прессы, аудитория региональных СМИ пространственно локализована и поэтому ориентирована на персонификацию материалов, что отражается и в жанровом контенте, в котором преимущество должно быть за очерковыми и эссеистическими материалами, в наибольшей степени воплощающими персонифицированное начало.

Периодичность каждой из вышеназванных газет разная: «Заря» выходит три раза в неделю, «Вечерний Брест» – дважды, «Народная трыбуна» – один раз. «Уравнивающим» публикационные возможности изданий фактором выступает наличие у каждого из них сайта, где у редакции есть возможность восполнить жанровые перегибы или пробелы, не ограничиваясь жесткими рамками газетной полосы.

Согласно статистике, в 16 выпусках газеты «Вечерний Брест» опубликовано за указанный период 7 очерковых материалов, в 22 выпусках «Зари» – 18 текстов, в 10 выпусках «Народнай трыбуны» – 5 текстов. И если в отдельных номерах газеты «Заря» публикуется более 4 очерковых материалов (например, № 68 от 20.06.2015), то в выпусках остальных изданий (не в каждом) появляется только один подобный текст. Причина состоит как в периодичности выхода газеты (это актуально прежде всего для «Народнай трыбуны»), так и в политике издания (характерно для газеты «Вечерний Брест»).

Областная газета «Заря» – ведущее периодическое издание, формирующее жанровые тенденции региональной прессы региона, имеющее славные традиции, в том числе и в очеркистике. И в настоящее время редакция газеты сохраняет тенденцию писать «о людях, а не о процессах». В то же время 22 текста в этой газете, которые мы маркировали как очерковые, достаточно разнородны по своей структуре. Так, в № 68 от 20.06.2015 г. напечатано 6 материалов очеркового характера. Однако только один из них соответствует канонам классического жанра – это текст И. Орловой «Папа, папочка, папуля» [2], занимающий целую полосу газеты.

Публикация представляет собой проблемный очерк, где рассказывается история отца-одиночки, который после трагической гибели жены не опустил руки, а постарался сделать так, чтобы ребенок вырос «психически здоровым человеком» [2]. В центре повествования оказывается история обычного человека. Журналист уже в лиде подчеркивает обычность героя: «На встречу с журналистом он долго не соглашался – не публичный, мол, человек» [2]. В то же время в тексте совершенно отчетлива публицистическая установка автора, которая побудила этого «непубличного» человека рассказать свою историю: «Перевесило единственное обстоятельство: возможно, приобретенный им жизненный опыт пригодится еще кому-то» [2].

Текст Л. Охремук о враче-комбустиологе Светлане Воронцовой (№ 68. – 20.06.2015. – С. 8) можно атрибутировать как портретный очерк (в советской прессе такие очерки назывались производственными, поскольку персонажами выступали люди разных профессий). Информационный повод – День медика. В очерке рассказывается о специалисте, оказывающем пациенту медпомощь, в том числе и хирургическую, при термических травмах. В отличие от предыдущего, в данном тексте собственно очерковая часть касается только обрисовки личности героини, выражается в попытке журналистки углубиться в мотивацию выбора героиней этой сложной профессии и занимает примерно треть текста. Основная же часть – рассказ о деятельности ожогового отделения, в котором работает врач-комбустиолог.

Как очерки историко-культурного плана можно определить тексты С.Романюка «За день до войны» (№ 68. – 20.06.2015. – С. 3), Л. Курашовой «Попало детство под бомбежку» (№ 68. – 20.06.2015. – С. 5).

Подобные материалы печатает и газета «Вечерний Брест» в авторском проекте В. Сарычева «В поисках утраченного» (за исследуемый период опубликован один текст (№ 42, от 29.05.2015)). В историко-культурных очерках существенен перевес в сторону документализма, а художественно-публицистическая составляющая остается в подтексте.

На сайте «Вечернего Бреста» (в отличие от газеты) есть немало проектов, где публикуются материалы очеркового характера. Так, в рубрике «Фамильный след» (ведет историк по образованию Б. Павловский) представлены историко-культурные очерки о знаменитых личностях региона,

оставивших на этой земле свой «фамильный» след. О земляках, которые прославили Брест во второй половине XIX – первой половине XX веков, пишет Ю. Рубашевский (проект «Портрет на фоне 1000-летия»). Некоторые из них дублируются, как, например, текст о Д.М. Карбышеве, фортификаторе Брест-Литовской крепости. Очерк сначала появился на газетной полосе (№ 35. – 06.05.2015. – С. 6), а потом и на сайте газеты [3].

Однако газетный очерк как жанр обращен не столько к истории, сколько к современности и к современникам. Таких публикаций в газете «Вечерний Брест» три из семи. Это портретная зарисовка Д. Шиферштейна «Кузнец далекой Победы» (№ 38. – 15.05.2015. – С. 7), производственно-портретные очерки Б. Павловского «“Тайны следствия” от Михаила Дворака» (№ 50. – 29.06.2015. – С. 4) и К. Богдановой «Мою мечту реализовали в Сорбонне…» (№ 48. – 19.06.2015. – С. 5). Два последних текста по своей структуре подобны материалу Л. Охремук из «Зари» и также приурочены к профессиональным праздникам. Специфика данных очерков состоит в том, что герой интересен журналисту как «специалист» в своей сфере, а индивидуально-личностные качества персонажа отступают на второй план. Отсюда – усиление аналитического и репортажного начал и снижение роли очерковой составляющей. Такое соотношение не делает текст некачественном по исполнению – напротив, в рамках поставленной цели и в соответствии с инфоповодом эти публикации выполняют свою функцию. В то же время ощущается определенный композиционный и содержательный дисбаланс в подаче фактического материала, в результате которого личность, индивидуальность человека затемняется внешними факторами. Для сравнения: в небольшой по объему портретной зарисовке Д. Шиферштейна, повествующей о сельском кузнеце, на первый план выходит личностный «фокус» как композиционный прием, который заявлен автором уже в заголовке.

В структуре областной газеты «Народная трыбуна» очерк занимает свою нишу. Почти в каждом втором выпуске публикуются материалы этого жанра. Кроме указанных выше разновидностей очерка (портретный, историко-культурный, производственный), в этой газете есть рубрика «Непрыдуманыя гісторыі», где размещаются тексты, жанр которых можно определить как художественно-публицистические рассказы – это своеобразный аналог жанра житейской истории, активно завоевывающего пространство современной прессы. В подобных текстах документальная составляющая обозначена в рубрике («Непрыдуманыя…»), а основу повествования составляет типизированное воссоздание реальной жизненной ситуации. Возможно, это один из путей, по которым будет развиваться очерк, прежде всего проблемный.

Как видим, анализ контента региональных изданий Брестчины показывает достаточно устойчивые позиции очерковых материалов в жанровой структуре исследуемых газет. Классический журналистский жанр адапти-

руется к меняющимся социокультурным условиям и остается на газетной полосе.

Отметим и такую тенденцию: очерк на страницах региональной прессы стремится к созданию положительного образа человека, что можно, с одной стороны, объяснить развитием очерковой традиции, с другой – потребностью социума, уставшего от негатива и чернухи, в образцах, примерах жизненного поведения.

Модель газетного очерка в региональной прессе характеризуется жанрово-стилевым полифонизмом, что обусловлено общими для журналистики процессами диффузии и интерференции.

Литература

1. Ким, М.Н. Жанры современной журналистики / М.Н. Ким. – СПб. : Изд-во Михайлова В.А., 2004. – 336 с.

2. Орлова, И. Папа, папочка, папуля… / И. Орлова // Заря. – № 68. – 20.05.2015. – С. 10.

3. Рубашевский, Ю. Дмирий Михайлович Карбышнв. Четыре войны – одна крепость / Ю. Рубашевский // Вечерний Брест: региональный новостной портал [Электронный ресурс]. – Режим доступа :http://www.vb.by/society/history/karbyshev.html. – Дата доступа : 14.10.2015.

4. Скибицкая, Л.В. Эволюция современного газетного очерка (на примере белорусских и российских печатных изданий) / Л.В. Скибицкая// Культура основа славянского братства: сб. материалов науч. конф. / под ред. И.А. Прихожан, В.И. Супруна. – Волгоград, 2012. – С. 212 – 216.

5. Шиманский, М. Его величество очерк, великолепный и забытый / М. Шиманский // БСЖ [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://bsj.by/2012/03/mixail-shimanskij-ego-velichestvo-ocherk/. – Дата доступа: 15.10.2015.

В.У. Таранеўскі (Віцебск)

НАРАЦЫЯ Ў “ЛЕТАПІСЦЫ ВЯЛІКІХ КНЯЗЁЎ ЛІТОЎСКІХ”

Галоўнымі творамі, што сыгралі выключную ролю ў станаўленні нашай нацыянальнай прозы, былі “Беларуска-літоўскія летапісы” XV–першай паловы XVI стст. Гэта “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх”, “Летапіс 1446 г.”, “Хроніка Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага”, “Хроніка Быхаўца”. Яны сталі своеасаблівымі “злучальнікамі” твораў розных жанраў, ад панегірыкаў (“Пахвала Вітаўту”) да легендаў і паданняў, выкладзеных па законах мастацкай прозы Сярэднявечча.

Стваральнік першага беларуска-літоўскага зводу, які складаецца з трох частак (дзве першыя аб’яднаны агульным загалоўка “Избрание лѣтописания изложено вкратце”, трэцяя – уласна “Лѣтописець великых князеи литовъскых”), пачаў сваю працу ў духу старажытнарускага летапісца. “Избрание лѣтописания изложено вкратце” створана на старажытнарускай аснове (кампіляцыя і рэдакцыя з рускіх летапісаў пра пачатак

“Земли Рустеи” (854 г.) і наследуе старажытнарускую традыцыю перавагі пагадовых запісаў над сюжэтнымі (летапіснымі) аповесцямі ў стылі манументальнага гістарызму. Але ўжо ў ім ярка праяўляецца імкненне пазбавіцца ад пагадовага запісу, што і было зроблена ў “Лѣтописце великих князеи литовскых”.

Названы летапіс пісаўся без датаў, у форме суцэльнага прагматычнага апавядання, фактычна – гэта невялікая гістарычная аповесць, хроніка, якая складаецца ў найбольш поўных спісах з дзвюх частак: уласна “Летапісца…” і “Аповесці пра Падолле”.

У сваё апавяданне аўтар “Лѣтописца…” ўступіў (па аналогіі з “Евангеллем ад Мацвея”, якое пачынаецца з радаслоўнай Ісуса Хрыста, “Сына Давыдава, Сына Аўраамава”) з пераліку сыноў Гедыміна: “У Великого князя Кгедимина литовского сынов 7 было; старший Монтивид, потом Нарамонт, Олкгирд, потомь Евнутий, потомь Кестутий, потомь Кориат, семый Люборт” [1, с. 238]. Такога кшталту “генеалагічны” ўступ у апавяданне-нарацыю знамянальны, паколькі першую ступень гістарычнага падання складае генеалогія, захаванне выдатных імёнаў, якія першапачаткова звязаны, як, напрыклад, у Егіпце, з прадметнымі помнікамі, да той пары пакуль на дапамогу не з’яўляецца пісьменнасць, раней за якую немагчыма гістарыяграфія. Паступова, з далучэннем да генеалагічнай кроны падзей і выдатных подзвігаў, генеалогія пераходзіць у хроніку.

“Лѣтописець великих князеи литовъскых”, апавяданне ў якім вядзецца з дня смерці князя Гедыміна (1341 г.) і заканчваецца пераломам XIV–XV стст., – гэта па сутнасці палітычная гісторыя Літвы, Беларусі і Украіны, заснаваная на імёнах асобаў, якія рэальна існавалі, і падзеях, якія ў сувязі з гэтымі асобамі сапраўды мелі месца або часткова былі выдуманымі, легендарнымі.

Экспазіцыя “Летапісца…” мае яшчэ характар звычайнага сінтэзу “генеалогіі” і “геаграфіі” без якой-небудзь дэталізацыі апавядання, як, напрыклад, у сюжэце пра “завяшчанне” Гедыміна, дзе расказваецца пра падзел вялікім князем сферaў уплыву між сынамі: “… Монтивиду отець дал Карачев и Слоним, Нарамонту Пинеск, Олкгирду королеву отцу, Крево, да к тому князь витебскый сынов не дръжал, принял ко дочце в Витебеск [в зяти]. Евнутя осадил в Вильни на великом княжени, а Кестутю дал Троки, а Корьяту Новгородок, а Люборта принял володимерскый князь [к дочце во Володимер и в Луцеск и] в(о) всю землю Волынскую” [1, с. 238–239].

Цытата наглядна ілюструе выкарыстанне старажытнарускай стылёвай традыцыі “манументальнага гістарызму”, калі летапісец імкнецца зірнуць на мінулае з “далёкіх адлегласцяў – адлегласцяў прасторавых, часавых (гістарычных) і іерархічных”. Але чым далей – тым летапісец становіцца больш шматслоўным: “генеалогія” і “геаграфія” дапаўняюцца дэталямі, дзеяннямі і якасцямі, і часцей за ўсё гэта адбываецца там, дзе апавяданне вядзецца не пра гераізаванае жыццё, а пра яго кароткія,

кульмінацыйныя моманты, як у выпадку з Яўнутам, які “во болшенстве будя не полюбился” братам, а больш за ўсё Альгерду і Кейстуту, і “смовивши межу собою и рок учинили, которого бы дня к Вильни пригнати и засести город под братом, великым княземь Евнутемь…” [1, с. 239].

Задуманае вялікія князі Альгерд і Кейстут здзейснілі, а “князь великый Евнутий, – паведамляе летапісец, – выскочил, и убежал в горы и в дол и тамо озябе в ноги”. Само апавяданне пра змову з’яўляецца не чым іншым, як завязкай, зыходным момантам у барацьбе за велікакняжацкую ўладу між сынамі Гедыміна. Але знамянальныя тут якраз не змова і людзі, якія ў ёй удзельнічалі, а слоўны спосаб выражэння фіналу княжання Яўнута, які ў “Хроніцы Вялікага княства Літоўскага і Жамойцкага” ідзе не без побытавых падрабязнасцяў і набліжаецца да сюжэтнага белетрыстычнага апавядання: “и в том крику наглом Евнут схопившися, босо, в кужушку едном, з обламков спустился и утекл сам единь в горы мижи льсы и там собь на грудь змерзлой ноги отморозил, был поиманый от жолньров”.

За апавяданнем пра Яўнута і падзеях з ім звязаных ідзе цікавая гісторыя Ваідыла. Бачыцца яна нам першай у “Летапісцы…” маленькай збелетрызаванай аповесцю з элементамі іерархічнага біяграфізму. “Нехто пак [был] у великого князя Олкгирда [паробок, неволны], холоп, Воидило. Първое был пекарцом, потом уставил его постелю собе слати и воду давати собе пити. Потом пак полюбился ему вел(ь)ми, дал был ему Лиду дръжати и повел его у великых. Потом по животе великого князя Олгирда две лете бол(ь)ше ль было, князь вяликий Ягайло поведеть его вел(ь)ми у высокых и дасть за него сестру свою родную, княгиню Марью, што потом была за князем Давыдом. Князю [великому] Кестутю великую нелюбовь и жалость вделал, што братанну его, а свою сестру, за холопа дал” [1, с. 240].

Ваідыл, як бачна, для летапісца не герой, не кандыдат на святы алтар, а “некто”, “паробок неволны, холоп”. Непрыняцце Ваідыла і ўчынак Ягайлы нарадзілі ў аўтара працытаванага ўрыўка імкненне быць змястоўным у падачы жыццёва-іерархічных фактаў, не надта ганаровых для Ваідыла. Яго жыццё, праўда, не даведзена тут да канца, як гэта бывае ў агіяграфічных ці біяграфічных творах, а выключныя жыццёвыя факты працуюць на адмоўную характарыстыку ўлюбёнца Ягайлы. Такой была задума летапісца як прыхільніка роду Кейстута, які не прымаў “князя-пахоліка” і гэтае непрыняцце, як нам здаецца, вылілася ў афарбаванае эмоцыямі летапіснае сюжэтнае апавяданне. Да таго ж творца “Летапісца…” ў кароткай гісторыі Ваідыла хораша перадаў сутнасць слоў старажытнаяўрэйскага прарока Іязекіля, “што мужы золата здабудуць, а золатам мужоў не здабыць” і гэтым самым выказаў свае негатыўныя адносіны да вядомай з даўніх часоў палітыкі “акняжвання” зямель, у гэтым выпадку зямель Вялікага княства Літоўскага. Ваідыл, па-сутнасці, стаў для летапісца першапрычынай насцярожаных адносін між дзядзькам і

пляменнікам, якія пазней перараслі ва ўзброены канфлікт і прывялі да здрадніцкага забойства Кейстута ў Крэўскім замку.

Пасля смерці вялікага князя Кейстута, у палоне, у тым жа Крэве, апынуўся і яго сын, вялікі князь Вітаўт, і, без сумненняў, Ягайла мог распарадзіцца яго жыццём так, як жыццём дзядзькі, але Вітаўтава выратаванне явілася яму ў іпастасях жанчын. “Князь пак великый Витовт седел у Креве у комнате за твердою сторожою, а жонце две ходили покладывать князя у комноту, положив да вон идуть, а сторожи около. То пак великия княгини, слышав от людей, иметь великый князь Витовт должей седети, аль пак также изгадають над ним как и над отцемь его. И пригадала ему так: как жонки поидуть покладать, ино ему одное жонки вскладши порты да выйти вон й з другою жонкою, а той жонце остати у нее, у которое портех вышол. А так его научить. И он наредився в одной жонки порты, да дрогою вышол, да спустился з города: утек в Немци и у Прусы [1, с. 244].

Летапіснае апавяданне пра ўцёкі Вітаўта з Крэўскага замка з’яўляецца самым арыгінальным, можа быць, самым эфектным у “Летапісцы…”. Натуральнаму (самі ўцёкі) і незвычайнаму (спосаб уцёкаў) ходу падзей у гэтым сюжэце дала штуршок жанчына, вялікая княгіня, жонка Вітаўта. Самі падзеі апісаны дынамічна і падрабязна, што толькі падкрэслівае праўдападобнасць таго, пра што расказваецца. Перад вачыма паўстае візуальная карціна, сцэнарый, напісаны рукою майстра, схільнага да прыгодніцтва, вольнага ад абсалютнага панавання над ім гісторыі ў фактах і падзеях.

Летапісец тут ужо секулярызаваны, ён творыць ад сябе, так як, здаецца, не сядзеў разам з Вітаўтам у камяніцы і не быў сведкам той драматычнай сітуацыі. А мудрая парада вялікай княгіні – гэта маленькае рэха мудрых, але каварных “повелений” княгіні Вольгі, з іменем якой звязаны шэраг востраюжэтных летапісных апавяданняў у “Аповесці мінулых гадоў”. Па маштабнасці спраў Вольгі яе асоба непараўнальная са справамі і асобаю вялікай княгіні, жонкі Вітаўта. Але апошняя выступае ў “Летапісцы…” ужо не як статычная постаць, а як дзейсны ўдзельнік падзей, што знакава не толькі для летапісання, але і для ўсёй беларускай літаратуры часоў сярэднявечча ў сэнсе займення ёю актыўнага героя.

Выдатным узорам нарацыі з’яўляецца ў “Летапісцы…” і апісанне зверстваў смаленскага князя Святаслава над хрысціянскім народам Беларусі ў 1386 г. Страшная, жорсткая летапісная карціна людскіх пакут выяўляла “небогоугодное дело” Святаслава і апраўдвала ваенныя дзеянні літоўскіх князёў. Паражэнне Святаслава пад Мсціслаўлем – гэта, на думку летапісца, справядлівая помста гвалтаўнікам і мучыцелям, якія “много зла сотвориша хрестянемь, не человъческы и ни хрестиянскыи, мучиша хрстянь” [1, с. 245]. “Много зла” – формула асуджэння амаральнасці, праява высокай хрысціянскай маралі. Пафас асуджэння не маралізатарскі, бо спалучаны са страшэннай карціннасцю: “Сбираху и запираху во изьбах и

зажигаху, а иныя жены и дъти на коле тыкаху...” [1, с. 245]. Зноў бачым, як жахлівыя малюнкі феадальнай вольніцы пазбаўляюцца маралізатарства, павучальнасці. На гэты раз не агульным асуджэннем зла, а спалучэннем “асуджэння” з біблійным сюжэтам: “а иных мук над хрестианы, их же срама ради не писаху, яко же ни Антиох сирскый, ни Улиан преступник такых мукь не сотворил над хрестианы...” [1, с. 245].

Менавіта тут, у апавяданні пра крывавую бойню, учыненую Святаславам, найбольш ярка выражана пазіцыя самога летапісца, паборніка ідэй цэнтралізатарскай палітыкі беларуска-літоўскіх князёў на Русі і неабходнасці аб’яднання беларуска-літоўскіх земляў у адной дзяржаве – Вялікім княстве Літоўскім. Такім чынам, тэкст “Летапісца...” яшчэ і палітызаваўся па-сярэднявечнаму: карціннасць маралітэ, палітыка-дзяржаўная скіраванасць. А ў цэлым – сінкрэтычнасць, сярэднявечны сінтэз. Аднак сам летапісец, яго самавыяўленне, яго аўтарскае “я” ў першым беларуска-літоўскім летапісным зводзе яшчэ не бачны. У гэтым сэнсе аўтар яшчэ аморфны. Гісторыя ў імёнах і падзеях валадарыць над ім, а не ён над гісторыяй. Але ўсё ж унутранае, чалавечае паняцце пра дабро і зло, белае і чорнае каларызуе яго аповед, напаўняе яго ўнутранай страсцю, ачалавечвае, а значыць, псіхалагізуе тэкст – у агульнафіласофскім плане.

Такім чынам, “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” – гэта першы і важнейшы этап станаўлення нацыянальнай прозы, на якім пераадолены старыя кніжныя традыцыі, “летапісная форма апісання гісторыі”. Ён, на наш погляд, з’яўляецца і ўдалай спробай стварэння падзейна звязанага, прагматычнага апавядання пра мінулае.

Літаратура

1. Анталогія даўняй беларускай літаратуры. XI – першая палова XVIII стагоддзя. – Мінск: Маст. літ., 2003. – 860 с.
2. Беларускія летапісы і хронікі. – Мінск: Маст. літ., 1997. – 440 с.

С.М. Тарасава (Гродна)

ЖАНРАВЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ПАЭМ ЯЎГЕНІІ ЯНІШЧЫЦ

Вызначаючы стан развіцця беларускай паэмы ў 1970-я гады, М. Арочка ў сваёй манаграфіі “Беларуская савецкая паэма” (1978) канстатаваў: “На сучасным этапе ліра-маналагічны эпас перажыў у нашай паэзіі сваё бурнае эстэтычнае станаўленне” [1, с. 261].

Прычыны такой актывізацыі навуковец бачыць у наступным: “Гэтаму, відавочна, паспрыяў сам час, тая грамадская атмасфера, у якой актывізавалася самаўсведамленне асобы чалавека, яе асабістай прыналежнасці да спраў грамадства, да трывог свету. Надышоў час грамадзянскай лірыкі, яе страснага прамаўлення” [1, с. 261].

Як прыклад дасягненняў у рэчышчы паэмнага жанру даследчык прыводзіць творы беларускіх аўтараў самых розных пакаленняў: старэйшага (А. Куляшоў, П. Броўка), “шасцідзясятнікаў” (В. Зуёнак, А. Вярцінскі і інш.).

На жаль, па-за ўвагай навукоўцы засталіся творы паэмнага жанру новага для таго часу пакалення – “сямідзясятнікаў”, якія ў значнай ступені ўзбагацілі беларускую літаратуру сваімі мастацкімі набыткамі.

У паэмах А. Разанава, А. Грачанікава, С. Законнікава выразна выяўляецца імкненне асобы пазнаць сябе, адкрыць свой унутраны свет, узбагаціць чалавецтва гуманістычнымі ідэямі.

Па сутнасці сваёй мастацкай творчасці Я. Янішчыц, беларуская паэтка з пакалення “сямідзясятнікаў”, вядомая сваімі арыгінальнымі, рамантычна-ўзвышанымі і ў той жа час задушэўна-інтымнымі вершамі, таксама дастаткова натуральна ўпісваецца ў мастацкую сферу паэмнага жанру, яго пошукаў і эксперыментаў.

Паэмы гэтай яркай творчай асобы былі заўважаны навукоўцамі. Пра іх згадвалі ў рэцэнзіях на паэтычныя зборнікі, куды былі ўключаны паэмы (Д. Бугаёў, У. Калеснік і інш.), у аглядных артыкулах пра паэмны стан беларускай літаратуры (Т.Чабан “Мара пра эпас”), узгадваюцца паэмы ў манаграфіі С. Калядкі “Непрыручаная птушка Палесся. Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц” (2007). Тым не менш, прыходзіцца канстатаваць, што жанравай прыродзе паэм Я. Янішчыц была ўдзелена вельмі сціплая ўвага: навукоўцы абмяжоўваліся фрагментарнымі заўвагамі пра жанравую прыроду твораў.

Я. Янішчыц звярталася да жанру паэмы практычна на працягу ўсёй сваёй творчасці. У 1977 годзе ў газеце “Літаратура і мастацтва” паэтка дэбютавала паэмай “Завеі снежаньскай пялёсткі”. Годам пазней у паэтычны зборнік “Ясельда” будзе ўключаны чарговы твор, паэма з аднайменнай назвай са шчымлівым прысвячэннем “Светлай памяці бацькі”. Практычна ў адзін год убачаць свет паэмы Я. Янішчыц “Акно ў дождж” і “Ягадны хутар” (1980). 1983 годам пазначаецца з’яўленне паэмы “Прызнанне вачамі”. У зборнік “Каліна зімы” (1987) будзе ўключаны апошні з напісаных паэткай твораў “Зорная паэма”. Пазней у кнігу “Выбранае” (2000) будзе ўключана незакончаная паэма “Галалёд”. У гэтай жа кнізе ў раздзеле “З незавершанага” змешчана кароткая нататка В. Коўтун пра саму паэтку і яе апошнюю паэму, дзе вельмі трапна вызначана яго характэрная адзнака: “Тонкі лірык, Жэня Янішчыц умела чуць у жыцці і яго драматычны пульс, яго драматычны рытм” [5, с. 316]. Згаданыя словы могуць быць успрыняты і як характэрная асаблівасць усіх твораў Я. Янішчыц, што належаць да паэмнага жанру.

Ужо ў першых паэмах бачыцца, што лірычны герой выступае своеасаблівым сродкам сувязі паміж самымі рознымі матывамі і калізіямі,

ён становіцца тым фокусам, праз які праходзяць асноўныя ідэйныя напрамкі.

У паэмах Я. Янішчыц знайшлі адбітак дзве магістральныя плыні яе творчасці – выяўленне глыбока інтымнага жыцця героя ці, дакладней, гераіні і ўлюблёнасць у беларускую зямлю, родныя мясціны.

Пры вызначэнні жанравай прыроды паэм Я. Янішчыц можна заўважыць, што яны знаходзяцца ў мастацкім полі лірычнай паэмы, для якой пастаяннымі рысамі становяцца спавядальнасць, эмацыйная напружанасць, энергія пачуцця, імклівае разгортванне лірычнага дзеяння і сцісласць думкі, асацыятыўнасць. Яе мастацкая задача – паказаць цэлы шэраг лірычных перажыванняў героя, які вырашае знакавае для яго пытанне. Сюжэт лірычнай паэмы – гэта духоўны рух героя, які падаецца праз ланцужок звязаных паміж сабой перажыванняў і ўражанняў. Лірычны герой, як правіла, выказвае блізкасць не толькі з асобай самога аўтара, але і ўтрымлівае належнае мастацкаму вобразу абагульненне.

Згаданыя жанравыя адзнакі дакладна адпавядаюць характару такіх паэм Я. Янішчыц, як “Завеі снежаньскай пялёсткі”, “Акно ў дождж”, “Прызнанне вачамі”, якія адназначна можна аднесці да жанру лірычнай паэмы.

Але даследчыкі заўважылі, што паэмы Я. Янішчыц не пазбаўлены рысаў наватарскіх, часам эксперыментальных. Гэта датычыцца паэм “Ягадны Хутар”, “Зорная паэма”. Асабліва сваёй неардынарнай формай уражвае паэма “Ягадны Хутар”, “своеасаблівая “паэма ў пісьмах” (Т. Чабан), у якой “бачыцца спалучэнне двух планаў: аб’ектывізавана-лірычная плынь традыцыйнага верша, звязаная з непасрэднай прысутнасцю аўткрі ў гушчы вясковых падзей, і рыфмаваная проза ў форме лістоў з дому – ад маці, дзядзькі Арцёма, стрыечнага брата Уладзіка” [2, с. 639].

У лірычнай плыні паэмы раскрываецца сэнс быцця для героя – любоў і гармонія ў людзях, у прыродзе, у жыцці, у свеце ўвогуле. Праз лісты-ўстаўкі ў паэму ўводзіцца фактычны матэрыял. “У лістах ад мамы, ад стрыечнага брата, ад дзядзькі Арцёма – людзей розных па ўзроставым паходжанні і сацыяльным статусе – аб’ектыўна перадаецца няпростае, праўдзівае становішча і побыт вяскоўца” [3, с. 83]. У той жа час аўтабіяграфізм паэмы ўзмацняе яе лірычнае гучанне, надае адзнакі спавядальнасці. Гэта паэма Я. Янішчыц можа быць абазначана як узор камбінаванай формы лірычнай паэмы. Пры знешняй аўтаномнасці лістоў-уставак сюжэтнае дзеянне паэмы падпарадкавана логіцы аўтарскіх разважанняў, яны аб’яднаны адной аўтарскай ідэяй.

“Зорная паэма” Я. Янішчыц успрымацца як паэтычны працяг папярэдніх мастацкіх пошукаў. У той жа час гэта новы этапны твор, суаднесены з агульнымі тэндэнцыямі лірыкі Я. Янішчыц гэтага часу. Па сведчанні літаратуразнаўцаў, у творчасці паэткі “ідзе пастаянная работа ў напрамку больш поўнага спасціжэння свайго “я” ў сучаснасці, – у сувязях з прыродай,

часам, людзьмі…лірычнай гераіні ўжо недастаткова ўстановак архаічна вясковага ўкладу для вырашэння наспелых праблем самарэалізацыі ў прасторы, каардынаты якой шырэйшыя за вясковыя" [3, с. 93].

Тэма, закранутая ў паэме, натуральна вынікае з грамадзянскай лірыкі Я. Янішчыц, у якой абазначыўся сваімі непаўторнымі рысамі вясковы свет.

Паэма напісана ў 1985 годзе, напярэдадні бурных перамен канца XX ст., калі ўжо ў самой атмасферы часу вітала прадбачанне і верагоднасць кардынальных перамен.

Сам твор скіраваны да адлюстравання свету рэальнага і знаёмага паэтцы. Жанравая адметнасць паэмы заключаецца якраз у тым спалучэнні ідэальнага, быційнага і ўстрывожанага, неспакойнага свету, у якім існуе і сам аўтар, і ўвесь народ. У аснове твора – маналог-роздум лірычнага героя, свядомасць якога трывожаць супярэчлівыя думкі, звязаныя са спробай зразумець, што адбываецца навокал.

У паэме выразнае абазначаецца аўтабіяграфічны пачатак: вясковае дзяцінства, адарванасць ад родных мясцін, вяртанне да якіх напоўнена трывогай і скрухай, сум па патрыярхальна арганізаваным укладзе жыцця вёскі, які кантрасна выступае поруч з хаатычнай раскіданасцю і непрадказальнасцю іншага свету. Таму канфлікт паэмы адыходзіць ад звыклага "я і навакольная рэчаіснасць" і вырастае да ўзроўню "я і свет", і нават больш - "я і эпоха". У творы гэты канфлікт разгортваецца як працэс перажывання, ацэнак, рэфлексій лірычнага героя.

Настроенасць на асобую танальнасць, на пэўны пафас выяўляе эпіграф да паэмы – коласаўскія радкі "Мой родны кут, як ты мне мілы…" Сам твор кампазіцыйна падзелены на дзве часткі. Першая ўражвае сваёй разнастайнай танальнасцю з рэзкімі пераходамі ад узвышанай, лагоднай інтанацыі да крытычнай, абуральнай.

Пачатак паэмы сцішана-лагодны: сэрца гераіні перапоўнена пачуццём замілавання ад хуткай сустрэчы з родным кутом. Ад гарадскога тлуму, ад сусветнай неўладкаванасці ўцякае яна са сваім "збалелым сэрцам" у вяскова-зялёны рай, дзе:

Дзятлік-урач і вавёрачка рыжая,
Вецер гаркавы, як пах буякоў.
Можа,
хоць тут ані згадкі пра хіжасць
І дэмагогію спрытных дзялкоў… [5, с. 308].

Але "райскія" мясціны перажываюць нялепшыя часы, няўмольны прагрэс парушыў раўнавагу і ў спрадвечна ўпарадкаваным вясковым укладзе. Увага гераіні спыняецца на самых розных момантах жыцця вёскі: неўладкаванасць лёсаў саміх вяскоўцаў ("*пяцера сірат у цёткі Настулі, // Цётка Настуля – жняярка і вол*" [5, с. 309], безгаспадарчасць і паказуха ("*А ў канторы – прыпіскі, адпіскі…"* [5, с. 311], страта гаспадара на зямля, адрыў моладзі ад сялянскай працы (*"Ах, як разбегліся ўсе адмыслова // Як*

найхутчэй з-пад бацькоўскіх апек! // Любім на словах, Бунтуем на словах // І славасловім праграмны наш век” [5, с. 310], востра адчуваюцца экалагічныя праблемы (*“А то дажджы як з вядра. Недарод. // Засуха б’е па прагнозах зачаста…”* [5, с. 311]. Погляд лірычнага героя ахоплівае многія нюансы жыцця вёскі свайго часу і не проста канстатуе іх, а спрабуе заглыбіцца ў іх сутнасць, выток, на кожным згаданым моманце ляжыць моцны эмацыйны адбітак. Тым не менш, ёсць у першым раздзеле важны момант: павучанне маці сыну як прадаўжальніку родавых народных традыцый.

Суб’ектыўны, асабісты вопыт аўтара накладваецца на сацыяльна-філасофскія праблемы і скрозь дэталі рэчаіснасці прасвечваецца сам час, яго атмасфера. Прадметы і з’явы напоўнены сімвалічным сэнсам. Так ранак асацыіруецца з новым часам, новым этапам, у надыходзе якога не сумняваецца аўтар. Жанчына з дзіцяткам – спадзеў на працяг жыцця ў будучым. У фінале першай часткі дамінуе стрыманы, але светлы настрой:

Покуль не чорныя воблакі – светла!

Светла, пакуль зелянее зямля [5, с. 312].

Другую частку паэмы пачынае эпіграф іншага класіка беларускай літаратуры М. Багдановіча: “Зорка Венера ўзышла над зямлёю…”, які, па сутнасці, вылучае ў паэме згаданы ў яе назве зорны матыў. Але пачатак раздзела ўражвае сваім кантрастам з прыведзенымі радкамі, ад якіх вее ўраўнаважанасцю і спакоем. Аўтар зноў вяртаецца да канстатацыі вострых і злабадзённых праблем сучаснасці, згадвае тыя праявы сацыяльнага зла, што і стварылі жорсткую і непрадказальную эпоху:

Думна і гэтак трывожна ў свеце,

Нібы лістку на спусцелым галлі.

Бомбы падпёрлі дыханне планеце:

Выкліча хто “дапамогу” Зямлі?! [5, с. 312].

Згаджаемся з літаратуразнаўцам, што “дадзенаму катастрафізму ў аснове светаўспрымання супрацьстаяць трывалыя каштоўнасці быцця, а таму заўсёды будуць знаходзіцца выхады з тупіковых сітуацый. Усё ж мацярынская трывога за ўсё жывое і безабароннае, паэтычная вера ў дабро, міласэрнасць, пяшчоту перакрываюць трывожна-драматычныя настроі гэтага твора” [3, с. 152].

Паліфанізм лірычнага перажывання патрабуе сваіх выяўленчых сродкаў. Аўтар часта карыстаецца прыёмам увасаблення (*“вечнасць пульсуе”, “цягнецца ў неба любові вярста”* і інш.), якія ў значнай ступені нясуць на сабе адбітак настрою лірычнага героя. Эпітаты ў мастацкім свеце паэмы таксама з налётам пачуцця і ацэнкі *(“Сэрцу збалеламу ёсць на прыкмеце // Белабярозавы кут”, “век гераічны, гранічны, крынічны”, “дэмаграфічны, лірычны, трагічны, // дыпламатычны і каставы век”* і інш.). Насычанасць паэмы шматзначнай сімволікай заўважалася многімі даследчыкамі, якія бачылі глыбокі змест у рэаліях і з’явах, згаданых пісьменнікам. Сімвалічны падтэкст утрымлівае і сама назва паэмы. Зор-

насць выступае як адзнака дасканаласці, гармоніі, якія і павінны панаваць у сусвеце. “Зорная паэма” – гэта значыць прасякнутая верай у вышэйшы розум, у яе “закладзена ідэя наступлення “зорнага” чалавечага часу ў рэальным, а не касмічным недасягальным жыцці людзей” [3, с. 152].

У паэме пазнаецца глыбіннае даследаванне паэтам сучаснасці, асэнсаванне ролі чалавека ў акружаючых яго праявах. Лірычная паэма Я. Янішчыц можа быць абазначана як лірыка-публіцыстычная паэма-роздум.

Адзначаныя ўласцівасці твораў Я. Янішчыц дазваляюць аднесці іх да жанру лірычнай паэмы. У той жа час некаторыя з іх уяўляюць сабой асобыя мадыфікацыі гэтага жанру, якія з’яўляюцца вынікам як уласна творчага пошуку пісьменніка, так і праявай унутраных заканамернасцяў літаратурнага працэсу, абумоўленага жыццём.

Літаратура

1. Арочка, М. Беларуская савецкая паэма / М. Арочка. – Мінск, 1979. – 336 с.
2. Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя: у 4 т. Т. 4. Кн. 2. 1986–2000 / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Ін-т літ. імя Я. Купалы; навук. рэд. У.В. Гніламёдаў, С.С. Лаўшук. – Мінск, 2003. – 975 с.
3. Калядка, С.У. Непрыручаная птушка Палесся. Творчая індывідуальнасць Яўгеніі Янішчыц / С.У. Калядка. – Мінск, 2007. – 216 с.
4. Чабан, Т. Мара пра эпас / Т.Чабан // Полымя. – 1990. – № 4. – С. 194–200.
5. Янішчыц, Я. Выбранае / уклад. А. Канапелькі і В. Коўтун / Я. Янішчыц. – Мінск, 2000. – 351 с.

І.А. Швед (Брэст)

ЧАС ЯК КАНСТАНТА ТРАДЫЦЫЙНАЙ КУЛЬТУРЫ БЕЛАРУСАЎ

Даследаванне выканана ў межах тэмы “Структурно-типологические параметры кодов мифопоэтической картины мира белорусов (по фольклорным записям XIX – нач. XXI вв.)” па Дзяржаўнай праграме навуковых даследаванняў “История, культура, общество, государство 1.4.07” на 2011–2015 гг. (“Народное творчество в социокультурных условиях современной Беларуси: региональное многообразие и межславянские связи фольклора и постфольклора”, № дзяржрэгістрацыі 20140200 ад 14.03.2014 г.).

Час разам з прасторай, вядома, з’яўляюцца вызначальнымі, максімальна нагружанымі з пункту гледжання міфалогіі і сімволікі, катэгорыямі жыццядзейнасці і светаадчування традыцыйнага грамадства, карціны свету беларусаў і іншых народаў, канстантамі традыцыйнай культуры, яе “рэгулятарамі”. У традыцыйнай карціне свету беларусаў, як і іншых народаў, вылучаюцца прыродны (касмічны) час (з дамінантай цыклізму і біялагізму) і жыццёвы (чалавечы) час (век). Жыццёвы час, “век” (ад інда-еўрапейскага *ve̯i̯-/vo̯i̯- ‘жыццёвая сіла’), паводле народных уяўленняў, адмераны, дадзены лёсам і павінны быць пражыты ў адпаведнасці з вызначанай чалавеку доляй. Век як час жыцця (пар.: “*Вік*

прожыв, а розуму ны нажыв” [Фальклорна-этнаграфічны архіў вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі БрДУ імя А.С. Пушкіна (ФЭ); Моладава Іванаўскага р-на] проціпастаўляецца гадзіне як моманту, малой адзінцы часу, як кропцы праламлення цячэння часу [3].

Час, які бачыцца праз прызму чалавечага жыцця, як лінія, шлях, паводле С. Талстой [3], спалучае міфалагічнае (цыклічнае, часта арыентаванае ў мінулае) і гістарычнае (лінейнае) успрыманне. Пры гэтым трактоўка часу як адзінай ніці ці кола, якое верціцца (праславянскае *vermę ад ‘вярцець’), не выключае ўяўлення пра паступальны рух часу (які ўспрымаецца ў выглядзе паслядоўнасцяў і рытмаў). Міфалагічнае ўспрыманне заснаванае на цыклічнасці прыроднага (касмічнага) часу – пораў года, фазаў месяца, дня і ночы. Па часе, як па коле ці адзінай ніці, можна рухацца ў абодвух кірунках, і межы паміж прошлым, сучасным і будучым не з’яўляюцца непераадольнымі. Больш за тое, пры парушэнні забароны грэх у сучасным можа абярнуцца пакараннем у будучым, прычым не толькі ў зямным жыцці самога грэшніка. Пакутнае існаванне чакае вінаватага на тым свеце. Яго нашчадкі могуць нарадзіцца непаўнавартаснымі, цяжка хварэць, рана паміраць. Вядома шмат аповедаў пра пакаранне людзей, якія ўдзельнічалі ў разбурэнні святынь, прычым часта “дзеці адказваюць за бацькоў”, прыкладам: *“Всё гонения на церковь были. [Пры адным старшыні храм разбуралі]. И председателя дочка родилась с вывернутыми ногами, умерла она. Вывернутые ноги у нее спиралью были, ходить не могла. И когда она умерла зимой, ее неделю не могли похоронить. Такая вьюга была, метелица. В Пелищах они жили. А сейчас он пошел в еговые, но он сейчас на пенсии… А он много церквей разбирал, очень много*” [ФЭ; Зводы Брэсцкага р-на].

Грэх, невыкананне забаронаў і прадпісанняў становяцца таксама прычынай парушэння ўсталяванага парадку і сувязяў з мінулым. Прыкладам, выкананне прадзільна-ткацкіх прац у памінальны час стварае перашкоды для душаў продкаў, якія не здолеюць перайсці мяжу між светамі, заблытаюць ногі ў нітках. Парушэнне пахавальнага абраду будзе мець адмоўныя натупствы для памерлага не толькі пры пераходзе ў засветы, будучым пасмяротным існаванні, але і падчас Страшнага суда: *“Возьмуть наволоку, напхають сіна, да і вся подушка. Пірье ны ложать, бо ек людэ будуть уставаты на страшный суд, ек будэ судыты Бог жывых і мёртвых, да встанэ, да всэ пірье будэ на голові, на косюх, да будэ іті бы тое лякало”* [ФЭ; Глінна Іванаўскага р-на].

У рытуалах народнай медыцыны чалавек пазбаўляўся ад хвароб праз яго вяртанне назад, у час яго «першастварэння», гэта значыць праз «перанараджэнне» нанава. Дасягнуць гэтага імкнуліся, звяртаючыся, у прыватнасці, да сакральна вылучаных дрэў. Праз іх расшчэпленыя ствалы працягвалі хворых, пакідаючы адзенне (= абалонку цела) у дрэве, якое выступала, апроч іншага, своеасаблівымі варотамі паміж сучасным (дысгарманізаваным) і мінулым (гарманічным, здаровым) і артыкулявала

касмаганічны міф. Добра ілюструюць сказанае і беларускія замовы, дзе дрэва маркіруе прасторава-часавы кантынуум, прыкладам: *«На моры, на кіяне стаіць дуб на тры і дзевяць какатоў, пад тым дубам зрублена на шэсць вуглоў хата (або авін). Святы цар Зосім стаіць на вугле святою сваею праваю нагою, угаль аціскаець, агонь унімаець, вецер занімаець…»* [2, с. 39].

У падобных шырокавядомых сітуацыях пазбаўленне ад хваробы ўяўляецца магчымым толькі пры ўмове ўстанаўлення адпаведнасці: цяперашні (рытуальны) час = міфалагічны (прачас). Гэтая адпаведнасць дасягаецца шляхам звароту да вобраза дрэва, у якім адмыслова супадае пачатак часу і сакральны цэнтр прасторы. Дрэва з разгалінаваннямі дазваляе ахапіць адзіным поглядам адрэзак часу – год, перавесці ў форму непасрэднага ўспрымання адносіны яго рознаўзроўневых частак – такіх, як поры года, месяцы, тыдні, дні і ночы. Яны карэлююць як умяшчальня і яе змесціва, выяўленае ў арнітаморфным кодзе (параўнае уяўленне пра год як гняздо Брахмана).

Структурызацыя часу праз дэндралагічны код стварае ілюзію пэўнай свабоды чалавека ад часу і некаторай улады над ім: цыклічны час можа быць вернуты, ён не адыходзіць назаўсёды. Дуб-год заўсёды ўзнаўляецца ў сваім нязменным выглядзе, а значыць, існуе вечна, нават калі дрэва-год не стаіць, а расце – як у загадцы: *«Расце ў лесе дзерава, на ём дванаццаць галінак, на каждуй галінцы па чатыры сучкі, на каждым сучку па сем лісткоў. – Год, месяц, тыдні, дні»* [1, с. 224]. Дрэва прадстаўляе абавязковую для касмалогіі пачатковую кропку адліку, з якой паслядоўна разгортваюцца структуры часу. Разгортванне (= рост дрэва-года) трэба трактаваць як працэс прыбаўлення тыдняў і дзён, які на апошнім сваім вітку паварочваецца назад. І дрэва-год, якое выяўляецца згодна з іерархічнай прасторавай прыкметай, зноў пачынае цыклічна развівацца, але пры гэтым застаецца ўвесь час тым самым, з той самай структурай. Як «гадавое» дрэва, звязанае з вечнасцю, дуб выяўляецца ў рытуальнай загадцы, што загадвалася сваццям на вяселлі: *«Рос дубок цэлы гадок, // На тым дубку дванаццаць гучкоў. // На тым гучку шэсць лісточкаў, // А сёмы – жалудочак… // Ды дубок – гэта гадок, // Дванаццаць гучкоў – дванаццаць месяцаў, // Шэсць лісточкаў – шэсць дзянёчкаў, // Сёмы, жалудок, – нядзелячка»* [1, с. 216]. Гісторыя дрэва-часу, такім чынам, замяняецца бясконцым колазваротам станаў, стадый яго росту, адыходу і вяртання ў першачасы.

Гістарычнае ўспрыманне, як шырока адзначаецца ў літаратуры пытання, грунтуецца на лінейнасці чалавечага жыцця, якое мае пачатак і канец. (Увогуле час адлічваецца ад стварэння свету, ад пачатку свету). Такая лінейна-цыклічная мадэль характэрная для хрысціянскага светапогляду, у якім гістарызм (стварэнне свету, яго развіццё і эсхаталагічная перспектыва) спалучаецца з «вечным вяртаннем» (М. Эліядэ) да «гістарычных пад-

зей» зямнога жыцця Хрыста. (Для чалавека традыцыйнай культуры, вядома, рэальнасць набывалі з’явы, якія паўтараліся рэгулярна).

У абедзвюх названых мадэлях час можа трактавацца і як перарыўны, дыскрэтны, і як неперарыўны. Так, цыклічнаму разуменню часу адпавядае ідэя кола жыцця, «вечнага вяртання», між тым у цыкле вылучаюцца пэўныя, рытмічна арганізаваныя, адрэзкі часу. Лінейны час мысліцца неперарыўным, аднак і ў лінейным злічэнні неперарыўнасць проціпастаўляецца адрэзку і нават кропцы – узгадаем падзел часу на прошлае, цяперашняе (кропка) і будучае. Увогуле час у традыцыйнай культуры «апрадмечаны», мае канкрэтны, пачуццёва ўспрымальны змест. Час – гэта не столькі тое, што ідзе (рухаецца), а тое, што адбываецца, што сапраўднае, што разумнае. Аснову члянення гістарычнага часу складаў адмысловы рад важных падзей грамадскага ці сямейнага жыцця («у час вайны з немцамі», «пры Польшчы», «калі пабудавалі царкву» і пад.). Прычым не толькі прыродны, але і гістарычны час міфалагізуецца носьбітамі традыцыі. Шматлікія матывы звязваюцца як з даўно мінулымі часамі, так і з нядаўнім мінулым – сацыялістычным перыядам, прыкладам змяненні структуры і сэнсу навагодняй, вясельнай, радзіннай і іншай абраднасці, стратэгіі надання імені немаўляці тлумачацца “выдумкай камуністаў”.

Мадэлі прасторы і часу накладваюцца адна на другую – чатыры бакі свету суаднесены з чатырма сезонамі і часткамі сутак (усход – вясна – раніца; поўдзень – лета – дзень; захад – восень – вечар; поўнач – зіма – ноч). Для беларускай народнай традыцыі характэрнае прасторавае ўспрыманне часу (хранатоп): прошлае мысліцца як пакінутае ззаду, а будучае чакае наперадзе. Дзень шляху пераўтвараецца ў меру адлегласці, прынятую для вымярэння адносна вялікіх дыстанцый. Для пазначэння часу і месца выкарыстоўваюцца тыя самыя словы (гл.: «поўдзень» і «поўнач» як вызначэнне часу і прасторы) [3], і тыя самыя аб’екты нават у адным кантэксце характарызуюццаі праз часавы, і праз прасторавы коды, прыкладам, усходні, паўднёвы, заходні, ранішні, вячэрні вецер у замове “от ветра”: *“Шла Божая Мать, на золотое коло ступала, золотым мостом опиралася, до Господа Бога добиралася. “Куда, Божая Мать, идешь?” “– До Господа Бога просити, молити, чтоб Господь Бог помог от ветра, или ветер восточный, или ветер южный, или ветер западный, или ветер утренний, или ветер вечерний, или луговой, или полевой, или грунтовой, или водяной, чтобы Божья Мать сняла с плечей…”* [ФЭ; Брэст].

Персаніфікаваныя адрэзкі часу рухаюцца ў прасторы, прыкладам выдаленне зімы з сваёй вёскі выяўляецца як яе пераход у аддаленыя, чужыя, паселішчы: “Хлопцы і дзяўчаты выходзілі з кіямі, стукалі ў сцены хат і гукалі: *“Іды, зіма, до Кучэва, // Бо ты нам наскучыла!”* [ФЭ; Моталь Іванаўскага р-на]; *“Ідзі, зіма, да Кіева, // Ужо ж ты нам надакучыла. // Ідзі, зіма, да Кракава, // Не вертайся да нас адзінакава. // Ідзі зіма да Крывіцы, // Забірай свае рукавіцы”* [ФЭ; Амяльная Івацэвіцкага р-на]. Не-

здарма ў шматлікіх абрадавых творах персаніфікаваным адрэзкам часу прыпісваецца рух на пэўных транспартных сродках, прыкладам Каляда ездзіць на белых конях, у возе. З порамі года могуць быць скарэляваны розныя транспартныя сродкі і ў іншых кантэкстах. Так, падчас гукання вясны *“білы булкамі адну аб другую і прыгаворвалы: “Блаславі, Божа, // Зіму замыкаты // Літо отмыкаты. // Зімою – у возочку, // Вясною ў чаўночку, // А улеце – у карэце”* [Мачулішчы Камянецкага р-на].

Часавы код надзвычай цесна звязаны не толькі з прасторавым, але і шматлікімі іншымі кодамі (прадметным, метэаралагічным, колеравым і г.д.), ды і само слова “гадзіна” семантычнай неперарыўнасцю асацыюецца не толькі са словамі “час” і “год”, але і “пагода”, “дождж”, “год” звязаны з “прыгожы, выгада” (ацэначная мадэль намінацыі часу), пара – з “пярэць” (актуалізуецца ідэя руху)” (М. Талстой).

Літаратура

1. Беларускі фальклор у сучасных запісах. Традыцыйныя жанры. Мінская вобласць / уклад. В.Д. Ліцвінка, Г.Р. Кутырова. – Мінск: Універсітэцкае, 1995. – 477 с.

2. Замовы / уклад. Г.А. Барташэвіч. – 2-е выд. – Мінск: Бел. навука, 2000. – 597 с.

3. Толстая, С.М. Время / С.М. Толстая // Славянские древности. Этнолингвистический словарь: в 5 т. / под общ. ред. Н.И. Толстого. – М.: Международные отношения, 1995. – Т. 1. – С. 448–452.

І.І. Шматкова (Мінск)

СТЫЛІСТЫЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ЛІРЫКІ КАХАННЯ БЕЛАРУСКІХ ПАЭТЭС ДРУГОЙ ПАЛОВЫ XX СТ.

Лірыка кахання беларускіх паэтэс такая ж багатая і складаная, як сама душа жанчыны, яе пачуццёвы свет. У 70-я–80-я гг. XX ст. з прыходам у беларускую літаратуру цэлага пакалення жанчын-паэтэс (Я. Янішчыц, Н. Мацяш, Р. Баравіковай, Г. Каржанеўскай і інш.) яна загучала “харавым спевам”, набыла “масавы” характар. Іх любоўная паэзія – своеасаблівая стылістычная з’ява, якая характарызуецца адметнымі эстэтычнымі і вобразна-мастацкімі рысамі.

Лірыка кахання беларускіх паэтэс вызначаецца філасофскай змястоўнасцю, псіхалагізмам. У лірыцы Я. Янішчыц каханне прадстаўлена як высокадухоўнае пачуццё, хоць і няспраўджанае. Паэтэса раскрыла эвалюцыю пачуцця кахання ў душы і лёсе жанчыны, стварыла своеасаблівы “інтымны дзённік”, лірычную аўтабіяграфію. У сваіх ранніх вершах маладая паэтэса – уся ў чаканні гэтага светлага стану (вершы “Золушка”, “Лісты закружацца, закружацца...”, “Дух часу мой то хмельны, то цвярозы...” і інш.). У вершах сталай паэтэсы настрой змяняецца ў больш песімістычны бок. Я. Янішчыц перажыла драму кахання, эмоцыі расчара-

ванай жанчыны перапаўняюць вершы “Няпраўда, ужо не сумую...”, “Забараняю сабе...” і інш. Уражвае сваім пакутлівым пафасам верш “Настальгія”: “*Ціха стаю на спусцелай зямлі, // Цішай скразной наліваецца цела... // Вось я – на насту. Адна. Ні пры кім. // І ў непрыкаяннай выстылай сіні // Як не стае мне адзінай рукі. // Той, у якой мая радасць і сіла!*” [10, с. 112]. Стыль вершаванага радка паэтэсы вылучаецца напружанасцю любоўнага пачуцця, спавядальнасцю, імкненнем да сур’ёзнага псіхалагічнага аналізу перажывання, моўна-вобразная сістэма – канкрэтна-рэчыўная, непасрэдна-эмацыянальная.

Асаблівасцю паэзіі кахання Н. Мацяш з’яўляецца тое, што яе лірычнае “я” найвыразней раскрываецца ў імкненні да духоўнага ідэалу. Вершы “Амаль казка”, “Жар-птушка”, “Ці скажу” прасякнуты смуткам лірычнай гераіні ад немагчымасці жаночага шчасця. І ўсе ж яна імкнецца сілай волі перамагчы боль і роспач (“На быстрыні”, “Не аддавай сябе самоце”). Таму ў яе больш філасофскіх разважанняў, пераасэнсаванняў, яе ўспрыманне кахання надзвычай драматычнае і балючае.

Каханне для лірычнай гераіні Н. Мацяш – гэта ісціна, якую, адпаведна сэнсу старажытнага выслоўя, можна выказаць наступным чынам: *“Я кахаю, значыць, – існую...”* [9, с. 72]. Сутнасць кахання дакладна вызначаецца ў вершы *“Amo te, ama me, fides immortales”: “Люблю цябе, любі мяне, вернасць бессмяротная”* [8, с. 85] – такі надпіс змяшчаўся на заручальных пярсцёнках у нашых продкаў. Гэта сцвярджэнне самакаштоўнае, бо лірычная гераіня ведае, што “люблю цябе” – не проста словы. Многія яе вершы маюць дыялагічную форму, і ў гэтым дыялогу з каханым абодва бакі не заўсёды чуйна ставяцца да свайго пачуцця. Паэтэса разумее, што насамрэч самую надзейную апору патрэбна шукаць у самой сабе, і гэта робіць лірычную гераіню моцнай у жыццёвых выпрабаваннях, якія яна перадае праз ланцужок афарызмаў: *“А мне ўсё лепей без цябе. // Працую – не гарую. // Спакойнай сіле не слабець – // Магу звярнуць гару я”* [8, с. 93].

Гэтак жа як і для Я. Янішчыц, для Н. Мацяш каханне – духоўна глыбокае пачуццё. Лірычная гераіня не дазваляе сабе гульні, пераўвасаблення, перасмейвання. Элемент самаіроніі, усмешлівага досціпу ў Н. Мацяш зведзены да мінімуму. Тут усё на поўным сур’ёзе, а калі і з’яўляецца ўсмешка, то часцей горка-іранічная: *“Не будзем сумныя. // Не варта. // Перавядзём усё на жарт”* [7, с. 49]. І гэта, безумоўна, не выпадкова. Каханне ў паэзіі Н. Мацяш – не толькі пошук асабістага шчасця, а ў першую чаргу філасофскі пошук ісціны, дабра, сэнсу чалавечага існавання: *“Цені ў кутках, як блакітная варта... // Сёння мы ў шчасця ў гасцях, // Можа, адзіна цяпер мы і варты // Жыцця”* [7, с. 49].

Каханне ў Н. Мацяш параўноўваецца з крыніцай, *“што толькі ў ёй адзінай і бруіцца // Жыццё, якім гамоніць з намі гай. // Любоў... Яна – як гэтая крыніца...”* [8, с. 73]. І тым больш адчувае сябе паэтэса нешчаслівай, чым больш успамінае пра мінулае – яна спрабуе забыць каханне. Верш

“Было расстанне” пачынаецца і заканчваецца аднолькавым радком: *“Было расстанне назаўжды”* [8, с. 104], толькі напрыканцы твора гэты сказ разбіты на два: *“Было расстанне. Назаўжды?”* Запытальная інтанацыя сведчыць аб надзеі, якая цепліцца ў сэрцы жанчыны.

Паэтэса называе пачуццё кахання “рэдкім талентам”, які могуць загубіць падман, фальш ці абыякавасць: *“Не хачу кахання рэдкі талент // Хітрыкаў бяздарнасцю губіць!”* [8, с. 129]. Унутраны свет лірычнай гераіні Н. Мацяш настолькі багаты і шчодры на пачуцці, што яна не можа дазволіць сабе папракнуць каханага, наракаць на свой лёс: *“Што б ні з’явілася прычынай // Твайго маўчання, // Не апушчуся я, мой любы, // Да нараканняў”* [8, с. 134]. Духоўная памяць робіцца для яе вызначальнай: *“Я цябе ніколі не забуду”* [8, с. 139].

Лірыка кахання Н. Мацяш – узор паэтычнага майстэрства – спалучана з традыцыямі нацыянальнай і еўрапейскай паэзіі. Яе інтымная споведзь адметна сваёй экстравертнасцю, гэта складаны і напружаны свет духоўнага існавання асобы. Вершаваны радок Н. Мацяш выдзяляецца знешняй выштукаванасцю вобразна-выяўленчых сродкаў, павышанай экспрэсіўнасцю паэтычнага сінтаксісу.

Лірыка кахання Г. Каржанеўскай вылучаецца прачуласцю і далікатнасцю, яна ціхая і роздумная. Аўтар гэтак жа ўслаўляе каханне, аднак як у яе жаночым лёсе, так і ў творах істотнае месца займаюць сям’я, дзеці. Падобна, што кахаць для паэтэсы – гэта забываць пра сябе, свае патрэбы і памкненні. На жаль, нават моцнае пачуццё могуць забіць проза жыцця, няўвага і абыякавасць сужанага: *“Цяплей не будзе. // Любага пагляд // Пазбавіўся пяшчоты”* [5, с. 10]. Але яна здольна любіць нават *“падманутым сэрцам”* [5, с. 111].

Неабходна заўважыць, што любоўныя пачуцці ў Г. Каржанеўскай менш паэтызуюцца на фальклорны лад, чым, напрыклад, у Я. Янішчыц, і вершаў, напісаных у гэтым стылі, няшмат: “Што каханы сто разоў пацалуе...”, “Не ідзе міленькі мой” і некаторыя інш. Паэтэса раскрывае сваё ўласнае, асабіста-інтымнае. Яе душэўны свет паўстае больш ураўнаважаным у процівагу інтымнай паэзіі Я. Янішчыц, Н. Мацяш. І ўсё ж з унутраным спакоем і разважлівасцю падчас мяжуюць усхваляванасць, роспач, гнеў: *“Прадаў каханне – гэтакай бяды!”* [4, с. 132]. Для інтымнай лірыкі Г. Каржанеўскай уласцівы выразны асабіста-інтымны пачатак, паэтыка яе твораў характарызуецца лаканічнасцю тропаў, алегарычнасцю.

Зусім па-іншаму лірычная гераіня прадстаўлена ў лірыцы кахання Р. Баравіковай, яна адкрывае нетыповы для беларускай жаночай паэзіі вобраз шчаслівай у каханні жанчыны. Як зазначае С. Калядка, *“менавіта творчасць Р. Баравіковай спрыяла таму, што многія забароны, накладзеныя сацыяльна-культуралагічным кантэкстам на цнатлівую, сарамлівую, несексуальную жаночую паэзію, былі перагледжаны”* [3, с. 94], а Г. Кісліцына ўвогуле называе яе *“секс-сімвалам беларускай літаратуры”*

[6, с. 58]. Зразумела, сексуальнай назваць яе паэзію можна ўмоўна, больш адпаведны тэрмін – эратычная. Дакладнае азначэнне лірыкі кахання Р. Баравіковай даў У. Гніламёдаў – *“пачуццёва-плоцевая”* [2, с. 248]. Упершыню паэтэса з дапамогай сродкаў “цялеснай” паэтыкі перадала вобраз закаханай жанчыны (вершы “Ля крыніцы бруістае вяне...”, “Музыка”, “Як добра, часам, што наўкол...” і інш.). Але гэта не значыць, што гэтай паэтэсе не вядомы пакуты, ёй таксама знаёма горыч расстання (вершы “Апошняя сустрэча”, “Не абяцаюць...” і інш.). Паэтэса ўводзіць у сваёй лірыцы побач з вобразам каханай вобраз каханкі: *“Шчыруе ў днях гарэзлівых каханка, // а я табе каханаю была”* [1, с. 145]. Лірычнай гераіні твораў Р. Баравіковай вядомы і спакусы “чужога мужа” (верш “Пасядзім, мой даўні дружа...”), і “дыханне здрады” (верш з аднайменнай назвай), даводзілася ёй і адмаўляць: *“Адмовіцца! – насуперак кручыне, – // і гэта ўсё, што ў долю магу даць // не брату, не таварышу, – мужчыне! – // і вернасцю сваёю пакараць”* [1, с. 92].

Пачуццё кахання стала эмацыянальна-сэнсавым ядром беларускай жаночай лірыкі другой паловы XX стагоддзя. Падабенства, блізкасць жаночага светаўспрымання пры адрознасці індывідуальнага псіхаэмацыянальнага выяўлення прадэманстравала розныя спосабы стылістычнага ўвасаблення тэмы, што дазваляе гаварыць пра любоўную лірыку кожнай з іх як арыгінальныя з’явы.

Літаратура

1. Баравікова, Р.А. Дрэва для райскай птушкі: лірыка / Р.А. Баравікова; прадм. І. Штэйнера. – Мінск: Маст. літ., 2007. – 270 с.
2. Гніламёдаў, У.В. Класікі і сучаснасць / У.В. Гніламёдаў. – Мінск: Маст. літ., 1987. – 288 с.
3. Калядка, С.У. Беларуская сучасная жаночая паэзія: мастацкія канцэпцыі “жаночага шчасця” / С.У. Калядка. – Мінск: Беларус. навука, 2010. – 163 с.
4. Каржанеўская, Г. Асенні мёд: вершы розных гадоў / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літ., 1999. – 159 с.
5. Каржанеўская, Г. Вечны водгук: вершы і паэма / Г. Каржанеўская. – Мінск: Маст. літ., 1988. – 157 с.
6. Кісліцына, Г. Раіса Баравікова як секс-сімвал беларускай літаратуры / Г. Кісліцына // Крыніца. – 1996. – № 5–6. – С. 57 – 60.
7. Мацяш, Н. Жнівень: лірыка / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літ., 1985. – 78 с.
8. Мацяш, Н. Паміж усмешкай і слязой: вершы і паэмы (1962 – 1992) / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літ., 1993. – 301 с.
9. Мацяш, Н. Поўны келіх: лірыка / Н. Мацяш. – Мінск: Маст. літ., 1982. – 63 с.
10. Янішчыц, Я. Ясельда: лірыка / Я. Янішчыц. – Мінск: Маст. літ., 1978. – 126 с.

П Р А Б Л Е М Ы В Ы К Л А Д А Н Н Я М О В Ы І Л І Т А Р А Т У Р Ы

С.В. Агароднікава, К.У. Петрыкевіч (Мінск)

АСПЕКТЫ ПРАЦЫ НАД ПРАФЕСІЙНЫМ ТЭКСТАМ СА СТУДЭНТАМІ ЭКАНАМІЧНЫХ ВНУ

Праграма курса беларускай мовы ў эканамічных ВНУ ставіць на мэце даць характарыстыку сістэмы беларускай літаратурнай мовы на сучасным этапе яе развіцця. Студэнты павінны дасканала авалодаць лексікай, граматыкай, стылёвай рацыянальнасцю роднай мовы, умець выбраць самыя дакладныя і пераканаўчыя сродкі для правільнага выказвання сваіх думак. Таксама праграма курса беларускай мовы прадугледжвае (і менавіта гэтаму надаецца найбольшая ўвага) навучанне мове спецыяльнасці. Апошняе патрабуе ад выкладчыкаў умення трапна спалучаць і выкарыстоўваць традыцыйныя і наватарскія метадычныя прыёмы і сродкі ў працэсе вывучэння адметных асаблівасцей мовы навуковага стылю.

У сваёй аснове навуковая мова – гэта пісьмовая мова, падпарадкаваная нормамі. Адцягнута-абагульняльны характар навуковай мовы падкрэсліваецца ўключэннем вялікай колькасці паняццяў, выкарыстаннем спецыяльных лексічных адзінак пасіўных канструкцый (*металы лёгка рэжуцца*). Шырока ўжываюцца дзеясловы, што маюць адцягнута-абагульненае значэнне, абстрактныя назоўнікі. Выкарыстоўваюцца канструкцыі, што падкрэсліваюць суадносіны паміж часткамі выказвання: пабочныя словы, вялікая колькасць прыназоўнікаў, што выражаюць розныя адносіны і дзеянні (*дзякуючы, у сувязі* і інш.).

Лексічны склад навуковага стылю характарызуецца аднароднасцю, адсутнічае лексіка з эмацыйна-экспрэсіўнай афарбоўкай. Шмат абстрактнай лексікі (*сістэма, перыяд, выпадак*). У тэкстах навуковага стылю выкарыстоўваюцца складанаскарочаныя словы, абрэвіятуры.

У сінтаксісе выкарыстоўваюцца складаныя сказы з дзеепрыметнікамі, дзеепрыметнымі і дзеепрыслоўнымі зваротамі, простыя сказы тыпу *што ёсць што* (*вадарод ёсць газ*), безасабовыя сказы. Адметнай асаблівасцю навуковай мовы з'яўляецца ўжыванне роднага склону назоўнікаў. Гэта выклікана неабходнасцю паслядоўных дзеянняў пры апісанні і характарыстыках, тлумачэнні.

Для замацавання вышэйназваных унармаваных сродкаў розных раздзелаў беларускай мовы вельмі паказальнай з'яўляецца праца з тэкстам. Разгледзім для прыкладу наступны ўрывак з перакладзенага эканамічнага тэксту: "…Камерсант павінен клапаціцца аб забеспячэнні прадпрыемтсва матэрыяламі з мінімальнымі затратамі, таму яму патрэбна поўная

інфармацыя аб цэнах на тавары і тарыфах на паслугі. Калі ва ўмовах прымянення толькі фіксаваных цэн іх можна было атрымаць з дзеючых прэйскурантаў, то зараз гэта праблематычна. Вырабнікі нават у кантрактах указваюць прыблізную цану, што ўдакладняецца толькі ў момант рэалізацыі прадукцыі. Доступ прадпрыемстваў да такой інфармацыі абмежаваны, а знайсці яе можна ў перыядычных выданнях, даведніках і іншых крыніцах".

Студэнтам можна прапанаваць наступныя заданні: знайсці ў тэксце абстрактныя назоўнікі; падкрэсліць словазлучэнні, што змяшчаюць назоўнікі ў форме роднага склону; запісаць асобныя сказы з дзеепрыметнымі словазлучэннямі.

Спецыяльныя словы і тэрміны служаць зыходным матэрыялам для развіцця навыкаў атрымання інфармацыі з навуковага тэксту, таму, каб папоўніць лексічны запас, студэнты з дапамогай выкладчыка складаюць слоўнік найбольш распаўсюджаных у тэксце эканамічных тэрмінаў, вылучаючы ўласнабеларускія адпаведнікі (спонсор – фундатар, потребитель – спажывец, налог – падатак).

Увогуле, усё вышэйпададзенае пераконвае: праца з прафесійным тэкстам дапамагае студэнтам авалодаць сродкамі навуковага стылю.

В.С. Варапаева (Мінск)

ФАРМІРАВАННЕ ЧЫТАЦКАЙ САМАСТОЙНАСЦІ Ў МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ ВА ЎМОВАХ БІЛІНГВІЗМУ

Чытанне мастацкай літаратуры – адзін з моцных фактараў фарміравання асобы. Літаратура як від мастацтва ўдзейнічае не на асобныя бакі псіхікі чалавека, а на асобу, індывідуальнасць у цэлым. Яна можа выхоўваць у дзіцяці высокія маральныя якасці, развіваць яго эмацыйна-пачуццёвую сферу і здольнасці.

Менавіта літаратура дае чытачам абагуленыя ўяўленні аб жыцці і дзейнасці чалавека, дапамагае ім авалодаць багаццямі роднай мовы, яе камунікатыўнымі і выяўленчымі сродкамі, дазваляе выкарыстоўваць чытанне як інструмент пазнання і зносін.

Нарэшце, літаратура дае прыклады, якія бяруць на ўзбраенне дзеці. Але патэнцыяльныя магчымасці кнігі праяўляюцца толькі тады, калі яе чытаюць. А між тым, як сведчаць псіхолагі, педагогі, бібліятэкары, прэстыж чытання з кожным годам падае. Безумоўна, гэтай з'яве ёсць свае прычыны: значную канкурэнцыю кнізе складаюць сродкі масавай камунікацыі: кіно, тэлебачанне, камп'ютар, інтэрнэт, якія не патрабуюць асаблівых намаганняў, як, напрыклад, чытанне. Пры гэтым сцвярджаецца, што сродкі масавай інфармацыі садзейнічаюць бессістэмнаму назапашван-

ню другасных ведаў і з'яўляюцца тормазам у духоўным, маральным і псіхалагічным развіцці дзяцей.

Працэс знаёмства з мастацкай кнігай з'яўляецца таксама працэсам засваення маральных норм, грамадскіх каштоўнасцей, стылю паводзін, увасобленых у сюжэтах і вобразах. Мастацкі твор малюе ў свядомасці чытача псіхалагічныя ўстаноўкі, якія ў пэўнай ступені каардынуюць яго зносіны з навакольнай рэчаіснасцю. Можна пагадзіцца з вучонымі, што мастацкая літаратура сапраўды з'яўляецца эфектыўным сродкам сацыялізацыі асобы. Без чытання мастацкай літаратуры немагчыма стаць годным чалавекам і грамадзянінам. У той жа час чытанне літаратуры пашырае кругагляд, садзейнічае развіццю вуснай і пісьмовай мовы. Сёння нават студэнты не могуць правільна, глыбока і змястоўна арганізаваць свой адказ, вусная мова (і беларуская, і руская) бедная, у маўленні прысутнічаюць слэнг, жарганізмы, пра афармленне пісьмовага тэксту нават гаварыць не прыходзіцца. У працэсе ж чытання фарміруецца зрокавая пісьменнасць, калі з гучаннем слова аўтаматычна суадносіцца яго правільны графічны выгляд. Такім чынам засвойваецца і пунктуацыя.

Псіхолагі, педагогі сцвярджаюць, калі да 10–11 гадоў дзіця не палюбіла кнігу і чытанне, – у яго ўжо ніколі не сфарміруецца духоўная патрэба ў чытанні.

Як жа заахвоціць дзяцей чытаннем, кнігай? Безумоўна, шмат чаго залежыць ад сям'і. Але ці часта ў нашых сем'ях бацькі абмяркоўваюць з дзецьмі прачытанае, убачанае па тэлебачанні, пачутае па радыё? Ці часта бачаць дзеці ў руках таты або мамы кнігу, зацікаўленага кнігай настаўніка і бібліятэкара, а гэта першасныя фактары, якія ўплываюць і на адносіны дзяцей да кнігі і чытання.

Калі дарослыя не чытаюць самі – цяжка патрабаваць гэтага і ад дзіцяці. Прымусам жа можна толькі адбіць жаданне, выклікаць непрыняцце кнігі, нават варожае стаўленне да яе.

Але ў пачатковай школе ёсць цудоўныя ўрокі, з дапамогаю якіх можна выхаваць (пры жаданні !!!) у дзяцей любоў да кнігі і чытання. Гэта ўрокі пазакласнага чытання, якія сёння не заўсёды праводзяцца правільна, адпавядаюць праграме, пэўным метадычным патрабаванням і крытэрыям. Часта ўрокі пазакласнага чытання падобны да ўрокаў літаратурнага чытання. А яны ж розныя! І мэты, задачы, методыка правядзення іх розныя. Калі на ўроках літаратурнага чытання вучні працуюць з асобным тэкстам, то на ўроках пазакласнага чытання – павінны працаваць з кнігамі. Мэта ўрокаў літаратурнага чытання – навучыць дзяцей чытаць, аналізаваць твор, пранікаць у яго сутнасць, вучыць разумець літаратуру як від мастацтва, з яе спецыфічнай формай, мовай, стылем. На ўроках пазакласнага чытання дзеці набываюць чытацкую самастойнасць. Гэты тэрмін у свой час уявяла Н.М. Святлоўская [3, с. 25]. Што такое чытацкая самастойнасць? Гэта якасць асобы, якая характарызуецца наяўнасцю матываў, якія абуджаюць

цікавасць да чытання, уменняў і навыкаў, якія дазваляюць рэалізаваць гэтую цікавасць. Прасцей кажучы, на ўроках пазакласнага чытання дзеці знаёмяцца з даступным колам кніг, набываюць уменні, як іх знаходзіць і па асабістым жаданні самастойна чытаць. Уменні аналізу мастацкага твора, набытыя на ўроках літаратурнага чытання, пераносяцца на самастойную чытацкую дзейнасць.

Ва ўмовах білінгвізму паспяховае дасягненне задач пазакласнага чытання, на наш погляд, магчыма пры спалучэнні і ўзаемасувязі ўрокаў беларускага і рускага пазакласнага чытання (адзін урок!). Вучэбным матэрыялам да яго павінны быць лепшыя творы сусветнай літаратуры для дзяцей і юнацтва (беларускай, рускай, замежнай). Даследаванні псіхолага Т. М. Савельевай [2, с. 22] паказалі, што ва ўмовах беларуска-рускага двухмоўя дзеці спантанна засвойваюць рускую мову і ўзровень валодання ею ў вучняў 1–2 класа аднолькавы, чаго не скажаш пра беларускую. Усё гэта прымушае шукаць шляхі і сродкі для эфектыўнага засваення беларускай мовы. На наш погляд, работа на ўроках пазакласнага чытання з рускімі і беларускімі кнігамі садзейнічае павышэнню моўнай культуры на той і другой мове, паскарае працэс пераключэння механізмаў словатворчасці і намнога скарачае дыяпазон інтэрферэнцыі, якая праяўляецца на ўсіх моўных узроўнях.

Урок пазакласнага чытання (тэматычны, вучэбным матэрыялам якога з’яўляюцца кнігі па беларускай і рускай мове, напрыклад, “Кнігі пра жывёл”) праводзіцца па беларускай мове да таго часу, пакуль дзеці не прыступаюць да абмеркавання самастойна прачытаных кніг. Каб пазбегнуць інтэрферэнцыі, так як усходнеславянскія мовы – беларуская і руская – вельмі блізкія па лексічным складзе і фанетычнай сістэме [1], неабходна, па-першае, падзяліць гэту частку ўрока (абмеркаванне прачытаных кніг) на дзве такім чынам, каб кнігі на беларускай мове абмяркоўваліся ў адной частцы, на рускай – у другой, па-другое, перад абмеркаваннем кнігі на беларускай і рускай мове павінна быць у вучняў дыферэнцавана ўстаноўка на мовы. Дзеці павінны зразумець, асэнсаваць і прыняць да дзеяння той факт, што абмеркаванне самастойна прачытаных кніг вядуць на дзвюх мовах – беларускай і рускай – і тым самым накіроўваць свае намаганні на выпрацоўку навыкаў пераключэння з адной мовы на другую.Задача настаўніка – сістэматычна і мэтанакіравана арганізоўваць гэту дзейнасць вучняў.

Сёння таксама востра стаіць пытанне: што чытаць дзецям і моладзі, якія кнігі варта прапаноўваць ім у першую чаргу, пра што і як пісаць пісьменнікам. Гэта праблема не толькі наша, але і сусветная. Многія даследчыкі разважаюць над тым, што такое добрая кніга і адказваюць: гэта тая, якая захапляе, якая падабаецца дзецям, у якой займальны сюжэт, які ўключае ў сябе і пераадоленне цяжкасцей, і прыгоды, і – пасля столькіх хваляванняў! – шчаслівы канец, які выклікае ў дзіцяці аблягчэнне, а таксама веру ў свае сілы і магчымасці. Добрая кніга – гэта і героі, якія на час чытання становяцца для дзяцей сябрамі. Зачастую зачараванне кнігі за-

ключаецца і ў стылі, і ў асобнай аўтарскай мелодыі, якая сама па сабе ператварае чытанне ў вялізнае задавальненне. Дзіцяці, якому ніколі не даводзілася, утульна ўладкаваўшыся ў крэсле, зачаравана, затаіўшы дыханне, чакаць пачатку гісторыі, – такое дзіця было пазбаўлена адной з самых вялікіх радасцей у жыцці.

Але добрай гісторыі мала быць захапляльнай. Добрая кніга павінна развіваць лексікон дзяцей. Адзіны выразны сродак вялікіх майстроў сусветнай літаратуры – гэта мова. Багацце мовы, яе сіла, яе праўдзівасць і дакладнасць адпавядаюць важнейшай ролі мовы, пра якую гаворыць нам Біблія. У першым і другім раздзелах Быцця, у аповедзе пра стварэнне свету сказана, што Бог словам Сваім стварыў усё існае: “У пачатку было Слова, і Слова было ў Бога , і Слова быў Бог”. Беларуская мова, як і творчае ўяўленне, – дар Божы. Вось чаму мы павінны даваць нашым дзецям кнігі, напісаныя дакладнай, ідэальнай мовай.

Але кніга павінна развіваць не толькі лексікон, розум, інтэлект. Яна магутная крыніца маралі. Безумоўна, здольнасць да эстэтычнага мыслення выходзіць хутчэй за ўсё з літаратуры, а не з маральных прынцыпаў. У казках, міфах, прымаўках і іншых творах закранаюцца важнейшыя пытанні: узаемаадносіны ў грамадстве, улада, абавязак, выбар у складанай сітуацыі. Сапраўднае мастацтва – гэта здольнасць паказаць свет, гэта ўменне перадаваць словамі тое, што звычайна застаецца нявыказаным – таму што занадта жахліва або, наадварот, цудоўна, альбо выходзіць проста за рамкі нашых бедных здольнасцяў. Адной з важнейшых якасцяў дзіцячай літаратуры з’яўляецца і павінна быць у кожным творы якасць надзеі.

Літаратура

1. Варапаева, В. С. Содержание и организация внеклассного чтения в начальных классах белорусской школы: автореф. дис. … канд. пед. наук / В.С. Варапаева. – М., 1978.

2. Савельева, Т.М. Некоторые результаты экспериментального исследования проблемы белорусско-русского двуязычия у младших школьников / Т.М. Савельева // Вопросы преподавания русского языка в школах с русским языком обучения: сб. науч. ст. – Минск, 1973. – С. 22–23.

3. Светловская, Н.Н. Теоретические основы читательской самостоятельности и их реализация в системе начального обучения: автореф. дис. … докт. пед. наук / Н.Н. Светловская. – М., 1977. – 25 с.

Л.С. Васюковіч (Віцебск)

РАЗВІЦЦЁ АЙЧЫННАЙ МЕТОДЫКІ ВЫКЛАДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ: УРОКІ ГІСТОРЫІ

Вылучэнне і аналіз этапаў у развіцці методыкі выкладання беларускай мовы мае гісторыка-метадалагічную каштоўнасць для захавання пераемнасці айчыннай педагагічнай думкі, для фарміравання пазітыўнага ўплыву спадчыны на сучасныя адукацыйныя працэсы, для аб’ектыўнага

прагназавання тэндэнцый. Засваенне метадычных набыткаў папярэднікаў набывае асаблівую актуальнасць ва ўмовах свядомай/несвядомай недаацэнкі айчыннага вопыту, “размывання” традыцыйных адукацыйных каштоўнасцей, неабходнасці пазітыўнага асэнсавання гісторыі нацыянальнай школы. Праведзены аналіз дае магчымасць вызначыць логіку станаўлення і развіцця айчыннай метадычнай думкі, знешнія фактары фарміравання сістэмы навукова-метадычных ведаў пра вучэбны тэкст, якія трансліруюць сацыяльна-культурныя ўмовы асяроддзя на развіццё адукацыі, унутраныя фактары, што адлюстроўваюць заканамернасці і асаблівасці развіцця самой сістэмы.

Ацэньваючы зробленае за пэўны перыяд, варта адштурхоўвацца ад крытэрыяў, пакладзеных у аснову перыядызацыі этапаў развіцця абранага прадмета даследавання. Як вядома, гісторыя пэўнай з’явы не можа быць зведзена да простага выкладу фактаў у храналагічнай паслядоўнасці: “Гісторыя вымяраецца не дзесяцігоддзямі, а тымі зрухамі ў грамадскай думцы, якія ствараюцца ў выніку сацыяльна-палітычных узрушэнняў” [2, с. 99]. Паспрабуем вытрымаць вызначаныя арыенціры ў ацэнцы здабыткаў беларускай метадычнай думкі.

Прынцып пераемнасці навуковай тэорыі патрабуе аналізу аб’екта даследавання ў гістарычным аспекце, паколькі разгляд любой з’явы як “пэўнай канстанты, без спробы расчляніць яе на розных узроўнях станаўлення і тым самым па-за ідэяй развіцця з’яўляецца недахопам, які абмяжоўвае магчымасці даследчыка” [3, с. 124–125]. З улікам таго, што “гістарычны аспект даследавання не можа быць выведзены за межы сістэмнага падыходу” [1, с. 20], разгледзім эвалюцыю якасных змен функцый, саставу і структуры вучэбнага тэксту, выявім тэндэнцыі, фактары, што маюць лінгваметадычную каштоўнасць у кантэксце трансфармацый адзінкі. Зварот да гісторыі станаўлення вучэбнага тэксту як аб’екта самастойнага даследавання дае магчымасць усвядоміць дыялектычнасць ацэнак у поглядах на падручнік, асэнсаваць рухомы характар патрабаванняў да яго асноўных кампанентаў. Спасціжэнне пройдзенага шляху дае падставу ацэньваць вучэбную кнігу па мове не як вынік суб’ектыўнай дзейнасці асобных аўтараў, а бачыць у ёй гістарычна-культурны феномен, матэрыяльны прадукт пэўнага перыяду ў развіцці філасофскай, лінгвістычнай, педагагічнай і метадычнай думкі. Рэтраспектыўны аналіз дае магчымасць прасачыць эвалюцыю колькасна-якасных змен у змесце і структуры падручніка, а значыць і ў эвалюцыі вучэбнага тэксту.

Рэтраспектыўны аналіз выданняў адукацыйнай сферы (праграмы, падручнікі па беларускай мове) на розных этапах развіцця айчыннай школы (20-я, 30-я, 50-я, 60-80-я гады XX ст., 90-я гады XX ст. – першае дзесяцігоддзе XXI ст.) выяўляе мэтазгоднасць дыялектычных ацэнак вучэбнага тэксту як лінгваметадычнай адзінкі. Працэс станаўлення тэорыі вучэбнага тэксту складваўся нераўнамерна. Практыка-эмпірычныя перыя-

ды развіцця з уласцівай канцэнтрацыяй і асэнсаваннем фактаў, першаснымі класіфікацыямі, вылучэннем прыватных гіпотэз спалучаліся з тэарэтычнымі этапамі, падчас якіх аб'ектываваліся асноўныя паняцці і заканамернасці, сістэматызаваліся, матэрыялізаваліся ў сфармуляваных канцэпцыях зыходныя катэгорыі, прынцыпы. Арганічнае спалучэнне гэтых перыядаў знаходзіць сваё вытлумачэнне: назапашванне ведаў, ідэй, іх асэнсаванне толькі ўмоўна можна ўявіць як паступовы эвалюцыйны працэс. Рэканструкцыя станаўлення тэорыі вучэбнага тэксту школьнага падручніка пазначана як грунтоўнымі тэарэтычнымі знаходкамі, так і этапамі, падчас якіх педагагічная думка была пазбаўлена логікі ўласнага развіцця, а метадычны кантэкст прадвызначаўся сацыяльна-педагагічным заказам. Працэс развіцця і ўдасканалення тэксту вучэбнай кнігі (вядучых функцый, сутнасных параметраў, структурных кампанентаў) раскрывае механізм змены лінгваметадычных парадыгмаў, залежны ад мэтаў і патрэбнасцей адукацыйнай практыкі.

Эвалюцыя функцый, саставу, структуры ВТ абумоўлена найперш зменамі ў агульнатэарэтычных пазіцыях адносна ролі і месца падручніка ў сістэме сродкаў навучання на розных этапах развіцця айчыннай школы. Першыя праграмы па беларускай мове **20-х гадоў XX ст**., якія мелі комплексны, надпрадметны характар, акрэслівалі эмпірычныя асновы стварэння вучэбных сродкаў. Практычная дзейнасць складальнікаў падручнікаў абумоўлівала характар вучэбных тэкстаў у форме сціслага апісання – тлумачэння моўных фактаў, з'яў, лаканічных паведамленняў, назіранняў у межах трох тэматычных сфер: прырода, праца, грамадства.

30-я гады XX ст. распачынаюць этап стабілізацыі зместу навучання беларускай мове. Распрацаваныя прадметныя праграмы акрэсліваюць прыярытэт граматыкі, актуалізуюць класавы падыход да разгляду моўных фактаў і з'яў. Свядомая арыентацыя на калектыўную і самастойную працу вучняў абумоўлівае з'яўленне новага тыпу падручніка — "Рабочая кніга па мове", што акцэнтавала функцыю замацавання і кантролю ў пазнавальнай дзейнасці. Вучэбныя тэксты школьных падручнікаў выступаюць як нарматыўныя, абавязковыя для запамінання і ўзнаўлення. Змест і структура тагачасных тэкстаў увасабляюць ідэю тоеснасці паміж вывучэннем мовы і граматыкі.

Практыка-эмпірычныя рашэнні складальнікаў вучэбных кніг паступова фарміравала разуменне неабходнасці стварэння тэарэтычных асноў гэтай галіны дзейнасці. Перадумовай выступіла пастанова "Запатрабаванні да рабочае кнігі па паасобных комплексах 3-га і 4-га года навучання", прынятая Навукова-метадычным камітэтам НКА БССР у 1929 годзе. Упершыню ў гісторыі беларускай адукацыі былі сфармуляваны нарматыўныя патрабаванні навуковага, педагагічнага, метадычнага і тэхнічнага характару да вучэбных тэкстаў. Спробу асэнсаваць змест і структуру рабочай кнігі можна лічыць пачатковым этапам распрацоўкі

тэарэтычных праблем школьнага падручніка. Менавіта ў 30-я гады метадычная навука мінула “стадыю першапачатковага эмпірызму” (Н.А. Бернштэйн) і вылучыла вучэбны тэкст як асобны кампанент вучэбных выданняў.

У **50-я гады XX ст.** знайшла рэалізацыю ідэя стабільнага падручніка па беларускай мове, у рэчышчы якой замацаваўся статус вучэбнага тэксту як першакрыніцы ведаў, як сродку фарміравання граматычных і арфаграфічных навыкаў. У цэнтры ўвагі метадычных прац знаходзілася адпаведнасць зместу тэксту дасягненням лінгвістычнай навукі, супастаўляльнае вывучэнне моўных з’яў. У поўнай меры актуалізуецца інфармацыйная функцыя вучэбных тэкстаў.

Паступова выкрышталізоўваюцца агульнадыдактычныя патрабаванні да тэкстаў вучэбных кніг па мове: змястоўнасць, інфармацыйнасць, частотнасць ужывання граматычных з’яў, узорнасць, захаванне нормаў літаратурнай мовы, стылістычная разгалінаванасць, выхаваўчы характар, адпаведнасць тэматыкі практыцы камуністычнага будаўніцтва. Педагагічная думка апрыёры сцвярджалася ў тым, што “паляпшэнне справы выкладання мовы” ў школе ў многім залежыць ад дыдактычнага патэнцыялу вучэбных тэкстаў. Задача адбору тэкстаў як “справа вельмі складаная” (І. Счасны) разглядалася ў рэчышчы вядучых праблем якаснага падручніка для савецкай школы. Асноўным прынцыпам стварэння тэкстатэкі становіцца тэматычны, які дэкларацыяваў прыярытэт зместавых параметраў, арыентаваных на ідэалы, каштоўнасці, абвешчаныя Камуністычнай партыяй і сацыялістычнай дзяржавай.

У **60–80-я гады XX ст.** абнаўляецца змест навучання ў аспекце развіцця вуснай і пісьмовай мовы вучняў. Праграма 1959/60 навучальнага года фармулявала асноўнай задачай развіццё мовы на аснове граматычнай тэорыі. Развіццё мовы абвяшчалася як пастаянны працэс узбагачэння слоўнікавага запасу і граматычнага ладу вучняў. Асноўная ўвага была скіравана на распрацоўку лінгвістычных асноў школьнага курса мовы. У вучэбных тэкстах паступова паглыблялася апісанне саставу і структуры граматычных катэгорый. Трэба аддаць належнае складальнікам стабільных падручнікаў (А.А. Амяльковіч, У.К. Андрэенка, Н.В. Вашчатынская, Р.С. Жываткевіч, Л.П. Падгайскі, Н.І. Шэўчык, М.С. Яўневіч) у плане бездакорнай навуковай тэорыі, якая адпавядала найноўшым дасягненням айчыннага мовазнаўства. Методыка працы над вучэбным тэкстам мела выразна аспектны характар, што выяўлялася праз падзел практыкаванняў на арфаграфічныя, лексічныя, граматычныя, заданні на развіццё мовы. Вядучым прызнаецца лексіка-семантычны прынцып адбору вучэбных тэкстаў, арыентаваных на ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў.

Вучэбны тэкст *сучасных падручнікаў вызначаецца цэласнасцю, функцыянальна-структурным адзінствам.* Ён мае поліфункцыянальную

прыроду, характарызуецца адзінствам інфармацыйнай, інструментальнай, камунікатыўнай, каштоўнасна-арыентацыйнай функцый.

Аналіз этапаў станаўлення тэорыі вучэбнага тэксту патрабуе прызнання таго, што метадычная навука заўсёды фарміравалася ў рэчышчы сацыяльна-палітычнага кантэксту, аднак мела ўнутраныя рэзервы, абумоўленыя ўзроўнем дасягненняў лінгвістыкі і педагогікі свайго часу. Гэтая самазначная логіка развіцця дазваляе ўключыць у навуковы актыў практычны вопыт стварэння і ўдасканалення рабочых кніг, стабільных падручнікаў па мове, перспектыўныя лініі ў развіцці метадычных ідэй, спраецыраваных на сучасныя набыткі, эвалюцыйны шлях разгортвання адукацыйна-нарматыўнай сферы, выхад знакавых лінгвістычных і метадычных прац, што паслужылі трывалым грунтам для сённяшніх тэарэтыка-эксперыментальных даследаванняў. Вылучаныя этапы ў развіцці методыкі ўяўляюцца не ізаляванымі гістарычнымі адрэзкамі, а лагічнымі звёнамі, абумоўленымі спецыфікай сацыяльна-культурнага кантэксту, прыярытэтам адпаведных метадычных ідэй, характарам вядучых падыходаў.

Вучэбны тэкст падручніка як гістарычна зменлівая адзінка выступае прадуктам лінгвістычнай і метадычнай парадыгмы свайго часу. Зместавыя, структурныя кампаненты, вядучыя функцыі тэксту трансфармаваліся ў кантэксце сацыякультурных фактараў і заканамернасцей развіцця лінгвістычнай і метадычнай навукі. Рэтраспектыўны аналіз вучэбных тэкстаў школьных падручнікаў па мове выяўляе эвалюцыю іх функцыянальнага прызначэння – ад адзінкі з выключна нарматыўна-лінгвістычнымі задачамі да ўніверсальнага сродку вучэбнай камунікацыі, прычым не толькі ў лінгвістычным, але і ў псіхолага-педагагічным, мастацка-эстэтычным і лінгвакультуралагічным аспектах.

Літаратура

1. Каган, М.С. Системный подход и гуманитарное знание: избр. ст. / М.С. Каган. – Л.: Изд-во ЛГУ, 2001. – 384 с.

2. Комаровский, Б.Б. Диалектика развития научно-педагогической мысли / Б.Б. Комаровский. – М.: Работник просвещения, 1928. – 96 с.

3. Поршнев, Б.Ф. О начале человеческой истории / Б.Ф. Поршнев. – СПб. : Алетейя, 2007. – 720 с.

Е.Н. Горегляд (Витебск)

ИЗУЧЕНИЕ СИНТАКСИСА ВОСТОЧНОСЛАВЯНСКИХ ЯЗЫКОВ В СИСТЕМЕ ДИСЦИПЛИН СПЕЦИАЛИЗАЦИИ

В теории языковых контактов и билингвизма остается актуальной проблема межъязыковой интерференции. С этой проблемой сталкиваются в условиях установившегося двуязычия и преподаватели вузов, и учителя школ и гимназий. Под интерференцией традиционно понимают факты от-

клонения от речевых норм второго (неродного) языка, обусловленные традициями и нормами словоупотребления родного языка. Главными причинами языковой интерференции обычно называют слабое владение вторым языком, в результате чего в речи билингва происходит смешение языковых единиц родного и неродного языков, итак называемый «языковой дефицит», предопределенный отсутствием в памяти говорящего языковых элементов неродного языка.

Проницаемыми для влияния со стороны родного языка оказываются все уровни языковой системы, в том числе и синтаксис, которому свойственна относительная устойчивость и высокая степень общности в генетически родственных языках.

В процессе исторического развития русского, белорусского и украинского языков в их синтаксической системе сформировался ряд общих черт, которые обусловили семантическую и структурную однотипность и функциональную эквивалентность многих синтаксических конструкций. В восточнославянских языках отмечается общность в строении большинства односоставных предложений, типах их грамматической структуры, в организации порядка слов в простом предложении, в употреблении и оформлении вставных конструкций, в морфологическом выражении и синтаксических связях однородных членов предложения. Однако некоторые синтаксические конструкции приобрели отличительные черты (это касается, в первую очередь, различий на уровне словосочетания, обособленных конструкций, некоторых типов односоставных предложений, способов выражения отношений в сложных предложениях).

Все это обусловливает значимость изучения в рамках дисциплин специализации курса, который ставит целью ознакомление студентов с актуальными проблемами синтаксического строя русского, белорусского и украинского языков, способствует формированию практических навыков в области сравнительно-сопоставительного анализа языковых явлений, позволяет усовершенствовать профессиональную подготовку студентов-филологов.

Данный курс может быть представлен в виде системы занятий, каждое из которых предполагает обсуждение обозначенных преподавателем теоретических вопросов и последовательное выполнение практических заданий, направленных на выработку умений строить различные типы синтаксических конструкций и понимать их коммуникативные особенности в восточнославянских языках.

Среди задач, которые ставятся перед студентами в ходе освоения дисциплины, – изучение основных теоретических вопросов синтаксиса восточнославянских языков, которые не нашли однозначной трактовки в научной и учебной литературе; ознакомление студентов с методами, применяемыми в сопоставительных исследованиях; анализ явлений межъязы-

ковой интерференции; выявление фактов, маркирующих связь межъязыковой интерференции и внутриязыковой.

Так, при изучении темы «Словосочетание» важно показать студентам способы лексико-морфологического выражения главного и зависимого компонентов словосочетаний; выявить особенности выражения атрибутивных, объектных и обстоятельственных отношений в словосочетаниях; представить различия в оформлении согласования, предложного и беспредложного управления в восточнославянских языках.

В ходе усвоения темы «Простое предложение» студентам необходимо обратить внимание на способы выражения подлежащего и сказуемого; специфику оформления значения принадлежности; формы прямого и косвенного дополнения; особенности формального выражения обстоятельственных отношений; своеобразие безличных и инфинитивных предложений; формальные особенности обособленных членов предложения; общее и различное в способах выражения обращений в русском, белорусском и украинском языках.

Раздел «Сложное предложение» завершает изучение синтаксиса и фокусирует основные положения всего курса. Здесь важно представить студентам особенности в характере связи предикативных частей в составе сложного предложения, структурные различия проявления обстоятельственных и определительных конструкций, стилистические особенности сложных предложений разных типов в русском, белорусском и украинском языках.

Для реализации поставленных задач предусмотрена система упражнений (она будет представлена в докладе), позволяющих в рамках коммуникативного принципа обучения совершенствовать грамматический строй речи студентов, улучшать технику перевода с одного из восточнославянских языков на другой, повышать общую речевую культуру [см., например, 1; 2]. Выполнение практических заданий позволяет студентам закрепить на конкретном материале содержание лекционного курса и содействует дальнейшему формированию навыков самостоятельного анализа языковых явлений.

Для проверки степени усвоенности материала и овладения необходимыми навыками студентам должны быть предложены контрольные вопросы и задания, которые могут выполняться как в режиме тренировки, так и в режиме контроля, самостоятельно и под руководством преподавателя.

Курс, предусматривающий изучение синтаксиса восточнославянских языков, не является изолированным, он напрямую связан с целым рядом учебных дисциплин, составляющих фундамент филологического образования. Среди них «Современный русский язык», «Сопоставительная грамматика русского и белорусского языков», «Введение в славянскую филологию», «Историческая грамматика русского языка», «История русского литературного языка», «Старославянский язык».

Опора на общие явления в синтаксисе близкородственных языков, внимание к специфике в каждом из них составляют лингвистические основы изучения синтаксиса русского, белорусского и украинского языков.

Литература

1. Горегляд, Е.Н. Простое предложение: учеб.-метод. пособие по русскому языку для студентов 4-го курса факультета белорусской филологии и истории / сост. Е.Н. Горегляд. – Витебск: ВГУ, 1997. – 29 с.

2. Горегляд, Е.Н. Общие вопросы синтаксиса. Словосочетание: метод. рекомендации / авт.-сост.: Е.Н. Горегляд, В.В. Глаздовская. – Витебск: ВГУ имени П.М. Машерова, 2013. – 48 с.

3. Рагаўцоў, В.І. Сінтаксіс беларускай і рускай моў: Дыскусійныя пытанні: дапаможнік / В.І Рагаўцоў. – Мн.: Універсітэцкае, 2001. – 199 с.

4. Сопоставительный анализ восточнославянских языков: учебник / А.А. Лукашанец [и др.]; под ред. А.А. Лукашанца, А.М. Мезенко. – Минск: РИВШ, 2014. – 288 с.

5. Сопоставительный курс русского и белорусского языков: учеб. пособие / А.М. Бордович, А.А. Гируцкий, Л.В. Чернышова. – Мн.: Універсітэцкае, 1999. – 223 с.

6. Типология двуязычия и многоязычия в Беларуси. – Мн.: Беларуская навука, 1999. – 246 с.

В.С. Зязюлькіна (Віцебск)

ВЫКАРЫСТАННЕ ФАЛЬКЛОРНЫХ ТВОРАЎ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ Ў 6–8 КЛАСАХ ЯК СРОДАК ФАРМІРАВАННЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ САМАСВЯДОМАСЦІ ВУЧНЯЎ

Адносіны да духоўнай спадчыны свайго народа, да мовы продкаў выяўляюць агульную культуру і грамадскую годнасць чалавека. На настаўніка ўскладваецца вялікая адказнасць за фарміраванне высокаморальнай творчай асобы з высокім узроўнем культуры і нацыянальнай самасвядомасці, здольнай дзейнічаць у інтарэсах дзяржавы. “Выхаваўчая работа ў нацыянальнай школе павінна грунтавацца на глыбокім веданні беларускага менталітэту. Кожны нацыянальны характар мае свае тыповыя рысы. Памяркоўнасць, гасціннасць, міласэрнасць, працавітасць, уменне пастаяць за сябе… – вось гэтыя і многія іншыя гуманістычныя рысы характару беларусаў сталі высокакаштоўнай нацыянальнай адметнасцю” [8]. Вядома, што школа павінна выхоўваць у дзяцей лепшыя рысы нацыянальнага характару. Нідзе так поўна не выяўляецца душа і характар народа, як у фальклоры, традыцыях і абрадах.

Вывучэнне мовы ў кантэксце культуры народа вызначана ў сучаснай лінгваметодыцы як лінгвакультуралагічны падыход (А.А. Быстрова, Г.М. Валочка, А.Д. Дзейкіна, Н.Л. Мішаціна, Л.А. Мурына, Л.І. Новікава). У навучанні праз моўныя факты і з’явы выяўляюцца асаблівасці культуры і мыслення народа, падаецца інфармацыя пра традыцыі, каштоўнасці, нормы і лад яго жыцця, і самае важнае – “адбываецца авалоданне вучнямі

ўменнямі карыстацца атрыманымі ведамі ў працэсе камунікацыі, лінгвакультуралагічнай кампетэнцыяй" [11]. Гэты кірунак "дазваляе праз слова (як адзінку мовы і тэксту) мэтанакіравана і сістэмна аказваць уплыў на фарміраванне асобы вучня" [5], дае магчымасць спасціжэння моўнай карціны свету беларусаў, развівае ўменні аперыравання культуразнаўчай інфармацыяй, спрыяе ўсведамленню ролі і месца беларускай культуры ў кантэксце іншых культур.

Патрыятычны элемент у першую чаргу павінен уключацца ў навучальныя заняткі, што патрабуе правільнага вызначэння выхаваўчай задачы кожнай тэмы заняткаў і спосабу яе вырашэння. Вялікую ролю ў гэтым адыгрывае правільны і старанны падбор навучальнага матэрыялу. Пры вывучэнні беларускай мовы мэтазгодна выкарыстоўваць пэўныя звесткі па этнаграфіі і фальклору ў выглядзе моўнага матэрыялу для практыкаванняў, моўныя хвілінкі з выкарыстаннем народных выслоўяў, картак на аснове фальклорнага матэрыялу. Вельмі цікава праходзяць ўрокі, аб'яднаныя адной тэмай, напрыклад, масленічны тыдзень, велікодныя традыцыі.

На нашу думку, такі падыход у большай ступені дазваляе рэалізаваць выхаваўчую мэту навучання. У кантэксце ўзаемазвязанага вывучэння мовы і традыцыйнай культуры беларускага народа аб'ектам увагі на занятках становяцца культурна афарбаваныя моўныя адзінкі:

– найменні прадметаў і з'яў традыцыйнага беларускага побыту;

– міфалагізаваныя моўныя адзінкі, абрадава-рытуальныя формы культуры, замацаваныя ў фразеалагізмах, прыказках, загадках, песнях;

– сімвалы нацыянальнай культуры;

– тэксты як адзінкі культуры.

Праца над словам і тэкстам прадугледжвае выкарыстанне на вучэбных занятках разнастайных метадаў і прыёмаў: паведамленне настаўніка; гутарка; экстралінгвістычны каментарый, які ўключае інфармацыю пра паходжанне, значэнне слова, функцыю прадмета традыцыйнай культуры; аналіз нацыянальна маркіраваных моўных адзінак рознага ўзроўню.

Праца па дадзенай тэме складаецца з некалькіх этапаў:

1. Падбор моўнага матэрыялу.

Карыстаючыся зборнікамі беларускага фальклору, стараюся падбіраць зразумелыя вучням моўныя адзінкі, прапаноўваць розныя фальклорныя жанры: каляндарная і сямейна-абрадавая паэзія, казкі, паданні і легенды, прыказкі і прымаўкі, загадкі, замовы, сацыяльна-бытавая лірыка. Значэнні слоў, што абазначаюць назвы рэалій матэрыяльнай і духоўнай культуры, могуць раскрывацца не толькі пры вывучэнні лексікі, але і ў якасці прыкладаў, або практычнага матэрыялу для замацавання ведаў, уменняў і навыкаў.

2. Вызначэнне раздзела праграмы, тэмы ўрока. Напрыклад, пры вывучэнні тэмы "Поўная і кароткая формы якасных прыметнікаў" асноўным узорам выкарыстання кароткай формы якасных прыметнікаў

з’яўляюцца беларускія народныя песні (“шырока ніўка”, “босы ножкі”, “цяжка доля” і інш.)

3. Падбор метадаў і прыёмаў уключэння афарыстычнай творчасці беларускага народа ў змест урока. Выбар этапаў урока.

Існуе шмат метадаў і прыёмаў навучання беларускай мове. У першую чаргу, гэта паведамленне настаўніка, дзе можна расказаць пра абрад, народнае свята, казку, легенду, з якіх вучні павінны выбраць вызначаныя паняцці, часціны мовы, словазлучэнні, антонімы або сінонімы. Але слова настаўніка павінна быць не суцэльным маналогам, а гутаркай з навучэнцамі, бо доўгі час дзеці не ў стане ўтрымліваць сваю ўвагу на словах настаўніка. Таму на ўроках выкарыстоўваецца прыём “Вучань – настаўнік”. Мэтай якога з’яўляецца паўтарэнне і сістэматызацыя ведаў вучняў па вывучаным матэрыяле; развіццё лідэрскіх ўменняў; прывіццё цікавасці да прадмета і настаўніцкай прафесіі. За некалькі ўрокаў паведамляю чатыром-пяці ініцыятыўным вучням, што на ўроку яны па чарзе будуць выконваць ролю настаўніка (да дзесяці хвілін). Застаюся з вучнямі пасля ўрокаў і абмяркоўваю змест і парадак заданняў, накіроўваючы іх на выкарыстанне фальклорных твораў. Пасля сігналу “вучань-настаўнік” выходзіць да дошкі і праводзіць апытанне або выконвае заданне. Напрыклад, вучні падрыхтавалі крыжаванку да тэмы “Правапіс прыслоўяў”, выкарыстоўваючы заданні: “Падбярыце сінонім да фразеалагізма куды ні глянь”, “Устаўце слова: “Ой, … на Івана”

Падабаецца вучням прыём “Арфаграфічная эстафета”. Некалькі частак невялікага вершаванага або празаічнага тэксту трэба размясціць на сцяне ці дошцы вучэбнага кабінета. Настаўнік дзеліць клас на групы і прапануе вызначыцца ў кожнай ролі: “кур’ер”, “пісьменнікі”, “карэктар”. “Кур’ерам” трэба пабываць ля тэксту вызначаную настаўнікам колькасць разоў і дакладна запомніць як мага больш, нічога не запісваючы. “Пісьменнікі” павінны правільна запісаць тэкст, прадыктаваны “кур’ерам”. За працай сваёй групы сочыць “карэктар”. Пасля сігналу настаўніка ён правярае тэкст “пісьменніка”, выпраўляе памылкі, параўноўвае запісанае з арыгіналам і ацэньвае працу згодна з прапанаванымі крытэрыямі.

Даволі цікавы і эфектыўны прыём “Карэктар”. Настаўнік павінен загадзя падабраць і размножыць тэкст з запланаванымі памылкамі. Іх агульная колькасць павінна быць вядома ўсім ўдзельнікам. Вучні падзяляюцца на групы. Кожны “вучань-карэктар” атрымлівае тэкст і самастойна выпраўляе памылкі алоўкам. Пасля індывідуальнай праверкі ўдзельнікі групы калектыўна абмяркоўваюць выпраўленае (фіялетавым стрыжнем). Вучні мяняюцца тэкстамі і параўноўваюць выпраўленае з тэкстам-эталонам. Выпраўленні робяцца чырвоным стрыжнем. Заканчваецца агульным каментарам дапушчаных памылак.

Кожнае заданне суправаджаецца абмеркаваннем моўнага матэрыялу, выхаваўчай гутаркай, прыкладамі з жыцця. Так, дзеці з задавальненнем

расказваюць аб святкаванні Каляд, Вялікадня, Купалля ў іх сям'і. Адзначаюць, што яны выкарыстоўваюць веды, набытыя ў школе, даюць парады сваім бацькам.

Хочацца адзначыць, што выкарыстанне фальклорных твораў і культуралагічных тэкстаў можа мець месца на любым этапе ўрока. Яны могуць служыць перадумовай фарміравання і развіцця матывацыйнай сферы вучняў, выкарыстоўвацца ў якасці эпіграфа; служыць моўным матэрыялам, у час знаёмства з новай тэмай, сродкам актывізацыі разумовай дзейнасці вучняў; ужывацца на карэкцыйным і кантралюючым этапах урока. Народныя песні могуць стаць цудоўным фонам пры выкананні пісьмовых самастойных заданняў, а таксама ў час правядзення фізкультхвілінак і рэфлексіі.

Сістэматычнае выкарыстанне фальклорных твораў на ўроках беларускай мовы ў 6-8 класах садзейнічаюць фарміраванню моўных, маўленчых і ўласна камунікатыўных уменняў і навыкаў вучняў, што ў выніку забяспечвае гатоўнасць асобы да маўленчай камунікацыі па-беларуску. Тэматычнае адзінства тэкстаў забяспечвае прадметны змест выказванняў вучняў, дазваляе зарыентавацца ў інфармацыі, прымяняць атрыманыя звесткі ў розных жыццёвых сітуацыях. Пачатковае ўспрыманне на ўроках прадаўжаецца ў пазаўрочнай дзейнасці.

Літаратура

1. Адукацыйны стандарт вучэбнага прадмета "Беларуская мова" // Роднае слова. – 2009. – № 8. – С. 101–111.

2. Беларуская мова V–XI класы. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2012. – 56 с.

3. Беларуская літаратура V–XI класы. Вучэбная праграма для агульнаадукацыйных устаноў з беларускай і рускай мовамі навучання. – Мінск: Нацыянальны інстытут адукацыі, 2012. – 54 с.

4. Беларускі фальклор: хрэстаматыя / склад. К.П. Кабашнікаў і інш. – Мінск: Выш. шк., 1996.

5. Валочка, Г.М. Лінгваметадычная сістэма развіцця звязнага маўлення школьнікаў пры навучанні беларускай мове / Г.М. Валочка, – Мінск, 2008. – 48 с.

6. Кірчук, І.І. Выхаванне на нацыянальных традыцыях / І.І. Кірчук. – Мінск: НІА, 2008. – 191 с.

7. Лозка, А. Беларускі народны каляндар / А. Лозка. – Мн., 1993.

8. Маляўка, М.М. Сядзіба, або Хата з матчынай душою / М.М. Маляўка. – Мінск: НІА, 2002.

9. Макаранка, Л.В. Дакрануцца сэрцам / Л.В. Макаранка, Я.А. Саўчанка. – Мазыр, 1994. – 210 с.

10. Мартынкевіч, С.В. Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі школьнікаў пры вывучэнні беларускай мовы (5–6) класы / С.В. Мартынкевіч. – Мінск: Выдавецкі цэнтр БДУ, 2010. – 104 с.

11. Методыка выкладання беларускай мовы / М.Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М.Г. Яленскага. – Мінск: Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.

С.В. Мартынкевіч (Віцебск)

МАЎЛЕНЧЫ ПАРТРЭТ СУЧАСНАГА ВУЧНЯ: АД ВЕДАННЯ ДА ВАЛОДАННЯ БЕЛАРУСКАЙ МОВАЙ

Адным з ключавых паняццяў сучаснай лінгвістыкі і лінгваметодыкі з'яўляецца паняцце "моўная асоба". Існуюць розныя падыходы да вывучэння моўнай асобы, якія вызначаюць статус яе як у лінгвістыцы – этнасемантычная (С.Р. Варкачоў), элітарная (В.Б. Сірацініна, Т.В. Качаткова), семіялагічная (А.Р. Баранаў), так і ў лінгваметодыцы – уласна моўная, маўленчая (Ю.Я. Прохараў, Л.П. Клабукова, С.В. Мамаева), камунікатыўная (В.В. Красных, В.І. Шахоўскі) і інш. Ідэя антрапацэнтрызму вызначае цікавасць да маўленчага Я з пазіцый згаданых навук і дае падставу для распрацоўкі прыёмаў апісання маўленчага партрэта носьбіта пэўнай мовы. Маўленчы партрэт – гэта адлюстраваная ў маўленні моўная асоба пэўнай сацыяльнай групы. Асаблівую ўвагу ў вывучэнні дадзенага пытання прыцягваюць тыя характарыстыкі маўленчай асобы, якія нясуць у сабе прыкметы групавой.

Мова, з'яўляючыся сродкам фарміравання свядомасці чалавека, лічыцца галоўнай рысай яго культурнай ідэнтыфікацыі. Асаблівую ўвагу неабходна надаць фарміраванню маўленчай асобы вучняў, бо гэта ўзроставая група найбольш адкрытая для ўплываў моўных формаў як літаратурных, так і нелітаратурных. Навучанне літаратурнай норме і ўзбагачэнне слоўнікавага запасу вучняў, засваенне маўленчых ведаў і фарміраванне камунікатыўных уменняў – кірункі, якія ствараюць аснову працэсу навучання беларускай мове. Пашырэнне вербальна-семантычнага поля, узбагачэнне тэзаўруса, удасканаленне камунікатыўна-дзейнасных патрэб адбываецца мэтанакіравана ў спецыяльна створаным адукацыйным моўным асяроддзі. Таму даследаванне маўленчай асобы сучаснага вучня ў дачыненні да валодання беларускай мовай дазволіць адысці ад абагульненай мадэлі моўнай асобы і на канкрэтным этапе развіцця моўнай адукацыі дапаможа выявіць праблемныя "кропкі" навучання беларускай мове, апісаць пэўныя этапы фарміравання маўленчай асобы і распрацаваць найбольш эфектыўныя тэхналогіі.

Як сведчаць назіранні за адукацыйным працэсам, сучасны вучань – асоба актыўная, якая лёгка адаптуецца ў разнастайных сітуацыях маўленчых зносін. Беларуская мова ўспрымаецца як спецыяльны прадмет, ведаць які неабходна, аднак выкарыстоўваць мову ў якасці сродку зносін неабавязкова. Разам з тым, трэба адзначыць, што нягледзячы на перавагу рускай мовы ў паўсядзённых зносінах, вучні добра арыентуюцца ў сістэме сродкаў беларускай мовы. Як правіла, у сітуацыях, якія трывала замацаваныя ў маўленчай свядомасці і не з'яўляюцца абсалютна новымі, беларускае маўленне не выклікае вялікіх цяжкасцей. Вынікі лінгвістычнага эксперы-

менту паказалі, што нават не валодаючы некаторымі ўласнабеларускімі лексічнымі адзінкамі, вучні на падсвядомым узроўні праз асацыяцыі імкнуцца растлумачыць іх значэнне на беларускай мове ў спецыяльна створанай маўленчай сітуацыі. Напрыклад, вучням шостага класа ўстановы агульнай сярэдняй адукацыі г. Віцебска былі прапанаваны безэквівалентныя словы, якія не маюць аднаслоўных адпаведнікаў у рускай мове, – *дранік, заранка, знічка, кажан, насоўка, сцізорык, фэст, вырай, поплаў, чыгунка* [1]. Значэнне прыведзеных слоў трэба было раскрыць апісальным спосабам. Праілюструем асобныя выпадкі. Пры тлумачэнні слова *дранік* вучні ўказалі на адметнасць назваў страў беларускай нацыянальнай кухні (*смачная ежа з бульбы, блін з бульбы, ежа з бульбы, нацыянальная ежа Беларусі, беларуская нацыянальная страва, беларуская ежа, народная страва нашай краіны* і інш). Значную колькасць адказаў (45%) склалі рускамоўныя тлумачэнні: *блин из картошки, блин из тёртой картошки, перетёртая пожаренная картошка, блины с мясом, картофельные блинчики, картофельные оладьи*; *национальное блюдо Беларуси, белорусское блюдо, белорусская еда, вкусное белорусское блюдо*. Астатнія адпаведнікі былі беларускамоўнымі, аднак аднаслоўнымі: *ежа, блін*.

Прыведзеныя тлумачэнні значэння слова *“**фэст, -у, м.** Церковный престольный праздник; вообще праздник с ярмарками и игрищами”*[1, с. 291] паказалі, што семантыка слова вядомая частцы ўдзельнікаў эксперыменту. Семантызацыя па-беларуску не выклікала цяжкасцей, але адпаведнікі былі ў асноўным з рускай мовы (80% адказаў): *фестиваль, праздник, ярмарка*. Адзінкавыя правільныя адказы – прыведзены назоўнік *свята*. Астатнія азначэнні былі памылковымі і дэманстравалі наяўнасць аднайменных або падобных па гучанні гандлёвых марак: *мінералка, вода, минеральная вода, газированный напиток* (па асацыяцыі да назвы мінеральнай вады “Фрост”), *цыгарэты* маркі “Фэст”. Такім чынам, прапанаванае слова добра вядомае ўдзельнікам эксперыменту, аднак не замацавана ў актыўным слоўніку, таму з цяжкасцю ўключаецца ў беларускамоўны кантэкст.

Пры тлумачэнні лексічнага значэння слова *“**кажан, -а, м.** Летучая мышь”* [1, с. 123] асноўную групу склалі прыклады, пабудаваныя на суаднясенні слова *кажан* з рускім словам *кожа*. Прычым няведанне семантыкі слова прадэманстравалі прыведзеныя рускамоўныя лексічныя адзінкі (62%): *ремень, кожаная одежда, кожаная куртка, кожаное пальто, кожаная вещь, что-то из кожи, кожанный ремень, кожаный кошелёк, кожаные брюки.* Адказы дэманструюць, што назоўнік *кажан* паслужыў стымулам да ўзнікнення міжмоўных асацыяцый: у моладзевым лексіконе сустракаецца слэнгізм *“кожанка” (верхняе адзенне са скуры)*. Нешматлікія беларускамоўныя тлумачэнні з’яўляюцца суадноснымі з рускамоўнымі прыкладамі: *адзенне, куртка, кажух*. Некаторыя з прыкладаў ствараліся на аснове моўнай гульні і рыфмаваліся паміж сабой: *кажан – Казань, кажан –*

каштан, *кажан – чамадан*, *кажан – качан*. Адказаў, якія паказалі веданне значэння слова, каля 11%: *звярок*, *летучая мышь*.

Слова *“**чыгунка, - і, ж.** Железная дорога”*[1, с. 305] адносіцца да актыўнай лексікі: яно часта сустракаецца ў мове сродкаў масавай інфармацыі, яго можна пачуць ў паўсядзённа-побытавым маўленні па-беларуску, таму тлумачэнне значэння не выклікала цяжкасцей. Аднак большасць правільна падабраных слоў былі на рускай мове (66%): *железная дорога*, *рельсы, дорога, по которой ездят поезда*. Некалькі адказаў склалі моўныя асацыяцыі па-беларуску: *цягнік*; *транспарт, які ходзіць па рэльсах*. Астатнія тлумачэнні вучні стваралі на аснове суаднясення слова *чыгунка* з падобнай па гучанні лексемай *чугун*: *кацёл*, *металічная міска*, *каструля*, *скаварада*, *чугунная скаварада*, і суадносныя з імі рускамоўныя азначэнні тыпу *метал*, *сталь*, *посуда*, *кухонная утварь*.

Праведзены лінгвістычны эксперымент паказаў, што ў працэсе навучання адбываецца фрагментарнае засваенне спецыфічна беларускай лексікі. Вучні імкнуцца арганізаваць сваё маўленне на беларускай мове ў тых сітуацыях, якія з’яўляюцца псіхалагічна камфортнымі для камунікацыі па-беларуску. Аднак бедны слоўнікавы запас, фармальныя спосабы семантызацыі невядомых слоў, якія выкарыстоўваюцца ў працэсе навучання (пераважна пераклад на рускую мову), не дазваляюць якасна ствараць нават невялікія выказванні з апорай на словы-стымулы.

Такім чынам, узровень ведання беларускай мовай адлюстроўвае агульную тэндэнцыю развіцця моўнай сітуацыі ў краіне – уплыў рускай мовы на лексічны запас асобы, засваенне і разуменне маўленчых адзінак, аднак нетрывалае валоданне імі. Адной з прычын з’яўляецца тое, што ў большасці сваёй беларуская мова амаль не выкарыстоўваецца ў паўсядзённа-побытавых зносінах, не прывіваецца ў сямейным асяроддзі. У той жа час удзельнікі эксперыменту рэальна ацэньваюць свой узровень валодання беларускай мовай ва ўсіх яе формах і разумеюць недахоп ведаў. Таму насёння важную ролю адыгрывае асоба настаўніка – менавіта яе большасць апытаных вучняў адзначыла як адзіны ўзор “жывога” беларускага маўлення.

Лагічным працягам эксперыменту стала пытанне, скіраванае на высвятленне матывацыі і жадання ўдасканальваць ўзровень валодання беларускай мовайвучняў 6 – 8 класаў згаданай установы адукацыі: *“З якой мэтай вы жадалі б удасканаліць сваё валоданне беларускай мовы?”*. Вынікі апытання прыведзены ў табліцы.

Табліца – Колькасныя паказчыкі вынікаў аналізу адказаў вучняў

Варыянты адказаў	6 клас	7 клас	8 клас
Кожны жыхар сваёй краіны павінен ведаць родную мову	44%	48%	36%
Гэта патрэбна мне для таго, каб палепшыць свае адзнакі	33%	14%	41%

Гэта неабходна мне для суразмоўніцтва, чытання кніг і інш.	9%	20%	8%
Мне гэта цікава	7%	6%	11%
Я не маю такой патрэбы	7%	12%	4%

Прагматычны ўзровень моўнай асобы вучняў вызначаецца наяўнасцю пэўных установак, аднак характарызуецца іх нетрываласцю і недастатковай матываванасцю.

Такім чынам, працэс навучання беларускай мове неабходна накіраваць на ўсведамленне вучнямі сутнасці сацыяльный функцыі беларускай мовы, пазнанне маральных і культурных каштоўнасцей свайго народа, спасціжэнне ролі мовы ў яго самавыражэнні. Такая арганізацыя вучэбнага працэсу забяспечыць у выніку дасягненне мэты моўнай адукацыі, а беларуская мова стане не толькі прадметам вывучэння, але і дзейсным сродкам фарміравання асобы.

Літаратура

1. Шкраба, І.Р. Слоўнік беларускай бэзэквівалентнай лексікі (у рускамоўным дачыненні) / І.Р. Шкраба. – Мн.: Бел. Эн. імя Петруся Броўкі, 2008. – 318 с.

В.В. Маршэўская (Гродна)

ДА ВЫКЛАДАННЯ СІНТАКСІСУ ТЭКСТУ Ў ВНУ І СЯРЭДНЯЙ ШКОЛЕ

Пры вывучэнні сінтаксісу тэксту ў ВНУ і сярэдняй школе часта ўзнікаюць пытанні, звязаныя з вызначэннем функцыянальна-сэнсавых тыпаў маналагічнага маўлення і характарыстыкай адпаведнай гэтым тыпам сувязі. Каб адказаць на гэтыя пытанні, успомнім асноўныя асаблівасці тэксту.

“Тэкст (лац. *textus* ‘тканіна, спалучэнне, спляценне’) – гэта маўленчае камунікацыйнае ўтварэнне, функцыянальна скіраванае на рэалізацыю пазамоўных задач” [1, с. 337].

Тэрмін тэкст у мовазнаўчай літаратуры тлумачыцца неадназначна: яго ўспрымаюць як сінонім да тэрмінаў выказванне, звязная мова, звязваюць з паняццем складанае сінтаксічнае цэлае, лічаць тэкстам любое па форме выказванне (вуснае і пісьмовае) і г.д. Тым не менш большасць даследчыкаў надае тэксту статус асноўнай камунікацыйнай адзінкі, якой уласціва звязнасць і цэласнасць. Паняцце звязнасці арыентуецца на структурную арганізацыю тэксту, а паняцце цэласнасці – на яго зместавую арганізацыю (фактуальную, канцэптуальную, падтэкставую).

Звязнасць тэксту выяўляецца праз знешнія структурныя паказальнікі (сказы, празаічныя строфы), выкарыстанне пабочных канструкцый, займеннікаў, лексічных паўтораў і інш. Напрыклад:

Пачнеш думаць пра дзень пражыты.

О-о, як хутка ён мільгануў! Толькі-толькі быў ясны ранак. І чыстае яркае і не спякотнае сонца на ўсходзе весяліла і бадзёрыла, саграваля душу надзеяю на непазбежнае шчасце. І ўпэўненасць была, што за доўгі дзень столькі зрабіць паспееш: і сустрэцца, і перагаварыць, і работу зрабіць. І ты хапаўся то за адно, то за другое і часта сярод белага дня, калі падымаў угору вочы, бачыў пякучае белае сонца, што бязгучна кацілася між аблокаў. І думалася тады: яшчэ далёка да вечара, яшчэ паспеецца… І зноў, вочы ад неба адарваўшы, хапаўся за сваё звыклае і запланаванае, забыўшыся на сонца ўгары, што коціцца і коціцца да той недасяжнай лініі, якая мяжуе між небам і зямлёю. І вось тады, калі сядзіш на лаўцы і сцішана глядзіш на шаравата-светлыя гурбы, да якіх хіліцца малінавы дыск, нечаканым жалем поўніцца душа: такім кароткім аказаўся дзень!

І што ты паспеў зрабіць за гэты дзень?

О-о, калі б гэты дзень змог пражыць нанава, то зусім іначай правёў бы яго, – не кідаўся б за няскончанай работай, зусім іначай гаварыў бы з людзьмі… (В.Г.).

Цэласнасць тэксту дасягаецца тэматычным і мадальным адзінствам. Тэматычнае адзінства выяўляецца ў паўторнай намінацыі ключавых слоў, якія могуць ствараць вакол сябе сэнсавы кантэкст, куды ўваходзяць іншыя словы, звязаныя з ключавымі пэўнымі асацыяцыйнымі сувязямі. Напрыклад: *Рукі пахлі кменам, збожжам і дажджамі, залацістым сенам, спелымі садамі, дзікім грэчкі мёдам, недасяжным небам, шумным карагодам і шчаслівым хлебам. Рукі мелі права пахі тыя знаці, імі нас ласкава абнімала маці* (Н.).

Мадальнасць тэксту ствараецца шляхам выбару аўтарам пэўных маўленчых сродкаў, неабходных для рэалізацыі сваёй канцэпцыі, асабістага пункту гледжання. Праілюструем гэта кантэкставымі антонімамі з паэтычнай спадчыны В. Зуёнка:

Усё вядома яшчэ да таго… // Чытае лёс з фармуляра майго: // Калі на свет я з'яўлюся, калі развітаюся з ім… // З кім сустрэнуся і размінуся, а каго не сустрэну зусім… // З кім засмяюся і з кім пабяруся… // Дзе прайду, а дзе – упаду… // Дзе і якая чакае ўдача, // А на якой дарозе заплачу… // Каго абнадзею паглядам, а каму зліхадзею здрадай... // З кім пасваруся і як памірую... // Усё вядома: дзе і калі паўтаруся я, на якой зямлі… // Ці гэта навала мяне абміне… // – Усё вядома… Толькі не мне…

Па форме рэалізацыі тэксты бываюць вусныя і пісьмовыя, спантанныя і падрыхтаваныя; па колькасці моўцаў тэкст можа ўяўляць сабой маналог (маўленне, звернутае да самога сябе ці да іншых і не разлічанае на слоўную рэакцыю другіх асоб); дыялог (маўленне, у час якога адбываецца непасрэдны абмен выказваннямі паміж дзвюма асобамі); палілог (абмен выказваннямі паміж больш чым дзвюма асобамі).

Да функцыянальна-сэнсавых тыпаў маналагічнага маўлення адносяцца апісанне, апавяданне і разважанне.

Апісанне – гэта дэталёвая характарыстыка прадмета маўлення з боку яго формы, складу, структуры, якасці, уласцівасцей, прызначэння і г.д. у залежнасці ад задач выказвання, ад задумы таго, хто гаворыць ці піша. Апісанню ўласціва статычнасць, перадача пастаянных ці часавых уласцівасцей.

Выдзяляюцца наступныя разнавіднасці апісання: пейзаж, ці агульны выгляд якой-небудзь мясцовасці; партрэт чалавека або апісанне знешняга выгляду нейкага прадмета, жывёліны, расліны, пабудовы, прадмета быту і інш.; інтэр'ер ці апісанне ўнутранай часткі якога-небудзь памяшкання; характарыстыка як пералік істотных асаблівасцей, прымет каго-небудзь, напрыклад, назвы рысаў характару, схільнасцей, роду заняткаў і інш. Апісанне можа быць мастацкае (вобразнае), навуковае, справавое (шукаецца чалавек па прыметах). Напрыклад:

Вось як жывога дзядзьку бачу, я тут партрэт яго зазначу. Ён невысок, не надта ёмак, ды карчавіты і няўломак, а волас мае цёмна-русы, і зухаўскія яго вусы умеру доўгі, густаваты, угору чуць канцы падняты; а вочы шэры, невялічкі, глядзяць прыветна, як сунічкі (К-с) – мастацкае апісанне вобраза чалавека;

Выгляд яе [хаты] для кожнай мясцовасці быў розны. Але найбольш тыповы быў такі. Ля ўвахода, справа, месца для мыцця посуду і іншых кухонных рэчаў. Пасля – печ. За печчу, па правай сцяне, – нары. Пад імі складалі розныя рэчы. Часам замест нараў стаялі шырокія ложкі. Уздоўж астатніх дзвюх сцен ішлі шырокія лавы, пакрытыя тканымі налаўнікамі. На іх сядзелі. Ноччу на лавах маглі спаць, асабліва калі бывалі госці. Перад лавамі – стол. Заўсёды дужа белы, бо яго часта скрэблі нажом… (Каратк.) – інтэр'ер;

Адзвінелі, адгаманілі, збягаючы з пагоркаў, шпаркія ручаі, заліліся звонкім срэбрам жаўрукі ў паднябессі, прыгрэла сонца, у нізінах мякка закучаравілася трава, пракінуліся залатыя вочкі кураслепу, зазвінела жоўтымі галоўкамі маці-мачыха. Вербалоз над канавамі і стаўкамі аздобіўся пушыстымі коцікамі, пацямнелі рослыя бярозы каля гасцінца, павіслі на іх голлі жаўтлявыя завушнічкі (Хадк.) – пейзаж.

Апавяданне – гэта перадача падзей, якія адбываліся з носьбітам маўлення або вядомых яму ад іншых ці прыдуманых, створаных яго фантазіяй.

Апавяданню ўласцівы дынамізм, паслядоўнасць дзеяння, руху. Апавяданне часта будуецца па моўнай схеме: пачатак – працяг – заканчэнне дзеяння. Напрыклад: *Аднойчы паслалі мяне ў камандзіроўку. Зімой гэта было. За горадам, у лесе, пайшоў снег. Падалося, нехта дарогу пераходзіць. Націснуў я на тормаз – машына спынілася, матор заглух. Паспрабаваў завесці старцёрам – не выходзіць. Узяў ручку завадную і выскачыў з*

кабіны. Раз крутнуў, другі – машына завялася, а я ў кабіну пабег. Пакуль сеў на сядзенне, матор заглух, і я зноў узяўся за ручку. Але зноў паўтарылася тое ж самае. Ажно спацеў ад беганіны. Потым сеў у кабіну і сяджу.

Раптам бачу: нехта ідзе – вялізны, у калматым футры. Прыгледзеўся – мядзведзь! Ну, думаю, машыну раздзярэ і да мяне дабярэцца...

Мядзведзь падышоў бліжэй, узяўся за ручку завадную. Крутануў – машына завялася. Што рабіць? Ці крычаць, ці падзякаваць выйсці? Тым часам мядзведзь наблізіўся і сунуў мне лапу ў кабіну. Зноў не ведаю, што рабіць. Падаць руку страшна. Але ж ён памог завесці машыну! І я працягнуў мядзведзю руку. Ціскануў ён яе так, што я ажно крыкнуў і... прачнуўся (А.П.).

Разважанне – такі тып тэксту, у якім разгляд пэўных пытанняў, праблем грунтуецца на лагічнасці, аргументаванасці. Лінгвісты прапануюць адрозніваць тры семантычныя разнавіднасці разважання: разважанне-доказ, разважанне-роздум, разважанне-тлумачэнне, якія характарызуюцца спецыфічнай моўнай структурай: тэзіс – аргументацыя – выснова (дэдуктыўнае разважанне), факты – іх аналіз і сінтэз – вывад (індуктыўнае разважанне). Напрыклад: *Якая, вы думаеце, самая цікавая кніга на свеце? Адразу не адкажаце, не здагадаецеся. Гэта кніга – зямля, на якой мы жывём і якая з першых год нашага жыцця штодня вучыць нас гісторыі, мове, штодня і шораз адкрывае нам усё новыя і новыя словы, значэнне і сэнс якіх мы вучымся спазнаваць і разумець.*

Жывое асяроддзе акружае нас: жывёлы, птушкі, самыя малыя істоты, а таксама расліны, кветкі, дрэвы. І ўсе яны маюць свае імёны. Тысячы і мільёны назваў існуе на зямлі. Кожная яе мясціна мае сваю назву.

Добра было б, каб адзін са сваіх сшыткаў вы назвалі "Мая бацькаўшчына", або "Мой родны кут". У ім запісвалі ўсё самае цікавае, пра што дазнаецеся ад старэйшых людзей (В.).

Аб'ёмнаму пісьмоваму твору не характэрна, каб цалкам увесь тэкст выкладаўся якім-небудзь адным спосабам (апісанне, апавяданне ці разважанне). Як правіла, спосабы выкладу пераплятаюцца: аўтар ад апавядання можа пераходзіць да разважання ці апісання і г.д. Бывае, што адзін тып маўлення можа мець сэнсавыя адценні, уласцівыя іншым тыпам.

Як пазначае Т.Р. Рамза, варта размяжоўваць кантамінаваны (ад лац. *contaminatio* 'сутыкненне, змешванне') функцыянальна-сэнсавы тып і спалучэнне розных функцыянальна-сэнсавых тыпаў у адным мікратэксце [3, с. 173]. "Кантамінаванае маўленне не з'яўляецца тэматычным спалучэннем розных тыпаў маўлення, а ўнутраным тыпалагічным іх скрыжаваннем на аснове змянення функцыі таго ці іншага тыпу маўлення, што вядзе да ўтварэння новай (трэцяй) моўнай адзінкі, г.зн. кантамінаванага тыпу маўлення" [2, с. 202].

У якасці мінімальнай структурна-семантычнай адзінкі тэксту выступае звышфразавае адзінства (ЗФА) (у якасці сіноніма выкарыстоўваецца тэрмін складанае сінтаксічнае цэлае – ССЦ). Звышфразавае адзінства – гэта “такая тэкставая адзінка, якая складаецца больш чым з аднаго самастойнага сказа і валодае сэнсавай цэласнасцю ў кантэксце звязнага маўлення, выступае як частка завершанай камунікацыі” [3, с. 175]. Звышфразавае адзінства ўласцівае і вуснаму, і пісьмоваму маўленню, яно характарызуецца лагічнасцю (з’яўляецца вынікам аб’ектыўнага чляненне), сэнсавай завершанасцю.

Мінімальнай кампазіцыйна-стылістычнай адзінкай тэксту з’яўляецца абзац (ням. *der Absatz* – уступ). Абзац існуе толькі ў пісьмовым тэксце. Памер абзаца, як правіла, залежыць ад індывідуальнай манеры аўтара выкладаць думкі, ад задумы аўтара (у гэтым выяўляецца прагматычнасць абзаца). Маючы суб’ектыўную скіраванасць, абзац можа выступаць у якасці эмацыянальна-выяўленчага сродку тэксту.

Абзац і ЗФА: ***а)*** могуць супадаць: *Ах, якія мы часам няўважлівыя да другіх, калі ў саміх усё гладка і роўна!* (Дам.);

б) у адно ЗФА могуць уваходзіць два і больш абзацаў:

А дзед быў прыгожы.

Без шапкі, у шэрай, як ралля, расхрыстанай на сухіх, загарэлых грудзях кашулі. Упёршыся худымі і пругкімі, як смаляныя галіны, нагамі ў рабрыну вялікай лодкі, “кароль вугроў” паволі і няспынна разгойдваўся ўперад-назад, рытмічна ўзмахваючы цяжкімі вёсламі ‹…› Белы маршчыністы лоб над загарэлымі скуламі шчодра акроплены потам. Сівыя валасы, хоць і прычасаныя перад ад’ездам у людзі, як толькі ён зняў кепку, зноў растрэсліся, прынялі свой звычайны, сціпла кучаравы беспарадак.

Прыгожы быў позірк светла-блакітных вачэй пад густымі, сівымі брывамі, вачэй адкрытых і чыстых, як само бясхмарнае неба, паўторанае ў крынічным люстры бяскрайняга возера… (Б.);

в) абзац можа змяшчаць некалькі рознатэматычных ЗФА: *Крынічка б’е з-пад зямлі, і вада ў ёй не замярзае. А летам такая халодная, што аж зубы сцінае. Яна наталяе смагу, надае сілы і нават гоіць раны. // Вы паглядзіце, колькі розных слядоў наўкола! Сюды, да крынічкі, прыходзяць ласі і ваўкі, лісы і зайцы, дзікі і алені, рысі і дзікія козы, прылятаюць курапаткі і ястрабы, цецерукі і каршуны, глушцы і ўсялякае дробнае птаства. // Ніхто нікога не чапае. Тут нібы дзейнічае закон дружбы ў імя захавання жыцця* (Д.С.).

У тэксце даследчыкамі вылучаюцца два віды сувязі: кантактная (спалучае суседнія выказванні) і дыстантная (спалучае аддаленыя выказванні). “Дыстантнай сувяззю звязваюцца, як правіла, інфармацыйна самыя значныя кавалкі тэксту, а таму найбольш выразна яна і праяўляецца якраз паміж абзацамі, фарміруючы “стрыжань” усяго тэксту і забяспечваючы яго цэласнасць” [3, с. 187].

Паводле характару сродкаў і спосабаў іх дзеяння адрозніваюць ланцужковую (паслядоўную) сувязь (калі выказванні чапляюцца адно за адно на ўзор звёнаў ланцужка; кожная наступная думка лагічна вынікае з папярэдняй), паралельную сувязь (будова сказаў ці абзацаў тоесная) і далучальную сувязь (змест наступнага выказвання дапаўняе, дадае інфармацыю да асноўнага).

Асноўнымі сродкамі паслядоўнай сувязі з'яўляюцца займеннікі, лексічныя паўторы, кантэкставыя сінонімы, антонімы і інш. Напрыклад: *Прыляцела ластаўка з далёкага выраю. Села яна на страху старога гумна і зашчабятала. Вясёленькая песенька яе так і пасыпалася па ўсім двары мілым шчэбетам* (К-с).

Паралельная сувязь вызначаецца аднолькавым парадкам слоў, аднатыпнасцю будовы сказаў, абзацаў, аднолькавымі формамі часу і трывання дзеясловаў-выказнікаў, паўторам адных і тых жа лексем і інш. Напрыклад: *І такуюць, такуюць раніцай глушцы. І клічуць-клічуць белыя лебедзі, б'юць на рэках пудовыя шчупакі, шумяць сонечныя дубы і грабы. І чырванеюць падасінавікі. І дымок ад ранішняга вогнішча змешваецца з туманам* (Каратк.).

На далучальную сувязь паказваюць злучнікі *і, ды, ды і, і таму, і тады* і інш., а таксама прыём парцэляцыі (раздзяленне сказа на некалькі інтанацыйна адасобленых частак з мэтай стварэння пэўных стылістычных эфектаў). Напрыклад: *Бяссоннай ноччу думаецца многа. І светла і не надта. Як калі* (Т.Д.).

Калі пры спалучэнні выказванняў назіраюцца прыметы розных відаў сувязі, – гэта змешаная сувязь. Напрыклад, прыкметы ўсіх трох відаў сувязі знаходзім у наступнай мініяцюры: *Адна рэч – чалавекам нарадзіцца. І зусім іншая – чалавекам памерці... Нарадзіцца – якім Бог даў. Памерці – якім Бог прыме…* (Гал-ч).

Літаратура

1. Всеволодова, М.В. Теория функционально-коммуникативного синтаксиса. Фрагмент прикладной (педагогической) модели языка / М.В. Всеволодова. – М.: МГУ, 2000. – 502 с.

2. Нечаева, О.А. Функционально-смысловые типы речи (описание, повествование, рассуждение) / О.А. Нечаева. – Улан-Удэ: Бурятское книжн. изд-во, 1974. – 261 с.

3. Рамза, Т.Р. Сінтаксіс: тэарэтычны курс: вучэб. дапам. / Т.Р. Рамза. – Мінск: БДУ, 2006. – С. 158–192.

С.В. Николаенко, Е.И. Сердечная (Витебск)

СОЦИАЛИЗАЦИЯ УЧАЩИХСЯ КАК ЦЕННОСТНОЕ ВИДЕНИЕ ОСОБЕННОСТЕЙ И ЗАКОНОМЕРНОСТЕЙ БЫТИЯ БЕЛОРУСОВ И РУССКИХ

В последние годы в Республике Беларусь в системе общего среднего образования лингворечевое и коммуникативное развитие учащихся осуществляется эффективно на основе лингвокультурологического подхода, в задачи которого входит организация усвоения знаний синтезирующего уровня, пограничных между науками, изучающими культуру. Как показывает практика обучения языку в учреждениях общего среднего образования, именно лингвогвокультурологический подход создает условия для изучения белорусского (русского) языка как феномена культуры, выступающего в качестве средства хранения и передачи ценностей русской и белорусской культур, являющихся основой взаимосвязанного лингвокультурологического и социокультурного развития учащихся. При этом процессе познания языка у обучаемых формируется отношение к культуре как совокупности материальных, социальных и духовных ценностей как русского, так и белорусского культурного наследия, создаваемых народами в условиях определенной эпохи.

Культура, с одной стороны – определенное количество унаследованных текстов, а с другой – унаследованных символов. Символы культуры редко возникают в ее синхронном срезе. Как правило, они приходят из глубины веков. Например, на протяжении многих столетий символическим изображением средоточия чувств у многих народов является сердце. Сердце, пронзенное стрелой, – символ любви, боли и страданий, которые несет с собой это, казалось бы, радостное и светлое чувство. И язык располагает такими средствами, которые отражают разные стороны любви: *сэрца рвецца, крывёю сэрца абягае (зацякае), сердце кровью обливается, сердце поет, надорвать сердце* и т.д.

Более сложные символы, к которым можно отнести, например, традиции и обряды, также имеют национальные признаки (Сымон-музыка – сімвал творцы, Міхал з “Новай зямлі” – сімвал гаспадара, Плюшкин – символ накопительства, Обломов – символ лени). Поэтому в центре лингвокультурологических исследований закономерно находится семантика языковых единиц, которая формирует, хранит и передает от поколения к поколению содержание ценностей, на основе которых реализуется система лингвокультурологического развития учащихся в процессе обучения русскому языку [1].

Ключевые слова, обозначающие важнейшие реалии и понятия духовной и материальной культур, должны изучаться в связи с историей русского и белорусского народов, так как развитие народа и языка

помогает объяснить природу культуры, взаимосвязь духовности и поведения народа, проследить систему представлений о мире, понятий, жизненных установок, правил, законов, по которым жил народ. Изучение культурно-исторических сфер языка позволяет проследить диалектику понятий, категорий, самой среды, формирующей духовность и эмоциональный опыт народа

Социализация учащихся в системе общего среднего образования Республики Беларусь в процессе обучения русскому языку предполагает овладение социокультурными ценностными знаниями, которые помогают обучаемым познакомиться с нормами поведения, предписывающими определенные стандарты и правила, в соответствии с которыми формируется их гражданская позиция, социально значимая для последующего (после завершения среднего общего и высшего образования) активного включения в избранную социально-экономическую, политическую, культурную, образовательную и т.д. среды деятельности современного общества. Такие интегрированные знания из разных взаимосвязанных дисциплин (лингвистика, социолингвистика (русский, белорусский языки), филология (русская, белорусская литературы), история (России, Беларуси), культурология, лингвокультурология. социология и др. формируют у учащихся ценностное видение особенностей и закономерностей бытия культуры, выраженного в различных видах культур (материальной, социальной, духовно-нравственной), отражающих ценности национального культурного наследия:

1) ценности материальной культуры (реальные исторические памятники, сохранившаяся архитектура, орудия труда, машины, предметы быта, одежда, произведения изобразительного искусства, письменные источники и др.);

2) ценности социальной культуры (нормативная система: обычаи, нравы, законы; социальное положение: статус, трудолюбие, профессия, семья, терпимость и др.; политические: свобода слова, гражданская свобода, законность, гражданский мир и др.);

3) ценности духовной культуры (витальные: жизнь, здоровье, качество жизни, природная среда и др.; моральные: добро, благо, любовь, дружба, долг, честь, порядочность и др.; эстетические: красота, идеал, гармония и др.). Духовные ценности в свою очередь подразделяются на общечеловеческие, национальные, семейные и индивидуально-личностные.

К общечеловеческим ценностям относятся все шедевры мирового искусства, устойчивые нормы нравственности (любовь и уважение, честность, милосердие, мудрость, красота души и др.); к национальным ценностям относится всё то, что занимает важнейшее место в жизни народа (белорусского, русского и т.д.): для белорусского народа –

Софийский собор в Полоцке, крест Евфросинии Полоцкой, деятельность Ф. Скорины (Библия) и др.; для России – это Кремль, А.С. Пушкин, Л.Н. Толстой, Ф.М. Достоевский, А.И. Солженицын. Следовательно, национальные духовные ценности – это всё то, из чего складывается культура (наследие) того или иного народа.

Идея понимания ценностей культуры с помощью ключевых слов плодотворна для языкового обучения, в частности, для наполнения социокультурного содержания языковых курсов. Важно подбирать и анализировать так называемые культуроспецифические слова, которые отражают особенности образа жизни, культуры, мышления. К культуроспецифическим словам, вслед за А. Вежбицкой, следует отнести названия *"вещей"* (видимых и осязаемых). Зачастую они не переводятся на другие языки, так как называют предметы, специфические для данной культуры, которые отсутствуют в другой культуре. Такими являются, например, названия блюд национальной кухни, одежды и т.п.

Так, пища – базовый компонент культуры уже потому, что голод – один из базовых инстинктов человека [1, с. 232]. Пища в белорусской культуре – это не чисто физиологический акт, а сакральный (особая пища на «Дзяды» и т.д.). Количество и разнообразие потребления пищевых продуктов, традиции приготовления, связанные с ними праздничные ритуалы и т.п., тесно связаны с базовой системой ценностей народа, являются факторами престижа и служат символами самых разнообразных аспектов культурной жизни.

Древняя основа традиционной кухни белорусов – *хлеб, каша, хлеб-соль, щи, блины, калач, квас.* К культурно специфическим относятся также *поливка, драники, узвар.* Наименования злаков и продуктов из них – наиболее богаты культурными символическими смыслами, например, хлеб, который Ю.С. Степанов относит к константам русской культуры. В русской картине мира концепт «хлеб» сложен. В нем есть и предметное и абстрактно-духовное начала: *Рыба – вода, ягода – трава, хлеб – всему голова! Хлебом* и *солью* встречают дорогих гостей, *хлеб да соль* – пожелание доброго аппетита, а гостеприимных людей русские называют хлебосольными; *Хлеб на стол – и стол престол! А хлеба ни куска – и стол доска!*

На первый взгляд, множество традиционно белорусских названий пищи на самом деле заимствованы из других культур: *кисель, мед, молоко, сыр, масло, рыба, мясо, уха* – это общеиндоевропейские слова, из греческого заимствованы *кулич, кутья, оладьи, свекла,* из латинского – *вино,* из тюркских – *чай,* из французского – *суп* и т.д.

Из всех ценностей материальной культуры одежда (костюм) теснее всего связана с человеком. Культурно-специфичными для белорусской лингвокультуры являются *жупан, кунтуш, андарак, фартух, затулка* и др. Следовательно, пища и одежда – это средства национальной идентификации.

К материальной культуре мы отнесли следующие: культовая архитектура (храмы), музеи, памятники архитектуры и градостроительства (дворцы и необычные сооружения, замки и крепости, ратуши), парково-усадебная архитектура, скульптура. Примером является «Национальный историко-культурный музей-заповедник «Несвиж» [2].

Памятники материальной культуры представлены в каждом из региональных словарей, для изучения отбираются наиболее значимые из них для каждого региона. Например, брестский учитель вправе предложить исторические сведения о Брест-Литовске, время основания которого до сих пор является спорным. Город не раз разрушался, переходил от одного правителя к другому. Расцвет Брест-Литовска приходится на 1870-е гг., когда он стал превращаться в красивый зажиточный город со своей железной дорогой и кирпичными зданиями. В августе 1915 г., к приходу немецких войск, город был опустошен и разрушен, далее его ждали три года немецкой оккупации и переход под власть польского государства, переименование и т.д.

Подобную историко-культурную информацию учитель может взять в прекрасной работе «Наследие Беларуси» (Минск, 2007), изданной по благословению православного митрополита и католического епископа Беларуси.

Литература

1. Ковшова, М.Л. Лингвокультурологический метод во фразеологии: коды культуры / М.Л. Ковшова. – М.: Либроком, 2012. – 453 с.

2. Спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://livingheritage.by/ Publikacyi/hkk%20spis.pdf. – Дата доступа: 12.02.2015.

3. Худенко, Л.А. Лингвокультурологический подход к обучению русскому языку учащихся 5–11 классов: теоретические и методические основы / Л.А. Худенко. – Минск: Нац. ин-т образования, 2011. – 276 с.

Е.И. Романовская (Минск)

ЛИНГВОКУЛЬТУРОЛОГИЧЕСКИЙ АСПЕКТ ПРЕПОДАВАНИЯ РУССКОГО ЯЗЫКА КАК ИНОСТРАННОГО

Лингвокультуроведческий подход при обучении иностранным языкам сформировался в 90-е годы. Что изучает лингвокультурология? Это наука, которая изучает предметы и явления отдельной культуры, концепты. Предметом исследования лингвокультурологии является культурный фон – специфическое для того или иного народа мировосприятие, представленное в мифологии, сказаниях, пословицах, поговорках и других формах фольклора, в прецедентных текстах. По мнению исследователя В.А. Масловой, предметом изучения лингвокультурологии выступают эталоны, стереотипы, символы, образы, речевое поведение и речевой этикет [4, с. 37].

Выделяют следующие методы изучения культурных концептов: «анализ пословиц, афоризмов, внутренней формы слов, прецедентных текстов, сюжетов художественных произведений, психолингвистический эксперимент с носителями языка» [3, с. 99].

Лингвокультурологический подход рассматривает язык в качестве носителя культуры (В.А. Маслова, Ю.С. Степанов). Изучение культуры предполагает включение фоновых знаний о личности носителя языка, выступающего как объект изучения культурной специфики, в контекст преподавания. Это ориентирует на взаимопонимание и выработку определенного поведения обучающихся. Культурные фоновые знания можно рассматривать как основу развития межкультурной компетенции обучающихся. Моделирование межкультурной коммуникации нацеливает на применение языка в различных ситуациях, близких к естественным. Обучающемуся требуется представить себя в той или иной роли. Это дает возможность «сравнения социокультурного фона и коммуникативного стиля поведения в родной и иноязычной культуре (культурно-прагматические знания)» [1, с. 4–6].

Данный подход раскрывает культурно-ориентированное содержание языка и речи, изучение культуры через язык. В контексте преподавания иностранных языков выделяют два направления соизучения языка и культуры: чисто филологический (через слово и словесные комплексы путем экспликации системы национально-культурных понятий), социологический (через изучение культурно-обусловленной сущности общения).

На семантическом уровне язык выступает как инструмент презентации, кодирования, преобразования и переработки информации. Когнитивный подход позволяет рассмотреть язык и культуру в связи с ментальными процессами восприятия и познания человеком и окружающего мира. Основной единицей структурирования знаний выступает концепт. Концепты формируют сознание. Концепт является конструктом и средством моделирования действительности. Концептуализация культурного пространства осуществляется с помощью языка и таким образом в концепте прослеживается корреляция языка и культуры. Концепт можно рассматривать как метаязык культуры [4; 6].

Концепты выражаются при помощи знаков – лингвокультурем. Лингвокультуремы – это слова, которые отражают в языке определенную понятийную сферу культуры. Лингвокультуремы образуют системы взаимодействующих полей – лингвокультурных полей, – из которых складывается языковая картина мира [7].

Лингвокультура выступает как фоновая среда познания, включающая *значения – смыслы – концепты – константы* и их отражение в языковой картине мира в конкретной лингвокультурной общности как в непосредственной, так и опосредованной формах через дискурсы, тексты и различные типы контекстов. Макроуровень лингвокультуры в ментальном

измерении представляет совокупность концептов, раскрывающих культурные универсалии и специфику определенной лингвокультурной общности. Содержание лингвокультуры на микроуровне составляют социокультурный фон общения и коммуникативный стиль поведения.

Художественные тексты фиксируют определенные нормы культуры, они являются источником культуроведческой информации. Художественный текст как источник культурных фоновых знаний может быть представлен в разных формах, нести миропонимание автора, картину или образ мира, смысл прошлых и последующих культур.

Наряду с номинативным социально-культурным содержанием в текстах присутствует и коммуникативное содержание. Когнитивное понимание текста происходит через денотативное представление культурного фона и составление денотатной карты; понятийное представление культурного фона и составление понятийной карты; потекстовое толкование национально-маркированной лексики; экспликация национально-культурных понятий; комментирование и имитация этикета поведения; выявление культурного фона художественного текста.

В художественном тексте можно выделить а) концептуальный; б) контекстуальный; в) собственно текстовой или информативный план; г) языковой план, включающий совокупность различных языковых средств [7, с. 138]. Все это вместе позволяет рассматривать художественный текст как динамическую систему, создающего модель иноязычной культуры. Рассматривая текст под этим углом зрения, можно выстроить его лингвокультурную парадигму.

Каждый художественный текст информативен и способен трансформировать и порождать сообщения (Ю.С. Степанов). В художественном тексте национально-специфическая картина мира предстает в форме культурно-прагматического пространства: окружающий мир, уклад жизни, запас знаний или культурный фонд, представители иной лингвокультурной общности.

Таким образом, художественные тексты выступают источником культурных фоновых знаний. В обосновании новой учебной дисциплины, имеющей интегративный характер, используется синергетический подход, теоретические наработки и программы по межкультурной коммуникации.

Принцип культурно связанного соизучения языков предполагает вычленение культурного значения и сопоставление выделенных лингвокультурных соответствий. Культурологический материал подбора текстов должен иметь практическую направленность, содержать задания, развивающие умение интерпретировать культуроведческую информацию, быть увлекательным и актуальным, носить познавательный характер. Учебники по иностранному языку могут быть дополнены иллюстрациями, фотографиями, музыкой, аудиоматериалами.

При обучении русскому языку как иностранному преподаватель должен придерживаться принципа коммуникативной направленности, дифференциации и интеграции, а также принципа учёта родного языка [5, с. 34–36].

В современных условиях важно научить студента творчески мыслить и свободно ориентироваться в культурном пространстве родной и иноязычной культуры. Личность должна обладать не только способностью к межкультурному общению, но и к эвристическим процедурам постоянного познания новых элементов (Г.В. Елизарова). Культурное знание является центрообразующим фактором понятия лингвокультуры, которая представляет на когнитивном уровне продукт этого знания. Успех действия и его интерпретации зависит от его когнитивной организации и структурирования в сознании человека.

Литература

1. Биболетова, М.З. Концепция учебного предмета «Иностранный язык» / М.З. Биболетова, Н.Н. Трубанёва, А.Н. Щепилова // Иностранные языки в школе. – 2013. – № 9. – С. 4–6.

2. Елизарова, Г.В. Культура и обучение иностранным языкам / Г.В. Елизарова. – М.: КАРО, 2005. – 352 с.

3. Карасик, В.И. Культурные концепты / В.И. Карасик // Языковой круг: личность, концепты, дискурс: монография / В.И. Карасик. – М.: Гнозис, 2004. – С. 87–224.

4. Маслова, В.А. Лингвокультурология: учеб. пособие. / В.А. Маслова. – 2-е изд., стереотип. – М.: Издательский центр «Академия», 2004. – 208 с.

5. Соловова, Е.Н. Методика обучения иностранным языкам: базовый курс / Е.Н. Соловова. – М.: Астрель, 2009. – С. 190–215.

6. Степанов, Ю.С. Концепт / Ю.С. Степанов // Константы. Словарь русской культуры. Опыт исследования / С.Ю. Степанов. – М.: Языки русской культуры, 1997. – С. 40–70.

7. Фурманова, В.П. Межкультурная коммуникация в теории и практике преподавания иностранных языков в вузе: монография / В.П. Фурманова. – Саранск: 2009. – 163 с.

В.І. Русілка, М.В. Бардзюкова (Віцебск)

ТВОРЧАСЦЬ У. КАРАТКЕВІЧА Ў ШКОЛЬНЫМ ВЫВУЧЭННІ

Творчасць Уладзіміра Караткевіча шырока прадстаўлена на ўсіх этапах літаратурнай адукацыі. Упершыню вучні звяртаюцца да яго твораў ужо ў III класе пачатковай школы. Тут вывучаюцца публіцыстычныя тэксты “Родная зямля” і “Бусел – сімвал Беларусі”, якія ў даступнай для дзяцей форме знаёмяць іх з асноўнымі, знакавымі сімваламі роднай зямлі.

У V класе разглядаецца верш У. Караткевіча “Бацькаўшчына”, увага звяртаецца перш за ўсё на выказаны ў творы гонар паэта за сваю радзіму, захапленне яе краявідамі, на мастацкае адлюстраванне прыроднага навакольля, на глыбокі лірызм, шчырасць і непасрэднасць у перадачы пачуццяў паэта. У вершы выяўляецца майстэрства аўтара ў стварэнні родных

краявідаў, тонкасць паэтычнага светаадчування. У гэтым жа класе вывучаюцца і казкі У. Караткевіча. Для абавязковага чытання прапануецца твор “Нямоглы бацька” і для дадатковага – “Чортаў скарб”, “Кацёл з каменьчыкамі”. Літаратурныя казкі выдатнага празаіка арганічна працягваюць фальклорныя традыцыі, даюць магчымасць данесці да вучняў думку аб творчай ўзаемасувязі літаратуры і вуснай народнай творчасці. Вывучэнне апавядання “Былі ў мяне мядзведзі” дапаможа вучням выявіць духоўную шчодрасць чалавека ў клопатах аб прыродзе, паяднанасць жыцця людзей з жыццём прыроды. Гэты твор дае багатыя магчымасці для развіцця маўленчай дзейнасці вучняў, дазваляе аптымальна арганізаваць вуснае слоўнае маляванне.

У VI класе вучні знаёмяцца з казкай У. Караткевіча *“Лебядзіны скіт”,* якая расказвае пра паходжанне назвы “Белая Русь”, пра сутыкненне дабра і зла, а таксама вучыць сваіх чытачоў лепшым чалавечым якасцям: спагадзе, справядлівасці, пачуццю чалавечай годнасці.

У VII класе перавага аддаецца нарысам і баладам У. Караткевіча. Так, напрыклад, нарыс *“Зямля пад белымі крыламі”* ўключае ў сябе цыкл мастацкіх нарысаў пра Беларусь, яе гісторыю, прыроду, культурныя традыцыі народа. Вучні могуць прасачыць патрыятычную ідэю твора, адзначыць ролю гумарыстычных, іранічных элементаў у выяўленні аўтарскіх адносін да асобных жыццёвых з’яў. *“Балада пра Вячку, князя людзей простых”* дазваляе вучням убачыць вобраз Вячкі як героя-патрыёта, змагара супраць ворагаў Радзімы – крыжакоў. Для дадатковага чытання вучням сёмага класа прапануецца верш У. Караткевіча *“Кніганошы”* і навэла *“Сівая легенда”*.

У VIII класе школьнікі вывучаюць верш *“Беларуская песня”*. Гэты твор – тыповы прыклад велічальнай лірыкі, узнёслая ода Радзіме. Вучні павобразна аналізуюць багатую выяўленчую палітру верша, вучацца выразна чытаць твор і такім чынам шматразова паўтараюць па-мастацку пераканальную клятву вернасці Радзіме. Вывучэнне твора немагчыма без прадуманых і змястоўных міжпрадметных сувязяў з гісторыяй, этнаграфіяй, выяўленчым мастацтвам, архітэктурай і музыкай. У гэтым жа класе вучні знаёмяцца з апавяданнем *“Паром на бурнай рацэ”*. Гэты эпічны твор уключае ў сябе элементы рамантычнай паэтыкі: зварот да гістарычнай тэмы, павышаная эмацыянальнасць аповеду, кантрастнасць вобразаў і характараў, драматызацыя дзеяння і карцін прыроды. Для дадатковага чытання вучням прапануецца аповесць *“Лісце каштанаў”*.

У IX класе вывучаецца старажытная беларуская літаратура і літаратура да XX ст., таму творчасць У. Караткевіча спецыяльна не разглядаецца. Прадстаўлены толькі адзін твор для дадатковага чытання – гэта *“Дрэва вечнасці”*.

У X класе творчасць У. Караткевіча вывучаецца манаграфічна, з вылучэннем асаблівасцяў мастацкага стылю і вызначэннем месца пісьменніка

ў літаратурным працэсе. Тэкстуальна разглядаюцца такія творы, як аповесць *“Дзікае паляванне караля Стаха”, “Чазенія”;* раман *“Каласы пад сярпом тваім”,* які мае гістарычную аснову. На самастойнае чытанне вучням адводзіцца аповесць *“Ладдзя роспачы*” і вершы са зборніка *“Быў. Ёсць. Буду”.* У XI класе творчасць У. Караткевіча не вывучаецца. Такім чынам, творчасць пісьменніка ў школьнай праграме прадстаўлена ў наступных жанрах: 4 казкі, 3 урыўкі з публіцыстычных нарысаў, 4 вершы, 1 балада, 2 навэлы, 3 апавяданні, 4 аповесці, 1 раман.

Па меркаваннях вучняў і настаўнікаў, творы У. Караткевіча чытаюцца лёгка і займальна. Самымі цікавымі для вучняў застаюцца такія жанры, як казка і гістарычныя творы. На ўроках ёсць магчымасць выкарыстаць розныя формы працы, такія, як выразнае чытанне твора, інсцэніроўка, цытатная характарыстыка герояў, складанне планаў, складанне сінквейна. Цікавым з’яўляюцца і “прыём інтрыгі”, “прыём запаўнення белых плям”, праектныя тэхналогіі, калі настаўнік падключае да актыўнай пошукавай дзейнасці вучняў.

Вывучэнне творчасці У. Караткевіча з’яўляецца дзейсным сродкам патрыятычнага, гуманістычнага і эстэтычнага выхавання школьнікаў, далучэння іх да навукова-праектнай дзейнасці па беларускай літаратуры.

П А К А З А Л Ь Н І К А Ў Т А Р А Ў

Абрамова Е.И. 3
Агароднікава С.В. 264
Аляксеева Т.У. 168
Аляхновіч М.М. 6
Арцямёнак А.Г. 48
Арцямёнак Г.А. 9
Бабіч Ю.М. 14
Бардзюкова М.В. 294
Бароўка В.Ю. 172
Белякова Е.С. 201
Варапаева В.С. 265
Вардамацкі Л.М. 18
Васілеўская А.С. 20
Васільева Т.А. 38
Васюк Г.У. 176
Васюковіч Л.С. 268
Ганчарова-Цынкевіч Т.У. 179
Гарнак В.У. 23
Генкін У.М. 25
Гладкова Г.А. 183
Глазман Л.Я. 186
Горегляд Е.Н. 272
Грачыха Т.А. 30
Гурчонак А.В. 34
Дабіжы С.П. 237
Дзядова А.С. 38
Дзятко Д.В. 42
Друк Г.М. 190
Зайцава К.А. 45
Зіманскі В.Э. 48
Зязюлькіна В.С. 275
Іконнікава Л.У. 194
Калеснікава А.А. 51
Кірпічэнка В.А. 54
Кісель Т.А. 57
Климкович О.А. 61
Крикливец Е.В. 198
Круталевіч М.М. 64
Курдзека Ж.П. 69
Курловіч І.М. 71
Лавицкий А.А. 74
Лапатинская О.В. 201
Лаппо М.С. 205
Лебядзевіч Д.М. 209
Ліпніцкая С.В. 77
Лукашанец А.А. 81
Лясовіч С.М. 85
Малько Г.І. 89
Марозава А.А. 93
Мартынкевіч С.В. 279
Маршэўская В.В. 282
Маслова В.А. 97
Мезенка Г.М. 101
Міхайлаў П.А. 104
Міхалевіч А.Г. 108
Мордас Н.Р. 108
Навасельцава Г.В. 215
Николаенко С.В. 288
Новік Г.Ю. 219
Нуждзіна Т.С. 223
Падстаўленка В.Ф. 227
Памазенка Т.Л. 112
Петрыкевіч К.У. 264
Півавар К.С. 118
Піваварчык І.В. 122
Пісарэнка А.М. 126
Рамза Т.Р. 130
Романовская Е.И. 291
Русілка В.І. 231, 294
Рычкова Л.В. 134
Саматой І.В. 234
Сафронава А.А. 237
Селібірава Л.У. 69
Семянькова Г.К. 54, 138
Сенькова О.Ф. 240
Сердечная Е.И. 288
Синкевич Т.И. 142
Скибицкая Л.В. 243
Скікевіч Т.І. 144
Скребнева Т.В. 148
Слесарева Т.П. 151
Снігірова Н.А. 154
Струц І.А. 158
Таранеўскі В.У. 247
Тарасава С.М. 251
Урбан В.В. 64
Федарцова К.Р. 162
Швед І.А. 256
Шматкова І.І. 260
Шунейка В.В. 164

Навуковае выданне

БЕЛАРУСКАЯ МОВА І ЛІТАРАТУРА
Ў СЛАВЯНСКІМ ЭТНАКУЛЬТУРНЫМ КАНТЭКСЦЕ

Матэрыялы II Рэспубліканскай навукова-практычнай канферэнцыі

Віцебск, 19–20 лістапада 2015 г.

Тэхнічны рэдактар *Г.У. Разбоева*
Камп’ютарны дызайн *Л.Р. Жыгунова*

Падпісана ў друк . . 2015. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$. Папера афсетная.
Ум. друк. арк. 17,32. Ул.-выд. арк. 19,64. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне – установа адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі ў якасці выдаўца,
вытворцы, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/255 от 31.03.2014 г.

Надрукавана на рызографе ўстановы адукацыі
«Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава».
210038, г. Віцебск, Маскоўскі праспект, 33.